
ПАМЯТЬ



РЭЧЫЦКІ РАЁН

У 2-х КНІГАХ

Кніга 1

МІНСК "БЕЛАРУСЬ" 1998

УДК 947.6
ББК 63.3(4Беи)
П 15

Рэдакцыйная калегія:
Э. Н. ГНЕЎКА, Т. І. ЛІТВІНАВА,
А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, П. П. РАБЯНОК

РАЁННАЯ КАМІСІЯ
ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

Т. І. ЛІТВІНАВА (старшыня камісіі), В. М. КЛЕЙМАН (нам. старшыні камісіі), У. М. АНОХІН, А. М. БАГАЦКАЯ, В. С. БЫШЫК, І. А. БЯЛЯЕЎ, М. М. ВІНІЦКІ, Л. А. ДВОРНІК, М. М. ЗАРАЗАКА, У. М. ЗАРЭЦКІ, Т. Ф. ЕЛІСЕЕВА, А. С. КРАЎЧАНКА, У. Л. КУНЦЭВІЧ, Н. І. МІХАЛЕЎСКАЯ, П. Н. ПАЎЛЯНОК, П. П. РАБЯНОК, С. П. СМОЛЬСКІ, І. Г. СЯРГЕЕЎ, І. Ф. ТАЧЫЛКІН, А. В. ЧУРЫЛАЎ, М. І. ШАРАМЕТ, І. А. ШАФІР, Р. К. ШПАКАЎ, Г. П. ШЫЛЯНОК, У. І. ШЫРОКІ, М. І. ЯНКОВІЧ.

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК «ПАМЯЦІ»
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:
А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік цэнтра), У. І. ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М. З. БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст).

Рэдактары: В. Ц. ВОЛЬСКІ, Э. Н. ГНЕЎКА (вядучы),
Г. Б. КРАСОЎСКАЯ, В. П. СОБАЛЕВА.

Укладальнік П. П. РАБЯНОК
Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-01-0161-X

© Выдавецтва «Беларусь» 1998

Рака Ведрыч

Каля 100 тысяч гадоў назад (эпоха палеаліту)	Паяўленне чалавека на тэрыторыі Рэчыцкага раёна.
IX—V тысячагоддзі да н. э. (эпоха мезаліту)	Паселішча ва ўрочышчы Прудок каля Рэчыцы.
II ст. да н. э.— II ст. н. э.	Пачатак рассялення славянскіх плямёнаў на тэрыторыі Рэчыцкага раёна.
VI — X стст. н. э.	Актыўнае засяленне плямёнамі дрыгавічоў і радзімічаў тэрыторыі Рэчыцкага раёна.

Знак пры ўездзе ў Рэчыцу

XI ст.	Пачатак распаўсюджвання хрысціянства на тэрыторыі Рэчыцкага раёна.
XI — XIII стст.	Уваходжанне Рэчыцкай зямлі ў склад Кіеўскага і Чарнігаўскага княстваў.
1213—1214 гг.	Першае летапіснае ўпамінанне аб Рэчыцы.
1316—1341 гг.	Уваходжанне Рэцыцкай зямлі ў склад Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ).
1561 г.	Атрыманне Рэчыцай магдэбургскага права.
1564—1566 гг.	Утварэнне Рэцыцкага павета і ўваходжанне яго ў Мінскае ваяводства.



Юбілейная капліца

1648—1654 гг. Баявыя дзеянні паміж казацка-сялянскімі атрадамі і атрадамі ВКЛ на тэрыторыі Рэчыцкага павета.

Помнік археалогіі. Гарадзішча

1654 г.	Рэчыца была занята войскамі рускіх ваяводаў А. Н. Трубяцкога, В. П. Шарамецева і казакамі М. Залатарэнкі.
1772 г.	У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай да Расіі адышла ўсходняя частка Рэчыцкага павета.
1793 г.	У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай да Расіі адышла ўся тэрыторыя Рэчыцкага павета.
1796 г.	Выступленне сялян вёсак Жмураўка і Броннае супраць пана Юдзіцкага.
20-ыя — 30-ыя гады XIX ст.	Па Дняпры пачалі хадзіць параходы. Рэчыца стала прыстанню. Горад злучаны паштовым трактам з Мінскам.

Былы Успенскі сабор (цяпер краязнаўчы музей)

1872 г.	У Рэчыцы асвечаны саборны храм у гонар Успення Прасвятой Багародзіцы.
1905—1907 гг.	Палітычныя стачкі і забастоўкі ў Рэчыцы. Сялянскія хваляванні ў вёсках Холмеч, Салтанова, Броннае, Жмураўка, Казазаеўка.
1910—1914 гг.	Сялянскія хваляванні ў вёсках Заспа, Пракісель, Броннае, Жмураўка, Казазаеўка.
1917 г., красавік	У Рэчыцы распачаў дзейнасць Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, у вёсках павета — сялянскія камітэты.
1917 г., 30.10 (I.-II)	У Рэчыцы ўстаноўлена Савецкая ўлада.

Касцёл. Помнік архітэктуры XIX ст. (цяпер вітамінны бар)

1918 г., люты — 12.1. 1919 г.	Акупацыя Рэчыцы і павета войскамі кайзераўскай Германіі.
1919 г., сакавік	Стракапытаўскі мяцеж.
1919 г.	Рэчыца і павет аднесены да Гомельскай губерні і ўвайшлі ў РСФСР.
1920 г., 8.5—20.6	Акупацыя Рэчыцы і павета палякамі.
1926 г.	Рэчыцкі павет далучаны да БССР.
1929 г.	У вёсцы Азершчына пачала ўзводзіцца суднаверф. У раёне створаны першыя калгасы.

Вайсковыя могілкі ў гарадскім скверы

1930 г.	Адкрылася Рэчыцкае педагагічнае вучылішча. Пачала выходзіць газета «Рэчыцкая праўда».
1936 г., жнівень	У Рэчыцы адбыўся Усесаюзны злёт стаханаўцаў прадпрыемстваў па выпуску запалак. Першае выступленне Азершчынскага хору па рэчыцкім радыё.
1938 г., чэрвень	Пачала выходзіць раённая газета «Зара камуны».
1941 г., чэрвень—ліпень	Арганізаваны атрад мясцовай абароны і Рэчыцкі знішчальны батальён, Рэчыцкі партызанскі атрад. Баявыя дзеянні рэчыцкіх апалчэнцаў і партызан на тэрыторыі былога Парыцкага раёна (Светлагорскі раён).

Мемарыяльны комплекс у парку Перамогі

1941 г., 23.8—1943 г., 18.11	Акупацыя Рэчыцы і раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі.
1943 г., май—чэрвень	Карная аперацыя нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызан і мірнага насельніцтва Рэчыцкага раёна.
1943 г., верасень — лістапад	Карныя аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызан і мірнага насельніцтва Рэчыцкага раёна («Барбара», «Хубертус»).

Да чытача

Кніга, якую Вы трымаеце ў руках, незвычайная. Гэта гісторыка-дакументальная хроніка г. Рэчыцы і Рэчыцкага раёна. Пад яе вокладкай звесткі аб ваярах і працаўніках Рэчыцкай зямлі ад сівой мінуўшчыны і да сёння.

Нам, жыхарам Рэчыцы і раёна, ёсць чым ганарыцца і што шанаваць. Берагавая Слабада, Гарошкаў, Глыбаў, Калочын, Капань, Мілаград, Ліскі... Гэта не проста вёскі, а і старажытныя паселішчы, вядомыя не толькі навукоўцам ды знаўцам даўніны Рэспублікі Беларусь, але і далёка за яе межамі. Тут жылі нашы далёкія продкі, якія пакінулі пасля сябе багатую археалагічную спадчыну.

На працягу многіх стагоддзяў Рэчыцкая зямля была краем вялікіх, а яшчэ — крывавых і трагічных падзей. Тут праходзілі, ехалі ці плылі Дняпром не толькі багатыя купцы ды іншаземныя паслы, але і бязлітасныя заваёўнікі-рабаўнікі — татары, польскія магнаты, шведы ды французы, расійскія князі... Нішчыліся мястэчкі і вёскі, палілася Рэчыца. Але зноў і зноў яны адбудоўваліся, рабіліся прыгажэйшымі, чым былі дагэтуль.

Ужо ў бягучым стагоддзі зведала Рэчыцкая зямля кайзераўскую і польскую акупацыю. Зведала страшэнныя сталінскія рэпрэсіі. А наперадзе было яшчэ цяжэйшае выпрабаванне — вайна, Вялікая Айчынная.

Тысячы нашых землякоў пайшлі на фронт, у партызанскія атрады. Мала каторыя з іх вярнуліся дамоў цэлымі ды здаровымі. Як не ад краю і да краю свае Айчыны ды ўсяе Еўропы спяць яны вечным сном. Вечная памяць ім! А яшчэ ўдзячнасць — бязмежная і глыбокая...

Дзесяткі нашых вёсак былі спалены карнікамі разам з жыхарамі... І ім вечная памяць!

Залячыліся раны вайны. Зноў, як і дагэтуль, завіравала жыццё на Рэчыцкай зямлі. Мы сеялі, здабывалі нафту і спадарожны газ, узводзілі шматпавярховыя жылыя дамы, школы і палацы культуры, адбудоўвалі вёскі. А тут новая навала — Чарнобыль. І зноў патрэбна выстаяць.

...Гэта кніга не для лёгкага чытання. Яна — для глыбокага роздуму. Аб тым, што зроблена продкамі нашымі — мужнымі ваярамі ды рупнымі сейбітамі. Аб тым, што робім мы і што мусім зрабіць яшчэ, каб жыла ў вяках слава аб нашай зямлі, палітай багата і потам і крывёю.

* * *

Гісторыка-дакументальная хроніка Рэчыцы і раёна складзена на падставе шматлікіх архіўных дакументаў і матэрыялаў, публікацый з кніг, газет, часопісаў, успамінаў удзельнікаў і сведкаў гістарычных падзей — рэвалюцыі 1905—1907 гг., Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва, сталінскага беззаконня, Вялікай Айчыннай вайны, аднаўлення народнай гаспадаркі.

У кнізе выкарыстаны дакументы і матэрыялы: Нацыянальнага архіва РБ, Беларускага дзяржаўнага архіва, Беларускага дзяржаўнага гістарычнага архіва, шматлікіх расійскіх архіваў, ДА Гомельскай вобласці і яго філіялаў у Рэчыцы і Мазыры, Нацыянальнай бібліятэкі РБ, Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі, Гомельскага абласнога краязнаўчага музея, Рэчыцкага краязнаўчага музея, музеяў і куткоў народнай і баявой славы гаспадарак раёна, прадпрыемстваў, школ Рэчыцы і раёна.

РЭЧЫЦКІ РАЁН размешчаны ў цэнтральнай частцы Гомельскай вобласці, пераважна на правабярэжжы Дняпра. Утвораны 8.12.1926 г. Плошча 2,7 тыс. км^2. Населеных пунктаў 195 (1996), у тым ліку гарпасёлак Зарэчча, гарады Васілевічы і Рэчыца (цэнтр раёна). 20 сельсаветаў: Азершчынскі, Артукоўскі, Бабіцкі, Баршчоўскі, Бела-Балоцінскі, Вышамірскі, Глыбаўскі, Дземяхоўскі, Дубраўскі, Заспенскі, Жмураўскі, Камсамольскі, Капараўскі, Каравацінскі, Ліскаўскі, Нова-Барсуцкі, Перасвятоўскі, Ровенска-Слабодскі, Свірыдавіцкі, Холмецкі. 1 гарпасялковы Савет — Зарэчанскі, 2 гарсаветы — Васілевіцкі і Рэчыцкі. Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Гомельскага Палесся. Рэльеф раўнінны. Карысныя выкапні: нафта, спадарожны газ, торф, гліна, пясчана-жвіровы матэрыял. Сярэдняя тэмпература студзеня —6,7 °С, ліпеня +18,6 °С. Ападкаў 610 мм за год. Вегетацыйны перыяд 194 дні. Па тэрыторыі раёна цячэ Дняпро з прытокамі Бярэзіна і Ведрыч (правыя). Пад лесам 44,2 % тэрыторыі. Глебы сельскагаспадарчых угоддзяў дзярнова-падзолістыя (22,8 %), дзярнова-падзолістыя забалочаныя (38,2 %), дзярнова-балотныя (11,1 %), тарфяна-балотныя і алювіяльныя (27,9 %). З мінеральных глеб 28,7 % суглінкавых, 44,3 супясчаных, 27 % пясчаных. Асноўныя землекарыстальнікі — 26 калгасаў, саўгасаў, вучгас ПТУ-178, некалькі падсобных гаспадарак Рэчыцкіх і Гомельскіх прадпрыемстваў. Раён спецыялізуецца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, свінагадоўлі. Вырошчваюцца збожжавыя, бульба, лён і г. д. Саўгас «Іскра» — гаспадарка пладова-ягадная. У гарадах Васілевічы і Рэчыца звыш 20 прамысловых прадпрыемстваў. Асноўныя галіны прамысловасці: машынабудаўнічыя і металаапрацоўчыя, харчовая, хімічная, дрэваапрацоўчая, тэкстыльная, будаўнічых матэрыялаў. Транспарт чыгуначны, аўтамабільны, рачны. Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка і шаша Гомель — Калінкавічы. Ад Рэчыцы ідуць аўтамабільныя дарогі на Лоеў, Хойнікі, Бабруйск, Жлобін. Суднаходства па Дняпры і Бярэзіне. Выдаюцца газеты «Дняпровец», «Рэчыцкая газета».

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Ад сівой мінуўшчыны

Паводле археалагічных звестак, тэрыторыя сучаснай Гомельшчыны, у тым ліку і Рэчыцкага раёна, заселена чалавекам у сярэднім палеаліце (каля 100 тысяч гадоў назад). Гэта былі першабытныя плямёны паляўнічых. Яны ішлі з поўдня і паўднёвага ўсходу, рассяляліся ў асноўным па басейнах рэк. Найбольш старажытныя прылады працы сярэдняга палеаліту (мусцьерская культура) — адшчэпы, архаічныя пласціны, востраканечнікі, скрэблы, якія выраблялiся з мясцовага крэйдавага кременю.

Адной з ранніх з'яўляецца стаянка каля вёскі Берагавая Слабада. Яна адносіцца да позняга мезаліту (6—5-ае тысячагоддзі да н. э.), адкрыта беларускім археолагам У. П. Ксяндзовым у 1977 г.

Сярод рэчаў, якімі карысталіся нашы далёкія продкі,— крамянёвыя наканечнікі стрэл, разцы, скрабкі, скабялі, праколкі, сякерападобныя і клінападобныя прылады, пласціны. Менавіта ў перыяд мезаліту чалавек удасканальвае каменныя і касцяныя прылады працы, вынаходзіць лук і стрэлы, шырока займаецца паляваннем і рыбалоўствам, прыручае жывёлу. Для эпохі мезаліту характэрныя лёгкія наземныя будынападобныя жытлы з агнішчамі ў цэнтры.

Далейшае развіццё гаспадарчай дзейнасці, а разам з тым і новых форм грамадскай арганізацыі (станаўленне плямён, умацаванне парнай сям'і) падрыхтавала пераход да эпохі неаліту.

Новы каменны век, які носіць назву неаліт, пачаўся ў канцы 5-га — 4-ым тысячагоддзі да н. э. Для яго характэрна з'яўленне керамічнай вытворчасці, а ў канцы неаліту — авалоданне навыкамі земляробства і жывёлагадоўлі, прадзення, пляцення, магчыма, што і ткацтва. У 2-ой палове 5-га — канцы 3-га тысячагоддзя да н. э. правабярэжжа Дняпра і басейн ніжняй Прыпяці насялялі неалітычныя плямёны днепра-данецкай культуры. Інакш кажучы — культуры грабеньчата-накольчатай керамікі. Людзі выраблялі ў той час пераважна мікралітычныя крамянёвыя прылады працы, гліняны, з раслiннай дамешкай, пяску ці жарствы, посуд. Посуд гэты ўпрыгожваўся адбіткамі грэбеня, трохвугольнымі наколкамі і рыскамі, глыбокімі ямкамі пад краем. Нашы далёкія продкі, каторыя жылі падчас неаліту, карысталіся ўпрыгожваннямі ў выглядзе падвесак з зубоў аленя, іклаў дзіка, ракавін і г. д.

Шырокае прымяненне атрымалі каменныя сякеры, долаты, цеслы. Асаблівасцю іх вырабу становіцца шліфаванне і свідраванне.

На тэрыторыі Рэчыцкага раёна неалітычныя стаянкі адкрыты ў вёсках Борхаў, Горваль, Заспа, Чорнае, ва ўрочышчы Прудок, што на паўночна-ўсходняй ускраіне Рэчыцы.

У 2-ім тысячагоддзі да н. э. неалітычную эпоху змяніла эпоха бронзы. З'явіліся медныя і бронзавыя вырабы,

якія траплялі на нашу тэрыторыю пераважна шляхам абмену. Удасканальваецца апрацоўка каменных прылад працы. Разам з жывёлагадоўляй і земляробствам не губляюць свайго значэння і старажытнейшыя заняткі чалавека — паляванне, рыбная лоўля, збіральніцтва.

Пасяленні эпохі бронзы выяўлены ў вёсках Андрэеўка, Бязуеў, Борхаў, г. Васілевічы, Гарошкаў, Горваль, Капань, ур. Грушавіца на паўночнай ускраіне Рэчыцы, Заспа, Левашы, Чорнае, Якімаўка.

Новы перыяд у гісторыі нашых продкаў знамяную жалезны век, які на тэрыторыі Гомельшчыны пачаўся ў VII ст. да н. э. На змену каменным і бронзавым прыладам працы прыходзяць больш дасканалыя, вырабленыя з жалеза. Яно здабывалася з мясцовых балотных руд, апрацоўвалася ў домніцах — сырадутных печах. З вынаходствам і апрацоўкай жалеза асновай эканомікі старажытнага насельніцтва становіцца ляднае (падсечнае) земляробства. Дарэчы, развіццё такога земляробства павялічыла гаспадарчае значэнне жывёлагадоўлі. А гэта ў сваю чаргу забяспечыла атрыманне дадатковага прадукту, садзейнічала маёмаснай дыферэнцыяцыі і працэсу распаду першабытных адносін.

Помнікі ранняга жалезнага веку былі абследаваны ў паўднёвай Беларусі, у тым ліку і на тэрыторыі Рэчыцкага раёна, Славянскай экспедыцыяй Інстытута археалогіі АН СССР у 1951—1961 гг. Раскопкі каля вёсак Гарошкаў, Глыбаў, Горваль, Бязуеў, Борхаў, Мілаград і г. д. адкрылі шырокі малюнак жыцця старажытнага славянскага насельніцтва. Своеасаблівы характар матэрыяльнай культуры на тэрыторыі паселішчаў, аднароднасць яе сталі асноўнай прычынай таго, што археолагі назвалі яе «мілаградскай» — па назве аднаго са старажытных пасяленняў каля вёскі Мілаград.

Справаздача аб знаходках і адкрыццях, зробленых каля вёскі Гарошкаў Дняпроўскім атрадам Славянскай экспедыцыі, была змешчана ў рэспубліканскай газеце «Советская Белоруссия» ў нумары ад 4 снежня 1955 г.: «...Вывучэнне абарончых збудаванняў на гарадзішчы ў в. Гарошкаў Рэчыцкага раёна паказала, што, апрача валоў, якія неаднаразова падсыпаліся, пасяленне мела ўмацаваныя падсыпкай схілы. За валамі праходзілі тры глыбокія канавы, раздзеленыя землянымі грабянямі, на якіх, мабыць, стаялі агароджы. Увесь комплекс знаходак гэтых абарончых збудаванняў дазваляе меркаваць аб даволі высокім узроўні развіцця прадукцыйных сіл.

На пасяленнях «мілаградскай культуры» ўскрыта плошча больш за 4000 кв. м. Выяўлены шматлікія сляды жыцця, вытворчыя памяшканні, надворныя будынкі, гаспадарчыя ямы, збудаванні, звязаныя са старажытнымі рэлігійнымі ўяўленнямі насельніцтва.

Сярод жылля пераважалі дамы на слупах характэрнай канструкцыі — з выступам па адной са сцен і павеццю або прыбудовай па другой сцяне. У цэнтры дома звычайна ёсць яма ад слупа, каторы падтрымліваў дах. Апрача наземнага жылля насельніцтва карысталася таксама жыллём, паглыбленым у зямлю, і зямлянкамі. У жыллі ёсць звычайна ачаг у выглядзе абпаленых каменняў у невялікай ямцы.

Найбольш распаўсюджанымі знаходкамі з'яўляюцца абломкі глінянага посуду.

Сярод знаходак з металу, выяўленых пры раскопках, першае месца належыць знойдзенаму на гарадзішчы ў в. Гарошкаў скарбу бронзавых і сярэбраных бранзалетаў. Скарб выяўлены на падлозе надворнага будынка, непадалёку ад жылля. Умовы яго знаходкі і тое, што скарб не быў узяты чалавекам, які паклаў яго, *побач з шэрагам* іншых абставін дазваляюць меркаваць раптоўны напад на гарадзішча, у выніку якога частка яго насельніцтва была знішчана, а само гарадзішча, мабыць, было пакінута. Выяўлены пры раскопках вала на яго старадаўняй паверхні шкілет жыхара, загінуўшага пры абароне паселі-

шча. Знойдзеныя бранзалеты вызначаюцца высокай тэхнікай выканання. Прыменены пры вырабе рэчаў тэхнічныя прыёмы (напайванне на шпень дробных зубцоў) гавораць аб высокім майстэрстве выканаўцаў.

Тады, у час раскопак, былі знойдзены ліцейныя формы для адліўкі ўпрыгожанняў, маленькі тыгель — пасудзіна для плаўкі металу са слядамі медзі на дне, коўшыкі для разліўкі металу і г. д. Гэта дало археолагам падставы для заключэння: метал апрацоўваўся на тэрыторыі гарадзішча.

Сярод металічных знаходак былі сярпы, нажы, шпількі і іголкі, завушніцы і інш. Побач з металічнымі прыладамі працы людзі працягвалі карыстацца і прыладамі з каменю.

Шэраг знаходак дазволіў зрабіць і вывад аб тым, што больш шырокае распаўсюджанне набывае земляробства. Так, акрамя сярпоў, у жыллі часта трапляліся зернецёркі. На адной з пасудзін захаваўся адбітак зерня пшаніцы. Аб жывёлагадоўлі сведчылі косці жывёлы: буйной і дробнай рагатай, коней, свінней, сабак. А вось знойдзеныя косці зубра, лася, дзіка, барсука ўказвалі на тое, што старажытнае насельніцтва, як і дагэтуль, займалася паляваннем.

За валамі гарадзішча ў Гарошкаве археолагі адшукалі шматлікія ямкі з разбітымі пасудзінамі. Некаторыя з іх былі напоўнены моцна перапаленымі касцямі. Быў раскапаны і доўгі дом, які таксама меў перапаленыя косці. Мяркуецца: збудаванне звязана з пахавальным абрадам.

У 1955 г. Дняпроўскі атрад правадзіў на тэрыторыі Рэчыцкага раёна раскоп і больш позняга пасялення. На гарадзішчы каля вёскі Калочын, якое адносіцца, па ўсёй верагоднасці, да першых стагоддзяў н. э., было раскапана збудаванне, што цягнулася па краі гарадзішча. Знойдзены жалезнае кап'ё, кручкі для лоўлі рыбы, іншыя рэчы.

Сваю работу на тэрыторыі раёна Славянская экспедыцыя Інстытута ар-



Бранзалеты (гарадзішча Гарошкаў. Раскопкі В. М. Мельнікоўскай)



Жалезныя прылады працы мілаградскай культуры, знойдзеныя пры раскопках В. М. Мельнікоўскай на Гарошкаўскім гарадзішчы



Гарадзішча Калочын

Речицкая РЦБС
Гомельской области



План гарадзішча Калочын

хеалогіі АН СССР праводзіла і ў наступныя гады.

Былі новыя адкрыцці. Адно з іх зрабіў Палескі археалагічны атрад па вывучэнні ранняга жалезнага веку паўднёва-ўсходняй Беларусі аддзела археалогіі Інстытута гісторыі Акадэміі навук, які распачаў у нас сваю работу летам 1980 г.

Археолагаў зацікавіла старажытнае паселішча, якое было выяўлена Г. В. Штыхавым за тры кіламетры на поўдзень ад вёскі Ліскі, на правым беразе рэчкі Ведрыч, і размяшчалася на пясчаным узвышшы сярод поплаву за 50 м ад рэчкі.

У раскопе плошчай 500 кв. м археолагі выявілі каля 10 тысяч абломкаў хатняга посуду, 37 кг 785 г сыравіны для апрацоўкі жалеза, вырабы з каменю і крэменю (пракрутка, нож, скрабок, пласціны, адшчэпы), бронзы (фібула, палова бранзалета, бляшка з вушкам), жалеза (серп, нажы, цвікападобныя скіфскія шпількі), гліны (грузікі, праселкі). Але сапраўднай творчай удачай можна лічыць знаходку двух бронзавых люстэркаў: адно дыяметрам 105 мм, другое — 83 мм.

Дарэчы, бронзавыя люстэркі дагэтуль яшчэ ні разу не трапляліся на тэрыторыі рэспублікі. Аналагічныя люстэркі шырокае распаўсюджанне мелі ў V — III стст. да н. э. сярод скіфаў, якія займалі правабярэжжа Сярэдняга Прыдняпроўя. Што да люстэрак з Ліскаўскага паселішча, то, па заключэнні археолага М. І. Лашанкова, іхні ўзрост можна датаваць другой паловай VI — першай паловай V ст. да н. э., а патрапілі яны ў Ліскаўскае гарадзішча як вынік гандлёвых сувязяў нашых далёкіх продкаў са скіфамі.

Такім чынам, можна смела сцвярджаць: раскоп Ліскаўскага гарадзішча дазволіў беларускім вучоным адгарнуць адну з найбольш ранніх старонак гісторыі нашага паходжання.

З сярэдзіны III ст. да н. э. у верхнім і сярэднім Падняпроўі, у тым ліку і на тэрыторыі Рэчыцкага раёна, дзе раней жылі плямёны мілаградскай культуры, склалася зарубінецкая культура. Храналагічна яна падзяляецца на ранні і позні этапы. На раннім этапе, а гэта сярэдзіна III ст. да н. э. — пачатак II ст. н. э., культура зарубінецкіх плямёнаў нагадвае мілаградскую. І найперш па характары жытлаў і пахавальным абрадзе.

Асноўным відам пасяленняў з'яўляліся гарадзішчы, адбудаваныя яшчэ плямёнамі мілаградскай культуры. Гарадзішчы дадаткова ўмацоўваліся. Так, дасыпаліся старыя валы, узводзіліся новыя, утвараючы яшчэ адну лінію абароны. Каля некаторых такіх гарадзішчаў узнікалі селішчы (в. Капань). Пахавальны абрад — трупаспаленне на гарызонце на бескурганных могільні-

Жыллё на Мілаградскім селішчы на поўнач ад гарадзішча. Ранні жалезны век

Ачаговая яма і жыллё. Мілаградскае гарадзішча. Ранні жалезны век

ках. Сярод пахавальнага інвентару (прылады працы, упрыгожанні і інш.) часта трапляецца кераміка — міскі, гаршкі.

На познім этапе (II — V стст. н. э.) людзі жылі на селішчах, што размяшчаліся на нізкіх берагах рэк. Звычайна выбіралася месца з урадлівай глебай.

Нашы продкі пад той час падтрымлівалі гандлёвыя сувязі з паўночнымі правінцыямі Рымскай імперыі, з плямёнамі чарняхоўскай культуры.

Грамадскі лад позняга этапу зарубінецкай культуры — развіты патрыярхат. Асноўная адзінка грамадства — патрыярхальная сям'я налічвала дзесяткі чалавек. Некалькі сем'яў у сваю чаргу стваралі патрыярхальны род.

Плямёны зарубінецкай культуры знаходзіліся на стадыі распаду першабытнаабшчыннага ладу і складання тэрытарыяльнай абшчыны. У іх існавала патрыярхальнае рабства.

Большасць даследчыкаў лічаць: плямёны зарубінецкай культуры з'яўляліся старажытнаславянскімі.

Э. М. Загарульскі (Древняя история Белоруссии. Мн.: 1977. С. 29—31) прытрымліваецца думкі, што адкрытая тэрыторыя Беларусі з наяўнасцю вялікіх рэк давала магчымасць засяленню яе насельнікамі розных тэрыторый (Украіна, Польшча, Цэнтральная Еўропа). Па-другое, ніводная з гэтых груп мігрантаў не была настолькі вялікай, каб засяліць значную тэрыторыю, заняўшы дамінуючае становішча над іншымі.

Выдатны даследчык гісторыі Беларусі Мікола Іванавіч Ермаловіч упэўнены: ніякія перасяленні не маглі поўнасцю змяніць насельніцтва той ці іншай тэрыторыі, што пэўная частка яго захоўвалася і пасля змешвалася з прышлым. Значыць, у той ці іншай ступені продкамі беларусаў былі ўсе плямёны, якія жылі тут у даіндаеўрапейскі перыяд. З'яўленне ж славянаў на Беларусі стала вынікам апошніх хваляў вялікага перасялення народаў, якімі былі рух готаў (II — III стст. н. э.) і нашэсці гунаў (IV ст. н. э.) і авараў (сярэдзіна IV ст. н. э.).

У выніку складаных этнічных працэсаў у IX ст. на тэрыторыі Беларусі сфарміраваліся ўсходнеславянскія плямёны крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў.

Непасрэднымі продкамі сучасных жыхароў Рэчыцкага раёна з'яўляюцца дрыгавічы. Назву дрыгавічоў старажытны летапісец выводзіў ад «дрыгвы», якая была характэрнай асаблівасцю мясцовасці, дзе яны аселі.

Густынскі летапіс, ведучы гаворку пра дрыгавічоў, зазначыў: яны рассяліліся паміж Прыпяццю, Дняпром і Дзвіною. Тым самым, у адрозненне ад іншых летапісаў, адзначана ўсходняя мяжа рассялення дрыгавічоў. Але ж усходняя мяжа тэрыторыі Рэчыцкага раёна праходзіць далей, чым «паміж Пры-

пяццю, Дняпром і Дзвіною». Гэта дае падставы для меркавання: тэрыторыю Баршчоўскага і Белабалоцінскага сельсаветаў, хутчэй за ўсё, насялялі радзімічы. Паводле летапісных легенд, радзімічы прыйшлі з прапольскіх (ляшскіх) зямель. Родапачынальнік іхні — Радзім. Праўда, археалагічныя матэрыялы гэтага не пацвярджаюць. Археалагічныя помнікі славянскіх плямёнаў дрыгавічоў і радзімічаў — гарадзішчы, селішчы, курганныя могілкі.

Дрыгавічы згадваюцца ў «Аповесці мінулых часоў». Упамінаюцца ў сувязі з падзеямі, што мелі месца да IX ст.

Дакладная дата першага ўпамінання ў рускіх летапісах аб дрыгавічах адсутнічае. Першым дакладным пісьмовым паведамленнем аб іх можна лічыць упамінанне Канстанціна Парфірародната, які называе дрыгавічоў у ліку славян, якія плацілі даніну кіеўскаму князю. Чарговае летапіснае ўпамінанне аб іх адносіцца да 1116 г., калі мінскі князь «Глеб бо бяше воевал дреговичи и Случеск пожог». У апошні раз на старонках рускіх летапісаў яны, дрыгавічы, названы ў 1149 г. Падкрэсліваецца: дрыгавічы належалі да найбольш развітых у сацыяльных адносінах плямён, знаходзіліся на заключнай стадыі распаду родаплемяннога ладу, мелі сваё палітычнае аб'яднанне — «княжанне» з цэнтрам у Тураве.

Дрыгавічы займаліся земляробствам, шырока развілі жывёлагадоўлю, гандлявалі. Ім было вядома ткацкае рамяство. Разам з тым славіліся ганчарамі, кавалямі, ювелірамі.

Увогуле, дрыгавічы былі неваяўнічымі плямёнамі. Ва ўсялякім разе, знаходкі зброі ў іхніх курганах уяўляюць вялікую рэдкасць.

Курганныя могільнікі дрыгавічоў у Рэчыцкім раёне выяўлены каля вёсак Глыбаў, Горваль, Крынкі, Луначарск, Крапіўня.

Што да радзімічаў, якія, як указвалася вышэй, маглі насяляць тэрыторыю Баршчоўскага і Белабалоцінскага сельсаветаў, то ў апошняй чвэрці 1-га тысячагоддзя н. э. яны склалі племянны саюз, амаль да канца X ст. н. э. захоўвалі адносную самастойнасць. Мелі сваё войска, князёў. У IX ст. плацілі даніну Хазарскаму каганату. У 885 г. падпалі пад уладу кіеўскага князя Алега, у складзе ягонага войска ў пачатку X ст. удзельнічалі ў шырока вядомым паходзе на Царград. У 984 г., як вядома з гістарычных крыніц, радзімічы адмовіліся плаціць даніну кіеўскаму князю Уладзіміру Святаслававічу. Князь выправіў ва ўладанні радзімічаў войска на чале з ваяводам Воўчым Хвастом. На рэчцы Пяшчанка (прыток Сожа, непадалёку ад Слаўгарада) ваяры князя разбілі дружыны радзімічаў.

У склад старажытнарускай дзяржавы Кіеўскай Русі тэрыторыя пасялення дрыгавічоў і радзімічаў увайшла ў канцы IX — X стст. У яе межах усходнеславянскія плямёны, якія мелі шмат агульнага, складваліся ў адзіную старажытную народнасць. Гэта было абумоўлена іх адноснымі эканамічнымі сувязямі, этнічнай, тэрытарыяльнай, культурнай і моўнай супольнасцю.

На працягу XI — XIII стст. рэчыцкія землі належалі ў асноўным кіеўскім і чарнігаўскім князям.

На жаль, далёка не ўсё вядома з гісторыі Рэчыцы. Лічылася, што першае ўпамінанне аб ёй знаходзіцца ў 1-ым Наўгародскім летапісе пад 1214 г. Тады Рэчыца ўяўляла сабой пагранічны горад Чарнігаўскага княства. Зараз лічыцца, першае ўпамінанне аб ім у Густынскім летапісе пад 1213 г.

Бясспрэчна наступнае: Рэчыца належыць да ліку старажытных паселішчаў усходнеславянскага племя дрыгавічоў. Яшчэ ў IX ст., а магчыма, і раней, на крутым правым беразе Дняпра ўзнікла паселішча, якое з'яўлялася гандлёвым пунктам на вялікім водным шляху «з варагаў у грэкі».

Прыток Дняпра — Рэчыца, ад якога і ўтварылася назва горада, у старажытнасці, па ўсёй верагоднасці, быў даволі суднаходнай рэчкай, па якой нашы продкі сплаўлялі ў Дняпро драўніну.

Па плану горада Рэчыцы XVII ст., які прыводзіць Ю. А. Ягораў у сваёй кнізе «Градостроительство Белоруссии», якая ўбачыла свет у 1954 г. ў Маскве ў Дзяржаўным выдавецтве літаратуры па будаўніцтву і архітэктуры, можна дакладна ўстанавіць старое рэчышча Рэчыцы. Дарэчы, яшчэ да нядаўняга часу па гарадскім выгане працякаў невялікі ручай, які, па ўсёй верагоднасці, і ўяўляў сабой тое, што засталося ад былой паўнаводнай Рэчыцы.

У названай вышэй рабоце Ю. А. Ягорава выказваецца думка: Уваскрасенская царква пабудавана ў Рэчыцы яшчэ ў 1079 г. Да 1872 г. яна лічылася саборнай. У 1876 г. была разабрана і перанесена на могілкі.

У сярэдзіне XII ст. Рэчыца ўваходзіла ў Пінска-Тураўскае княства, а ў канцы XII і першай палавіне XIII ст. належала Чарнігаўскаму княству.

Доўгі час археалагічныя помнікі Рэчыцы заставаліся невядомымі навуцы. І толькі ў 1932 г. беларускі археолаг І. Х. Юшчанка адшукаў на правым беразе Дняпра ў межах горада (урочышча Царквішча) прадметы сярэдневяковага часу. У 1957 г. на вуліцы Лугавой у час ускопвання агарода на глыбіні 20—25 см быў знойдзены каменны тапор эпохі бронзавага веку, а пры раскопках у парку над Дняпром — старажытнаруская цагліна. Абследаванне Рэчыцкага гарадзішча ва ўрочышчы Старая Крэпасць правёў археолаг Э. А. Сымановіч. Ён і вызначыў: летапісны горад Рэчыца знаходзіўся менавіта на гэтым месцы.

У пачатку 1989 г. археалагічныя вышуканні ў Рэчыцы правёў аддзел археалогіі Гомельскага абласнога краязнаўчага музея. Пошукавыя шурфы былі закладзены каля паўднёва-заходняга боку гарадзішча. Пад пластом грунту XIX — XX стст. і будаўнічага смецця ўдалося адшукаць рэшткі пабудовы канца XIV — пачатку XV ст. Былі знойдзены: ключ ад старажытнарускага навяснога замка XIII — XIV стст., шматлікія абломкі глінянага посуду XII — XVIII стст., манеты позняга сярэднявечча. Увесь комплекс археалагічных матэрыялаў сведчыць аб бурным развіцці Рэчыцы, пачынаючы з XII ст.

Удзельнікі раскопу 1989 г. зрабілі вывад: тэрыторыя летапіснага горада не абмяжоўвалася невялікім гарадзішчам Старая Крэпасць, якое было ўмацавана драўляна-земляным валам і глыбокім абарончым ровам. Да гарадзішча-дзядзінца прымыкала другая частка горада — навакольны горад. Ён, напэўна, меў уласны пояс абароны, а таксама неўмацаваны пасад, дзе і жыла значная частка насельніцтва.

Рэчычане не забываюць аб сваёй гісторыі. На гарадзішчы ўстаноўлены маляўнічы мемарыяльны знак «Помнік археалогіі». Пры праектаванні новага будаўніцтва ў межах горада ўлічваецца ахоўная археалагічная зона, кожны лапік якой можа «адгарнуць» новую, невядомую пакуль старонку ўзнікнення старажытнай Рэчыцы.

Падрыхтавалі да друку
П. П. Рабянок, І. А. Шафір

Асноўныя археалагічныя помнікі на тэрыторыі Рэчыцы і раёна

г. Рэчыца

Гарадзішча. У гарадскім парку, на правым беразе Дняпра.

Амаль прамавугольная пляцоўка памерам 75×45 м, з заходняга, усходняга і паўднёвага бакоў умацавана валам вышынёй 2 м. З поўначы гарадзішча абмываецца ракой. З заходняга і ўсходняга бакоў глыбокія яры. Даследавалі ў 1957 г. Э. А. Сімановіч, у 1976 г. Г. В. Штыхаў. У адхоне выяўлены культурны пласт 1,6 м, з праслойкамі попелу і вугольля. На глыбіні 1,2 м знойдзена кераміка XIII—XIV стст., не-

калькі кавалкаў ляпнога посуду. Гарадзішча адносіцца да ранняга жалезнага веку і эпохі Кіеўскай Русі. У XIII ст. тут быў дзядзінец горада.

Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь і Рэчыцкім краязнаўчым музеі.

Паселішча. На паўночна-ўсходняй ускраіне горада, за 0,6 км на ўсход ад ільнозавода, ва ўрочышчы Прудок. Адкрыў і даследаваў у 1981 г. на плошчы 1200 м^2 У. П. Ксяндзоў. У культурным пласце 0,1 м выяўлены крамянёвыя наканечнікі стрэл грэнскага тыпу, ланцэтападобныя прылады працы, вастрыі з пукатай і прамой спінкамі, скрабкі, скрэблы, разцы, свярдзёлкі — пакруткі, пласціны з рэтушшу, адшчэпы, рэтушоры, адбойнікі, нуклеусы і інш. Адносіцца да эпохі мезаліту (9—5-ае тысячагоддзі да н. э.).

в. Азершчына, цэнтр сельсавета

Паселішча. За 0,3 км на захад ад вёскі, на правым беразе р. Ведрыч. Памеры 100×50 м. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У. П. Ксяндзоў. У культурным пласце 0,2 м знойдзены 12 крамянёвых ножападобных пласцін, 15 адшчэпаў, скрабок, рэшткі ляпной керамікі. Адносіцца да каменнага веку. Раскопкі не праводзіліся.

в. Акцябр, Камсамольскі сельсавет

Гарадзішча. За 1 км на паўночны захад ад вёскі. Чатырохвугольная пляцоўка памерам 60×45 м абнесена валам вышынёй 2 м. Ніжэй яго прыкметы рэшткі другога вала, насыпанага з культурнага пласта. Адкрыў і абследаваў у 1976 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Баршчоўка, цэнтр сельсавета

Курганны могільнік. За 1,5 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Курганне, каля могілак. 65 насыпаў вышынёй 0,5—2,2 м, дыяметрам 10—15 м. Вядомы з 1885 г. Абследавалі ў пачатку XX ст. Е. Р. Раманаў, у 1976 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Берагавая Слабада, Глыбаўскі сельсавет

Курганны могільнік. За 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, на беразе Дняпра. 4 насыпы вышынёй 1,5 м, дыяметрам каля 10 м. Выявіў і абследаваў у 1976 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

Паселішча. На заходняй ускраіне вёскі, на другой надпоймавай тэрасе Дняпра, на вышыні 2 м над межанным узроўнем вады ў рацэ ў летні перыяд. Выявіў у 1977 г. і даследаваў у 1978—1983 гг. У. П. Ксяндзоў. Культурны пласт 0,3 м прасочаны ўздоўж берага на працягу 1 км (глыбіня залягання 0,2—0,5 м ад паверхні). У 3 раскопах агульнай плошчай 448 м^2 ускрыта частка мезалітычнага гаспадарча-бытавога комплексу. Выяўлены рэшткі злёгку заглыбленага ў зямлю прамавугольнага жытла памерам 4×4 м. Вакол яго ямы авальнай і круглай формы з пакатымі сценамі і чашападобным дном, прасочаны 2 паглыбленні, запоўненыя попелам і драўнінным вугалем (рэшткі агнішчаў). У культурным пласце знойдзены 3841 крамянёвы выраб: нуклеусы, адшчэпы, пласціны, наканечнікі стрэл, скрабкі, разцы, сякерападобныя прылады працы з выемкамі, праколкі, трапецыі і інш. Адносіцца да верхнедняпроўскай культуры позняга мезаліту, датуецца 6—5-ым тысячагоддзямі да н. э.

Матэрыялы даследаванняў захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь.

в. Борхаў, Баршчоўскі сельсавет

Гарадзішча. За 3 км на поўдзень ад вёскі, сярод балота.

Пляцоўка прамавугольнай формы з закругленымі вугламі, памерам 60×30 м, абнесена валам вышынёй 1 м. Вядома з 1910 г. Даследавана ў 1955 і 1959 гг. В. М. Мельнікоўскай. На плошчы 34 м^2 быў ускрыты культурны пласт каля 0,6 м. Выяўлены рэшткі пабудовы памерам 3,2×3,2 м. Знойдзены абломкі ляпнога глінянага посуду, 7 прасліц, жалезная шпілька. У 1976 г. гарадзішча абследаваў Г. В. Штыхаў. Помнік адносіцца да мілаградскай культуры, датуецца VII — III стст. да н. э.

в. Валадарск, Глыбаўскі сельсавет

Гарадзішча. За 2 км на поўдзень ад вёскі, сярод балота. Пляцоўка авальная, абнесена 2 валамі. Вышыня ўнутранага вала каля 2 м, вонкавага — 0,5 м. Абследавалі ў 1958 г. В. М. Мельнікоўская, у 1976 г. Г. В. Штыхаў. Культурны пласт 0,3 м. Знойдзены рэшткі ляпной керамікі. Адносіцца да мілаградскай культуры. Датуецца VII — III стст. да н. э. Раскопкі не праводзіліся.

Курганны могільнік. За 1,5 км на поўдзень ад вёскі, каля лясной дарогі, ва ўрочышчы Усобіна. 70 курганоў вышынёй 0,5—1,5 м, дыяметрам 8—10 м. Каля асобных насыпаў ёсць раўкі. Выявіў і абследаваў у 1976 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце археалогіі АН Рэспублікі Беларусь і Інстытуце гісторыі Рэспублікі Беларусь.

в. Васількова, Дуброўскі сельсавет

Курганны могільнік. За 1 км на ўсход ад вёскі, на ўзлессі. 19 курганоў вышынёй 1—1,7 м, дыяметрам 8—20 м. Выявіў у 1976 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

Пас. Гагалі, Камсамольскі сельсавет

Паселішча. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, на першай надпоймавай тэрасе правага берага р. Бярэзіны. Выявіў у 1977 г. У. П. Ксяндзоў. На плошчы 150 м² прасочаны культурны пласт 0,15 м. Знойдзены крамянёвыя вырабы (адшчэпы, пласціны) і рэшткі ляпной керамікі. Помнік адносіцца да бронзавага веку, датуецца 2-ім — 1-ым тысячагоддзямі да н. э. Раскопкі не праводзіліся.

в. Гарошкаў, Заспенскі сельсавет

Гарадзішча. У вёсцы, на правым беразе р. Дняпро, ва ўрочышчы Гарадок. Складаецца з 2 пляцовак, умацаваная 2 валамі. Унутраны вал абмяжоўваў малую пляцоўку (памеры 100×25 м) амаль трохвугольнай формы. Вонкавы вал размяшчаўся за 65—70 м ад унутранага. Пляцоўка паміж валамі памерам 140×70 м. Вышыня ўнутранага вала 2 м, вонкавага 3,5 м. Гарадзішча разам з



Гарадзішча ў в. Гарошкаў. Ранні жалезны век



План і разрэз зарубінецкага жылля (в. Гарошкаў. Заштрыхаваны ямы ад слупоў)

2 пляцоўкамі і валамі займае плошчу каля 2 га. Адкрыў у канцы XIX ст. У. З. Завітневіч, абследавалі ў 1935 г. А. Дз. Каваленя, у 1952 г. Ю. У. Кухарэнка, у 1964—1967 гг. Л. Д. Побаль, у 1976 г. Г. В. Штыхаў, даследавала ў 1954—1961 гг. В. М. Мельнікоўская. У час раскопак выяўлены рэшткі жытлаў, якія размяшчаліся скучана на цэнтральнай частцы пляцоўкі. Даследавана 20 жытлаў. Яны слупавой канструкцыі, у плане квадратныя ці прамавугольныя, зрэдку з закругленымі вугламі, плошчай 12—16 м², заглыблены ў мацярык на 0,15—0,5 м, разлічаны на адну сям'ю. Для будаўніцтва сцен выкарыстоўвалі 2 прыёмы: плятнёвы, калі паміж слупамі ставіўся шчыльны пляцень, і замацаванне паміж слупамі тонкага бярвення, пакладзенага гарызантальна. Двухсхільны дах на парных сохах — высокіх слупах з развілкай — у сярэдзіне жылля падтрымліваўся цэнтральным слупам. Уваход рабілі ў сцяне ці ў вугле. Агнішчы адкрытыя, размешчаныя паміж цэнтральным слупам і сцяной. Двары абгароджвалі

плятнём. Характэрная асаблівасць жытлаў — наяўнасць выступу прамавугольнай, круглай ці авальнай формы ў адной з сцен або вуглоў. Даследавана пабудова (даўжыня 8,5 м, шырыня да 3 м), верагодна, культавага прызначэння. Яна была заглыблена ў мацярык на 0,5 м. Выяўлена двухкамерная вытворчая пабудова. Каля кожнага жытла быў невялікі склеп, які ўяўляў сабой яму з прыступкамі і пакрыццём у выглядзе будана. У 4 ямах знойдзены скарбы: у 1 — жалезныя земляробчыя прылады працы, у 3 іншых — жаночыя ўпрыгожанні. На гарадзішчы знойдзены таксама 14 сярпоў, дзесяткі нажоў і тачыльных брускоў, 30 бронзавых бранзалетаў, падвескі, кольцы, латэнскія фібулы, шпількі некалькіх тыпаў (посахападобныя, гальштацкія і інш.), каля 100 грэчаскіх пацерак са шкла, сотні грузікаў і прасліц, каля 90 гліняных фігурак жывёл, пераважна коней, тыглі, льячкі, ліцейныя формы, шмат вырабаў з металу, каменю, косці, рога. Помнік адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур, датуецца IV — I стст. да н. э.

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь, Інстытуце археалогіі АН Рэспублікі Беларусь, у Гомельскім і Рэчыцкім краязнаўчых музеях.

Бескурганны могільнік-1. Паміж 2 валамі гарадзішча. Даследаваны ў 1954, 1955, 1959—1961 гг. В. М. Мельнікоўскай. Раскапана каля 100 пахаванняў. Трупаспаленні знаходзіліся ў круглых ці прадаўгаватых ямах глыбінёй 0,2—0,5 м. Знойдзены гліняны ляпны посуд, жалезны наканечнік стралы, бронзавае кольца з выступамі, прасліцы. Адносіцца да мілаградскай культуры.

Бескурганны могільнік-2. За 0,1 км на поўнач ад вонкавага вала гарадзішча. Адкрыла і раскапала ў 1958 г. В. М. Мельнікоўская. Даследавана 5 пахаванняў. Знойдзены гліняны ляпны посуд, наканечнік кап'я, нож, фібула, бронзавы ланцужок. Адносіцца да зарубінецкай культуры, датуецца I ст. да н. э.

Матэрыялы раскопак могільнікаў знаходзяцца ў Інстытуце археалогіі АН Рэспублікі Беларусь.

в. Гіроў, Белабалоціцкі сельсавет

Гарадзішча. За 4 км на поўнач ад вёскі, на левым беразе Дняпра, сярод балота. Пляцоўка авальная, памерам 75×60 м, умацавана 2 валамі. Вышыня ўнутранага вала 1,5 м, вонкавага 2 м. Вядома з 1910 г. Абследавалі ў 1955 г. В. М. Мельнікоўская, у 1976 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Глыбаў, цэнтр сельсавета

Гарадзішча. На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі. Пляцоўка памерам 160×110 м абнесена дугападобным валам вышынёй больш за 2 м. Даследавала ў 1955 г. В. М. Мельнікоўская. Раскапана 200 м² плошчы. У культурным пласце 0,5 м выяўлены рэшткі 2 жытлаў, знойдзена ляпная керамі-ка, прасліцы, грузікі. У 1976 г. гарадзішча абследаваў Г. В. Штыхаў. Адносіцца да мілаградскай (VII — III стст. да н. э.) і зарубінецкай (II ст. да н. э.— V ст. н. э.) культур.

Могільнік-1. На тэрыторыі сучасных каталіцкіх могілак. 4 насыпы вышынёй 1,5—2 м, дыяметрам 10—12 м. У 1958 г. С. С. Шырынскі даследаваў адзін курган. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў яме пад насыпам. Знойдзены рэшткі ганчарнага посуду, бронзавыя ўпрыгожанні. У 1976 г. могільнік абследаваў Г. В. Штыхаў. Ён прыйшоў да вываду, што могільнік належаў дрыгавічам, датуецца ён XII — пачаткам XIII ст.

Могільнік-2. За 0,2 км на поўнач ад гарадзішча. Захаваліся тры курганы вышынёй 1,5—2 м, дыяметрам 10—12 м. Раней курганоў было 9. У 1958 г. два курганы абследаваў С. С. Шырынскі. Пахавальны абрад — трупапалажэнне ў ямах пад насыпам. Знойдзены ўпрыгожанні з бронзы, шкляныя пацеркі, бронзавы крыжык, аздоблены выемчатай эмаллю. У 1976 г. могільнік абследаваў Г. В. Штыхаў і зрабіў вывад, што могільнік належаў дрыгавічам, датуецца XII ст.

Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце археалогіі АН у Маскве.

в. Горваль, Глыбаўскі сельсавет

Гарадзішча. За 1,5 км на поўдзень ад вёскі. Пляцоўка трохвугольная, плошчай 600 м². З боку поля ўмацавана валам вышынёй 1,5 м, даўжынёй 25 м і ровам глыбінёй 5 м. У 1958 г. гарадзішча даследавала В. М. Мельнікоўская, а ў 1976 г.— Г. В. Штыхаў. Культурны пласт 0,6 м. Знойдзены рэшткі ляпнога посуду, а таксама ганчарнай керамікі эпохі Кіеўскай Русі.

Усе знаходкі размяшчаліся ў верхняй частцы могільніка. Адносіцца да мілаградскай (VII – III стст. да н. э.), зарубінецкай (II ст. да н. э.) культур і да эпохі Кіеўскай Русі (XI – XIII стст.).

Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце археалогіі АН у Маскве і Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь.

Курганны могільнік. За 0,3 км на ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Бярэзіна. 30 насыпаў вышынёй 0,5–2 м, дыяметрам 9–12 м. У 1958 г. могільнік абследавала В. М. Мельнікоўская, а ў 1976 г. – Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

Стаянка. У цэнтры вёскі. Выявіў і абследаваў у 1977 г. У. П. Ксяндзоў. На плошчы 800 м^2, на дзюне знойдзены крамянёвыя скрабкі, наканечнікі стрэл, ножападобныя пласцінкі, фрагменты грабеньчата-ямачнай керамікі. Адносіцца да эпохі неаліту, датуецца 4-ым – 2-ім тысячагоддзямі да н. э. Раскопкі не праводзіліся.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь.

в. Завужаль, Холмецкі сельсавет

Гарадзішча. На паўднёвай ускраіне вёскі, на беразе Дняпра, побач з могілкамі. Вышыня пляцоўкі над навакольлем каля 15 м.

Пляцоўка чатырохвугольная, з закругленым паўднёва-ўсходнім вуглом, памерам 75×75 м. З боку поля ўмацавана дугападобным валам вышынёй 1,5–3 м, даўжынёй каля 100 м. З заходняга і ўсходняга бакоў – ровы. Вядома з канца XIX ст. У 1958 г. абследавала В. М. Мельнікоўская, у 1964 г. Л. Д. Побаль, у 1976 г. Г. В. Штыхаў. У культурным пласце 0,3–0,4 м выяўлены рэшткі ляпнога посуду і ганчарная кераміка (у верхняй частцы). Адносіцца да мілаградскай (VII – III стст. да н. э.) і зарубінецкай (II ст. да н. э. – V ст. н. э.) культур, а таксама да эпохі Кіеўскай Русі. Раскопкі не праводзіліся.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце археалогіі АН у Маскве і Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь.

г. Калочын, Холмецкі сельсавет

Гарадзішча-1. За 0,5 км на поўнач ад вёскі, на правым беразе Дняпра. Пляцоўка памерам 42×36 м умацавана 2 падковападобнымі валамі, вышыня ўнутранага вала 3,5 м, вонкавага 1,1 м. Даследавалі ў 1951 г. Ю. У. Кухарэнка, у 1955 г. В. М. Мельнікоўская, у 1955–1960 гг. Э. А. Сымановіч. Раскапана 1332 м^2 плошчы. Знойдзены гліняны посуд і біканічныя гаршкі з валікам, жалезныя сярпы, нажы, шылы, долата, гліняныя прасліцы, зерняцёрка. Адносіцца да VI – IX стст. Знойдзены і больш раннія матэрыялы мілаградскай і зарубінецкай культур.

Гліняныя сасуды з Калочынскага гарадзішча (сярэдзіна I тыс. н. э.)



Сярпы з гарадзішча Калочын

Гарадзішча-2. За 0,5 км на поўдзень ад вёскі, на мысе правага берага Дняпра. Пляцоўка прамавугольная, памерам 50×25 м, умацавана 2 валамі і равамі. Вышыня ўнут-

ранага вала 3 м, вонкавага 2,5 м. У 1955 і ў 1961 гг. даследавала В. М. Мельнікоўская. У культурным пласце 0,5 м знойдзены матэрыялы мілаградскай (VII — III стст. да н. э.) і зарубінецкай (II ст. да н. э.— V ст. н. э.) культур.

Селішча. Побач з гарадзішчам. Плошча больш за 1 га. Даследаваў у 1955—1960 гг. Э. А. Сымановіч, абследавалі ў 1955 г. В. М. Мельнікоўская, у 1964 г. Л. Д. Побаль. Выяўлены 2 паўзямлянкавыя жытлы, шмат гаспадарчых ям, знойдзена ганчарная кераміка. Селішча належала славянам. Датуецца яно VI — VIII стст.

Матэрыялы даследавання знаходзяцца ў Рэчыцкім краязнаўчым музеі.

Па назве вёскі названа культура.

в. Каравацічы, цэнтр сельсавета

Гарадзішча-1. За 0,8 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, сярод асушанага балота, ва ўрочышчы Пагібла. Пляцоўка гарадзішча амаль круглая ў плане, дыяметрам 65 м, абнесена валам вышынёй да 2 м. У 1976 г. гарадзішча выявіў і абследаваў Г. В. Штыхаў. Культурны пласт 0,2 м. Знойдзены фрагменты ляпнога посуду з гліны.

Гарадзішча-2. За 4 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Шчоўб. Пляцоўка гарадзішча амаль круглая, вышынёй 2,5 м, дыяметрам 45 м, абнесена кальцавым валам. У 1970 г. гарадзішча выявіў Г. В. Штыхаў, ён жа абследаваў гэты помнік археалогіі ў 1976 г. Культурны пласт у шурфах 0,3 м. Знойдзены ляпны гліняны посуд.

Гарадзішча адносіцца да мілаградскай (VII — III стст. да н. э.) і зарубінецкай (II ст. да н. э.— V ст. н. э.) культур.

в. Коззе, Дземяхоўскі сельсавет

Гарадзішча. За 0,7 км на захад ад вёскі, на правым беразе р. Ведрыч.

Гарадзішча мае 2 пляцоўкі. Паўночная — прамавугольнай формы, памерам 55×50 м, абнесена валам вышынёй 0,5—2 м. Паўднёвая пляцоўка амаль прамавугольная, памерам 80×30 м, яна абнесена валам вышынёй 0,5 м. У 1976 г. гарадзішча выявіў і абследаваў Г. В. Штыхаў. На паўднёвай пляцоўцы культурны пласт 0,3 м. У ім знойдзена ляпная кераміка з гліны. Гарадзішча адносіцца да ранняга жалезнага веку. Раскопкі яго не праводзіліся.

Матэрыялы даследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь.

в. Крапіўня, Камсамольскі сельсавет

Курганны могільнік. За 2 км на паўночны ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Бярэзіна. 25 курганоў вышынёй 0,5—1,7 м, дыяметрам 6—10 м. У 1976 г. могільнік выявіў і абследаваў Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

в. Крынкі, Ліскаўскі сельсавет

Гарадзішча-1. За 2 км на захад ад вёскі, у лесе, ва ўрочышчы Гарадок. Займае ўсходнюю частку ўзвышша. Пляцоўка гарадзішча круглая, плошчай 5675 м^2, умацавана валам вышынёй 1,2 м, шырынёй 10 м. З паўднёвага захаду прасочаны дадатковы вал вышынёй 0,5—0,7 м, шырынёй 8 м і роў глыбінёй 0,4—0,6 м, шырынёй 3 м. У 1976 г. гарадзішча выявіў Г. В. Штыхаў, а ў 1981 г. яго абследаваў М. І. Лашанкоў. Раскопкі гарадзішча не праводзіліся.

Гарадзішча-2. За 3 км на захад ад вёскі, за 1 км на захад ад гарадзішча-1, ва ўрочышчы Гарадок. Пляцоўка гарадзішча авальная, плошчай 4200 м^2, умацавана валам вышынёй 1 м, шырынёй 8 м і ровам глыбінёй 0,5 м, шырынёй 5—6 м. У 1981 г. выявіў і абследаваў М. І. Лашанкоў. Магчыма, гэта гарадзішча-сховішча ранняга жалезнага веку. Раскопкі яго не праводзіліся.

Курганны могільнік. За 2 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Лаўскае, на ўзлессі. 20 курганоў вышынёй 0,5—2 м, дыяметрам 5—6 м. Каля асобных насыпаў прасочаны раўкі. У 1981 г. могільнік выявіў М. І. Лашанкоў, ён жа абследаваў помнік археалогіі ў 1982 г. Раскопкі могільніка не праводзіліся.

в. Ліскі, цэнтр сельсавета

Гарадзішча. За 3 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Зарэцкі (Гарадок), сярод правабярэжнага поплаву р. Ведрыч, на невысокім пагорку. Пляцоўка гарадзішча авальная, памерам 190×155 м. Умацавана валам вышынёй 2 м, шырынёй 14—18 м. З усходняга боку гарадзішча прасочаны дадатковы вал вышынёй 1 м, шырынёй 8 м і роў глыбінёй 0,5—0,7 м, шырынёй 3—3,5 м. З паўднёвага і паўночнага ўсходу вал

і роў пераходзяць у тэрасу і паступова зліваюцца з асноўным валам. У 1976 г. гарадзішча выявіў Г. В. Штыхаў, а ў 1980—1982 гг. яго даследаваў М. І. Лашанкоў. Культурны пласт гарадзішча 0,4—0,8 м. Знойдзены больш за 20 тыс. фрагментаў ляпной керамікі і больш як 82,5 кг бурага жалязняку (балотнай руды), 490 касцей дзікіх і свойскіх жывёлін, 142 гліняныя грузікі — прасліцы і іх фрагменты, частка тыгля і льячкі, 2 бронзавыя люстэркі, рэшткі бранзалетаў, бляшка з вушкам, званочак, фібула, жалезныя нажы, сярпы, 2 цвікападобныя шпількі, фрагменты шпілек, наканечнік стралы, пацерка з арнаментам, каменная зерняцёрка, сякеры, таўкачы, цёрачнік ад зерняцёркі, крамянёвыя рэтушор, праволка, скрабкі, нож, пласціны і адшчэпы, наканечнік для стралы і інш. Гарадзішча адносіцца да мілаградскай культуры, яно датуецца VI — IV стст. да н. э.

Курганны могільнік. За 0,5 км на поўнач ад вёскі, па дарозе на в. Крынкі, каля чыгуначнага пераезда. Могільнік складаюць 26 курганоў вышынёй 0,4—1,5 м, дыяметрам 5—11 м. У 1981 г. могільнік выявіў і даследаваў М. І. Лашанкоў. Раскапаны 2 насыпы. У адным знойдзены рэшткі ганчарнага збана, у другім выяўлена пахаванне па абрадзе трупапалажэння, галавой на захад на падсыпцы. Каля ног нябожчыка былі раскіданы жалезныя цвікі, каля галавы — рэшткі ганчарнага посуду. На поясе 2 бронзавыя кольцы і прамавугольная спражка. Могільнік адносіцца да эпохі Кіеўскай Русі, датуецца канцом X — XIV стст. н. э.

Селішча. Знаходзіцца ў вёсцы, на левым беразе р. Ведрыч. Плошча 0,7—0,8 га. У 1981 г. селішча выявіў і абследаваў М. І. Лашанкоў. Культурны пласт 0,4 м. Знойдзены рэшткі ляпной керамікі бронзавага і ранняга жалезнага вякоў і ганчарная кераміка XIV — XVII стст., косці жывёлін.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь.

в. Луначарск, Заспенскі сельсавет

Курганны могільнік. На ўсходняй ускраіне вёскі, на правым беразе Дняпра. 50 насыпаў вышынёй 0,5—2,5 м, дыяметрам 6—10 м. Каля вялікіх курганоў ёсць раўкі. У 1964 г. могільнік абследаваў Л. Д. Побаль, а ў 1976 г. — Г. В. Штыхаў. Раскопкі могільніка не праводзіліся.



Гліняны конік і прасліца (мілаградскія грузікі)

в. Мілаград, Глыбаўскі сельсавет

Гарадзішча. За 1 км на поўнач ад вёскі, на правым беразе Дняпра. Гарадзішча мысавага тыпу, трохвугольнай формы. Мае жылую (плошча 0,4 га) і гаспадарчую (плошча 0,6 га) пляцоўкі. Жылая з трох бакоў умацавана П-падобным валам вышынёй 2 м. Раскопкі праводзілі ў 1952 г. Ю. У. Кухарэнка, у 1955, 1957, 1958, 1961 гг. В. М. Мельнікоўская. Гарадзішча абследавалі ў 1964 г. Л. Д. Побаль, а ў 1976 г. — Г. В. Штыхаў. Раскапана 800 м^2 плошчы. Даследаваны абарончыя збудаванні ў заходняй частцы гарадзішча. Край пляцоўкі тут вышэйшы, па ім праходзіў насып старажытнага вала. Паралельна схілу знаходзіліся 3 канавы. Раскопкамі ўстаноўлена, што на першым часе былі пабудаваны ўмацаванні, якія адгароджвалі мыс ад плато, а некалькі пазней — больш магутныя валы, што аддзялялі жылую пляцоўку. З заходняга боку знаходзіўся ўваход на гарадзішча. Культурны пласт на жылой пляцоўцы 0,5 м. Ён аднастайны, без праслоек, насычаны керамікай і асобнымі знаходкамі. Выяўлены рэшткі 10 жытлаў слупавой канструкцыі, якія размяшчаліся ўдоўж унутранага схілу валоў і месцамі падыходзілі да іх асновы, і гаспадарчых пабудоў. Яны былі круглымі ў плане, дыяметрам 7 м. На гарадзішчы выяўлена некалькі мяшаных мілаградска-зарубінецкіх комплексаў. Так, у адным жытле, раскапаным у 1957 г., знаходзіліся мілаградская і зарубінецкая кераміка і вялікая колькасць бронзавых рэчаў, у тым ліку позналатэнскія фібулы. На гарадзішчы знойдзены сярпы, гліняныя прасліцы, тыглі, бронзавыя пярсцёнкі, скроневыя кольцы, фібулы, падвескі, зерняцёрка, ляпны посуд. Траплялася і кераміка з штры-

хоўкай арнаментальнага характару. Ад назвы вёскі і гарадзішча атрымала назву мілаградская культура. Атрыманы матэрыялы для вырашэння пытання аб узаемасувязях насельніцтва мілаградскай і зарубінецкай культур на верхнім Дняпры, а таксама для падзелу мілаградскай культуры на асобныя храналагічныя этапы. На гаспадарчай частцы гарадзішча культурнага пласта няма. Пры раскопках знойдзены рэшткі ўмацаванняў па краі гарадзішча. Помнік датуецца IV — III стст. да н. э. — II ст. н. э.

Селішча. На поўнач ад гарадзішча, за яго валамі. У 1955 г. 300 м^2 плошчы даследавала В. М. Мельнікоўская. У культурным пласце 10—15 см быў знойдзены мілаградскі і зарубінецкі посуд. Выяўлены таксама прыкметы жытла з познім мілаградскім комплексам рэчаў і зарубінецкай керамікай.

Матэрыялы даследаванняў захоўваюцца ў Інстытуце археалогіі АН у Маскве.

в. Перавалока, Караваціцкі сельсавет

Гарадзішча-1. За 2 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Шчыгуз, сярод балота. Пляцоўка гарадзішча круглая, дыяметрам 15 м, абнесена кальцавым валам вышынёй 1,5 м, шырынёй 15 м. Уваход на пляцоўку з паўднёва-ўсходняга боку. У 1964 г. гарадзішча выявіў і абследаваў Л. Д. Побаль, а ў 1976 г. абследаваў Г. В. Штыхаў. Раскопкі гарадзішча не праводзіліся.

Гарадзішча-2. За 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Пажары. Пляцоўка гарадзішча памерам 52×36 м. Яна абкружана валам вышынёй 1,3 м. У 1964 г. гарадзішча выявіў і абследаваў Л. Д. Побаль, а ў 1976 г. абследаваў Г. В. Штыхаў. Раскопкі гарадзішча не праводзіліся.

в. Рассвет, Васілевіцкі гарадскі Савет

Гарадзішча. За 3 км на паўночны ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадзінка, на ўзлессі. Пляцоўка гарадзішча блізкая па форме да круга. Плошча каля 0,5 га. Умацавана валам вышынёй 1,3 м, шырынёй 10 м і ровам глыбінёй 0,4 м, шырынёй 3 м. З паўночнага боку прасочаны дадатковы вал вышынёй 0,5—0,8 м і шырынёй 4—6 м. У 1981 г. гарадзішча выявіў М. І. Лашанкоў. Культурны пласт 0,4 м. У ім знойдзены *керамікa і косці жывёлін*. Адносіцца да мілаградскай культуры ранняга жалезнага веку. Раскопкі гарадзішча не праводзіліся.

Матэрыялы абследавання захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь.

в. Стара-Краснае, Дземяхоўскі сельсавет

Гарадзішча. За 1 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Гарадок, у лесе. Пляцоўка гарадзішча авальная, памерам 62×70 м, абнесена 2 валамі. Адзін вышынёй 2,5 м знаходзіцца на краі пляцоўкі, другі вышынёй 1 м праходзіць ніжэй першага. Паміж валамі прагледжваюцца прыкметы рэштак рова. У 1976 г. гарадзішча адкрыў і даследаваў Г. В. Штыхаў. Культурны пласт 0,4 м. Знойдзены 12 абломкаў ляпной керамікі. Гарадзішча адносіцца да зарубінецкай культуры.

в. Унорыца, Азершчынскі сельсавет

Паселішча-1. На заходняй ускраіне вёскі, на першай надпоймавай тэрасе Дняпра. У 1977 г. паселішча адкрыў і абследаваў У. П. Ксяндзоў. Культурны пласт 0,2 м на плошчы 200 м^2. Знойдзены ляпная кераміка і крамянёвыя прылады працы. Паселішча адносіцца да канца бронзавага — пачатку ранняга жалезнага веку, датуецца пачаткам 1-га тысячагоддзя да н. э.

Паселішча-2. За 1,5—2 км на поўдзень ад вёскі, на першай надпоймавай тэрасе правага берага Дняпра. У 1977 г. паселішча адкрыў і абследаваў У. П. Ксяндзоў. Культурны пласт 0,1 м на плошчы 300 м^2. Знойдзены крамянёвыя вырабы (адшчэпы, пласціны, нуклеусы), рэшткі ляпной керамікі з дамешкам жарствы і пяску ў гліне, упрыгожаныя арнаментам у выглядзе наразных ліній. Паселішча адносіцца да канца бронзавага — пачатку ранняга жалезнага веку, датуецца яно пачаткам 1-га тысячагоддзя да н. э.

пас. Храбры, Ровенска-Слабодскі сельсавет

Гарадзішча. За 0,6 км на паўднёвы ўсход ад пасёлка, сярод балота. Пляцоўка гарадзішча памерам 85×60 м, абнесена 2 валамі і ровам. Вышыня ўнутранага вала 1,5 м, вонкавага 0,5 м. У 1960 г. гарадзішча абследавала В. М. Мельнікоўская, а ў

1976 г.— Г. В. Штыхаў. Раскопкі гарадзішча не праводзіліся.

в. Чорнае, Белабалоціцкі сельсавет

Гарадзішча. За 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, на беразе возера Хацімля. Пляцоўка гарадзішча памерам 75×45 м. З заходняга і ўсходняга бакоў ёсць равы. З боку поля гарадзішча ўмацавана валам вышынёй 2 м, шырынёй 15 м. Частка пляцоўкі пашкоджана. У 1960 г. гарадзішча абследавала В. М. Мельнікоўская, а ў 1976 г.— Г. В. Штыхаў. У шурфах былі знойдзены 200 абломкаў ляпнога посуду (кераміка з расчосамі і глянцаваная), гліняны грузік з 5 выступамі і адтулінай пасярэдзіне (рытуальнага прызначэння), бронзавая трапецападобная падвеска. Гарадзішча адносіцца да мілаградскай і зарубінецкай культур.

Матэрыялы абследаванняў захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН Рэспублікі Беларусь.

в. Чырвоная Дуброва, Караваціцкі сельсавет

Гарадзішча. За 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, на ўзвышшы правабярэжнага поплаву р. Ведрыч. Пляцоўка гарадзішча ў плане эліпсападобная, памерам 195—122,5 м. Умацавана валам вышынёй 0,8—1,2 м, шырынёй 10 м. У 1976 г. гарадзішча выявіў Г. В. Штыхаў, а ў 1981 г. яго абследаваў М. І. Лашанкоў. Раскопкі гарадзішча не праводзіліся.

Падрыхтаваў да друку П. Рабянок

Пра нашых продкаў...

...Дрыгвічы расьсяліліся паміж Прыпяцьцю і Заходняй Дзьвіною. Сярэдзіна сялібы дрыгвічоў супадае з нашай Меншчынай. Яны жылі пасярод лясоў і балот, дзе шмат было багнін, інакш кажучы, дрыгвы. Адсюль і пашло іх імя. Пасьля іх толькі ў Меншчыне засталося больш як 30 тысяч курганоў-магільнікаў. Радзімічы былі невялікім племем і жылі па абодвух берагох Сожу. Яны прыйшлі сюды пазьней ад крывічоў і дрыгвічоў з ляскай (польскай) страны. Летапіс гаворыць аб іх так: «Бяста бо два брата в Лясех: Радзім, а другі Вятко, і прішедша седоста Радім на Соже, і прозвашася Радімічі, Вятко седе с родом своім по Оце, от него-ж прозвашася Вятічі».

Аб жыцьці нашых прародзічаў мы знаходзім весткі ў Кіеўскім летапісу. Летапісец так малюе гэтае жыцьцё: «Жывяху в лесе, яко-же всякі зверь, ядуще всё нечісто, і срамословіе в ніх пред отцы і пред снохамі; і брацы не бываху в ніх, но ігріща межю селы»... і г. д. Судзячы па гэтай летапіснай ведамасьці, выходзіць, што нашыя продкі былі зусім у первястковым стане, ня мелі ніякай культуры і жылі сярод лясоў, як нейкае быдла. Ня так абстаіць справа, калі мы запытаемся ў чужаземных сьведкаў. Усе яны ў адзін голас кажуць аб тым, што ўсходнія славяне ўжо і ў часы сівой старасьветчыны мелі нейкую культуру і нават немалую. Так, напрыклад, гавораць бізантыцкія аўтары — Пракопі, Маўрыкі, Канстанты Чырвонародны і арабскі аўтар Масудзі. Той самы летапіс, каторы, з аднаго боку, такою чорнаю хварбаю малюе культурны быт нашых продкаў, з другога боку, дае пэўныя весткі аб вялікім ліку гарадоў, якія былі раскіданы па ўсіх куткох тагочаснай Полацкай Русі. А мы ведаем, што прысутнасць у народу гарадоў як гандлёвых цэнтраў гаворыць зусім ясна аб культурнасьці народу. Аб гэтым-жа, хоць маўчком, але гавораць тыя магільнікі-курганы, каторыя засталіся на тэрыторыі Беларусі аж да нашых часоў. Раскопкі гэтых магільнікаў-курганоў, якія робяцца вучонымі, даюць шмат матэрыялаў, каб намаляваць стан культуры як матэрыяльнай, так і духоўнай у крывічоў, дрыгвічоў і радзімічаў.

З раскопак мы бачым, што пляменьні будучага беларускага народу, не зважаючы на сваю блізкасьць па крыві і суседзтву, мелі ня зусім сходныя звычаі. Так, напрыклад, кожнае з іх па сваім уласным звычаі хавала нябожчыкаў. Крывічы палілі труп, попел зьбіралі ў пасудзіну, якую потым пакрывалі насыпам. Укола насыпу капалі раўчак, а курган абводзілі стужкай з каменю. Дрыгвічы клалі сваіх нябожчыкаў на зямлі і насыпалі над імі курганы. Радзімічы да X сталецьця сваіх нябожчыкаў палілі, а пасьля гэтага часу клалі нябожчыка

на ложка, пасыпанае попелам, і над ім рабілі насыпу. Уклад хаўтурны крывіцкі быў найскладнейшы; гэтае гаворыць аб тым, што і культура іх павінна была быць вышэйшаю.

Па тых рэчах, што знаходзяцца ў курганох, ясна, што дзяды нашыя ня сквапны былі да вайны, ім больш падабалася мірная праца: земляробства, зьвералоўства і гандаль. Яны ўмелі ўжо ткаць на кроснах, ведалі бандарную і ганчарную справу. Былі сярод іх людзі заможныя, каторыя любілі хораша прыбрацца. На шыі яны насілі маністы з шкляных пацерак: часам бронзавых і срэбных, з размаітымі падвескамі, добра апрацаванымі. Відаць, што пацеркі, вельмі штучна зробленыя, дзесь купляліся. Беларус нашага часу ня можа прыбрацца так багата і цікава, як маглі прыбрацца яго продкі, каторыя, па летапісу, «жівяху в лесе, яко-же всякій зверь». Проф. Завітневіч аб кургановых рэчах гаворыць так: «Курганные предметы Полесья по своему материалу ценнее, а по форме разнообразнее, затейливее, а иногда даже изящнее нынешних». І няма тут ніякага дзіва. Нашу бацькаўшчыну багаціў вялікі водны шлях з Варагаў у Бізантыю, па каторыі ішоў сусьветны гандаль таго часу. У гэтым гандлі працавалі і мелі немалы заробак і нашы прародзічы. Цікава тое, што некаторыя рэчы, якія ўжываліся тады, ужываюцца і цяпер беларусамі нашага часу. Жыхар курганавага Палесься меў звычай падпяразвацца раменным пасом з шкураным кашэлікам, у каторым ён хаваў крэсіва, крамень, губку і ножык. Наш беларус некаторых паветаў Горадзеншчыны, Магілёўшчыны і Меншчыны таксама носіць пры сабе ў кашэліку на раменным пасу такія самыя рэчы; толькі ён дадаў да іх, як чалавек нашае культуры, яшчэ тытун і люльку.

Чым вытлумачыць тое, што вестка летапісу аб някультурнасьці нашых прародзічаў так не падобна на весткі чужаземных сьведкаў курганоў? Трэба памятаць, што хто-б ня быў аўтар летапісу, ён быў манах, прадстаўнік новай культуры, і новай веры, якая прасочвалася ў нашыя лясы з далёкай Бізантыі. Пэўна, што ўсё тое, што насіла на сабе адзнакі не яго культуры, аўтар лічыў някультурным. Шлюб, учынены водлуг звычаяў паганскай веры, яго не здавольваў, і летапісец піша, што ў продкаў нашых «брацы не бываху». Калі продкі нашы ў посны, па звычаі хрысьціянства, дзень елі скаромнае па сваім паганскім звычаі, манах летапісец кажа, што яны елі ўсё нячыстае. Такія здарэньні ацэнкі культуры ў гісторыі людзей мы бачым часта. Вядома нам, напрыклад, што рымляне звалі першых хрысьціян бязбожнікамі за тое, што яны верылі ў свайго нявіднага бога, а ня ў іх рымскіх багоў; апроч таго, рымляне вінавацілі іх у распуснасьці за тое, што ў хрысьціян была свая мораль, а не мораль паганскай веры рымлян. Адным словам, летапісец зрабіў згодна з законамі соцыяльнай псыхолёгіі тую абмылку, якая для нас зусім зразумела: славяне ня мелі і не прызнавалі бізантыцка-хрысьціянскай культуры, значыць, яны ня мелі ніякай культуры.

Ігнатоўскі У. М.
Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн.: 1991.

* * *

...Хутчэй за ўсё, мабыць, што назва дрыгавічоў паходзіць ад славянскага імя Дрыгавіт, як радзімічы ад Радзіма і вяцічы ад Вяткі. Гэта тым больш верагодна, што ў Канстанціна Парфіраноднага і ў «Жыціі Дзмітрыя Салунскага» яны выступаюць як «другувіты», «драгувіты» і «дрогувіты». Пры «р» быў досыць невыразны галосны гук, які перадаваўся па-рознаму візантыйцамі. Ён па-рознаму мог гучаць і ў славянскім вымаўленні. Як бачым, больш правільнай формай гэтай назвы трэба лічыць «драгавіты». І вельмі шкада, што ў беларускай навуковай літаратуры ўкаранілася яўна няправільная форма «дрыгавічы». Тут дарэчы будзе адзначыць пахвальную спробу Л. Аляксеева ўжываць форму «дроговичи».

Паўднёвая мяжа рассялення дрыгавічоў ішла на поўдзень ад Прыпяці па мяжы былых Менскай і Валынскай губерняў, дзенідзе толькі заходзячы яшчэ далей на поўдзень (у міжрэччы Гарыні і Стыры). Тут дрыгавічоў ад драўлян аддзяляла досыць шырокая балоцістая прастора.

Густынскі летапіс, гаворачы пра дрыгавічоў, зазначыў, што яны рассяліліся паміж Прыпяццю, Дняпром і Дзвіною. І гэтым самым у адрозненне ад іншых летапісаў адзначыў іх усходнюю мяжу. А яна ішла па левым беразе Дняпра на поўнач ад упадзення ў яго Прыпяці.

...Рассяленне дрыгавічоў на такой вялікай прасторы (Папрыпяцце, Падняпроўе, Панямонне і Пабужжа) мела ў далейшым надзвычай важныя вынікі як для лёсу самога племя, так і для гісторыі ўсёй Беларусі.

...З уступленнем Уладзіміра на вялікакняскі пасад аднаўлялася (але зноў толькі часова) адзінства і палітычная раўнавага Кіеўска-Наўгародскай дзяржавы. Гэта і дало ёй магчымасць аднавіць зноў вайсковую палітыку. У 981 г. Уладзімір хадзіў на ляхаў, у гэтым жа і наступных гадах — на вяцічаў. У 983 г. быў зроблены паход на яцвягаў (гэта першае ўпамінанне іх у летапісе) і ўзята іх зямля. На жаль, у крыніцы не ўдакладняецца месца паходу. Яцвягі займалі, як мы ведаем, значную тэрыторыю, і таму не выключана, што гэты паход мог быць прадпрыняты на тэрыторыю Беларусі, у раёны Папрыпяцця, ці Панямоння, ці Пабужжа.

Але для нас асаблівую цікавасць складае паведамленне летапісу пад 984 г. пра заваяванне радзімічаў. Зразумела, што з пакарэннем вяцічаў лёс радзімічаў быў прадвырашаны. Уладзімір, робячы паход на іх, наперадзе сябе паслаў ваяводу па прозванню Воўчы Хвост, які сустрэў радзімічаў на рацэ Пяшчане і перамог іх. З таго часу і з'явілася прымаўка, якой дражняць радзімічаў: «Пяшчанцы воўчага хваста бегаюць». У заключэнне летапісец яшчэ раз паўтарыў, што радзімічы ад роду ляхаў і аселі тут, а таксама дадаў, што яны «плацяць даніну Русі, павоз вязуць і дагэтуль».

Розныя даследчыкі па-рознаму адносіліся да гэтай падзеі. Адны бачылі ў ёй карную экспедыцыю супраць радзімічаў, якія паўсталі ці адклаліся, другія — сутычку Уладзіміра і яго дружыннікаў у час збору даніны, трэція лічылі, што гэта падзея перанесена з часоў Алега, а чацвёртыя наогул прымалі яе за легенду, створаную для тлумачэння народнай прымаўкі. Ні з воднай з гэтых думак нельга пагадзіцца. Для правільнай ацэнкі гэтай падзеі трэба прыгадаць, што яшчэ ў прамежку 912—944 гг. радзімічы разам з вяцічамі і севяранамі выйшлі з-пад улады Кіева. Таксама паказальны факт, калі ўспомніць, што летапісец паказваў гэтыя тры плямёны блізкімі па сваіх звычаях. І гэта невыпадкова. Мы ўжо бачылі, што шлях севяранаў ішоў з Польшчы, а радзімічы і вяцічы таксама вялі свой род з ляхаў. Нездарма ж і пасяліліся яны побач адзін аднаго. Ці не ўтварылі гэтыя тры плямёны, аддзяліўшыся ад Кіева, нейкую асобную палітычную адзінку, магчыма, нешта накшталт федэрацыі? Гэта тым больш верагодна, бо ў далейшым з іх тэрыторыі поўнасцю склалася Чарнігаўскае княства. Сцверджанне пра заваяванне радзімічаў Святаславам не пацвярджаецца крыніцамі. Зыходзячы з гэтага, паход Уладзіміра ў 984 г. трэба лічыць заваёўчым паходам з мэтай вярнуць радзімічаў пад уладу Кіева. Гэта пацвярджаецца і тым, што сутычка адбывалася на рацэ Пяшчане (правым прытоку Проні), якая была рубяжом радзіміцкіх паселішчаў, і таму натуральна, што радзімічы менавіта тут сустрэлі праціўніка. Але паўторнае заваяванне радзімічаў апроч даніны давала Кіеву яшчэ адну эканамічную выгоду. Справа ў тым, што тэрыторыя радзімічаў, як і сумежных з ёю раёнаў, была багатая балотнымі рудамі, нават вядомая ўжо нам рака Пяшчана мела другую назву — Рудніца. Са шматлікіх радзіміцкіх балотаў здабываўся сырэц для выпрацоўкі металу. Калі гэтая рака не страціла свайго прамысловага значэння яшчэ на рубяжы XVIII — XIX стст., то няцяжка ўявіць, як яна цанілася ў канцы X ст. Не можа быць сумнення, што авалоданне радзіміцкімі руднымі багаццямі было адной з важнейшых мэт пакарання радзімічаў Уладзімірам. Нездарма ж таму Воўчы Хвост найперш накіраваўся на Пяшчану, асабліва багатую рудамі, і нездарма ж радзімічы тут сканцэнтравалі сваю абарону: тут знаходзілася іх найбольшае багацце.

Ермаловіч Мікола.
Старажытная Беларусь / Полацкі і Новагародскі перыяды. Мн.: 1990.

Рэчыцкая зямля на старажытных і старых картах

Старажытныя і старыя карты — важнейшыя гістарычныя дакументы. Нярэдка менавіта яны з'яўляюцца апошнім аргументам у спрэчках паміж урадамі і народамі. Гісторыя ведае нямала прыкладаў, калі спрэчкі гэтыя перарасталі ў крывавыя войны, што забіралі мільёны чалавечых жыццяў. Так, на жаль, і па сёння.

Традыцыйна высокая картаграфічная культура, навуковая абгрунтаванасць і матэматычная дакладнасць у адлюстраванні інфармацыйнага матэрыялу характэрны перш за ўсё для даследчыкаў Германіі, Галандыі, Аўстрыі, Англіі. І яны, гэтыя людзі, «паказалі» ў сваіх працах і Рэчыцкую зямлю.

На карце Польшчы і Венгрыі з першага выдання «Геаграфіі» Пталамея пры дапамозе С. Мюнцера (Базілія, 1540 г. Фармат арыгінала 345×256 мм) бачна і наша мясцовасць. Яна пазначана як надта лясістая.

У 1600 г. убачыла свет карта Вялікага княства Літоўскага, па Геʼарду Меркатару, копія Петруса Каерыуса (фармат арыгінала 178×254 мм). Але Рэчыца на ёй на ... левым беразе ракі Бярэзіны. На самай жа справе тут (на правым беразе Бярэзіны) Горваль. Пад гэты час мястэчка было даволі вядомым.

Мінула ўсяго 13 гадоў, і М. Хрыстафор Радзівіл (1623 г.) выдаў карту Вялікага княства Літоўскага. На ёй і Рэчыца, і Горваль. Рэчыца пазначана замкам. Бачна і рэчка (рака) Ведрыч. На поўдзень ад горада — лясы.

На карце М. Хрыстафора Радзівіла акрэслена і ўся Рэчыцкая зямля. Яна значна большая, чым тэрыторыя сучаснага Рэчыцкага раёна.

Яшчэ выразней тое заўважна на карце Вялікага княства Літоўскага і Русі Белай (Нюрнберг, 1687 г.). Рэчыцкая зямля сягае ажно да Мазыра. Тое ж самае і на карце Джуно (Лондан, 1711. Гравюра Германа Мола. Памер арыгінала 197×251 мм).

У 1710 г. Дж. Б. Хоман выдаў у Германіі (Нюрнберг) карту Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. На ёй і Рэчыца, і Горваль. Але Горваль на левым беразе Бярэзіны.

Тое ж самае і на карце Каралеўства Польшчы Ісаака Цірыена, выгравіраванай Дж. Кайзерам у 1733 г. у Амстэрдаме.

А мо тут не было памылкі? Мо замак Горваль пад гэты час і знаходзіўся на левым беразе Бярэзіны? Ва ўсялякім разе, выключаць такое меркаванне нельга. Так, само мястэчка тулілася на правым беразе Бярэзіны, непадалёк ад упадзення яе ў Дняпро. А замак — за Бярэзінай. Мясціны там значна ніжэйшыя за той, дзе зараз вёска Горваль, таму нават летам маглі знаходзіцца пад вадой. Але ж менавіта гэтая акалічнасць і магла задаволіць тых, хто жыў у замку. Калі б у мястэчку Горвалі з'явіўся вораг, то насельнікі замка мелі б магчымасць прыняць нейкія захады з улікам абставін. Скажам, падрыхтавацца да абароны ці на пэўны час схавацца.

На карце Ісаака Цірыена Рэчыцкая зямля сягае далёка за Прыпяць. Не пазначаны Ведрыч. Мо на гэты час ён згубіў судна-



Фрагмент карты ВКЛ па Геʼарду Меркатару, копія Петруса Каерыуса. 1600 г.

Фрагмент карты ВКЛ, выдадзенай М. Хрыстафорам Радзівілам. 1613 г.

Карта ВКЛ і Русі Белай. Нюрнберг. 1687 г.

ходнасць? Не. На карце Каралеўства Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, складзенай І. М. Пробстам у 1753 г. (памер арыгінала 480×573 мм), пазначаны і Рэчыца, і Ведрыч, праўда, горад на левым беразе Ведрыча, дзе зараз вёска Азершчына. Што да Горваля, то ён, як на каторых ранейшых картах, застаўся за Бярэзінай. Увогуле ж тэрыторыя Рэчыцкай зямлі на карце І. М. Пробста ўбірае ў сябе апроч межаў сучаснага раёна і тэрыторыю цяперашніх Брагінскага, Лоеўскага, Нараўлянскага, Светлагорскага, Хойніцкага раёнаў.

Карта Польшчы Тобіаса Маера (Нюрнберг, 1750 г.) мала розніцца ад карты І. М. Пробста. Праўда, адна палова слова Rzeczyca на правым беразе Дняпра, другая — на левым. Напэўна ж, Тобіасу Маеру было вядома, што пад гэты час улада Рэчыцы распаўсюджвалася і на значныя тэрыторыі, што знаходзіліся ў міжрэччы Дняпра і Сожа (Рэчыцкае староства).

Характэрная дэталь: на карце тэрыторыя цяперашніх Баршчоўскага і Белабалоцінскага сельсаветаў пазначана як мясціна, багатая барамі.

Ёсць Рэчыца і на серыі картаў з Гістарычнага атласа Польшчы Іоахіма Левела (Лейпцыг, 1847 г. Памер картаў 227×244 мм). На жаль, на картах адсутнічаюць многія рачныя прытокі, у тым ліку і Ведрыч. Не паказаны бары і г. д.

Даволі цікавая этнаграфічная карта заходняга славянства і Заходняй Русі, якая была складзена прафесарам Т. Д. Фларынскім і выдадзена С.-Пецярбугскім славянскім дабрачынным таварыствам (Маштаб 40 вёрстаў у дзюйме. Кіеў, 1911 г.). На карце разам з Рэчыцай і Горвалем пазначаны таксама Васілевічы і Холмечы. На карце і чыгунка, якая прайшла праз Рэчыцу і Васілевічы. Праўда, Рэчыца як бы там, дзе зараз вёскі Казазаеўка і Жмураўка.

Дарэчы, карта прафесара Т. Д. Фларынскага каляровая. Там, дзе Горваль, ружовая плямінка. А гэта сведчыць пра тое, што на пачатку бягучага стагоддзя значную колькасць насельніцтва мястэчка складалі палякі. А вось у Рэчыцы і Холмечы большасць насельніцтва складалі, як бачна з карты, яўрэі.

А. П. Рабянок.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстана праца Яўгена Яўгенавіча Шыраева «Русь Белая, Русь Черная и Литва в картах». Мн.: 1991.

У СКЛАДЗЕ ВКЛ І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

XIII ст. — трагічны і адказны перыяд ў лёсе ўсходніх славян, у тым ліку і беларусаў. Раз-пораз па іх землях каціліся мангола-татарскія нашэсці з усходу, з захаду не міналі пажывіцца крыжакі. А ў дадатак — феадальныя міжусобіцы і войны. Знешняй агрэсіі і ўнутраным разладам паспяхова супрацьстаяць магла толькі моцная цэнтралізаваная дзяржава. Таму на абшарах Беларусі пачаўся працэс аб'яднання асобных княстваў. Цэнтрам кансалідацыі стала летапісная Літва, якая размяшчалася паміж асноўнымі этнічна-беларускімі землямі — Полацкай, Турава-Пінскай і Наваградскай. Галоўнай



Фрагмент Рэчыцкай зямлі з карты Т. Маера. Нюрнберг. 1750 г.

дзеючай асобай на пачатку працэсу збірання асобных княстваў у адну дзяржаву стаў князь Міндоўг. Сталася так, што ў 1240-ых гадах ён змушаны быў, ратуючыся ад унутраных разладаў на радзіме, перабегчы ў Наваградак. Прыняў там хрысціянства. А неўзабаве феадалы Наваградка абралі яго сваім служылым князем. Міндоўг з дапамогай наваградцаў падпарадкаваў Літву. Яго сын Войшалк здолеў падначаліць суседнія балцкія землі — Дзяволтву і Нальшчаны. Пазней уладу Наваградка добраахвотна прынялі Полацк і Менск. Такім чынам, аб'яднанне Літвы, Нальшчанаў, Дзяволтвы, Полацкага і Пінскага княстваў вакол Наваградка стала першым этапам у збіранні Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ). Гэта была дзяржава з поліэтнічным насельніцтвам, у якой дзевяць дзесятых насельніцтва былі нелітоўцамі.

Утварэнне дзяржавы

У склад Вялікага княства Літоўскага Рэчыцкая зямля ўвайшла ў перыяд княжання Гедыміна (1316—1341 гг.). Яе насельніцтва не бачыла крыжакоў, затое неаднойчы сутыкалася з мангола-татарамі. У 1242 г. у нізоўях Волгі хан Батый заснаваў сваё царства, якое атрымала назву «Залатая Арда». Рабіў адтуль набегі на ўсходнеславянскія землі. Усе славянскія княствы, праз якія прайшлі воіны Батыя, апынуліся ў васальнай залежнасці ад Арды. Мясцовыя князі ўлады найчасцей не пазбаўляліся, але абавязаны былі ва ўсім слухацца хана і плаціць даніну. Вядома, даніна ў ханскую казну ішла і з Рэчыцкай зямлі.

Архімандрыт Кіева-Пячорскага манастыра Серапіён пра вынікі мангола-татарскага нашэсця апавядаў так: «Кровь и отець

и братия нашея, аки вода много, землю напои... Мьножайша же братия и чада наша в плен ведени быша; села лядыною поросшаша... богатство наше онемь в корысть быть; труд наш погании последоваша; землю нашу иноплеменникомь в достояние бысть...»

Вялікае княства Літоўскае, маладая яшчэ дзяржава, шмат рабіла для таго, каб спыніць мангола-татарскую экспансію на беларускія землі. Так, у сярэдзіне XIII ст. войскі княства сустрэліся з мангола-татарамі ў нізоўі Прыпяці, нанеслі ім паражэнне.

Наступная бітва адбылася ў 1259 г. у мясцінах, блізкіх ад Рэчыцы. Тады супраць ардынцаў выступілі таксама валынскія, галіцкія ды чарнігаўскія князі. Пэўную дапамогу аказалі князі смаленскія і нават наўгародскія. Цалкам верагодна, што ўдзел у бітве бралі і ваяры з Рэчыцкай зямлі.

Аб'яднанае войска нанесла мангола-татарам цяжкае паражэнне. Вось як гаворыцца пра тое ў адным з летапісаў: «...княжата за всеми войсками особами своими прибыли или на помочь уважаючи сполную от татар небязпечность, злучившися весном тым охотней до обозу тягнулы, где сам царь (Кордан) лежал за Мозырем над рекою Окуневкою, там же битву сшедшиеся, окрутную оточили з обусторон, которая споранку ажсь до вечера трывала, наостаток татары уцекаты почали, а Литва и Русь тыле смелей разогнаных и уцекаючих татаров били, громили, секли, кололи, в реках топили, ин наголову оныне великие войска нагайские крымские над рекою Окуневкою поразили. Сам царь Кордан в малой дружине ледве уцекал до своей земли, а Литва и Русь полоны забрали и з великим и славным звитязтвом до своих сторон вернулися...»

Бараніць сваю зямлю ад татарскіх нашэсцяў войскам Вялікага княства Літоўскага давялося таксама ў 1275, 1277, 1287, 1315, 1325, 1338 гг. Але найбольш славутая бітва адбылася ў 1362 г. на рацэ Сінія Воды — левым прытоку Паўднёвага Буга. Войска княства на чале з вялікім князем Альгердам разбіла татарскіх князёў Кутлубуга і Хачэбоя. Абшары княства Кіеўскага і Падолле былі вызвалены ад татар і далучаны да Вялікага княства Літоўскага.

...Збіранне беларускіх земляў у адну дзяржаву мела прагрэсіўнае значэнне. Феадалы былі зацікаўлены ў моцнай уладзе, здольнай бараніць іхнія інтарэсы. Насельніцтва, якое цярпела ад феадальнай анархіі і спусташальных набегаў знешніх ворагаў, таксама разлічвала на такую абарону. Да таго ж, найчасцей аб'яднанне насіла добраахвотна-дагаворную аснову. Аўтаномнасць зямель, асабліва на першым часе, прадугледжвала нават абмежаванне судовай улады намеснікаў вялікага князя літоўскага і ваявод.

Але феадалы паўднёвай часткі Беларусі, у тым ліку і тыя, што валадарылі на Рэчыцкай зямлі, ужо ў хуткім часе пачалі губляць ранейшую незалежнасць і манапольнае становішча, адчулі — іхні ўдзел у агульнадзяржаўным кіраванні даволі абмежаваны. Гэта здарылася ўжо пры пераемніку вялікага князя Альгерда — князю Ягайле, які пачаў правіць у 1377 г.

Вялікае княства Літоўскае сутыкнулася з сур'ёзнымі цяжкасцямі. Расла пагроза з боку тэўтонаў. Маскоўскі князь, набраўшыся моцы і ўпэўненасці пасля перамогі над мангола-татарамі на Кулікоўскім полі ў верасні 1380 г., распачаў дзеянні, накіраваныя на тое, каб вярнуць пад сваю ўладу шэраг былых зямель Старажытнай Русі, якія на той час знаходзіліся ў межах Вялікага княства Літоўскага.

Гэта, а таксама палітыка Рыма, які бачыў у стварэнні на ўсходзе Еўропы магутнай праваслаўнай дзяржавы пагрозу сваім інтарэсам, прымушала Ягайлу шукаць моцнага саюзніка. Ім стала Польшча. Ягайла ажаніўся на польскай каралеве Ядзвізе, атрымаў каралеўскі трон. У 1387 г. Ягайла, прыняўшы каталіцтва, стаў Уладзіславам. З гэтага часу пачало мяняцца ў Вялікім княстве Літоўскім сацыяльна-прававое становішча беларускіх зямель. Феадальная знаць каталіцкага веравызнання (у большасці літоўскага паходжання) атрымала неабмежаванае права валодання і распараджэння сваімі вотчынамі. Яна вызвалялася таксама ад шэрага павіннасцей на карысць дзяржавы. На феадалаў жа, якія былі праваслаўнымі і вялі радаслоўную з беларускіх, украінскіх і рускіх зямель, прывілеі Уладзіслава-Ягайлы не распаўсюджваліся.

Крэўская унія, заключаная ў 1385 г. паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай, прывяла да пагаршэння становішча і простага насельніцтва праваслаўнага веравызнання. Стварыліся ўмовы для каталіцкай экспансіі ў беларускія землі. Уладзіслаў-Ягайла, стаўшы католікам, жадаў акаталічвання і праваслаўнага насельніцтва

Вялікага княства. Пашыралася таксама каталіцкае землеўладанне.

Што яўляла сабой Рэчыца пад той час? Гэта быў умацаваны пункт на ўсходняй мяжы Вялікага княства Літоўскага. Пагранічнае становішча, безумоўна, вызначала тое стратэгічнае значэнне, якое горад меў. Менавіта таму на высокім беразе Дняпра спехам узводзіцца замак-крэпасць. Ён уяўляў першапачатковае ядро горада. Ад астатняй тэрыторыі пасялення замак аддзяляўся глыбокім ровам. Крэпасць мела пяць вежаў і злучалася з горадам пад'ёмным мостам. Па ўсёй верагоднасці, крэпасць займала тэрыторыю каля аднаго гектара. Абарончыя збудаванні акружалі і цэнтральную частку Рэчыцы. Тут была гандлёвая плошча, куды людзі збіраліся на кірмашы. Меліся культавыя збудаванні, знаходзіліся жылыя дамы найбольш багатых жыхароў. Асноўная ж частка жылых кварталаў была паміж другім і трэцім паясамі абарончых гарадскіх умацаванняў.

Па ўсёй верагоднасці, Рэчыца займала плошчу памерам каля 700×400 м, як бы капіруючы тып тагачасных беларускіх гарадоў-крэпасцей. Была драўлянай. Не мела ніякіх мураваных збудаванняў: ні ў «жылой» зоне, ні ў замку. Тым не менш Рэчыца ўяўляла сабой даволі магутную крэпасць, уваходзіла ў сістэму пагранічнай аховы Вялікага княства Літоўскага на Дняпры.

Не раней 1387 г.— не пазней 1406 г. Выпіска са «Спіса рускіх гарадоў дальніх і бліжніх», якая ўтрымлівае звесткі аб гарадах на тэрыторыі Беларусі

А се имена всем градом руским далним и ближним...
...А се Киевьскыи гроди:
Дверень, на Рши Корсунь. Треполь на Днепре. Канев. Глинеск. Переяславль Руськыи. Юрьев. Пересечен. Василев на Стугне. Бельгород. На Рпене, Черньгород. Киев деревян на Днепре, а церкы святаа богородиця Десятинаа камена была о полутретьятцати версех, а святая Софиа о 12 версех. Вышегород. Мирославици. Тмуторокань. Остречьскыи, на Десне Чернигов. Омелники. Сновеск. Брянеск. Ростовець. Унеятин. Новгород Северьскыи. Трубческ. Путивль на Семи. Рылеск. Куреск на Тускоре. Коршов на Сосне. А на Суле Снепород. Ськнятин. Грошин. Чемесов. Утешков. Синеч. Кляпечь. Ромен. Ковыла. Ворона. Сал. Песьи кости. Хотень. А на Пьсле Ничян. Городище. Лошици. Бирин. Жолважь. На Ворьскле Хотмышль. Чечерск. Тетерин. Попова гора. Пропошеск. Дроков. Гомин. Речиця. Могилёв. Быхов. Лучин. Рогачев. Стрешин. Любечь. Навоз. На Припете Чернобыль. Копыль. Мозырь. Пернров. Смедин. Туров. На Метлици. Иванов. Вручии. Житомель. Коречь.

«Исторические записки» № 40. 1952. С. 223—224.

Напады крымчакоў

...У другой палове XV ст. на паўднёвых межах Вялікага княства Літоўскага з'явіўся моцны і небяспечны вораг. Гэта было Крымскае ханства. Як дзяржава яно ўтварылася ў выніку распаду некалі магутнай Залатой Арды, войскі якой неаднойчы прыносілі гора і на Рэчыцкую зямлю. Крымскія ханы ды татарская вярхушка асноўную крыніцу для свайго існавання бачылі ў нападах на землі суседзяў, рабаўніцтве іх. Багатыя і ўрадлівыя землі паўночнага суседа — Вялікага княства Літоўскага — надта вабілі крымчакоў. На агрэсію іх падштурхоўвала і палітычная змова, якая паміж крымскім ханам Менглі-Гірэем і маскоўскім уладаром Іванам III мела месца ў 1480 г. Менглі-Гірэй і Іван III заключылі пагадненне, накіраванае на сумесную барацьбу супраць Вялікага княства Літоўскага.

Першымі ўдары крымчакоў адчулі паўднёвыя землі Вялікага княства — Падолле, Валынь, Кіеўшчына і Ноўгарад-Севершчына.

Наезды на абшары Вялікага княства Літоўскага былі штогод, а нярэдка і па некалькі разоў на год.

У 1482 г. крымчакі захапілі Кіеў, спалілі Пячорскі манастыр, абрабавалі Сафійскі сабор, які з'яўляўся святыняй усіх праваслаўных жыхароў Вялікага княства Літоўскага.

З канца XV ст. крымскія татары пачалі рабіць набегі і на тэрыторыю сучаснай Беларусі.

У 1500 г. распачалася вайна паміж Вя-

лікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай. Галоўныя сілы Вялікага княства знаходзіліся на ўсходзе дзяржавы, дзе вяліся баявыя дзеянні з Масквой. Гэта скарыстоўвалі крымскія ханы.

Тры гады доўжылася вайна паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай, і ўвесь гэты час Рэчыцкая зямля не ведала спакою ад крымчакоў.

Самы спусташальны набег на Беларусь быў здзейснены ў 1505 г. Тры сыны Менглі-Гірэя — Махмет-Гірэй, Біці-Гірэй і Бурнас пераправі́ліся са сваім войскам праз «татарскія броды» каля Лоева і пачалі нішчыць землі Вялікага княства. Паліліся і руйнаваліся вёскі, мястэчкі, гарады. Нішчылася ды забіралася ў палон насельніцтва.

Толькі пасля 1530 г., калі крымскія татары зведалі чарговае паражэнне ад войскаў Вялікага княства, на чале якіх на гэты раз быў князь Іван Дубровіцкі, набегі крымчакоў на Беларусь сталі радзейшымі і менш адчувальнымі.

Умацаванне феадальнай дзяржавы

...Кансалідацыя зямель у складзе Вялікага княства Літоўскага спрыяла расшырэнню і ўмацаванню ўнутраных эканамічных сувязей. Садзейнічала таму і наяўнасць адносна трывалай цэнтральнай улады і агульнадзяржаўнага заканадаўства (Судзебнік 1468 г., Статуты Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг.).

Улады Вялікага княства ажыццявілі адміністрацыйна-тэрытарыяльную рэформу (1564—1566 гг.). Згодна з гэтай рэформай быў утвораны Рэчыцкі павет, які ўваходзіў у Менскае ваяводства.

Кансалідацыя зямель спрыяла не толькі значным гарадам, але і мястэчкам. З XIV ст. набывае вядомасць Горваль. Гэтаму спрыяла месцазнаходжанне — бераг Дняпра і Бярэзіны.

У XIV — XVI стст. на тэрыторыі сучаснага Рэчыцкага раёна пераважным тыпам паселішчаў былі невялікія вёскі і хутары. Сяляне з'яўляліся асабіста залежнымі, звалі́ся «людзьмі», «мужыкамі», «падданымі». Асноўнай вытворчай ячэйкай сельскай гаспадаркі была гаспадарка селяніна, якая ў пісьмовых крыніцах гэтага перыяду насіла назву «дым». Гаспадаркі адной вёскі складалі суседскую сельскую абшчыну. Некалькі блізкіх адна да аднае вёсак, якія належалі аднаму феадалу (пану), утваралі валасную абшчыну. Кожная сельская гаспадарка мела зямельны надзел, які даваў феадал — уласнік зямлі. Надзелы звычайна перадаваліся ў спадчыннасць. Сялянскія дзеці, якія карысталіся зямлёй бацькоў (отчынай), называліся «отчычамі». Сяляне не мелі права перадаваць зямлю ў часовае і пастаяннае ўладанне шляхам закладу (заставы), продажу ці іншых здзелак. Для гэтага патрэбна было мець дазвол свайго пана.

Як не да канца XVII ст. сяляне абавязаны былі плаціць сваім феадалам сельскагаспадарчай прадукцыяй — збожжам, мёдам, курамі, футрам і інш. Яны звалі́ся людзьмі даннымі. Адзінкай абкладання быў «дым». Разам з тым члены сельскіх і валасных абшчын (валашчане) неслі перад феадаламі і калектыўную адказнасць. Пэўная частка даннікаў звалася «дольнікамі», бо ў якасці даніны феадалу павінны былі аддаваць чацвёртую частку (долю) ад атрыманага ўраджаю.

1500 г., чэрвень. Устаўная грамата караля намеснікам і іншым управіцелям каралеўскіх валоданняў аб відах і памерах паброў, якія належала браць у падняпроўскіх паветах

Намесником нашим и старцом и всим мужом Поднепрским и волостем нашим Свислоцким, Любошанским, Бобруйским обема половицам — Виленское половицы и Троцкое, Кричевским, Пропойским, Чечерским, Горвольским, Речицким, Брагинским, Мозырским, Бчицким.

Што есте дани нашое грошовое, бобров и куниц не отнесли до скарбу нашого и меду пресного не отвезли до ключов наших до Вилии, до Троков, а которые з вас хотя будуть и дань нашу до скарбу нашого грошовую и бобры, и куницы отнесли, и мед пресный до ключов наших привезли не сполна, где ся што будеть у волостех наших остало и мы для всих тых дел послали там до вас, на волости наши, писара нашого, намесника Перелайского, Богуша Боговитиновича, и казали есмо ему тую дань нашу на вас сполна справити грошовую и бобры, и куницы, и мед пресный, подлуг давного обычая: за рубль

гр. по 2 копе гр., а за бобра чорного по копе гр., а за карого бобра по 40 гр., а за куницу по 6 гр., где не будеть — шерстью: а за встав меду пресного по 4 руб. гр., а за колоду по 2 гр. И вы бы все сполна и з его доходом выдали конечно, по тому как перед тым бывало. А которые з вас будуть земли пустовские або люди голтяйные, або по себе роскинули, на большого большей, а на меньшей, как здавна бывало, абы ни один грош дани нашое у вас не остал. Такеж, которые промеж вас дела обидные будут кому о чем мы казали ему ж о том промежы вас досмотрети и справедливость тому вчинити.

Писан в Менску июнь „.. день, индикт 3 [1500].

М. К. Любавский «Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства». М.: 1892. Прыл. XII – XIII.

Асноўныя сельскагаспадарчыя культуры — збожжавыя, бабовыя, лён, каноплі, агародніна. Прымяняўся трохпольны севазварот: папар, азімае жыта, яравыя. Пры такім архаічным трохполлі ворыва дзялілася на тры ўчасткі. Нешта засявалася, а большасць трохполля заставалася аблогай.

Сяляне стараліся пашырыць свае сельскагаспадарчыя ўгоддзі. Рабілася гэта за кошт раскарчоўвання плошчаў, занятых лесам і хмызнякамі. Феадалы, зацікаўленыя ў павелічэнні ўгоддзяў сваіх маёнткаў, спрыялі таму, нават вызвалялі сялян на пэўны час ад павіннасцей.

Аснова ж эканамічнага жыцця тагачасных беларускіх гарадоў, у тым ліку і Рэчыцы, — рамяство і гандаль. Далейшае развіццё атрымалі промыслы. Пераважная колькасць гараджан — рамеснікі, земляробы, дробныя і сярэднія купцы. Існавала і праслойка гараджан, якія не мелі маёмасці. Іх называлі «вольнымі».

Вядучая роля ў эканамічным і грамадска-палітычным жыцці належала ў гарадах феадальна-купецкім вярхам, а таксама вышэйшаму духавенству.

У 1561 г. Рэчыца атрымала права на самакіраванне (няпоўнае магдэбургскае права). Гараджане вызваляліся ад шэрагу феадальных павіннасцей, маглі займацца рамяством, гандлем ці земляробствам, выбіраць гарадскі орган улады — магістрат, суд, ствараць рамесныя аб'яднанні — цэхі.

У XV – XVI стст. феадальная ўласнасць на зямлю ўзрасла. Адбылося гэта за кошт захопу феадаламі абшчынных зямель. Дарэчы, працэс юрыдычнага запрыгоньвання сялян у Вялікім княстве Літоўскім быў пакладзены яшчэ Прывілеем 1447 г. Менавіта гэты дакумент забараніў пераход прыватнаўладальніцкіх сялян ад аднаго феадала да другога. Юрыдычна замацавалі прыгоннае права Статуты Вялікага княства Літоўскага, якія згадваліся вышэй, і асабліва Статут 1588 г.

У 1557 г. былі выдадзены «Уставы на валокі». Меркавалася, што яны прывядуць да павелічэння фальварковых панскіх гаспадарак. Але гэтага не адбылося, бо ажыццяўленню рэформы перашкодзіў шырокі сялянскі рух, які ў першай палове XVI ст. ахапіў і тэрыторыю сучаснага Рэчыцкага раёна. Сяляне выступілі супраць дадатковых павіннасцей, разлічаных на папаўненне велікакняжацкага скарбу. Пачаліся масавыя ўцёкі насельніцтва з парубежных валасцей на тэрыторыю Расіі. Гэта быў непажаданы працэс, які вёў да аслаблення Вялікага княства Літоўскага. Таму ўлады прыйшлі да высновы: на ўсходзе Беларусі ўвядзенне новых павіннасцей патрэбна абмежаваць. Гэта было зроблена і на тэрыторыі Рэчыцкага павета. На дзяржаўных землях была праведзена палавінчатая рэформа: зямельныя ўчасткі ўраўноўваліся, устанаўлівалася плата за іх і павіннасці. Плата бралася з сялянскага двара («дыма»). Разам з тым узраслі памеры натуральнай і грашовай рэнты. Гэта вяло да далейшага збяднення сялянства. Спадарожнікамі жыхароў Рэчыцкага павета былі частыя голады. Найбольш вядомы з іх напаткаў нашых прашчураў на пачатку XVII ст. Бедству спрыяла і надвор'е. Сабраць ураджай не далі дажджы. А потым, калі прыйшоў час малаціць, усё засыпаў снег. Дарэчы, аб тым апавядае Баркулабаўскі летапіс — помнік беларускай пісьменнасці XVI – XVII стст. З летапісу бачна, што той страшэнны голад прывёў да чарговага бегства насельніцтва з родных мясцін.

Канец XVI — пачатак XVII ст. З Баркулабаўскага летапісу — помніка беларускай пісьменнасці XVI—XVII стст.

...Того ж року 1601 месеца октобра 10 дня целую неделю снег силный и кгвалтовный ишол, выпал до полголени; также и буря силная была. Тогды пшеницы, ярицы, овес, гречиху, горохи и вси овощы, великое множество ярицы на полях непожатые, также и копы жатые снегом позаметала метелица, иж было

жалостно и страшно гледети и выповедити уздыханя и плачу людей убогих, пашников немаетных. А так лежал тот снег 2 недели аж до Дмитровы суботы; якож з великих морозов р. Днепр был замерз, и ездили по нем, яко серед зимы. А потом за ласкою всемилостивого господа бога для плачу и великого уздыханя снег ростал и р. Днепр расплынулся. А потом почали жати-горовати по снегу у стужу. Были теж морозы великие, огне клали, сами грелися, иж страшно и жалосно было гледети: 3—2 чел. на ден ледво снопов 40 нажнут овса албо арицы, бо велми к земли прилегло. Люди убогие яр на весне жали-горевали, але вже токо для статку, а того много статками на весне сами господари свое збоже травили; маки, горохи, бобы, проса, репа — то все згола погинуло...

...А тот гнев божий был и непогода, почавши от Менска до Полоцка к Витебску, до Орши, до Мстиславля, до Пропойска, до Рогачева, Могилева, Любошаны. Потом у Речицы, в Лоеве, в Киеве аж на Волын добрый врожай был. А так потом много множества людей убогих з голоду на низ з жонами и детками и з семею, што иж страшно было не только видети, але трудно было и выписати...

Могилевская старина. Вып. 1. Могилев. 1901. С. 5, 12—13.

У 1569 г. Вялікае княства Літоўскае і Польшча заключылі Люблінскую унію. Згодна з ёю аб'ядналіся ў федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую. Праз заключэнне уніі магнаты Вялікага княства меркавалі атрымаць з боку Польшчы саюзніка ў барацьбе супраць тэрытарыяльных дамаганняў Маскоўскай дзяржавы. Уласныя мэты ставіла і вярхушка каталіцкай Польшчы. Галоўная з іх — далейшае распаўсюджанне каталіцызму на ўсходнеславянскія землі.

Фармальна Вялікае княства Літоўскае захавала свае органы ўлады, войска і заканадаўства. Фактычна ж трапіла ў залежнае становішча, бо ўнутранай палітыкай урада Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Беларусі стала насаджэнне каталіцызму і «пальшчызны».

Магнаты і шляхта Вялікага княства згубілі былое палітычнае вяршэнства. Перастаў існаваць сейм, у якім яны праводзілі дагэтуль свае рашэнні. Большасць жа членскіх месцаў у агульным сенаце Рэчы Паспалітай аказалася за палякамі. Шляхта Вялікага княства не мела правоў на атрыманне зямлі ў раёнах, якія былі гвалтоўна адарваны Польшчай у 1569 г. А вось польская шляхта займела магчымасць на атрыманне зямлі ў межах княства. Значна пагоршылася сацыяльнае становішча сялянства, бо ўзмацніліся ўсе формы феадальнага прыгнёту. Насельніцтва Вялікага княства, у тым ліку і Рэчыцкага павета, адчула востра і ўціск нацыянальна-рэлігійны. Гэта прывяло да далейшага абвастрэння класавых супярэчнасцей феадальнага грамадства Беларусі.



Старонка з «Баркулабаўскай хронікі» XVII ст.

Антыфеадальныя паўстанні

У 1595 г. на Украіне ўспыхнула антыфеадальнае паўстанне пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі, якое неўзабаве перакінулася на Беларускае Палессе.

Гісторык В. І. Пічэта выказваў думку, што менавіта беларускія сяляне паклалі пачатак Запарожскай Сечы «как убежищу для противофеодальных элементов Речи Посполитой» (Белоруссия и Литва XV — XVI вв. М.: 1961. С. 574). Па ўсёй верагоднасці, В. І. Пічэта, схіляючыся да такой думкі, некалькі перабольшвае ролю белару-

скага сялянства ў стварэнні Запарожскай Сечы, але галоўнае ў іншым — шырокі ўдзел беларусаў у фарміраванні гэтай арганізацыі казацтва не выклікае сумнення.

30 лістапада 1595 г. атрад Налівайкі авалодаў Магілёвам. Пасля штурму разрабавалі яго. Праз два тыдні казацкія атрады Магілёў пакінулі, збаяўшыся 18-тысячнага войска Рэчы Паспалітай, якое падышло да горада.

Севярын Налівайка са сваімі паплечнікамі адступаў праз Быхаў і Рэчыцу. Па дарозе нішчыў маёнткі свецкіх і царкоўных феадалаў.

У 1602—1603 гг. на тэрыторыі Рэчыцкага павета дзейнічалі сумесныя атрады казакаў і паўстаўшых сялян.

У 1596 г. была падпісана Брэсцкая царкоўная унія. У выніку такога пагаднення праваслаўная царква аб'ядноўвалася з каталіцкай. На аснове аб'яднання стваралася царква уніяцкая. Гэта таксама выклікала ў нашых мясцінах рост рэлігійна-палітычнай барацьбы.

Час з 1633 па 1647 год адметны адсутнасцю буйных выступленняў сялянства і нізоў гарадскога насельніцтва. Шляхта не дарэмна назвала гэты перыяд «золотым спокойствием». Але неўзабаве ўсё перайначылася.

Штуршком для пад'ёму антыфеадальнага руху ў сярэдзіне XVII ст. і пераўтварэнні яго ў антыфеадальную вайну 1648—1651 гг. адыграла народнае паўстанне на Украіне пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Пры Жоўтых Водах (6 мая) і пад Корсунем (16 мая 1648 г.) казакі атрымалі перамогі. Гэта выклікала значныя ўзброеныя антыфеадальныя выступленні беларускіх сялян і гараджан, і асабліва ў тых мясцовасцях, якія прымыкалі да Украіны.

Адразу ж пасля бітвы пад Корсунем Багдан Хмяльніцкі накіраваў у беларускія гарады сваіх надзейных людзей, якія добра ведалі гэтыя мясціны. Накіраванцы Хмяльніцкага прыбылі цішком і ў Рэчыцу, пачалі распаўсюджваць універсалы, у якіх Хмяльніцкі заклікаў да барацьбы з Рэччу Паспалітай.

У тым жа 1648 г. у раён Брагіна, Гомеля і Рэчыцы прыбыў казацкі атрад Галавацкага. Затым сваіх людзей на тэрыторыю Беларусі прывялі Нябаба, Гаркуша, Крывашапка і інш. З'яўленне ў Беларусі новых казацкіх атрадаў і стала штуршком да антыфеадальнага паўстання. Іезуіт-шавініст Каяловіч, напрыклад, адзначаў: сяляне паўсюдна браліся за зброю і далучаліся да казацкіх атрадаў.

1648 г. ліпеня 10. З пісем, атрыманых каралём Янам Казімірам з лагера польскіх войскаў

В Загале стоял на квартирах полк пана Воловича, писаря Вел. кн. Лит. Несколько тысяч казаков пробрались к городу, соединенным строем напали на отряд пана Фаленцкого, стоявший под городом, и уничтожили его. Наконец стража вступила в бой, и наши оправились. Пан Доновой старый стоял храбро с своей пехотою. Когда казаки были вытеснены в поле, то наши бросились на них с саблями. Их было до 2000. Обращенные в бегство, они добрались до болот и стали тут окапываться: наши добывали штурмом, пока казаки не побежали к болотам, где едва 1000 спаслась бегством.

Один из двух старшин этой вольницы — Голота — убит, а другой — Кисель — ушел. Другой полк казацкий, под командою Гловацкого, пошел на Речицу. Пан стражник Мирский, узнав об этом, прибегнул к хитрости: подкупил мужика и выслал его навстречу казакам, чтобы их навел на войско, скрытое в разных местах, и уверил, что в той деревне находится только несколько сот молодых солдат для получения хлеба.

Казаки поверили и сделали быстрое нападение. Наши, готовые к бою, велели молодым солдатам в числе нескольких десятков делать вылазки; наконец навели казаков на наше войско. Бог послал такое счастие, что ни одна душа не ушла, а Гловацкого взяли живьем и посадили на кол...

Пераклад с польской мовы

Памятники, изданные Киевской временной комиссией для разбора древних актов. Т. 1. Изд. 2. Отделение III. Материалы для истории Малороссии. Киев. 1848. С. 446—448.

1654 г. ліпеня 15. З пісьма наказнога гетмана Івана Залатарэнкі цару Аляксею Міхайлавічу аб баявых дзеяннях ягоных войскаў і разарэнні палякамі беларускіх гарадоў, у тым ліку і Рэчыцы

Список с листа, что писал ко государю царю и вел. Кн. Алексею Михайловичю ... [Т], нежинской наказной гетман Иван Золоторенко с подьячим с Яковом Портомоиным в нынешнем во [7] 162 [1654] г. июля в 22 день.

Божиею милостию, великому государю царю и вел. кн. Алексею Михайловичю ... [Т], Иван Микифорович, гетман наказной от его милости пана Богдана Хмелницкого, гетмана Войска Запорожского,

и слуга вашего царского величества со унижением челобитный мой поклон под ноги в. ц. вел. со всем Войском Запорожским, яко верный и желателный, смиренно отдаюсь.

...Того ж бога всемогущего, в троице святой единого, усердно молим, чтобы короли, княжата, места сильные и недобытые в. ц. вел, помазаннику божию, вскоре прилучить, чтобы счастьем в. ц. вел всякий народ нигде отстоятися не мог, приятно от сердца желаем и верне хотим. По росказанию в. ц. вел. шли есмя с Войском Запорожским, при мне будучем на Гомель, в котором на заставе от ляхов стоит ратных людей не мало, как я чрез Петра Забелу до в. ц. вел. писал, в замку, велми оборонном, стрелбы и порохов и запасов немало имеючих; до которых писали есмя имянем в. ц. вел. и Богдана Хмелницкого, гетмана Войск Запорожских в. ц. вел. На что они гордо и сурово до нас отписали, которых листы в. ц. вел. отсылаем.

А мы, выразумевши из тех листов, что, когда их тут оставим не добывши, всей Литве и войскам их сердца и смелости додадут.

Те же неприятели, по отступлению нашему, выпадши из тое ямы разбойническия, с того голоду, как есмя их принудили и из пушек надбили, в наши краи впадши, жон и детей наших живых пускати не будут и места в. ц. вел. украинные испустошат. Стоячи под тем Гомлем, посылали есмя в загоны, которые по той там стороне Днепра замки и места поимали, и под мечь непослушные; а городы, которые нам шкоды прежде чинили, попалити велели есмя, особный замок Речицкий, замок Злобин, замок Стрешин, замок Рогачев, замок Горволь позжено.

Волощаня, как речицкие, гомельские, такожде и селяне тех мест, которые по лесам крылися, счастьем в. ц. вел. поклонилися и от нас листы взяли, имеют в наши городы итти на житье. В том же листу в. ц. вел. указ нам итти с Тимофеем Ивановичем Спасителевым под Смоленеск, чего мы, яко желаем елень на источники водные, так мы желаем в. ц. вел. служити; однако ж тех врагов наших, позадь нас будучих, есть дело велми не безстрашное оставить.

...При том дай, Христе, царю, чтоб есмя в. ц. вел. в добром здоровье во всяких радостных потехах победителем над неприятелми счастливе государствуючего, долголетне зрети могли.

Дан из табору под Гомлем июля 15 дня от рождества христова 1654.

В. ц. вел. наинижайший слуга и верный подданный Иван Микифорович, гетман наказный от Богдана Хмелницкого, гетмана Войск Запорожских в. ц. вел.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. XIV. СПб. 1889. С. 135—138.

Супраць казацка-сялянскіх атрадаў былі кінуты вайсковыя сілы пад кіраўніцтвам магната Вялікага княства Літоўскага Януша Радзівіла. Але летам 1648 г. казацка-сялянскія атрады атрымалі шэраг перамог над шляхецкім апалчэннем і войскам Вялікага княства, якое складалі наёмнікі.

У раёне Рэчыцы паўстанцы разграмілі харугвы пад камандаваннем пісара Вялікага княства Літоўскага Валовіча. Не пашанцавала і пану Мірскаму. Ягоны атрад каля Горваля пераправіўся праз Бярэзіну, але быў сустрэты атрадам Гаркушы. Давялося спехам адступаць.

Януш Радзівіл быў незадаволены такім ходам падзей. Прычакаў падмацавання і ў наступным 1649 г. падышоў да Рэчыцы. Пачаўся штурм горада. Ягоныя абаронцы



Рэчыца. З малюнка 1649 г.

паказалі мужнасць, але вымушаны былі адступіць.

Пасля заняцця Рэчыцы распачаўся пошук паўстанцаў, якіх чакала жудасная расправа.

Багдан Хмяльніцкі накіраваў да граніц Вялікага княства Літоўскага новы атрад казакаў у тры тысячы чалавек. Іх павёў Ілля Галота. Ранняй вясной 1649 г. атрад пераправіўся праз Прыпяць, разграміў некалькі гарнізонаў Вялікага княства.

Януш Радзівіл пісаў 13 красавіка 1649 г. гетману Вялікага княства Янушу Кішку: «Даже в тех самых местах, где стоит войско, крестьяне, возбуждаемые казаками на дерзкие поступки, начинают восставать и скопляться по лесам...»

Рэшткі абаронцаў разгромленых гарнізонаў беглі да Рэчыцы.

Януш Радзівіл. Гравюра XVII ст.

1649 г. красавіка 28. З пісьма невядомага, які знаходзіўся ў польскіх войсках

По краткости времени ничего не пишу вам о наших нуждах и голоде; расскажу только, что случилось. Полк е. м. пана гетмана стоит в Речице (куда я отправлен был от своего товарищества посоветоваться о нашем горе, о том, что мы служим, а платы не получаем). В Речицу приведен Фесько, сотник брасинский, который на допросе показал, что в великую субботу полковник Небаба вступил в Гомель с 2500 казаков, что у него наиболее опытной пехоты; у полковника Макеры до 6000 чел., в Лазове и Брагине. В Говнице Напальщиц имеет до 6000 чел. и с ним шляхтич Горностай сотник. Вышеупомянутый сотник с 80 чел. пришел было к Гельману, где был поставлен для защиты ловчий стародубский Соколовский с отрядом из 150 чел. Неприятель хотел напасть ночью, но прежде сам сотник пошел против отряда, отправленного из Речицы для разъездов. Сотника взяли, однако ж с трудом, а другие не дали взять себя и сгорели вместе с избою. Вышеупомянутый сотник оставил было своих людей на острове, но принужден был объявить о них, и туда послано 200 чел. немецкой пехоты, которая перестреляла казаков. Тот же сотник говорил, что хотя Хмельницкий и хотел бы помириться, но не может, ибо чернь так разъярена, что решилась или уничтожить шляхту, или погибнуть; тем временем из полка Речицкого погибло до 100 чел. Мы уже удостоверились, что мужики, уходя, разными способами ловят наших, от чего множество поселян гибнет в лесах и пр.

Пераклад з польскай мовы.

Памятники, изданные Киевской временной комиссией для разбора древних актов. Т. 1. Изд. 2. Отдел III. Материалы для истории Малороссии. 1848. С. 390–392.

1649 г. не раней ліпеня — не пазней снежня... З запіскі царскага ганца дзяка Кунакова аб бітве пад Рэчыцай войскаў Міхаіла Крычэўскага з войскамі Януша Радзівіла і адпраўцы Багданам Хмяльніцкім войска пад камандаваннем Івана Нячая на тэрыторыю Беларусі

...Богдан же Хмельницкой до пакт, будучи под Збаражем, послал на литовского гетмана на Януша Радивила полковника кума своего Кричевского, а с ним козаков и гультяйства 40 000 чел.

И Кричевской сшол Януша Радивила у Речицы, а с Янушом Радивилом было войска 8000 чел.; и гетман стал обозом у р. Днепра на городцкой стороне.

И полковник Кричевской розделил войско свое на двое, и с половиною полку своего пошол к гетманскому обозу полем, а другую половину полку своего послал р. Днепром в байдаках, а ударить было им на гетманской обоз вместе. И пошли Кричевского полку хлопи к гетманскому обозу на похвале: всякого было по два аркана, гетманского войска людей имая, взять.

И ударили, не дождався плавные. И того Кричевского на поле гетман Януш Радивил побил на голову, и самого Кричевского взяли в гетманской обоз ранена, и в гетманском обозе ранен умер.

А плавное Кричевского войско пришли на гетманской обоз р. Днепром, опознясь и не ведая того, что Кричевской побит; и из гетманского обозу ударили по тем байдакам из наряду и потопили 7 байдаков, а достальные розбежались...

И Богдан де Хмельницкой стал в недоуменье и учал сбирать войско, а готового де при нем войска: польских и литовских шляхты, которые учинены были банитами, 6000 чел. да татар крымских 20 000 чел., да Запорожского Войска с 40 000 [чел]. А шляхта де баниты паче всех Богдана Хмельницкого к войне на Польшу наговаривают: «Такие де нам поры николи не будет; теперь-то де и смирить, покаместа не справились».

Да Богдан же де Хмельницкой послал полковника своего Нечая, а с ним войска козаков и гультяйства 50 000 чел., а велел им стоять на Горыни, от Вильны в 50 милях, а от Копыля в 20 милях. И ныне де тот полковник Нечай с войском на реке на Горыни стоит, а для де чего Богдан Хмельницкой того своего полковника Нечая на Горынь послал и что ево, Богданова, мысль, того ныне подлинно неведомо...

Да и то де паны рада мыслят: как у короля будут государевы великие послы, и им бы паном раде всякими мерами на омылки ответы учинить; и в прежних царского величества грамотах и е. ц. вел. великих послов и посланников в ответных и во всяких писмах досматриваются безпрестани, чтоб какая хоти малая омылка сыскать, а преж бы всех дел вечное докончанье подкрепить, а польские де и литовские бискупы и кознодеи по волшебным своим книгам дочитаются: сего де пришлого 1650 року будет знаменье — два затменья в солнце да два затменья в месеце; и то де досвечоная речь, что то все на погибель Речи Посполитой, и одолеет де в Польше и в Литве римскую веру грецкая вера вскоре.

И та у них речь обносится во всех людех, и от того де наипаче в польских и в литовских людех ужасть великая.

Да у них же де обносится речь, что Богдан Хмельницкой писал ныне к царскому величеству, чтоб Киев и всее Белую Русь и его, Богдана, со всем войском изволил великий государь, его царское величество, приняти под свою государьскую высокую руку...

АЮЗР, Т. III. СПб.: 1862. С. 398, 404, 405.

Тут знаходзіўся добра ўмацаваны лагер.

Упартая барацьба ішла з пераменным поспехам. Шляхцічам і наёмнікам Вялікага княства ўдалося стрымаць паўстанцаў на лініі Мазыр — Рэчыца — Чачэрск. Але для шырокіх наступальных дзеянняў сілы не было.

Да Рэчыцы на падмацаванне Радзівілу прыйшлі новыя атрады. У першай палове 1649 г. войска Вялікага княства ўзяло пад кантроль поўдзень Беларусі, у тым ліку і тэрыторыю Рэчыцкага павета.

7 чэрвеня Ілля Галота загадаў свайму атраду выступіць да Загалля (Рэчыцкі павет) на лагер войска Вялікага княства. Казакі на чаўнах спусціліся па Прыпяці да Краснага Сяла. Мясцовыя сяляне паказалі ім бяспечную дарогу да Загалля.

Была жорсткая сеча. Казакі пацярпелі паражэнне. Справу вырашыла кавалерыя, якая на дапамогу шляхціцам прыйшла з Рэчыцы. Ноччу рэшткі казацкага загону балотнымі сцяжынамі адышлі да Прыпяці. Што да самога Іллі Галоты, то ён, цяжка паранены, не змог выбрацца ў бяспечнае месца. Раніцай быў знойдзены шляхціцамі і рассечаны на кавалкі.

1649 г. ліпеня 7. З адпіскі пуціўльскіх ваявод цару Аляксею Міхайлавічу аб бітве пад Рэчыцай войскаў Івана Галоты з польскімі войскамі

Государю царю и великому князю Алексею Михайловичу всеа Русии холоп твои Микифорко Плещеев челом бьет.

Нынешнего, государь [7] 157 [1649] г. июля в 28 день писал я, холоп твой, к тебе, государю царю и великому князю Алексею Михайловичю всеа Русии, к Москве в Посольской приказ и Розряд с московским торговым человеком с Перфильем Зеркольниковым, что я, холоп твой, по твоему государеву указу послал в литовскую сторону путивльца Кузму Титова с товарищи 5 чел., а велел государь им в литовской стороне проведать всяких вестей про польского короля и про поляков, и про черкас, и про татар о всем подлинно против твоего государева указу.

И июля, государь, в 7 день Кузма Титов с товарыщи приехали в Путивль, а в роспросе мне, холопу твоему, сказали: были де, государь, они за Днепром в Киеве и поехали они в иные городы дале Киева проведывать подлинных вестей; и, не доезжая де гор. Василькова, встретились с ними черкаские станичники человек з 20, посланы от гетмана Богдана Хмельницкого по литовским городом с листами; и те де, государь, станичники черкасы сказывали им, что де татаровя стоят от них только в 15 верстах, и проехать де им, Кузме Титову с товарыщи, от тех татар дале тово не мочно; а тех де, государь, станичников

провожали татарские толмачи; а вестей де, государь, им, Кузме Титову с товарыщи, те черкасы сказали, что король де польской Казимер стоит ныне в гор. Жеславле, а обоз де его королевской стоит под гор. Львовом и на Глиняном поле; а гетман де, государь, польной у ляхов пан Фирлей, а сним де, государь, гетманом польным, паны Корецкой, да Синявской, да князь Вишневецкой со многими польскими ратными людми; а гетман де, государь, литовской Радивил стоит в собранье в литовских городех, а с ним де, государь, гетманом Радивилом, в зборе литовских ратных людей тысечь с 30; да в том же де литовском повете в гор. Речицы стояли в зборе литовские люди с паном Воловичем, да с паном Патцем, да с паном Сапегою, а хотели де, государь, оне итти для войны на сю сторону Днепра на литовские украинные городы, в которых городех черкасы живут; и доведовся, государь, про то гетман Хмельницкой, посылал от себя черкас с полковником з Голотою к гор. Речице, и те де, государь, паны: пан Воловичь, да пан Патц, да пан Сапега с ратными людми тех черкас побили и полковника де, государь, Голоту убили; и гетман де, государь, Богдан Хмельницкой после того послал против тех панов черкас 2 полка, полк Киевской да полк Черниговской, а с ними татар крымских...

А больши де, государь, тово они иных вестей не слыхали...

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. III. Доп. СПб.:1862. С. 70—71.

Вестка аб гібелі Іллі Галоты дайшла да Багдана Хмяльніцкага. Нягледзячы на тое, што асноўныя ягоныя сілы знаходзіліся на захадзе Украіны, Хмяльніцкі накіраваў у Беларусь шэсць тысяч казакаў чарнігаўскага палка на чале з Гаркушам і Падабайлам. Казацкія загоны сталі лагерам каля Лоева. Іхняя пазіцыя была ўдалай: Дняпро і Сож прыкрывалі лагер з трох бакоў, а з чацвёртага — балота.

Радзівіл накіраваў да Лоева разведку. Атрымаўшы неабходныя звесткі, пакінуў умацавальны гарнізон у Рэчыцы, выслаў да Прыпяці вартавыя атрады кавалерыі, сам жа з асноўнымі сіламі накіраваўся да Лоева.

Багдан Хмяльніцкі паслаў у Беларусь яшчэ дзесяць тысяч казакаў кіеўскага палка і дзве тысячы казакаў чарнобыльскага палка, тры з паловай тысячы палка оўручскага і дзве тысячы казакаў на чале з Рыгорам Галотам, братам Іллі Галоты. Агульнае кіраўніцтва гэтым войскам было даручана кіеўскаму палкоўніку Міхаілу Крычэўскаму.

Казацкія загоны пераправіліся праз Прыпяць, разбілі вартавыя атрады Вялікага княства, рушылі да Рэчыцы. У горадзе ўзнікла паніка. Але да бітвы справа не дайшла, бо Крычэўскі даведаўся: асноўныя сілы Вялікага княства каля Лоева і смяротная небяспека пагражае Гаркушу і Падабайлу. Крычэўскі павярнуў свае сілы на Лоеў. Казацкія атрады прайшлі праз Холмеч. Жыхары мястэчка дапамаглі паўстанцам харчамі.

31 ліпеня 1649 г. атрады Міхаіла Крычэўскага атакавалі войска Радзівіла. Адбылася самая буйная падчас антыфеадальнай вайны бітва. Перамога была за войскам Вялікага княства. На полі бітвы засталіся звыш 8 тысяч загінуўшых казакаў, каля 3 тысяч патанулі ў Дняпры. Сам Міхаіл Крычэўскі быў цяжка паранены, трапіў у палон і праз некалькі дзён памёр.

Радзівіл накіраваў каралю і сейму паведамленне аб перамозе. Лічыў, што дарога на Украіну перад ім свабодная. Але пазней, узважыўшы свае магчымасці, зноў прыйшоў у Рэчыцу, у свой умацаваны лагер.

8 жніўня 1649 г. Багдан Хмяльніцкі быў вымушаны падпісаць у Зборава перамір'е з Рэччу Паспалітай. Выконваючы ўмовы дагавора, Хмяльніцкі адклікаў казацкія атрады з Беларусі. Войска Радзівіла, якое знаходзілася ў Рэчыцкім лагеры, пачало карныя дзеянні супраць мірнага насельніцтва.

Вядома, перамір'е ў Зборава не магло быць доўгім. Так яно і здарылася.

У Рэчыцкім павеце паўстанне супраць шляхты распачалі жыхары Горваля. Супраць непакорлівых з Рэчыцы выступіў атрад драгун. Сяляне далі ім бой. Але сілы былі няроўнымі. Бачачы тое, многія з паўстанцаў падаліся ў лясы, пачалі дзейнічаць метадамі партызанскай вайны. Партызан пад той час называлі «лесунамі».

Толькі летам 1651 г. шляхціцы здолелі задушыць паўстанне горвальцаў. Але невялікія групы «лесуноў» дзейнічалі ў Рэчыцкім павеце і пазней. Так, стражнік Вялікага княства Літоўскага Мірскі паведамляў Радзівілу, што 23 чэрвеня 1653 г. у лагер вярнуўся конны атрад, што накіроўваўся разбіць «лесуноў», каторыя дзейнічалі каля Рэчыцы. Атрад, пісаў Мірскі, «...шел за теми лесунами до самого Сожа», аднак здагнаць іх не здолеў, бо яны, лесуны, «...имея приготовленные челны, легко переправились и крестьян с той стороны с собой увели».

Да восені 1651 г. народны рух на Бела-

русі быў задушаны. Але менш чым праз тры гады адбыўся новы пад'ём антыфеадальнага руху ў сувязі з пачаткам вайны паміж Расійскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай. Ён быў лагічным працягам папярэдніх масавых антыфеадальных выступленняў народных мас. Па-другое, быў ідэалагічна тонка падрыхтаваны Масквой, якая падавала сябе заступніцай інтарэсаў праваслаўнага насельніцтва Беларусі.

Але спадзяванні жыхароў Вялікага княства Літоўскага не спраўдзіліся. Царскія войскі ды казацкія атрады рабавалі гарады, мястэчкі і вёскі не менш, як шляхціцы.

З самага пачатку вайны тэрыторыя Рэчыцкага павета стала арэнай ваенных дзеянняў. У маі 1654 г. наступленне ўздоўж Дняпра распачалі казацкія палкі (20 тысяч чалавек), на чале якіх быў І. Н. Залатарэнка. У жніўні казакі занялі Рэчыцу, праз некалькі дзён — Горваль.

Далейшы шлях загонаў Залатарэнкі ляжаў на Стрэшын, Жлобін, Рагачоў і Чачэрск.

1653 г. паміж мая 30 і чэрвеня 8. Адпіска тарапецкага ваяводы С. М. Вельямінава ў Пасольскі прыказ аб роспытах тарапецкіх гандлёвых людзей М. і С. Бяляевых (Чыр'евых), Ф. Сталбыніна і А. Пазднякова, якія прыехалі з Віцебска і Вільні і чулі, што і ў Рэчыцы стаяць войскі, варожыя рускаму цару

Государю царю и великому князю Алексею Михайловичю всеа Русии холоп твой Стенька Вельяминов челом бьет.

В нынешнем, государь, во 161 году майя в 28 день приехали из Литовские стороны торопчаня посадцкие лутчие люди Михайло да Семен Чирьевы. А в приказной избе сказали мне, холопу твоему: Были де оне, Михайло, в Витебске, а Семен в Вильне. И слышали де они от шляхты и от мещан, что турской царь перевесся через Дунай реку, а стоит де в Мултанской зем[ле]. И гетман де черкаского войска Богдан Хмельнитцкой хочет сам ехать к турскому царю бить челом, чтоб он пришел к нему на помочь на польских и литовских людей. А где де таперь король, ани де про то не ведают. А то де онне слышали, что королю Казимеру санатыри все не верят, итить ему на черкас не велели, а говорят де, что де он делает с Хмельнитцким все по совету. А к гетману де ксенже Яну Родивилу писал свояк ево, Хмельнитцково сын Тимофей, — будет де ты хошь с нами жить в совете, и ты де против нас не ходи. А ныне де гетман ксенжа Родивил в Вильне живет. Да они ж де слышали, что цысарской король прислал на помочь на черкасы к королю Казимеру 7000 немец. А польские де люди стоят обозом под Белою Церковью, а осадили де их черкасы. А литовские люди стоят в Речице и в Бобруйске. А в украинных де в литовских городех во всем береженья великое, берегутца приходку твоих государевых ратных людей. И порубежных городов для береженья всем людем велено быть в порубежных городех, и поветные люди все пописаны в осаду.

Да в нынешнем же, государь, во 161 году майя в 30 день приехали из Литовские стороны торопчаня посадцкие люди Федька Столбынин да Архипка Позняков. А сказали передо мною, холопом твоим, что были де оне в Литовской стороне в городе в Витебске, а из Витебска де поехали тому 2 недели, и при них де приехали в Витебск могилевцы торговые люди, а сказывали им, что у польских и у литовских людей перед вешним Николиным днем с черкасы з гетманом з Богданом Хмельнитцким бой был, и черкасы де литовских людей гораздо побили.

Ф. Сношения России с Польшей. 1653 г. Стб. № 1. Ч. II. Лл. 290—291.
Русско-белорусские связи. Мн.: 1963. С. 280—281.

1653 г. ліпеня 27. Роспыт у Бранскай прыказной ізбе работніка гандлёвага чалавека гасцінай сотні Андрэя Ісакава Ф. Аргамачнікава аб паездцы яго ў Магілёў па «будняй справе», дзе ён паведаміў, што польскія войскі стаяць у Рэчыцы

161 году июля в 27 день. Во Брянске в съезжей избе перед стольником и воеводою перед князем Григорьем Даниловичем Долгоруково гостиные сотни Андреев человек Исакова Федька Аргамачников в роспросе сказал:

Посылал де меня за рубеж в Литовскую сторону Андрей Исаков в город Могилев к Олександру Войне для будного дела. И побыл у нево недель з 20 и больши. И после де таво был я и в другом городе в Галовчине. И слышел ото многих людей, что король был в Бресте, а послы де государевы, боярин князь Борис Александрович Репнин с товарищи, пошли в город Брест; и как де король послышал, что послы государевы идут в город Брест, и он де пошол из Бреста к морю в-ыной город, а как город славет, и я топропамятавал; а послы де государевы стоят в Бресте, а встреча им была большая, а корм де к ним посылают большой, и они тех кормов не примают. А хто де теперь в городе Бресте начальных людей и пристав, тово не ведаю. А послом де государевым указано итти за королем, хотя за моря, и велено им короля доходить. А обоз де ксенжи Родивила сын его стоит в Речицы, а иных полков нигде нет.

Ф. Сношения России с Польшей. 1653. Стб. № 1. Ч. III. Л. 590.
Русско-белорусские связи. Мн.: 1963. С. 282—283.

1654 г. студзеня 22. Роспыт у Пасольскім прыказе вяземскага гандлёвага чалавека С. Калужкі, які ездзіў у Оршу, Магілёў і іншыя гарады і паведаміў разам з іншымі звесткамі, што польскія войскі прыйшлі з-пад Рэчыцы да Магілёва

162-го генваря в 22 день. В Посольск[ом] приказе явился вязьмятин торговой человек Стенька Колужка, а в роспросе сказал:

По государеву де указу имали ево с собою в Литв[у] государевы великие послы, боярин князь Борис Александрович Репнин с товарыщи. И как де ево те государевы великие послы отпустили из Орши в Могилев с товары и для проведыванья вестей, и он де в Могилеве жил 17 недель. И как де он послышал, что пришол из обозу и под Речицы литовской гетман ксенжа Радивил в местечко Головчин, от Могилева 25 верс[т], ездил из Могилева в Головчин к гетману для того, чтоб осмотреть гетманова войска и розведать вестей. И будучи де он в Головчине у гетмана, был за неделю до Николина дни. И гетман де у него смотрил товаров — соболей и шуб собольих и лисиц. Да при нем де, Стеньке, пришол к нему гетману, ис под Речиц же полковник Корх, а с ним 12 хоронг, половина жолнерей, а другая драгунов. А говорили гетману Родивилу, чтоб он позволил им стоять на леже в Могилеве. И гетман де в том ему отказал, в Могилев им итти не велел, а велел итти на лежу в Могилевской уезд в Чаусы и в Смоленской и в Дорогобужской и в Рословской уезды, и приказывал им, чтоб они с московскими людьми задору никакова не чинили. А как де он, Стенька, был у гетмана у Радивила, и гетман де ему говорил: ведомо де им учинилось, что у царского величества ратные люди собраны многие, а хочет царское величество наступить на них войною, а им де ныне и без того трудно и государство их поопустошено, а царскому де величеству за такие малые дела вечного докончанья розорвать и войною наступать на них не за что.

А которые де люди тут были з гетманом, и те де все говорят, что оӣи от царского величества ратных людей страшны.

Да он же де, Стенька, слышел в розговорех у Родивиловых слуг, что крымский хан с польским королем помирился. А на которых мерах помирился, навек или для того чтоб короля из осады выпустить, и черкас тут замирил ли или нет, про то де они не ведают. А как де крымский хан, помирясь с королем, пошол назад в Крым, и, идучи, де черкасом шкоду починили большую.

И побыв де гетман в Головчине, поехал в Менск на трибунал, а трибунал был о Крещении господни. А маршалок де трибунальной бывшей воевода смоленской Глебович.

А как де гетман поехал в Минск, и с ним де приказывал гетман Родивил, чтоб он, Стенька, купил на него, гетмана, товаров, а каких товаров, и тому дал ему роспись. А искупя б те товары, приехать к нему, гетману, вскоре. Да он же, гетман, послал с ним, Стенькою, лист за своею рукою и за печатью, а велел ево отдать Петру Вяжевичю.

А как де гетман поехал в Минск, и слуги де ево спрашивали которою дорогою им ехать в Минск. И гетман де им велел ехать на Березиню, а на Борисов прямою дорогою ех[ать] не велел, для того что в то время было там моровое поветрее, а в Вильне де моровое поветрее миновалось, и которые люди от мору из Вильны вышли было в-ыные места, и те де все собрались опять в Вильну.

Да он же сказал: как де он поехал от гетмана и был в Могилеве ж и в Шклове и в Орше и в Копыси, и в тех де городех всяких чинов люди говорят: как государевы ратные люди на Польшу и на Литву наступят, и они де под государеву руку готовы, а стоять против государевых людей нигде не станут. Да он же де был и в Глебовичеве маетности в Дубровне, и в тех де вышеписаных городех, в Орше и в Могилеве и в Шклове и в Глебовичеве маетности, в Дубровне, ратных людей никого нет, только тутошные жильцы.

А ехал де он из Орши в Вязьму, не займуючи Смоленска и Дорогобужа. А как из Могилева поехал, тому ныне 2 недели.

Да он же, Стенька, слышал, что выбирают депутатов или послов поветных из Орши и из-ыных городов к королю, чтоб король учинил сойм, а с сойму б послал к государю послов.

Да он же де, едучи дорогою, слышел, что смоленская шляхта все высланы в Смоленеск в осаду и береженье де в Смоленске большое, город отпирают в 3-м часу дни, а запирают рано.

А что де государь изволил черкас принять под свою государеву высокую руку, и про то де в Литве ведомо ещо нет. А как де сведают, и у них де будет страхованье большое.

Ф. Сношения России с Польшей. 1654 г. Стб. № 1. Лл. 1—7.
Русско-белорусские связи. Мн.: 1963. С. 288—290.

Пачатак экспансіі Расіі

У 1654 г. праз Рэчыцкі павет прайшлі царскія войскі на чале з А. Н. Трубяцкім і В. П. Шарамецевым. Рэчыца, а таксама населеныя пункты, якія аказалі ім хоць якое супраціўленне, былі вынішчаны. Восенню 1655 г. на поўдзень Беларусі прыбыло царскае войска на чале з князем Дзмітрыем Валконскім. Рабаўніцтвы і разбурэнні пакінуў пасля сябе на Беларускім Палессі і гэты царскі служка. Менавіта

таму значная колькасць насельніцтва Рэчыцкага павета «вызваліцеляў» пачала супраціўляцца ворагу.

Вайна закончылася Андрусаўскім перамір'ем (1667 г.). Рэчыца і амаль увесь павет засталіся ў складзе Рэчы Паспалітай. А зусім побач, за Дняпром (тэрыторыя Баршчоўскага і Белабалоцінскага сельсаветаў Рэчыцкага раёна), стаялі атрады рускага цара.

У 1700 г. распачалася Паўночная вайна Расіі са Швецыяй. Тэатрам баявых дзеянняў стала і Беларусь. Насельніцтва рабавалі і шведы, і рускія.

Пакуль не знойдзены дакументальныя звесткі пра тое, што на тэрыторыі Рэчыцкага павета мелі месца баі паміж рускімі і шведскімі войскамі. Але каля вёскі Азершчына (3 км ад Рэчыцы) сяляне неаднойчы знаходзілі зброю шведаў. Існуе таксама паданне: на месце каля вёскі Заспа адбылася жорская сутычка паміж рускімі і шведамі. Пралілося шмат крыві. Таму і бліжэйшая ад Заспы вёсачка атрымала назву Чырвоны Мост.

23 чэрвеня 1706 г. Пётр I каля Быхава вёў на сваім байдаку перамовы з камендантам быхаўскай крэпасці Сініцкім аб выкананні ім саюзніцкіх абавязацельстваў у барацьбе супраць шведаў. Пасля гэтага рускі цар адбыў па Дняпроўскаму шляху ў Кіеў. Значыць, недзе ў канцы чэрвеня ці пачатку ліпеня Пётр I праплыў паўз Рэчыцу.

Шлях да падвышэння свайго дабрабыту, які сур'ёзна пахіснуўся за час войнаў, феадалы бачылі ў далейшым запрыгоньванні насельніцтва. На працягу XVII — XVIII стст. некалькі разоў павялічвалася норма дармавой прымусовай працы сялян у гаспадарцы феадала. Апроч штотыднёвай паншчыны сяляне выконвалі і павіннасці, звязаныя са жнівом, сенакосам, сяўбой, — гвалты, талокі, згоны.

Узмацненне ўціску вяло да новага разгортвання сялянскага руху. Хваляванні жыхароў мястэчка Горваль, якое належала Віленскаму капітулу, адбыліся ў 1745 г. У 1770-ыя гады ўзброеныя выступленні мелі месца ў Любоніцкім і Стоўпінскім старостваx Рэчыцкага павета. Кіраўніком паўстанцаў быў Павел Лагойка. Толькі ў 1782 г. паўстанне было зломлена. Гэта адбылося пасля таго, як злавілі і пакаралі смерцю Паўла Лагойку. Разам з кіраўніком рэчыцкіх паўстанцаў смерць прынялі і яго-ныя памочнікі Лаўрын Самадзелак і Сымон Пячонка.

А. Рабянок

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Шляхам двух стагоддзяў

У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772 г.) да Расіі адышла ўсходняя частка Рэчыцкага павета. Пасля другога падзелу (1793 г.) — увесь павет.

Рэчыца, шмат разоў разбураная і спаленая, пачала адбудоўвацца ў выглядзе вёскі, што цягнулася ўздоўж Дняпра.

...У далучаных абласцях палітыка царскага ўрада зводзілася ў першую чаргу да таго, каб захаваць «цішыню і спакой». На беларускія гарады, якія мелі магдэбургскае права, а таксама на цэнтры паветаў пашыраліся льготы, якія былі вызначаны ў 1785 г. Дароўнай граматай. Усё насельніцтва, незалежна ад звання і чыну, павінна было ў месячны тэрмін прысягнуць на вернасць царскай уладзе. Памешчыкам, якія давалі такую прысягу, пакідаліся маёнткі і прыгонныя. Яны мелі тыя ж самыя правы, што і рускія дваране. Тыя ж, каторыя прысягаць не жадалі, абавязаны былі выехаць за межы рускай дзяржавы. На працягу трох месяцаў ім дазвалялася прадаваць маёмасць. Калі ж тэрмін, адведзены на гэта, заканчваўся, а памешчык маёнтак не прадаў, то маёнтак гэты падлягаў канфіскацыі і аддаваўся ў казну.

Увогуле аграрная палітыка царызму на далучаных тэрыторыях была накіравана на пашырэнне землеўладання дваранства і ўмацаванне памешчыцкага землеўладання наогул. На тэрыторыі

Рэчыцкага павета з'явілася нямала новых уладальнікаў — Арловы, Горваты, фон Гольсты, Лашчы, Нарушэвічы, Паніны, Прозары, Шуйскія і інш.

Большасць насельніцтва павета з'яўляліся прыгоннымі сялянамі. Іхнія павіннасці былі ў асноўным такімі: тры дні на тыдзень паншчыны для мужчын (з канём) і тры дні паншчыны для жанчын (пешай); гвалты (талокі) — згон сялян у час уборкі сена, збожжавых і інш.; шарваркі — будаўнічыя работы ў маёнтку памешчыка (будаўніцтва дарог, мастоў, жывёлагадоўчых памяшканняў і інш.); павіннасць дарожная — перавозка прадуктаў памешчыцкай гаспадаркі да месца продажу; данина — збор грыбоў і ягад для памешчыка, здача яму прызначанай колькасці курэй, яек, дроў і інш.; пража для памешчыка пэўнай колькасці палатна.

Існавалі і дзяржаўныя падаткі, якія аплачваліся грашыма.

Пераважная большасць сялян былі прыгоннымі. Яны знаходзіліся ў поўнай уладзе сваіх памешчыкаў. Але, бадай, яшчэ больш цяжкім было становішча для іх у маёнтках дзяржаўных. Арандатары (часовыя ўладальнікі) стараліся выціснуць з сялян як мага больш.

Далейшы ўціск прыводзіў да новых сялянскіх хваляванняў.

Так, у 1796 г. жыхары вёсак Жмураўка і Броннае адмовіліся падпарадкоўвацца пану Юдзіцкаму. На другі дзень з Рэчыцы ў Жмураўку і Броннае выехалі прадстаўнікі павятовай адміністрацыі. Пачалі палохаць вяскоўцаў усялякімі карамі. Але сяляне цвёрда стаялі на сваім. «Юдзіцкаму і ягоным прыслужнікам падпарадкоўвацца не будзем», — заявілі яны. Бачачы, што дамовіцца не ўдасца, улады арыштавалі і публічна пакаралі бізунамі 15 сялян. Некалькі чалавек былі адпраўлены ў Сібір.

У 1802 г. адмовіліся падпарадкоўвацца новаму памешчыку Андрэю фон Гольсту сяляне дзяржаўнага маёнтка Мухаеды. Гэта бачна з рапарта Рэчыцкага ніжняга земскага суда Кіеўскаму ваеннаму губернатару ад 29 лістапада 1802 г.

У Мухаеды выязджаў Рэчыцкі ніжні земскі суд, каб на месцы разабрацца, чаму сяляне выказваюць непаслушэнства, схіліць іх да неабходнасці падпарадкоўвацца новаму ўладальніку.

Былі сабраны сяляне з кожнай хаты вёскі. Яны выслухалі ўказ Мінскай казённай палаты за № 2094 і кантракт, заключаны гэтай жа палатай і памешчыкам фон Гольстам. Але ўсё гэта не пераканала сялян выконваць павіннасці перад новым часовым уладальнікам. Яны крычалі: «Хоць нас няхай вешаюць і катуюць, але слухаць памешчыка фон Гольста і падпарадкоўвацца яму не будзем...»

Сяляне патрабавалі, каб суддзі паказалі ім указ не Мінскай палаты, а ўказ дзяржаўны.

Убачыўшы, што дамовіцца з сялянамі не ўдасца, суддзі папрасілі мясцовага святара Фёдара Цішкевіча, каб ён угаварваў людзей слухацца памешчыка-арандатара Андрэя фон Гольста. Святар жа ўзяў бок сялян.

Суддзі паспрабавалі перапісаць прозвішчы ўсіх тых, якія найбольш актыўна выказваліся супраць новага арандатара. Ніхто сябе не назваў. І тады дапамог войт Гардзей Аксёнаў. 14 чалавек былі арыштаваны — Васіль Музычэнка, Пятро Качан, Андрэй Пашка, Мацвей Пашка, Фёдар Мішчанка, Якаў Грыбенка, Нічыпар Дубянок, Іван Макараў, Фёдар Усік, Кірэй Коган, Даніла Піліпенка, Яўхім Савенка, Мацвей Качан і Якаў Рэбешка. Яны былі арыштаваны і высланы ў Рэчыцу на земскі павятовы суд для пакарання «па закону».

Сялянскія хваляванні адбыліся ў Рэчыцкім павеце і ў 1808—1809 гг.

Далучэнне поўдня Беларусі да Расійскай імперыі дало магчымасць да ўключэння яго ў агульнарасійскую гаспадарчую сістэму, стварыла перадумовы для больш хуткага развіцця эканомікі.

На тэрыторыі Рэчыцкага павета былі пабудаваны некалькі паташных заводаў, ва ўладанні Сіверса пры вёсцы Гута завод па вырабу шкла. Шырокае развіццё атрымалі рудаплавільныя мануфактуры, бо ў павеце было мноства балот, багатых на жалезную руду. Найбольш славутая з такіх мануфактур працавала ў вёсцы Дзямідаў (Нараўлянскі раён).

У справаздачы за 1805 г. мінскі губернатар адзначаў: у Мазырскім і Рэчыцкім паветах асабліва развіты выраб паташу, смалы і дзёгцю. Сапраўды, багацце лясоў Рэчыцкага павета давала дастаткова сыравіны для вырабу такой прадукцыі. Рынкам яе збыту былі Адэса, Крамянчуг і Херсон. Паташ, смала і дзёгаць дастаўляліся туды па Дняпры, карысталіся шырокім попытам.

Памешчыкі Рэчыцкага павета немалы даход мелі ад продажу лесу. Па Дняпры драўніна сплаўлялася на Украіну. За сплаўшчыкаў найчасцей былі прыгонныя сяляне. Амаль у кожнай вёсцы, якая знаходзілася на беразе ракі, меліся сплаўныя арцелі. Найбольш вядомая — у вёсцы Азершчына. Плыты вязалі і пераганялі на Украіну як не ўсе мясцовыя мужчыны.

А вось з Украіны рачнымі байдакамі ў павет дастаўлялася соль. Яна развозілася потым амаль па ўсім Беларускім Палессі.

У пачатку XIX ст. памешчыкі Рэчыцкага павета пабудавалі некалькі аўчарных заводаў, наладзілі выраб сукна. Прадавалі тканіну арміі, а таксама на традыцыйных Рэчыцкіх кірмашах. Асабліва багатымі яны былі 9 мая і 6 снежня (па старому стылю). Якраз на гэтыя дні прыпадалі хрысціянскія святы Міколы — веснавога і зімовага. На кірмашах прадаваліся таксама лесаматэрыялы, хлеб, жывёла, дзёгаць.

З тагачасных дакументаў бачна: на пачатку XIX ст. у Рэчыцы было 316 драўляных дамоў, 2 драўляныя праваслаўныя царквы, драўляны каталіцкі манастыр і сінагога. Жыхароў мелася 1770 чалавек. З іх шляхты — 2 працэнты, служак культа — 2, купцоў — 2, мяшчан — 83, а таксама 8 працэнтаў рамеснікаў. Асноўным заняткам гараджан былі земляробства, рыбалоўства і сплаў лесу.

Рэчыца была ў арэндзе, а затым у «пажыццёвым» уладанні баранесы Корф.

Суровым выпрабаваннем для беларускага народа з'явілася Айчынная вайна 1812 г. На працягу яе Рэчыца была часовай рэзідэнцыяй мінскага губернатара. Тут кватаравалі вайсковыя часці, якія потым накіроўваліся ў раён баявых дзеянняў. Разам з тым у горадзе размяшчаўся галоўны склад паўднёвай рускай арміі.

У 20—30-ых гг. XIX ст. па Дняпры пачалі хадзіць параходы. Рэчыца стала значнай прыстанню. Горад злучаўся паштовым трактам з Мінскам. Ён пралягаў праз Горваль, Бабруйск, Ігумен. Тракт на Чарнігаў быў праз Холмеч і Лоеў.

У першай палове XIX ст. грамадскі рух на тэрыторыі Беларусі быў адметны антыпрыгонніцкім характарам. У ім бралі ўдзел не толькі сяляне, але і дробная шляхта, разначынцы, чыноўнікі, перадавыя афіцэры. У 1830 г. пачалося паўстанне ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве. У чэрвені — ліпені 1831 г., калі ў Заходняй Беларусі і Літве паўстанне было амаль падаўлена, хваляванні ўспыхнулі на поўдні Беларусі. У Мазырскім, Рэчыцкім і Пінскім паветах дзейнічалі атрады, якія ўзначальвалі памешчыкі Ф. Кяневіч і Т. Пуслоўскі. Шырокай падтрымкі з боку сялянства паўстанцы не атрымалі. Гэта прывяло да іх паражэння.

На тэрыторыі Рэчыцкага павета пэўны час хаваліся ўдзельнікі паўстання. Прытулак сабе знаходзілі ў балоцістай, маладаступнай мясцовасці. Каторыя з іх вярнуліся потым на радзіму (Польшчу ці Літву). Іншыя дзе-нідзе заснавалі хутары, якія з цягам часу выраслі ў вёскі. На тэрыторыі сучаснага Рэчыцкага раёна гэткім чынам узнікла вёска Лясное.

У 1845 г. быў зацверджаны герб Рэчыцкага павета. Ён уяўляў шчыт, які быў падзелены на дзве палавіны. У верхняй — губернскі герб, у ніжняй — на белым полі распушчаны ў левы бок двухканцовы сцяг ружовага колеру. На сцягу — вершнік у латах. У правай руцэ коннік трымае выцягнуты меч, у левай — шчыт з намаляваным на ім двайным крыжам.

Рэвалюцыйная сітуацыя канца 1850 — пачатку 1860-ых гг., абумоўленая крызісам феадальна-прыгонніцкай сістэмы і зараджэннем капіталістычных адносін, стала галоўнай прычынай, якая прымусіла царызм у 1861 г. пайсці на адмену прыгоннага права. Сяляне Рэчыцкага павета, як і па ўсёй Расійскай імперыі, атрымалі асабістую волю і магчымасць распараджацца сваёй маёмасцю. Але адмена прыгоннага права не ліквідавала прыгонніцкія пережыткі. Большая частка зямлі засталася за памешчыкамі. Пры раздзеле землеўладальнікі пакінулі за сабой і лепшыя ўчасткі. Сяляне павета засталіся ў асноўным малазямельнымі. Павінны былі заплаціць памешчыку і за волю, і за зямлю. Выкуп асабістай волі быў замаскіраваны ў завышэнні цаны за зямлю. Вядома, сяляне не мелі грошай, неабходных для выкупу. 80 працэнтаў неабходнай сумы давала дзяржава. Сяляне ж рабіліся даўжнікамі на 49 гадоў. Выплочвалі не толькі суму доўгу, а і працэнты за пазыку. Былі вымушаны браць у памешчыкаў надзелы, апрацоўваць іх сваім інвентаром і засяваць уласным насеннем. А калі прыходзіў час уборкі ўраджаю, то палову ад намалочанага трэба было аддаць памешчыку.

«Палажэнні 19 лютага» прадугледжвалі новы парадак кіравання сялянамі. Ён быў заснаваны на выбарнасці нижэйшых службовых асоб. Жыхары сельскай грамады выбіралі старасту. На валасных сходах сельскія старасты і ўпаўнаважаныя ад кожных 10 двароў выбіралі валасное праўленне, валасного старшыню і суддзю. Функцыі новых органаў сялянскага самакіравання былі надзвычай абмежаваныя. Галоўнымі абавязкамі сельскіх улад былі: раскладка і збор падаткаў, кантроль за выкананнем сялянамі іхніх павіннасцей, рэгуляванне пазямельных узаемаадносін паміж сялянамі, арганізацыя ў вёсках паліцэйскай службы (соцкія, дзесяцкія). У дачыненні сялянства дзейнічаў закон кругавой парукі, што з'яўлялася пережыткам сярэднявечча.

Сярод сялян распаўсюджваліся чуткі аб падмене памешчыкамі царскага маніфеста, скажэнні ягонага зместу. Гэта прыводзіла да хваляванняў.

У красавіку 1861 г. хваляванне сялян адбылося ў маёнтку Салтанова. З Рэчыцы выехала паліцыя. Сялян арыштавалі і пагналі ў горад. Там ім было «тлумачана» Палажэнне 19 лютага і інвентар Салтаноўскага маёнтка ад 1846 г. Пасля гэтага ўдзельнікі хвалявання былі пакараны розкамі.

1861 г. красавіка 12. Акт павятовага прадвадзіцеля дваранства і земскага спраўніка Рэчыцкага п. аб хваляваннях сялян маёнтка Салтаноўка і падаўленні іх паліцыяй

В комиссии по крестьянскому делу, в коей находились речицкие уездный предводитель дворянства Мечислав Прозор и земский исправник Василий Маркианович, собраны были около 9 час. утра по ее распоряжению по месту заседания в доме предводителя крестьяне Солтановского имения; им были читаны и объясняемы членами комиссии высочайшее Положение 19 февраля и инвентарь Солтановского имения с 1846 г. при бытности ихнего помещика Николая Ланевского-Волка. Крестьяне эти, не находя нигде, чтобы с них следовало, как постоянно с упрямством утверждали, по 1 мужскому и женскому дню в неделю, друг пред другом с большим шумом стали кричать: «Неправда, нам читают не то». Члены комиссии стали их вразумлять, стараясь сколько можно было за общим шумом допросить их и разобрать, в чем дело и почему законным властям не верят. Когда же многие крестьяне отзывались, что протоиерей Речицкой соборной церкви Банковский им читал и объяснял Положение так, как понимают они, то сей протоиерей, быв приглашен особым отзывом за № 9, сейчас же в комиссию прибыл. Тут же в присутст-

вии комиссии он в глаза крестьянам сказал, что когда несколько из них за некоторое время до того приходили к нему с просьбою прочитать им несколько статей такового, по неимению времени остального не читал и в таком смысле, как они говорят, чтобы по 1 дню в неделю отбывать барщины, вовсе не объяснял. Затем стал и увещевать к смирению, повиновению законным властям и, наконец, взяв из их рук Положение, стал из такового им читать их повинности в пользу владельца. Тут они толпою закричали: «Неправда, батюшка, читай так, как читал нам прежде». Другие, возвыся голос над толпою, кричали: «Ты, батюшка, от помещика покуп взял, не так читаешь», иные вопили: «Не так читаешь, нет, иди и сейчас нам присягай». Протоиерей объявил им, что присяга ему не страшна, что он готов присягать, но сего от него не требует и сам закон, но несколькократно просил их смириться, увещевал повиноваться законным властям, верить им, исполнять так, как они объясняют, повинности в отношении к владельцу на точном основании высочайше утвержденного Положения и инвентаря, сожалел над их заблуждением по чистосердечному желания добра им; но всё это было понапрасну; до того ещё некоторые крестьяне в подкрепление своей претензии приводили, что в марте месяце, во время бытности их в гор. Речице, на базаре при барабанном бое самим городничим во всеобщее услышание всего народа им читано было, что они утверждают. По соображении сего оказалось, что ссылаются на прочет высочайшего манифеста частным приставом Двораковским в 12 день истекшего марта. Чиновник сей по приглашению комиссии тотчас прибыл и из взятого из рук их самих же крестьян ихнего экземпляра Положения в присутствии комиссии чистым и внятным голосом стал читать им манифест. Но те же крестьяне, которые слышали прочет сего манифеста на базаре, кричали: «Ты не то читаешь, читай то, что читал прежде», и пошел крик толпою: «Да, да не то, не то». Тут отвержение истины было уже слишком очевидно, а действие заговором всех заодно весьма явно; многие крестьяне, как по расспросу оказалось, 12 марта вовсе на базаре не были, а отвергали то, чего слышать не могли. Затем члены комиссии всячески крестьян вразумляли, уговаривали отбывать по Положению повинности владельцу, повиноваться законным властям, земский исправник прочитал им по нескольку раз правила Положения и инвентарь, объяснял, толковал — все понапрасну, крестьяне и слушать не хотели об убеждении, все настаивали на одном, и криком и шумом вразумления властей покрывали, наконец, земский исправник после поясненного неоднократного разъяснения им правил, возвыся голос, спросил, понимают ли достаточно, что им было говорено, или еще надо объяснять. Из толпы поднялись крики: «Да мы все хорошо понимаем, да знаем мы ваш инвентарь». Исправник продолжал: «Так если знаете, то почему же не исполняете, разве по упрямству не хотите делать». На это все отвечали молчанием, дело становилось серьезнее, время уходило, а самые власти были в ничто поставлены, это происходило уже $2^{3}/_{4}$ час. пополудни. По общему совещанию комиссиею сейчас же за № 12 и № 13 приглашены были начальник инвалидной команды с 24 чел. нижних чинов и полицейских чиновников, Двораковский с десятскими. Между тем в передней комнате, где собраны были крестьяне, шум все больше и больше возрастал, о вразумлениях комиссии крестьяне уже и слышать не хотели, одни кричали: «Да тут царя нету, а вы что хотите, то и делаете, изберем десятерых из наших и пошлем пешком с жалобою к царю», другие, не слушаясь наших увещаний, кричали: «Да годи уже панам по нас ездить». При этом, как и все время, все стояли крепко за одно, особенным же криком и дерзостью, одобрявшим прочих, отличались: Григор Матвеев Ткач, Николай Лавский, Василий Шапулин, Янко Тарасов, Иван Бондарь, Иван Пашковский, Яков Пашковский и Григор Пинчук. Когда же по прибытии инвалидной команды начальник по нашему приказанию приказал взять под стражу означенных крестьян, то все закричали, что их не выдадут, и со страшным криком завопили: «Берите всех», но из комнаты выйти не хотели. Надо было заставить их к тому силою, для отвращения побега одни двери были заперты, и крестьяне послушались наконец увещаний предводителя дворянства и, побравшись за руки, со страшным шумом и криком чрез все комнаты и залу вышли в другие двери, где ожидала и взяла их под арест остальная часть команды при содействии полицейских и повела чрез город. На базаре крестьяне заупрямились, крича: «Бейте нас здесь, пусть весь народ видит нашу обиду». Когда им велено было идти в полицию, то они схватились с солдатами, желая выбиться из-под ареста, но за всем тем власти при содействии караула заставили их отправиться в полицию (что все происходило уже после 5 час. пополудни) для прочета каждому высочайшего Положения и наказания каждого, смотря по возрасту и вине, от 10 до 40 ударов розог. Определили: о всем происшедшем и принятых комиссией мерах, составив настоящий акт за подписью всех при этом находившихся, представить таковой г-ну речицкому предводителю дворянства, от имени своего представить г-ну начальнику губернии и просить возможно скорого распоряжения его сиятельства о присылке по крайней мере 6 рот военной команды по 2 на каждый стан в Речицком у., под распоряжение предводителя дворянства и земского исправника, тем более, что с каждым почти часом поступают из разных имений такого рода донесения о неповиновении и самоволии крестьян, что, если сейчас же не будут приняты энергические решительные меры, ни за что ручаться не будет можно.

Речицкий уездный предводитель дворянства Мечислав Прозор.
Земский исправник Маркиянович.
И. д. городничего частный пристав Двораковский.
Речицкий благочинный протоиерей Андрей Банковский.
ЦДГАЛ. Ф. 1286. Воп. 22. Спр. 1353. ЛЛ. 24—27.

Асушальны канал у Рэчыцкім павеце

У 1864 г. адмовіліся ўносіць выкупныя плацяжы, падаткі і выконваць павіннасці жыхары Лоеўскай і Дзяражыцкай валасцей Рэчыцкага павета. І тут улады прымянілі сілу. Непакорныя былі пакараны розкамі і штрафамі. Але ў 1867 г. сялянскія хваляванні ў Лоеўскай і Дзяражыцкай валасцях успыхнулі з новай сілай. Адбылося тое пасля таго, як праверачная камісія, падкупленая памешчыкам, адрэзала ў сялян на ягоную карысць больш 1800 дзесяцін зямлі і павялічыла выкупныя плацяжы звыш як на 5,3 тысячы рублёў. Сяляне не змірыліся з беззаконнем. Калі з Рэчыцы прыбыла паліцыя, то аказалі ёй супраціўленне.

Хваляванні жыхароў Лоеўскай і Дзяражыцкай валасцей працягваліся чатыры гады. Рэчыцкая паліцыя была не ў стане ўсмірыць сялян. Павятовыя ўлады звярнуліся за дапамогай да мінскага губернатара. Былі прысланы салдаты, якія і навялі ў паўстаўшых валасцях «парадак».

Сялянскія хваляванні ў Рэчыцкім павеце не сціхалі да канца XIX ст. Толькі ў 1890—1900 гг. іх адбылося 24.

У другой палове XIX ст. Рэчыцкая зямля стала месцам правядзення работ Заходняй экспедыцыі па асушэнню балот пад кіраўніцтвам вядомага ў Расіі спецыяліста па інжынерных работах І. І. Жылінскага.

Да асушальных работ экспедыцыя прыступіла ў 1873 г. Галоўнай іх мэтай былі павелічэнне даходаў казны з дзяржаўных лясных і лугавых угоддзяў, падрыхтоўка лініі пад будучую чыгунку.

Шмат увагі экспедыцыя надавала дослед ам па выкарыстанню асушаных зямель пад агарод і ворыва. Яны праводзіліся і ў Васілевіцкай лясной дачы, ва ўрочышчы Стаў каля вёскі Бабічы. Пад кіраўніцтвам агранома Гедэмана (бацька вядомага польскага гісторыка О. Гедэмана) была створана доследная ферма.

Асушэнне балот дало магчымасць для эфектыўнага выкарыстання лясных угоддзяў, павялічыліся плошчы ворнай зямлі.

У 1878 г. у Васілевічах была створана метэаралагічная станцыя. Яна старэйшая ў рэспубліцы.

У другой палове XIX ст. Рэчыца значна выросла. У 1886 годзе, як бачна з кнігі даведніка Мінскай губерні, у горадзе было каля 7 тысяч жыхароў, 940 драўляных дамоў, 140 прыватных драўляных крам і 2 крамы мураваныя. Такім чынам, за 60 гадоў Рэчыца выросла ўтрая.

Гараджане мелі 475 коней, 496 галоў буйной рагатай жывёлы, 480 свіней, 250 авечак і 150 коз.

Прамысловасць горада заставалася слабаразвітай. Працавалі дробныя саматужныя прадпрыемствы, якія называліся заводамі, хаця і мала адпавядалі такой назве. Напрыклад, былі 2 скураныя заводы. На іх працавалі ўсяго 6 рабочых. Быў завод па вырабу цэглы з 2 рабочымі. На крупадзёрным жа і свячным заводах працавалі па аднаму рабочаму.

Больш буйныя прадпрыемствы знаходзіліся ў памешчыцкіх маёнтках. Яшчэ ў пачатку XIX ст. вядома суконная фабрыка пана Аскеркі. Сваю прадукцыю яна пастаўляла ў асноўным казне. Не было недахопу ў ахвотніках набыць прадукцыю паташных заводаў паноў Горватаў і г. д. Увогуле ў другой палове XIX ст. у памешчыцкіх маёнтках Рэчыцкага павета прадукцыю выпускалі 21 бровар (вінакурныя заводы) з 180 рабочымі, 2 паравыя млыны, якіх абслугоўвалі 8 рабочых, 6 шкіпінарна-смаляных заводаў (8 рабочых).

Памешчыкі адкрывалі цэхі па вырабу каўбасы, вяндлярні. Горваты прадавалі мяса ў Пецярбургу, прасаванае сена дастаўлялі ў Адэсу.

У канцы XIX ст. велізарную ролю ў развіцці прамысловасці пачалі адыгрываць чыгункі. У 1886 г. пачаўся рух паяздоў паміж Гомелем і Лунінцом. Участак Палескіх чыгунак быў пракладзены і праз Рэчыцу. Гэта спрыяла таму, што ў непасрэднай блізкасці ад чыгункі ў Рэчыцкім павеце пачалі ўзнікаць новыя прамысловыя прадпрыемствы. У асноўным — лесапільныя заводы.

У 90-ых гг. XIX ст. з чыгуначнай станцыі Рэчыца штогод адпраўлялася каля

Мост праз Дняпро. Канец XIX ст. Не існуе

1 мільёна 300 тысяч пудоў разнастайных грузаў. 160 тысяч пудоў — абарот грузаў Рэчыцкай прыстані.

Першы ўсеагульны перапіс насельніцтва Расійскай імперыі, які праводзіўся ў 1897 г., паказаў: эканоміка Рэчыцкага павета насіла, як і раней, аграрны характар. Павет меў 23 воласці, 749 населеных пунктаў. Плошча павета — 11 087,5 квадратнай вярсты, насельніцтва — 221 771 чалавек. У Рэчыцы было 9280 жыхароў, працавалі 2 лесапільныя і 2 піва-мёдаварныя заводы, маслазавод, завод па вырабу цэглы. Лесапільні належалі Зелкінду і Когану, на іх працавалі 53 рабочыя. Піламатэрыялаў было выпушчана за год больш як на 90 тысяч рублёў. 25 тысяч рублёў — гадавы абарот мукамольнай вытворчасці.

Рос культурны ўзровень насельніцтва павета. З пачатку 1850-ых гадоў пачалі адкрывацца царкоўнапрыходскія школы. У першую чаргу — для дзяцей дзяржаўных сялян. У 1860—1870-ых гг. у павеце было звыш 20 царкоўнапрыходскіх школ. Некаторыя з іх сталі народнымі вучылішчамі. Так, народнае вучылішча мястэчка Горваль наведвалі 35 хлапчукоў і 10 дзяўчынак. За настаўніка быў мясцовы святар Іван Маскалевіч.

Рэчыца. Кацярынінскі шлях. Пач. XX ст.

У Рэчыцы было прыходскае вучылішча, двухкласнае народнае яўрэйскае вучылішча, некалькі яўрэйскіх малітоўных школ.

Дарэчы, насельніцтва Рэчыцы больш як на 60 працэнтаў складалі яўрэі. Па закону,

падпісанаму Аляксандрам III у 1882 г., ім забаранялася купляць і арандаваць зямлю, працаваць у дзяржаўных установах, паліцыі, на афіцэрскіх пасадах у арміі, на чыгуначным транспарце. Яўрэі мелі права адкрываць лаўкі, лабазы, невялікія прадпрыемствы, працаваць рамеснікамі, возчыкамі. Пераважная большасць яўрэйскага насельніцтва горада з'яўлялася людзьмі надзвычай беднымі. Але былі і дробныя ўласнікі, якія мелі лаўкі і мануфактуры. Асобныя з яўрэяў сталі капіталістамі, як названыя вышэй Зелкінды і Коганы.

У Рэчыцы была бальніца на 25 ложкаў, прыватная аптэка, некалькі ларкоў па продажу лекавых прэпаратаў.

13 жніўня 1898 г. Рэчыцкі павятовы камітэт прыняў рашэнне аб адкрыцці ў валасцях народных чытальняў. Праз год павет меў 6 такіх чытальняў.

І ўсё ж варта прызнаць: на народную асвету і медыцыну ў Рэчыцы і павеце выдаткоўваліся мізэрныя сумы. Так, у 1896 г. даходы Рэчыцы склалі звыш 21 тысячы рублёў, расходы — 20 610 рублёў. З іх на народную асвету пайшлі 1325 рублёў, а на дабрачыннасць і медыцыну — усяго 100 рублёў. Бальніцы дапамаглі дабрачыннымі ўзносамі найбольш заможныя гараджане.

На Рэчыцкай зямлі нарадзіліся і раслі: Аляксандр Уладзіслававіч Аскерка (1830—1911 гг.) — адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гг. у Беларусі і Літве; Ота Гедэман (1887—1937 гг.) — гісторык і краязнавец; Міхайла (Міхаіл Аляксандравіч) Грамыка (1885—1969 гг.) — беларускі пісьменнік і вучоны; Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі (1867—1934 гг.) — беларускі этнограф, фальклярыст, гісторык; Сяргей Епіфанавіч Палуян (1890—1910 гг.) — выдатны беларускі публіцыст, празаік і літаратуразнавец; Уладзімір Данілавіч Спасовіч (1829—1907 гг.) — публіцыст, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч; Фёдар Ігнатавіч Стравінскі (1843—1902 гг.) — выдатны рускі спявак і г. д.

А. П. Рабянок, П. П. Рабянок

Са справаздачы міравога пасрэдніка 1-га участка Рэчыцкага павета за 1866 г.

1

Нравственный быт крестьян и стремление их к образованию

Чем дальше крестьяне собственники выясняют свои права, дарованные им Высочайшим Положением 19 февраля 1861 года, тем светлее становится нравственный быт их. С понятием о неприкосновенности их собственности, о личных правах, дарованных Высочайшим Положением, прививается к крестьянам понятие о неприкосновенности чужой собственности и чужих прав. Прежние одичалые понятия о собственности, сложившиеся в своеобразные и темные формы, вследствие полного бесправия в крепостные времена и совершенной неразвитости большинства крестьян во время, переходное от крепостной зависимости, постепенно исчезают.

Нравственная порча крестьян 1 участка была велика до сих пор, сначала в 1865 г. потрачено Мировым Посредником много энергии, вполне разумной и обдуманной распорядительности в волостях Лоевской, Заспенской и части Холмечской, чтобы искоренить привычки хищения, бесправия, чувство неправды и безобразное пьянство. В 1865 г. этих волостей очень мало исправились, в 1866 году результаты были значительно лучше, особенно в Лоевской и Холмечской волостях, как это свидетельствует статистика преступлений и проступков.

...крестьяне приходят к сознанию недостатков своей среды вследствие отсутствия просвещения. В 1866 году это ясно обнаружилось как из личных объяснений с крестьянами, так и увеличением числа училищ. Недостаток средств на постройку и содержание училищ и наем достаточно образованных наставников останавливают пока желаемое распространение грамотности в больших пределах.

...В приходских и частных училищах, где наставники из общества, дети больше успевают относительно времени обучения их. В этих училищах, особенно в Заспенском, Короватичском, Левашовском, со стороны наставников видно особенное старание и вознаграждаемая любовь к делу; труд их так заметен, что родители с полным доверием и охотно отправляют к ним детей. Приходские и сельские училища открыты только в 1866 году, а потому в некоторых из них к 1867 году было незначительное число воспитанников, но после этого число их прибыло. Были такие случаи, что дети сами приходили к наставникам, прося их учить грамоте.

2

Насколько прививаются русские дух и жизнь в народ

В первом Мировом участке Речицкого уезда дело польской пропаганды оставило надолго свою память: крестьяне, как надо полагать, по переимчивости от помещиков-католиков, всякого прибывшего

с того берега Днепра, до сего времени привыкли называть нарицательно «русский». Перенесенные от тех же помещиков-католиков и ксендзов некоторые польские обычаи, привычки, склад польской речи вошли в характер жизни и домашний быт крестьян и наложили на них особый отпечаток, не свойственный русскому крестьянину. В настоящее время, когда прервана зависимость крестьян к помещикам и пробуждено обстоятельствами воспоминание о русском и православном происхождении их, крестьяне отшатнулись от всего, что навязано было им польскими и католическими правилами: желание крестьян сделаться русскими по духу и по жизни возбуждено настолько, что смело можно надеяться, при некоторой только заботливости со стороны русских деятелей и разъяснений со стороны духовенства, крестьяне постепенно вытеснят сами из жизни польско-католические обычаи, привычки и даже обороты польской речи, принятые ими от колонизаторов-помещиков...

3
Материальный быт крестьян, торговля, промышленность и промыслы

Материальный быт крестьян собственников 1 участка бесспорно и заметно улучшился в 1866 году, вследствие определенности их земельного владения, независимости труда и не отяготительности казенных и мирских повинностей. В 1866 году в деревнях, в которых утверждены выкупные акты, многие крестьяне начали заводить новые постройки, довольно удобные и опрятные на месте обветшавших, тесных и неудобных дворов, оставшихся со времени крепостного права.

Нищеты и крайней бедности между крестьянами в 1866 году не было замечено, вследствие вводимого у крестьян на началах, указанных в Положении 19 февраля, попечения общества о призрении всех лишенных средств к существованию своим трудом и строгой опеки над теми, которые по расточительности приходят к нищете.

В 3 волостях: Заспенской, Маладушской и Лоевской, сложились с сентября месяца запасные капиталы и сделаны общественные предприятия; в Заспенской выстроено помещение для приходского училища, в Холмечской построено в октябре народное училище, в Маладушской в декабре предпринята постройка дома для волости. Запасные капиталы здесь крайне необходимы были, чтобы подорвать лихоимство евреев, ссужавших крестьянам деньгами за проценты, по 20 % в месяц.

Торговля и промышленность у здешних крестьян, исключая м. Лоев, не существуют: все промыслы и вся торговля в руках евреев. Еврей-шинкарь, он же и мелочный торговец и фактор у других крупных евреев-промышленников; так что всякий сельский серый материал для торговли и промышленности уходит через его руки, а на долю крестьянина выпадает подрядный, или заказной, труд.

Ремесла у крестьян 1 участка, кроме Лоевских, также не развиты: даже плотницкое дело, самое необходимое для крестьянина, мало им знакомо, и все, сколько-нибудь чистые, постройки исполняются рабочими Черниговской губернии, или евреями-рядчиками.

Материальный быт государственных крестьян значительно обеспеченнее, чем у крестьян собственников. Не говоря о том, что труд их раньше освободился от зависимости, что почти все они не терпят недостатка леса как на отопление, так и на постройку. Прибыли от лесных работ, сплава и значительного свободного пчеловодства должны возвести их на степень большего благосостояния, особенно если вытеснить из деревни евреев-шинкарей и арендаторов, съедающих достояние крестьян и усыпляющих в них чувство предприимчивости, способности к промышленности и более успешному нравственному развитию.

4
Зависимость крестьян от евреев и помещиков-католиков и стремление их к промышленности

Свободный труд и определенность земельных прав освободили крестьян от зависимости в материальном отношении к помещикам-католикам вверенного мне участка, особенно там, где определены права крестьян на землю с окончанием поверки.

Недоверие к помещикам-католикам вследствие различных неправд и угнетений крестьян в прежние времена в этом участке, где мелкие землевладельцы, где все прибыли помещиков во время крепостного права выручались не из хозяйства, а из одного принуждаемого труда крестьян по найму их на сплав леса, избавило крестьян от нравственной зависимости. Только прежние дворовые люди, из коих многие до однесь живут у помещиков, подчинились вполне зависимости и многие, вследствие неспособности заняться хозяйством и полевыми работами, сохранили до сего времени особенный польско-шляхетский тип здешнего дворового человека. Однако же достаточное обеспечение крестьян землею, пробуждаемая промышленность, наконец, возможность устроить некоторых дворовых людей на должности по хозяйственной части в крестьянском общественном управлении, все это не лишает надежды, что и этот класс народа освободится от материальной зависимости помещиков-католиков и от полонизаторов со стороны их.

С начала освобождения крестьян от крепостной зависимости предприимчивость их заняться торговлею вином в общественных шинках останавливала неопределенность земельного владения. Потом, как мною исследовано, в 1-м участке были слабые попытки некоторых крестьян заняться этим промыслом, но они не удались вследствие сильной конкуренции евреев. В 1866 году, когда последовало воспрещение

евреям торговать, в крестьянских общественных шинках явилось стремление у некоторых крестьян взять общественные крестьянские шинки, но они смутно верили, чтобы евреи могли выпустить из своих рук давнишний их промысел, посредством которого в глазах крестьян некоторые евреи обогатились. Наконец в январе 1867 г. назначены были окончательные сроки евреям-шинкарям удалиться из деревень. Когда окончили с ними расчеты, то явились желающие из крестьян и дворовых людей взять общественные шинки. Таким образом, отдано было несколько крестьянских шинков в Холмецкой, Заспенской, Ровенской и Маладушской волостях, но евреи бросились на аферы: они стали отговаривать крестьян и перекупать себе право торговли вином через подставных крестьян. Подобных случаев открылось несколько.

Вообще из наблюдений в 1866 г. оказывается, что крестьяне-собственники 1-го участка достаточно усвоили себе, насколько дорого обходятся им всякие деловые и торговые отношения к евреям, и обнаружили стремление освободиться от эксплуатации их. Для большего успеха начатого дела остается ограничить и подначалить особенно строгой полицейской опеке конкуренцию евреев-шинкарей помещичьих шинков, строго преследовать всякие попытки их торговать под именем крестьян в общественных шинках и наблюдать за проживанием их в деревне под видом занятия разными ремеслами, а на самом деле для обмана и барышничества или для торговли через подставных крестьян в общественных шинках.

Мировой Посредник 1-го участка (подпись)
НА РБ. Ф. 242, воп. 1, спр. 624. С. 1—11.

З гісторыі забудовы Рэчыцы ў XVII—XVIII стст.

...Як паказваюць дакументы, што захаваліся, Рэчыца пяражыла ў XVII — XVIII стст. тыповы для беларускага горада гэтага часу перыяд заняпаду планіроўкі і архітэктурна-мастацкага аблічча.

У 1649 г., падчас вайны украінскага і беларускага народаў пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага, быў зроблены з натуры малюнак горада, які амаль цалкам адпавядае плану Рэчыцы, складзенаму ў той час. Параўнанне гэтых плана і малюнка з планам Рэчыцы 1795 г. паказвае дэградацыю горада на працягу другой паловы XVII і ўсяго XVIII стст. Пагранічнае становішча го-



План Рэчыцы ў сярэдзіне XVII ст.

рада вызначыла яго стратэгічнае значэнне.

Размешчаны на высокім беразе пры ўпадзенні ў Дняпро прытока Рэчыцы, горад у першай палове XVII ст. быў даволі моцнай крэпасцю. Разам з Воршай, Старым Быхавым, Магілёвам, Шкловам і Рагачовам Рэчыца ўваходзіла ў сістэму пагранічнай абароны на Дняпры. Першапачатковым ядром горада было ўмацаванне, размешчанае на беразе Дняпра і аддзеленае ад астатняй тэрыторыі ровам. Крэпасць мела пяць вежаў і злучалася з горадам пад'ёмным мостам. Частка крапасных вежаў добра відна на малюнку сярэдзіны XVII ст. Шматгранныя вежы былі пакрыты невысокімі шатрамі, частка з іх мела каравульныя памяшканні. Калі меркаваць па малюнках, гэтыя вежы нагадвалі «круглікі» віцебскіх замкаў. Рэчыцкая крэпасць займала невялікую тэрыторыю — каля аднаго гектара. Другая лінія абарончых збудаванняў абкружала цэнтральную частку горада. Тут размяшчаліся гандлёвая плошча, найбольш значныя храмы і багатыя жылыя дамы.

Асноўная частка жылых кварталаў размяшчалася паміж другім і трэцім паясамі гарадскіх умацаванняў. Дакладны геаметрычны малюнак кварталаў горада сведчыць аб тым, што ў XVI ці першай палове XVII ст. Рэчыца планавалася і ўмацоўвалася паводле праекту. Калі меркаваць па малюнку таго часу, знешнія ўмацаванні горада складаліся з земляных бастыёнаў і роваў. За імі ішла драўляная крапасная сцяна з вежамі. Увесь горад займаў прамавугольны ўчастак памерам каля 700×400 м, належаў да тыпу гарадоў-крэпасцяў.

План Рэчыцы 1795 г. паказвае, што да горшага змяніўся горад за апошнія паўтара стагоддзі панавання Польшчы на Беларусі. Рускія спецыялісты, што абследавалі горад у канцы XVIII ст., пісалі: «На беразе Дняпра размешчана невялікае старажытнае



Дняпро ў раёне Рэчыцы. Пач. XX ст.

ўмацаванне, так званы замак, у якім акрамя развалін і рова нічога няма».

Дакладная планіроўка горада сярэдзіны XVII ст. была парушана, і Рэчыца расцягнулася ўздоўж Дняпра як вялікая вёска. У 1800 г. у горадзе засталося ўсяго 316 драўляных дамоў, драўляны каталіцкі манастыр і сінагога. Насельніцтва горада зменшылася да 2296 чалавек.

Як паказвае план, тэрыторыя крэпасці ў канцы XVIII ст. была яшчэ абкружана ровам, праз каторы былі перакінуты два масты. Каля ўмацавання знаходзіліся гандлёвая плошча і каталіцкі манастыр. Уздоўж паўкальцавой вуліцы, на беразе ракі, былі размешчаны праваслаўныя цэрквы. Астатнюю частку горада складалі жылыя кварталы. Кампазіцыя плана і аб'ёмна-прасторавая забудова горада ясна адлюстроўвалі жыццё феадальнага горада. У цэнтры — замак, каля яго гандлёва-культавы цэнтр горада. Паўкальцавая вуліца з цэрквамі, якія ўзвышаліся над ёй, падкрэслівала значнасць замка.

Ю. Ягораў

Горад быў драўляным

На першы погляд старая драўляная забудова Рэчыцы здаецца аднастайнай і мала выразнай. Але гэта не так.

...70—90-ыя гг. XVIII ст. — перыяд абнаўлення многіх правінцыяльных гарадоў Расіі. Асноўны тагачасны напрамак развіцця архітэктуры — узвядзенне новых і рэканструкцыя старых будынкаў. Дарэчы, важную ролю ў распрацоўцы новых планаў правінцыяльных гарадоў, у тым ліку і Рэчыцы, адыграла «Комиссия для устройства городов С.-Петербурга и Москвы». Толькі за перыяд з 1768 па 1795 г. яна распрацавала і зацвердзіла больш 400 праектаў перапланіроўкі невялікіх гарадоў. Праўда, практычная работа ў гэтым кірунку шырока распачалася толькі ў пачатку XIX ст.

Менавіта ў гэты час Рэчыца атрымлівае

Пушкінскае гарадское вучылішча на вул. Набярэжнай. Будынак не захаваўся

Рэчыца. Успенская вуліца. Пач. XX ст.

новы рэгулярны план, які і складае аснову сучаснага плана горада. Лукавіна Дняпра ў многім вызначыла планіровачную структуру Рэчыцы. Горад атрымаў прамавугольную сетку вуліц. Адны з іх арыентаваны паралельна рацэ, а другія — перпендыкулярна ёй.

На пачатку XIX ст., як, дарэчы, і дагэтуль, у Рэчыцы пераважала драўляная забудова. Яе архітэктурная выразнасць забяспечвалася будаўніцтвам дамоў па «ўзорных» фасадах, ад якіх забудоўшчыкам не дазвалялiся ніякія адхіленні. Планіроўка дома была ва ўладзе гаспадара, а вось фасад жылля, і асабліва на вуліцу, строга адпавядаў правілам так званай «прыгожай архітэктуры». Яны заключаліся ў абавязковай абшыўцы вонкавых сцен дошкамі або тынкаванні, у афарбоўцы зацверджанымі колерамі. Патрабаванні да жылых драўляных дамоў былі выкладзены ў альбомах аб фасадах, у складанні якіх бралі ўдзел вядомыя архітэктары — Л. І. Руска, В. І. Гестэ і В. П. Стасаў. З 1809 па 1812 г. яны выдалі ажно пяць альбомаў.

Тым не менш, нягледзячы на прыведзеныя вышэй патрабаванні, на практыцы назіраліся адступленні ад зацверджаных фасадаў. Гэта звязана было з прыродна-кліма-

Рэальнае вучылішча на вул. Андрэеўскай

тычнымі і мясцовымі нацыянальнымі асаблівасцямі, з жаданнем хутка растучага купецтва мець дамы з гандлёвымі лаўкамі.

У 1811 г. В. П. Стасаў распрацаваў «Правілы пабудовы ў гарадах абывацельскіх збудаванняў». Яны дапускалі пэўныя змяненні памераў дамоў, але ў той жа час дакладна абумоўлівалі ўсе суадносіны паміж іх асобнымі часткамі і кампазіцыяй фасадаў.

На працягу ўсяго XIX ст. будаўніцтва драўляных жылых дамоў у Рэчыцы ажыццяўлялася практычна ў поўнай адпаведнасці з названымі вышэй Правіламі. Уплыў «узорных» фасадаў праяўляўся даволі ярка. Доказам яго з'яўляюцца высокія цагляныя цокалі, абшыўка сцен дошкамі, строгія класічныя карнізы з добра выяўленым фрызам і архітравам, трох- або чатырохскатныя дахі без слуховых акон.

Сярод драўляных дамоў Рэчыцы значнае месца займаюць дамы ў тры (вул. Леніна, 87, 96, 146, 148, 164 і г. д.) і пяць (вул. Урыцкага, 14, Леніна, 174) акон, якія па кампазіцыі фасадаў найбольш строга прытрымліваюцца «ўзораў».

Матывы класіцызму выразна бачны ў аконных налічніках з трохвугольнымі франтонамі (вул. Савецкая, 142, Леніна, 96 і 174), у аздабленні вуглоў дома прамавугольнымі драўлянымі накладкамі, якія імітуюць каменны руст (вул. Леніна, 87, 96), а таксама ў прапарцыянальнай забудове фасадаў з улікам маштабнай узгодненасці асобных дэталей з агульнымі памерамі дамоў.

Да канца 50-ых гг. XIX ст. адступленні ад «узорных» фасадаў у правінцыяльных гарадах, у тым ліку і ў Рэчыцы, набылі шырокае распаўсюджанне і былі замацаваны спецыяльным указам «Аб парадку дазволу прыватных пабудоў, фасады якіх адступаюць ад узорных чарцяжоў».

Мастацкая выразнасць драўлянай жылой забудовы Рэчыцы дасягалася нярэдка мудрагелістай дэталіроўкай, не звязанай агульнай кампазіцыяй фасадаў, прымяненнем скразной пілаванай разьбы. Скразная

пілаваная разьба ўпрыгожвала аконныя налічнікі. Карнізы мелі адзін ці два рады падзораў, пілястры — прамавугольныя і ромбападобныя накладкі. Сцены над вокнамі і пад імі аздабляліся фігурнымі дошкамі. Усе гэтыя дэталі былі, напрыклад, у дамах: № 14 па вул. Урыцкага, 37 — вул. Камсамольская, 71, 87, 144, 146, 164 — па вул. Леніна, 27, 35, 37 — па вул. Луначарскага, і г. д.

З усіх дэталей найбольшай увагі заслугоўваюць аконныя налічнікі. Самыя прыгожыя з іх, так званыя франтонныя, мелі шырокі гарызантальны карніз складанага профілю з раскрапоўкамі па баках і класічнае пакрыццё дзвюма дошкамі. Такія налічнікі нагадваюць двухскатны дах (вул. Савецкая, 142, Леніна, 96, 110, 174).

У Рэчыцы можна было сустрэць і аналагічныя налічнікі, але ўжо з плоскім трохвугольным франтонам, упрыгожаным паўкруглымі выразамі, точанымі шарыкамі, гіркамі і цыбулінамі. Каторыя з іх мелі ажурныя праразныя накладкі і фігурныя падаконныя дошкі (вул. К. Маркса, 31, Сыдзько, 117, 123, Савецкая, 61 і іншыя).

Развіццё разьбы, як сродку ўпрыгожвання фасадаў, прывяло амаль да поўнай замены франтонных налічнікаў шырокімі праразнымі «ручнікамі», якія значна ўступаюць па сваіх мастацкіх вартасцях класічным узорам (вул. Луначарскага, 37 і інш.).

У пачатку XX ст. у архітэктуру жылой забудовы правінцыяльных гарадоў Расіі пранікае мадэрн. Дамоў у такім стылі ў Рэчыцы не было, бо ўзвядзенне іх было звязана са складанасцямі гэтага стылістычнага напрамку і патрабавала работы прафесіянальных архітэктараў. Праўда, да асобных вялікіх дамоў у Рэчыцы прыбудоўваліся халодныя тамбуры з парадным уваходам (вул. Леніна, 110, Савецкая, 124 і іншыя). Высокія двухстворкавыя дзверы, упрыгожаныя *глыбокімі прамавугольнымі філенкамі*, і стрэшка з трохвугольным франтонам удала дапаўнялі класічную кампазіцыю галоўнага фасада.

Л. Патапаў

Гістарычныя звесткі аб былым саборным Уваскрасенскім храме

Уваскрасенскі храм і прыход у г. Рэчыцы бярэ пачатак у глыбокай старажытнасці. Паданне абвяшчае, што храм у гонар Уваскрасення Хрыста Збаўцы быў першым хрысціянскім храмам. Пабудаваны ён, як сцвярджаюць царкоўныя дакументы, прыхаджанамі, але калі дакладна, невядома. Храм Уваскрасення Хрыста Збаўцы драўляны, невялікага памеру, пабудаваны ў выглядзе капліцы; на працягу многіх гадоў свайго існавання ён неаднаразова перабудоўваўся і рамантаваўся прыхаджанамі.

З часоў далучэння Менскай губерні да Расіі і заснавання праваслаўнай Менскай епархіі, храму Уваскрасення Хрыста Збаўцы з 1794 г. прысвоена было найменне саборнага храма. З 1794 па 1842 г. прычт саборнага храма складалі: протаіерэй, дзяк*ан і адзін прычатнік. Прычт не атрымліваў жалавання ад казны, а карыстаўся добраахвотнымі прынашэннямі ад прыхаджан, займаўся гаспадаркай, пераважна хлебаробствам.*

Протаіерэй жыў у царкоўным доме, астатні ж прычт царкоўных дамоў не меў, як і цяпер, а жыў у прыватных дамах па найму. У 1820 г. пры царкве Уваскрасення было адчынена прыходскае вучылішча. У 1866 г. у саборную Уваскрасенскую царкву была ахвяравана срэбная пазалочаная, у шкляным каўпаку, даразахавальніца, Яго Імператарскіх Высакасцяў Гасударом Наследнікам Цесарэвічам Аляксандрам Аляксандравічам. У 1869 г. казённай Ілюстрацыйнай Камісіяй прычту саборнай Уваскрасенскай царквы надзелены ва ўрочышчы Пагулянцы, у 22 вярстах ад горада і царквы, участак зямлі і балотнай сенажаці ў колькасці 19 дзесяцін. Зямля і сенажаць нязручныя і мала прыносяць карысці духавенству.

У 1872 г. у г. Рэчыцы быў асвечаны новы саборны храм у гонар Успення Прасвятыя Багародзіцы. 10-га чэрвеня гэтага года ў Уваскрасенскім храме адбылася апошняя ўрачыстая літургія за здароўе ўсіх яго прыхаджан, пасля чаго храм Уваскрасення быў зроблены прыпісным да новага саборнага *Успенскага храма. Усе царкоўныя рэчы: рызніцы*, лампады, кадзілы, кнігі, званы і іншыя царкоўныя прадметы перанесены бы-

лі ў новы саборны Успенскі храм. Цяпер Уваскрасенскі храм мяркуецца прыхаджанамі перанесці на гарадскія могілкі. На кошт гэтага і збіраецца сума, але пакуль ён стаіць некранутым на тым самым месцы, дзе ён стаяў некалькі стагоддзяў і быў нямым гледачом гістарычных векавых пераваротаў, у лёсе краю і прыхаджан.

Гістарычныя сведчанні аб сучасным саборным Успенскім храме

Саборны Храм Успення Прасвятыя Багародзіцы мураваны, з такой жа званіцай, аднапрастольны, скончаны будоўляй у 1872 г. і 11-га чэрвеня гэтага года яго Праасвяшчэнствам, Праасвяшчэнным Аляксандрам, Епіскапам Мінскім і Бабруйскім, асвечаны. Пры асвячэнні храма прысутнічаў правадзейны стацкі саветнік Уладзімір Мікалаевіч Токараў, які быў у той час начальнікам губерні. Храм пабудаваны за кошт казны. Будаўніцтва храма працягвалася больш за 30 гадоў пры наступных неспрыяльных абставінах. У 1839 г., з канчатковым аб'яднаннем уніятаў з праваслаўнай царквой, урад звярнуў увагу на стан цэркваў у Заходнім краі. Рэчыцкі Уваскрасенскі храм, малаўмяшчальны і стары, прапанавана было замяніць новым мураваным храмам. Дзеля гэтага ў 1840 г. была выдаткавана з казны сума на пабудову саборнага мураванага храма. Першым будаўніком гэтага храма быў па падраду ад казны рэчыцкі яўрэй па прозвішчу Гец, пад поглядам камітэта духоўных асоб. Пачаты будавацца ў 1840 г., храм у канцы 1843 г. ужо зусім скончаны быў начарна, але раптам нечакана разбурыўся амаль датла. Гэта было ўвосень, у лістападзе 1843 г. Несумненны падрадчык Гец кудысьці знік, храм жа прастаяў у руінах да 1863 г. У гэтым годзе, з нагоды ўзнікшага

Успенскі сабор

Галоўны іканастас Успенскага сабора. Не захаваўся

ў Заходнім краі паўстання, урад ізноў звярнуў увагу на цэрквы гэтага краю. Для дабудовы саборнага храма ізноў асігнавана была ад казны сума ў 14 800 руб. Падрадчыкам на гэты раз быў запрошаны менскі купец і гарадскі галава Свечнікаў. Будоўля, якая пачалася ў 1864 г., у канцы 1866 г. ізноў прыпынілася. Падрадчык Свечнікаў па прычыне розных неспрыяльных абставін абанкруціўся, і сабор ізноў застаўся непабудаваным. У 1870 г. саборнае духавенства звярнулася за дапамогай да тагачаснага менскага губернатара правадзейнага стацкага саветніка Токарава, які прыбыў у гэтым годзе ў першы раз на рэвізію рэчыцкіх службаў. Губернатар звярнуў увагу на гаротны стан саборнага храма ў г. Рэчыцы і прызначыў для будаўніцтва яго асобы будаўнічы камітэт, якому і даручыў заняцца гаспадарчым спосабам узвядзення новага сабора, з асігноўкаю на гэта сумы ў 6982 рублі. За гэту суму стараннем камітэта ў 1872 г. новы саборны храм, па міласці Божай, нарэшце быў закончаны і 11-га чэрвеня асвечаны ў гонар Успення Прасвятой Багародзіцы.

Рыбцевич И. Город Речица. Мн.: 1903.

Рэчыца і павет

За станцыяй Мазыр у 36 вёрстах на Брэсцка-Бранскай чыгункі ляжыць станцыя Васілевічы, якая адгружае звыш 1200 тыс. пудоў лясных і часткова хлебных грузаў. Станцыя размешчана паблізу вытокаў р. Ведрыч, прытоку Дняпра, пры с. Васілевічы. У сяле ёсць Мікалаеўская царква, пабудаваная ў 1825 г., валасное праўленне і сельская школа. З 1878 г. у Васілевічах існуе метэаралагічная станцыя з прыборамі для назірання над узроўнем навакольных водаў. Васілевічы пасля пабудовы чыгункі пачалі

развівацца і зрабіліся даволі бойкім гандлёвым пунктам. У той жа час былі асушаны экспедыцыяй генерала Жылінскага балоты, якія акружалі мястэчка. Перад асушэннем балотаў урад выручаў за лугі арэндную платы толькі 155 руб., пасля ж правядзення каналізацыі лугі пачалі прыносіць да 7000 руб. У наваколлі Васілевічаў знаходзіцца самы глыбокі на Палессі тарфянік, паблізу ж ёсць глыбокія нізіны, ці калодзежы, вядомыя пад назвай «зовжыных». У народзе захавалася паданне, што гэтыя калодзежы былі выкапаны па распараджэнню княгіні Вольгі падчас яе паходу на драўлян.

У 39 вёрстах за Васілевічамі Брэсцка-Бранская чыгунка дасягае павятовага горада Рэчыцы, размешчанага на правым беразе Дняпра. Станцыя Рэчыца грузіць да 1300 тыс. пудоў пераважна лясных і часткова хлебных грузаў. Гісторыя г. Рэчыцы небагатая падзеямі. Вядома, што ў канцы XII ст. горад, што знаходзіўся ў зямлі дрыгавічоў, ужо існаваў, быў умацаваным пунктам і належаў Валынскаму княству, затым ім авалодалі чарнігаўскія князі, а ў 1214 г. горад быў зусім знішчаны князем Мсціславам Наўгародскім. У часы Гедыміна Рэчыца ўвайшла ў склад ВКЛ, а пазней не адзін раз бывалі каля Рэчыцы перакопскія татары. Паводле данай Жыгімонтам у 1511 г. граматы дняпроўскім і задвінскім горадам, Рэчыца ў ліку іншых валасцей атрымала права ўносіць даніну непасрэдна ў казну «как бывала за великого князя Витовта», затым у 1561 г. кароль Жыгімонт даў асобную грамату жыхарам Рэчыцы, у якой было пацвярджэнне падаткаў і павіннасцяў, а таксама правы суда і гандлю; у 1596 г. усе гэтыя прывілеі былі пацверджаны і Жыгімонтам III. У 1634 г. мінскі ваявода Аляксандр Слушко заснаваў тут манастыр дамініканцаў. Падчас вайны Багдана Хмяльніцкага ў 1648 г. Рэчыцу занялі казакі, але ў наступным годзе Януш Радзівіл, гетман літоўскі, у наваколлі Лоева разбіў казацкія атрады Крычэўскага і Падабайлы. У 1650 г. Рэчыцу заняў Нябаба, але неўзабаве вымушаны быў уступіць і загінуў у бойцы. Пасля гэтага гетман умацаваў горад і заняў яго войскамі; у 1653 г. у Рэчыцы літоўскае войска мела галоўную кватэру, а ў наступным годзе рушыла на Воршу і тут было разбіта войскамі цара Аляксея Міхайлавіча пад камандаваннем князя Трубяцкога; Рэчыца засталася безабароннай і была занята рускімі войскамі. У 1796 г. Рэчыца была староствам, а потым — павятовым горадам чарнігаўскага намесніцтва; у 1797 г. яна была далучана да Менскай губерні, а ў 1802 г. пакінута павятовым горадам гэтай жа губерні. У 1845 г. быў зацверджаны герб Рэчыцкага павета, які ўяўляў сабою шчыт, раздзелены на дзве палавіны, прычым у верхнім змешчаны губернскі герб, а ў ніжняй — у белым полі распушчаны ў левы бок двухканцовы сцяг ружовага колеру, ніжні канец сцягу некалькі даўжэйшы; на сцягу выява конніка ў латах, які сядзіць на кані павернуты ў правы бок; у правай руцэ конніка — аголены меч, а ў левай — шчыт з выявай на ім двайнога крыжа. Насельніцтва Рэчыцы дасягае больш чым 10 000 чалавек, з іх праваслаўных — 37 %, яўрэяў — да 57 %, астатнія ж 4 % складаюць іншыя веравызнанні; што датычыць складу насельніцтва паводле саслоўя, то найбольшы працэнт складаюць мяшчане — 80 %. Цяпер у горадзе ёсць дзве царквы — адна, больш новая, Успенская, а другая, — што існавала з 1723 г., Святога Мікалая, каталіцкі касцёл, сінагога і некалькі яўрэйскіх малітоўных дамоў, прыходскае вучылішча і некалькі хедэраў, бальніцы — прыказа грамадскага апекавання на 15 ложкаў і турэмная на 4 ложкі, аптэка, яўрэйскае таварыства для аказання дапамогі бедным і дзве лесапільні з 53 рабочымі. У Рэчыцы ёсць параходная прыстань на Дняпры. Горад гандлюе хлебам і лесам. Уніз па Дняпры адпраўляецца адсюль звыш 160 тыс. пудоў грузавых, а прыбывае да 1500 тыс. пуд.

З жыхароў горада мяшчане-хрысціяне жывуць заможна, займаюцца галоўным чынам земляробствам, а таксама рыбалоўствам, сплавам лесу, лясных матэрыялаў і адкормам свіней; яўрэі ж займаюцца дробным гандлем і таксама сплавам лесу і лясных прадуктаў. Даходы горада дасягаюць 14,5 тыс. рублёў. Два разы на год у Рэчыцы збіраюцца ярмаркі — 9-га мая і 6-га снежня; на іх прадаюцца хлеб, коні і скаціна. У 1830 г. у Рэчыцы нарадзіўся У. Д. Спасовіч, вядомы адвакат, крытык і публіцыст.

Вярстах у 30 на паўночны захад ад Рэчыцы ўверх па Дняпры, вярстах у 4 вышэй упадзення ў яго р. Бярэзіны на правым беразе гэтай ракі ляжыць пры паштовым тракце з Менска ў Рэчыцу м. Горваль. Мястэчка гэта раней належала князям літоўскім, і на яго часта нападалі маскоўскія войскі. Пры цараванні Івана Грознага, у

1535 г. яно было зусім разбурана, а падчас вайны Яна-Казіміра з царом Аляксеем Міхайлавічам у другі раз было спустошана. У 1503 г. Аляксандр Ягелончык заключыў перамір'е на 6 гадоў з Іванам III; у гэтым дагаворы Горваль у ліку іншых мястэчак быў названы польскай тэрыторыяй і да зыходу тэрміна перамір'я не падлягаў нападзенням. У 1648 г. казакі пад Горвалем разбілі на голаў стражніка літоўскага Мірскага. Мясцовасць навокал мястэчка — палеская, але ж бедная; маёнтак складаюць 53 000 моргаў зямлі; у пушчах гоніцца смала і вырабляецца шкіпінар. Цяпер маёнтак знаходзіцца ў запусценні. У мястэчку налічваецца 900 жыхароў, якія займаюцца галоўным чынам сплавам лесу і гандлем; гандлем займаюцца пераважна яўрэі. У мястэчку ёсць праваслаўная царква, станавая кватэра, валасное праўленне, тры яўрэйскіх малітоўных дамы, бальніца, вучылішча і даволі многа крамаў. На падставе былых прывілеяў тут кожны тыдзень адбываюцца таргі. На прыстані ў Гарвалі грузіцца да 500 тыс. пудоў лясных грузаў.

Уніз па Дняпры вярстах у 30 на паўднёвы ўсход ад Рэчыцы размешчана мястэчка Холмеч з прыстанню і паромнай пераправай. У мястэчку ёсць дзве праваслаўныя царквы, два яўрэйскіх малітоўных дамы, два бровары і некалькі млыноў. Здаўна мястэчка належала Валовічам, а ў апошні час — Ракіцкім. Дзякуючы месцараспалажэнню ля ракі Холмеч з'яўляецца гандлёвым пунктам: адсюль вывозяцца ўніз па Дняпры лясныя матэрыялы і смала, параходы ж знізу прывозяць соль, зерне і інш. прадметы першай неабходнасці; усіх грузаў адпраўляецца ўніз каля 750 тыс. пудоў. Мястэчка стала вядомым з часоў казацкіх войнаў. У 1649 г. гетман Януш Радзівіл разбіў тут казакоў, якія былі пад начальствам Падабайлы і Крычэўскага. У 1775 г. 4 ліпеня пасля першага падзелу Польшчы ў Холмечы быў падпісаны акт размежавання беларускіх зямель паміж Польшчай і Расіяй.

Ніжэй м. Холмеча на Дняпры вярстах у 30 ад яго ляжыць мястэчка Лоеў, якое мае параходную прыстань на Дняпры пры ўпадзенні ў яго Сожа, на мяжы Магілёўскай і Чарнігаўскай губерняў. Мястэчка размешчана таксама пры паштовым тракце з Рэчыцы ў Чарнігаў. У Лоеве ёсць верф для пабудовы суднаў. Жыхароў тут налічваецца 1615 чалавек абодвух палоў. У мястэчку ёсць дзве праваслаўныя царквы, касцёл, чатыры сінагогі, школа, сем ветраных млыноў і два вадзяных, даволі многа крамаў, паштовая станцыя і валасное праўленне. На прыстані складваюцца тавары, якія сплаўляліся вясною і летам па Дняпры, Бярэзіне і Сожу, галоўным чынам соль, зерне, лён, масла і клёпка. Усіх гэтых грузаў адпраўляецца ўверх да 70 тыс. пудоў, уніз — за 160 тыс. пудоў, а прыходзіць знізу да 90 тыс. і зверху — да 15 тыс. пудоў. Наогул Лоеў уяўляе сабою мястэчка, прычым гандаль тут асабліва ажыўлены вясною. Гандлем амаль выключна займаюцца яўрэі. Пра паходжанне Лоева гісторыя маўчыць, але без сумнення ён быў адным з старажытнейшых пасяленняў, таму што зручнае размяшчэнне яго пры вялікай рацэ, якая была старажытным гандлёвым шляхам «З вараг у грэкі», рабіла Лоеў адным з этапаў каланізацыі; ва ўсялякім разе адносна Лоева вядома, што з часоў Літвы ён знаходзіўся пад уладай Польшчы і ў далейшай сваёй гісторыі быў многа разоў спустошаны. У 1505 г. мястэчка было разбурана перакопскай ардой Махмед-Гірэя, які тады ваяваў з Менскім і Слуцкім княствамі. На галоўным сейме 1646 г. Лоеў быў далучаны да Старадубскага павета Смаленскага ваяводства, як кампенсацыя Літве за вернуты Трубчэўск. Падчас паўстання казакоў пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага Лоеў быў сведкам крывавай разні. У канцы 1648 г. казацкі галава Падабайла знішчыў яго зусім. Гэтаму ж мог перашкодзіць харунжы Галеўскі, які быў там, таму што атрад казакоў пад началам Крачкоўскага пагражаў яму з тылу; між тым стары гетман літоўскі Станіслаў Кішка з прычыны хваробы не мог прыняць удзел у вайне і даручыў камандаванне гетману Янушу Радзівілу, які знаходзіўся пад Рэчыцай. Такім чынам, пачаліся ваенныя дзеянні. 18 ліпеня 1649 г. Януш Радзівіл рушыў з-пад Рэчыцы свае войскі — пяхоту байдакамі па Дняпры, а конніцу і артылерыю сухім шляхам — і прыйшоў к Лоеву ў два дні; Галеўскі ж з пяхотай перабраўся на другі бок Дняпра, на месцы ўпадзення ў яго Сожа, і зрабіў тут акопы, каб аблегчыць рух Радзівіла, які ішоў з войскамі к Лоеву. Толькі 31 ліпеня Крачкоўскі сустрэўся з войскамі Радзівіла. Адбылася ўпорная і крывавая бітва, у якой казакі былі разбіты наголаў. Ніжэй па Дняпры няма адметных пасяленняў, таму што найбольш прыкметныя — Радуль і Любеч знаходзяцца на левым беразе Дняпра ў Чарнігаўскай губерні.

Вярстах у 25 ад Лоева, пры дарозе ў Любеч, паблізу правага берага Дняпра ў Рэчыцкім павеце знаходзіцца с. Дзеражычы з праваслаўнай царквой, сельскай школай, а таксама з прыстанню на Дняпры. Трохі вышэй Дзеражычаў знаходзіцца Дзеражыцкая мель, а ніжэй Дзеражычаў вёрстаў на 5, супраць Любеча размешчана с. Глушэц; недалёка ад сяла ёсць пастаянная паромная пераправа па дарозе з Мазыра ў Чарнігаў і прыстань. Вярстах у 30 ніжэй Глушца, недалёка ад упадзення ў Дняпро р. Брагінка, знаходзіцца Каначэўская мель і размешчана с. Старая Іолча. Гэта сяло знаходзіцца на палявой дарозе праз Дняпро. У ім ёсць часовая паромная пераправа і параходная прыстань. Вярстах у 30 ніжэй Старой Іолчы размешчана мястэчка Камарын, таксама з параходнай прыстанню. У мястэчку ёсць значная мель. Вярстах у 15 ніжэй Камарына ляжыць м. Верхнія Жары, а 5 вёрстаў ніжэй — Ніжнія Жары з лясной прыстанню. Далей Дняпро выходзіць правым берагам за межы Менскай губерні ў Кіеўскую і кіруецца да вусця Прыпяці.

Рэчыцкі павет займае плошчу ў 4087 кв. вёрстаў з насельніцтвам 223 тыс. душ (19 жых. на кв. вярсту) і размешчаны на правым беразе Дняпра і на яго прытоку Прыпяці. Мясцовасць большай часткай нізінная. Глеба пясчаная і балоцістая; паміж Прыпяццю і Дняпром зрэшты ёсць вастравок сугліністых і супясчаных глебаў, а па далінах Дняпра і Прыпяці цягнуцца палосы пойменных глебаў. Пад лесам 33 % плошчы павету (364 тыс. дзес.), пад балотам 33,5 % (368 тыс. дес.), пад ворывам каля 19,5 % (216 тыс. дзес.), а пад лугамі і выганамі каля 14 % (153 тыс. дзес.). Насельніцтва займаецца ляснымі, суднавымі промысламі, рыбалоўствам і земляробствам.

Брэсцка-Бранская чыгунка пераходзіць праз мост, праз Дняпро пад Рэчыцай і выходзіць у Гомельскі павет Магілёўскай губерні. У 39 вярстах ад Рэчыцы дасягае ст. Гомель, размешчанай пры аднайменным павятовым горадзе, дзе і перасякаецца з Лібава-Роменскай чыгункай і р. Сож.

З кнігі «Россия. Полное географическое описание нашего отечества». СПб.: 1905.

Колькі гадоў Рэчыцы?

...Шмат каму пытанне такое падасца дзіўным. «Рэчыца нядаўна святкавала гэты дзень, — могуць зазначыць яны. — Гораду 780 гадоў». Больш дасведчаныя, што цікавіліся пытаннем, з якога пачынаецца артыкул, шукаючы адказ у даведніках і энцыклапедыях, будуць менш катэгарычнымі. І вось чаму. Найчасцей годам першага ўпамінку Рэчыцы старажытным летапісцам з'яўляецца не 1213-ы, а 1214-ы.

...30 гадоў таму Б. І. Умецкі выдаў кароткі гісторыка-эканамічны нарыс «Речица». У ім некалькі радкоў з поўнага збору рускіх летапісяў, падрыхтаваных да друку археалагічнай камісіяй у Санкт-Пецярбургу ў 1841—1859 гг.

«В лето 6721 Мстислав же Мстиславич собрався за Новгородцыи Смолняны и прочими помочми, поиде ко Киеву на Всеволода Киевского и повоева во первых вся волости Черниговскии по Днепру, державы Всеволодовы, наченеше от Речицы вся грады и села поплени...».

Як бачым, у лета 6721 Мсціслаў Мсціслававіч (называлі таксама Мсціславам Удалым) сабраўся за Ноўгарадцы... Аднімем ад гэтай лічбы 5508, як патрэбна рабіць пры пераходзе на цяперашняе часавылічэнне. Атрымліваецца: Мсціслаў Мсціслававіч, князь наўгародскі, рушыў на Кіеў у 1213 г. Але ж Умецкі, бачачы тое, у нарысе падкрэслівае: «...Первое летописное упоминание о Речице относится к 1214 г.».

Дык чаму ж так? На Умецкага, напэўна ж, як бы цісне аўтарытэт рускага гісторыка С. М. Салаўёва. У працах ягоных час пачатку паходу Мсціслава Удалога на Кіеў пазначаны 1214-ым г. Якой летапіссю кіраваўся С. М. Салаўёў, калі апавядаў пра паход на Усевалада?

Няхай сабе Салаўёў памыліўся, і Мсціслаў Мсціслававіч рушыў на Кіеў усё ж летам 1213 г. Калі дружына ягоная магла з'явіцца каля Рэчыцы? Напэўна ж, не раней чым у пачатку 1214 г. Шлях ад Ноўгарада да горада нашага немалы. Ды і ў Смаленску ў дружыны Мсціслававай была затрымка. Дайшло нават да сутычкі паміж наўгародцамі і смальнянамі. Дружына не схацела ісці за Мсціславам далей. Але князя тое не стрымала. Пайшоў адзін. Бачачы тое, дружына раскаялася, рушыла следам.

У працах яшчэ аднаго славутага рускага гісторыка — М. І. Кастамарава занатавана:

дружына Мсціслава Удалога ўзяла прыступам Рэчыцу. На чым грунтуецца такое сцвярджэнне? На аўтарскай інтуіцыі? Бадай, што так. Але ж яно, такое сцвярджэнне, аніяк не вытлумачваецца тагачаснымі абставінамі. Па-першае, Мсціслаў Мсціслававіч быў чалавекам надзвычайнага сумлення. Гісторыя не захавала доказаў ягонай вераломнасці. Перад тым як узяць які горад, ён паведамляў аб намеры варожаму боку. Нярэдка і тройчы. Таксама, напэўна, было і ў дачыненні Рэчыцы. Па-другое, ці магла тагачасная Рэчыца думаць пра ўзброены адпор, бачачы дружыну Мсціслававу, перад якой збаяўся неўзабаве нават сам князь кіеўскі?

Але не будзем надта засяроджваць увагу на гадах, высвятляючы, які — 1213-ы ці 1214-ы — больш правільны ў дачыненні першага ўпамінку пра Рэчыцу. Аналіз дадатковых крыніц дазваляе сур'ёзна ўсумніцца ў дачыненні абодвух гадоў.

Хто ёсць чарнігаўскі князь Усевалад, на якога рушыў Мсціслаў? Сын вялікага князя кіеўскага Святаслава Усеваладавіча, які памёр у 1194 г. Яго, Усевалада Чарнігаўскага і Кіеўскага, звалі таксама Усеваладам Чэрмным. Калі кіеўскі князь Рурык Расціслававіч (дзядзька Мсціслава Мсціслававіча Удалога) памёр, то Чэрмны выгнаў з зямлі Кіеўскай сыноў і пляменнікаў Рурыкавых, сам авалодаў Кіевам. Выгнаннікі звярнуліся за дапамогай да Мсціслава Мсціслававіча. Ён згадзіўся пастаяць за праўду. Прывёў дружыну да Кіева, быў гатовы змагацца з Усеваладам Чэрмным. Але той, збаяўшыся, уцёк за Дняпро.

Пацікавімся радаслоўнай Усевалада Чэрмнага. Яна ў шматтомнай капітальнай працы — «История СССР с древнейших времен до наших дней». М.: 1966.

І што ж бачна: Усевалад Чэрмны памёр у ... 1212 г. Значыць, тыя падзеі, пра якія апавядаецца ў летапісу ў дачыненні Рэчыцы, аніяк не маглі мець месца ні ў 1213 ні ў 1214 г. Яны былі раней 1212 г.

Але ў княскіх радаводах ёсць яшчэ адна загадка. У дачыненні смерці Рурыка Расціслававіча, Вялікага князя Кіеўскага, нашчадкаў якога выгнаў з Кіева Усевалад Чэрмны. Радаслоўная Рурыка Расціслававіча паказвае: ён памёр у ... 1215 годзе.

Значыць, нешта пераблытана летапісцам або памылак нарабілі складальнікі княскіх радаводаў. Апошняе было б найбольш прыкрым, бо над памянёнай вышэй працай па гісторыі СССР карпелі не адзін дзесятак акадэмікаў ды членаў-карэспандэнтаў. І радаслоўныя амаль 30 гадоў пераходзяць з аднаго выдання ў другое. У тым ліку і ў зборнікі Карамзіна, Кастамарава, Салаўёва, Тацішчава.

А цяпер, бадай, пра галоўнае. Адказ на пытанне, з якога пачынаецца гэты артыкул, знаходзіцца, па ўсёй верагоднасці, у іншых крыніцах, чым у 1-ым Ноўгарадскім летапісу, дзе распавядаецца пра паход Мсціслава Мсціслававіча Удалога на Кіеў (1213—1214 гг.).

У 1900 г. у Маскве ў друкарні Шарапава выйшла праца Л. Вінаградава «Гомель. Его прошлое и настоящее. 1142—1900 гг.». Яна прысвечана «Светлейшему Князю Варшавскому Графу Федору Ивановичу Паскевичу-Эриванскому»...

Азнаямленне з кнігай Л. Вінаградава паказвае: у ягонай асобе — карпатлівы і старанны краязнаўца. Ён нашмат глыбей засяродзіўся на гістарычных крыніцах, чымсьці тыя ж Кастамараў і Салаўёў, якія «ахоплівалі» перыяд усяе Русі. Вінаградаў жа рупіўся адшукаць звесткі толькі пра Гомель. Знайшоў: гістарычная эпоха Гомеля пачынаецца з 1142 г., калі смаленскі князь Расціслаў Мсціслававіч пайшоў на чарнігаўскага князя Ігара Алегавіча, забраў у таго Гомель. Паведаміўшы пра тое, Л. Вінаградаў робіць зноску. А яна мае прамое дачыненне і да гісторыі Рэчыцы. Аказваецца, яшчэ раней 1142 г., калі ў летапісу названы Гомель, меліся звесткі пра Рэчыцу. Пазначаны і год — 1034-ы (хутчэй за ўсе — 1134-ы. — *Заўвага А. Рабянка і П. Рабянка.*). Яшчэ тады «...Новгородцы начаша воевати по Днепрю городе Черниговскее и взявша Речице на щить и иные городе мнози...».

Параўнаем тэксты з летапісаў, што ў нарысе Умецкага і працы Л. Вінаградава. Пра адно і тое ж: наўгародцы пачынаюць ваяваць гарады чарнігаўскія, што стаяць на Дняпры, і не мінаюць Рэчыцы. Толькі ж пра тое, ды словамі зусім іншымі.

Паміж 1034 (1134) і 1213—1214 гг. немалы прамежак часу. Дык няўжо і тады, яшчэ на пачатку XI (XII) ст., наўгародцы хадзілі на Кіеў паўз Рэчыцу? Сумнявацца не даводзіцца. Хадзіць ад Ноўгарада да Кіева Дняпром — шлях найбольш зручны. І на шляху гэтым, вядома ж, наўгародцы мелі сваіх таемных памочнікаў, якія паказвалі ў Ноўгарад нямала звестак пра княскую дружыну кіеўскую. Верагодна, што та-

ды, у 1034 (1134) г., наўгародцы і разбурылі Рэчыцу, ці, як у летапісу, на які спасылаецца Л. Вінаградаў, узялі яе на шчыт.

...Нядаўна Рэчыца святкавала юбілей — 780 гадоў. Дата не надта круглая, але ж. Ці адпавядае яна сапраўднасці? Наўрад. Верыцца: у бліжэйшы час будзе знойдзены грунтоўны доказ таго, што гісторыя Рэчыцы мае больш грыбокія карані, чым лічыцца дагэтуль. Магчыма, доказ такі на паліцы ці ў скрыні легендарнай бібліятэкі Івана Грознага, на след якой гісторыкі рупяцца натрапіць не адно стагоддзе.

А. Рабянок, П. Рабянок

Горваль

Паселішча Горваль вядомае па пісьмовых крыніцах з XIV ст., аднак на яго тэрыторыі маюцца два гарадзішчы эпохі Кіеўскай Русі і больш ранняга часу. Да сярэдневяковага замка Горваля адносіцца гарадзішча на ўсходняй ускраіне сучаснага селішча на правым беразе Бярэзіны ля спуску да парома. Пляцоўка яго мае прамавугольную форму памерамі 40×20 м, выцягнутую ўздоўж берага ракі па лініі поўнач — поўдзень. З усходу гарадзішча бароніць круты і высокі схіл берага, вышынёй больш за 13 м, з поўначы і поўдня яго прыкрываюць яры, з напольнага заходняга боку выкапаны штучны роў і насыпаны вал.

У 1503 г. Горваль у статусе мястэчка згаданы ў мірным пагадненні паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім княствам Літоўскім. У час вайны ў 1535 г. Горваль быў ушчэнт разбураны рускімі войскамі. Вядома, што з 1528 г. Горваль належаў дзяржаўцу Б. І. Шалуху, затым перайшоў да каралевы Боны, якая «фрымарком» аддала яго за Ковель князю В. Сангушку. У XVII ст. замкам валодала Віленская капітула. Верагодна, у першай палове XVII ст. і былі тут збудаваны бастыённыя ўмацаванні.

У 1648 г. пад Горвалем паўстанцы — украінскія казакі разбілі войска стражніка Вялікага княства Літоўскага князя Мірскага. Замак заставаўся важным пунктам, які кантраляваў пераправу і шлях на р. Бярэзіне ў Дняпро, што пацвердзіла вайна Расіі з Рэччу Паспалітай у XVII ст. У лістападзе 1654 г. казакі гетмана І. Залатарэнкі вымушаны былі хадзіць на штурм, у выніку чаго «замко Горвалю позжено». Пазней умацаванні былі адноўлены.

М. А. Ткачоў. «Замкі і людзі». Мн.: 1991.

Холмеч

Прыватнаўладальніцкі Холмеч у XVI — XVII стст. належаў Валовічам — некалі багатаму і знатнаму роду беларускіх феадалаў. Размешчаны на левым беразе Дняпра гарадок быў абкружаны валам з драўлянымі сценамі і вежамі. Уезд і выезд ажыццяўляліся праз двое варотаў, якія адкрывалі дарогу ў Рэчыцу і Лоеў. Хутчэй за ўсё яны называліся Рэчыцкімі і Лоеўскімі. Такой была сярэдневяковая традыцыя.

Умацаванні горада ўпамінаюцца ў сувязі з падзеямі 1649 г. і бітвай войскаў украінскага палкоўніка Крычэўскага супраць атрадаў гетмана Вялікага княства Літоўскага Януша Радзівіла. Холмеч быў заняты атрадам шляхціча і наёмнікаў на чале з ротмістрам Сасноўскім. Аднак жыхары горада ўстанавілі сувязь з паўстанцамі і адчынілі вароты. Атрад Сасноўскага быў ліквідаваны.

Цяпер сляды старажытных умацаванняў Холмеча растварыліся пад забудовай і рэканструяваць іх цяжка.

М. А. Ткачоў. «Замкі і людзі». Мн.: 1991.

Рэвалюцыйны рух 1905—1907 гг.

Статыстычны даведнік «Города России в 1904 г.» дае ўяўленне аб колькасным саставе насельніцтва Рэчыцы. Усяго ў горадзе жылі 10 889 чалавек. З іх — 5462 мужчыны і 5427 жанчын. Яны займаліся ў асноўным земляробствам і перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі, рыбалоўствам, дробным рамяством. У горадзе, як і раней, няма буйных прамысловых прадпрыемстваў. «Обзор Минской губ. за 1904 г.» сведчыць: у Рэчыцкім павеце 47 фабрык і заводаў. На іх працуе каля 600 рабочых, сума вытворчас-

Паштова-тэлеграфная кантора. Пач. XX ст.

ці — 2586 тысяч рублёў. У самой жа Рэчыцы толькі два прамысловыя прадпрыемствы. Працуюць тут 43 рабочыя. Яны вырабляюць прадукцыі на 39 тысяч рублёў у год. Лічбы, як бачым, даволі сціплыя. Вядома, у Рэчыцы меўся шэраг прадпрыемстваў зусім карлікавых, прадукцыя якіх не выходзіла за межы павета.

Прамысловы крызіс 1900—1903 гг. узмацніў супярэчнасці паміж рабочым класам і буржуазіяй. Ад патрабаванняў эканамічнага характару працоўныя пачынаюць пераходзіць да патрабаванняў палітычных. Рэвалюцыйныя выступленні пралетарыяту ахопліваюць Беларусь, у тым ліку Рэчыцу і павет. У 1903 г. рабочыя Рэчыцы ўпершыню ўключыліся ў палітычную барацьбу — у горадзе адбылася першамайская забастоўка.

У снежні 1903 г. сярод жыхароў мястэчка Холмеч была распаўсюджана нелегальная літаратура — газета «Іскра», № 42, 1903 г., пракламацыі Кіеўскага камітэта РСДРП — «Канец зубатаўшчыны», «Да рэкрутаў», «Далоў самадзяржаўе!». З данясення памочніка начальніка Мінскага губернскага ўпраўлення ў дэпартамент паліцыі вынікае: 1 сакавіка 1904 г. у Рэчыцы распаўсюджаны пракламацыі «Дзеля чаго павінен паміраць рускі салдат!».

Палітычная дэманстрацыя мела месца ў Рэчыцы 9—10 чэрвеня 1905 г. Рабочыя горада і моладзь ішлі пад лозунгамі: «Далоў самадзяржаўе!», «Далоў царскі суд!», «Далоў паліцыю!». З мэтай самаабароны рабочыя арганізоўваюць баявы атрад.

23 чэрвеня дэманстрацыя адбылася каля будынка турмы. У ёй прынялі ўдзел каля 400 чалавек. Праз пяць дзён (28 чэрвеня 1905 г.) успыхнула яшчэ адна дэманстрацыя. У наступным месяцы 4 і 15 ліпеня прайшлі яшчэ дзве дэманстрацыі.

Рэчыцкая жаночая гімназія Гаўрылавай. Пач. XX ст.

Разам з рабочым рухам разгарнулася рэвалюцыйная барацьба шырокіх мас сялянства і на тэрыторыі павета. Сяляне захопліваліпамешчыцкія землі, секлі лес, грамілі маёнткі. Сур'ёзныя аграрныя хваляванні адбыліся ў маёнтках памешчыкаў Ваньковіча, Горвата, графіні Ракіцкай (май — чэрвень 1905 г.). Вяскоўцы патрабавалі павелічэння заработнай платы, адмаўляліся ад выканання павіннасцей, самавольна выганялі жывёлу на памешчыцкія ўгоддзі. Аб гэтым, у прыватнасці, паведамляла газета «Пралетарый» у нумары ад 22 чэрвеня 1905 г.

Сялянскія выступленні мелі месца ў вёсках Стралічава і Дудзічы (поўдзень Рэчыцкага павета).

З прадстаўлення пракурора Мінскага акруговага суда пракурору Віленскай судовай палаты бачна, што 20 і 21 лістапада 1905 г. у мястэчку Холмеч праводзілася агітацыя сярод сялян. Яна была накіравана супраць самадзяржаўя. Агітатару актыўна дапамагалі мясцовыя жыхары Сцяпан Кучень, Мікалай Пяскоўскі і Мікалай Вайтовіч.

19 снежня 1905 г. сур'ёзнае сялянскае хваляванне пачалося ў мястэчку Горваль. Мясцовых жыхароў падтрымалі насельнікі суседніх вёсак. Рэчыцкая паліцыя не здолела ўласнымі сіламі ўсмірыць сялян. Была выклікана вайсковая каманда. Але і яна не дала рады. І толькі казакі здолелі падавіць сялянскі бунт.

Сялянскія хваляванні ў 1905 г. адбыліся таксама ў вёсках Заходы і Заспа. Прыклад арганізаванасці паказалі жыхары вёскі Дзюрдзеў (цяпер Камсамольск) Горвальскай воласці. На рэвалюцыйную барацьбу

Касцёл. Пач. XX ст. Цяпер вітамінны бар



Выпіс з прыгоннай кнігі аб продажы зямлі, в. Глыбаў. 1904 г.

яны ўзняліся яшчэ ў ліпені 1904 г. Аб'явіўшы забастоўку, не спынялі яе больш тыдня. У 1905 г. пайшлі на ўзброенае сутыкненне са стражнікамі. У ходзе сутыкнення быў забіты адзін селянін і паранены стражнік. Улады прынялі ўсе меры для таго, каб паўстанне вяскоўцаў было падаўлена. Гэта ўдалося: 25 чалавек былі арыштаваны. Чатыры з іх былі засланы ў Сібір, трое высланы за межы губерні, адзін павешаны.

У 1906 г. сялянскі рух у Рэчыцкім павеце разгарнуўся з яшчэ большай сілай. 22 студзеня ў газеце «Труд» (№ 16) быў надрукаваны прысуд сялян вёсак Холмеч і Завужаль, у якім яны патрабавалі перадачы вяскоўцам казённых, удзельных, манастырскіх і памешчыцкіх зямель. Былі ў прысудзе і іншыя патрабаванні: знішчэнне саслоўяў; вяртанне грошай, якія сяляне пераплацілі за зямлю; усеагульнае і абавязковае абучэнне за дзяржаўны кошт; скліканне Устаноўчага сходу на аснове ўсеагульнага, прамога і тайнага выбарчага права.

17 чэрвеня 1906 г. сяляне шэрагу вёсак Рэчыцкага павета адмовіліся плаціць грошы за пасьбу жывёлы ў казённых лясах. А калі прыбылі леснікі, то сілай прагналі іх прэч.

20 чэрвеня адбылося сутыкненне паміж сялянамі і вартаўнікамі памешчыцкай маёмасці ў вёсцы Салтанова. Сяляне збілі прыстава, паранілі стражніка. Неўзабаве з Рэчыцы прыбыла вайсковая каманда. Яна арыштавала 14 чалавек. Толькі пасля гэтага сяляне спынілі захоп памешчыцкай зямлі. Калі ж салдаты пакінулі Салтанова, то вяскоўцы выгналі пасвіцца жывёлу на кармавыя ўгоддзі мясцовага памешчыка.

Барацьбу супраць сваіх прыгнятальнікаў вялі ў 1906 г. жыхары маёнткаў Чрусі, Сямігосцічы, хутара Стары Косцічаў і многіх іншых населеных пунктаў Рэчыцкага павета.

Палітычныя стачкі і мітынгі правялі ў маі рабочыя Рэчыцы.

Унушальнымі палітычнымі стачкамі

Першы выпуск Рэчыцкага Пушкінскага гарадскога вучылішча. 1904 г.

быў адметны ў Рэчыцы май 1907 г. Потым пракацілася хваля палітычных забастовак. У ліпені 1907 г. баставалі рабочыя фанернай фабрыкі Каплана. Адміністрацыі фабрыкі былі прад'яўлены наступныя патрабаванні: павелічэнне заработнай платы на 15—30 працэнтаў, нікога не звальняць на прадпрыемстве без згоды рабочых, не прымушаць працаваць звышурочна.

22 жніўня забаставалі сяляне вёсак Броннае, Жмураўка і Казазаеўка. Яны адмовіліся вазіць сена на прасавальны завод, што знаходзіўся ў Гомельскім павеце. Сяляне патрабавалі павышэння заработнай платы. Кіраўніцтва ж завода не згадзілася з бунтаўшчыкамі, наняло на работу сялян з іншых вёсак. Але забастоўшчыкі не дапусцілі іх да работы.

Хваляванні жыхароў Броннага, Жмураўкі і Казазаеўкі працягваліся да таго часу, пакуль у вёскі не прыбыў атрад стражнікаў.

Часам сяляне Рэчыцкага павета выкарыстоўвалі і такую форму барацьбы з памешчыкамі, як спальванне іхняй маёмасці, а часам і маёнткаў. Напрыклад, у 1907 г. быў знішчаны маёнтак памешчыка Бараноўскага.

У другім паўгоддзі 1907 г. у рэвалюцыйным руху наступае спад, у канцы года было заўважана паражэнне рэвалюцыі. Атрымаўшы часовую перамогу, царызм спрабаваў замацаваць яе суровымі рэпрэсіямі. Была разгромлена і Рэчыцкая група РСДРП. Мясцовыя партыйцы, каторыя пазбеглі арыштаў, пайшлі ў падполле. Зрабілі гэта дзеля таго, каб зберагчы сілы, падрыхтавацца да новых рэвалюцыйных бітваў. Рыхтаваліся да іх таксама жыхары Рэчыцы і павета. Увогуле, у 1907 г. у Рэчыцы былі 3 параўнальна буйныя прамысловыя прадпрыемствы. На іх працавалі 165 рабочых, якія выпускалі ў год прадукцыі на суму ў 265 тысяч рублёў. На тэрыторыі ж павета прадукцыю выпускалі 44 фабрыкі і заводы. Агульная колькасць рабочых — 368 чалавек, сума вытворчасці прадукцыі — 2648 тысяч рублёў у год.

П. П. Рабянок, І. А. Шафір

Група рабочых і служачых завода механічнай апрацоўкі дрэва. 1907 г.

Паміж дзвюма рэвалюцыямі

Пасля паражэння рэвалюцыі 1905—1907 гг. пачаўся перыяд жорсткай рэакцыі. Былі разгромлены сацыял-дэмакратычныя арганізацыі, прафсаюзы, закрыты многія асветніцкія таварыствы, што ўзніклі і дзейнічалі ў гады рэвалюцыі. Кіраўнікі Рэчыцкай групы РСДРП Саланец і Вайтовіч былі схоплены і асуджаны царскім судом на ссылку ў Сібір. Пяскоўскаму і Сікорскаму ўдалося схавацца. На ссылку ў Сібір выправіліся і эсэры: Спявак (Рэчыца) і Акуленка (Юравічы).

Але і ў перыяд рэакцыі рэчыцкія бальшавікі не спынялі рэвалюцыйнай работы. Так, Рэчыцкая арганізацыя РСДРП аднавіла сваю дзейнасць ужо ў 1908—1909 гг.

Нягледзячы на разгул чарнасоценнай рэакцыі, аднаўляецца сялянскі рух за зямлю і волю. Вясной 1908 г. у вёсцы Казіміраўка (Холмецкая воласць) адбыўся сялянскі з'езд. Яго ўдзельнікамі былі 55 дэлегатаў. З'езд абмеркаваў наступныя пытанні: аб выбарах у Дзяржаўную думу, аб аграрным пытанні, аб накіраванні навабранцаў у армію, аб эканамічнай рабоце ў вёсцы. На гэтым з'ездзе быў і прадстаўнік Усерасійскага сялянскага саюза. Па аграрнаму пытанню дэлегаты з'езда выказаліся за працяг барацьбы з памешчыкамі. У дачыненні арміі рашэнне было такім: навабранцаў выпраўляць на вайсковую службу з наказам, каб яны не стралялі ў рабочых.

У гэтым жа 1908 г. у раёне вёскі Казіміраўка былі падпілаваны ўсе тэлеграфныя слупы. У Рэчыцы адбылася стачка. Спыніліся ўсе заводы і фабрыкі. Рабочыя патрабавалі зменшыць працоўны дзень, даць час для абеду. Стачка мела працяг у 1909 г. Патрабаванні рабочых былі задаволены.

Сялянская барацьба на тэрыторыі Беларусі значна актывізавалася ў 1910—1911 гг. У 1911 г. жыхары вёскі Пракісель атрымалі прапанову выйсці на хутары. Большасць вяскоўцаў рашуча адхілілі гэту прапанову.

Рэчыца. Хросны ход. Перанясенне мошчаў Еўфрасінні Полацкай. 1910 г.

Але асобныя з найбольш заможных далі згоду для пераходу на хутарное землекарыстанне. Вяскоўцы кінулі ім папрок і пагрозу спаліць. У хуткім часе ўспыхнула гумно старасты. У Пракісель прыбыла з Рэчыцы паліцыя. Знайсці падпалышчыкаў яна не здолела, затое арыштавала некалькіх «зачыншчыкаў беспарадкаў».

Ленскі расстрэл вясной 1912 г. ускалыхнуў пралетарыят і сялянства ўсёй Расіі.

З данясення Мінскага губернатара Дэпартаменту паліцыі вядома, што 12 чэрвеня 1913 г. сяляне вёскі Заспа Рэчыцкага павета ажыццявілі самавольны выпас жывёлы на азімых, яравых пасевах, якія належалі мясцоваму памешчыку Н. І. Аляксандраву. Нанеслі яму ўрон на значную суму.

Увогуле ў 1913 г. у павеце мела месца 21 выступленне сялян. Сваёй барацьбы вяскоўцы не спынялі і ў наступным годзе. Пачасціліся пагромы і падпалы памешчыцкіх маёнткаў, маёмасці кулакоў. Так, падпалілі гаспадарчыя пабудовы і маёнтак памешчыка сяляне вёскі Верхнія Жары. Жыхары вёскі Гарадніцы не далі працаваць землямеру, які прыбыў з Рэчыцы, каб наразаць зямлю пад хутары.

Вясной 1914 г. самавольную пашу жывёлы на памешчыцкай зямлі распачалі сяляне вёсак Броннае, Жмураўка і Казазаеўка.

Класавыя супярэчнасці ў вёсцы ва ўмовах імперыялістычнай вайны рэзка абвастрылі абстаноўку і выліліся ў новую ўспышку сялянскіх «бунтаў». У 1915 г. Рэчыцкі павятовы спраўнік паведамляў мінскаму губернатару, што ў павеце «...в последнее время самовольные порубки значительно участились». Спраўнік указваў таксама: лясная варта баіцца затрымліваць парушальнікаў па той прычыне, што яны «...угрожают побоями, и уже был случай нанесения лесному сторожу побоев, а несколько лет тому назад был случай убийства лесного сторожа крестьянами».

У жніўні 1916 г. забаставалі ў Рэчыцы рабочыя цвікавага аддзялення завода братоў Рык. Яны патрабавалі павелічэння заработнай платы.

У ходзе Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1917 г., якая звергла царскае самаўладдзе, у гарадах Беларусі, як і па ўсёй Расіі, ствараліся Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў, а ў вёсках — сялянскія камітэты. З данясення старшага фабрычнага інспектара Мінскай губерні ў Міністэрства гандлю і прамысловасці ад 27 красавіка 1917 г. бачна: у Рэчыцы дзейнічае Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, а каторыя з прадпрыемстваў перайшлі на васьмігадзінны рабочы дзень. Найперш гэта зрабілі рабочыя завода братоў Рык і фанернага завода Каплана.

У маі на васьмігадзінны рабочы дзень перайшлі і працаўнікі запалкавай фабрыкі «Днепр».

21—23 мая 1917 г. у Рэчыцы адбыўся павятовы сялянскі з'езд. Ён выбраў выканкам Савета сялянскіх дэпутатаў. У састаў выканкама ўвайшлі толькі бальшавікі і тыя, хто ім спачуваў. Было прынята рашэнне аб аб'яднанні выканкама Савета сялянскіх дэпутатаў з выканкамам Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. З'езд пастанавіў рэквізаваць у памешчыкаў для патрэб арміі $^{3}/_{4}$ жывёлы, а племянную жывёлу перадаць сялянам. Валасныя камітэты павета апошняе рашэнне сялянскага з'езда прынялі да выканання.

У ліпені 1917 г. была ўтворана Рэчыцкая арганізацыя РСДРП бальшавікоў. Яна распаўсюдзіла свой уплыў на ўвесь павет. Падпольны камітэт узначаліў Аляксандр Сцяпанавіч Кастэнка. У састаў камітэта ўвайшлі П. Кузняцоў, А. Савінскі, П. Нікіцін, І. Галубкоў.

Верасень 1917 г. Рэчыцкі камітэт РСДРП(б) звярнуўся «К товарищам» з падпісным лістом аб зборы сродкаў на набыццё друкарні бальшавіцкай газеты «Буревестник», якая выходзіла ў Мінску. «Поможем областному комитету приобрести собственную типографию, — гаварылася ў звароце. — Типография — это наша кузница, где укрепляется пролетарская мощь...»

Вядома, апроч бальшавікоў работу сярод насельніцтва Рэчыцы і павета праводзілі таксама меншавікі, эсэры, бундаўцы. Успаміны А. С. Кастэнкі даюць уяўленне аб тых «сілах», якія дзейнічалі пад той час у Рэчыцы: «1. Сацыял-дэмакраты (меншавікі). Кіраўнікі: Печкуроў (настаўнік) і Палей (гаспадар гасцініцы «Еўропа»); 2. Сацыял-дэмакраты (інтэрнацыяналісты). Кіраўнік — Паперны (гаспадар гасцініцы «Парыж»); 3. Эсэры правыя. Кіраўнік — Яфім Спявак; 4. Эсэры левыя. Кіраўнік — Сцяпан Акуленка; 5. Арганізацыя Бунд. Кі-


Форма № 17.

КНИЖКА № 9887/18528

ГОСУДАРСТВЕННАЯ

СБЕРЕГАТЕЛЬНАЯ КАССА

№ 357

при Городской думе

Города Рѣчицы

Губерніи Минской

Э. Э. Г. Б. 1913

Ашчадная кніжка жыхара Рэчыцы. 1913 г.


Рѣчица «17» дня «мая» 1914 года.

ОРДЕРЪ № 212

По возвращеніи сего ордера и уплатѣ Руб. 100 Коп. 52

и пени «12» % годовыхъ послѣ «24» дня мая 1914 г.

г. Впредь ордера

Новогрудскаго Уѣзд. Казн. имѣетъ получить

квитанцію за №

Виленскій Частный Коммерческій Банкъ

Комиссионерство въ Рѣчицѣ.

Ордэр Рэчыцкага цвікавага завода

Сялянская хатка ў в. Заспа

раўнікі — браты Габавы (трымальнікі абутковай майстэрні) і Брыскін (уладальнік аптэкі); 6. Арганізацыя народных сацыялістаў. Кіраўнік — Каган (урач); 7. Арганізацыя кадэтаў. Кіраўнік — Караткевіч; 8. Арганізацыя беларускіх нацдэмаў. Кіраўнік — Лукашэвіч (інспектар народных вучылішчаў); 9. Саюз гараджан-земляробаў. Кіраўнікі — Дашчынскі і Філіпушка (мясцовыя служачыя)». Гэта не поўны пералік рэчыцкіх арганізацый, партый і саюзаў, што былі ў апазіцыі да бальшавікоў.

25—28 ліпеня 1917 г. у Рэчыцы баставалі рабочыя лесапільнага і фанернага заводаў. Забаставаліадначасова, вылучыўшы *наступныя патрабаванні: павелічэнне* заработнай платы да 50 працэнтаў, выдзяленне памяшкання для пасяджэння заводскіх камітэтаў, будаўніцтва рабочай казармы, лазні, сталовай, адкрыццё харчовай лаўкі. Большасць патрабаванняў, вылучаных рабочымі, былі неўзабаве задаволены. Варта адзначыць і тое, што забастоўкай кіравалі бальшавікі.

Праз два дні, адпрацаваўшы адну змену, рабочыя забаставалі зноў. Яны патрабавалі неадкладнага павышэння заработку. І гэта патрабаванне было задаволена: заработная плата павысілася да 40 працэнтаў, а за дні забастоўкі рабочым было аплочана 75 працэнтаў ад заработку.

25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. у Смольным адкрыўся II Усерасійскі з'езд Саветаў, які абвясціў пераход улады ў цэнтры і на месцах у рукі Саветаў. Сярод 400 бальшавікоў, дэлегатаў з'езда, былі прадстаўнікі і ад Рэчыцкага Савета.

Дарэчы, сход па выбарах дэлегатаў на гістарычны з'езд у Рэчыцы праходзіў бурна. Але большасць удзельнікаў сходу аддалі свае галасы за бальшавікоў — прапаршчыка 257-га пяхотнага запаснога палка Пятра Мілюкова і каваля запалкавай фабрыкі «Днепр» Афанасія Шчарбакова. П. Мілюкоў паехаў на з'езд з правам рашаючага голасу, а А. Шчарбакоў — дарадчага.

П. П. Рабянок, І. А. Шафір

Славутыя землякі

АСКЕРКА Аляксандр Уладзіслававіч нарадзіўся ў 1830 г. у маёнтку Рудакова Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Грамадскі дзеяч, ліберал, удзельнік паўстання 1863 г. на Беларусі і ў Літве. Скончыў Пецярбургскі універсітэт. Як член Мінскага камітэта, удзельнічаў у распрацоўцы ўмоў сялянскай рэформы 1861 г., у рабоце рэдакцыйных камісій у Пецярбургу; выступаў у друку па пытаннях земскага крэдыту. У 1862 г. арганізаваў у Варшаве выданне на беларускай мове «Элементажа для добрых дзетак каталікоў». Быў адным з кіраўнікоў партыі «белых» на Беларусі і ў Літве. У сакавіку 1863 г. увайшоў у склад паўстанцкага Аддзела кіраўніцтва правінцыямі Літвы. Арыштаваны 31.5.1863, сасланы на катаргу ў Сібір. З 1875-га жыў у Варшаве, працаваў у рэдакцыі часопіса «Ateneum».

А. У. Аскерка памёр 11.1.1911 г. у Відзах (Браслаўскі р-н Віцебскай вобл.).

Г. В. Кісялёў

ВІСЛАВУХ Фелікс Аўгусцінавіч нарадзіўся 11(23).9.1833 г. у Рэчыцкім павеце Мінскай губерні. Удзельнік паўстання 1863 г. у Літве і на Беларусі. З дробнамаянтковай шляхты. У 1856—1861 вучыўся ў Маскоўскім і Кіеўскім універсітэтах. Тайна перабраўся за мяжу, вучыўся ў польскай ваеннай школе ў Італіі. Пераканаты дэмакрат, прыхільнік партыі «чырвоных». У пачатку паўстання, паводле загаду Літоўскага правінцыяльнага камітэта, на чале атрадаў распачаў баявыя дзеянні ў Трокскім павеце. З канца мая 1863-га — паўстан-

цкі ваенны начальнік Трокскага павета. Некалькі месяцаў вёў партызанскую барацьбу супраць царскіх карнікаў на Віленшчыне. Пасля задушэння паўстання эмігрыраваў. Год смерці Віславуха невядомы.

Літ.: Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864 гг. М.: 1965 (Восстание 1863 года. Материалы и документы).

Г. В. Кісялёў

ГАШКЕВІЧ Іосіф Антонавіч нарадзіўся ў 1814 г. у Мінскай губерні. Як лічыцца, ягоная радзіма — вёска Перасвятое Рэчыцкага павета.

Бацька Іосіфа Антонавіча — святар. Сын таксама скончыў Мінскую духоўную семінарыю і ў 1835 г. быў накіраваны ў Пецярбургскую духоўную акадэмію. Выказаў там думку аб перакладзе Ветхага запавету на рускую мову. Гэта выклікала непаразуменне кіраўніцтва акадэміі і, напэўна, стала прычынай таго, што І. Гашкевіч быў накіраваны ў Пекінскую духоўную місію. Там правёў 10 гадоў. Вывучыў кітайскую мову. Праводзіў метэаралагічныя назіранні, даныя дасылаў у Пецярбург. У Кітаі І. Гашкевіч напісаў некалькі цікавых артыкулаў на самыя розныя тэмы: аб развядзенні бульбы і рысу, прыгатаванні парфумы і г. д.

У 1852 г. наш зямляк атрымаў накіраванне на пасаду перакладчыка і сакратара да віцэ-адмірала Пуцяціна. У гэты час эскадра пад камандаваннем адмірала здзяйсняла плаванне ў Японію.

У 1855 г. быў заключаны руска-японскі трактат, згодна якому рускія караблі займелі магчымасць заходзіць у японскія гавані. Заслуга ў тым і І. Гашкевіча.

Наш зямляк пачаў вывучаць і японскую мову. Дапамагаў яму ў тым манах Тацібана-на Ідзу. Ён, Ідзу, даў згоду выправіцца з І. Гашкевічам за мяжу. Аднак судна, на якім знаходзіліся Гашкевіч і Ідзу, патрапіла ў палон да англічан. Давялося 9 месяцаў знаходзіцца ў няволі. І. Гашкевіч і Ідзу дарэмна час не гублялі. У турме яны склалі першы японска-рускі слоўнік. Ён убачыў свет у 1857 г. і быў адзначаны прэстыжнай Дзямідаўскай прэміяй.

У тым жа 1857 г. Іосіф Антонавіч атрымаў накіраванне на дыпламатычную працу — стаў рускім консулам у Японіі на востраве Хакайда.

Мясцовыя жыхары надта непрыязна ставіліся да еўрапейцаў. Напэўна, не выпадкова пажар адбыўся і ў памяшканні рускага



І. А. Гашкевіч

консульства. Частка калекцый, якія рупна збіраў І. Гашкевіч, загінула.

У 1867 г. Іосіф Антонавіч вярнуўся дамоў. Жыў у маёнтку ў Віленскай губерні. Цяжка хварэў, але працягваў займацца навуковай працай. Да смерці паспеў напісаць цікавае даследаванне пад назвай «Аб каранях японскай мовы».

Наш славуты зямляк І. А. Гашкевіч памёр у 1875 г. Ягонае жыццё з'яўляецца яскравым пацвярджэннем даўно вядомай ісціны: самаадданая праца і настойлівасць не прападаюць дарэмна, яны прыводзяць да вялікіх здзяйсненняў і адкрыццяў.

П. Рабянок

ГЕДЭМАН Ота нарадзіўся 29.4.1887 г. у Рэчыцкім павеце Мінскай губерні. Буржуазны гісторык і краязнавец Беларусі. З сям'і меліяратара. Скончыў гімназію ў Гомелі. З гісторыка-філалагічнага факультэта Кіеўскага універсітэта выключаны за ўдзел у рэвалюцыйным руху. З 1922 г. настаўнік у Браславе. З 1928 г. у Вільні, займаўся навукова-даследчай дзейнасцю.

Вывучаў магдэбургскае права, развіццё гандлю і рамёстваў, сацыяльную структуру і маёмасныя адносіны насельніцтва ў беларускіх гарадах Сярэдняга Падзвіння (Дзісна, Друя, Глыбокае), аграрныя адносіны ў Браслаўскім павеце, лясныя промыслы і водныя шляхі на Беларусі XVII — XIX стст., даследаваў гісторыю Белавежскай пушчы. Працы Гедэмана багатыя на фактычны матэрыял.

Гедэман Ота памёр 16.5.1937 г.

П. Р. Казлоўскі

ГРАМЫКА Міхаіл Аляксандравіч нарадзіўся 12.11.1885 г. у вёсцы Чорнае Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і разначынца.

У час вучобы ў Магілёўскай гімназіі ўдзельнічаў у рабоце нелегальнага гуртка, які знаходзіўся пад уплывам Магілёўскай арганізацыі РСДРП. У 1905 г. паступіў у Маскоўскі універсітэт на медыцынскі факультэт, затым перавёўся на фізіка-матэматычны па спецыяльнасці геалогія. У 1905 г. удзельнічаў у маскоўскім снежаньскім паўстанні. У 1906—1907 гг. уваходзіў у сялянскую арганізацыю пры Магілёўскім акруговым камітэце РСДРП. Пасля заканчэння універсітэта (1911) настаўнічаў у Адэсе ў прыватным камерцыйным вучылішчы, у жаночых гімназіях, у 1920 г. быў загадчыкам школы-інтэрната для беларусаў-бежанцаў. У 1921—1930 гг. працаваў у Інбелкульце, выкладаў геалогію ў Белпедтэхнікуме, быў дацэнтам кафедры геалогіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Адным з першых браў удзел у пошуках нафты на Палессі. У 1930 г. рэпрэсіраваны і сасланы ў Іванава-Вазнясенск. Пасля заканчэння тэрміну ссылкі (1936) пераехаў з сям'ёй у Запалярны Кіраўск, дзе працаваў у горным тэхнікуме. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны апынуўся ў г. Чусовым Пермскай вобласці. Праз год пераехаў ва Удмурцію. Займаў розныя пасады, у тым ліку дацэнта Удмурцкага педінстытута (Іжэўск). У 1948—1952 гг. зноў працаваў у Запалярным горным тэхнікуме. Апошнія гады жыў у г. Хімкі пад Масквой. Рэабілітаваны 15.11.1957 г. Член СП СССР з 1965 г.

Памёр 30.6.1969 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1907 г. (пісаў спачатку на рускай мове). У 1922 г. апублікаваў у часопісе «Полымя» паэму «Гвалт над формай», у 1927 г. выйшлі кнігі паэзіі «Плынь» (вершы і паэмы) і «Дзве паэмы». Аўтар п'ес «Змітрок з Высокай Буды» (1918), «Скарынін сын з Полацка» (пастаўлена ў 1926), «Каля тэрасы» (1929, пастаўлена ў 1927, у новай рэдакцыі выйшла ў 1975), «Віно бушуе» (1929), «Над Нёманам» (пастаўлена ў 1927), «Воўк» (1930). У 1967 г. выдадзена «Выбранае», у 1987 г. — «Родная пушча» (п'есы, вершы, паэмы, успаміны, лісты).

Выступаў як крытык з артыкуламі пра творчасць М. Багдановіча, пра пастаноўку «Цара Максімільяна» і інш.

Апублікаваў на беларускай мове падручнікі «Пачатковая геаграфія» (1923, 4 выданні), «Уводзіны ў навуку аб неарганічнай прыродзе» (ч. 1 — Крышталаграфія, ч. 2 — Мінералогія, 1926).

Перакладаў творы Л. Талстога, У. Сасюры.

З даведніка «Беларускія пісьменнікі». 1994

Аўтабіяграфія

Я ўзяўся пісаць «Старонкі сямейнай хронікі», дзе хачу досыць падрабязна расказаць пра сваё жыццё. З гэтай прычыны тут я намячаю толькі галоўныя вехі.

Мой дзед паходзіў з ваколіцы Грамыкі на р. Бесядзь (прыток Сожа). Малазямелле і дрэнная глеба прымушалі частку сыноў амаль кожнай сям'і пакідаць бацькаву гаспадарку і падавацца ў гарады: Гомель, Магілёў, Кіеў. Тут з іх выходзілі дробныя чыноўнікі, прыказчыкі, чыгуначнікі. Вось жа мой дзед Гаўрыла Данілавіч і яго сыны зрабіліся разначынцамі. Родны дзедаў брат Іван Данілавіч і лінія яго сям'і заставаліся ратаямі — хлебаробамі. Дзед служыў у Гомелі. Ажаніўся з каталічкай. Памёр 26-і гадоў. Бабка выйшла замуж у другі раз за беларуса — каталіка Невяровіча, і сям'я пераехала ў Вільню. У час упартай русіфікацыі абодвух праваслаўных хлопчыкаў з ахвотай прынялі ў духоўнае вучылішча, каб вырваць з-пад уплыву «польскай» сям'і. Уладзіміру было 12 гадоў, Аляксандру — 10, калі адбывалася паўстанне 1863 года. Бацькаў айчым прымаў у ім актыўны ўдзел. Ужо ў школьным узросце я чуў ад бабкі і бацькі апавяданні пра трагедыю паўстання. Асвятляліся людзі і падзеі з розных пунктаў гледжання. Бабка — з поўным спачуваннем; бацька — як праваслаўны рускі «патрыёт». Я цалкам

прымаў бабчына асвятленне: шкадаваў «палякаў» і абураўся на казакаў. Хутка пасля паўстання Невяровіч памёр, і бабка вярнулася з дзецьмі ў Гомель. Дзядзька Уладзімір пачаў служыць чыноўнікам, але хутка пераключыўся на прыватную адвакатуру. Браўся за рызыкоўныя справы адсуджваць зямельныя валоданні на карысць нашчадкаў, якія страцілі свае правы. Меў поспех, бо выявіліся ў яго значныя юрыдычныя здольнасці, хоць меў ён асвету ўсяго тры — чатыры класы віленскага духоўнага вучылішча. Бацька пайшоў валанцёрам у полк. Прымаў удзел у турэцкай кампаніі 1877—1878 гг. Быў пад Плеўнай. Вярнуўся з паходаў у званні фельдфебеля, вельмі ганарыўся балгарскімі, румынскімі і сербскімі медалямі. Пасля вайны браўся за розныя службы, жыў і ў радні ў Грамыках, выконваючы сялянскія работы, памагаў большаму брату ў ягоных адвакацкіх справах.

Маці маёй ледзь споўнілася шаснаццаць год, калі выйшла замуж. Яна карэнная гомельчанка з сям'і гарадскога служака Іллі Гаўрылавіча Акушкі. Гэны мой дзед быў католікам з уніятаў. Бабка з матчынага боку, Наталля, родам з Клімавіч, была праваслаўнай. Гэта так было тыпова для значнай часткі беларусаў — гараджан. У год, як мне нарадзіцца, дзядзька Уладзімір набыў зямлю каля сяла Чорнае ў былым Рэчыцкім павеце. Надумаў будаваць хутар. Гаспадарыць пасадзіў малодшага брата. Пакуль будаваўся дом, бацька і маці жылі ў сяле. Тут я і нарадзіўся 12 лістапада (31 кастрычніка па ст.ст.) 1885 года і запісаны ў прыходскай царкве. Імя далі ў гонар матчынага дзеда, майго прадзеда Міхайлы Клімовіча. Мне было каля трох гадоў, брату чатыры — пяць месяцаў, калі памерла маці. Пахавана яна на вясковых могілках таго ж Чорнага. Хутка дзядзька прадаў хутар. Бацька з дзецьмі перабраўся ў Гомель. Праз пяць гадоў ажаніўся ў другі раз. Заступніца матулі, мачыха, аказалася, супраць народных казак, сардэчнай жанчынай. Праз усё жыццё з намі яна не рабіла розніцы паміж пасынкамі і роднымі дочкамі. Бацька атрымаў пасаду даверанага і ўправіцеля маёнтка ўдавы магілёўскага настаўніка семінарыі. Толькі па «сегрэгацыйных», як у наш час назвалі б іх, законах царскай дзяржавы звычайны настаўнік і яго ўдава праз «юрыдычнае» ашуканне купца-яўрэя змаглі атрымаць лясныя абшары больш як на дзесяць вёрст. Фальварак каля вёскі Іванішчавічы ў Быхаўскім павеце быў у поўным заняпадзе. Бацька з усёй шчырасцю і ўмельствам узяўся наладжваць гаспадарку. З сямі да трынаццаці гадоў я пражыў багатым на ўражанні жыццём. У гэты час сям'я наша не адчувала матэрыяльнай нястачы. Блізкае знаёмства з нашай прыродай, сялянамі, мовай, рознабаковымі праявамі гаспадаркі, непасрэднае назіранне за дзейнасцю бацькі заклалі ў маю душу пэўныя асновы светапогляду. Толькі значна пазней я даведаўся, што далёка не кожны аканом ходзіць з касой першым у касавіцу; падае снапы ў барабан малатарні; вучыць, як крыць гонтамі страху, як рабіць прышчэпы...

Дастатак дазволіў паслаць сыноў у гімназію. Калі я перайшоў у трэці клас, бацька, расквітаўшыся з памешчыцай, пераехаў у Магілёў. Тут набыў невялікі, але ладны дамок, прыбудаваў кухню і пакоі для дзяцей. Пры доме быў кветнік і фруктовы сад 12—15 сотак. Тут я правёў гімназічныя гады, праводзіў большую частку студэнцкіх вакацый. Першыя два — тры гады гарадскога жыцця сям'я яшчэ мела дастатак. Бацька спрабаваў займацца адвакатурай. Але яму не так шанцавала, як дзядзьку Уладзіміру. Ужо з шостага класа я пачаў займацца рэпетытарствам. У пятым класе ўвайшоў у нелегальны вучнёўскі гурток, які пазней узяла пад свой кірунак Магілёўская арганізацыя РСДРП (бальшавікоў). З гэтага часу пачаліся разыходжанні з бацькам па палітычных поглядах і перакананнях. Пазней гэтыя разыходжанні прымалі часам амаль драматычныя формы.

У 1905 годзе я паступіў у Маскоўскі універсітэт на медыцынскі факультэт. Недахоп сродкаў у бацькі (было ўжо трое сясцёр) і малыя заработкі рэпетытарствам прымусілі перайсці на прыродазнаўчае аддзяленне фізіка-матэматычнага факультэта, дзе можна было прыязджаць здаваць экзамены.

Рэвалюцыйны, бурны канец 1905 года я правёў у Маскве. Усерасійская стачка. Маніфест 17 кастрычніка. Вялікая на той час маніфестацыя пахавання Баўмана. Снежаньскія барыкады...

Пасля разгрому рэвалюцыйных дружын на Прэсні я выехаў з Масквы.

У 1906—1907 гг. я ўваходзіў у аграрную групу Магілёўскай арганізацыі РСДРП (бальшавікоў). Агітавалі па вёсках, па мястэчках.

Пасля аднаго такога выезду я захварэў

на запаленне лёгкіх. Доктар раіў пажыць на поўдні. Бацькі паслалі мяне ў Растоў і Грозны, дзе асталявалася матчына радня. Гэтыя абставіны, ранняя першая жаніцьба, патрэба хутчэй закончыць асвету — адхілілі ад выканання рэвалюцыйных даручэнняў.

У 1911 годзе я атрымаў дыплом.

У Віленскай акрузе мне ў пасадзе настаўніка сярэдняй школы адмовілі. На пазычаныя пад працэнты грошы я паехаў у Адэсу, дзе жыла сям'я знаёмых па Маскве курсістак. У гэтым горадзе пражыў 10 гадоў, выязджаючы на лета ў Беларусь.

Пасля лютаўскай рэвалюцыі беларусы-бежанцы арганізаваліся ў Адэсе ў таварыства «Гай». Далучыўся і я да культурна-асветнай працы сярод землякоў. Улетку 1921 г. з групай настаўнікаў пераехаў у Мінск.

Настаўніцкая група наша — «адэсіты», як пачалі нас звать, — адразу рассыпалася па кватэрах. Мне дастаўся пакойчык на другім паверсе досыць вялікага дома, які нядаўна гарэў.

Жыццё ва ўсіх галінах толькі-толькі наладжвалася. З'язджаліся па закліку ўрада з усіх бакоў: з Петраграда, Масквы, Урала. Не было памяшканняў для школ і ўстаноў. Будавалі спачатку невялікія і невысокія камяніцы, рамантавалі і пашыралі старыя асабнякі. Напрыклад, у архірэйскім асабняку размясціўся Народны камісарыят асветы.

Было мне 36 гадоў. Але і ў маладзейшыя гады я не адчуваў такога ўздыму жыццёвых сіл, працаздольнасці і творчага захаплення, як тады... Прычыны? Першая — апынуўся я ў родным асяроддзі. Праўда, ужо з 1917 года я пачаў працаваць у арганізацыі беларусаў-бежанцаў «Гай», а пазней — у бежанскіх школах дзіцячага гарадка імя III Камуністычнага Інтэрнацыянала. З тых часоў я ўжо не аддзяляўся ад нашага народнага жыцця. Другая прычына — жывое акружэнне. Якое то было акружэнне! Я ўглядаўся ў постаці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Максіма Гарэцкага і многіх хоць і меней выдатных, але патрэбных для паўнаты і магутнасці «хору» і «аркестра». Дадаць трэба таксама палітычных дзеячаў-камуністаў, праз якіх толькі і магла рэалізавацца вялізная культурная праца.

З той жа восені 1921 года я пачаў выяўляць сябе ў двух кірунках: навукова-педагагічным і літаратурным. Часам даручаліся мне і адміністрацыйныя абавязкі, напрыклад, школьная інспекцыя, праца ў дырэкцыі тэатра.

Адразу я пачаў выкладаць геалогію і мінералогію ў Белпедтэхнікуме. З дня яго заснавання працаваў у Інстытуце беларускай культуры. Мікола Азбукін і я — галоўныя аўтары навуковай тэрміналогіі ў галіне геаграфіі, геалогіі, грунтоў і хіміі.

Пасяджэнні ў Інбелкульце, на якіх нязменна прысутнічалі Янка Купала, Якуб Колас і выдатнейшыя знаўцы нашай мовы, з месяца ў месяц узбагачалі мае веды моўных законаў. Я пачаў адчуваць грунт, калі пераходзіў да паэтычнай творчасці.

Я рос пад даглядам праслаўленых сыноў нашага народа, якія прыхільна, спрыяльна адносіліся да мяне.

На другі ці трэці год перайшоў ва універсітэт на кафедру геалогіі, кіраўніком якой быў вядомы прафесар, пазней акадэмік Мікола Фёдаравіч Бліадухо. Па яго планах я рабіў маршрутныя выхады і выезды. Прайшоў, між іншым, па беразе прыгажуні Проні ад вытокаў яе каля г. Горак да злучэння з Сожам пад Слаўгарадам (былое мястэчка Прапойск). Пісалася пра мае адносіны да вынаходак нафты ў Рэчацкім раёне. Справа ў тым, што М. Азбукіну і мне даручана было абследаваць пачатковым маршрутам гэты раён. Верагодна, што ўжо ўлетку 1930 года мы ўгледзелі б некаторыя адзнакі нафты. Памаглі б і распытванні насельнікаў. Магчыма, што ўжо тады па нашых запісах пастаўлена была б буравая разведка. Але наш маршрут быў нечакана спынены.

Культурна-нацыянальнае будаўніцтва ішло між тым поўным тэмпам. Мне прыйшлося ўзяцца за свае дысцыпліны, у выніку чаго надрукаваны былі два падручнікі: «Уводзіны ў крышталаграфію» і «Уводзіны ў мінералогію». Выдадзены яны былі добра, з фотаздымкамі.

Трэба дадаць і трэці момант, спрыяльны для творчасці. Перажываў я ў той час рамантыку кахання. Пры гэтым «лірыка» яго пераходзіла момантамі ў «драму». З Лідай Рытар, якая стала маёй жонкай, мы працавалі разам у Адэсе ў школе-камуне. Прыехалі таксама разам. Яна ставіла па школах-інтэрнатах змястоўныя і вясёлыя вечары самадзейнасці, на якіх часта бывалі Купала, Колас, Бядуля, Чарвякоў і інш. Ці дзіва, што хутка пайшлі ў мяне цэлыя раздзелы вершаў, паэмы («Крылан»), драмы («Над Нёманам»). Так, увесь раздзел старога выдання «Плыні» пад назвай «Рытмы ка-

хання» адбівае асабістыя перажыванні. Або невялічкая паэма «Пад бубянцы» (закончана была 8/VI 1922 г.). Пісалася яна ў драматычныя моманты.

У кастрычніку 1923 года нарадзілася наша «пярвушка» Расціслава. «Аа-аа, Росценька! Ляжы, лялька, просценька!» — піша 37-гадовы бацька, для якога яна першая жывая радасць. Так з'явілася паэма «Над калыскай» («Дзіця» — у старым выданні).

У маленькім пакойчыку флігелька, што стаяў на двары дома цешчы артыста Грыгоніса, пісалася больш вялікая паэма — «Крылан». Хатка была падзелена на «каюткі». Усю каютку займаў ложак.

Ці не ў той флігелёк зайшоў да нас Якуб Колас? Ці не там паспрачаліся мы аб памерах нашых паэм — «Сымона — музыкі» і «Крылана»? Літаратурны «хлапчук» гарэзліва пераконваў сталага майстра скарачаць ягоную славутую паэму. Прымітыўнарамантычны «Крылан» і стала-рамантычны «Сымон — музыка»! Толькі нябачнае падтрыманне малой істоты, якая лямантавала на шырокім ложку, магло падбіць мяне на такую гарэзнасць.

У 1926 годзе быў напісаны невялічкі верш «Марынка», які звярнуў на сябе прыхільную ўвагу крытыкі (Дарэчы, гэты верш разам з большым крыху вершам «Ванда Карсак» толькі і ўвайшоў з усіх маіх рэчаў у «Анталогію беларускай паэзіі»). Можна падумаць, што верш гэты прысвячаўся другой нашай дачушцы. Але Марына, цяпер доктар гістарычных навук, нарадзілася толькі ў 1927 годзе.

Неяк у маі 1925 года пазванілі мне: «Дзядзька Грамыка! Заўтра 20-годдзе літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы. Выручайце. Трэба даць у газету прывітанне». Што тут зробіш. Праз дзве гадзіны быў напісаны і перапісаны верш «Янку Купалу».

Яшчэ ў Адэсе ўлетку 1917 года я пачаў спрабаваць сябе як беларускі пісьменнік. Першай такой спробай, калі не лічыць некалькіх вельмі прымітыўных вершаў, была п'еса «Змітрок з Высокай Буды». Друкавалася яна ў газеце «Вольная Беларусь» у 1918 годзе. П'еса з драматычным уздымам, але, наогул, досыць слабенькая па структуры і моўным афармленні. Е. Міровіч пачаў быў рыхтаваць яе да пастаноўкі, але хутка ад яе адмовіліся, і добра зрабілі.

З таго часу Я. Купала, М. Красінскі і іншыя настойліва раілі, каб я не кідаў спрабаваць сябе ў драмах. У выніку такіх шчырых сяброўскіх парад з'явілася яшчэ пяць п'ес. Вялікі і разам з тым вельмі сціплы і патрабавальны да сябе Я. Купала казаў, нібыта мне больш «удаюцца» жаночыя тыпы, чымсьці яму.

У 1929 годзе надрукавана была асобнай кніжкай драма «Каля тэрасы». З поспехам прайшла яна сезон на сцэне 2-га Беларускага дзяржаўнага тэатра. Галоўную ролю — матроса Барыкі — з уздымам праводзіў незабыўны К. Саннікаў. П'еса ў першым друкаваным варыянце мае значныя недахопы і «сырая», але яе дынаміка адпавядае рэвалюцыйнаму ўздыму Кастрычніка. Цяпер я значна перарабіў гэту п'есу, і яна зацікавіла некаторыя калектывы народных тэатраў.

У «Полымі» № 7 за 1929 г. была надрукавана мая камедыя з жыцця студэнтаў «Віно бушуе».

Драма «Над Нёманам» перароблена мной з паэмы «Леснічанка». Матэрыял для паэмы і драмы падказала мне жонка, якая ведала добра на Нёмане месцы, дзе адбываліся паказаныя падзеі. Ставіў п'есу Е. Міровіч, і яна карысталася поспехам. На анкетнае запытанне сярод камсамольцаў, якая п'еса найбольш спадабалася ў мінулым сезоне, большасць адказала: «Над Нёманам». У драме выступала амаль уся трупа 1-га Беларускага дзяржаўнага тэатра (цяпер тэатр імя Я. Купалы), бо ў ёй 21 дзеючая асоба, апрача эпізадычных. На памяць прыходзяць некаторыя ролі. Правадыра паўстанцаў іграў У. Крыловіч; польскага афіцэра Вацлава Ржэвуцкага, які перайшоў на бок паўстанцаў, — Б. Платонаў; ксяндза — Ф. Ждановіч; дачку асадніка Тэклю — мая сястра Кацярына Грамыка. У сучасны момант адзін машынапісны экземпляр п'есы захоўваецца ў мяне, другі — у бібліятэцы тэатра.

З усіх маіх п'ес найбольш творчых сіл і часу патрабавала гістарычная драма «Скарынін сын з Полацка». Па стылю яна таксама найбольш апрацаваная. Яна вытрымана была ў памеры пушкінскага «Барыса Гадунова». Памятаю толькі пачатак: «На вежы выбіла чатыры, а доктара ўсё няма з друкарні... І ўчора так, і сёння — кожны дзень!» — скардзіцца служанцы адданая Францішку ягоная жонка. П'еса была пастаўлена ў 1-ым Беларускім дзяржаўным тэатры ў юбілей 400-годдзя скарынінскіх выданняў у віленскай друкарні. На афіцыяльным тэатральным экземпляры п'есы стаяў штамп: «Дазваляецца да пастаноўкі на адзін раз». Гэта дало зачэпку добраму сябру

майму Міколу Азбукіну пусціць жарцік: «Тваю п'есу будуць ставіць кожныя 400 гадоў!» Аўтарскае права на «Скарыну» я перадаў Беларускай Акадэміі навук. Адзіны ўласны экземпляр выпрасіў у мяне навуковы супрацоўнік акадэміі Мік. Шчакаціхін. Усе іншыя загінулі разам з рознымі архівамі ў час Айчыннай вайны.

Да тэатральнага жыцця я меў дачыненне не толькі як драматург. Уваходзіў я ў склад дырэкцыі 1-га Беларускага дзяржаўнага тэатра. Цёмная зала ў часе генеральных рэпетыцый бачыла мяне, мусіць, не радзей, чым геалагічны кабінет універсітэта.

Было так. Узімку — падрыхтоўка і заняткі са студэнтамі. У вольныя хвіліны — крыху вершаў. Часам накідваўся план п'есы. Здаралася, што напісаны былі першыя дзеі, але напісанае адкідалася і пачыналася занаў. Канчатковая апрацоўка адкладвалася на летні адпачынак. На ўлонні прыроды, дзе-небудзь у Калодзішчах або ў Астрашыцкім Гарадку, канчалася пад восень тая ці іншая п'еса.

Апошняя мая п'еса — «Воўк» — рыхтавалася Е. Міровічам да пастаноўкі ў сезон 1930/31 г. Па горадзе былі расклеены афішы. Пра гэта інфармавала мяне жонка. Сам я не меў ужо магчымасці бачыць тыя афішы, а п'еса не ўзышла на сцэну.

З 1931 г. я жыў у Івана-Вазнясенску. У 1936 г. пераехаў з сям'ёй у запалярны Кіраўск, дзе раней асталявалася большая з сясцёр. Тут матэрыяльна нам жылося добра. Я працаваў у горным тэхнікуме, жонка — завучам у школе. Тут у нас нарадзіўся сын. Пасля паветранай бамбардзіроўкі Кіраўска 28 чэрвеня 1941 года пачалася эвакуацыя. Я апынуўся ў Пермскай вобласці (Чусавы Гарадок). Праз год пераехаў да сям'і ў Удмурцію. Меў розныя пасады. Нарэшце асталяваўся выкладчыкам Удмурцкага педагагічнага інстытута. Большая дачка выйшла замуж у 1945 годзе за інжынера і пераехала з Іжэўска ў Казань, а пазней пад Маскву. За ёй падалася малодшая і жонка з сынам. Я заставаўся ў Іжэўску да 1948 года. З восені 1948 па 1952 год зноў працаваў у Запалярным горным тэхнікуме. З 1952 года выйшаў на пенсію.

Спрабаваць сябе ў літаратуры пачаў яшчэ студэнтам. Пісаў вершы, невялікія навелы. У 1913—1914 гг. задумаў вершаваны раман, які так і не скончыў.

Поўны разварот некаторых літаратурных здольнасцей праявіўся толькі тады, як перайшоў у творчай працы на мову сваіх дзядоў.

1965 — 1967 гг.

Вучоны вялікага таленту

Беларускі гісторык, этнограф і фальклярыст **Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі** нарадзіўся ў Рэчыцы 14 чэрвеня 1867 г.

Вучыўся ў Мінскай гімназіі, Мазырскай прагімназіі, з Кіеўскай гімназіі быў выключаны за ўдзел у тайных гуртках і распаўсюджванне нелегальнай літаратуры. У 1894 г. скончыў Кіеўскі універсітэт. У сувязі з забаронай педагагічнай дзейнасці ў Кіеўскай навучальнай акрузе з 1898 г. працаваў у Маскве ў архіве Міністэрства юстыцыі, прыват-дацэнтам Маскоўскага універсітэта. Пасля абароны магістэрскай дысертацыі «Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах» (1901) працаваў у Кіеўскім універсітэце, дзе абараніў доктарскую дысертацыю «Нарысы па арганізацыі заходня-рускага сялянства ў XVI ст.». З 1906 г. в. а. дырэктара створаных ім камерцыйных курсаў (пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Інстытут народнай гаспадаркі), кіраваў таварыствамі аматараў сацыяльных ведаў, Нестара-летапісца і інш. З 1920 г. выкладчык Харкаўскага інстытута народнай гаспадаркі, з 1922-га — прафесар Азербайджанскага універсітэта, дырэктар сельскагаспадарчага і гандлёвага музея Азербайджана і начальнік кіраўніцтва прамысловасці і гандлю Наркамата прамысловага гандлю Азербайджанскай ССР. З 1925 г. правадзейны член, кіраўнік гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта і прафесар БДУ. З 1926 г. у Маскве, прафесар сельскагаспадарчай акадэміі імя Цімірязева, выкладчык Інстытута народнай гаспадаркі імя Пляханава.

М. В. Доўнар-Запольскі апублікаваў больш за 150 навуковых прац па сацыяльна-эканамічным становішчы Беларусі і Літвы, дзекабрысцкім руху, палітычным становішчы Расіі і гісторыі народнай гаспадаркі, а таксама па беларускай этнаграфіі, фальклору і літаратуры. Эклектычныя, паводле метадалогіі, яго працы багатыя фактычным матэрыялам. Асноўныя працы па этнаграфіі і фальклору Беларусі напісаны ў 1880—1890-ыя гг. з дэмакратычных пазіцый. Этнаграфічным даследаванням адво-

М. В. Доўнар-Запольскі

дзіў асноўнае месца пры вывучэнні гістарычных працэсаў, падкрэсліваў, што «ў вывучэнні быту народаў і заключаецца галоўны інтарэс гісторыі». (Даследаванні і артыкулы. Кіеў, 1909. Т. 1. С. 345, на рус. мове.) Матэрыялы для вывучэння побыту і культуры беларусаў збіраў у час сваіх вандраванняў па Беларусі, экспедыцыі 1890—1891 гг. па даручэнню Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі і з дапамогай карэспандэнтаў, для якіх распрацаваў праграмы (настаўнікам Мінскай губ., у 1893 г. праграму-заклік «Значэнне этнаграфічнага Гродзенскай губерні»). У карэспандэнцыі «Ад Кіева да Рагачова» (Минский листок. 1887. № 64) Доўнар-Запольскі ад імя беларускага селяніна патрабаваў друкаваць літаратурныя творы на беларускай мове, у артыкуле «Навіны беларускай навукі» (Виленский вестник. 1889. № 81) заклікаў стварыць на Беларусі навуковыя таварыствы, адкрыць універсітэт, вывучаць усе бакі культуры і побыту беларускага народа, а ў серыі артыкулаў «Нататкі з вандраванняў па Беларусі» (Виленский вестник. 1890—1891) побач з апісаннем жыцця беларускай вёскі намаляваў жахі капіталістычнай эксплуатацыі сялян-адыходнікаў, выступаў супраць фальсіфікатараў культуры беларусаў. У працах па этнаграфіі Доўнар-Запольскі апісваў сямейны побыт, звычаёвае права, вясельныя звычаі і абрады беларусаў («Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках», 1893; «Матывы вясельных песень пінчукоў», 1893; «Рытуальнае значэнне каравайнага абраду ў беларусаў», 1900; і інш.). Важнейшыя працы пра побыт і культуру беларусаў сабраны ў зборніку «Даследаванні і артыкулы» (Т. 1. 1909). Збіраў фальклор, частку запісаў, апублікаваў у зборніку «Песні пінчукоў» (1895). У 1897 г. выдаў «Дакументы Маскоўскага архіва Міністэрства юстыцыі». Высока цаніў творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча, І. Неслухоўскага, Я. Купалы, навуковую дзейнасць А. Пыпіна, Я. Карскага і іншых дзеячаў беларускай культуры. Значная частка сабраных ім фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў не апублікавана. У архіве Геаграфічнага таварыства (Ленінград) зберагаюцца зборнік беларускіх казак (82), запісаных Доўнар-Запольскім і яго карэспандэнтам П. П. Дземідовічам, матэрыялы пра вераванні беларусаў з уступным артыкулам «Нататкі па беларускай этнаграфіі». Частка матэрыялаў, якія напісаў Доўнар-Запольскі, захоўваецца ў ЦДГА Украіны.

Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі, які пакінуў пасля сябе багатую гістарычную спадчыну, памёр у 1934 г.

Літ.: *Дайгяла З.* Літаратурныя працы доктара рускай гісторыі Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага ў храналагічным парадку за 45 год (1883—1928). Запіскі аддзела гуманітарных навук. Кн. 8. Працы класа гісторыі. Т. 3. Мн.: 1929; *Бандарчык В. К.* Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. Мн., 1964.

В. К. Бандарчык

ПАЛУЯН Сяргей Епіфанавіч нарадзіўся 7(19).10.1890 г. у мястэчку Брагін Рэчыцкага павета Мінскай губерні (Згодна іншых даных — у Рэчыцы). (Чытай артыкул «Але ўспомніць яшчэ зорку свет...») Літаратурныя псеўданімы: С. Ясяновіч, П. Ян, С. П. Беларускі публіцыст, празаік і літаратуразнавец, адзін з пачынальнікаў беларускай прафесійнай літаратурнай крытыкі. Вучыўся ў Мітаўскай гімназіі (цяпер г. Елгава, Латвія). Удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Кіеве і Мітаве. Супрацоўнічаў у газеце «Наша ніва», украінскім перыядычным друку. Аўтар апавяданняў («Вёска»), вершаваных і драматычных тво-

раў (не выяўлены), вершаў у прозе, літаратурна-крытычных артыкулаў і рэцэнзій. Падтрымліваў творчыя пошукі Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Ц. Гартнага і інш. (рэцэнзіі «Якуб Колас. Другое чытанне для дзяцей беларусаў», «Тарас на Парнасе», «Ядвігін Ш. Дзед Завала» і інш.). Напісаў першы ў беларускай крытыцы аглядны артыкул («Беларуская літаратура ў 1909 годзе»), першы гістарычны нарыс новай беларускай літаратуры («Беларуская паэзія ў яе тыповых прадстаўніках»), тым самым прадвызначыў з'яўленне аналагічных прац М. Багдановіча. Выступаў як тэатральны крытык («Віленская беларуская вечарынка», «Беларускія вячоркі» і інш.). Даследаваў таксама ўкраінскую культуру і літаратуру, беларуска-ўкраінскія літаратурныя сувязі («Выдавецтва «Час», «Народны каляндар «Село» на 1910 год», цыкл артыкулаў «Лісты з Украіны» і інш.). Адстойваў правы беларусаў на развіццё сваёй мовы і культуры («Пра нацыянальную школу на Беларусі», цыкл артыкулаў «З нашага жыцця»), падтрымліваў духоўнае адраджэнне іншых нацый («Нацыянальнае адраджэнне чувашоў», «Якуцкі нацыянальны рух»). Для яго творчай манеры характэрна валоданне жывым і вобразным народным словам, доказнасць і аргументаванасць выказванняў, ужыванне гістарычных аналогій, класавы падыход пры ацэнцы з'яў грамадскага і літаратурнага жыцця. У атмасферы сталыпінскай рэакцыі скончыў жыццё самагубствам. Я. Купала прысвяціў С. Е. Палуяну паэму «Курган» і верш «Памяці С. Палуяна», М. Багдановіч — зборнік «Вянок» і вершы «С. Палуяну» і «С. Е. Палуяну», Ц. Гартны — верш «С. Палуяну» і імпрэсію «Апошні ліст С. Палуяну», Ядвігін Ш. — верш у прозе «Раны» і інш.

Тв.: Лісты ў будучыню. — Мн.: 1986.

Літ.: Кобржицька Т. В. З невідомого про Сергія Полуяна. — Українське літературознавство. 1970. № 8.

В. П. Рагойша

«Але ўспомніць яшчэ зорку свет...»

На Беларускім Палессі прайшлі дзіцячыя гады аднаго з дзеячаў беларускай культуры пачатку XX ст. Сяргея Еўфанавіча Палуяна, сябра Я. Купалы (паэт прысвяціў яму сваю паэму «Курган») і М. Багдановіча. Хаця жыццё Палуяна трагічна абарвалася на 20-ым годзе, малады літаратар пакінуў немалую публіцыстычную спадчыну.

М. Багдановіч прысвяціў яму першы і адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок». На першай старонцы чытаем: «Вянок на магілу С. Палуяна». У зборнік уключаны трыялет і верш «С. Е. Палуяну»:

Але ўспомніць яшчэ зорку свет,
Бо ў сэрцах гарыць яе след.
Так свабодна, так ярка пражыць —
Лепшай долі няма на зямлі.

Аб жыцці Сяргея Палуяна вядома вельмі мала. Нарадзіўся ён у 1890 г. у Рэчыцы. Калі яму споўнілася прыкладна чатыры гады, ягоныя бацькі перайшлі з сялянскага саслоўя ў купецкае, а яшчэ праз год сям'я пасялілася ў багатым маёнтку Крышычы (цяпер Калінкавіцкі раён). Маёнтак знаходзіўся ў 95 вярстах ад Рэчыцы, сама вёска Крышычы налічвала ў той час амаль 500 жыхароў, многія з якіх працавалі на ўладальніка маёнтка, што разбагацеў на гандлі.

У 1908 г. С. Е. Палуян упершыню прыехаў у Кіеў, верагодна, па даручэнню беларускай газеты «Наша Ніва» як яе карэспандэнт. Пасяліўся ён на вул. Гогалеўскай, 37, непадалёк ад Львоўскай плошчы. Ён шмат чытаў, задумаў напісаць шэраг артыкулаў аб беларускай літаратуры, якія павінны былі больш шырока пазнаёміць украінскую грамадскасць з літаратурным жыццём беларусаў. Першае выступленне С. Палуяна ў кіеўскім друку звязана з выхадам у пачатку 1909 г. зборніка настаўніцкага гуртка Віцебскай губерні «Беларускі настаўнік», рэцэнзію на які ён надрукаваў у майскім нумары часопіса «Украінска хата».

Сяргей Палуян рупіўся за абучэнне беларускіх дзяцей на роднай мове, горача вітаў выхад падручніка Якуба Коласа «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909). У рэцэнзіі ён пісаў, што кніжка складзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі педагогікі, прыцягвае сваёй паэтычнасцю.

У 1910 г. у Вільні быў выдадзены «Першы беларускі каляндар» «Нашай Нівы». У ім былі і мастацкія творы. С. Е. Палуян ацаніў каляндар як значную падзею ў літаратурна-грамадскім жыцці Беларусі, асабліва звярнуў увагу на ноты песні на верш Янкі Купалы «А хто там ідзе?».

Сяргея Палуяна можна лічыць і адным з заснавальнікаў нацыянальнага беларускага тэатразнаўства, аб чым сведчаць ягоныя

газетныя артыкулы «Беларускія вечарынкі», надрукаваныя ў часопісе «Рада» ў 1910 г.

Некалькі разоў С. Палуян прыязджаў з Кіева ў Вільню. У апошні раз ён прыехаў туды восенню 1909 г. і сустракаўся з Я. Купалам, які падараваў яму сваю фотакартку з цёплым надпісам: «На добрую памятку С. Палуяну афярую ад шчырага сэрца. Я. Купала. Вільня, 29/XI.09 г.».

Каб пазнаёміць украінскую грамадскасць з беларускай літаратурай, Сяргей Палуян задумаў напісаць вялікую працу, якую назваў «Беларуская паэзія ў яе тыповых прадстаўніках». У сакавіцкім нумары часопіса «Украінска хата» за 1910 г. была змешчана першая яе частка — «Народная славеснасць і першыя спробы штучнай паэзіі». Аднак праца гэта засталася нясканчанай.

У Кіеве Сяргей Палуян жыў бедна, на сродкі, якія атрымліваў за артыкулы і рэцэнзіі. З бацькам, якому не па душы быў занятак сына, Сяргей не падтрымліваў зносін. Выключная беднасць і нястача ва ўмовах сталыпінскай рэакцыі сталі прычынай самагубства. 21 сакавіка 1910 г. С. Е. Палуян быў пахаваны ў Кіеве на Байковых могілках, дзе хавалі пісьменнікаў, журналістаў, мастакоў, вучоных.

На трагічную смерць свайго сябра Я. Купала адклікнуўся пранікнёнымі радкамі:

Так мала жыў, а столькі ўжо рабіў надзей
Сваім паглядам нештодзённым!
Якіх не роіў сноў аб старане сваёй,
Як верыў, як да родных рваўся ніў і сёл...

І. І. Пірожнік, В. С. Аношка, С. І. Кот. Дарогамі дружбы. Беларускае і Украінскае Палессе. Мн.: 1985.

СПАСОВІЧ Уладзімір Данілавіч нарадзіўся 16.1.1829 г. у Рэчыцы. Публіцыст, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч. Скончыў Мінскую гімназію (1845), Пецярбургскі універсітэт (1849), у ім жа з 1857 прафесар крымінальнага права. У лекцыях («Падручнік крымінальнага права», 1863) знаёміў студэнтаў з прагрэсіўнымі філасофскімі і прававымі ідэямі. У 1861 г. у знак пратэсту супраць жорсткага задушэння студэнцкага руху пакінуў універсітэт. У 1866 пачаў адвакацкую дзейнасць, выступаў на буйнейшых працэсах, у тым ліку палітычных. Супрацоўнічаў у часопісе «Вестник Европы», газеце «Słowo» («Слова»). З удзелам Спасовіча ў 1876 у Варшаве заснаваны часопіс «Ateneum» («Атэнэум»), у 1882 у Пецярбургу — часопіс «Kraj» («Край»). Аўтар «Агляду гісторыі польскай літаратуры», што ўвайшоў у «Агляд гісторыі славянскіх літаратур» (1865, разам з А. М. Пыпіным), даследаванняў пра творчасць А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, С. Выспянскага, С. Жаромскага, Дж. Байрана, руска-польскія літаратурныя сувязі. Прыхільнік культурна-гістарычнай школы. У канцы 50-ых гадоў рыхтаваў да выдання Статуты Вялікага княства Літоўскага. Спасовіч — прататып адваката Фецюковіча ў рамане Ф. Дастаеўскага «Браты Карамазавы». І. Рэпін напісаў яго партрэт (1891, Рускі музей у Санкт-Пецярбургу).

Ул. Д. Спасовіч памёр 26.10.1906.

В. Ф. Шалькевіч

В. Д. Спасовіч

Юбілей Спасовіча

Пяцьдзесят гадоў літаратурнай дзейнасці даюць звычайна падставу да юбілею пісьменніка, да ўшанавання яго асветніцкай працы. Але і кніга, якая не згубіла і праз многа гадоў сваёй значнасці, мае таксама свайго роду права на юбілей, што

заключаецца ў добрай памяці аб ёй і ўдзячных успамінах аб яе аўтары. Адна з такіх кніг з'явілася больш пяцідзесяці гадоў назад. Яна называлася «Падручнік крымінальнага права», і аўтарам яе быў Уладзімір Данілавіч Спасовіч.

Пры думцы аб кнізе міжволі ўспамінаецца і яе аўтар.

Гімназістам шостага класа карыстаўся я з таварышамі тагачасным свабодным доступам ва універсітэцкія аўдыторыі і слухаў, нярэдка з захапленнем, вобразную і мастацкую мову Кастамарава, строгае і разам прыгожае выказванне Стасюлевіча і арыгінальнае, жывое слова Спасовіча, які ўпершыню пазнаёміў нас, юнакоў, з філасофскімі паняццямі. Як цяпер бачу, затым вялікая зала Пецярбургскай гарадской думы, дзе чыталіся ў 1862 г. лекцыі першага свабоднага рускага універсітэта, дзе гучала натхнёнае слова Кавеліна і дзе на эстраду, на якой была пастаўлена кафедра, па тры разы ў тыдзень уваходзіў хуткаю хадою чалавек у акулярах, з коратка абстрыжанай галавой, энергічным тварам і жывымі, пранізлівымі вачамі, у глыбіні якіх гарэла полымя думкі і смелага імкнення к сапраўдным ведам. Складаныя паняцці аб злачынстве і пакаранні перад уважлівай і пярэстай аўдыторыяй ярка і зразумела, вельмі часта па-мастацку і заўсёды з той шырынёй, якая адна дае крымінальнаму праву падставу называцца навукай, а не зборам тэарэтычных палажэнняў, чужых жыццю і падчас цяжкіх для сумлення чалавека. Гэты прафесар быў Спасовіч.

Майму ўнутранаму погляду ўяўляецца, як быццам гэта было толькі ўчора, яркі дзень ранняй вясны, калі сонца ўжо грэла і залівала сваім светам і залу думы, і маладыя, поўныя падзей твары, і калі за вакном блішчэлі залатыя кроплі, што падалі з даху... Гэтак жа раставаў у тыя дні снег, які доўга трымаў пад сваім мёртвым покрывам нашу радзіму, і грэла толькі што ўзайшоўшае сонца незабыўных шасцідзесятых гадоў. На парозе грамадскага жыцця нас рыхтаваліся сустрэць вялікія рэформы, што абновяць увесь рускі быт, і голас нашых настаўнікаў гучаў для нас як заклік і паказ на дарогу для будучай дзейнасці, якой так радасна было прысвяціць, без разліку і карысці, усё сваё жыццё. Час высакароднай думкі, натхнёнага, гарачай падзеі на светлую будучыню і гордай веры ў сябе і ў духоўныя сілы рускага народа, — час, калі кожнаму стала б сорамна, нават таемна ад усіх, падумаць пра сябе шмат з таго, што потым давялося нярэдка пачуць не толькі ў бессаромных громкіх словах, але нават і ў друку, — час захаплення непахіснасцю прынцыпаў і агіды да паслухлівасці жыццёвых прыстасаванняў, — гэты час звязаны для мяне і большасці маіх таварышаў па Пецярбургскаму універсітэту з успамінамі аб чытаннях Кавеліна і Спасовіча!

Але апошняму не давялося доўга настаўнічаць, і вусны яго назаўсёды змоўклі на кафедры. Падручнік сваёй навізною і смелым паказам перакананняў аўтара ўсхваляваў прадстаўнікоў руцінных поглядаў на крымінальнае права і выклікаў у друку нападкі, што далёка не заўсёды стаялі на выключна навуковым грунце. Можа быць, у значнай ступені яны садзейнічалі страце Спасовічам у палове шасцідзесятых гадоў кафедры ў Казанскім універсітэце. Прадстаўнікі схаластыкі ў крымінальным праве сталі поўнымі гаспадарамі ў некаторых універсітэтах і маглі, як і раней, перажоўваць састарэлыя «запіскі» без усялякай сарамлівасці.

...Затым давялося сустрэцца са Спасовічам праз некалькі гадоў, на службе судзейным статутам, якім ён аддаў толькі лепшыя сілы. Разам з многімі, якія цяпер сышлі са сцэны, я быў сведкай яго працы і горача вітаў тыя асновы судовай этыкі, якія закладваліся ім і ў судовых спрэчках, і ў азначэннях савета прысяжных павераных. У ліку многіх і многія гады я захапляўся яго арыгінальнымі, непакорнымі словамі, якія ён убіваў, нібы цвікі, у дакладныя і адпаведныя ім паняцці, з замілаваннем назіраў за яго гарачымі жэстамі і цудоўнай архітэктурай прамоў, непахісная логіка якіх супернічала з глыбокай іх псіхалогіяй і ўказаннямі працяглага і аснаванага на вопыце жыццёвага роздуму. Як часта даводзілася ўяўляць сабе некага, хто першы раз прыйшоў паслухаць у судзе знакамітага Спасовіча, і спачатку здзіўлена пытаць сябе: «Як? Няўжо гэта Спасовіч! Не можа быць...»; гаворачы сабе затым праз некалькі хвілін: «Але ж, бадай, гэта ён...» — і, нарэшце, з захапленнем: «Так, гэта ён! Ён — і ніхто іншы!» На судовых спаборніцтвах нам давялося папрацаваць разам. Не адзін раз мелі перамогі, калі толькі дарэчы казаць аб перамозе і парадзе ў шчырым пошуку праўды ў судовай справе, вагаліся то на адзін, то другі бок, — але, і пераможаны

і пераможацам, я вяртаўся дадому заўсёды, і перш за ўсё ўдзячным вучнем Спасовіча. З кожнага нашага спаборніцтва я выносіў павучальны і радасны прыклад строга маральных адносін к прыёмам і формам судовай барацьбы і ўспамін аб шырокіх гарызонтах філасофскіх, сацыяльных і нават прыродазнаўча-навуковых ведаў, якія Уладзімір Данілавіч так па-майстэрску ўмеў адкрываць вачам слухачоў, скрозь лясную чашчобу фактычных даных справы.

Выступаючы ў якасці абаронцы, а падчас і грамадзянскага істца ў шэрагу выдатных крымінальных спраў, Спасовіч з'яўляўся не толькі своеасаблівым, глыбокім і таленавітым прадстаўніком адвакатуры, але і ўсёю сваёй дзейнасцю на гэтым полі дзейнасці падаваў дастойныя самага ўважлівага вывучэння прыёмы і спосабы, сугучныя з непасрэднымі мэтамі і, разам з тым, з грамадскімі задачамі адвакатуры.

...У прамовах яго рассыпана мноства каштоўных заўваг пра дзейнасць і арганізацыю суда прысяжных. Да ўвядзення гэтай формы суда ў Расіі ён ставіўся ў свой час з недаверам. У публічных лекцыях «аб тэорыі судова-крымінальных доказаў», прачытанных у 1860 г. у Пецярбургскім універсітэце, ён выказаў апаску, што маральна-юрыдычнае развіццё народа не падрыхтавала яго к удзелу ў свабодным, не абмежаваным абавязковымі правіламі, меркаваннямі, судзе і што адсутнасць прывычкі адрозніваць закон ад патрабаванняў начальства, а таксама ўласцівая рускаму чалавеку схільнасць бачыць у злачынцы «нясчаснага» могуць шкодна адбіцца на правільным выкананні правасуддзя. Жыццё і здаровы сэнс народа не пацвердзілі гэтай апаскі, і Спасовіч, выпрабаваўшы рускіх прысяжных засядацеляў на практыцы, прамадушна і цвёрда стаў на іх бок, але не стаў упадаць у ідэалізацыю.

...Жывая, энергічная мова Спасовіча, аднолькава моцная ў сінтэзе і ў аналізе, ніколі не ўпускае з поля зроку падсуднага, як «брата па чалавецтву», прасякнутая разумнай памяркоўнасцю да захапленняў маладога ўзросту, аднак, без ліслівай паблажлівасці, заўсёды рабіла ўражанне на прысяжных і прыцягвала да сябе асобую ўвагу суда.

...Яго папракалі ў тым, што ён заўсёды раскідваўся, ніколі не аддаючыся адной справе, — і ў думках і ў дзеяннях быў непаседай, не стварыў карпатлівай і ўседлівай працай чаго-небудзь аднаго, вялікага і цэлага. Так, бадай, гэта праўда... Але хапае ў жыцці нашым вузкіх спецыялістаў, дастаткова выключнай прыналежнасці і да ўсялякіх афіцыйных і неафіцыйных ведамстваў, якія накладваюць аднабаковы адбітак на ўсю асобу чалавека! Было нешта прыцягальнае ў гэтым Спасовічу, калі ён шукаў новых уражанняў і ўвасабляў іх у арыгінальныя думкі, дзе б яго не даводзілася сустрэць: у тэатры, на выставе карцін, на публічнай лекцыі, на дыспуце, у судзе, у рэдакцыі часопіса, на сяброўскім абедзе ці на пахаванні харошага чалавека. Нельга было не цаніць гэтую яго спагадлівасць, гэтыя рысы яго асобы, таму што кожны яго крок у разнастайных сферах духоўнага жыцця быў прасякнуты ўнутраным сэнсам і заўсёды, так ці іначай, накіраваны к абуджэнню тых агульных ідэй і ўяўленняў, у якіх вызначаюцца лепшыя бакі людскога духу і без каторых жыццё адукаванага чалавека было б цяжкім.

З кнігі А. Ф. Коні.
Собр. соч. в 8 т. М.: 1968

СТРАВІНСКІ Фёдар Ігнатавіч нарадзіўся 8(20).6.1843 г. у маёнтку Новы Двор Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Рускі спявак (бас). Скончыў гімназію ў Мазыры (1865, у час вучобы спяваў у студэнцкіх спектаклях, зборы ад якіх ішлі на карысць матэрыяльна незабяспечаных гімназістаў), Пецярбургскую кансерваторыю (1873). Саліст Кіеўскага (1873), Марыінскага (з 1876) оперных тэатраў. На сцэне апошняга выканаў больш за 60 рознахарактарных партый у операх рускіх і замежных кампазітараў. Сярод лепшых: Фарлаф («Руслан і Людміла» М. Глінкі), Варлам і Рангоні («Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага), Яромка, Алаферн («Варожая сіла», «Юдзіф» А. Сярова), Млынар («Русалка» А. Даргамыжскага), Дон Базіліо і Бартала («Севільскі цырульнік» Дж. Расіні), Спарафучыле («Рыгалета» Дж. Вердзі), Сен-Бры і Марсель («Гугеноты» Дж. Меербера), Мефістофель («Фауст» Ш. Гуно) і інш. Стравінскі валодаў яркім сцэнічным талентам, майстэрствам пераўвасаблення, найбольшую ўвагу аддаваў акцёрскаму майстэрству, сам ствараў эскізы грыму да роляў. Меў вялікі камерны рэпертуар з твораў Глінкі, Мусаргскага, А. Рубінштэйна. Выканальніцкая дзейнасць Стравінскага, які прадоўжыў традыцыі О. Пятрова і прадвызначыў творчы шлях Ф. Шаляпіна, стала значным эта-

пам у гісторыі рускага рэалістычнага оперна-га мастацтва.

Ф. І. Стравінскі памёр 21.11(4.12). 1902.

Т. Г. Слабодчыкава

ЯСТРЭБСКІ Мікалай Феліксавіч нарадзіўся 10.7.1808 у Рэчыцкім павеце Мінскай губерні ў сям'і межавага суддзі.

Сучаснае пакаленне мала што ведае (калі не сказаць — нічога) пра М. Ястрэбскага. Нават у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі яму не прысвечана ні радка. А між іншага М. Ястрэбскі належыць да тых людзей, пра якіх гавораць: «Ён быў першы!»

Першы пачаў даследаваць трываласць жалеза і сталі... Упершыню ў Расіі зрабіў даследаванні па дынаміцы машын... Выдаў першы на рускай мове дапаможнік па будаўнічаму майстэрству... Стварыў першы на рускай мове дапаможнік па супоры матэрыялаў. Напісаў першыя нарысы па гісторыі механікі...

І яшчэ — ён быў даволі таленавітым... літаратарам-стылістам. Не здзіўляйцеся, дарагі чытач, менавіта так: прырода шчодра надзяліла М. Ястрэбскага талентамі. Праўда, ён не пісаў вершы (дакладней, мы пра гэта не ведаем — архівы не захавалі яго паэтычных твораў), не знаходзім у яго спадчыне і раманаў, аповесцяў, апавяданняў... І ўсё ж М. Ястрэбскі быў таленавіты літаратар — ён напісаў першыя тры раздзелы другога тома «Мертвых душ», ды так добра, што вядомыя ў той час літаратуразнаўцы, спецыялісты па творчасці М. В. Гогаля, не знайшлі ніякіх стылістычных і моўных адрозненняў ад гогалеўскага тэксту. Але гэта не галоўная яго праца.

Імя Мікалая Феліксавіча ў 30—70-ыя гады XIX ст. было добра вядома шырокай грамадскасці Расіі: студэнтам і выкладчыкам навучальных устаноў, вучоным Пецярбургскай акадэміі навук, інжынерам шляхоў зносін, будаўнікам і архітэктарам, эканамістам і бухгалтарам, пісьменнікам і крытыкам, шмат якім чытачам газет і часопісаў. Яго жыццё і дзейнасць звязаны з Рэчыцай, Вільняй, Пецярбургам, Магілёвам.

М. Ф. Ястрэбскі

Прафесар механікі, адзін з першых гісторыкаў навукі і тэхнікі ў нашай краіне, лаўрэат Дзямідаўскай прэміі Мікалай Феліксавіч Ястрэбскі памёр у 1874 г.

Рэчыца павінна ганарыцца сваім славутым земляком.

Павел Ткачоў

Іх ведае Рэчыцкая зямля

ЖЫЛІНСКІ Іосіф Іпалітавіч нарадзіўся 8(20).4.1834 г. у Віленскай губерні. Рускі геадэзіст. Генерал. Скончыў Пецярбургскі інстытут інжынераў шляхоў зносін (1854). На геадэзічным аддзяленні Акадэміі Генеральнага штаба праслухаў тэарэтычны курс па геадэзіі і ў Пулкаўскай абсерваторыі прайшоў практыку. У 1863—1873 кіраваў градусным вымярэннем дугі паралелі 52° паўн. ш. (на Беларусі прыкладна па лініі Брэст — Пінск — Мазыр — Гомель). Пачынаючы з 1873 Заходняя экспедыцыя генерала І. І. Жылінскага прыступіла да асушальных работ на Палессі. Галоўнымі мэтамі пры гэтым былі: павелічэнне даходаў казны з дзяржаўных ляс-

ных і лугавых угоддзяў; падрыхтоўка лініі пад будучую чыгунку. Экспедыцыяй былі праведзены значныя асушальныя работы каля Васілевіч, створана доследная ферма ва ўрочышчы «Стаў» каля в. Бабічы пад кіраўніцтвам агранома Гедэмана, бацькі вядомага польскага гісторыка О. Гедэмана. У 1881—1893 І. І. Жылінскі з'яўляўся начальнікам трыянгуляцыі заходніх тэрыторый Расіі. Пасля завяршэння работ на Палессі (1898) узначальваў экспедыцыю па асушэнню забалочаных зямель Маскоўскай, Разанскай, Уладзімірскай губерняў. Удзельнічаў у астралагічна-геадэзічных работах за мяжой. І. І. Жылінскі памёр у 1916. Частка матэрыялаў ягонай экспедыцыі на Палессі захоўваецца ў Цэнтральным Дзяржаўным гістарычным архіве РБ у Мінску.

Тв.: Очерк работ Западной экспедиции по осушению болот (1873—1898). Спб.: 1899.

КЛУМАЎ Яўген Уладзіміравіч нарадзіўся 16.12.1876 у Маскве. Герой Савецкага Саюза (8.5.1965). Беларускі савецкі вучоны ў галіне хірургіі і гінекалогіі. З сям'і адваката. Рускі. Кандыдат медыцынскіх навук (1935), прафесар (1938). Скончыў Маскоўскі універсітэт (1902). З 1905 земскі ўрач у Рэчыцкім павеце Мінскай губерні. У гады 1-ай сусветнай і грамадзянскай войнаў хірург і ўрач шпіталяў на Заходнім фронце. З 1921 у медыцынскіх установах Мінска. З восені 1941 у мінскай гарадской бальніцы. Падтрымліваў сувязь з патрыятычным падполлем (падпольны псеўданім Самарын). Дапамагаў параненым падпольшчыкам і партызанам, забяспечваў падпольшчыкаў і многія партызанскія атрады медыкаментамі, хірургічнымі інструментамі, поўнасцю абсталяваў 2 партызанскія шпіталі. У кастрычніку 1943 быў арыштаваны фашыстамі, якія ў абмен на жыццё прапанавалі яму супрацоўніцтва. Я. У. Клумаў рашуча адмовіўся. У лютым 1944 разам з жонкай Г. М. Клумавай, якая дапамагала яму ў падпольнай дзейнасці, быў знішчаны ў душагубцы. У Мінску ягоным імем названы вуліца, завулак, сярэдняя школа № 67 і 3-яя клінічная бальніца, на будынку якой устаноўлена мемарыяльная дошка.

КАНЧАР (КАНЧЭР) Яўсевій (Яўген) Сцяпанавіч нарадзіўся ў вёсцы Сеўкі Дзержыцкай воласці Рэчыцкага павета Менскай губерні (цяпер Лоеўскі раён Гомельскай вобласці) у сялянскай сям'і. Скончыў Мар'інагорацкае земляробчае вучылішча. Падчас рэвалюцыі 1905 г. жыў у Тыфлісе, удзельнічаў у выступленнях супраць царызму, быў арыштаваны, але праз некаторы час быў апраўданы судом. У 1910—1914 гг. вучыўся на Пецярбургскіх сельскагаспадарчых курсах. Яшчэ ў Тыфлісе Я. Канчэр далучыўся да кааператыўнага руху, актуальным арганізацыйна-эканамічным праблемам якога некалькі гадоў пазней прысвяціў свой вялікі артыкул пад назвай «Дапаможнік па сельскай кааперацыі».

Сакавік 1917-га. Разломны, рэвалюцыйны і, у дадатак, бядотны ваенны час. Разбураюцца асновы вялікай Расійскай імперыі. Шматлікія народы, якія ўваходзяць у яе, пачынаюць шукаць шляхі да свайго нацыянальнага самавызначэння. У беларусаў адным з падзвіжнікаў гэтай найважнейшай і высакароднай ідэі становіцца Я. Канчэр. Спачатку ён уваходзіць у склад Беларускага нацыянальнага камітэта пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў (Петраград).

У снежні таго ж 1917-га ў Мінску сабраўся першы Усебеларускі з'езд, дэлегаты якога прадстаўлялі ўсе слаі насельніцтва краю. Праблема, пастаўленая на ім, па сваёй значнасці для лёсу Беларусі каласальная — пошук шляхоў да нацыянальнай незалежнасці. І адным з самых дзейных арганізатараў з'езда выступае, ізноў жа, Я. Канчэр. Фінал з'езда быў, на жаль, сумным — яго разагналі бальшавікі.

Далейшая грамадска-палітычная дзейнасць гэтага незвычайнага чалавека была звязана з пасадай загадчыка навукова-статыстычным аддзелам Беларускага нацыянальнага камісарыята ў Петраградзе, а таксама з Беларускім вольна-эканамічным таварыствам (старшыня). Арганічным яе працягам стала публіцыстыка. Я. Канчэр выдае зборнік, назва якога гаворыць сама за сябе, — «Беларускае пытанне». Яго артыкулы, нарысы, нататкі з'яўляюцца ў газеце «Дзянніца», часопісе «Чырвоны шлях». І, як бы паміж усім гэтым, была скончана Петраградская сельскагаспадарчая акадэмія...

У 20-ыя гады ён працягваў жыць у Петраградзе. Займаўся навуковай і выкладчыцкай дзейнасцю. Пры гэтым сувязі з Беларуссю падтрымліваліся самыя цесныя. Ён быў членам-карэспандэнтам Інбелкульта, выступаў у розных мінскіх выданнях з артыкуламі на эканамічныя тэмы. У Петра-

градзе ж стварыў зямляцтва беларускіх студэнтаў. У Канчэра былі намеры вярнуцца ў Мінск, ён нават аформіў патрэбныя дакументы для работы ў Белдзяржуніверсітэце, аднак гэтае жаданне па нейкіх невядомых сёння прычынах не здзейснілася. Навуковая ж праца па-ранейшаму мела «беларускі напрамак». У 1923 г. ён напісаў «Эканамічную геаграфію БССР» і прапанаваў яе выдавецтву «Савецкая Беларусь».

Рэпрэсіі 20—30-ых гадоў Я. С. Канчэра нейкім цудам не закранулі. У Петраградзе — Ленінградзе ён застаўся назаўсёды. Сувязі з Беларуссю перарваліся да канца 60-ых гадоў, калі ён прапанаваў свае паслугі як гісторык і мемуарыст беларускай энцыклапедыі і часопісу «Полымя». Але час для публікацыі твораў такога аўтара яшчэ не настаў.

Жыццё і дзейнасць Я. С. Канчэра, яго роля ў барацьбе за беларускую дзяржаўнасць ў 1917—1919 гг. чакаюць свайго даследчыка.

Усебеларускі з'езд (кангрэс) 1917 г., які абвясціў усяму свету, што беларусы ствараюць сваю дзяржаву, — адна з найважнейшых падзей у гісторыі Беларусі XX ст. На грунце яго рашэнняў былі выпрацаваны Устаўныя граматы і абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка.

Трэба сказаць, што ў Канчэра былі свае схільнасці, свае, толькі яму ўласцівыя, часам супроцьлеглыя, погляды на вырашэнне «беларускага пытання». З аднаго боку, ён рэзка крытыкуе мінскіх бальшавікоў як праціўнікаў беларускага руху, з другога — выступае і супраць пазіцыі лідэраў Беларускай рады, якія змагаліся за неадкладнае абвяшчэнне незалежнай Беларускай рэспублікі.

В. В. Скалабан.
Часопіс «Неман», № 1. 1993.

КАПЛАН Фані Яфімаўна нарадзілася ў 1886 г. у Рэчыцы. З сям'і яўрэйскага настаўніка. У рэвалюцыйную барацьбу ўключылася, калі ёй не было і дваццаці гадоў. З'яўлялася членам Кіеўскай рэвалюцыйнай анархісцкай арганізацыі. Была арыштавана і ў снежні 1906 асуджана ваенна-палявым судом.

З прыгавору:

...Военно-полевой суд от войск Киевского гарнизона в составе: председателя суда — подполковника Немилова, членов — полковника Липинского, подполковника Пацевича, капитана Богатырева и капитана Тенькова, в судебном заседании 30 декабря 1906 г. рассмотрел дело о мещанке, именующейся Фейгой (Фани) Хаимовной (Ефимовной) Каплан, преданной суду начальником войск Киевского гарнизона по обвинению в изготовлении, хранении, приобретении и ношении взрывчатых веществ с противной государственной безопасности и общественному спокойствию целью. Постановил: Подсудимую, именующейся Фейгой Каплан, за доставление и хранение у себя с противной государственной безопасности и общественному спокойствию целью взрывчатых веществ по лишению всех прав состояния сослать в каторжные работы без срока».

Да сакавіка семнаццатага года Фані Каплан адбывала катаргу ў Забайкаллі. Пры этапіраванні яе туды начальніку этапу быў выдадзены дакумент, у якім указана, што асуджаная можа ісці пешшу ў наручніках і што патрабуе асабліва пільнага нагляду, бо схільная да ўцёкаў.

Катарга ёсць катарга. Каплан цярпліва яе пераносіла. Ніводнай заявы аб памілаванні ці змякчэнні кары не напісала. Хварэла, некалькі разоў змяшчалася ў бальніцу. Слепла на істэрычнай глебе — так указана ў заключэнні ўрачоў. Ёй дазволілі для чытання мець лупу, якую ёй прыслалі з Чыкага яе браты.

Каплан была вызвалена ад работы, тэрмін катаргі ёй вызначылі ў 20 гадоў. Выпусцілі яе на свабоду па амністыі на аснове тэлеграмы пракурора Чыцінскага акруговага суда пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917-га. Такім чынам, Каплан на катарзе правяла больш за дзесяць гадоў.

Калі да катаргі Каплан знаходзілася пад уплывам анархістаў, то пасля знаёмства з катаржанкай Марыяй Спірыдонавай, Ганнай Пігіт і іншымі погляды яе змяніліся. Яна зблізілася з сацыялістамі-рэвалюцыянерамі. У васемнаццатым Каплан ужо цалкам прыняла ідэі правых эсэраў.

Пасля Сібіры яна з месяц жыла ў Маскве ў былой катаржанкі Г. Пігіт, потым пераехала ў Крым, дзе спачатку лячылася ў санаторыі для паліткатаржан, а пасля працавала ў Сімферопалі загадчыцай курсаў па падрыхтоўцы работнікаў валасных земстваў. Кастрычніцкі бальшавіцкі пераварот прыняла варожа. Як і ўсе сацыялісты, акрамя бальшавікоў, Каплан была за Устаноўчы сход, супраць міру з Германіяй.

Вядомы такі эпізод з жыцця Каплан

у Крыме. У санаторыі для паліткатаржан Каплан пазнаёмілася з малодшым братам У. І. Леніна Дзмітрыем Ульянавым, які там адпачываў. Ён дапамог Каплан з уладкаваннем на працу, з паездкай у Маскву. Па яго хадайніцтве мясцовымі ўладамі ёй была аказана і матэрыяльная дапамога.

...У канцы дня 30 жніўня 1918 г. у Маскве ў дварыя завода Міхельсона быў зроблены замах на Леніна. Падазроную жанчыну затрымалі. Допыт яе ішоў адразу пасля затрымання — вечарам, ноччу, потым назаўтра. Дапытвалі паасобку, намеснік Дзяржынскага Петэрс, старшыня Маскоўскага рэўтрыбунала Дзьяканаў, чэкісты Кінгісеп, Скрыпнік, нарком юстыцыі Курскі. На ўсіх гэтых допытах жанчына прызналася, што страляла ў Леніна яна, і назвала сябе Фаняй Яфімаўнай Каплан.

З паказанняў на следстве памочніка камісара 5-ай Маскоўскай пяхотнай дывізіі С. Батуліна.

«Я, падышоўшы да аўтамабіля, пачуў тры рэзкія сухія гукі, якія я прыняў за маторныя гукі. Убачыў натоўп народа, які разбягаўся, і Леніна, які ляжаў тварам да зямлі. Я зразумеў, што на жыццё Леніна быў замах. Чалавека, што страляў, я не бачыў. Я не разгубіўся і закрычаў: «Трымайце забойцу таварыша Леніна!» З гэтым крыкам я выбег са двара на Серпухоўку, па якой уцякалі ў розныя напрамкі перапалоханыя стрэламі людзі. Сваім крыкам «Трымайце» я хацеў спыніць тых, хто бачыў, як стралялі ў таварыша Леніна. Дабегшы да так званай стрэлкі на Серпухоўцы, я ўбачыў дзвюх дзяўчат, якія па маім глыбокім перакананні беглі таму, што ззаду іх бег я і іншыя людзі. Я іх не стаў больш даганяць. У гэты час ззаду сябе, каля дрэва, я ўбачыў з партфелем і парасонам у руках жанчыну, якая сваімі дзіўнымі паводзінамі спыніла маю ўвагу. Яна мела выгляд запалоханага чалавека, які ратаваўся ад праследавання. Я спытаў гэту жанчыну, чаму сюды трапіла? «А навошта вам гэта?» — адказала жанчына. Тады я абшукаў яе кішэні, узяў яе партфель і парасон і прапанаваў ісці за мной. У дарозе я яе спытаў, «чуя в ней лицо, покушавшееся на тов. Ленина» (так у арыгінале), чаму яна страляла ў Леніна, на што яна адказала: «А для чаго вам гэта ведаць?» Мяне гэта канчаткова пераканала, што замах на тав. Леніна зрабіла яна. У гэты час да мяне падышлі яшчэ 3—4 чалавекі, якія памаглі мне суправаджаць яе па Серпухоўцы. Нехта з натоўпу пазнаў у гэтай жанчыне чалавека, які страляў у тав. Леніна. Пасля гэтага я яшчэ раз спытаў: «Вы стралялі ў тав. Леніна?», на што яна сцвярджальна адказала, адмовіўшыся назваць партыю, па даручэнні якой яна страляла. Баючыся, як бы не адбілі з нашых рук асобы, якія ёй спачувалі, і яе аднадумцы, я прапанаваў міліцыянерам, што былі ў натоўпе, памагчы суправаджаць нас».

Вось самы першы, напісаны праз гадзіну пасля затрымання Каплан, пратакол яе допыту. «Я, Фані Яфімаўна Каплан, 28 гадоў, катаржанка, сядзела ў Акутуі, спынялася ў Маскве, дзе прыйдзецца. Мяне затрымалі каля ўваходу на мітынг. Ні да якой партыі я не належу. Я страляла ў Леніна таму, што лічу, што ён здраднік, і лічу, чым далей ён жыве, тым аддаляе ідэю сацыялізму на дзесяткі гадоў. Я ўчыніла замах асабіста ад сябе».

Зінаіда Лёгенькая-Халаднова... Ёй, тады чырвонаармейцу, з дзвюма сяброўкамі было даручана абшукаць Каплан, што яны вельмі старанна выканалі. Зброі у Каплан не было. Знайшлі толькі прафсаюзную картку на імя Мітрапольскай і чыгуначны білет да станцыі Таміліна. Лёгенькая-Халаднова потым памагла канваіраваць Каплан на Лубянку. Расказала, што Каплан, адказваючы на пытанні, амаль крычала, таму прыходзілася яе спыняць.

Пад следствам Каплан знаходзілася ўсяго чатыры дні. Хоць дапытвалі яе настойліва, можна сказаць, канвеерам, ніякіх доказаў, што яна дзейнічала ў групе ці па заданні нейкай партыі, не было здабыта. Каплан настойвала, што страляла яна ў Леніна па ўласнай волі. Апошнім яе дапытваў Я. Петэрс у падвальным памяшканні Крамля, куды яе па загадзе ЧК перавёз з Лубянкі П. Малькоў.

Каплан была расстраляна камендантам Маскоўскага Крамля П. Мальковым. Адбылося гэта ў 16 гадзін 3 верасня 1918 г.

Васіль Хомчанка.
«Тэрарыстка з Рэчыцы»
(са значнымі скарачэннямі).

БІБЛІЯГРАФІЯ

Агульныя работы і даведнікі Беларусь

Белорусский край. Спб.: 1906.

Военно-статистическое обозрение Российской империи. Т. 9. Ч. 4. Минская губерния. 1848.

Военно-топографический очерк района между реками Березиною и Днепром вдоль Московско-Брестской железной дороги. М.: 1908.

Гамалия К. Земля и люди в России. Белоруссия и Литва. Киев. 1883.

Гуленко М. Среди болот и лесов. Краткий рассказ о Белоруссии и белорусах. М.: 1903.

Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3. Ч. 1. Литовское Полесье. Ч. 2. Белорусское Полесье. Спб. – М.: 1882.

Замечательности Северо-Западного края. Вильна. 1867 – 1868.

Золотарев А. М. Военно-географический очерк окраин России и пути в соседние территории. Спб.: 1903.

Зябловский Е. Землеописание Российской империи для всех состояний. Ч. 6. Спб.: 1810.

Календарь «Северо-Западного края». М.: 1889 – 1890.

Майков Г. П. Белорусский край. Спб.: 1898.

Попов Р. Очерки Белоруссии. Спб.: 1876.

Попов Р. С. Белоруссия и белорусы. М.: 1879.

Путеводитель по России. Спб.: 1888.

Риттер А. Ф. Обиженный край. Спб.: 1911.

Россия. Полное географическое описание нашего отечества. Спб.: 1905.

Сапунов А. П. Белоруссия и белорусы. Витебск. 1910.

Северозападный календарь. Мн.: 1891 – 1892.

Семенов Д. Д. Отечествоведение. Россия по рассказам путешественников и ученым исследованиям. Т. 4. Восток и Запад. Спб. – М.: 1867.

Столпянский Н. П. Девять губерний Западнорусского края в топографическом, геогностическом, статистическом и историческом отношениях. Спб.: 1866.

Палессе

Жилинский И. И. Краткое обозрение Полесья и его канализации. Спб.: 1892.

Левитский И. О. О хозяйственных условиях Полесья и о значении для них производимой ныне канализации этого края. Спб.: 1878.

Маракуев В. Н. Полесье и полешуки. М.: 1879.

Приложение к очерку работ Западной экспедиции по осушению болот. 1873 – 1898. Спб.: 1899.

Семенов Н. М. Полесье. Мозырь. 1913.

Сно Е. Э. В болотах Полесья. Белорусы. Очерк. Спб.: 1904.

Тулинов П. В. Полесье. Спб.: 1903.

Эремич И. Очерки Белорусского Полесья. Вильна. 1868.

Апісанні і агляды губерняў Памятныя кніжкі

Зеленский И. Минская губерния. Ч. 1, 2. Спб.: 1864.

Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии. Мн.: 1870.

Карманная книжка Минской губернии на 1865 г. Мн.: 1864.

Смородский А. П. География Минской губернии (Отечествоведение). Мн.: 1894.

Товаров А. В. Историко-статистическая справочная книжка Минской епархии. Историко-статистический обзор городов, церквей и приходов Минской епархии. Мн.: 1903.

Турбин С. Днепр и Приднепровье. Описание губерний. Спб.: 1877.

Ястремский Ф. Н. Статистико-экономический очерк Минской губернии. Мн.: 1896.

Атласы, карты, планы і картаграфічныя матэрыялы

Атлас Западно-Русского края. Спб.: 1866.

Жилинский И. И. Карта Полесья с показателем исполненной и предполагаемой канализации. Спб.: 1882.

Карский Е. Ф. К вопросу об этнографической карте белорусского племени. Спб.: 1903.

Эркерт Р. Ф. Этнографический атлас Западно-русских губерний и соседних областей. Берлин. 1863.

Насельніцтва

Волости и важнейшие селения Европейской России. Спб.: 1886.

Волости и гмины 1890 года. Спб.: 1890.

Вольтер Э. А. Статистика племенного состава народонаселения Северо-Западного края. М.: 1890.

Коялович М. О. О расселении племен Западного края России. М.: 1863.

Лебедкин М. О племенном составе народонаселения Западного края Российской империи. Спб.: 1861.

Народы России. Белорусы и поляки. Спб.: 1878.

Народы России. Живописный альбом. Спб.: 1880.

Генеалогія. Геральдыка

Алфавитный список дворянским родам Минской губернии, внесенным в дворянскую родословную книгу по 1-е июля 1903 года. Мн.: 1903.

Винклер П. П. Гербы городов, губерний, областей и посадов Российской империи, внесенных в Полное собрание законов с 1649 по 1900. Спб.: 1900.

Археалогія. Музеі

Альбом рисунков, помещенных в отчетах Археологической комиссии за 1882—1898 годы. Спб.: 1906.

Татур Г. Х. Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и ее археологическое значение. Мн.: 1892.

Этнаграфія

Довнар-Запольский М. Ф. Очерки семейного права крестьян Минской губернии. М.: 1867.

Довнар-Запольский М. Ф. Чародейство в Северо-Западном крае в XVII — XVIII ст. Историко-этногр. этюд. М.: 1890.

Крачковский Ю. Ф. Быт западно-русского селянина. М.: 1874.

Труды этнографическо-статистической экспедиции в Западно-Русский край, снаряженной Русским географическим обществом. Т. 4. Спб.: 1877.

Янчук Н. А. По Минской губернии (Заметки из поездки в 1886 году). М.: 1889.

Гісторыя Беларусі па перыядах

Полное собрание русских летописей, изданное по высочайшему повелению императорскою археографическою комиссиею. Т. 17. Западнорусские летописи. Спб.: 1907.

Антоневич Н. И. История Белой Руси и белорусы. Львов. 1908.

Антонович В., Иловайский Д. История Великого княжества Литовского. От найдавнейших часов до упадка удельной системы в Литовской Руси. Тернополь. 1887.

Антонович В. Б. Монографии по истории Западной и Юго-Западной России. Т. 1. Киев. 1885.

Турцевич А. О. Русские крестьяне под владычеством Литвы и Польши. Краткий исторический очерк. Вильна. 1911.

Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Мн.: 1848.

Исторический очерк Минской губернии. Мн.: 1907.

Смородский А. П. Столетие Минской губернии. (1793—1893. Историко-статистическая записка). Изд. 2-е, испр. и доп. Мн.: 1893.

Товаров А. В. Исторический очерк Минской губернии в начальную пору существования русского государства. (От основания русского государства до распространения господства Литвы.) Мн.: 1910.

Мясцовае ўпраўленне і самакіраванне

Денежный отчет Речицкой уездной земской управы за 1914 год. Речица. 1915.

Журналы Речицкого уездного очередного земского собрания 1911 г. I сессии (с 12 по 17 декабря), с приложениями и журналы чрезвычайных уездных земских собраний 1—4 августа 1911 г. 2—3 октября 1911 г. Речица. 1912.

Смета расходов и доходов и раскладки на 1913 год Речицкого уездного земства. Речица. 1913.

Народная гаспадарка

1. Агульныя пытанні

Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от причтов сведениям. Мн.: 1878—1879. (Речицкий уезд. 1879).

2. Статыстыка

Отчет о деятельности Минского губернского статистического комитета... Мн.: 1888—1916.

3. Прамысловасць. Рамяство

Фабрично-заводская промышленность России. Перечень фабрик и заводов. Спб.: 1897.

4. Сельская гаспадарка

Журнал общего собрания Мозырско-Речицкого отдела Минского общества сельского хозяйства... Мозырь. 1911—1916.

Ястремский Ф. Н. Повинности крестьян Минской губернии. Мн.: 1906.

Ястремский Ф. Н. Поземельное устройство крестьян Минской губернии. Мн.: 1901.

1917

1941

ЧАС БАРАЦЬБЫ І ВЫПРАБАВАННЯЎ

За ўладу Саветаў

1(14) лістапада 1917 г. адбылося надзвычайнае пасяджэнне Рэчыцкага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Заслухаўшы даклад П. І. Мілюкова, дэлегата II Усерасійскага з'езда Саветаў, Савет прыняў рашэнне аб устанаўленні ў горадзе і павеце савецкай улады. Быў абраны выканкам Савета ў складзе: Мікалая Дарафеевіча Шчарбітава — старшыня, Аляксандра Сцяпанавіча Кастэнкі — сакратара, членаў выканкама Я. П. Міцкевіча, П. І. Мілюкова, Я. Е. Дзямідава, У. А. Мяшчэрскага, Алешына і іншых. Разам з тым былі ўтвораны камісарыяты (аддзелы) — земляробства, унутраных спраў, харчавання, фінансаў, народнай асветы, аховы здароўя і юстыцыі. Рэдактарам бальшавіцкай газеты «Известия Речицкого Совета» прызначылі Я. Е. Дзямідава.

Раніцай 2(15) лістапада была абвешчана пастанова Савета аб пераходзе ўлады ў горадзе і павеце ў ягоныя рукі.

Рэчыцкі Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, а таксама мясцовая бальшавіцкая арганізацыя мелі на насельніцтва горада і павета адчувальны ўплыў. Гэта пераканаўча паказалі выбары дэлегатаў ва Устаноўчы сход, які праходзіў у лістападзе 1917 г. Бальшавікі Рэчыцы атрымалі ў час выбараў 75 працэнтаў усіх галасоў *(«Дзесяць год на Дняпры», Рэчыца, 1927 г.)*. Гэта была буйная перамога, бо, напрыклад, у Гомелі бальшавіцкія дэпутаты на Устаноўчы сход мелі толькі 30 працэнтаў усіх галасоў.

У Рэчыцы пасля перамогі Кастрычніка побач з Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў існавалі гарадская дума і земскі сход. У пачатку студзеня 1918 г. старшыня выканкама Рэчыцкага Савета М. Д. Шчарбітаў накіраваў дакладную запіску ў Наркамат унутраных спраў, дзе выказаў думку аб неабходнасці ліквідацыі гарадскіх дум і земстваў.

14 лютага выканкам Рэчыцкага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў распусціў думу і земскі сход, сканцэнтраваў усю ўладу ў сваіх руках.

Яшчэ 12 студзеня корпус белапалякаў Доўбар-Мусніцкага распачаў актыўныя дзеянні супраць Савецкай Рэспублікі. 13 студзеня часці корпуса захапілі Рагачоў, рушылі на Жлобін, Бабруйск, каб затым захапіць і Мінск. Палякі мелі намер акупіраваць таксама Гомель і Рэчыцу. Але Палескі камітэт РСДРП(б) прыняў усе захады для абароны Гомеля і Рэчыцы. Гомельскі і Рэчыцкі паветы былі аб'яўлены на ваенным становішчы. 31 студзеня 1918 г. у «Известиях Гомельского Совета» быў надрукаваны зварот да працоўных Гомельскага і Рэчыцкага паветаў. У ім гаварылася: «Грамадзяне! Цёмныя сілы ў асобе польскіх легіянераў пагражаюць заваёвам рэвалюцыі. Усе, каму дорага справа рэвалюцыі, запісвайцеся ў добраахвотную сацыялістычную Чырвоную гвардыю для абароны ад польскіх легіянераў».

П. І. Мілюкоў

Неўзабаве Рэчыцкі баявы атрад на чале з Я. П. Міцкевічам даў белапалякам бой, адкінуў іх ад горада.

Яшчэ не былі разбіты польскія легіянеры, а над Савецкай Рэспублікай навісла яшчэ адна смяротная небяспека. Пасля зрыву мірных перагавораў у Брэст-Літоўску распачалі наступленне і германскія войскі.

21 лютага 1918 г. выйшла адозва СНК «Сацыялістычная Айчына ў небяспецы». Праз два дні галоўнакамандуючы войскамі Заходняга фронта А. Ф. Мяснікоў звярнуўся да беларускага народа з заклікам не прапусціць немцаў углыб краіны.

Рабочыя і сяляне Рэчыцы і павета, якія з першых жа дзён савецкай улады спазналі волю і мелі цвёрдую ўпэўненасць, што ленінскія дэкрэты будуць няўхільна праўвасабляцца ў жыццё, не жадалі мірыцца з вяртаннем ранейшых парадкаў. Народ пачаў узнімацца на барацьбу. У Рэчыцы быў створаны баявы атрад, падрыхтоўка да партызанскай вайны распачалася ў населеных пунктах павета.

У канцы лютага ля Рэчыцы ішлі цяжкія баі. У аператыўных зводках адзначалася: «У Рэчыцы партызанскія атрады вядуць працяглыя баі з немцамі, і небеспаспяхова...». Партызанам дапамагаў чырвонагвардзейскі атрад, які называўся Сямёнаўскім. Потым атрад атрымаў імя М. Шчорса.

Буйныя страты немцы панеслі таксама пад Горвалем.

З сакавіка Савецкая Расія падпісала мірны дагавор з аўстра-германскім блокам, згодна якому дэмаркацыйная лінія была акрэслена рубяжом Нарва — Пскоў — Магілёў — Гомель. Але немцы не думалі адмаўляцца ад сваіх захопніцкіх намераў.

Гомельскі падпольны бальшавіцкі камітэт распаўсюдзіў адозву да рабочых і сялян: «Нямецкім захопнікам намі аб'яўлена бязлітасная вайна. І мы не складзём зброі да таго часу, пакуль у нашых радах будзе хоць адзін чалавек, здольны валодаць вінтоўкай».

У сярэдзіне сакавіка на падпольным сходзе бальшавікоў Рэчыцы быў зацверджаны састаў падпольнага партыйнага камітэта. Яго ўзначаліў Л. Х. Васілявіцкі.

Тады ж, у сярэдзіне сакавіка 1918 г., Палескі камітэт накіраваў у населеныя пункты многіх паветаў сваіх прадстаўнікоў. У вёску Васільеўку Рэчыцкага павета прыбыў Любамірскі. Стварыў тут баявы атрад, у які ўвайшлі некалькі дзесяткаў жыхароў бліжэйшых вёсак.

У хуткім часе акупанты далучылі Беларускае Палессе да гетманскай Украіны. На гэтай тэрыторыі была ўтворана так званая Палеская губерня. Увайшла ў яе і тэрыторыя Рэчыцкага павета. У Рэчыцу і павет былі ўведзены атрады гайдамакаў. Такім чынам, жыхары Рэчыцы былі вымушаны весці барацьбу не толькі супраць германскіх захопнікаў, а і ўкраінскіх буржуазных нацыяналістаў.

У вёскі павета накіраваліся дзесяткі нямецкіх агентаў па закупу хлеба і жывёлы. Акупанты меркавалі, што сяляне больш ахвотна пойдуць на дыялог з агентамі — гандлярамі, чым з карнымі атрадамі. У адказ на гэта падпольны партыйны камітэт Рэчыцы надрукаваў лістоўкі і звароты да працоўных павета. Нягледзячы на рэпрэсіі і здзекі, рабочыя Рэчыцы не ўхіляліся ад эканамічнай барацьбы. Так, забастоўкі праводзіліся на фабрыцы «Днепр» і цвікавым заводзе. Яны былі

выкліканы жорсткай эксплуатацыяй, 10-гадзінным рабочым днём, павышэннем нормы выпрацоўкі і ў той жа час зніжэннем заработнай платы.

Тут жа, на рэчыцкіх прадпрыемствах, ствараліся баявыя атрады з рабочых. Яны дзейнічалі на фабрыцы «Днепр», дрэваапрацоўчым і цвікавым заводах.

Летам 1918 г. партызанскія атрады былі створаны ў 65 населеных пунктах Рэчыцкага павета. Найбольш буйны атрад быў у Ровенскай Слабадзе. У яго састаў уваходзілі 250 вяскоўцаў. 155 змагароў меў у сваіх радах атрад вёскі Горваль. На чале партызанскага руху ў Рэчыцкім павеце стаялі А. І. Якаўлеў-Кастрама, І. А. Валосенка, А. А. Мажэйка і г. д. Дарэчы, немцам удалося схапіць Адама Андрэевіча Мажэйку. Пасля жорсткіх катаванняў мужнага партызана кінулі ў капліцу. Але і на другі дзень ён адмовіўся размаўляць з ворагамі. Адбыўся суд. Немцы прыгаварылі Мажэйку да пакарання смерцю. Гэта быў першы смяротны прысуд, які немцы вынеслі ў Рэчыцы бальшавіку. Але прыгавор не быў прыведзены ў выкананне. Баявыя таварышы не пакінулі Адама Андрэевіча ў бядзе, яны дапамаглі яму ўцячы. Мажэйка перайшоў дэмаркацыйную лінію, стаў байцом Чырвонай Арміі. Немцы пра тое не ведалі. Яны меркавалі, што адзін з кіраўнікоў партызанскага руху Рэчыцкага павета А. А. Мажэйка хаваецца ў горадзе ці ў якой з вёсак. Акупанты распаўсюдзілі аб'яву, у якой гаварылася: «Тры тысячы рублёў узнагароды. У г. Рэчыца з месца зняволення ўцёк прыгавораны да смерці селянін вёскі Амелькаўшчына Адам Мажэйка. Хто выдасць яго ўладам, укажа месца яго знаходжання, будзе садзейнічаць затрыманню, атрымае з рэчыцкай этапнай камендатуры 3000 рублёў узнагароды. За ўкрывацельства Мажэйкі вінаватыя ў тым асобы і сельскія грамадствы панясуць самае суровае пакаранне».

Летам 1918 г. партызанскі атрад пад кіраўніцтвам матроса Кастрамы, які дзейнічаў на поўначы Рэчыцкага павета, разграміў некалькі нямецкіх застаў, у задачу якіх уваходзіла ахова памешчыцкіх маёнткаў. Немцы былі вымушаны ўцякаць у Рэчыцу. Атрад жа Кастрамы накіраваўся ў паўночна-заходнюю частку павета. І там народныя мсціўцы працягвалі рашучую барацьбу супраць нямецкіх захопнікаў.

У канцы ліпеня быў скліканы сялянскі сход прадстаўнікоў многіх паветаў Беларускага Палесся. Сход (з'езд) прыняў рашэнне аб узмацненні падрыхтоўкі да паўстання. Гэта стала вядома акупацыйным уладам. Начальнік дзяржаўнай варты 1 участка Рэчыцкага павета 11 ліпеня 1918 г. паведамляў нямецкаму камандаванню, што «...пад кіраўніцтвам былога члена Рэчыцкага Савета салдацкіх і рабочых дэпутатаў арганізоўваецца тайнае таварыства, якое ставіць сваёй мэтай выступіць са зброяй супраць нямецкіх войск» (*«Разгром нямецкіх захопнікаў у 1918 г.». Зборнік дакументаў. Дзяржпалітвыдат, 1943 г., дак. № 158).*

У пачатку ліпеня прадстаўнікі партызанскіх атрадаў Гомельшчыны распрацавалі план адначасовага выступлення супраць акупантаў. Меркавалася, што Гомельскі і Васілевіцкі атрады знішчаць мясцовыя гарнізоны, накіруюцца да Рэчыцы і, вызваліўшы яе, разам з рэчыцкімі партызанамі рушаць на вызваленне Гомеля. З поўдня дапамогу ім павінны былі аказаць Церахоўскі, Насовіцкі, Прыбыткаўскі і іншыя атрады.

Агульным сігналам для паўстання служыў падрыў нямецкага цягніка паміж Зябраўкай і Церахоўкай, а сігналам для выступлення гомельскіх і рэчыцкіх партызан — падпал нямецкіх казармаў у Гомелі. У ноч з 16 на 17 жніўня цягнік быў падарваны, але падпаліць нямецкія казармы не ўдалося. І ўсё ж Горвальскі атрад, які узначальваў камуніст Дубовік, вырашыў не чакаць. Атрад разграміў горвальскі гарнізон, аднавіў у вёсцы савецкую ўладу, накіраваўся да вёскі Слабодка.

Неўзабаве гарнізон гайдамакаў, што знаходзіўся ў Слабодцы, быў абяззброены. Без прамаруджвання партызаны выбілі немцаў і гайдамакаў з Якімаўскай Слабады, Берагавой Слабады, Уноры, Глушца і г. д. У ходзе рэйда атрад вырас да 200 чалавек, хаця на дзень выступлення ў ім было толькі 60 байцоў.

Нямецкае камандаванне, усхваляванае такім становішчам, тэрмінова выправіла з Рэчыцы насустрач Горвальскаму партызанскаму атраду значныя сілы. Непадалёк ад горада адбыўся цяжкі бой. Партызанскі атрад пацярпеў паражэнне, быў змушаны адступіць. На жаль, кайзераўцы захапілі ў палон некалькі партызан. Сярод іх быў і камандзір атрада Дубовік. Неўзабаве ён быў павешаны на плошчы ў Рэчыцы. Лёс свайго камандзіра падзялілі і некаторыя палонныя партызаны.

Нягледзячы на тое, што паўстанне супраць нямецкіх акупантаў было няўдалым, барацьба супраць захопнікаў працягвалася, набываючы ўсё больш масавы размах. Добрую баявую загартоўку атрымалі партызаны паўднёвай часткі Рэчыцкага павета, якія дзейнічалі ў раёнах вёсак Крывічы, Новая Аляксееўка, Савічы і г. д. На чале гэтых атрадаў стаялі камуністы В. Кончар, Т. Лявоненка, Ф. Хаменка, С. Вароненка.

Летам 1918 г. з Масквы ў распараджэнне Палескага камітэта партыі былі накіраваны некалькі членаў германскай сацыял-дэмакрытычнай групы «Спартак»: Шмідт, Краўзо і іншыя. Яны мелі заданне весці прапагандысцкую работу сярод салдат германскіх войск. «Спартакаўцы» разгарнулі сваю дзейнасць і ў Рэчыцы, выпусцілі лістоўкі на нямецкай мове, у якіх тлумачылі нямецкім салдатам рабаўніцкі характар імперыялістычнай вайны, заклікалі іх усяляк ухіляцца ад карных аперацый супраць мірнага насельніцтва і партызан.

13 лістапада 1918 г. Савецкі ўрад анулявaў Брэсцкі дагавор. Войскі Заходняга і Украінскага франтоў распачалі супраць акупантаў рашучыя дзеянні. У напрамку Гомель — Калінкавічы — Лунінец наступала 17-ая стралковая дывізія. Чырвонаармейцам актыўную дапамогу аказвалі партызаны.

6 снежня немцы былі вымушаны пакінуць мястэчкі Лоеў і Стрэшын, вёску Азершчыну, ад якой да Рэчыцы некалькі кіламетраў.

Рашучыя баявыя дзеянні супраць акупантаў на тэрыторыі Рэчыцкага павета ажыццяўлялі байцы 1-ай роты 151-га Чырвонагвардзейскага палка пад камандаваннем С. Д. Ляскаўца. У роту ўступілі 140 добраахвотнікаў з вёсак павета. Вызваленню горада і павета садзейнічала актыўная работа Рэчыцкага падпольнага камітэта партыі, які восенню 1918 г. узначаліў А. С. Кастэнка, і падпольнага рэўкома, на чале якога быў Я. П. Міцкевіч.

У сярэдзіне снежня 1918 г. у тэлеграме Рэўваенсавета Заходняга фронта Я. М. Свярдлову паведамлялася: «Рэчыца ахоплена паўстанцамі, нямецкія салдаты ідуць насустрач паўстанцам. Адносіны паміж нашымі і нямецкімі салдатамі ўсталёўваюцца самыя цесныя, бальшавізм у нямецкія войскі пранікае ўсё больш і больш».

У Рэчыцы былі сканцэнтраваны два палкі нямецкай пяхоты, два кавалерыйскія эскадроны, чатыры кулямётныя роты і дзве батарэі артылерыі. Рэчыцкі гарнізон налічваў каля пяці тысяч салдат і афіцэраў. Разам з тым нямецкае камандаванне спрабавала стварыць у горадзе белагвардзейскую дружыну. Для ўзбраення дружыны акупанты выдалі 3500 вінтовак і 6 кулямётаў. Але ў дружыну запісаліся толькі 80 афіцэраў.

18 снежня 1918 г. Рэчыца была вызвалена.

22 снежня адбылася канферэнцыя прадстаўнікоў заводскіх камітэтаў і палітычных партый Рэчыцы. Большасцю галасоў канферэнцыя падтрымала прапанову бальшавікоў аб аднаўленні савецкай улады. Быў абраны рэўком з 9 чалавек.

24 снежня рэўком надрукаваў заяву з наступным зместам: «На падставе рэзалюцыі рабочай канферэнцыі г. Рэчыцы ад 22 снежня 1918 г. аб'яўляем усім грамадзянам горада, што ўся ўлада ў горадзе і ўездзе перададзена Рэвалюцыйнаму камітэту, які выбраны на канферэнцыі. Усе ўстановы горада і ўезда падпарадкоўваюцца Рэвалюцыйнаму камітэту. Грамадзяне горада і ўезда заклікаюцца да захавання рэвалюцыйнага парадку і спакою. Усякія спробы да беспарадкаў, грабяжоў і насілля будуць падаўляцца бязлітасна. Усім служачым усіх існуючых устаноў заставацца на сваіх месцах і выконваць свае абавязкі».

У канцы лютага 1919 г. адбылася Рэчыцкая павятовая партыйная канферэнцыя. На ёй былі выбраны павятовы камітэт партыі і бюро павятовага камітэта з трох чалавек: А. С. Кастэнка — сакратар, Л. Х. Васілявіцкі і Я. П. Міцкевіч — члены бюро.

Неўзабаве адбыўся і павятовы з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Старшынёй павятовага выканкама на ім быў абраны Я. П. Міцкевіч.

Сур'ёзным выпрабаваннем для працоўных Рэчыцы і павета з'явіўся мяцеж, на чале якога стаяў былы штабс-капітан царскай арміі, член эсэра-кадэцкай арганізацыі «Саюз абароны радзімы і свабоды» Стракапытаў. Мяцеж пачаўся ў Гомелі 24 сакавіка 1919 г. і хутка перакінуўся ў Рэчыцу. Некалькім былым царскім афіцэрам удалося справакаваць каравульную роту ў колькасці 125 чалавек. Яны і выступілі супраць савецкай улады. У ноч на 25 сакавіка Стракапытаў, які ўжо аб'явіў сябе «камандуючым першай арміяй Рускай народнай рэспублікі», накіраваў рэчыцкім мяцежнікам тэлеграму з наступным зместам: «Паўстанне пашыраецца... у Гомелі савецкая улада звергнута. Уся ўлада перайшла да камітэта першай рускай арміі... прапаную паўстанцкаму камітэту ў Рэчыцы пачаць актыўныя дзеянні...».

У гэты час амаль увесь партыйны і савецкі актыў Рэчыцы знаходзіўся ў населеных пунктах павета, дзе ішла падрыхтоўка да веснавой сяўбы, нарыхтоўвалася харчаванне для Чырвонай Арміі. Невялікі атрад рэчыцкіх камуністаў пад камандаваннем Я. П. Міцкевіча паспрабаваў прадухіліць паўстанне каравульнай роты, але безвынікова. Таму давялося адступіць у Горваль. У барацьбе з мяцежнікамі асабліва вызначыліся матросы Кавалёў і Бурцаў. Менавіта яны прыкрывалі адступленне атрада.

Раніцай 29 сакавіка Гомель быў цалкам у руках Чырвонай Арміі. Стракапытаўцы адступілі ў напрамку Рэчыцы. Тут у Рэчыцы яны пачалі масавае рабаўніцтва насельніцтва, выпусцілі з турмы крымінальнікаў. Па-зверску расправіліся з бальшавіком Б. Бяганскім. Ад рук стракапытаўцаў загінулі члены партыі Казак, Казоўскі, Арлоў, Куперман, Палей, Пшаноў, Хаздан, якія не паспелі выйсці з горада.

Стракапытаўцы ўчынілі пагром і ў Васілевічах. Але падышлі часці Чырвонай Арміі і ў раёне Васілевіч цалкам разгромілі іх. Актыўную дапамогу чырвонаармейцам аказалі працоўныя Рэчыцы і павета.

У красавіку 1919 г. буйны атрад пятлюраўцаў пад камандаваннем палкоўніка царскай арміі Струка захапіў Лоеў і шэраг населеных пунктаў на поўдні Гомельскага і Рэчыцкага паветаў, ліквідаваўшы органы савецкай улады. Рэчыцкі павятовы камітэт партыі тэрмінова правёў мабілізацыю сваіх членаў, сфарміраваў атрад, які ўзначаліў Я. П. Міцкевіч. Пад Лоевам пятлюраўцам быў дадзены бой. Атрад палкоўніка Струка быў разгромлены.

20 красавіка 1919 г. адбылося аб'яднанае пасяджэнне членаў Магілёўскага губкома, Палескага камітэта і ўкомаў партыі паўночных паветаў Чарнігаўскай губерні. Вынікам аб'яднанага пасяджэння стала ўтварэнне Гомельскага губкома РКП(б). Былі сфарміраваны таксама Гомельскі губвыканкам і яго-

Група камуністаў г. Рэчыца перад адпраўкай на фронт (на барацьбу з Дзянікіным). 1919 г.

ныя аддзелы. Такім чынам, Гомель стаў губернскім цэнтрам. У састаў Гомельскай губерні ўвайшоў і Рэчыцкі павет.

Праз два тыдні пасля ўтварэння Гомельскай губерні пачала сваю работу першая губернская партыйная канферэнцыя. Яна падвяла вынікі работы, ажыццёўленай на тэрыторыі губерні пасля вызвалення ад нямецкіх захопнікаў, акрэсліла задачы на аднаўленне народнай гаспадаркі, павышэнне культурнага ўзроўню і матэрыяльнага дабрабыту працоўных, вызначыла пытанні дапамогі фронту.

У канцы мая ў Гомелі прайшоў першы губернскі з'езд Саветаў, які адобрыў унутраную і знешнюю палітыку Савецкага ўрада, вызначыў шэраг мерапрыемстваў па ўмацаванні дапамогі фронту. Сур'ёзная ўвага была ўдзелена ўтварэнню камун, арцелей і таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі. Характэрная дэталь: акцэнт рабіўся на тое, што стварэнне названых вышэй фарміраванняў павінна ісці толькі метадамі пераканання, а не сілай. Было прынята рашэнне аб далейшым удасканаленні народнай асветы.

Летам 1919 г. тэрыторыя Гомельскай губерні была ў выключна складаных умовах.

Па-першае, Дзянікін захапіў Чарнігаў, што ўяўляла сур'ёзную пагрозу для Гомеля.

Па-другое, белапалякі захапілі ўсю тэрыторыю Мазырскага павета і выйшлі на Бярэзіну. Пад пагрозай акупацыі апынулася тэрыторыя Рэчыцкага павета, там было аб'яўлена ваеннае становішча. Зноў, як і раней, пачалася мабілізацыя ў армію камуністаў. Рэчыцкая партыйная арганізацыя кіравалася ў сваёй рабоце рашэннем губкома партыі, у якім гаварылася: «Мабілізаваць у паветах па магчымасці ўсіх камуністаў, скарачаючы да мінімуму ад-

дзелы, пакідаючы моцнымі арганізацыйна парткомы, ваенкаматы, прафкомы, сабезы, чэка».

Былі прыняты меры па вяртанню ў рады Чырвонай Арміі дэзерціраў. Так, газета «Путь Советов» за 1 кастрычніка 1919 г. паведамляла, што ваеннаабавязаныя вёсак Стары і Новы Барсук Маладушскай воласці Рэчыцкага павета, «...якія раней лічыліся недаступнымі ў сэнсе мабілізацыі, пасля сабранага сходу і гутаркі з сялянамі, вырашылі ўсе з'явіцца ў ваенкаматы. Іх прыкладу паследавалі іншыя вёскі, і цяпер дэзерціры вяртаюцца масамі».

У пачатку сакавіка 1920 г. белапалякі зноў рушылі ў наступленне. Ім удалося пацясніць чырвонаармейскія часці, захапіць Мазыр, Калінкавічы, Васілевічы. Васілевіцкая арганізацыя РКП(б) змагла загадзя адмабілізаваць свае сілы, стварыла канспіратыўныя органы для падпольнай работы ў тыле ворага.

Камуністы Рэчыцы і павета перайшлі на казарменнае становішча. Дарэчы, з мэтай ачышчэння партарганізацыі ад выпадковых людзей у красавіку — маі 1920 г. у партарганізацыі Рэчыцкага павета адбылася перарэгістрацыя. З 218 членаў партыі ў партарганізацыі засталіся толькі 102 камуністы.

У пачатку мая 1920 г. белапалякі прарвалі абарону Чырвонай Арміі і рушылі на Рэчыцу. Павятовы камітэт партыі ў ноч на 8 мая правёў тэрміновае пасяджэнне, прысвечанае абароне горада. З ліку камуністаў, камсамольцаў, рабочых была сфарміравана Камуністычная рота, якую ўзначаліў павятовы ваенком Аляксей Міхайлавіч Качаноўскі.

8 мая каля вёскі Воўчая Гара рота ўступіла ў бой з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. Байцы мужна змагаліся з ворагам. Наступленне белапалякаў было затрымана на некалькі гадзін. Гэта дало часцям 57-ай стралковай дывізіі магчымасць пераправіцца праз Днепр і заняць абарону, а з горада эвакуіраваць многіх грамадзян, дакументы, каштоўную маёмасць.

Многія байцы Камуністычнай роты загінулі ў баі. Сярод іх член павятовага камітэта партыі Галоўчанка, старшыня павятовай ЧК Пляшкоў, загадчык друкарні Крупецкі, камуністы Гуцьентаў і Драбышэўскі.

Падцягнуўшы свежыя сілы, белапалякі захапілі Рэчыцу, Горваль. Занялі яны і Лоеў. Аднак прасунуцца далей не змаглі. Праўда, яны пераправіліся праз Днепр, пасля цяжкага бою захапілі вёску Капань, рушылі да станцыі Якімаўка, але былі адкінуты адтуль назад да Рэчыцы. 42 дні гаспадарылі акупанты ў горадзе.

Перад адступленнем з Рэчыцы белапалякі ўзарвалі чыгуначны мост праз Днепр, вывелі са строю абсталяванне прадпрыемстваў горада. Абрабавалі яны бальніцу, школы, майстэрні, кааператыўныя лаўкі.

Рашаючую ролю ў разгроме акупантаў пад Рэчыцай і выгнанні іх з павета адыгралі Мазырская група чырвонаармейскіх часцей і Дняпроўская ваенная флатылія, у якой служылі многія з нашых землякоў — К. П. Старыкаў, Р. М. Хамянок, А. А. Траскуноў і г. д.

Пасля выгнання белапалякаў на тэрыторыі Рэчыцкага павета з'явіліся банды Галака, Струка, Булак-Балаховіча. Для барацьбы з імі былі створаны часці асобага прызначэння. Камандзірам ЧОН з'яўляўся Гросс, а пасля яго-най гібелі — Мухтар-Ландарскі.

Да сярэдзіны лістапада 1920 г. балахоўцы захапілі ўвесь Мазырскі павет, акупіравалі большую частку Рэчыцкага павета. На занятай тэрыторыі ліквідавалі органы савецкай улады, распачалі масавыя растрэлы і здзекі мірнага насельніцтва. Дзікі пагром арганізавалі яны і ў Васілевічах.

У другой палове лістапада часці 16-ай арміі разам з мясцовымі баявымі атрадамі пачалі рашучыя баявыя дзеянні супраць балахоўцаў. Цяжкі ўрон ім быў нанесены пад Рэчыцай. На пасяджэнні Гомельскага губкома партыі,

якое адбылося 24 лістапада 1920 г., адзначалася, што «...тры палкі Балаховіча пад Рэчыцай знішчаны і ўзяты ў палон. Вораг пайшоў за Мазыр. За ім гоняцца».

Нягледзячы на цяжкае становішча з харчаваннем і палівам, працоўныя Рэчыцкага павета горача адгукнуліся на заклік выканаць заданне харчовай развёрсткі па аказанні дапамогі Чырвонай Арміі. Нарада прадстаўнікоў валасных рэўкомаў Рэчыцкага павета, якая адбылася 11—13 снежня 1920 г., у сваёй рэзалюцыі па харчоваму пытанню адзначала: «...выкананне харчовай развёрсткі парушана нашэсцем Балаховіча... Аднак, нягледзячы на разбуранасць павета, развёрстка павінна быць выканана поўнасцю». Так яно і здарылася. Менавіта таму працоўным Рэчыцкага павета загадам рэўваенсавета 16-ай Арміі ад 23 снежня 1920 г. была аб'яўлена падзяка. У ёй гаварылася: «За энергічную работу па выкананні развёрсткі харчавання для патрэб Чырвонай Арміі аб'яўляецца падзяка Рэчыцкаму павятоваму харчкамітэту, выканкаму, рэўкомам, насельніцтву павета і валасцей, а таксама ўсім супрацоўнікам гэтых устаноў».

У пачатку 1921 г. бандытызм на тэрыторыі Рэчыцкага павета працягваў дзейнічаць. Асабліва лютавала ў той час групоўка Галака, сфарміраваная з рэшткаў банды Балаховіча. Галакаўцы ўчынілі крывавы пагром у Холмечах. Але на працягу вясны 1921 г. з бандытызмам было пакончана. Рашаючую ролю ў гэтым адыграла не толькі моц Чырвонай Арміі, а і пераход ад палітыкі ваеннага камунізма да новай эканамічнай палітыкі.

П. П. Рабянок, І. А. Шафір

Дакументы сведчаць

З аператыўнай зводкі аб партызанскай барацьбе з нямецкімі акупантамі ў Рэчыцкім і Чаускім паветах

1918 г., сакавіка 26(13)

Получены известия, что у Речицы крестьяне, окопавшись, ведут затяжные бои с немцами с успехом для себя. Отбито 1000 винтовок и 4 пулемета. На Могилевском направлении наши партизаны, ворвавшись ночью в Чаусы, отбили у польских легионеров 600 винтовок.

Член фронтового отдела (подпись)
Заведующий оперативным отд[елом] (подпись)

ДА РФ, ф. 6, воп. 7, спр. 48, л. 101.

З тэлефанаграмы Хойніцкага рэвалюцыйнага Савета аб разгроме партызанамі нямецкага гарнізона ў мястэчку Горваль Рэчыцкага павета

1918 г., верасня 17(4)

В начале сентября в мест. Горваль Речицкого у. отряд партизан из крестьян волости численностью в 60 чел. занял мест. Горваль, перебив и забрав в плен немецкий гарнизон местечка.

НА РБ, ф. 60, воп. 2, спр. 380, лл. 24—25.

Звесткі аб арганізацыі Саветаў у Мінскай губерні

1918 г., снежня 30(17)

Во всех уездах: Минском, Бобруйском, Борисовском, Игуменском, Мозырском, Речицком и Слуцком, за исключением Новогрудского и Пинского, организованы Совдепы. Волостных Советов организовано 160.

ДА РФ, ф. 393, воп. 24, спр. 55, л. 7.

Тэлеграма Бабруйскага ваеннага Савета Рэўваенсавета Заходняга фронту аб вызваленні Рэчыцкага і Мазырскага паветаў Мінскай губерні ад нямецкіх акупантаў і арганізацыі ў іх камбедаў

13 снежня 1918 г.

Бобруйск, 13 декабря к 20 ч. В расположении частей бригады без перемен. Путь на 64-й вер[сте] Полесской ж. д. исправлен, движение поездов можно возобновить. На 12 декабря был пущен через исправленный мост пробный паровоз. Против Речицы в Лясковцах настроение крестьян бодрое, желание бросить все и идти в Красную Армию. Партийными товарищами роты 151-го полка организуются комитеты бедноты. Идет совместная работа с ревкомами Горваля. По донесениям политической разведки, в Речице имеется 200 гайдамаков, и они держатся пассивно. На участке против Мозыря устроен в одной волости митинг, назначен съезд бедноты. Везде большая нужда в литературе и политических работниках. 14 [декабря] в Мозырь выезжают тт. Гуревич и Абрамович для приветствия революции в германской армии и переговоров об очищении линии Гомель — Лунинец.

Бобруйский военный совет
Военрук *Васильев*
Член совета *Вейнер*

ДА РФ, ф. 488, воп. 1, спр. 48, л. 278.

Рэзалюцыя І Надзвычайнага Рэчыцкага павятовага з'езда Саветаў Мінскай губерні па харчаваму пытанню

1918 г.

І съезд красноармейских, крестьянских и батрацких депутатов Речицкого у., заслушав в заседании своем доклад и прения о положении продовольственного вопроса в нашем уезде, находит:

1. Что при существующей разрухе продовольственного дела, расстройстве транспорта единственно правильной политикой для улучшения положения принять только ту, каковая в настоящее время проводится центральной советской властью.

2. Что единственным выходом из настоящего катастрофического положения является точный учет, немедленное изъятие излишков хлеба, картофеля и других продуктов у богачей, кулаков и по возможности у среднего крестьянства.

3. Принимая во внимание крайнюю нужду [в] продовольствии на фронте и необходимость немедленно накормить голодную Красную Армию и население, съезд вменяет в обязанность волостным сельским исполкомам и продовольственным комитетам принять все меры к организации товарообмена деревни с городом на продукты сельского хозяйства и фабричного производства на основах, указанных центром, и оказывать всяческое содействие и помощь агентам и инструкторам по учету и изъятию излишков в порядке товарообмена.

Собранным хлебом в деревнях прежде всего удовлетворять местную бедноту, а затем излишки послать в город.

Принято подавляющим большинством.

ДА РФ, ф. 393, воп. 3, спр. 209, л. 194.

Пастанова аб'яднанага сходу членаў Рэчыцкага павятовага рэўкома і старшынь сельскіх рэўкомаў аб выбарах селькіх Саветаў

15 лютага 1919 г.

Немедленно приступить к выборам сельских Советов, для чего Ревком должен выслать в каждое селение руководителя выборов.

Председатель *В. Пудреев*
Члены: *А. Ломонос, Коваленко*

ДА Гомельскай вобл., ф. 1595, воп. 1, спр. 2, л. 40.

Пратакол аб'яднанага пасяджэння Холмецкага валвыканкама і камуністычнай ячэйкі аб зборы хлеба для Чырвонай арміі

23 сакавіка 1919 г.

Повестка дня: О сборе хлеба для армии.

Слушали: Доклад представителя Речицкого ревкома тов. Мисюк о сборе хлеба для армии согласно постановлению № 49 Особо-продовольственной комиссии по снабжению армий Западного фронта. Принимая во внимание громадность волости и количество населения и принимая во внимание то обстоятельство, что в настоящее время приходится очень осторожно обходиться с населением, так как провокационные силы смогут восстановить народное мнение против советской власти, и принимая во внимание недостаток хлеба в волости, постановили:

Разбить волость на 5 районов. В каждый район назначить 1 члена исполкома, выбранного или кооптированного, и 1 члена коммунистической ячейки. Красноармейцев не посылать, так как это подорвет авторитет власти. Сбор производить не принудительным путем, а путем добровольных пожертвований, полагаясь в этом на местные Советы. Спрятанный хлеб, если таковой будет обнаружен, реквизировать только половину, а половину оставлять в распоряжение беднейшего населения деревни. Работу начать с 25 марта, предварительно, путем митингов, разъяснив населению сущность сбора.

Председатель *Громыко*
Секретарь *Кривенков*

ДА Гомельскай вобл., ф. 1595, воп. 1, спр. 2, л. 49.

Паведамленне аб контррэвалюцыйным мяцяжы ў Рэчыцы

25—26 сакавіка 1919 г.

25—26 марта с. г. местная караульная рота под предводительством быв. офицера студента Солодухова и быв. офицера Берзина и других бывших офицеров под влиянием гомельских событий выступила с оружием в руках против советской власти.

После короткой перестрелки с партией коммунистов власть была захвачена повстанцами.

Захватив власть, повстанцы под предводительством тех же офицеров разграбили квартиры коммунистов, у которых эти громилы забрали последнее белье. Коммунистов давили, избивали прикладами и сажали в тюрьму.

Затем белогвардейскими бандами была разгромлена тюрьма и выпущены все уголовные преступники. Разгромлен также Ревком, военком, чрезвычком и отдел юстиции. Из кассы военкома похищено около 100 000 руб., комиссии по снабжению Красной Армии — около 100 000 руб., финотдела — около 20 000 руб., уездной милиции — около 12 000 руб., у сотрудника совнархоза 30 000 руб.; разграблен цейхгауз караульной роты, захвачена часть лошадей и около 200 пуд. хлеба, закупленного для Красной Армии, склад сырья Минского губкома.

При уходе банды повстанцев-грабителей ограбили многих частных обывателей. В м. Василевичи эшелонами грабителей, шедших из Гомеля, был устроен еврейский погром. Разграблено до 80 семейств, 15 человек убито и свыше 20 ранено.

Этими же бандами были убиты и товарищи коммунисты: председатель уголовно-следственной комиссии тов. Казак, заведующий отделом центропечати тов. Куперман, инструктор совнархоза Беганский и рядовые коммунисты товарищи Палей и Казовский. Трупы их, кроме Беганского, доставлены в город и похоронены.

Подлые убийцы не удовлетворились убийством, но еще надругались над трупами, выкалывая глаза, избивая головы и изуродовав лица.

В настоящее время в уезде спокойно. Громилы караются, работа налаживается.

Газета «Бедняк» № 159, 19 красавіка 1919 г.

Пратакол з'езда школьных работнікаў Горвальскай воласці Рэчыцкага павета па арганізацыйных пытаннях культурна-асветніцкай работы ў вёсцы

25 ліпеня 1920 г.

Слушали: 1. Об организации комиссии по обследованию школ и школьных зданий в волости.

Постановили: В состав комиссии по обследованию школ и школьных зданий должны войти: представитель от волотнаробраза, представитель от сельского Совета, школьные работники обследуемых школ и 2 представителя от деревни по назначению общества. Поручить волостному отделу народного образования обследование произвести до учебного периода и весь материал представить в уотнаробраз.

Слушали: 2. Об организации изб-читален по деревням.

Постановили: В тех деревнях, где имеются школьные работники, возложить на них обязанность заведовать читальней, принимать активное участие в деле распространения литературы среди населения деревни, привлекая к этому все грамотное население. Все свободное время школьные работники должны уделить для чтения книг и литературы среди темных масс деревни, устраивая для этого почаще собрания и митинги. Поручить волотнаробразу снабжать избы-читальни достаточным количеством литературы, а сельским Советам отвести для изб-читален особые помещения.

Слушали: 3. Вопрос об удовлетворении школьных работников продовольственным пайком по твердым ценам.

Постановили: Принимая во внимание острую потребность в продовольственных продуктах всех без исключения школьных работников, поручить волотнаробразу составить списки на всех школьных работников и их семейства на предмет ходатайствования им ежемесячного продовольственного пайка.

Слушали: 4. О созыве уездного съезда школьных работников.

Постановили: Ходатайствовать перед уотнаробразом о неотлагательности созыва уездного съезда школьных работников в текущем году до открытия учебных занятий.

Слушали: 5. О предоставлении подвод школьным работникам по служебным делам.

Постановили: Просить волотнарабраз и волревком сделать распоряжение сельским комитетам о трудовой повинности, представлять подводы школьным работникам, предъявившим соответствующие документы о служебных командировках.

ДА Гомельскай вобл., ф. 1621, воп. 1, ад. зах. 4, лл. 11–12.

Пастанова міжведамаснай нарады пры Гомельскім губрэўкоме аб аказанні дапамогі пацярпеўшым ад пагромаў, учыненых бандамі Балаховіча ў Рэчыцкім павеце

28 лістапада 1920 г.

1. Предложить губпродкому организовать питание пострадавшим от погромов в Речицком уезде, согласно имеющимся на то положениям и сообразуясь с запасами продовольствия, коими губпродком располагает.

2. Предложить всем представленным на этом совещании учреждениям, за исключением губпродкома, представить к 3 час. дня 29 с. м. в комиссию ЖКР губсобеса сведения о том фонде материалов, которые могут быть ими отпущены в помощь погромленным.

3. Предложить комиссии ЖКР губсобеса послать своего представителя в Речицкий уезд для обследования на месте совместно с местными органами власти действительных нужд погромленных.

4. Губсобесу по соглашению с губревкомом послать в Москву представителя для исходатайствования нарядов на недостающие материалы, необходимые для удовлетворения погромленных.

5. Обратиться в губком РКП с просьбой предоставить временно в распоряжение комиссии ЖКР 2 товарищей для ведения инструкторской работы по оказанию помощи погромленным.

6. Комиссии ЖКР докладывать губревкому о ходе работы через каждые 3 дня.

7. Поручить обследователям комиссии выяснить на местах количество лиц, желающих переселиться из пострадавших от погромов мест в другие места.

ДА Гомельскай вобл., ф. 428, воп. 2, ад. зах. 126, л. 267.

Загад 16-ай арміі з аб'яўленнем падзякі харчовым камітэтам, выканкамам і рэўкомам Гомельскай губерні за выкананне харчовай развёрсткі для патрэб Чырвонай арміі

23 снежня 1920 г.

За энергичную работу по выполнению разверстки продовольствия для нужд Красной Армии объявляется благодарность: Гомельскому губпродкому, упродкомам: Новозыбковскому, Почепскому, Гомельскому, Речицкому, Стародубскому, Суражскому, Мстиславскому, Рогачевскому, Быховскому, Чаусскому, Чериковскому, Климовичскому и Городецкому; соответствующим исполкомам, ревкомам, населению указанных уездов и волостей, а также всем сотрудникам упомянутых учреждений.

Газета «Красноармеец» № 467, 29 снежня 1920 г.

Іх імёны звязаны з рэвалюцыйнай Рэчыцай

ДЗЯМІДАЎ Якаў Ермалаевіч нарадзіўся ў 1891 г. у в. Слабада Дубраўскай воласці Парэцкага павета. Бацькі — малазямельныя сяляне. Вучыўся ў двухкласнай школе, што размяшчалася ў Дубраве. Пасля сканчэння яе паступіў у Парэцкую гарадскую школу. Аднак сродкаў у бацькоў для вучобы сына не было, і ён быў вымушаны паехаць у Маскву на заробкі. Тут працаваў вагонаважатым, потым — фурманам у памешчыка. На вайсковую службу патрапіў у Пецярбург, у лейбгвардыі драгунскі полк.

На фронце Я. Е. Дзямідаў мужна змагаўся за Айчыну, за што быў адзначаны трыма Георгіеўскімі крыжамі. У 1916 г. яго накіравалі ў афіцэрскую школу. Скончыўшы яе, Якаў Ермалаевіч атрымаў першы афіцэрскі чын і зноў быў адпраўлены ў дзеючую армію.

У 1917 г. Я. Е. Дзямідаў стаў бальшавіком; працаваў у Рэчыцы рэдактарам газеты «Известия» Рэчыцкага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, актыўна змагаўся за ўстанаўленне і ўмацаванне савецкай улады.

У пачатку 1918 г. ён вярнуўся на радзіму і адразу ж аказаўся ў гушчыні рэвалюцыйных падзей павета, дзе яшчэ дзейнічалі органы звергнутага ў сталіцы і буйных гарадах Часовага ўрада.

Прыбыўшы ў Парэчча, Якаў Ермалаевіч стаў на чале бальшавікоў павета, вёў энергічную работу па стварэнні і ўмацаванні партыйных ячэек.

У гэты час Я. Е. Дзямідаў шмат ездзіў па валасцях, растлумачваў палітыку савецкай улады, ствараў новыя партыйныя ячэйкі.

Усе гэта не магло не раззлаваць ворагаў новага жыцця.

Мяцежнікі падышлі да Парэчча і захапілі яго, схапілі і Дзямідава.

На допыце патрабавалі ад Дзямідава адрачэння ад бальшавіцкіх пераканняў, публічнага асуджэння палітыкі савецкай улады. Якаў Ермалаевіч у адказ заявіў, што лічыць для сябе зняважлівым выслухоўваць такія прапановы, і напісаў на бланку допыту: «Я, Дзямідаў, быў, ёсць і памру камуністам». Забіты ў верасні 1918 г.

Я. Е. Дзямідаў

Я. П. Міцкевіч

ЛЯСКАВЕЦ Сямён Дзмітрыевіч нарадзіўся ў 1893 г. у в. Заполле былой Мінскай губерні. У 1915 г. скончыў Мар'інагорскае сельскагаспадарчае вучылішча. Затым быў прызваны на службу ў царскую армію. У перыяд Кастрычніцкай рэвалюцыі прымаў актыўны ўдзел ва ўстанаўленні савецкай улады на тэрыторыі Рэчыцкага павета, а пазней — у абароне яе ад нямецкіх акупантаў.

Сямён Дзмітрыевіч быў дэлегатам III Усерасійскага з'езда Саветаў.

С. Д. Ляскавец — адзін з арганізатараў калгаснага руху. Памёр 6 мая 1968 г.

МІЦКЕВІЧ Яўген Пятровіч нарадзіўся 31 снежня 1893 г. у м. Клевань Ровенскай губерні, у сялянскай сям'і.

У 1915 г. быў прызваны ў царскую армію і накіраваны ў школу прапаршчыкаў. Далейшую службу працягваў у 257-ым стралковым палку.

У 1917 г. Міцкевіч выбіраецца членам камітэта 257-га палка, які ў гэты час пераводзіцца ў Рэчыцу, дэпутатам Рэчыцкага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У верасні 1917 г. уступае ў рады бальшавіцкай партыі.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Я. П. Міцкевіч прызначаецца камісарам юстыцыі Рэчыцкага Савета, а ў сакавіку 1919 г. выбіраецца старшынёй выканаўчага камітэта Рэчыцкага павятовага Савета.

У 1920 г. прымае актыўны ўдзел у баях з белапалякамі. Быў цяжка паранены. Пасля лячэння зноў прыязджае ў Рэчыцу. Працуе павятовым ваенным камісарам. Рэчычане выбралі Яўгена Пятровіча дэлегатам на X Усерасійскі з'езд Саветаў.

Я. П. Міцкевіч — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ён узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга (адзін — за ўдзел у грамадзянскай вайне), ордэнамі Айчыннай вайны 1-ай ступені і «Знак Пашаны», некалькімі медалямі.

Памёр у Маскве 19 лютага 1959 г.

КАСТЭНКА Аляксандр Сцяпанавіч нарадзіўся ў 1893 г. у с. Корсікі Смаленскай губерні. Тут пазнаёміўся з сацыял-дэмакратамі, іхняй праграмай.

У лістападзе 1912 г. уступіў у рады РСДРП.

У 1915 г. прызваны ў царскую армію. Браў удзел у баях, быў паранены. У маі 1916 г., пасля лячэння, яго накіравалі ў Бранск. Тут А. С. Кастэнка прыняў удзел у забастоўцы рабочых паравозабудаўнічага завода. І зноў арышт. Паўгода знаходзіўся

С. Д. Ляскавец

А. С. Кастэнка

пад следствам. Выйшаў з турмы і патрапіў у 257-ы пяхотны запасны полк. Па ініцыятыве Аляксандра Сцяпанавіча ў гэтым вайсковым падраздзяленні была створана бальшавіцкая арганізацыя.

Часовы ўрад накіроўвае полк на фронт, але бальшавікі прынялі рашэнне спыніцца ў Рэчыцы, што і было зроблена. Неўзабаве на арганізацыйным сходзе бальшавікоў Рэчыцы і 257-га палка А. С. Кастэнка быў абраны старшынёй падпольнага камітэта Рэчыцкай арганізацыі РСДРП(б). Пасля абвяшчэння ў Рэчыцы савецкай улады А. С. Кастэнка выбіраецца сакратаром выканкама Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Адначасова ўзначальвае камісарыят земляробства.

А. С. Кастэнка – актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны, дэлегат V Усерасійскага з'езда Саветаў.

Пасля грамадзянскай вайны Аляксандр Сцяпанавіч Кастэнка доўгі час працаваў у партыйных і дзяржаўных установах. Быў узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Дружбы народаў. З'яўляўся персанальным пенсіянерам саюзнага значэння, ганаровым грамадзянінам Рэчыцы і пасёлка Клетня Бранскай вобласці.

Памёр у 1989 г.

ХАЛАСЦЯКОЎ Георгій Мікітавіч нарадзіўся 20 ліпеня 1902 г. у г. Баранавічы Брэсцкай вобл. З рабочых. Беларус. Віцэ-адмірал (1945). Герой Савецкага Саюза (1965). Скончыў Вышэйшае ваенна-марское гідраграфічнае вучылішча (1925), спецыяльны клас падводнага плавання спецкурсаў камандната саставу (1928), курсы па тактыцы пры Ваенна-марской акадэміі (1932), Ваенную акадэмію Генштаба (1950). У 1918–1919 гг. працаваў у Рэчыцкім павятовым камітэце камсамола. У Чырвонай Арміі са жніўня 1919 г. У грамадзянскую вайну на Паўднёвым і Заходнім франтах – палітрук роты. З 1921 г. у ВМФ – чырвонафлоцец, штурман, старшы памочнік камандзіра падводнай лодкі, камандзір падводнай лодкі, дывізіёна, брыгады падводных лодак. У час Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. начальнік аддзела падводнага плавання штаба Чарнаморскага флота, камандзір Новарасійскай ваенна-марской базы, камандуючы Азоўскай і Дунайскай ваеннымі флатыліямі. Удзельнік абароны Крыма, Каўказа, Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Аўстрыі. З 1950 г. на камандных пасадах у ВМФ, у 1965–1969 гг. кансультант ВМФ пры Міністэрстве абароны СССР. Жыў у Маскве. Трагічна загінуў ад рукі бандыта-крымінальніка 21.7.1983 г. Ганаровы грамадзянін гарадоў Баранавічы, Геленджык, Браціслава.

Г. М. Халасцякоў

Камсамольцы былі ўперадзе

З успамінаў Пятра Піліпавіча Патэюка, члена КПСС з 1919 г., аднаго з арганізатараў камсамольскай арганізацыі Рэчыцы

...Ужо ў першыя дні лютаўскай (1917 г.) рэвалюцыі моладзь Рэчыцы прымала актыўны ўдзел у пошуку і абяззбройванні царскіх жандармаў, паліцэйскіх, іхніх паслугачоў. На шматлікіх мітынгах хлопцы і дзяўчаты заўсёды праціскаліся бліжэй да аратараў.

А восенню 1917 г. мы, маладыя, сталі і ўдзельнікамі сацыялістычнай рэвалюцыі: распаўсюджвалі бальшавіцкія лістоўкі і бюлетэні, змагаліся са спекулянтамі, іншымі ворагамі савецкай улады, ахоўвалі пошту і банк, амаль штодзённа патрулявалі па вуліцах Рэчыцы.

Неўзабаве атрымалі і сапраўднае баявое хрышчэнне. Адбылося тое, калі ў пачатку зімы 1918 г. да Рэчыцы накіраваліся з антысавецкімі намерамі белапольскія легіянеры корпуса Доўбар-Мусніцкага. Каб адбіць наступленне легіянераў, Рэчыцкі Савет тэрмінова сфарміраваў з салдат, рабочых і моладзі чырвонагвардзейскі атрад, які і адбіў спробу белапалякаў захапіць горад і выйсці да Дняпра.

Давялося нам змагацца і з немцамі.

Непадалёку ад Рэчыцы ў хваёвым бары размяшчаліся вялізныя артылерыйскія склады. Была патрэба зброю і боепрыпасы, што ляжалі на складах, вывезці ўглыб краіны, каб усё гэта не патрапіла да немцаў.

Па закліку партыйнай арганізацыі і Савета каля тысячы рэчычан выйшлі на пагрузку зброі. За некалькі дзён усё было складзена ў вагоны, і цягнікі ўзялі кірунак на ўсход.

Праўда, частка зброі была раздадзена насельніцтву горада. Немцы, вядома, ведалі аб тым і, захапіўшы Рэчыцу, неаднаразова прапаноўвалі жыхарам зброю здаць. Палохалі смяротнай карай. Але і гэта дзейнічала мала. Рэчычане зброю здавалі, ды толькі тую, каторая не была прыгоднай.

...У сакавіку 1918 г. кайзераўцы з баямі падышлі да Рэчыцы. Сустрэлі ўпартае супраціўленне з боку чырвонагвардзейскага атрада, пакінулі на полі бою нямала забітых. На жаль, сілы былі далёка не роўнымі: чырвонагвардзейцы адступілі за Днепр. Аднак барацьба з захопнікамі ў Рэчыцы на гэтым не скончылася. Так, ужо на другі ці трэці дзень пасля таго, як у горад увайшлі немцы, групе моладзі ўдалося праз пралом у сцяне расцягнуць нямецкі склад зброі і боепрыпасаў. Усё гэта мы захоўвалі ў лесе і па дамах. Словам, рыхтаваліся да ўзброенай барацьбы з акупантамі.

Летам 1918 г. успыхнулі народныя паўстанні супраць немцаў у Горвалі, Васілевічах і іншых населеных пунктах Рэчыцкага павета. На жаль, яны не прывялі, як планавалася, да ўсеагульнага паўстання на Палессі. Але ўсё ж вораг адчуў: лёгкага жыцця яму не будзе.

Тады ж, летам 1918 г., у памяшканні Рэчыцкай жаночай гімназіі быў наладжаны літаратурна-танцавальны вечар. На яго прыйшлі і нямецкія афіцэры з мясцовага гарнізона. У час танцаў яны паздымалі з сябе паясы з пісталетамі. І тады мы, група моладзі, адцягнулі ўвагу вартаўніка, забралі зброю і хуценька пакінулі памяшканне гімназіі.

Мы арганізавалі кааператыў навучэнцаў. Фармальна перад членамі кааператыва ставілася мэта аказваць хлопцам і дзяўчатам дапамогу ў набыцці кніг і пісьмовых прыналежнасцей. Гэта і рабілася. Разам з тым пад выглядам закупу кніг мы ўстанавілі сувязь з падполлем Гомеля, Мазыра, іншых гарадоў Беларусі.

Тады ж я перайшоў дэмаркацыйную лінію і патрапіў ва Унечу. Тут стаялі часці легендарнага Шчорса. Захапіўшы мноства савецкіх газет і брашур, я вярнуўся назад у Рэчыцу. Прынесеная мной літаратура пераходзіла потым з рук у рукі.

Пасля лістападаўскай (1918) рэвалюцыі ў Германіі і пад уплывам бальшавіцкай агітацыі сярод нямецкіх салдат, што размяшчаліся ў Рэчыцы, пачалося бражэнне. На базарнай плошчы праходзілі мітынгі, прыходзілі на іх і нямецкія салдаты: слухалі, а то і выступалі самі.

У снежні 1918 г. у Рэчыцу прыбыла група бальшавікоў, сярод якіх былі Кастэнка, Міцкевіч, Жыляк, Аляксандраў, Бурцаў і г. д. З'яўленне ў горадзе гэтых таварышаў дало новы імпульс барацьбе рэчычан супраць акупантаў.

У канцы таго ж 1918 г. у Рэчыцу ўступіў атрад Чырвонай Арміі, зноў распачаў сваю работу рэўком.

Варта зазначыць, што ў першыя месяцы 1919 г. пярвічных партыйных арганізацый у горадзе не было, а павятовая арганізацыя налічвала ў сваіх радах недзе 25—30 бальшавікоў. Камуністы мелі ў горадзе грунтоўны аўтарытэт.

Цяжкае выпрабаванне выпала на нашу долю ў сакавіку 1919 г.: успыхнуў мяцеж супраць савецкай улады, на чале якога стаў былы царскі афіцэр Стракапытаў. Мяцежнікі рушылі праз Калінкавічы на Гомель. На барацьбу з імі была мабілізавана ўся партыйная арганізацыя Рэчыцы. Камуністы, якія былі здольны насіць зброю, перайшлі на казарменнае становішча.

Два дні атрад камунараў (каля 30 чалавек), які ўзначальваў старшыня рэўкома Я. П. Міцкевіч, трымаў горад у сваіх руках. І толькі на трэці дзень, раніцай, калі на станцыю прыбылі значныя сілы стракапытаўцаў, а мясцовая каравульная рота ў колькасці амаль 150 чалавек, якую падбухторылі царскія афіцэры Вольскі, Берзін, Мяцельскі і іншыя, перайшла на бок контррэвалюцыянераў і пачала акружаць памяшканне павятовага камітэта партыі, каб знішчыць камунараў, мы з боем адступілі. Асабіста я хваляваўся не столькі за ўласнае жыццё, як за пячатку павятовага партыйнага камітэта і папкі з паперамі, якія мне даручана было вынесці з Рэчыцы.

Пад Горвалем натрапілі на стракапытаўскую засаду. Аднак пры перастрэлцы ніхто з нашай групы не пацярпеў, і мы лесам

П. П. Патэюк

дабраліся да чыгуначнай лініі Жлобін — Калінкавічы. Група ж Міцкевіча перайшла па лёдзе Днепр у раёне Азершчыны.

Неўзабаве мяцеж быў падаўлены. Свой уклад унеслі ў гэтыю справу і рэчычане. Каторыя з іх загінулі. Гэта Казоўскі, Казак, Куперман, Палей, Хаздан і г. д. Яны пахаваны ў брацкай магіле.

...У кастрычніку 1918 г. у Маскве адбыўся першы з'езд рэвалюцыйнай моладзі, на якім і быў утвораны Расійскі Камуністычны Саюз Моладзі (РКСМ). А вось у Рэчыцы камсамольская арганізацыя створана ў красавіку 1919 г.

Павятовы камітэт РКП(б) даручыў мне, самаму маладому камуністу, падабраць групу моладзі і арганізацыйна аформіць камсамольскую арганізацыю. У такую групу апроч мяне ўвайшлі Дворнікаў, Рапапорт, Мурашка, Зубрыцкі, Козел, Пацеенка, Гінзбург, Малікіна і іншыя. Найперш мы падрыхтавалі і аддрукавалі зварот да моладзі, у якім растлумачвалі мэты і задачы камсамола, запрашалі хлопцаў і дзяўчат на арганізацыйны сход. Ён прайшоў у памяшканні тэатра 28 мая 1919 г. На сходзе выступілі старшыня бюро павятовага камітэта РКП(б), іншыя таварышы. Потым, пасля дэталёвага абмеркавання, у камсамол былі прыняты каля 20 чалавек. Яны і абралі свой першы камітэт. Апроч мяне ў камітэт увайшлі Дворнікаў, Рапапорт і яшчэ два таварышы.

Былі абраны таксама дэлегаты на губернскі з'езд камсамола, які адбыўся ў Гомелі 2—4 чэрвеня таго ж 1919 г. На з'езд ад рэчыцкай камсамоліі ездзілі я і Дворнікаў.

Мы, камсамольцы, атрымалі для работы памяшканне з чатырох пакояў.

Чым жа займаліся мы? Спраў было многа. Апроч асноўнай работы на прадпрыемстве, кожны з нас патруляваў па вуліцах горада, змагаўся са злачынцамі, праходзіў абучэнне ў часцях асобага прызначэння (ЧОН). Члены ж камітэта камсамола рэгулярна наведвалі населеныя пункты павета, стваралі там пярвічныя камсамольскія арганізацыі.

Недзе ў пачатку лета 1919 г. павятовы камітэт партыі накіраваў мяне для работы ў павятовую надзвычайную камісію па барацьбе з контррэвалюцыяй, сабатажам. Давялося змагацца не толькі са звычайнымі бандытамі, а і белапалякамі, бандыцкімі фарміраваннямі Галака і Струка.

Восенню 1919 г. вялізную небяспеку для савецкай краіны ўяўляў дзянікінскі фронт. Партыя кінула заклік: «Усе на барацьбу з Дзянікіным!». І тады рэчыцкая партыйная і камсамольская арганізацыі паслалі на фронт сваіх прадстаўнікоў. Я патрапіў у Нова-Беліцу, дзе фарміраваўся 3-і Савецкі полк. Камандзірам яго быў прызначаны Я. П. Міцкевіч, начальнікам штаба — былы камендант Рэчыцы т. Мацко. Я з Дворнікавым увайшлі ў кулямётную каманду. Разам з палком, які быў перайменаваны потым у 417-ы полк 57-ай дывізіі 12-ай арміі, мы, пасланцы Рэчыцы, прымалі ўдзел у баях пад Жытомірам, Кіевам, Растовам, а затым і на фронце з белапалякамі пад Оўручам, Корастынем, Мазыром.

У пачатку 1920 г. я захварэў сыпным тыфам. Калі ачуняў, то зноў вярнуўся ў Рэчыцу, зноў стаў чэкістам...

«Я не магу спыніцца...»

У жніўні 1917 г. старшынёй новага, цяпер ужо бальшавіцкага, Савета быў абраны Мікалай Дарафеевіч Шчарбітаў. У гэты час ён з'яўляўся старшынёй палкавога камітэта.

З чаго пачаў новы старшыня Рэчыцкага Савета? У горадзе быў уведзены строгі кантроль за дзейнасцю дзяржаўных устаноў, і ў першую чаргу такіх, як пошта, тэлеграф, банкі.

Мікалай Дарафеевіч разумеў, якую сілу мае друкаванае слова. Таму менавіта па ягонай ініцыятыве ў Рэчыцы пачала выходзіць газета «Известия Речицкого Совета», якую рэдагаваў бальшавік Я. Е. Дзямідаў.

Мікалай Дарафеевіч — адзін з кіраў-

М. Д. Шчарбітаў

нікоў па разгрому карнілаўшчыны. Мяцежнікі высадзіліся ў Рэчыцы, разлічвалі, што не сустрэнуць тут аніякага супраціўлення. Але памыліліся. Былі вымушаны спехам садзіцца ў вагоны ды бегчы з горада. І менавіта тады, у небяспечны для рэвалюцыі і бальшавіцкай партыі час, М. Д. Шчарбітаў прыняў цвёрдае рашэнне жыццё сваё звязаць з бальшавікамі.

Чуткі аб перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе хутка дакаціліся і да павятовага горада Рэчыцы. Мясцовы Савет, на чале якога быў Шчарбітаў, без разваг узяў у свае рукі ўсю паўнату ўлады.

Мікалай Дарафеевіч, поўны энергіі і жадання, шмат рабіў па аднаўленню Рэчыцы і павета, якія прыйшлі ў заняпад за гады імперыялістычнай вайны. Але жыццё прадыктавала іншае. Давялося займацца арганізацыяй барацьбы супраць кайзераўцаў і белапалякаў.

Вялізная падзея ў жыцці М. Д. Шчарбітава — выбранне яго ад Мінскага губернскага з'езда Саветаў дэлегатам на III Усерасійскі з'езд Саветаў, які адбыўся ў студзені 1918 г.

Вярнуўшыся ў Рэчыцу, з падвоеннай энергіяй узяўся за наладжванне новага жыцця. Яго амаль немагчыма было заспець у службовым кабінеце, бо як не штодня Мікалай Дарафеевіч сустракаўся з рабочымі мясцовых прадпрыемстваў, сялянамі павета.

У 1919 г. М. Д. Шчарбітава выбралі ў састаў Гомельскага губернскага выканаўчага камітэта і губкома партыі. А гэта азначала, што яму вераць, яму давяраюць, на яго спадзяюцца. Так яно і было. І Шчарбітаў ніколі не схібіў, не збаяўся, не палічыў неабходным шукаць лягчэйшага.

Прыйшоў дзень, калі Мікалай Дарафеевіч развітаўся з таварышамі па партыі, выехаў на паўднёвы фронт. Там ён быў прызначаны камісарам 52-ой стралковай дывізіі, абраны членам Ваенна-Рэвалюцыйнага Савета фронту, палымяным словам натхняў чырвонаармейцаў на барацьбу з ворагам. Камісар М. Д. Шчарбітаў і ў час бою быў ўперадзе байцоў. Пры штурме Перакопа белагвардзейская куля прабіла ягоныя партыйны білет і сэрца...

У свой час Мікалай Дарафеевіч Шчарбітаў падараваў на памяць сваю фотакартку А. С. Кастэнку, першаму старшыні Рэчыцкай арганізацыі РСДРП(б). На адваротным баку фотакарткі такія словы:

И я иду. Пусть буря
злится.
Пусть ждут лишенья впереди.
Я не могу
остановиться
На полупройденном
пути!

І гэта не проста ягоныя прыгожыя словы. У іх змест кароткага і яркага жыцця Мікалая Дарафеевіча Шчарбітава, чалавека, дзейнасць якога ўяўляе хвалюючую гісторыю Рэчыцкай зямлі.

П. П. Рабянок

Удзельнікі Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны

АЗЕРШЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЗЕРШЧЫНА

БРАЗДЗЕЦКІ Арсень Цярэнцьевіч, н. у 1897.

ВЕРАБЕЙ Фёдар Цімафеевіч, н. у 1895, рад. 15 пантоннага б-на.

ДВОРНІК Фёдар Пятровіч, н. у 1896, рад. 174 сп.

ЛАЗАРЭВІЧ Дзяменцій Уладзіміравіч, н. у 1895, тэлефаніст 280 сп.

ЛАПАТА Фёдар Іванавіч, н. у 1895. З 1916 па 1918 — рад. І Прыбалтыйскага палка, з 1919 па 1921 — баец Гомельскага атрада ЧОН.

ЛАПАТА Яўстафій Гардзеевіч, н. у 1896, рад. 193 Свіяжскага сп.

ЛАПАЦІН Емяльян Панцеляймонавіч, н. у 1895.

ЛАПШАК Гаўрыла Філімонавіч, н. у 1896.

СЯРАК Андрэй Радзівонавіч, н. у 1895, рад. 273 Багадухаўскага пп.

ЯНКОВІЧ Фёдар Мікітавіч.

ПАСЁЛАК ГАРАДОК

МАРКАВЕЦ Іван Ціханавіч, н. у 1895, чырвонагвардзеец 10 кавалерыйскага палка.

ПАСЁЛАК РУДНЯ

ВАРОНА Аляксей Міхайлавіч, н. у 1896. З 1918 па 1921 — рад. 63 кавалерыйскага палка 1 Коннай арміі.

ЧЫЖЫК Савелій Сямёнавіч, н. у 1895, рад. 280 пп.

ВЁСКА УНОРЫЦА

БАС Апанас Мітрафанавіч, н. у 1895, рад. 2 Сафійскага сп.

ДВОРНІКАЎ Васіль Аляксандравіч, н. у 1895, чырвонагвардзеец 3 Эстляндскага Камуністычнага палка.

СЕВЯРЫНЕЦ Іван Мікалаевіч, н. у 1895, рад. 2 Сафійскага пп.

СЕВЯРЫНЕЦ Пётр Рыгоравіч, н. у 1895.

АРТУКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯТХІНЬ

КАВАЛЕЎСКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1896, кавалерыст, разведчык.

ВЁСКА КРАСНАПОЛЛЕ

ПІСАРЭНКА Сцяпан Андрэевіч, н. у 1895, баец 2 кавалерыйскага корпуса.

ШУРПО Андрэй Лукіч, н. у 1896. З 1918 па 1920 — баец 2 запаснога сп.

ПАСЁЛАК КРУЖОК

КАЖАДУБ Гаўрыла Лявонавіч, н. у 1892.

ВЁСКА ЦЕРАБЕЕЎКА

МАРЧАНКА Сямён Нічыпаравіч, н. у 1896, чырвонагвардзеец 23 Нізовіцкага сп.

СТАРЫКАЎ Дзмітрый Кандратавіч, н. у 1895. З 1918 па 1921 — баец 5 сп.

БАБІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАБІЧЫ

АСТАПЕНКА Марк Трафімавіч. Удзельнік І сусветнай вайны, затым — чырвонагвардзеец. Прымаў актыўны ўдзел у ахове эшалонаў з хлебам для Петраграда і Масквы. Ваяваў на франтах грамадзянскай вайны да 1922. Адзін з першых калгаснікаў арцелі «Чырвоны Шлях».

ГОРАЎ Цімафей Васільевіч.

ЖУРАНОК Якаў Фёдаравіч, н. у 1898.

КОЦУР Максім Іванавіч, н. у 1892. З 1916 па 1917 — рад. 35 пп., які дыслацыраваўся ў г. Вязьма. З 1917 па 1920 — баец 305 запаснога сп. З 1920 па 1922 — баец каравульнай роты ў Рэчыцы. У час Вялікай Айчыннай вайны — партызан.

М. Т. Астапенка

Ц. В. Гораў

С. В. Пятроўскі

М. А. Філіпаў

ПЯТРОЎСКІ Станіслаў Вікенцьевіч, вадзіцель браневіка.

ТАБУЛІН Іосіф Аляксеевіч. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Працаваў настаўнікам, завучам Бабіцкай СШ. Быў узнагароджаны ордэнамі Леніна і «Знак Пашаны».

ФІЛІПАЎ Мікалай Арцёмавіч, н. у 1894.

У 1915 быў прызваны на службу ў царскую армію. Служыў у кавалерыі. Скончыў школу палкавой разведкі. Прымаў актыўны ўдзел у баявых дзеяннях. Быў некалькі разоў паранены. За мужнасць атрымаў узнагароду — Георгіеўскі крыж. У час Кастрычніцкай рэвалюцыі знаходзіўся ў Рэвелі (Талін). Перайшоў на бок бальшавікоў. У час грамадзянкай вайны служыў у кавалерыі, прымаў удзел у разгроме вайсковых фарміраванняў Булак-Балаховіча. З Чырвонай Ар-

А. М. Шапашнікаў

мii дэмабілізаваўся ў 1922. У 1930 абраны землякамі членам выканкама сельсавета. Адзін з арганізатараў калгаса, які 7 гадоў узначальваў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Вайну скончыў ва Усходняй Прусіі. Узнагароджаны некалькімі медалямі. Сярод якіх — «За адвагу», «За баявыя заслугі». У пасляваенны перыяд працаваў у Бабіцкім лясніцтве. Памёр у 1984.

ШАПАШНІКАЎ Арсень Міхайлавіч. У 1917 служыў у Маскве. У 1920 прымаў актыўны ўдзел у вызваленні Беларусі ад белапалякаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Абараняў Маскву, вызваляў Прыбалтыку. Быў дэмабілізаваны з арміі ў кастрычніку 1945 у званні старшага лейтэнанта. Узнагароджаны некалькімі ордэнамі і медалямі. Пасля вайны працаваў бухгалтарам у арцелі «Рассвет».

ВЁСКА ГАЛОЎКІ

БРЭЛЬ Іван Якаўлевіч, н. у 1899. З кастрычніка 1919 па кастрычнік 1921 — баец асобнага каравульнага б-на. У час Вялікай Айчыннай вайны — рад. 307 запаснога сп.

ГАЛОЎКА Андрэй Іосіфавіч, н. у 1899. З кастрычніка 1918 па кастрычнік 1921 — баец сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЖУРА (ЖУРО) Іван Іванавіч, н. у 1899. З мая 1920 па ліпень 1922 у Чырвонай Арміі. Прымаў актыўны ўдзел у вызваленні Беларусі ад белапалякаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

БАРШЧОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЯКСАНДРАЎКА

ЛЫСЕНКА Аляксандр Васільевіч, н. у 1892.

ВЁСКА БАРШЧОЎКА

КАВАЛЁЎ Іван Сцяпанавіч, н. у 1896. З 1918 па 1920 — баец Ленінскага сп. У час Вялікай Айчыннай вайны — рад. 156 сп., а затым 76 асобнага стралковага б-на.

КОЛЫБАЎ (КАРЭБА) Аляксей Цімафеевіч, н. у 1885. На царскай службе з 1915. З 1918 па 1921 — баец 1 марскога палка. Прымаў актыўны ўдзел у баях супраць калчакаўцаў. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памёр у 1974.

РАМАНАЎ Андрэй Пятровіч, н. у 1899. З 4.3.1918 па 12.11. 1922 — баец 388 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

САЎЧАНКА Іван Нічыпаравіч, н. у 1895, чырвонаармеец 115 сп.

ШАЎЧЭНКА Іван Лукашавіч.

ЯНКОЎ Кузьма Гаўрылавіч, н. у 1895.

ВЁСКА БОРХАЎ

АНЦІПЕНКА Дзмітрый Апанасавіч, н. у 1895.

ВЁСКА ВОСТРАЎ

КАВАЛЁЎ Пётр Яфімавіч, н. у 1899.

ВЁСКА ГРАНАЎКА (БАРАВАЯ)

ДУБРОЎСКІ Пётр Карпавіч, н. у 1900.

ВЁСКА КАПАНЬ

ПУГАЧОЎ Васіль Гаўрылавіч, н. у 1892. Змагаўся з кайзераўцамі ў Багунскім палку М. А. Шчорса. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

...Салдат першай сусветнай вайны, удзельнік Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі В. Г. Пугачоў быў адным з тых, каго ў пачатку восені 1918 г. накіравалі пад Унечу, дзе Мікалай Шчорс толькі-толькі прыступіў да фарміравання Багунскага палка. А неўзабаве багунцы ўступілі ў свой першы бой. Выбілі немцаў з Клінцоў, з Навазыбкава і Сноўска.

Прымаў удзел у баях супраць кайзераўцаў і пятлюраўцаў пад Чарнігавам, Кіевам і іншымі гарадамі. У саставе 44 сд В. Г. Пугачоў браў удзел у разгроме белапалякаў.

ПУГАЧОЎ Іван Гаўрылавіч, н. у 1897. Змагаўся з кайзераўцамі ў вайсковым фарміраванні М. А. Шчорса. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

БЕЛАБАЛОЦІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГЛУШЭЦ

ЗОЦІКАЎ Антон Андрэевіч, н. у 1896.

ВЁСКА ЧОРНАЕ

АНЦІПАЎ Восіп Фёдаравіч, н. у 1895. З 1919 па 1921 — чырвонаармеец 257 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Рад., сапёр 144 мотастралковага б-на 1 Беларускага фронту.

ВАСІЛЬКОЎ Аляксандр Макаравіч, н. у 1892.

ГУЗАЎ Лука Іванавіч,

МАНОЙЛІН М. Прымаў актыўны ўдзел у баях з кайзераўцамі і пятлюраўцамі.

ФАМІН Міхаіл Цімафеевіч, н. у 1896, чырвонаармеец 16 Сібірскага сп.

ХАЛЕЦКІ Рыгор Арцёмавіч, н. у 1896. З 1919 па 1923 — чырвонаармеец 151 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ВАСІЛЕВІЦКІ ГОРСАВЕТ

ГОРАД ВАСІЛЕВІЧЫ

БРЭЛЬ Адам Сяргеевіч, н. у 1896.

БРЭЛЬ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1898. З лютага 1918 па май 1921 — чырвонаармеец 119 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ДЗЕЙКУН Іван Львовіч, н. у 1902 ці 1903.

ДЗЕЙКУН Максім Сямёнавіч, н. у 1898. З 18.5.1918 па снежань 1922 — чырвонаармеец 155 асобнага б-на войскаў ВЧК. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

КУЧЫНСКІ Глеб Іванавіч, н. у 1899. У Чырвоную Армію прызваны 6.10.1918. З кастрычніка 1918 па кастрычнік 1922 — качагар баявога карабля Дняпроўскай флатыліі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 561 сп.

НОВІКАЎ Міхаіл Піліпавіч, н. у 1890.

ПЯШКОЎ Іван Фёдаравіч, н. у 1886.

ШУЛЬГА Ілья Антонавіч, н. у 1898. З лістапада 1917 па студзень 1919 — чырвонагвардзеец.

ЯШЧЫН Хайм Залманавіч, н. у 1899, чырвонагвардзеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны перыяд узначальваў васілевіцкі калгас імя Сталіна.

ВЁСКА МАКАНАВІЧЫ

КУЗМЕНКА Антон Аляксеевіч, н. у 1898. З кастрычніка 1918 па кастрычнік 1920 — чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 218 запаснога сп.

ВЫШАМІРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЫШАМІР

КРОТАЎ Іосіф Пятровіч, н. у 1899.

ВЁСКА ГАНЧАРОЎКА

МАЛАШАНКА Ягор Ягоравіч, н. у 1896. З 1918 па 1921 — чырвонаармеец 4 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ГЛЫБАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЕРАГАВАЯ СЛАБАДА

БАБІЧ Міхаіл Пятровіч, н. у 1900. З мая 1918 па лістапад 1923 — чырвонаармеец 62 кавалерыйскага палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КАВАЛЬЧУК Мікалай Лаўрэнцьевіч, н. у 1895, чырвонаармеец 284 Мсціслаўскага пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ШЫХАВЕЦ Васіль Антонавіч, н. у 1895. У Чырвонай Арміі з 1918 па 1920. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ШЫХАВЕЦ Ілья Захаравіч, н. у 1900. З 1920 па 1922 — чырвонаармеец 39 асобнага б-на войскаў ВЧК. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 479 сп. 1 Беларускага фронту.

ВЁСКА ВАЛАДАРСК (ГАВЕНАВІЧЫ)

КАСТРАМА Васіль Сцяпанавіч, н. у 1895, чырвонаармеец І Ахтырскага пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

РАГОЎСКІ Раман Іванавіч, н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ВЁСКА ГОРВАЛЬ

КАСТРАМА Дзяніс Лаўрэнавіч, н. у 1895, чырвонаармеец, разведчык-коннік 107 пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЛАХОНЬКА Андрэй Сямёнавіч, н. у 1896. З красавіка 1918 па кастрычнік 1922 — чырвонаармеец 1 артылерыйскага дывізіёна цяжкіх гармат. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1943 — рад. 128 лінейнай роты сувязі войскаў НКУС, затым начальнік паста 258 асобнага б-на ўрадавай сувязі 2 Беларускага фронту.

ЛАХОНЬКА Уладзімір Антонавіч, н. у 1895. З 1918 па 1922 — чырвонаармеец 67 пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 42 артылерыйскага гаўбічнага палка на Цэнтральным і 2 Беларускім франтах. Адзначаны некалькімі баявымі ўзнагародамі.

ШКУРЫН Васіль Майсеевіч, н. у 1896. З 1919 па 1921 — чырвонаармеец артылерыйскага дывізіёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 680 сп.

ШЫЛЯНОК Васіль Іванавіч, н. у 1904. У час грамадзянскай вайны — палітрук кавалерыйскага эскадрона. У 1937 быў абвінавачаны як удзельнік шпіёнска-дыверсійнай арганізацыі. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 11.12.1937 прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1957.

ШЫЛЯНОК Іван Сцяпанавіч, н. у 1896. У 1917 — матарыст 2 Каўказскага корпуса, з 1917 па 1922 — машыніст бронепоезда «Чырвоны ўраган».

ШЫЛЯНОК Пётр Емяльянавіч, н. у 1894. У час грамадзянскай вайны — камісар атрада. У 1938 быў абвінавачаны ў шпіёнскай дзейнасці. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 12.4.1938 прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1958.

ВЁСКА МАСКАЛІ

ДВОРНІК Мікалай Аляксандравіч, н. у 1901, чырвонаармеец артылерыйскага дывізіёна асобага прызначэння. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 314 сп. 170 Рэчыцкай сд.

ВЁСКА СТАСЕЎКА

ДАЎГАЛАПЦЭЎ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1895.

ДАЎГАЛАПЦЭЎ Васіль Макаравіч, н. у 1902.

КОЦУР Уладзімір Адамавіч, н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 531 б-на аэрадромнага абслугоўвання.

ДЗЕМЯХОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БУДКА ШЫБЕНКА

ВЕРАБЕЙ Міхаіл Іванавіч, н. у 1895. З 1918 па 1922 — чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 88 зенітна-артылерыйскага палка.

ВЁСКА ДЗЕМЯХІ

ДЗЕНІСЕНКА Піліп Нічыпаравіч, н. у 1894, чырвонаармеец 8 артылерыйскай брыгады.

ЗАБІРАН Васіль Мікалаевіч, н. у 1896. З кастрычніка 1918 па люты 1920 — чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ПАЧКОЎСКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1895.

ПІНЧУК Андрэй Харытонавіч, н. у 1895, чырвонаармеец 93 Іркуцкага пп.

СУПЕЙ Андрэй Іванавіч, н. у 1894, чырвонаармеец 7 ап.

ВЁСКА ДЗЯРАЖНЯ

ВАРАБ'ЁЎ Аляксей Аляксеевіч, н. у 1900. З 17.8.1917 па чэрвень 1920 — чырвонаармеец, памочнік камандзіра ўзвода.

КАЗЛОЎСКІ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1896. З 1918 па 1920 — чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 602 сп.

КАПАНСКІ Сцяпан Васільевіч, н. у 1895, чырвонаармеец 143 Дарабугскага пп.

ВЁСКА КОЗЗЕ

МЕЛЬНІКАЎ Мікалай Трафімавіч, н. у 1895, чырвонаармеец 135 Ліхвінскага пп.

ШЫНГІРЭЙ Іван Ануфрыевіч, н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1941 па 1945 — рад. 174 сп. Узнагароджаны медалямі «За адвагу» і «За баявыя заслугі».

ВЁСКА САЛТАНОВА

ГУРЧАНКА Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1893, чырвонаармеец 29 Зайскага пп і Украінскага сп.

МАШЭЎСКІ Міхаіл Парфіравіч, н. у 1893. З 1919 па чэрвень 1921 — чырвонаармеец 145 пп.

ТОЛКАЧ Павел Макаравіч, н. у 1897.

ВЁСКА СТАРА-КРАСНАЕ

ТКАЧ Аляксандр Вікенцьевіч, н. у 1895.

ШЫНГІРЭЙ Ігнат Цімафеевіч, н. у 1895. Да красавіка 1918 — чырвонаармеец 518 пп.

ДУБРОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БУШАЎКА

СКАВАРОДНІК Трафім Мікітавіч, н. у 1896, чырвонаармеец.

ВЁСКА ВАСІЛЬКОЎ

Усе ўдзельнікі грамадзянскай вайны з в. Васількова ў 1918 бралі актыўны ўдзел у разгроме гарнізона кайзераўцаў у м. Горваль. Захапілі там зброю. Добраахвотна ўступілі ў рады Чырвонай Арміі, *змагаліся супраць дзянікінцаў.*

БАТУРА Савелій Малахавіч, н. у 1896.

БЕЛЫ Пракоп Цімафеевіч, н. у 1895. Загінуў у 1918.

ГУЗ Адам Антонавіч, н. у 1897. Загінуў у 1918.

ГУЗ Васіль Нічыпаравіч, н. у 1895. Загінуў у 1918.

ГУЗ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1895. Загінуў у 1918.

ГУЗ Іосіф Васільевіч, н. у 1896. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ГУЗ Ісак Паўлавіч, н. у 1896. Загінуў у 1918.

ГУЗ Сямён Паўлавіч, н. у 1898. Загінуў у 1918.

ГУЗ Фёдар Мінавіч, н. у 1896. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ГУЗ Якаў Паўлавіч, н. у 1895.

ЗАКРУЖНЫ Адам Піліпавіч, н. у 1896. Загінуў у 1918.

СМАЛЯН Васіль Андрэевіч, н. у 1895. Загінуў у 1918.

ВЁСКА ДУБРОВА

ФЕШЧАНКА Савелій Захаравіч, н. у 1897.

ЧЫРЫК Улас Максімавіч, н. у 1897.

ВЁСКА ЗАХОДЫ

ВОЛКАЎ Герасім Цярэнцьевіч, н. у 1895, чырвонаармеец 26 кавалерыйскага палка 17 кавалерыйскай дывізіі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ДЗЕМІДЗЕНКА Антон Лявонавіч, н. у 1889, чырвонаармеец.

ДЗЕМІДЗЕНКА Дзмітрый Пархомавіч, н. у 1889, чырвонаармеец 1 Коннай арміі.

ЗАКРУЖНЫ Адам Аляксеевіч, н. у 1882, чырвонаармеец.

ВЁСКА ОСАЎ

ДРАБЫШЭЎСКІ Пятро Рыгоравіч, н. у 1882, чырвонаармеец 1 Коннай арміі.

КЛЕШЧАНКА Іван Калінавіч, н. у 1894, чырвонаармеец 1 Коннай арміі.

ПАПУША Адам Дзмітрыевіч, н. у 1893, чырвонаармеец. Адзін з арганізатараў у Рэчыцкім р-не калгасаў.

ВЁСКА РУДЗЕЦ

ГУСАКОЎ Лявон Фёдаравіч, н. у 1890—1893(?). Памёр у 1964.

ДЗЕМІДЗЕНКА Якаў Лявонавіч, н. у 1882, чырвонаармеец 1 Коннай арміі.

СОМАЎ Ілья Пятровіч, н. у 1893. Загінуў у час грамадзянскай вайны.

ЖМУРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БРОННАЕ

БАЖЭНКА Нічыпар Якаўлевіч, н. у 1896.

ДАВЫДЗЕНКА Астап, чырвоны партызан.

ДАВЫДЗЕНКА Дзяніс Дзмітрыевіч, н. у 1896. З 1919 па 1921 — чырвонаармеец 5 Ленінскага сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ГАПОНЕНКА К.

З успамінаў К. Гапоненкі

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. заспела мяне ў Карпатах, на аўстра-венгерскім фронце. У гэты час у дзеючай арміі буяла незадавальненне салдат вайной. Кожны дзень гінулі ці калечыліся людзі. Усё часцей і часцей мы, салдаты, задавалі сабе пытанні: «Калі ж канец вайне? Што, апроч умацавання царызму, можа прынесці нам перамога? Чаму павінны мы класці галовы за тых, хто распачаў вайну?..» Словам, нашым «чаму» не было, здаецца, канца.

Неўзабаве дывізія, дзе я служыў, была перакінута пад горад Сугава. А тут і Вялікі Кастрычнік. Каторых найбольш рэакцыйных афіцэраў мы, салдаты, арыштавалі, а іншыя разбегліся самі. Быў сфарміраваны новы штаб.

У хуткім часе дывізія знялася з баявых пазіцый і пачала адступленне на радзіму. На Украіне ўжо знаходзіліся немцы, ім дапамагалі гайдамакі. Наш полк быў немцамі акружаны і абязброены. Я вырашыў дабірацца да родных мясцін, у вёску Броннае.

Дамоў вярнуўся 18 красавіка 1918 г. Даведаўся: у Бронным дзейнічае падпольная бальшавіцкая арганізацыя, члены якой арганізоўваюць народныя масы на барацьбу супраць нямецкіх акупантаў. Назаўтра я размаўляў з Астапам Давыдзенкам, які і стаяў на чале падпольнай арганізацыі. Давыдзенка прапанаваў мне ўступіць у першы Дняпроўскі партызанскі атрад. Я даў згоду і пакляўся, што буду добрасумленна выконваць даручаныя мне заданні.

Мы, партызаны, адшуквалі і распаўсюджвалі сярод насельніцтва бальшавіцкую літаратуру, пісалі лістоўкі да нямецкіх салдат.

Насельніцтва Рэчыцкага павета не плаціла акупантам падаткі, перашкаджала вывозіць нарабаванае дабро. Чыгуначнікі нярэдка зрывалі работу транспарту.

Восенню наш партызанскі атрад уяўляў сабой грозную баявую адзінку. Пачалі рыхтавацца да разгрому гарнізона кайзераўцаў, што стаяў у Рэчыцы. Але з Гомеля ад надзейных людзей атрымалі паведамленне: з выступленнем трэба пачакаць. Праз некалькі дзён адтуль, з Гомеля, да нас прыехаў прадстаўнік бальшавіцкай арганізацыі горада Міцкевіч. Разам з ім ва ўрочышчы Глушакі мы правялі нараду, на якой было вырашана разграміць варожы гарнізон у вёсцы Горваль.

Баявая аперацыя была даручана кіраўніку Горвальскай падпольнай групы Сіліну. Ён удала справіўся са сваім заданнем. У баі былі забіты 18 нямецкіх салдат і кіраўнік маёнтка. А вось страт з боку атрада не было.

Актывізацыя партызанскага руху на тэрыторыі павета прымусіла немцаў узмацніць ахову Рэчыцы. Але, нягледзячы на тое, кіраўніцтва нашай падпольнай арганізацыі прыняло рашэнне перабрацца ў Рэчыцу. Асноўнай явачнай кватэрай стаў дом Палея па вуліцы Успенскай (цяпер Савецкая).

Работа, якую мы праводзілі сярод насельніцтва і салдат нямецкага гарнізона, дала адчувальныя вынікі. Так, сярод салдат упала дысцыпліна. Яны прадавалі зброю, боепрыпасы.

У лютым 1919 г. кайзераўцы пакінулі Рэчыцу. У горад уступіла рота Чырвонай Арміі на чале з Ляскаўцом.

Такім чынам, савецкая ўлада была адноўлена. Пачалося будаўніцтва мірнага жыцця. Астап Давыдзенка, які з'яўляўся маім баявым паплечнікам і настаўнікам, атрымаў прызначэнне на загадчыка Заспенскага зямельнага аддзела.

А потым... потым быў стракапытаўскі мяцеж. Многія савецкія работнікі былі арыштаваны. Такі ж лёс напаткаў мяне і Астапа Давыдзенку. Пасля працяглых допытаў і здзекаў мяне адпусцілі пад паручыцельства мясцовага паляка Міхалеўскага. А вось з Астапам было горш. Яго судзіў ваенна-палявы суд, на якім за старшыню быў генерал Грабскі. І вось прыгавор суда: пакаранне смерцю праз павешанне. Але здарыўся цуд. Калі Давыдзенку канваіравалі ў Рэчыцу, то яму ўдалося ўцячы. Астап пераплыў праз Дняпро. А там стаялі часці Чырвонай Арміі.

ГАПОНЕНКА Нічыпар Іванавіч, н. у 1896, чырвонаармеец 151 пп 17 пд.

ЛОХМАН Ціхан Сідаравіч, н. у 1895, чырвонаармеец 512 Медынскага пп.

ПІНЧУК Прохар Мацвеевіч, н. у 1895.

Н. І. Гапоненка

ВЁСКА ВОЎЧАЯ ГАРА

СТРЭЛЬЧАНКА Павел Андрэевіч, н. у 1895.

ВЁСКА КАЗАЗАЕЎКА

ГАТЧАНКА Андрэй Мацвеевіч, н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КАЦУРА Васіль Савельевіч, н. у 1896. З 1917 па 1919 — чырвонаармеец 75 пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ПЯРОЎСКІ Іван Васільевіч, н. у 1895.

ПАСЁЛАК КІРАВА

МАРШКОЎ Навум Іванавіч, н. у 1891.

ШПЧАНКА Арсень Еўдакімавіч, н. у 1892.

ЗАСПЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АДАМАЎКА

ЕЎДАКІМАЎ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1896.

ЕЎДАКІМАЎ Трафім Фёдаравіч, н. у 1901.

ПРОЦЫК Мікалай Еўдакімавіч, н. у 1896. З 1918 па 20.11.1921 — чырвонаармеец 174 пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ВЁСКА ВЕЛІН

БЯНЧУК Павел Мікітавіч, н. у 1901.

ВЁСКА ГАРОШКАЎ

ЧАРНАШЭЙ Фёдар Сяргеевіч, н. у 1895. У 1917—1918 — рад. 14 грэнадзёрскага палка.

ВЁСКА ЗАСПА

ДАЛІКАТНЫ Фама Пракопавіч, н. у 1895. У 1917—1918 — рад. 203 ап.

ЛЯШЧЫНСКІ Іван Андрэевіч, н. у 1896, чырвонаармеец дывізіі Катоўскага. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

СТРЫЖАК Абакум Карпавіч.

СТРЫЖАК Апанас Канстанцінавіч.

СТРЫЖАК Васіль Сцяпанавіч, н. у 1896, рад. 75 пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 2.7.1941 па 29.9.1944 — рад. 153 асобнага інжынернага сапёрнага б-на, з 29.9.1944 па 18.7.1945 — 31 сп.

ЦІТАВЕЦ Тарас Сідаравіч.

ЦІТАВЕЦ Яфім Іванавіч.

ШАЛЕЙКА Іван Паўлавіч.

ЯРАЦ Мікіта Фёдаравіч, н. у 1895. У 1917—1918 — рад. 228 Задонскага пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ВЁСКА ЛЕВАШЫ

ЧАРАДНІК Рыгор Архіпавіч, н. у 1892, у 1921 браў удзел у разгроме бандфарміраванняў Струка і Галака.

ВЁСКА ЛУНАЧАРСК (БРАГІДОЎ)

ПЫРХ Аляксандр Пятровіч, н. у 1898.

ВЁСКА СЦЯПАНАЎКА

ВЯРБІЦКІ Міхаіл Антонавіч, н. у 1895, чырвонаармеец 2 Сафійскага пп. Дэмабілізаваны па хваробе ў лістападзе 1920.

ЯКУШ Мікалай Іванавіч, н. у 1895.

ПАСЁЛАК ЧЫРВОНЫ МОСТ

ЦІТАВЕЦ Іван Лявонцьевіч, н. у 1886.

КАМСАМОЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАЛАШАЎКА

ДРАБЫШЭЎСКІ Фёдар Паўлавіч, н. у 1895. У 1918—1922 — чырвонаармеец 57 кавалерыйскага дывізіёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 105 асобнага інжынернага б-на.

ВЁСКА КАМСАМОЛЬСК (ДЗЮРДЗЕЎ)

КАВАЛЬЧУК Яфім Фёдаравіч, н. у 1902.

ЧЫРЫК Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1895. У 1919—1921 — чырвонаармеец 67 пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад.

ВЁСКА КРАПЎНЯ

ДРАГУН Андрэй Антонавіч, н. у 1895. У 1918—1921 — чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 213 асобнай роты абслугоўвання.

ВЁСКА СВЕДСКАЕ

СОБАЛЬ Піліп Міхайлавіч, н. у 1893.

ТОМКА Міхаіл Данілавіч, н. у 1900. З лістапада 1919 да лістапада 1922 — чырвонаармеец

8 сд. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, камандзір аддзялення 542 асобнай кулямётнай роты.

КАПАРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БУДКА

ГОРБАЧ Марк Іванавіч, н. у 1895. З 1918 па 1920 — чырвонаармеец 4 разведвальнага дывізіёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, майстар-аружэйнік 1170 сп. Узнагароджаны 2 медалямі «За адвагу».

КУШНЕР Яўхім Іванавіч, н. у 1895.

СТРЭЛЬЧАНКА Уладзімір Маркавіч. н. у 1895.

ВЁСКА ЛАЗАРАЎКА

ПАТАРОЧА Андрэй Дзянісавіч, н. у 1897.

КАРАВАЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАРАВАЦІЧЫ

БЛІЗНЕЦ Ціт Іванавіч.

...Пачатак верасня 1917 г. З Дзвінска ў Маскву выходзіць эшалон. У ім 869 салдат-франтавікоў, якія былі арыштаваны за выступленні супраць імперыялістычнай вайны і Часовага ўрада. У вагонах — салдаты 82 часцей 5-ай арміі Паўночнага фронту. Усе яны прабылі пад арыштам звыш двух месяцаў, сядзелі ў дзвінскай ваеннай турме і абвінавачваліся па законах ваеннага часу. Згодна з законам, вязням прадугледжвалася катарга ад 4 гадоў і вышэй, з пазбаўленнем усіх правоў.

Сярод салдат, якіх везлі з Дзвінска ў Маскву, быў і Ціт Іванавіч Блізнец.

Часовы ўрад салдат, не згодных з яго палітыкай, называў дэзерцірамі. Але не дэзерцірамі былі «дзвінцы». Яны ўяўлялі адно з першых воінскіх фарміраванняў Кастрычніка, па іроніі лёсу «арганізаванае» самім Часовым урадам.

...Як сапраўднае рэвалюцыйнае падраздзяленне, «дзвінцы» ўвайшлі ў вароты «бутыркі». Ішлі пад чырвоным сцягам, спявалі песню «Смело, товарищи, в ногу!».

На дзевяты дзень зняволення вязні аб'явілі галадоўку. «Наш арышт, — заявілі яны, — ёсць контррэвалюцыйны ўдар па дэмакратыі, а пагэтаму для нас — свабода ці смерць...»

У выніку пратэстаў і патрабаванняў рабочых мас 21 верасня «дзвінцы» былі вызвалены. Абяссіленых пасля галадоўкі, іх размясцілі ў двух шпіталях.

...Увечары, 27 кастрычніка, «дзвінцы» атрымалі загад прыбыць для аховы Маскоўскага Савета. На чале іх пайшоў салдат Е. Н. Сапуноў.

Яшчэ на падыходзе да Крамля рэвалюцыйныя салдаты заўважылі ланцуг юнкераў, узброеных вінтоўкамі. Салдаты яшчэ не ведалі, што Маскоўскі Савет ужо акружаны і што контррэвалюцыйныя атрады маюць намер захапіць штаб рэвалюцыйнага паўстання, не дапусціўшы да яго падмацавання.

Афіцэр, каторы стаяў наперадзе ланцуга, крыкнуў: «Хто такія? Куды ідзеце?»

— Ахоўваць Маскоўскі Савет, — адказаў яму Сапуноў.

І тады ланцуг як бы разамкнуўся, даючы магчымасць калоне салдат прайсці на Красную плошчу. Гэта была правакацыя, бо ля гістарычнага музея «дзвінцаў» спыніў новы ланцуг юнкераў, а палкоўнік, які быў з імі, заявіў: «Мы самі ахоўваем цэнтр Масквы і Маскоўскі Савет. Здаць зброю!»

Е. Н. Сапуноў, а ён стаяў уперадзе, рашуча павярнуўся да атрада, жадаючы, відаць, аддаць баявы загад. На жаль, зрабіць тое яму не ўдалося, бо палкоўнік стрэліў салдату ў спіну і тут жа закрычаў: «У штыкі!»

Над Краснай плошчай прагучалі залпы: адзін, потым яшчэ. Падалі забітыя і параненыя юнкеры, былі адчувальныя страты і з боку рэвалюцыйных салдат.

Увогуле на Краснай плошчы гераічна загінулі 45 «дзвінцаў». Быў цяжка паранены і Ціт Іванавіч Блізнец.

Пасля перамогі Вялікага Кастрычніка Ц. І. Блізнец вярнуўся ў родныя Каравацічы. 20 гадоў Ціт Іванавіч працаваў у сельскім Савеце, затым — на ферме калгаса «Запаветы Леніна». У час Вялікай Айчыннай вайны разам з 400 сваімі аднавяскоўцамі ён пайшоў на фронт. З вайны Ціт Іванавіч не вярнуўся...

Э. П. Залескі

ДЗЕЙКУН Мікалай Міхайлавіч, н. у 1899. З 1.10.1918 па кастрычнік 1920 — стралок бронепоезда № 55. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ТУЖЫК Дзям'ян Аляксеевіч, н. у 1903.

ВЁСКА ПЕРАВАЛОКА

ГАЙДАШ Ігнат Несцеравіч, н. у 1898. З лютага 1917 па снежань 1921 — рад. 303 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ГОЛУБ Кузьма Лаўрэнцьевіч, н. у 1902.

КУЛАЖАНКА Кузьма Сямёнавіч, н. у 1900.

КУЛАЖАНКА Нестар Прохаравіч.

Н. П. Кулажанка ў час грамадзянскай вайны ваяваў пад сцягам 49-га кавалерыйскага палка 9-ай Крымскай кавалерыйскай дывізіі 2-га кавалерыйскага корпуса, камандзірам якога з'яўляўся Рыгор Іванавіч Катоўскі. Корпус нанёс шэраг сакрушальных удараў па дзянікінскіх часцях, вызваляў Адэсу, Тыраспаль, Вазнясенск, разам з 1-ай Коннай арміяй браў удзел у контрнаступленні на Паўднёва-Заходнім фронце і г. д.

Калі ж прыйшоў час дэмабілізацыі, Нестар Прохаравіч атрымаў грамату, падпісаную Катоўскім.

...Пасля дэмабілізацыі Нестар Прохаравіч вярнуўся ў родную вёску, быў адным з членаў мясцовага камітэта сялянскай беднаты, удзельнічаў у арганізацыі калгаса, працаваў у леспрамга-

се. А потым — вайна. Вялікая Айчынная. І зноў давялося былому кавалерысту браць у рукі шаблю. Змагаўся з ворагам у складзе 4-ай Сталінскай дывізіі.

Цяжкія баі, акружэнне, партызанскі атрад. Не раз вызначаўся адвагай партызан Нестар Прохаравіч Кулажанка. А вестка пра тое, што ягоную жонку і трохгадовую дачку закатавалі карнікі, памножыла лютую нянавісць да ворага. За зброю ўзяўся і яго шаснаццацігадовы сын Міхаіл. Яны ваявалі разам у атрадзе «Мсціевец».

За ратныя подзвігі Нестар Прохаравіч узнагароджаны пяццю медалямі.

Пасля вайны Н. П. Кулажанка ў органах правапарадку. За бездакорную службу быў адзначаны яшчэ дзвюма ўзнагародамі.

А. Дубравін

СЕМЧАНКА Кузьма Адамавіч, н. у 1888.

СЕМЧАНКА Фёдар Андрэевіч, н. у 1898. Са студзеня 1918 да кастрычніка 1920 — чырвонаармеец 71 кавалерыйскага палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 12.11.1943 і да канца вайны — мінамётчык 185 сп 1 Беларускага фронту. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

ЛІСКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРЫНКІ

БЛІЗНЕЦ Дзмітрый Дзянісавіч.

БЛІЗНЕЦ Сямён Фаміч. Скончыў курсы чырвоных камандзіраў, камандаваў ротай. Браў удзел у баях з дзянікінцамі, белапалякамі.

БЛІЗНЕЦ Фёдар.

ГВОЗДЗЬ Яфім Сцяпанавіч.

ДЗЯМ'ЯНАВІЧ Ігнат.

КАЦУРА Максім Іванавіч.

КАЦУРА Мікалай Кузьміч.

ТКАЧ Фёдар Францавіч.

ВЁСКА ЛІСКІ

АСТАПЕНКА Андрэй Харытонавіч, н. у 1896.

АСТАПЕНКА Анісім Цярэнцьевіч, н. у 1898.

АСТАПЕНКА Іван Піліпавіч, н. у 1894.

АСТАПЕНКА Піліп Міканоравіч, н. у 1892. Загінуў у час грамадзянскай вайны.

АСТАПЕНКА Сцяпан Іванавіч.

АСТАПЕНКА Сямён Іванавіч, н. у 1894.

АСТАПЕНКА Фама Міканоравіч, н. у 1881. Загінуў у час грамадзянскай вайны.

БЛІЗНЕЦ Васіль Адамавіч, н. у 1892.

БЛІЗНЕЦ Дзмітрый Дзмітрыевіч, н. у 1894.

КАЦУРА Міхаіл Сідаравіч, н. у 1893, рад. 228 Задонскага пп. Дэмабілізаваны ў снежні 1918.

ЛАСІЦА Іван Іосіфавіч, н. у 1893.

ЛАСІЦА Ігнат Мартынавіч, н. у 1893. Памёр у час Вялікай Айчыннай вайны.

ЛАСІЦА Сідар Уладзіміравіч, н. у 1894.

ЛОБАН Аляксей Якаўлевіч, н. у 1882. За мужнасць і адвагу адзначаны двума Георгіеўскімі крыжамі. Загінуў у час грамадзянскай вайны.

ЛОБАН Міхаіл Аляксеевіч. Загінуў у час грамадзянскай вайны.

МУРАШКА Якаў Самсонавіч, н. у 1886.

НАВАСАД Павел Мартынавіч, н. у 1889.

ЯРАЦ Якаў Цімафеевіч.

НОВАБАРСУЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛЯСНОЕ
(ЧЫРВОНЫ ВОСТРАЎ)

НАРНІЦКІ Ульян Уладзіміравіч, н. у 1882.

З успамінаў У. У. Нарніцкага

...І мяне летам 1916 г. забралі ў салдаты, хаця і быў я «сінебілетнікам», а гэта значыць — адзіным кармільцам сям'і.

Дома засталіся няўбраны ўраджай на лапіку зямлі і жонка з малым на руках, якая не ведала, што разлучаемся на многія гады.

Прыгналі нас на фарміраванне ў Чалябінск. Апранулі, далі вінтоўкі, паказалі, як страляць з іх. А потым каманда зноў грузіцца ў вагоны. Пагрузіліся, цягнік крануўся. Спыніўся толькі ў Архангельску. Прама з цягніка перавялі нас на марскі транспарт «Канада». Праз суткі, ужо ў моры, нам паведамілі: трымаем шлях на Францыю.

Цёмныя вясковыя хлопцы, як і я, ажно заскакалі ад радасці. Мроіліся ім багатыя заморскія краіны, дзе можна і адпачыць, і з харчамі не мець аніякага клопату.

Словам, мы лічылі сябе шчаслівымі, што патрапілі ў экспедыцыйны корпус. Аб крывавай вайне неяк забыліся. А рускія газеты, якія атрымлівалі пры наведванні портаў, стракацелі апісаннем мужнасці ды адвагі рускага салдата, гатовага аддаць без аніякіх ваганняў за бацюхну-цара само жыццё.

З зайздрасцю разглядалі здымкі георгіеўскіх кавалераў, і ўласныя грудзі ўяўлялі ва ўзнагародах. А тут яшчэ афіцэры ўвесь час удоўблівалі ў нашыя галовы «дух патрыятычнасці», заклікалі, каб тут, за мяжой, мы не зганьбілі гонар расейскага салдата.

Толькі ж у цёмных кутках трумаў каторыя з салдатаў шушукаліся паміж сабой, шукалі адказы на пытанні: «Чаму мы павінны ваяваць за Францыю? Чые інтарэсы будзем там абараняць?»

Найбольш адукаваныя выказваліся так: «На забой, хлопцы, нас вязуць. Цар ад французаў гарматы атрымлівае, а расплочвацца мяркуе крывёй ды жыццямі нашымі...»

У Брэст — французскі порт — прыбылі ноччу. Далі нам пару дзён адпачыць — і на перадавую. Вось тут мы ўжо і спазналі, што такое вайна. Вялі баі так званага мясцовага характару. Прастрэльвалі нямецкія акопы, а яны — нашыя. Хадзілі ў атакі, займалі варожыя акопы. Потым адступалі. І так з дня ў дзень. Здавалася, што

У. У. Нарніцкі

гэта робіцца наўмысна, каб знішчыць больш салдат. І з нашага боку, і з нямецкага.

Міналі месяцы. Да нас прасочваліся скупыя звесткі пра тое, што робіцца на радзіме. За мяжой заспела нас і Лютаўская рэвалюцыя. Уздыхнулі з палёгкай. Былі надзеі на хуткія перамены, на вяртанне дамоў. Ды дзе там! Тыя ж афіцэры, каторыя раней заклікалі аддаваць галовы за цара і Айчыну, падхапілі новы лозунг, падказаны Часовым урадам, — «За вайну да пераможнага канца!».

Адчулі мы і «свабоду». Калі раней афіцэры салдатам калі-нікалі кухталя давалі, то зараз і страляць пачалі. Асабліва, памятаецца, лютаваў камандзір 2-га палка. Салдаты не сцярпелі: учынілі самасуд ды прыкончылі крыўдзіцеля. Але на гэтым справа не скончылася: прама перад строем былі расстраляны васьмёра нашых таварышаў. Ды расстрэлы, калі на тое, ужо не маглі ўціхамірыць узбунтаваныя палкі. Пачаліся мітынгі, на якіх выступалі як салдаты, так і французскія рабочыя. Была прынята аднадушная рэзалюцыя за вяртанне на радзіму. Вядома, французскі ўрад, напалоханы рэвалюцыяй у Расіі, паспяшаўся ад нас пазбавіцца. Корпус быў расфарміраваны. Каторыя з салдат увайшлі ў французскія падраздзяленні, а астатніх, у тым ліку і ўвесь наш шосты полк, накіравалі ў Алжыр. Рускіх афіцэраў змянілі французы.

Як след паспыталі салдацкага хлеба і ў Афрыцы. Шмат хто памёр там ад брушнога тыфу, дызентэрыі, а то і проста ад нястачы вады, ад невыноснай спякоты.

А ў Расіі грымнула Кастрычніцкая рэвалюцыя, потым распачалася грамадзянская вайна.

У пачатку 1920 г. наша мара, нарэшце, збылася: вярнуліся на радзіму. Але пакуты і вандраванні на гэтым не скончыліся. Замест перадачы па пагадненню з савецкай дзяржавай нас выгрузілі ў Новарасійску, дзе акапаліся рэшткі белай арміі. Белякі прымушалі нас ваяваць у іхніх часцях. Але я, яшчэ некалькі хлопцаў, чые прозвішчы заканчваліся на «цкі» і «скі», сустрэліся з польскім консулам, назвалі сябе палякамі, папрасілі ў яго дапамогі...

Вярнуўся дамоў, браў удзел у барацьбе з бандытызмам. Мае вяскоўцы, сяляне Лясного Вострава, абралі мяне ў Савет.

7 лістапада 1922 г., у дзень святкавання пятай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, у Маладушы прайшла канферэнцыя сялян воласці. Мае землякі ўзнялі пытанне, каб Лясны Востраў перайменаваць у Чырвоны Востраў. Я з'яўляўся тады старшынёй Савета сялянскіх дэпутатаў Лясного Вострава.

Мне ўжо 84 гады. Летась у сваім калгасе «Перамога» выпрацаваў больш як сто працадзён. Раблю і сёлета.

(Запіс ад 1966 г.)

ВЁСКА МАЛАДУША

МАНУЙЛАЎ Іван Андрэевіч, н. у 1900, чырвонаармеец 45 сд.

ВЁСКА НОВЫ БАРСУК

КІРЫЧЭНКА Рыгор Андрэевіч, н. у 1888.

ПШАНОЎ Іван Восіпавіч, чырвонаармеец. Быў абраны вяскоўцамі членам выканкама, а затым і старшынёй выканкама мясцовага Савета. Забіты ў в. Смагарынь.

ПАТАПЕНКА Прохар Іванавіч, н. у 1902.

ВЁСКА СТАРЫ БАРСУК

ДАЎГАЛАПЦЕЎ Іван Барысавіч, н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

КЕЧКА Аляксей Іосіфавіч, н. у 1896, чырвонаармеец 142 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 71 ваенна-будаўнічага б-на. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

КУЦАРАЎ Апанас Іванавіч, н. у 1897.

ПРАКАПЕНКА Георгій Фядосавіч, н. у 1895. З мая 1919 па сакавік 1921 — чырвонаармеец Мінскай дывізіі ўнутранай аховы.

ВЁСКА СЯРГЕЕЎКА

ПЯТРОЎСКІ Лаўрэн Ігнатавіч, н. у 1883.

ПЕРАСВЯТОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАРЫВАДА

ІВАНОЎ Уладзімір Антонавіч, н. у 1886.

ЛІТОШКА Іван Андрэевіч, н. у 1895.

МАРОЗ Лявон Піліпавіч, н. у 1896, чырвонаармеец 16 артылерыйскага дывізіёна цяжкіх гармат. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 514 сп. Дэмабілізаваны ў сувязі з раненнем у верасні 1944.

ШАТОН Іван Пятровіч, н. у 1901, чырвонаармеец 13 асобнага інжынерна-тэхнічнага сапёрнага б-на. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ВЁСКА КОРАСЦЕНЬ

БУЧКО Апанас Андрэевіч, н. у 1893.

ПАСЁЛАК ПАДМОСЦЕ

ДУБАВЕЦ Максім Захаравіч, н. у 1894.

ВЁСКА ПЕРАСВЯТОЕ

ГАЙДАШ Цімафей.
ГРЫШЧАНОК Андрэй Пятровіч, н. у 1900, чырвонаармеец 1 Курскага бронепалка.
НАЛЯГАЧ Іван Еўдакімавіч, н. у 1895, чырвонаармеец 228 сп.
НАЛЯГАЧ Пётр Харытонавіч.

ВЁСКА РАБУСА

КАЛЕСНІКАЎ Фёдар Маркавіч, н. у 1898.
КАХАНОЎСКІ Якаў Паўлавіч, н. у 1893.
ПУЗАН Іван Сямёнавіч, н. у 1894.
ФЕДАРОВІЧ Фядос Герасімавіч, н. у 1894, чырвонаармеец. Быў дэмабілізаваны ў 1918 у сувязі з раненнем.

РОВЕНСКА-СЛАБОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АНДРЭЕЎКА

МУХА Васіль Лаўрэнцьевіч.
З успамінаў В. Л. Мухі

Пачаў я сваю службу на Балтыцы з марай хутчэй вярнуцца дадому, у родную Андрэеўку пад Рэчыцай.

Не думаў-не гадаў, што падзеі павернуцца так крута і мае сцежкі-дарожкі пойдуць у зусім іншы бок.

Пачалася першая сусветная вайна. Плаваў я на крэйсеры «Рурык», на іншых баявых караблях. Лютаўская рэвалюцыя заспела ў Гельсінгфорсе, на службе сувязі. Восем гадоў насіў я бесказырку, уставаў і клаўся спаць пад андрэеўскім флагам.

У самым пачатку ліпеня 1917 г. па справах службы мне давялося перабрацца ў Кранштат, я стаў камуністам, уступіў у ленінскую партыю.

Нас, маракоў-беларусаў, надта цікавіла, што адбываецца на радзіме. Там жа лінія фронту праходзіць, частка тэрыторыі акупіравана немцамі. Становішча даволі цяжкае.

У Петраградскім Савеце паведамілі аб маючым адбыцца з'ездзе сялян Мінскай і Віленскай губерняў. І вось я з яшчэ трыма матросамі-дэлегатамі накіраваны на з'езд.

Мінск у 1917 г. нагадваў бурлівы кацёл. І з'езд праходзіў вельмі бурна. Ішла барацьба за масы. Меншавікі і эсэры са скуры лезлі, каб схіліць сялян на свой бок. Давялося даваць ім адкрыты бой. Дарэчы, бальшавіцкую фракцыю на

М. З. Дубавец

В. Л. Муха

з'ездзе ўзначальваў Аляксандр Фёдаравіч Мяснікоў.

Толькі сціхлі спрэчкі на трыбуне сялянскага з'езда, як быў скліканы з'езд салдат Заходняга фронту. Рашэннем гэтых двух з'ездаў быў створаны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту (аблвыканкамзах). Я таксама быў абраны ў гэты выканкам.

Праз каторы час я атрымаў ад Мяснікова заданне — разабрацца з «Палонбежам». Існавала такая арганізацыя па дапамозе палонным і бежанцам.

Прыходжу я на адзін склад, другі. У нас, заяўляюць, усё ў парадку, харч паступае ў лагер бесперапынна, у дастатковай колькасці. Пазнаёміўся я з жыццём бежанцаў, і валасы дыбам на галаве сталі: бруд, тыф, старыя, дзеці пухнуць, людзі дзесяткамі паміраюць ад голаду і хвароб.

Аказваецца, харчаванне са складоў паступала не ў лагер, а на чорны базар, дзе прадавалася па спекуляцыйных цэнах. Са злодзеямі давялося паступіць згодна з рэвалюцыйнымі законамі.

Я нагадаў толькі адзін факт барацьбы са злоўжываннямі. А колькі іх было! Мне, камісару ўнутраных спраў Ландару, камісару харчавання Пярно і іншым таварышам даводзілася амаль штодзённа сустракацца з аналагічнымі выпадкамі.

Кастрычніцкія падзеі знайшлі магутны водгук і ў Мінску. Салдаты і рабочыя падтрымалі сацыялістычную рэвалюцыю. Гарадскі Савет і аблвыканкамзах не дапусцілі беспарадкаў. Праўда, легіянеры, якімі камандаваў палкоўнік Бек, спрабавалі выступіць супраць народнай улады. Але мы іх хутка ўсмірылі.

Трэцяга снежня мяне прызначылі камісарам грамадскага апекавання, а пятага я ўжо сядзеў у вагоне цягніка. Ваенна-рэвалюцыйная секцыя Петраградскага Савета выклікала мяне для дакладу аб сваёй дзейнасці.

У Петраградзе быў нядоўга. У пачатку 1918 г. мяне разам з атрадам чырвонагвардзейцаў-матросаў накіравалі для барацьбы з польскімі

легіянерамі, якія пасля выгнання іх з Мінска акапаліся ў Бабруйскай крэпасці і тэрарызавалі мясцовае насельніцтва.

У баі ля Жлобіна, у якім нам давялося прымаць удзел, мы разбілі эскадрон праціўніка.

18 лютага 1918 г. імперыялістычная Германія распачала наступленне на Савецкую Расію. Нямецкія войскі прасоўваліся ўглыб Беларусі, устанаўлівалі на акупіраванай тэрыторыі рэжым насілля і здзекаў з мірнага насельніцтва.

Наш чырвонагвардзейскі атрад прыбыў у Гомель і аказаў дапамогу ў эвакуацыі ваеннай маёмасці, у тым ліку Рэчыцкага артылерыйскага парка.

Пад націскам пераўзыходзячых па колькасці і ўзбраенню нямецкіх войск мы вымушаны былі разам з рэвалюцыйнымі салдатамі Гомеля адступіць на станцыю Злынка. Тут немцам далі бой. Затым нашы сілы аб'ядналіся з атрадам чырвонагвардзейцаў і партызан Украіны пад камандаваннем легендарнага героя грамадзянскай вайны Мікалая Аляксандравіча Шчорса. Дарэчы, на станцыі Унеча былі сфарміраваны Багунскі і Тарашчанскі палкі маладой Чырвонай Арміі, у якіх было нямала беларусаў, у тым ліку і ўраджэнцаў Рэчыцкага павета.

З першых жа дзён наступлення германскай арміі на Савецкую рэспубліку рабочыя і сяляне Беларусі ўзняліся на справядлівую вызваленчую вайну супраць замежнага імперыялізму.

Разам з групай камуністаў я быў пасланы на тэрыторыю, якую кайзераўцам удалося захапіць. У нашу задачу ўваходзіла арганізацыя падпольных рэўкомаў і пярвічных партыйных ячэек, якія ўзначалілі барацьбу працоўных супраць германскіх захопнікаў.

Мне давялося прымаць удзел у стварэнні некалькіх рэўкомаў: Ровенска-Слабодскага (старшыня яго — т. Сцянкевіч), Брагінскага (Піліп Скараход), Хойніцкага (Уладзіслаў Жыляк), Лоеўскага. Сам жа я ўзначаліў Маладушскі рэўком.

Увесь Рэчыцкі павет быў ахоплены полымем партызанскай вайны. Акупанты імкнуліся тэрорам і карнымі мерамі зламаць волю працоўных да барацьбы за сваю свабоду і незалежнасць. Каб застрашыць насельніцтва, немцы павесілі ў Рэчыцы трох чалавек, забілі т. Жыляка, палілі вёскі. Але да самага вызвалення нашай зямлі ад кайзераўскіх акупантаў у тыле ворага не спынялася партызанская вайна.

Пасля выгнання германскіх захопнікаў на тэрыторыі Рэчыцкага павета разгарнулася вялікая работа па аднаўленню ўлады Саветаў і разбуранай вайной народнай гаспадаркі.

Ад Рэчыцкага павета я быў абраны дэлегатам на Першы Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, які адбыўся ў Мінску 2—5 лютага 1919 г.

Вясной 1920 г. панская Польшча зноў пайшла ў наступленне супраць нас.

У баях з белапалякамі ля Рэчыцы аддалі сваё жыццё многія гераічныя абаронцы савецкай улады. Брацкая магіла нашых таварышаў знаходзіцца паблізу вёскі Воўчая Гара.

У гэты перыяд я ўступіў у 57-ую дывізію Чырвонай Арміі і з'яўляўся палітруком. Затым мяне выклікалі ў палітупраўленне 16-ай арміі, дзе я знаходзіўся да восені 1920 г., г. зн. да вызвалення Беларусі ад белапольскіх акупантаў.

Восенню 1920 г. Гомельскі губком партыі накіраваў мяне ў Рэчыцкую партыйную арганізацыю. Тут я працаваў загадчыкам павятовага аддзела сацыяльнага забеспячэння, старшынёй выканкама павятовага Савета (1921 г.), загадчыкам павятовага зямельнага аддзела.

З 1923 г. знаходзіўся на рабоце ў савецкіх і партыйных органах рэспублікі.

ВЁСКА ПАСЕКА

СІВУХА Пётр Міхайлавіч, н. у 1893.

ВЁСКА РОВЕНСКАЯ СЛАБАДА

ДВОРНІК Адам Цітавіч, н. у 1899. Адзін з арганізатараў партызанскага руху на тэрыторыі Рэчыцкага р-на ў час Вялікай Айчыннай вайны.

КАЛЬЧУК Даніла Кірэевіч.

КАЛЬЧУК Іван Цімафеевіч.

КУЦЕНЬ Іван Васільевіч, н. у 1896. З 1917 па 1922 — чырвонаармеец 2 артылерыйскага дывізіёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

МЯЛІК Васіль Іванавіч, н. у 1894.

СІВУХА Андрэй Епіфанавіч, н. у 1898.

СІВУХА Гаўрыла Яфімавіч, н. у 1895. З 1918 па 1922 — чырвонаармеец 75 пп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З ліпеня 1941 і да канца вайны — рад. 212 асобнай роты абслугоўвання. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

СІВУХА Мікалай Яфімавіч, н. у 1896.

СІВУХА Пётр Іванавіч, н. у 1898, рад. Рэчыцкага чырвонагвардзейскага атрада, ваенны камісар Ровенска-Слабодскай воласці, старшыня камітэта беднаты, старшыня Ровенска-Слабодскага с/с. Адзін з арганізатараў калгаснага будаўніцтва на тэрыторыі Рэчыцкага р-на. З 1931 — старшыня калгаса «Мудрэц» в. Баршчоўка. Быў неабгрунтавана рэпрэсіраваны. З 1932 па 1942 (час адбыцця пакарання) узначальваў жывёлагадоўчую брыгаду саўгаса «Новы Бор» Варкутлага. Рэабілітаваны.

СІВУХА Рыгор Іванавіч.

ЧЭЧАТ Піліп Вікенцьевіч, н. у 1898.

ВЁСКА РОЎНАЕ

МАРОЗ Васіль Васільевіч, н. у 1895. З 1918 па 1920 — сапёр 55 сд. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЧАРНАШЭЙ Гаўрыла Карнеевіч, н. у 1880. Загінуў у час грамадзянскай вайны.

ЧАРНАШЭЙ Пётр Васільевіч, н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1941 па 1945 — рад. 213 асобнай роты абслугоўвання.

ЧАРНАШЭЙ Раман Сямёнавіч, н. у 1886. Загінуў у час грамадзянскай вайны.

СВІРЫДАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК ЗОРКА

СТРЫЖАК Нічыпар Дзянісавіч, н. у 1895, чырвонаармеец 3 гаўбічна-артылерыйскага палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ПАСЁЛАК КРАСНАСЕЛЛЕ

КРАЎЧАНКА Павел Агеевіч, н. у 1896, чырвонаармеец 324 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 77 сп.

ВЁСКА СВІРЫДАВІЧЫ

КАЛАЦЭЙ Васіль Герасімавіч, н. у 1896. З 1919 па 1920 — чырвонаармеец 202 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КАЛАЦЭЙ Лаўрэн Цімафеевіч, н. у 1896. З 1918 па 1920 — чырвонаармеец 193 Свяцкага сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КУЗЬКО Яфім Цітавіч, н. у 1895, чырвонаармеец 206 Сальянскага сп. Быў дэмабілізаваны ў красавіку 1919 у сувязі з раненнем.

ПЫРХ Дзмітрый Фёдаравіч.

ВЁСКА ЯМПАЛЬ

КАСЦЯНОК Васіль Фёдаравіч, н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. На фронце з 13.12.1943, рад. 547 б-на аэрадромнага абслугоўвання.

НОВІКАЎ Сцяпан Кузьміч, н. у 1900. Са студзеня 1920 па чэрвень 1920 — чырвонаармеец пагранічнага б-на.

ПАЎЛЯНОК Фама Раманавіч, н. у 1895.

ВЁСКА ЯНОЎКА

ШАЎЛОЎСКІ Андрэй Ларывонавіч, н. у 1896, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 218 сп 1 Беларускага фронту.

ХОЛМЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАВУЖАЛЬ

СЕВЕРАЎ Фёдар Паўлавіч, н. у 1901, чырвонаармеец 75 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Кіраўнік падпольнай патрыятычнай групы вв. Холмеч — Завужаль.

П. П. Худароба

ВЁСКА ХОЛМЕЧ

АМЕЛЕНКА Яфім Маркавіч, н. у 1896. З 1918 па 1921 — чырвонаармеец 81 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ВАЙТОВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1883. Паліткатаржанін. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Член падпольнай патрыятычнай групы, а з лістапада 1943 — кіраўнік групы.

ВАШЧЫЛА Іван Фёдаравіч, н. у 1893. У час Вялікай Айчыннай вайны — член патрыятычнай падпольнай групы.

ЗЯЛЕНСКІ Павел Гаўрылавіч, н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. На фронце з 5.7.1941 і да канца вайны.

МШКІН Мікіта Сямёнавіч, н. у 1901, чырвонаармеец 13 кавалерыйскага палка.

НАЗАРАНКА Іван Цярэнцьевіч, н. у 1890. У час Вялікай Айчыннай вайны — член падпольнай патрыятычнай групы.

САМАТКАН Іван Ульянавіч, н. у 1886. У час Вялікай Айчыннай вайны — член падпольнай патрыятычнай групы.

ХУДАРОБА Пётр Пятровіч (Пэтэр Пэтэравіч), н. у 1886. Венгр па нацыянальнасці, камандзір аддзялення 149 сп. У 1920 узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Член падпольнай патрыятычнай групы, партызан. Быў закатаваны фашыстамі разам з жонкай, 3 дачкамі і сынам зімой 1943 каля в. Валадарск (Гавенавічы).

ГОРАД РЭЧЫЦА

АКУЛІЧ Антон Восіпавіч, н. у 1895. З 1918 па 1922 — артылерыст Чарнаморскага флоту. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 12.11. 1943 — рад. 110 запаснога сп, з 10.2.1944 — рад. 7 кавалерыйскага палка.

АЛЁШКІН Дзмітрый Мацвеевіч, н. у 1899. З кастрычніка 1918 па май 1922 — рад. 3 сп.

АРКЛІС Лазар Шмеркавіч, н. у 1898. З верасня 1919 па кастрычнік 1922 — чырвонаармеец 57 сд. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

АСАДЧЫ Пётр Мацвеевіч, н. у 1895, чырвонафлоцец Чарнаморскага флоту.

БАБІЦКІ Навум Рыгоравіч, н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

БАБРОЎНІК Васіль Кузьміч, н. у 1898. З мая 1918 па снежань 1922 — чырвонаармеец.

БАЛАШЧАНКА Якаў Фёдаравіч, н. у 1900. З верасня 1919 па 1922 — чырвонаармеец.

БАСІК Кірыл Фаміч, н. у 1901. З мая 1918 па чэрвень 1924 — камандзір аддзялення 7 Самарскай кавалерыйскай дывізіі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Камандзір узвода 65 кавалерыйскага палка. Узнагароджаны некалькімі ордэнамі і медалямі.

БЕЛКІН. Баец Рэчыцкага атрада «ЧОН» (часць асобага прызначэння). Загінуў у маі 1920 каля в. Воўчая Гара ў баі з белапалякамі.

БЯССМЕРТНЫ Іван Мікалаевіч, н. у 1895, чырвонафлоцец. З ліпеня 1921 і да канца вайны — чырвонаармеец 76 асобнага б-на войскаў НКУС. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ВІШНЕЎСКІ Акім Фёдаравіч, н. у 1896. З 1918 па 1922 — чырвонаармеец 177 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 213 асобнай роты абслугоўвання.

ГАЛІЦКІ Анісім Міхайлавіч, н. у 1895. З мая 1918 па 1921 — чырвонаармеец 5 вучэбнага каравульнага б-на. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад.

ГАЛОЎЧАНКА. Баец Рэчыцкага атрада «ЧОН». Загінуў у маі 1920 каля в. Воўчая Гара ў баі з белапалякамі.

ГАНТМАН Цыля Ярмолаўна, н. у 1902.

ГАРЭЛІК Сямён Ізраілевіч, н. у 1895. З 1918 па 1921 — чырвонаармеец 140 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ГРАБЯНЧУК Іван Рыгоравіч, н. у 1894.

ГРЫНБЕРГ Майсей Ліпавіч, н. у 1902, курсант Чугуеўскай пяхотнай школы, пам. камандзіра ўзвода 52 сд, інструктар кулямётнай справы 39 кавалерыйскага палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, са снежня 1942 па сакавік 1943 — пам. камандзіра ўзвода 464 сп.

ГРЭБНЕЎ Іосіф Харытонавіч, н. у 1899. З кастрычніка 1919 па жнівень 1922 — чырвонаармеец 1 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 60 стралковага б-на.

ГУДКОЎ Ігнат Яўменавіч, н. у 1900. З 15.8.1919 па чэрвень 1922 — чырвонаармеец 19 сп.

ГУРСКІ Мікіта Сямёнавіч, н. у 1899. З ліпеня 1918 па студзень 1921 — чырвонаармеец ваеннага камісарыята г. Рагачова. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ГУРСКІ Павел Мікалаевіч, н. у 1899. З чэрвеня 1919 па май 1922 — чырвонаармеец каравульнай роты ваеннага камісарыята г. Нясвіж.

Ц. Я. Гантман

ДАЗОРЦАЎ Леў Маркавіч, н. у 1895.

ДАЎГАЛАПЦЕЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1896. З 1918 па 1920 — чырвонаармеец 342 стралковага дывізіёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ДВОРНІК, баец Рэчыцкага атрада «ЧОН». Загінуў у маі 1920 каля в. Воўчая Гара ў баі з белапалякамі.

ДЗЕДЗІКАЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1896, пам. камісара Старадубскага павятовага ваенкамата. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ДРАБЫШЭЎСКІ Сцяпан Паўлавіч, баец Рэчыцкага атрада «ЧОН». Загінуў у маі 1920 каля в. Воўчая Гара ў баі з белапалякамі.

ДРАЧОЎ Карп Міхайлавіч, н. у 1897, чырвонаармеец 4 асобай дывізіі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Са жніўня 1941 па лістапад 1943 — камандзір узвода, палітрук, камісар 265 партызанскага атрада. Узнагароджаны 5 ордэнамі і 10 медалямі.

ЗУБРЫЦКІ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1891.

ІВАНОЎ Фёдар Апанасавіч, н. у 1893.

ІСАКОЎ Андрэй Максімавіч.

КАВАЛЕЎСКІ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1901.

КАЗАК Апанас Мікітавіч, н. у 1896, чырвонаармеец 174 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КАЗАЧЭНКА Павел Акімавіч, н. у 1900, тэлеграфіст.

КАЗЛОЎ Рыгор Іванавіч, н. у 1899, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1943 і да канца вайны — камандзір аддзялення 862 і 516 сп.

КАЗЛОЎ Рыгор Сцяпанавіч, чырвонаармеец. Старшыня камітэта беднаты, нам. старшыні Горвальскага, Васілевіцкага валасных выканкамаў. Прымаў актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КАЛОША Яфім Аляксандравіч, н. у 1902, з 1918 і да канца грамадзянскай вайны — чырвонаармеец 41 кавалерыйскага палка 1 Конной арміі.

КАСЦЮК Якаў Міхайлавіч, н. у 1900, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КАЦУРА Макар Андрэевіч, н. у 1900. З чэрвеня 1919 па верасень 1921 — чырвонаармеец.

КРУПЕЦКІ, баец Рэчыцкага атрада «ЧОН». Загінуў у 1920 каля в. Воўчая Гара ў баі з белапалякамі.

КРЫЛОЎ Павел Кліменцьевіч, н. у 1896. З 1918 па 1920 — чырвонаармеец 3 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

КУЛАГА Андрэй Сямёнавіч, н. у 1896.

КУЛЕЙ Мікалай Несцеравіч, н. у 1899, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, 7 медалямі.

КУЦАПАЛАЎ Фёдар Васільевіч, н. у 1899. З 1918 па 1920 — чырвонаармеец 119 асобнага сп.

ЛАЗАРАЎ Мацвей Авакумавіч, н. у 1895, чырвонаармеец 18 Валагодскага сп.

ЛІН Рыгор Лук'янавіч, н. у 1900, чырвонаармеец 7 сд.

ЛІЎШЫЦ Гілер Хаймавіч, н. у 1896, чырвонаармеец 31 кавалерыйскага палка.

ЛЯВОНЧЫК Аляксандр Паўлавіч, н. у 1895.

МАЙСЕЕНКА Васіль Фёдаравіч, н. у 1898, чырвонаармеец 36 запаснога кавалерыйскага палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

МАКАРАЎ Дзмітрый Паўлавіч, н. у 1900. З 6.12.1918 па красавік 1922 — чырвонаармеец 6 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

МАКСІМЕНКА Іосіф Ігнатавіч, н. у 1900. Са жніўня 1919 па май 1921 — чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

МАЛІКІН Шалом Лейбавіч, н. у 1896, супрацоўнік Маскоўскай групы асобага аддзела. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

МАЛЫНІЧ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1898. Са жніўня 1919 па снежань 1921 — чырвонаармеец 52 кавалерыйскага палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 448 сп. Са снежня 1942 і да канца вайны — камандзір аддзялення матацыклістаў 700 асобнай аўтамабільнай роты. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

МАРГОЛІН Тана Хаймавіч, н. у 1896. З 1921 па 1922 — чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, мал. сярж. Узнагароджаны некалькімі медалямі.

МІНІЧ Андрэй Раманавіч, н. у 1896, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

МНУХІН Сяргей Аляксандравіч, н. у 1900.

МУРАШКА Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1895, чырвонаармеец 6 тэлеграфнага дывізіёна.

МУРЗІН Мікалай Пятровіч, н. у 1896. З 1919 па 1921 — чырвонаармеец 238 стралковай брыгады. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

МУШПАКОЎ Мацвей Раманавіч, н. у 1893, чырвонафлоцец Балтыйскага флоту, інструктар вадалазнай справы. З 1919 — чырвонаармеец 1 Украінскай дывізіі.

НАРУЦКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1902, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ваенком, старшы палітрук, агітатар палітаддзела фронту.

І. І. Палевікоў

НАЎГАРОДСКІ Акім Сяргеевіч, н. у 1896, машыніст Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ПАЛЕВІКОЎ Іван Іванавіч, н. у 1893.

Вясной 1917 г. у 1-ым авіяцыйным парку, што размяшчаўся ў Петраградзе, ствараецца ячэйка бальшавікоў. Сакратаром яе выбіраецца рэчычанін, унтэр-афіцэр Іван Палевікоў. Крыху пазней выбіраюць яго і членам партыйнага бюро РСДРП(б) ваеннай арганізацыі Адэскага гарнізона і Румынскага фронту.

У Адэсе Іван Палевікоў прыняў актыўны ўдзел у барацьбе за ўладу Саветаў, прайшоў баявую рэвалюцыйную школу.

...Стаяла суровая, снежная зіма 1918 г. У халодным ад марозу вагоне Іван Палевікоў пасля больш чым трохгадовага знаходжання на фронце дабіраецца ў Рэчыцу. Рэчыца мітынгавала. На другі дзень пасля прыезду Іван выступае на гарадскім мітынгу, заклікае цвёрда стаяць за ўладу Саветаў.

У горадзе доўга не прабыў. Накіраваўся ў Гомель, дзе ўвайшоў у састаў валаснога рэўкома. Пачаў працаваць у павятовай зямельнай камісіі. Узяўся за арганізацыю камбедаў, ваенных дружын.

У лютым 1918 г. на Беларусь і Украіну рушылі нямецкія акупанты. Яны захапілі Рэчыцу, Гомель і імкнуліся прасунуцца ўглыб краіны. Ствараліся рэвалюцыйныя партызанскія і чырвонагвардзейскія атрады.

Баявую групу з вясковай моладзі-беднаты арганізаваў Іван Палевікоў. Гэтая група аб'ядналася затым з другім Клінцоўскім чырвонагвардзейскім атрадам. Палевікоў становіцца яго палітычным кіраўніком. На тэрыторыі цяперашняй Бранскай вобласці з асобных чырвонагвардзейскіх і партызанскіх атрадаў, якія дзейнічалі на Беларусі і Украіне, фарміруецца 1-ы Рэвалюцыйны полк. Камандзірам палка прызначаецца Дзямід Дзям'янавіч Грышалёў, а сакратаром партыйнай арганізацыі таварышы выбіраюць палітрука 2-га батальёна Івана Іванавіча Палевікова.

На з'ездзе 83 рэвалюцыйных партызанскіх атрадаў было прынята рашэнне: назваць полк імем У. І. Леніна.

...У пачатку жніўня 1918 г. абстаноўка на Каспіі і Каўказе рэзка абвастрылася. І тады было прынята рашэнне зняць 1-ы Рэвалюцыйны полк імя Леніна з Заходняга фронту, накіраваць яго на Каспійска-Каўказскі фронт. Шлях ляжаў на Астрахань. 15 жніўня тут успыхнуў контррэвалюцыйны мяцеж. Вялікую ролю ў падаўленні яго адыграў Ленінскі полк.

...З гэтым палком прайшоў Іван Іванавіч Палевікоў увесь цяжкі баявы шлях ад Унечы да Церака. Быў паранены, перанес тыф і запаленне лёгкіх, абмарозіў рукі і ногі... Але перамог смерць, вытрымаў усе нягоды і цяжкасці.

У Вялікую Айчынную І. І. Палевікоў зноў граміў ворага. У званні капітана браў удзел у баях пад Арлом, дзе быў паранены, пад Оршай і Мінскам. Баявы свой шлях закончыў каля сцен Кенігсберга.

Б. Ільін

ПАЛЯНКОЎ Рыгор Паўлавіч, н. у 1901, чырвонаармеец 236 стралковага атрада. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ПАНАМАРЭНКА Фёдар Фёдаравіч, н. у 1904.

ПАЦЕЕНКА Барыс Іванавіч, н. у 1902.

З успамінаў Б. І. Пацеенкі

...Ішоў 1920 г. Рэчыцкая партыйная арганізацыя разам з працоўнымі горада і вёскі працавала над аднаўленнем разбуранай імперыялістычнай і грамадзянскай войнамі народнай гаспадаркі. Але ў гэты цяжкі час на маладую Савецкую рэспубліку пайшла вайной панская Польшча. Белапалякі знаходзіліся яшчэ далёка ад Рэчыцы, а павятовы камітэт партыі ўзяўся за арганізацыю баявога атрада з камуністаў, камсамольцаў і членаў прафсаюза. Атрад атрымаў назву — Рэчыцкая камуністычная рота. У яе саставе былі 150 чалавек, адабраных партыйнай камісіяй. Камандзірам жа роты быў прызначаны былы афіцэр царскай арміі, камуніст Качаноўскі, а справаводам — камуніст Навіцкі.

Для паскоранай баявой падрыхтоўкі роты камандзір распрацаваў спецыяльную праграму. У вызначаныя гадзіны байцы збіраліся на пляц былога базара, дзе авалодвалі вайсковым майстэрствам. Нярэдка выходзілі і ў поле, каб трэніравацца ў стральбе з вінтовак і кулямётаў.

Неўзабаве стварылася пагроза для Рэчыцы, бо белапалякі былі ўжо блізка. Але к гэтаму часу Рэчыцкая камуністычная рота ўяўляла сабой моцную баявую адзінку. Мы, члены роты, перайшлі на казарменнае становішча, пачалі звацца чырвонаармейцамі, атрымалі спецыяльныя пасведчанні.

І вось Рэчыцкая камуністычная рота атрымала заданне перакрыць дарогі, што вялі да чыгуначнага маста праз Днепр. Мы павінны былі прыкрыць адступленне 57-ай дывізіі. Дывізія ж мела загад пераправіцца праз раку і ўмацавацца на левым беразе Дняпра, каб не дапусціць белапалякаў да Гомеля.

Б. І. Пацеенка

Наша рота выйшла да вёскі Воўчая Гара, дзе перакрыла дарогу Калінкавічы — Гомель.

Мы занялі абарону, устанавілі кулямёты. У любую хвіліну былі гатовы сустрэцца з ворагам. А ў гэты час па чыгуначнаму масту часці 57-ай дывізіі перапраўляліся праз Днепр.

Неўзабаве паказаліся варожыя раз'езды. Іх сустрэлі мы інтэнсіўным агнём. Белапалякі спачатку разгубіліся, а потым, атрымаўшы моцнае падмацаванне, рассыпаліся па лесе, пачалі абыходзіць чырвонаармейцаў з мэтай акружэння. Камандаванне нашай роты разгадала намер ворага, перагрупавала сілы. Вораг нарваўся на яшчэ большы агонь, панёс немалыя страты. Прычакаў, калі падыйдзе яшчэ падмацаванне.

Давялося падымацца нам і ў штыкавую атаку. Не вытрымаўшы, белапалякі адступілі. Толькі з дапамогай артылерыі вораг здолеў нас адцясніць. Але мы ўжо ведалі, што заданне, каторае стаяла перад ротай, выканалі, бо часці 57-ай дывізіі пераправі́ліся і замацаваліся на левым беразе Дняпра.

У ліпені таго ж 1920 г. Рэчыца канчаткова была вызвалена ад белапалякаў. На месцы бітвы нашай роты каля Воўчай Гары працоўныя горада паставілі абеліск, які нагадвае людзям аб слаўных былых днях. Рашэннем жа выканкама гарсавета Фабрычна-Заводскі завулак перайменаваны ў вуліцу Камуністычнай роты. Так народ шануе памяць герояў.

ПЕКАРОЎСКІ Абрам Шлемавіч, н. у 1896. З 1918 па 1922 — чырвонаармеец 193 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 23.6.1941 па 25.8.1941 — баец атрада мясцовай абароны г. Рэчыца, з 25.8.1941 па жнівень 1942 — рад. атрада пагранічных войскаў НКУС.

ПІНСКІ Абрам Хацкелевіч, н. у 1895. З 1918 па 1921 — баец Рэчыцкай каравульнай роты. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ПЛОТКІН Мордух Саламонавіч (Сымонавіч), н. у 1895, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ПЛЯШКОЎ, баец рэчыцкага атрада «ЧОН». Загінуў у маі 1920 каля в. Воўчая Гара ў баі з белапалякамі.

РАЗАНАЎ Майсей Барысавіч, н. у 1895, баец асобнай каменданцкай каманды г. Бабруйска. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

РЫБАЛКІН Андрэй Мінаевіч, н. у 1900, курсант, мал. ваенфельчар 37 кавалерыйскага палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

РЫЎКІН Гірш Шмеркавіч, н. у 1898, чырвонаармеец 502 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

РЭЗЕР Хайм Іосіфавіч, н. у 1896.

САЗОНАЎ Іван Харытонавіч, н. у 1901, чырвонаармеец 21 кавалерыйскага палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 12 кавалерыйскага палка, 353 асобнага кавалерыйскага эскадрона, камандзір аддзялення разведчыкаў 230 гаубічнага артылерыйскага палка.

САЛАМОНАЎ Логвін Фёдаравіч, н. у 1899, курсант, кулямётчык 23 Магілёўскіх пяхотных курсаў. З верасня 1921 — пам. камандзіра кулямётнага ўзвода 80 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

САЛОБНІН Міхаіл Захаравіч, н. у 1901. З ліпеня 1920 па снежань 1923 — чырвонаармеец 25 сп.

САЛЯНКА Сцяпан Карпавіч, н. у 1896.

САСІНОЎСКІ Аляксандр Аляксандравіч, н. у 1899.

СВІСТУНОЎ Павел Фёдаравіч, н. у 1899.

СІМАКОЎ Андрэй Фёдаравіч, н. у 1897.

СКАРАХОДАЎ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1902.

СЛУДНІКАЎ Васіль Якаўлевіч, н. у 1899. З верасня 1919 па кастрычнік 1922 — чырвонаармеец 478 пп.

СМІРНОЎ Пётр Аляксандравіч, н. у 1899. З мая 1918 па красавік 1922 — чырвонаармеец асобнага кавалерыйскага эскадрона пры Валагодскай губернскай камісіі ВЧК.

СМІРНОЎ Якаў Васільевіч, н. у 1896. З лістапада 1918 па студзень 1920 — чырвонаармеец.

СМОЛЬСКІ Несцер Паўлавіч, н. у 1890.

СТАТКЕВІЧ Франц Мартынавіч, н. у 1897. Са снежня 1918 па красавік 1919 — чырвонаармеец. Адзін з арганізатараў партызанскага руху на тэрыторыі Рэчыцкага р-на ў час Вялікай Айчыннай вайны.

СТАШУК Васіль Іванавіч, н. у 1899. З 4.4.1918 па жнівень 1923 — шафёр 1 кавалерыйскага палка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

СУНЕЦ Пётр Іванавіч, н. у 1902.

СЫСОЎ Мікалай Сяргеевіч, чырвонаармеец, шафёр 7 аўтамабільнага парка.

ТАМАШУК Віталь Іосіфавіч, н. у 1896. З 1918 па 1922 — чырвонаармеец 17 сд. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

ТАЛКАЧОЎ Георгій Сцяпанавіч, н. у 1896. З 1918 па 1922 — чырвонаармеец 40 сапёрнага б-на. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 222 сп, 90 асобнага лыжнага б-на, 287 і 870 сп. Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

ТОРШЫН Андрыян Андрэевіч, н. у 1894.

Х. І. Рэзер

Р. М. Хамянок

ТОЦІКАЎ Аўрам Мікалаевіч, н. у 1901. З 10.10.1920 па снежань 1923 — чырвонаармеец 16 запаснога сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 13 сп.

ТРАСКУНОЎ Андрэй Аляксеевіч, н. у 1901.

ТРАСЦЯНСКІ Нічыпар Фёдаравіч, н. у 1902.

ХАМЯНОК Рыгор Мітрафанавіч, н. у 1893, машыніст Балтыйскага флоту.

ХАРЫТОНЧЫК Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1899. З 1920 — чырвонаармеец баявога атрада ВЧК. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ХАРЫТОНЧЫК Валянцін Фёдаравіч, н. у 1898.

ХІЛЬКЕВІЧ Пётр Платонавіч, н. у 1896. З 1918 па 1922 — чырвонаармеец, камандзір узвода 219 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЦІХАНОВІЧ Апанас Кірылавіч, н. у 1896. З 1918 па 1921 — чырвонаармеец Сумскага сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЧАРНЫШОЎ Пётр Платонавіч, н. у 1896. З 1919 па 1922 — чырвонаармеец, камандзір узвода 219 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

ЧУЦІСТАЎ. Баец Рэчыцкага атрада «ЧОН». Загінуў.

Н. П. Смольскі

А. А. Траскуноў

ЧЫЖЫК Павел Сцяпанавіч, н. у 1896.

ЧЫСЦІК Кузьма Фядосавіч, н. у 1897, чырвонаармеец. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, 8 медалямі.

ШАПІРА Хацкель Хаймавіч, н. у 1895. З 1919 па 1922 — чырвонаармеец 80 сп. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, рад. 173 б-на аэрадромнага абслугоўвання.

ШАТОН Іван Ігнатавіч, н. у 1900.

ШМАТКОЎ Васіль Яфімавіч, н. у 1899. З лістапада 1917 па красавік 1923 — чырвонаармеец 41 кавалерыйскага палка.

ШЧЭРБАЎ Апанас Рыгоравіч, н. у 1899.

ЯНЧАНКА Васіль Пятровіч, н. у 1893, чырвонафлоцец крэйсера «Грамабой».

ЯРМОЛЕНКА Аляксей Іванавіч, н. у 1895.

ЯРМОЛЕНКА Сцяпан Арцёмавіч, н. у 1896.

ЯЎСЕЕНКА Яфім Данілавіч, н. у 1899.

Удзельнікі грамадзянскай вайны, якія служылі ў Рэчыцкай павятовай міліцыі

АПАНАСЕНКА Сямён Лаўрэнцьевіч, н. у 1896. З 1919 — пам. Рэчыцкага павятовага ваенкома. У 1921 узначаліў павятовую камісію па барацьбе з бандытызмам. Браў асабісты ўдзел у разгроме банды Галака. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

АЎРАМЕНКА Канедзі Мікалаевіч, н. у 1896. У павятовую міліцыю залічаны ў 1918. Загінуў у баі з бандытамі ў студзені 1921 каля в. Удалёўка (Лоеўскі р-н).

БОЛДЗІН, мал. міліцыянер. Загінуў у 1920.

ГАЛЯКОВІЧ Аляксей Аўрамавіч, н. у 1898, мал. міліцыянер.

ГАРУКАЛАЎ, н. у в. Чорнае. Загінуў у 1919.

ГРОС, начальнік палітбюро Рэчыцкага павета па барацьбе з бандытызмам. Загінуў.

ДЗЕДЗІК Аляксей Анісімавіч, н. у 1898, мал. міліцыянер.

ДЗЕМІДЗЕНКА Ігнат, н. у 1887, справавод павятовай міліцыі.

ДУБІНСКІ Лявон, н. у 1900. У 1920 выконваў абавязкі начальніка Рэчыцкай гарадской міліцыі.

ЖАРСКІ Флорт Мікітавіч, н. у 1890, мал. міліцыянер.

ІВАНОЎ Уладзімір, н. у 1868. У 1920 з'яўляўся загадчыкам адраснага стала г. Рэчыцы.

КАВАЛЬЧУК Аляксей Авер'янавіч, н. у 1886, пам. начальніка міліцыі раёна № 7.

КАРАТКЕВІЧ Канстанцін, н. у 1890, пам. начальніка міліцыі раёна № 6.

КАСЦЮК Ілья Пятровіч, н. у 1896, начальнік міліцыі раёна № 1.

КАТЭБА (КАЦЭБА) Іван Максімавіч, н. у 1896, начальнік міліцыі раёна № 4.

П. С. Кручкоўскі

КРУЧКОЎСКІ Пётр Станіслававіч, н. у 1887. У міліцыю прыйшоў у 1919. Службу пачынаў з пасады мал. міліцыянера. Затым — старшына коннага рэзерву.

...Вясной 1920 г. было атрымана паведамленне, што каля Лоева з'явілася банда Галака. Група рэчыцкіх міліцыянераў выправілася на баявое заданне. На чале групы быў Вайцыхоўскі. Галакаўцы заўважылі міліцыянераў. Распачаўся бой. Загінулі малодшыя міліцыянеры Болдзін і Шульгін. Быў смяротна паранены Вайцыхоўскі. У гэтай крытычнай сітуацыі кіраўніцтва боем узяў на сябе П. С. Кручкоўскі...

За актыўную барацьбу з бандытызмам у 1926 г. П. С. Кручкоўскі быў узнагароджаны гадзіннікам. У лістападзе 1931 г. загадам начальніка Галоўнага кіраўніцтва Рабоча-Сялянскай міліцыі БССР участковы інспектар Рэчыцкага аддзела міліцыі Пётр Станіслававіч Кручкоўскі быў узнагароджаны знакам «Ганаровы міліцыянер».

П. С. Кручкоўскі — удзельнік першага злёту ўдарнікаў рабоча-сялянскай міліцыі БССР, які адбыўся ў маі 1933.

І. Шпадарук

КУПРЭЧЫКАЎ (КУПРЭЙЧЫКАЎ) Лук'ян М., н. у 1896, начальнік міліцыі раёна № 7.

ЛЕБІН Іван Паўлавіч, камандзір атрада 39 б-на войскаў ВЧК. Загадам па войсках Заходняга фронту ад 18.1.1922 быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

ЛОБАЧАЎ Пётр, н. у 1897, агент крымінальнага вышуку павятовай міліцыі.

МАЛЧАНАЎ Сяргей Мітрафанавіч, н. у 1893, міліцыянер.

МІТРАФАНАЎ Кірыл, н. у 1895, пам. начальніка павятовай міліцыі.

МУХТАР-ЛАНДАРСКІ М. І., камандзір Рэчыцкага атрада «ЧОН».

ПАРЭМСКІ Мікалай Лукіч, н. у 1887, начальнік міліцыі раёна № 6.

ПАТАНОЎСКІ, н. у 1867, загадчык аддзела крымінальнага вышуку павятовай міліцыі.

ПАЦЕЕНКА Міхаіл, н. у 1897, ст. міліцыянер Рэчыцкай гарадской міліцыі.

ПІКУЛЬ Ціхан, н. у 1894, камандзір узвода коннага рэзерву павятовай міліцыі.

ПОКЧАДАЎ Мікалай, н. у 1903, міліцыянер.

САЛАНЕЦ Фадзей, н. у 1892, ст. міліцыянер Рэчыцкай гарадской міліцыі.

САМОНЧЫК Фама, н. у 1895, мал. міліцыянер павятовай міліцыі.

СЛЕПАКОЎ Піліп Паўлавіч, н. у 1891. Удзельнік партызанскага руху супраць кайзераўцаў. У 1920 — пам. начальніка Рэчыцкай павятовай міліцыі. З 1921 — упаўнаважаны Рэчыцкага палітбюро па барацьбе з бандытызмам. З 1922 — сакратар Гомельскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага трыбунала. Памёр у 1961.

СМІРНОЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1895. З ліпеня 1920 — начальнік Рэчыцкай павятовай міліцыі. Быў рэпрэсіраваны ў 1937. Памёр у месцы зняволення ў 1941. Рэабілітаваны.

СУДАС Іосіф Раманавіч, мал. міліцыянер раёна № 6. Загадам за № 58 па Гомельскай губернскай міліцыі ад 1 красавіка 1922 Судасу І. Р. была аб'яўлена падзяка за тое, што «...4 января с. г. при исполнении служебных обязанностей в дер. Колбасичи Дудичской волости задержал известного бандита Жуковского».

СУНЕЦ Пётр Іванавіч, упаўнаважаны Гомельскага губернскага аддзела ГПУ па Рэчыцкаму павету.

СЦЕЛЬМАШЭНКА Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1895. У Рэчыцкую павятовую міліцыю прыйшоў у 1918. Загінуў у баі з бандытамі ў студзені 1921 каля в. Удалёўка (Лоеўскі р-н).

ТУРЦЭВІЧ Леанід, н. у 1892, сакратар Рэчыцкага палітбюро па барацьбе з бандытызмам.

ФАМІН Сцяпан, н. у 1874, сакратар Рэчыцкай павятовай міліцыі.

ФІЛІППЕНКА Сцяпан, н. у 1892, агент крымінальнага вышуку.

ФІЛОНЧЫК Усцін Карнеевіч, камандзір атрада па барацьбе з бандытызмам. Загадам па войсках Заходняга фронту ад 18.1.1922 узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

ХАМЯКОЎ. З 1919 — пам. начальніка Рэчыцкай павятовай міліцыі.

ЦІХАНАЎ Аляксандр, н. у 1900, агент крымінальнага вышуку.

ЧАРНЕЦКІ Васіль Фёдаравіч, н. у 1863, пам. начальніка міліцыі па раёну № 1.

ЧЫЖОК Аляксандр, н. у 1880, міліцыянер.

ШКУРЫН Ілья Іванавіч, пам. начальніка міліцыі раёна № 4.

ШУЛЬГА Аляксандр Пятровіч. З 1919 па 1921 — міліцыянер.

ШУЛЬГІН, мал. міліцыянер. Загінуў у 1920.

ШЫЯНАЎ Сцяпан Арсеньевіч, камандзір паўроты Рэчыцкай павятовай міліцыі. Загадам па войсках Заходняга фронту ад 18.1.1922 узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Іхні лёс — у лёсе Рэчыцы і павета

АКУЛЕНКА Сцяпан Аляксандравіч

Нарадзіўся ў 1875 г. у в. Тульгавічы Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Скончыў двухкласную школу. З юнацтва ўключыўся ў барацьбу супраць самаўладства. 19-гадовым яго выслалі з Мінскай губерні тэрмінам на два гады за шкодны ўплыў на сялян. Воляй лёсу трапіў у Кіеў, працаваў кур'ерам рэдакцыі газеты «Киевские отклики». Вясной і летам 1905 г. выконваў даручэнні мясцовага камітэта РСДРП.

Увосень 1905 г. пасля амністыі адміністрацыйным ссыльным Акуленка вярнуўся на радзіму і ўступіў у падпольны сацыял-дэмакратычны гурток у Нароўлі.

З мэтай больш шырокага ахопу людзей рэвалюцыйнай прапагандай члены гуртка ішлі ў кожную вёску. Акуленка асабіста арганізаваў у в. Барысаўшчына выступленне сялян ля маёнтка пана Ястржэмбскага. Па іх патрабаванні апошні вымушаны быў вярнуць незаконна спагнаныя на працягу года штрафы, палепшыць харчаванне батракоў, паабяцаць не звальняць і не праследаваць іх за ўдзел у рэвалюцыйным руху. 8 студзеня 1906 г. у гадавіну Крывавай нядзелі сацыял-дэмакраты арганізавалі мітынг на базарнай плошчы ў Хойніках, які скончыўся разгромам жандармскай канцылярыі і забойствам урадніка Чарняка. Ратуючыся ад праследавання ўлад, Акуленка зноў трапіў у Нароўлю.

Царскі ўрад аб'явіў па-за законам Акуленку і яго таварыша Валадковіча. Тым, хто пакажа месца іх знаходжання, была ўстаноўлена ўзнагарода.

Пазбягаючы ганення, Сцяпан Акуленка трапіў у Адэсу. У маі 1907 г. у мясцовай арганізацыі сацыял-дэмакратаў ён атрымаў пашпарт на імя Дзмітрыя Міхайлавіча Папова, пасля чаго адправіўся ў Пецярбург, дзе зноў актыўна ўключыўся ў рэвалюцыйную дзейнасць, арганізоўваў забастоўкі за павелічэнне заработнай платы і дзевяцігадзінны рабочы дзень. Як выдавец «Русской газеты», органа Пецярбургскага камітэта РСДРП, Акуленка быў арыштаваны і асуджаны на 5 гадоў турэмнага зняволення і

7 — катаргі. Першы тэрмін адбыў у Шлісельбургскай крэпасці, потым быў высланы ў сяло Казачынскае Мінусінскага павета Туруханскага краю. Калі ў Казачынскім стала вядома аб лютаўскай рэвалюцыі 1917 г., палітказтаржане пры падтрымцы сялян і салдат гарнізона арыштавалі прадстаўнікоў царскай улады, стварылі ваенна-рэвалюцыйны камітэт і заявілі аб салідарнасці з петраградскім рабочым класам. Старшынёй рэўкома быў выбраны С. А. Акуленка-Папоў.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі С. А. Акуленка вярнуўся ў родныя мясціны. Быў абраны старшынёй Рэчыцкай земскай управы. Пасля акупацыі Рэчыцы кайзераўскай Германіяй у сакавіку 1918 г. яго арыштавалі. Давялося прайсці канцэнтрацыйны лагер у Польшчы, потым турмы ў Гомелі, Кіеве, Кобрыне, адкуль выйшаў у лістападзе 1918 г. Не даехаўшы да Тульгавіч, ён быў зноў арыштаваны ў Хойніках і адпраўлены ў рэчыцкую турму, дзе неўзабаве падняў бунт, знішчыў дакументы і вывеў усіх палітзняволеных у лес. У пачатку 1919 г. сфарміраваны ім партызанскі атрад прымаў удзел у вызваленні Хойніцкай воласці Рэчыцкага павета ад нямецкіх акупантаў.

У канцы чэрвеня 1920 г., пасля канчатковага выгнання белапольскіх акупантаў, зноў пачаў працаваць у Рэчыцкім павятовым земаддзеле.

29 жніўня 1920 г. на 1-ым валасным з'ездзе Саветаў Юравіцкай воласці Сцяпан Акуленка быў выбраны членам выканкама, яму даручылі ўзначаліць савецкую ўладу ў воласці. Сакратаром валвыканкама стаў Павел Фёдаравіч Мележ, бацька народнага пісьменніка Івана Мележа.

На гэтай пасадзе Сцяпан Аляксандравіч працаваў да канца 1923 г. Ён стаў прататыпам аднаго з герояў рамана І. П. Мележа «Людзі на балоце» — старшыні Юравіцкага валвыканкама Апейкі. Пра гэта пісьменнік паведаміў сыну Акуленкі Генадзю пасля выхаду твора ў свет.

У 1924 г. Акуленка арганізаваў Тульгавіцкае сельскагаспадарчае таварыства «Араты беларус» і ўзначаліў яго праўленне.

З 1927 г. некаторы час жыў і працаваў у Маскве, потым на будаўніцтве Днепрагэса. З кастрычніка 1929 г. зноў на радзіме. Працаваў у Гомелі ў будаўнічым ФЗВ загадчыкам вытворчай часткі, потым, з 1931 г., выкладчыкам у Тульгавіцкай ШКМ. У верасні 1933 г. уладкаваўся будаўніком у Ленінградскім аддзяленні таварыства палітказтаржан.

У 1933 г. Акуленка разам з іншымі членамі таварыства быў арыштаваны па даносу, а ў 1935 г. таварыства было распушчана. Справа ў парадку нагляду трапіла да пракурора, які пазнаў у Сцяпане Аляксандравічу таго, хто выратаваў яго ў 1918 г. у Рэчыцкай турме ад здзекаў крымінальнікаў. Пракурор сказаў Акуленку, што не верыць тым даносам, якія ёсць у справе, паабяцаў хадайнічаць аб яе спыненні, але параіў пераехаць на працу ў іншае месца.

Акуленка вярнуўся на радзіму, у Тульгавічы. Працаваў у школе, дзесятнікам дарожнага аддзела Хойніцкага райвыканкама. 24 сняжня 1937 г. ён быў зноў арыштаваны Хойніцкім раённым аддзелам НКУС і 30 снежня пастановай тройкі асуджаны па абвінавачванні ў контррэвалюцыйнай агітацыі і прапагандзе. 11 студзеня 1938 г. памёр у месцах зняволення. 15 кастрычніка 1956 г. прэзідыум Гомельскага абласнога суда пастанову тройкі пры НКУС БССР ад 30.12.1937 г. у адносінах Акуленкі-Папова адмяніў, а справу за недаказанасцю абвінавачання спыніў. Сцяпан Аляксандравіч быў рэабілітаваны.

А. М. Зелянкоўскі

ЖЫЛЯК Уладзімір Васільевіч

Нарадзіўся ў 1893 г. у адной з вёсак Хойніцкай воласці Рэчыцкага павета. З сялян. Рана застаўся сіратой. У рэвалюцыю 1905—1907 гг. член Бабчынскай групы Рэчыцкай арганізацыі РСДРП. У гады першай сусветнай вайны быў прызваны ў царскую армію. Членам партыі бальшавікоў стаў у 1917 г. У кастрычніку 1918 г. абраны членам Рэчыцкага падпольнага рэўкома. У. В. Жыляк — адзін з арганізатараў рэўкомаў у валасцях Рэчыцкага павета, барацьбы супраць нямецкіх акупантаў. Загінуў 4 студзеня 1919 г.

НАЗАРАНКА Ціт Сцяпанавіч

Нарадзіўся ў 1900 г. у в. Руднае Рэчыцкага павета Мінскай губерні ў беднай сялянскай сям'і. У пошуках лепшага жыцця сям'я Назаранкаў пераехала ў Мінск. Ціт паспяхова скончыў царкоўнапрыходскую школу і паступіў у гімназію. Тут, як і ў школе, яго асабліва цікавіла літаратура. Калі пачалася першая сусветная вайна, бацька Ціта быў прызваны ў армію і ў 1915 г. загінуў на фронце. Сям'я ледзь-

У. В. Жыляк

Ц. С. Назаранка

ледзь зводзіла канцы з канцамі, таму маці вырашыла вярнуцца ў Руднае.

У 1916 г. з дыпломам народнага настаўніка прыехаў у родную вёску і Ціт Назаранка.

Лютаўскую буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю 1917 г. і звяржэнне царызму юнак сустрэў з радасцю і вырашыў, што яго месца сярод рэвалюцыйна настроенай моладзі Мінска. Неўзабаве ён стаў палітработнікам у дзеючай арміі на Заходнім фронце ў раёне Мінск — Маладзечна, дзе ўступіў у рады РСДРП.

Пасля перамогі Кастрычніка Ціт Назаранка выказаў жаданне ехаць у Хойнікі. У канцы кастрычніка 1917 г. ён перайшоў лінію фронту і прынёс сваім землякам першыя дэкрэты савецкай улады аб міры і зямлі. Прымаў удзел у стварэнні ваенна-рэвалюцыйнага камітэта ў Хойніках і стаў першым яго старшынёй.

У лютым 1918 г. нямецкія войскі пачалі наступленне і акупіравалі Хойнікі. Валасны рэўком перайшоў у падполле. Явачнай кватэрай стаў дом бацькоў Ціта Сцяпанавіча ў в. Руднае. Быў створаны партызанскі атрад, які праводзіў у Хойніцкай воласці Рэчыцкага павета дыверсіі супраць акупантаў.

13 снежня 1918 г. савецкая ўлада ў Хойніках была адноўлена. Усе сілы валасны рэўком накіраваў на стварэнне Саветаў у вёсках воласці.

З канца 1919 да 1922 г. Назаранка працаваў сакратаром Рэчыцкага павятовага камітэта РКП(б). Гэта нялёгкі час аднаўлення гаспадаркі павета, разбуранай першай сусветнай і грамадзянскай войнамі, а таксама барацьбы з бандытызмам. З 1922 г. Назаранка ў апараце Гомельскага губкома. З пасады загадчыка аддзела яго накіравалі на вучобу на эканамічнае аддзяленне Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Там ён вучыўся 2 гады.

Летам 1923 г. у час канікулаў Назаранка з групай студэнтаў і са сваёй жонкай прыязджаў у Хойнікі для правядзення масава-палітычнай работы з загадчыкамі хат-чытальняў, работнікамі сельскіх Саветаў, камсамольцамі.

Пасля сканчэння універсітэта Ціт Сцяпанавіч працаваў загадчыкам аддзела Бакінскага гаркома Азербайджана, тут сустракаўся з С. М. Кіравам. Па рэкамендацыі апошняга ў 1926 г. Назаранка быў адазваны ў Ленінград, займаў пасаду сакратара парткома завода «Электрасіла», а потым загадчыка аддзела і сакратара Ленінградскага Савета. Неаднаразова выбіраўся ў склад Маскоўска-Нарвскага райкома ВКП(б) і яго бюро, Ленінградскага абкома ВКП(б).

З 1935 г. Ціт Сцяпанавіч — парторг ЦК на «Прыбалхашбудзе», будаўніцтве медзеплавільнага камбіната, потым першы сакратар Балхашскага гаркома КП(б) Казахстана.

У пачатку снежня 1937 г. Назаранку выклікалі на міжведамасную нараду ў Свярдлоўск, а потым у Маскву да сакратара ЦК Л. Кагановіча. 6 снежня 1937 г. ён быў арыштаваны. Яго абвінавачвалі ва ўдзеле ў «праватрацкісцкай арганізацыі» ў час работы ў Ленінградзе.

11 лістапада 1938 г. адбыўся суд над удзельнікамі «ленінградскай справы». Усе яны былі прыгавораны да расстрэлу.

Вызначэннем ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 6 жніўня 1955 г. «ленінградская справа» была спынена за адсутнасцю складу злачынства і прыгавор суда ад 11 лістапада 1938 г. у адносінах Ц. С. Назаранкі быў адменены.

А. М. Зелянкоўскі

Да новага жыцця

Галечу, голад і разруху прынесла Рэчыцы і павету грамадзянская вайна. Не працавалі з-за недахопу паліва, сыравіны і абсталявання прамысловыя прадпрыемствы. Толькі пры наступленні вайсковых фарміраванняў Булак-Балаховіча (другая палова 1920 г.) абсталяванне рэчыцкіх прадпрыемстваў тройчы вывозілася, а затым вярталася назад.

Не хапала рабочых рук, жывёлы, інвентару, насення ў вёсках павета. Але людзі жылі надзеяй на лепшае, у неймаверна складаных умовах аднаўлялі разбуранае, вырошчвалі хлеб, вучылі дзяцей.

З прамысловых прадпрыемстваў Рэчыцы першай пачала падымацца запалкавая фабрыка «Дняпро». У канцы 1920 г. яна прыступіла да выпуску прадукцыі.

У другой палове 1920 г. пачаўся выпуск прадукцыі і на заводзе «Прыдняпроўскі» (цяпер метызны), які неўзабаве пачаў называцца Рэчыцкім дротава-цвікавым імя Інтэрнацыянала («Інтэрнацыянал»). І гэта прадпрыемства з'яўлялася адным з перадавых у Гомельскай губерні.

Распачаліся работы па будаўніцтву гарадской электрастанцыі. Неабходнае абсталяванне для яе было дастаўлена з Петрограда. У 1921 г. электрастанцыя дала першы ток.

Заробак рабочых быў мізэрным. Людзі жылі ў асноўным за кошт зямельных надзелаў.

Становішча ў вёсцы было яшчэ больш складаным, чым у горадзе. Палітыка ваеннага камунізму і харчразвёрсткі не спрыяла зацікаўленасці сялян ў нарошчванні вытворчасці сельгаспрадукцыі. Рэальную магчымасць атрымаць нешта больш, чым патрэбна было для сям'і, мелі так званыя «моцныя» сяляне. Яны аб'яўляліся кулакамі, да іх у першую чаргу заходзілі харчатрады. Гэта вяло да незадавальнення вяскоўцаў, а нярэдка і да ўзброенага адпору. Так, былі забіты некалькі байцоў харчатрада, накіраванага ў Маладушскую воласць Рэчыцкага павета. Тых, хто зрабіў гэта злачынства, выявіць не ўдалося.

У сакавіку 1921 г. адбыўся X з'езд РКП(б), які прыняў рашэнне аб пераходзе ад палітыкі ваеннага камунізму да новай эканамічнай палітыкі.

Праз некалькі дзён пасля гэтай падзеі адбылася 1-ая Рэчыцкая павятовая нарада старшынь селькамаў, валасных камітэтаў па сяўбе і валвыканкамаў. Яе ўдзельнікі вітралі адмену харчразвёрсткі і замену яе хлебным натуральным падаткам.

Больш шырокае абмеркаванне рашэнняў X з'езда РКП(б) аб пераходзе да харчпадатку і новай эканамічнай палітыкі зрабілі дэлегаты 5-га Рэчыцкага павятовага з'езда Саветаў (май 1921 г.). Была прынята спецыяльная рэзалюцыя, якая канстатавала, што харчразвёрсткі ставілі сялян у апазіцыю да савецкай улады, вялі да скарачэння пасяўных плошчаў, не давалі сялянству быць гаспадаром вырашчанай прадукцыі.

Павятовы з'езд Саветаў абавязаў грамадзян павета ва ўстаноўленыя тэрміны і без ніякіх пярэчанняў выконваць харчпадатак.

З'езд выказаўся за найхутчэйшае адкрыццё кустарных і сялянскіх млыноў, маслабоек і г. д.

Прайшлі ў павеце і валасныя з'езды Саветаў. Як і чакалася, яны таксама цалкам адобрылі палітыку савецкай улады.

Увогуле 1921 г. для сялянства павета быў удалым. Сабранага ўраджаю хапіла для таго, каб аддаць дзяржаве падатак, засыпаць насенны фонд, пратрымацца да новага жніва. Але ў планы вяскоўцаў павета сур'ёзныя карэктывы ўнёс страшэнны голад, які напаткаў Паволжа.

Партыйныя і савецкія органы распачалі тлумачальную работу, накіраваную на збор сродкаў для галадаючага Паволжа. У вёсках адбыліся сходы сялян, на якіх прымаліся рашэнні аб зборы прадуктаў і адзення.

У населеныя пункты павета зноў, як і раней, накіраваліся актывісты і ўпаўнаважаныя, узброеныя чырвонаармейцы. І зноў прагучалі стрэлы з-за вугла. Быў забіты ўпаўнаважаны, загадчык зямельнага аддзела Савіцкага валвыканкама Рэчыцкага павета Т. Страхатні, а неўзабаве і ягоны бацька, старшыня гэтага ж валвыканкама П. Страхатні.

У другой палове снежня 1921 г. адбыўся 6-ы Рэчыцкі павятовы з'езд Саветаў. У спецыяльнай адозве аб дапамозе галадаючым Паволжа канстатавалася, што на тэрыторыі павета не ўсё зроблена для таго, каб пракарміць 32 000 галодных.

Збор сродкаў для Паволжа працягваўся і ў першай палове наступнага, 1922 г.

Восенню 1922 г. у Рэчыцы і павеце шы-

рока адзначалася 5-ая гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ва ўсіх валасцях прайшлі сялянскія канферэнцыі, дэманстрацыі, мітынгі. Канферэнцыя Маладушскай воласці перайменавала вёску Лясны Востраў у Чырвоны Востраў, накіравала тэлеграму У. І. Леніну.

У Рэчыцы адбылася агульнагарадская рабочая канферэнцыя.

7 лістапада на святочную маніфестацыю выйшлі калектывы прадпрыемстваў, усе вайсковыя часці. На другі дзень адбыўся ўрачысты выпуск лікбеза. Амаль усе вуліцы горада атрымалі новыя, пралетарскія назвы.

З тагачасных дакументаў бачна: барацьба з непісьменнасцю ў Рэчыцы і павеце ішла сапраўды шырокімі тэмпамі. У 1920 г. у павеце функцыяніравалі 210 школ першай ступені, якія наведвалі 10 811 дзяцей. У школах працавалі 426 настаўнікаў. У тым жа годзе былі адкрыты 3 дзіцячыя дамы, якія прытулілі 160 дзяцей.

Паўсюдна адкрываліся лікбезы і хаты-чытальні. Найбольш актыўна работа ў гэтым кірунку пачала праводзіцца з сярэдзіны 1920 г. На пачатку 1921 г. у павеце працавалі 14 хат-чытальняў. Узорнай лічылася чытальня вёскі Заспа.

Вяскоўцы мелі магчымасць узяць кнігу і ў бібліятэцы Дома селяніна, адкрытага ў Рэчыцы ў 1919 г. Там працавалі і гурткі мастацкай самадзейнасці.

28 мая 1919 г. створана Рэчыцкая камсамольская арганізацыя.

Да студзеня 1920 г. пэўны ўплыў на рабочых і сялянства Рэчыцы і павета мелі і меншавікі. Але 2-і губернскі з'езд Саветаў (20—22 студзеня 1920 г.) прыняў рашэнне аб выключэнні меншавікоў з усіх органаў савецкай улады. Гэта рашэнне было спехам праведзена ў Рэчыцы і павеце.

У красавіку — маі 1920 г. у павеце прайшла перарэгістрацыя камуністаў. З 218 членаў партыі партыйныя білеты былі пакінуты толькі ў 102 чалавек *(НА РБ, ф. 1, воп. 1, спр. 146, л. 68)*. Прозвішчы выключаных былі занесены ў «чорныя спісы» і надрукаваны ў газеце «Плуг і молат», якая з'яўлялася органам Рэчыцкага павятовага выканкама.

23—27 снежня 1922 г. прайшоў X Усерасійскі з'езд Саветаў, які прыняў пастанову аб утварэнні СССР. Вынікі ягонай работы, а таксама I з'езда Саветаў СССР шырока абмяркоўваліся на канферэнцыях і сходах рабочых і сялян, у часцях Чырвонай Арміі.

На працягу студзеня — лютага 1923 г. прайшлі сялянскія канферэнцыі ва ўсіх валасцях павета.

...Канец грамадзянскай вайны для Рэчыцы і павета быў перыядам аднаўлення. Пэўная стабільнасць бачылася ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, значныя змены адбываліся ў культуры, народнай адукацыі, ахове здароўя.

Найбольш стабільна працаваў калектыў запалкавай фабрыкі «Дняпро». У 1923 г. прадпрыемства пераўзышло даваенны выпуск прадукцыі на 7,2 працэнта.

Нарошчваў выпуск прадукцыі дротавацвікавы завод. Калі ў 1922 г. завод выпусціў 26 448 пудоў прадукцыі, то ў 1923 г. — 29 489 пудоў.

У 1923 г. распачалася распілоўка драўніны на Рэчыцкім чатырохрамным лесапільным заводзе. Да канца года агульны аб'ём распілаванай драўніны склаў 42 тыс. $м^3$.

Некалькі прамысловых прадпрыемстваў дзейнічалі ў павеце. Надзейным пастаўшчыком паліва для Добрушскай папяровай фабрыкі быў торфазавод «Закрашынскі Мох», які функцыяніраваў каля Васілевіч. Здабыча торфа распачалася тут яшчэ ў 1918 г. Тады ж пачаў узводзіцца і рабочы пасёлак.

У 1925 г. у Рэчыцы прадукцыю выпускалі 7 дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў. На іх працавалі 1248 рабочых. Дзейнічалі звыш 10 дробнаўласніцкіх прадпрыемстваў. Так званыя нэпманы адкрывалі майстэрні, невялікія цэхі.

Парасткі новага бачыліся і ў сельскай гаспадарцы. У студзені 1920 г. у Рэчыцкім павеце было 9 калектыўных сельскіх гаспадарак. Камуны ў першую чаргу атрымлівалі падтрымку з боку дзяржавы. Менавіта таму адбываўся хуткі рост такіх гаспадарак. У канцы таго ж 1920 г. іх ужо 22 *(ДА Гомельскай вобл., ф. 13, воп. 1, спр. 2681, л. 84)*.

Найбольш знакамітай камунай Рэчыцкага павета была «Дняпроўская». Створана яна 12 лютага 1923 г. у былым маёнтку графіні Бараноўскай у вёсцы Суткова. У яе ўваходзілі каля 40 сялянскіх гаспадарак. Ужо ў 1924 г. камуна мела 333 дзесяціны зямлі, 18 коней, 32 каровы, 22 авечкі, 25 свіней *(ДА Гомельскай вобл., ф. 18, воп. 1, спр. 255)*.

Гордасцю Дняпроўскай сельскагаспадар-

чай камуны быў сад, які раскашаваў на 40 га. Вядома, у свой час яго садзілі людзі графіні Бараноўскай. Але і камунары клапаціліся, каб сад радзіў, каб спажываць садавіну не толькі самім, а і большую частку яе рэалізоўваць дзяржаве ці на кірмашы.

Аб сур'ёзнасці намераў камунараў сведчыць і той факт, што на Украіне «Дняпроўская» набыла неўзабаве каля 40 племянных кароў, коней, тры конныя сеялкі, столькі ж конных жняярак, малацілку, снопавязалку і бульбасаджалку *(Архіў Рэчыцкага краязнаўчага музея, ф. 5, спр. 2)*.

Першы старшыня камуны — Іван Мікалаевіч Смірноў. Ягонымі найпершымі памочнікамі былі Ф. Д. Кавальчук, І. І. Махонька, І. Р. Пінчук, К. Д. Пінчук, І. А. Пузік, Я. Д. Яўсеенка. Усе яны ўваходзілі ў мясцовую партыйную ячэйку, паказвалі прыклад у працы. Пазней І. Р. Пінчук, К. Д. Пінчук, І. А. Пузік і Я. Д. Яўсеенка былі абраны старшынямі калгасаў Гомельскага і Рэчыцкага раёнаў.

Уздым сельскіх калектыўных гаспадарак — адно з пытанняў VII Рэчыцкай павятова-гарадской партыйнай канферэнцыі (10 кастрычніка 1922 г.).

Пытанні развіцця сельскай гаспадаркі і прамысловасці разглядаліся і на VIII Рэчыцкай павятова-гарадской партыйнай канферэнцыі. Прайшла яна 11—14 сакавіка 1923 г. Дэлегаты канферэнцыі прызналі: галоўнае ў прамысловасці — планавае развіццё, у сельскай гаспадарцы — культура ў апрацоўцы зямлі, паляпшэнне сельскагаспадарчай адукацыі.

Падчас работы канферэнцыі Рэчыцкі павет меў 247 383 дзесяціны ворнай зямлі. Насельніцтва павета — 319 393 чалавекі. 7 тыс. вясковых гаспадарак не мелі кароў. Ураджайнасць збожжавых і бульбы была ніжэй сярэдняга паказчыка па губерні. Гэта і зразумела: у Рэчыцкім павеце 100 тыс. дзесяцін зямлі займалі балоты, а яшчэ 70 тыс. дзесяцін — малаўрадлівая пясчаная глеба.

У пачатку 20-ых гадоў пэўная частка сялянскіх гаспадарак Рэчыцкага павета паляпшэнне свайго матэрыяльнага становішча бачыла не ў камунах, а ў выхадзе на хутары. Але ўлады бачылі ў гэтым падрыў курсу на далучэнне сялянства да калектывізацыі. VIII Рэчыцкая павятова-гарадская канферэнцыя канстатавала: развіццё хутарской гаспадаркі — з'ява непажаданая і шкодная.

Толькі на працягу 1925 г. у Рэчыцкім павеце было арганізавана 51 сельскагаспадарчае таварыства рознага напрамку — крэдытныя, садова-агародныя, малочна-масларобчыя, пчалярскія, меліярацыйныя, машынныя, будаўнічыя і г. д., якія мелі 10 145 дзесяцін зямлі.

Да сярэдзіны 1926 г. у павеце дзейнічалі 98 усемагчымых аб'яднанняў, якія мелі звыш 11 тысяч пайшчыкаў. Агульная пасяўная плошча складала 111 298 дзесяцін зямлі. Вяскоўцы мелі каля 185 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, звыш 68 тысяч коней.

На XII павятовай партыйнай канферэнцыі (14—17 лістапада 1925 г.) разам з чыста гаспадарчымі пытаннямі абмяркоўвалася і пытанне распаўсюджвання партыйнага ўплыву на сялянства павета. Адзначалася, што па стану на 2 кастрычніка 1925 г. на партыйным уліку ў Рэчыцкім павеце 574 камуністы і 1444 камсамольцы. У павеце працуюць адзін ленінскі і 12 іншых палітычных гурткоў, пры хатах-чытальнях — 2 літаратурныя, 10 харавых і драматычных гурткоў. Асабліва станоўча адзначалася работа 8 сельскагаспадарчых гурткоў.

У сярэдзіне 1925 г. у павеце было ўзята на ўлік 1712 батракоў. Пераважная большасць іх брала актыўны ўдзел у камітэтах сялянскай узаемадапамогі, якіх было звыш 200.

Аднаўленчы перыяд для Рэчыцы і павета характэрны значнымі дасягненнямі ў культуры, народнай адукацыі, ахове здароўя. Толькі ў Рэчыцы ў 1924—1925 гадах працавалі 12 школ. Горад меў добрую бібліятэку.

Значнай падзеяй стала адкрыццё ў 1925 г. школы сялянскай моладзі. Мэта школы — падрыхтоўка спецыялістаў для сельскай гаспадаркі, кааперацыі, савецкіх органаў.

У 1925—1926 гадах Рэчыцкі павет меў 73 спецыялісты сельскай гаспадаркі: 14 аграномаў, 6 памочнікаў агранома, 20 каморнікаў, 5 ветэрынарных урачоў, 9 ветфельчараў, 2 гідратэхнікаў.

Амаль ва ўсіх населеных пунктах былі ўзведзены або прыстасаваны клубы. У Горвалі пабудавана ўчастковая бальніца, у якой працавалі два ўрачы, два фельчары, дзве акушэркі.

Вядома, станаўленне новага ў Рэчыцы і павеце таксама сустракала часам адкрытае супраціўленне. Так, быў забіты старшыня

Нова-Барсуцкага сельсавета Іван Восіпавіч Пшаноў, які прыехаў у вёску Смагарын, каб правесці сход сялянскай беднаты.

У павеце працягвалі дзейнічаць дробныя банды.

Галоўная падзея 1926 г. — далучэнне Гомельскага і Рэчыцкага паветаў да БССР.

На тэрыторыі Рэчыцкага павета, а цяпер акругі, з'явіліся раёны. Статус раёнаў атрымалі былыя воласці. Але ў 1927 г. Рэчыцкая акруга была скасавана.

Архіўныя дакументы даюць магчымасць прасачыць, што ўяўляла Рэчыцкая акруга на перыяд свайго ўтварэння. Дзейнічалі 13 прамысловых прадпрыемстваў, на якіх працавалі 2006 рабочых. Найбольш перадавым, як і раней, з'яўлялася запалкавая фабрыка «Дняпро». У 1925 г. і пачатку 1926 г. на фабрыцы былі ўстаноўлены машына і 2 механічныя прэсы для вытворчасці фанеры. Гэта дазволіла павялічыць яе выпуск у два разы, хаця колькасць рабочых, занятых на вытворчасці, павялічылася толькі на 48 працэнтаў.

Са сводкі аб забяспечванні гаспадарак павета асноўнымі крыніцамі даходаў, якія падлягалі пад аблажэнне сельскагаспадарчым падаткам, бачна: у 1926 г. былі 40 804 сельскія гаспадаркі, колькасць едакоў — 223 677 чалавек. Сяляне мелі 48 217 коней, 81 198 кароў.

Пераважная доля вясковых гаспадарак (49,5 працэнта) карысталася надзеламі зямлі ад 2 да 5 га. Звыш 5 га мелі толькі 9,2 працэнта гаспадарак. 320 гаспадарак, або 0,7 працэнта, зямлі не мелі наогул.

Вяскоўцы карысталіся 203 плугамі і культыватарамі, выраблены мі на заводзе. У павеце было 345 малацілак і веялак, 4 трактары.

Другі перапіс насельніцтва (15 снежня 1926 г.) паказаў: насельніцтва Рэчыцы — 16 486 чалавек.

Далёка не ўсе жыхары Рэчыцкага павета (акругі) мелі магчымасць карміцца з зямлі ці знайсці работу. Выйсце з такога становішча многім бачылася ў перасяленні. Рэчыцкі земаддзел за перыяд з 1 сакавіка па 28 жніўня 1926 г. выдаў дакументы на перасяленне ў Паволжа, Сібір і Далёкі Усход 34 сельскім гаспадаркам і 107 вяскоўцам, якія жадалі перасяліцца без сем'яў. Але ахвотнікаў на перасяленне было нашмат больш. Так, ехаць у Паволжа выказваліся 242 гаспадаркі (1878 душ), у Сібір — 125 гаспадарак (834 душы), на Далёкі Усход — 371 гаспадарка (2579 душ). *(ДА Гомельскай вобл., ф. 28, воп. 1, ад. зах. № 252, арк. 6).*

У 1927 г. буйнейшым прадпрыемствам Рэчыцы заставалася запалкавая фабрыка «Дняпро». На ёй працавалі 1300 рабочых, якія выраблялі за год 283 880 скрынь запалак. Прадукцыя фабрыкі накіроўвалася ў асноўным на Украіну, Дон, Каўказ. Значная частка яе ішла ў Турцыю, Персію (Іран), Грэцыю і Афганістан. Фанерны завод фабрыкі «Дняпро» выпрацоўваў за год 9334 м^3 фанеры.

24 сакавіка 1927 г. рэспубліканская газета «Звязда» паведамляла сваім чытачам: замест фабрыкі «Дняпро» ў Рэчыцы неўзабаве ўвойдзе ў строй буйнейшая ў Саюзе запалкавая фабрыка, якая будзе абсталявана па апошняму слову тэхнікі замежнымі машынамі.

Сапраўды, такая фабрыка ў другой палове года распачала выпуск прадукцыі. Новае прадпрыемства атрымала назву «Х Кастрычнік». Але з уводам яго не была ліквідавана і фабрыка «Дняпро». Больш таго, па стану на 1 лістапада 1928 г. у Рэчыцы толькі фабрыка «Дняпро» мела колькасць рабочых больш чым за 300 чалавек.

Восенню 1928 г. распачаліся падрыхтоўчыя работы па будаўніцтву Рэчыцкага завода дубільных экстрактаў імя Варашылава, а ў 1929 г. у вёсцы Азершчына пачала ўзводзіцца суднаверф.

...У 1927 г. XV з'езд партыі прыняў рашэнне аб правядзенні калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Ва ўмовах аўтарытарна-бюракратычнай сістэмы кіравання план суцэльнай калектывізацыі прывёў да далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі, забяспечыў краіну хлебам, падняў культурны ўзровень насельніцтва. Разам з тым калектывізацыя з'явілася страшэннай бядой для вялікай колькасці сялян. Пачаліся раскулачванні, высяленні ў паўночныя раёны краіны, зняволенні ў канцлагеры і так званыя папраўча-працоўныя лагеры, расстрэлы. Рэпрэсіі ахапілі і гарады (гл. артыкул «Беззаконне»).

Першыя калгасы ў раёне былі ўтвораны ў сярэдзіне 1929 г. — імя Калініна (в. Пракісель), імя Дзяржынскага (в. Ровенская Слабада), «Ленінскі шлях» (в. Ямпаль), «Парастак сацыялізму» (в. Глыбаў) і г. д.

У канцы 1929 г. Рэчыцкі раён меў 17 калгасаў. У іх уваходзілі 503 сям'і. Грамадскі фонд гаспадарак — 5076 га вор-

Першая ўдарная брыгада клеевага цэху Рэчыцкай запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік». 1930 г.

най зямлі, 1903 га сенажацяў, 76 га садоў.

У рэзалюцыі Рэчыцкай раённай партыйнай арганізацыі (28—29 верасня 1929 г.) ставілася задача ў 1930 г. давесці пасяўныя плошчы калгасаў да 10,5 тысячы га (12 працэнтаў зямельнага фонду раёна). Сельскім Саветам належала ўзмацніць работу па калектывізацыі сялянства.

Згодна афіцыйных даных, у сярэдзіне 1930 г. у Рэчыцкім раёне было 45 калгасаў, у якія ўваходзілі 3400 сем'яў. Лічбы, па ўсёй верагоднасці, далёка не дакладныя. Шмат якія калгасы арганізоўваліся, а затым распадаліся. Так, калгас «Іскра» (в. Роўнае) ствараўся тройчы: у 1929, 1930 і 1931 гадах. Асобныя гаспадаркі былі пасапраўднаму карлікавымі. Напрыклад, калгас «Чырвоны баец» (в. Бязуеў) быў утвораны вясной 1930 г. У яго ўваходзілі 10 сялянскіх гаспадарак. Членамі арцелі з'яўляліся 33 чалавекі. Калгас меў толькі 22 га ворнай зямлі, 9 галоў рабочай жывёлы, трох кароў. Кошт сельгасмашын калгаса «Чырвоны баец» па стану на 5 мая 1930 г. — 50 руб., транспарту і вупражы — 380 руб. Недзялімы фонд ацэньваўся ўсяго ў 280 руб.

1930-ы — год нараджэння дзвюх дзяржаўных гаспадарак — луггасаў «Ведрыч» (цяпер племзавод «Ведрыч») і «Рэчыца» (цяпер саўгас «Рэчыцкі»). Яны ўзніклі на асушаных тарфяніках, мелі задачу нарыхтоўваць сена для патрэб Чырвонай Арміі.

...Сярэдзіна 20-ых — пачатак 30-ых гадоў — перыяд вялікіх змен у культуры, народнай адукацыі, ахове здароўя. Рэчыца была ў асноўным радыёфіцыравана. У 1926 г. радыё прыйшло і ў бліжэйшыя ад горада населеныя пункты.

Рэчыца мела кінатэатр. 7 кінаперасовак працавалі ў 1926 г. у Рэчыцкай акрузе. Але бюро акружкома партыі прыняло рашэнне аб набыцці яшчэ дзвюх кінаперасовак. Указала на неабходнасць знізіць плату за прагляд кінастужкі з такім разлікам, каб яна была не вышэй 10 капеек. Усе вясковыя кінаперасоўкі пераводзіліся на дзяржбюджэт. Ставілася задача на працягу двух наступных гадоў у населеных пунктах, дзе звыш 200 двароў і ёсць клубныя памяшканні, абсталяваць стацыянарныя кінаўстаноўкі.

У 1927 г. кніжны фонд Рэчыцкай цэнтральнай бібліятэкі налічваў звыш 14 тыс. экземпляраў. Бібліятэкі меліся ў кожным сельсавеце. Вясковых жыхароў абслугоўвалі звыш 200 кнігаперасовак. Газеты і часопісы ішлі ў кожную вёску раёна.

З 1926 г. пачалося адкрыццё няпоўных сярэдніх школ, з 1931 г. — сярэдніх. У 1924 г. у Васілевічах быў адкрыты лясны тэхнікум, які ў 1927 г. быў перайменаваны ў лесатэхнічную школу. Школа з'яўлялася сапраўдным цэнтрам культурнага жыцця мястэчка. Яна мела нават свой батанічны сад.

У буйных населеных пунктах адкрыліся ўчастковыя бальніцы (мястэчкі Васілевічы, Горваль, Холмеч, вёскі Заспа, Новы Барсук).

З 7 лістапада пачала выходзіць газета «Рэчыцкая праўда», орган раённага камітэта партыі і райсавета.

Пачынаючы з 1931 г. флагманам прамысловай вытворчасці Рэчыцы становіцца запалкавая фабрыка «Х Кастрычнік». Калектыў прадпрыемства рэгулярна выходзіў пераможцам у спаборніцтве калектываў саюзнай запалкавай вытворчасці.

21 студзеня 1935 г. пастановай Прэзідыума ЦВК БССР за ўзорныя паказчыкі работы, поспехі ў правядзенні палітычна-гаспадарчых кампаній, выкананне планаў сацыялістычнага будаўніцтва фабрыка «Х Кастрычнік» была занесена ў Чырвоную кнігу імя XI Усебеларускага з'езда Саветаў. Гэтай жа пастановай у Чырвоную кнігу быў занесены і фанерны завод імя Галадзеда, які ўваходзіў у фабрыку «Х Кастрычнік»: «...за датэрміновае (13 снежня 1934 г.) выкананне гадавой праграмы, ахоп усіх рабочых спаборніцтвам і ўдарніцтвам, ахоп 73 % усіх рабочых тэхвучобай, паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў рабочых».

10 студзеня 1936 г. Цэнтральная рада прафесіянальных саюзаў Беларусі сабрала



Завод дубільных экстрактаў імя Варашылава. 1931 г.

звесткі аб колькасці стаханаўцаў на прадпрыемствах рэспублікі. Па Рэчыцы стаханаўцаў было 1364 чалавекі. Амаль усе — працаўнікі запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік» і фанернага завода імя Галадзеда.

У 1942 г., калі ўжо ішла Вялікая Айчынная вайна, Савет Народных Камісараў БССР выдаў у Маскве агляд аб стане народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва Гомельскай вобласці да пачатку вайны. У аглядзе адзначалася: «Буйнейшымі індустрыяльнымі цэнтрамі вобласці з'яўляліся гг. Гомель, Речыца и Добруш». Фабрыка «Х Кастрычнік» была названа як буйнейшае і перадавое прадпрыемства прамысловасці па пераапрацоўцы драўніны.

У лютым 1931 г. выдаў першую партыю дубільнага экстракта Рэчыцкі завод імя Варашылава. Калектыў прадпрыемства правадзіў мэтанакіраваную работу па асваенню праектнай магутнасці, паляпшэнню якасці прадукцыі, удасканаленню тэхналогіі і арганізацыі вытворчасці. У 1932 г. на заводзе працавалі 171 чалавек, валавая прадукцыя па цэнах 1926/27 гг. — 1485,6 мільёна руб., асноўныя фонды на 1 студзеня 1933 г. — 2,17 мільёна руб.

У 1936 г. выпуск экстракта ў параўнанні з 1931 г. падвоіўся. Прадпрыемства пачало выпускаць прадукцыю для адпраўкі на экспарт.

Буйным прадпрыемствам Рэчыцы з'яўляўся і дротава-цвікавы завод імя Інтэрнацыянала. На пачатку 1931 г. калектыў прадпрыемства складалі 370 чалавек.

Пастановай СНК БССР ад 25 чэрвеня 1935 г. намячаліся шляхі рэканструкцыі прадпрыемства. Быў расшыраны дротавы цэх, узведзена новае травільнае аддзяленне, пераабсталяваны электрасеткі і г. д. Усё гэта дало магчымасць калектыву дротава-цвікавага завода аб'ём прамысловай вытворчасці за час перадваенных пяцігодак нарасціць у 390 разоў, па выпуску цвікоў — у 79, дроту — у 564 разы. Прадукцыйнасць працы на кожнага працаўніка павялічылася ў 22 разы, вытворчыя плошчы — у 7 разоў, колькасць працуючых — у 25 разоў. У 1940 г. за суткі завод выпускаў 27 т цвікоў.

28 ліпеня 1941 г. завод быў спынены. Асноўныя дэталі станкоў былі эвакуіраваны ў гарады Барнаул і Горкі.

Рэчычане ганарыліся тым, што прадукцыя іхніх прадпрыемстваў знаходзіла попыт не толькі ў краіне, але і за яе межамі. Газета «Звязда» ў нумары ад 12 студзеня 1937 г. паведамляла, што фанера «...Рэчыцкага завода імя Галадзеда экспартавалася ў мінулым годзе ў 30 краін свету, у тым ліку ў Паўднёвую Амерыку, Грэцыю, Македонію, Палесціну, Сірыю і інш. Якасць фанеры высокая. За ўвесь год ад замежных фірм не паступіла ніякіх прэтэнзій і рэкламацый на якасць тавараў».

У 1937 г. удзельная вага фанеры ў лесаэкспарце БССР склала 90 %. Яна пачала

экспартавацца ў ЗША. Амаль трэць беларускай фанеры, якую купілі ЗША ў перадваенныя гады, была выраблена ў Рэчыцы.

...Вялізныя змены адбываліся ў вёсцы. І асабліва там, дзе калгасы былі не дробнымі і кволымі, а па-сапраўднаму буйныя, дзе іх узначальвалі таленавітыя арганізатары і спецыялісты. Прыкладам такой гаспадаркі быў калгас імя Калініна (в. Пракісель). У 1931 г. калгас аб'ядноўваў 250 сялянскіх гаспадарак, меў 4000 га зямлі. Арганізатарам калгаса і яго першым старшынёй быў С. Д. Ляскавец, актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны, дэлегат III Усерасійскага з'езда Саветаў, аграном па спецыяльнасці.

Увогуле калектывізацыя ў Рэчыцкім раёне ішла больш сціплымі тэмпамі, чым у сярэднім па рэспубліцы. У 1933 г. удзельная вага сацыялістычнага сектара ў сельскай гаспадарцы складала па раёну 40 %. Па рэспубліцы гэта лічба перавышала 50 %. Ураджайнасць сельскагаспадарчых культур была па раёну наступнай: жыта — 10,5 ц з га, азімая пшаніца — 11,5, пшаніца яравая — 9,4, ячмень — 12 ц з га. Гаспадаркі раёна мелі 6817 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 2703 каровы. На калектыўных фермах утрымліваліся 1315 авечак.

Да 1933 г. раён спецыялізаваўся на вырошчванні канапель і бульбы. У 1934 г. спецыялізацыя стала жывёлагадоўчай.

Па выніках работы за 1933 г. працадзень «важыў» у сярэднім па раёну 2—3 кг збожжа, 7—8 кг бульбы. У перадавых гаспадарках, як калгасы імя Калініна, «Парастак сацыялізму» і г. д., на працадзень выпадала па 5—6 кг збожжа, па 11—12 кг бульбы.

Планам на 1934 г. колькасць малочнатаварных ферм раёна меркавалася давесці да 112 (9540 галоў буйной рагатай жывёлы), свінаводчых ферм — да 60 (3200 свіней), авечкаферм — да 40 (1800 авечак).

Дасягнуць запланаванага не ўдалося. На раён зноў абрынулася вострая крытыка.

Даныя ўлікова-даведачнага аддзела Наркамзема БССР аб ходзе калектывізацыі ў рэспубліцы па стану на 1 жніўня 1939 г. паказваюць: тэмпы калектывізацыі ў Рэчыцкім раёне былі найменшымі па Гомельшчыне. Працэнт калектывізаваных двароў па вобласці вымяраўся лічбай 87,4, а ў Рэчыцкім раёне — 81,0. Становішча амаль не змянілася і ў наступным, 1940 г. Працэнт калектывізаваных двароў узрос усяго на 0,2 працэнта. У раёне меліся 2080 сялянскіх гаспадарак, якія заставаліся *аднаасобнымі і не жадалі* ўступаць у калгасы.

У 1940 г. у раёне функцыяніравалі 80 калгасаў. Агульная плошча сельгасугоддзяў складала 99 724 га, ворнай зямлі — 33 233 га. У раёне былі: 80 малочнатаварных ферм, 71 авечкаферма, 58 свінаводчых ферм.

Значную дапамогу гаспадаркам раёна аказвалі калектывы машынна-трактарных станцый — Азершчынскай, Рэчыцкай, Холмецкай. Буйнейшай была Рэчыцкая. Яна мела 32 трактары і 7 камбайнаў. 26 трактараў і 3 камбайны былі ў Азершчынскай МТС. У Холмецкай МТС — 22 трактары і 5 камбайнаў.

Асноўныя раённыя прадпрыемствы — спіртзавод (в. Салтанова), крухмальны завод (в. Заспа), сеназавод і завод па вытворчасці шпалаў. У раёне дзейнічалі 6 водаў па вытворчасці цэглы, 36 млыноў (13 паравых, астатнія — ветракі).

30-ыя гады далі новы штуршок разгортванню культурна-выхаваўчай работы. Лекцыйная прапаганда, даведачная работа, калектыўныя чыткі, гутаркі, вечары адпачынку, выпуск насценных газет былі абавязковымі для кожнай установы культуры Рэчыцы і раёна.

Сапраўднай падзеяй культурнага жыцця Рэчыцы і раёна стала нараджэнне Азершчынскага хору, які неўзабаве стаў народным. Арганізатар яго — Т. К. Лапацінка.

20 жніўня 1936 г. адбылося першае выступленне хору па рэчыцкаму радыё.

Значныя змены мелі месца ў галіне народнай адукацыі. У 1930 г. у Рэчыцы адкрылася педагагічнае вучылішча, у 1931 г. — рабфак. Да 1938 г., калі адбыўся сёмы выпуск, вучылішча падрыхтавала для школ рэспублікі звыш 500 кваліфікаваных спецыялістаў.

Шырокай папулярнасцю ў вясковай моладзі карысталіся курсы механізатараў, якія дзейнічалі пры Рэчыцкай МТС. Арганізаваліся яны ў снежні 1931 г. Першымі слухачамі курсаў сталі 126 хлопцаў і дзяўчат — накіраванцаў гаспадарак раёна.

Курсы працавалі да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

З даных за 1935 г. бачна: у Рэчыцы была адна сярэдняя, дзве сямігадовыя і 6 пачатковых школ. Расла колькасць школ вячэрніх. На пачатак 1938 г. іх было звыш дваццаці.

У раёне ў 1939 г. функцыяніравалі 38 пачатковых, 24 няпоўныя сярэднія і 7 сярэдніх школ. Раённы калектыў педагогаў складалі 435 настаўнікаў. У пачатковых школах раёна вучыліся 2987 хлопчыкаў і дзяўчынак, няпоўных сярэдніх — 6142 і ў сярэдніх — 3569 вучняў.

У 1937 г. у Рэчыцы была створана паўтарагадовая школа медыцынскіх сясцёр.

У 1940 г. бальніцы Рэчыцы мелі 350 ложкаў, раённыя — 75. Пачынаючы з 1934 г. хірургічныя паласныя аперацыі пачалі праводзіцца ў Васілевіцкай участковай бальніцы.

...У жніўні 1936 г. у клубе фабрыкі «Х Кастрычнік» адбыўся Усесаюзны злёт стаханаўцаў прадпрыемстваў па выпуску запалак. Выбар Рэчыцы для правядзення такога мерапрыемства быў не выпадковым. Фабрыка ў чарговы раз стала пераможцам усесаюзнага спаборніцтва, па-другое, амаль усе яе працаўнікі з'яўляліся стаханаўцамі і рацыяналізатарамі.

...Другая палова 30-ых гадоў праходзіла ў перадгразавой атмасферы. Мала для каго было сакрэтам, што СССР чакае вайна з фашысцкай Германіяй. Прадпрыемствы горада перадалі значную суму грошай сем'ям рэспубліканцаў, у якіх былі загінуўшыя ў барацьбе з фашыстамі ў Іспаніі. У 1935 г. на сродкі запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік» былі створаны школа парашутнага спорту і планерны гурток. У іх займаліся звыш 60 хлопцаў і дзяўчат.

У 1936 г. у Рэчыцы дзейнічала 31 пярвічная арганізацыя Асаавіяхіма. Моладзь вывучала зброю, здавала нормы на абарончыя значкі. Тым самым рыхтавалася да абароны Радзімы.

6 жніўня 1936 г. у Рэчыцу прыляцеў агітсамалёт імя Максіма Горкага. Яго сустракалі тысячы людзей, прадстаўнікі ўсіх прадпрыемстваў і арганізацый горада.

Неўзабаве ў Рэчыцы пачаў дзейнічаць авіяклуб. Ягоныя курсанты ганарыліся земляком Юрыем Рыгоравічам Прылуцкім, кавалерам ордэна Леніна, узнагароджаным за ўдзел у 1935 г. у палёце на стратастаце «СССР — 1-біс». Шмат хто з курсантаў авіяклуба сталі потым ваеннымі лётчыкамі, мужна змагаліся з ворагам на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з іх — Сцяпан Сямёнавіч Гошка, кавалер ордэна Леніна. Гэту ўзнагароду наш зямляк атрымаў за першы таран у небе Масквы, здзейснены днём.

У Рэчыцы і раёне працавала нямала людзей, якія дасягалі высокіх вытворчых паказчыкаў. На цвікавым заводзе імя Інтэрнацыянала А. Туранок абслугоўвала 7 станкоў замест 3 па норме. Клейшчыца карабкоў запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік» М. Сцепіна нярэдка дзённыя нормы выпрацоўкі перавышала больш чым у тры разы. Адной з лепшых стаханавак-настаўніц з'яўлялася яшчэ адна працаўніца фабрыкі — О. Лазарэвіч. На прадпрыемства прыйшла ў 12 гадоў. Асвоіла прафесію клейшчыцы карабкоў. На «выдатна» здала тэхэкзамен. Пачала працаваць на двух, а потым і на трох станках. Арганізавала ў брыгадзе спаборніцтва. Неўзабаве ўсе яе сяброўкі сталі стаханаўцамі. Амаль з усіх роднасных прадпрыемстваў краіны прыязджалі ў Рэчыцу дэлегацыі для пераймання вопыту Лазарэвіч. Яна была запрошана на Ленінградскую фабрыку запалак, дзе на працягу трох месяцаў перадавала свой вопыт іншым.

У раёне грымела слава Т. У. Гарая, брыгадзіра калгаса «Савецкая Беларусь», дэлегата II Усесаюзнага з'езда калгаснікаўударнікаў, які адбыўся ў лютым 1936 г. Сярод лепшых калгаснікаў былі таксама ардэнаносцы Піліп Зайцаў і Марыя Саранчук.

...У 1938 г., паводле новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу сучаснай Гомельшчыны, былі ўтвораны дзве вобласці — Гомельская і Палеская. Рэчыцкі раён увайшоў у склад Гомельскай вобласці. Але без Васілевіч. Бо яны таксама сталі раённым цэнтрам і ўвайшлі ў склад Палескай вобласці.

З 10 чэрвеня 1938 г. пачала выходзіць газета «Зара камуны», орган Рэчыцкага РК КП(б)Б і выканкама райсавета. Органам Васілевіцкага РК КП(б)Б і Васілевіцкага выканкама райсавета стала газета «Сацыялістычная праца».

Насельніцтва перадваеннай Рэчыцы — звыш 30 тыс. чалавек, раёна — амаль 57 тыс. Тэрыторыя раёна — 884 кв. км. У раёне быў 21 сельскі Савет.

Аналізуючы 30-ыя гады і дамагаючыся гістарычнай праўдзівасці, нельга падыходзіць да гэтага перыяду, і найперш да калектывізацыі, аднабакова. Калектывізацыя мела шмат адмоўнага і трагічнага. Але станаўленне калгаснага ладу прывяло да ўздыму вёскі. Добра бачна гэта на прыкладзе Горваля. Перад вайной там былі: школа-дзесяцігодка, клуб, бібліятэка, дзіцячыя

яслі, участковая бальніца, аптэка, ветэрынарная лячэбніца, дзве крамы, некалькі ларкоў, хлебапякарня, паравы млын, шавецкая майстэрня, майстэрня па пашыву ботаў, пошта.

Пераважная большасць жыхароў Горваля, як і астатніх вёсак раёна, з упэўненасцю глядзелі ў будучае, верылі ў тое, што заўтрашні дзень будзе больш шчаслівым. Светлыя мары і спадзяванні на лепшую будучыню перакрэсліла Вялікая Айчынная вайна.

А. П. Рабянок, П. П. Рабянок

Паведамленне аб нядзельніку на Дняпроўскім мосце ў Рэчыцы

15 сакавіка 1921 г.

6 марта по инициативе укома РКП, при участии подива и упрофбюро был устроен грандиозный воскресник на Днепровском мосту. Участвовало 331 чел., из них 110 коммунистов. Работали 4 часа. Нагружено на платформы булыжника 5 куб. саж., распилено и расколото дров 1 куб. саж., разобрано у паромной переправы с уборкой материала 15 пог. саж. дров и произведены другие работы.

Газета «Полесская правда» № 242, 15.3.1921 г.

Аб першым вопыце калектыўнага забеспячэння на Рэчыцкай запалкавай фабрыцы «Днепр»

10 ліпеня 1921 г.

Образцовая фабрика

Фабрика «Днепр» считается самой образцовой среди всех остальных фабрик Полесского района как по производительности, так и по состоянию трудовой дисциплины и интенсивности труда.

Враги не сломили

Разгромленная белополяками в мае месяце прошлого года, фабрика в короткий срок усилиями рабочих была восстановлена. Несмотря на то, что вслед за этим, ввиду наступления Балаховича, фабрика 3 раза эвакуировалась и возвращалась на место, все до мелочи было сохранено, и в последних числах ноября фабрика получила возможность нормальной работы.

На Красную доску

Рабочие взялись за работу весьма усердно, и в первый же месяц, т. е. в декабре прошлого года, фабрика выполнила 135 процентов производственной программы. За такую высокую производительность, быстрое восстановление разрушенной фабрики рабочие были занесены на Красную доску и им была выражена благодарность от лица губернского правления союза химиков.

Впереди остальных

В дальнейшем фабрика работала с неменьшим успехом и за первые 4 месяца этого года по производительности труда идет на первом месте среди всех остальных спичечных фабрик нашего района.

Восстановление фанерного цеха

Наряду с этим, в течение этого времени производилось восстановление фанерного завода, особенно сильно пострадавшего от белополяков. По окончании ремонта завод был пущен в ход 7 июля и за первые 16 дней выпустил 105 куб. м. фанеры, что составляет на одну смену $6^3/_4$ куб. м., т. е. почти норму мирного времени.

Переход на коллективное снабжение

1 июля фабрика, согласно постановлению губэкономсовета, перешла на сдельно-коллективную систему оплаты труда. Фабрике отпускаются продукты по расчету выпускаемых единиц фабрикатов, т. е. ящиков спичек или куб. м. фанеры. В основу расчета взято количество продуктов, отпускавшихся государством рабочим, падающих на каждую единицу фабрикатов, выпущенных в первые 4 месяца этого года. Производственная программа фабрики повышена с 3500 до 6000 ящиков спичек в месяц; то же с фанерным заводом.

20 июня общее собрание рабочих одобрило эту систему, и 26 июня губэкономсовет вынес постановление о введении этой системы с 1 июля в виде опыта на 2 месяца и о забронировании продуктов.

Первые шаги

Вслед за этим в течение 2 дней был установлен нормальный штат, сокращенный на 75 человек. Так, по спичечной фабрике штат установлен в 463 чел. и по фанерному заводу в 102, а всего 565 чел., вместо прежнего количества, доходившего до 660 чел. и выше. Затем выработаны продуктовые ставки, нормы и расценки на каждый род работы и на каждого рабочего. Вся эта колоссальная работа была проделана с такой точностью, что она почти не вызвала ни одного возражения на общем собрании 20 июня, на котором рабочие знакомились с деталями новой системы.

Опасения напрасны

Общим собранием новая система оплаты труда была принята единодушно, если не считать единичных товарищей, опасавшихся за выполнение полностью нового высокого задания, вследствие наступающего времени сенокоса и жатвы. Однако сомнения эти были рассеяны, т. к. рабочих, связанных с полевыми работами, на фабрике немного, всего лишь процентов 15.

Голос рабочих

Общим собранием принята следующая резолюция:

Заслушав доклад о сдельно-коллективной оплате труда и прения по докладу, общее собрание рабочих и служащих государственной спичечной фабрики и фанерного завода «Днепр» приветствует новую систему оплаты труда, предлагает ввести ее с 1 июля, призывает рабочих приложить все усилия к увеличению производительности и тем самым к увеличению заработной платы. Собрание предлагает заводоуправлению и фабрично-заводскому комитету принять самые решительные меры к окончательному прекращению хищений, вплоть до расчета и увольнения с фабрики, и просит на первое время расплату производить еженедельно.

Первый успех

В первый день опыта, 1 июля, рабочие фабрики «Днепр» доказали свою решимость выполнить новое задание во что бы то ни стало: в этот день фабрика выпустила 334 ящ. спичек, т. е. больше нового задания губэкономсовета на 11 проц. Фанерный завод выпустил 9 прессов фанеры, т. е. больше прежнего на 25 проц. и больше нового задания на 12 процентов.

Фабрика станет образцом

Первый день опыта показывает, что новая система оплаты труда жизненна, что великие хозяйственные обязанности, возложенные на рабочий коллектив фабрики «Днепр», будут выполнены с успехом и что фабрика станет образцом пролетарского творчества.

Газета «Полесская правда» № 338, 10.7.1921 г.

Рапарт калгаснікаў калгаса «Гігант» Холмецкага сельсавета XIII з'езду КП(б) Беларусі

(захоўваецца мова арыгінала)

Мы, калгасьнікі і калгасьніцы калгасу «Гігант», Холмецкага сельсавету, Рэчыцкага раёну ў момант абвастрэньня міжнароднага становішча, узросту пагрозы ваеннай небясьпекі і абвастрэньня клясавай барацьбы ўнутры краіны, рапартуем аб выкананьні і перавыкананьні сяўбовага пляну, што зьявіцца найлепшым адказам нашым ворагам.

У калгасе ў сучасны момант лічыцца 49 гаспадарак, з якіх 3 адзінкі і 5 батракоў. У калгасе коней 43, кароў купленых 41, быкоў вытворных — 2, цялят — 37. Намечана было па пляну вясновага сяўбовага кліну — 110 га, засеяна 179 га раней вызначанага сяўбовага пляну на 7 дзён.

Калгас пушчае ў працу млын, маслабойню, крупарушку, ужо працуе масладзельня слівачнага масла, цагельны завод, на якім ужо закантрактована 30 000 шт. цэглы на пабудову 7-гадовай школы, да ўборачнай кампаніі будзе пабудавана гумно для складу ўраджаю.

Мы, калгасьнікі і калгасьніцы, даём абязацельства XIII зьезду КП(б)Б своечасова падрыхтаваць да ўборкі ўраджаю і правядзеньня ўборачнай кампаніі на чале сац. спаборніцтва і ўдарніцтва. У калгасе створана ўжо ўдарная брыгада з 19-ці асоб імя «XIII-га зьезда КП(б)Б».

К уборцы калгас закупляе адну касілку, 2 жнейкі, 1 грабарку, 30 шт. кос і 30 шт. сярпоў, зама-

цоўвае сувязь з бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі, гаспадаркамі-адзіночкамі. Калгасам аказана дапамога 5-ці гаспадаркам пахатай і іншымі работамі. Абавязуемся ў працэсе сваёй працы дапамагчы абпрацоўваць паасобныя бядняцкія гаспадаркі як пры ўборцы ўраджаю, так і пры абсямяненьні азімага кліну. Аказваць таварыстскую дапамогу бедняцка-серадняцкім гаспадаркам шляхам сумеснага вырашэньня адміністрацыйна-гаспадарчых пытаньняў, мы іх павядзём па шляху калектывізацыі. Калгас зараз перадаў лепшых двух беднякоў калгаса ўдарнікаў у шэрагі партыі.

Па даручэньню агульнага сходу калгасьнікаў Прэзідыум сходу.
Упаўнаважаныя Рэчыцкага райкаму КП(б)Б
(Кажамякін, Касьцюкоўскі)
1930 г.

З эканамічнай характарыстыкі Рэчыцкага раёна па стану на 1933 год

(захоўваецца мова арыгінала).

Рэчыцкі раён разьмяшчаецца паміж 52°04′ і 52°37′ паўночнай шырыні і 29°35′ і 30°42′ усходняй даўжыні. Раённы цэнтр — г. Рэчыца стаіць на правым беразе Дняпра. Бліжэйшая чыгуначная станцыя — Рэчыца. Раён падзяляецца на 35 сельсаветаў, у тым ліку адзін (Балашоўскі) нацыянальны — польскі. Мяжуе Рэчыцкі раён на поўначы з Жлобінскім раёнам, на ўсходзе — з Уваравіцкім і Гомельскім, на поўдні — з Лоеўскім і Хойніцкім і на захадзе — з Мазырскім.

Агульная тэрыторыя раёну 297 900 га, у тым ліку зямель с.-г. прызначэньня 57,54 % і лясоў — 41,5 %. З зямель с.-г. прызначэньня ўжытковай — 147 999 га — 94,3 %, няўжытковай — 5,7 %.

Усяго насельніцтва ў раёне 112 539 чал., з іх: беларусоў — 71,17 %, яўрэяў — 1,74 %, палякаў — 1,24 %, рускіх — 22,97 %, літоўцаў — 0,07 %, латышоў — 0,03 % і іншых — 3,28 %.

Па тытульнаму сьпісу за 1931 г. па раёне налічвалася 54 прадпрыемствы, з лікам рабочых 4560. У ліку прадпрыемстваў былі такія: электрастанцыя — 1, торфазавод — 1, суднабудаўнічая арцель — 1, цьвікашрубны завод — 1, мэталяапрацоўчая арцель — 1, лака-палітурны завод — 1, лесахэмічная арцель — 1, экстрактны завод — 1, запалкавая фабрыка — 1, фанэрны завод — 1, цагельных заводаў — 11, лесазавод — 1, лесапільная арцель — 1, абодная — 1, бандарная — 1, карзінаплётная — 1, вяровачная — 1, абутковых — 2, кравецкіх — 2, друкарня — 1, паравых млыноў — 17, хлебазавод — 1, цукерачная арцель — 1, крухмальны завод — 1, завод фруктовых вод — 1, вінзавод — 1.

У 1932 г. па раёне ўжо існавала 37 дзяржаўных, 70 коопэрацыйных і 2 грамадзкіх, а ўсяго — 109 прамысловых прадпрыемстваў. З іх знаходзілася ў падпарадкаваньні НКЦяжпрому — 3, НКЛеспрому — 12, НКЛегпрому — 5, НКСнабу — 5, НКЗему — 5, Наркомгасу — 2, РВК і Гарсавету — 4, іншых дзяржаўных — 1, прамкоопэрацыі — 35, колгасаў — 26, інш. коопэрац. — 9, грамадзкіх арганізацый — 2. Пэрсонал усіх гэтых прадпрыемстваў на 1/XII-32 г. — 5332, у тым ліку рабочых (бяз вучняў і МАП) — 4587, служачых 486, апрача таго, працуючых па хатах было 61. Сярэдняя колькасьць рабочых за першае паўгодзьдзе 1932 г. была 4553. Сума асноўных фондаў складала 6 795 962 р. Калі валавая продукцыя ў аптова-адпускных цэнах адпаведнага году за 1931 г. складала — 23 629 304 р., то толькі за першае паўгодзьдзе 1932 г. яна ўжо складала — 15 468 856 р. Дваццаць пяць прадпрыемстваў мелі рухавікі.

Асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі раёну зьяўляюцца: электрастанцыя, з лікам рабочых у сярэднім за паўгодзьдзе 1932 г. — 14, з валавой продукцыяй за гэты ж час у цэнах 1926—1927 г. — 43,64 тыс. р.; торфазавод «Закрашынскі Мох», рабочых 318, валавой продукцыяй — 133,75 тыс. р.; суднабудаўнічая верфь, рабочых — 149, валавой продукцыі — 138,1 тыс. р. (за год); абоза-будаўнічая арцель, рабочых — 50, валавой продукцыі — 74,66 тыс. р.; абодная арцель, рабочых — 52, валавой продукцыі — 105,18 тыс. р.; цьвіковы завод «Інтэрнацыянал», рабочых — 227, валавой продукцыі — 496,81 тыс. р.; лакапалітурны завод, рабочых — 8, валавой продукцыі — 408,11 тыс. р.; экстрактны завод «імя Варашылава», рабочых — 179, валавой продукцыі — 720,15 тыс. р.; запалкавая фабрыка «Х Кастрычнік», рабочых — 1236, валавой продукцыі — 2527,47 тыс. р.; цагельная арцель, рабочых — 32, валавой продукцыі — 3,88 тыс. р.; лесапільны завод пры заводзе «Інтэрнацыянал», рабочых — 76, валавой продукцыі — 407,65 тыс. р.; лесазавод імя Томскага, рабочых — 349, валавой продукцыі — 1336,16 тыс. р.; лесазавод Леспрамгасу, рабочых — 30, валавой продукцыі — 68,51 тыс. р.; дрэваапрацоўчая промарцель, рабочых — 80, валавой продукцыі — 165,30 тыс. р.; фанэрны завод імя Галадзеда, рабочых — 549, валавой продукцыі — 1846,20 тыс. р.; майстэрня вульляў, рабочых — 30, валавой продукцыі — 23,17 тыс. руб.; вяровачная арцель, рабочых — 139, валавой продукцыі — 411,00 тыс. р.; абутковая арцель, рабочых — 101, валавой продукцыі — 150,39 тыс. р.; швэйная арцель, рабочых — 135, валавой продукцыі — 230 тыс. р.; мэблевая арцель, рабочых — 71, валавой продукцыі — 112,79 тыс. р.; млын «Інтэрнацыянал»; скатабойня, рабочых — 20, валавой продукцыі — 187,15 тыс. руб.; хлебапякарня, рабочых — 55, валавой продукцыі — 421,50 тыс. руб.; крухмальны завод, рабочых — 19, валавой продукцыі — 52,45 тыс. руб.; сенапрэсавальны завод, рабочых — 18, валавой продукцыі за год — 83,73 тыс. руб.; шпаларэзны завод, рабочых — 18, валавой продукцыі — 40,23 тыс. р.; вінзавод, рабочых — 98, валавой продукцыі — 227,09 тыс. руб.; гонтарэзны завод, рабочых — 17, валавой продукцыі — 4,62 тыс. р.

У раёне выяўлены наступныя карысныя выкапні: гліны — у в. Маладуша, в. Бярозаўка, г. Рэчыца, ур. Інаваўка, в. Азершчына, в. Стасеўка, в. Гавенавічы, колг. Заходы, в. Маўчаны, в. Салтанова, пас. Красная Дуброва, ур. Аколтца, ур. Воўча-Гара; пяскі — у в. Гарывада; маргелі — ва ўр. Азерыў-Блёс, в. Корастань; жалезьнякі — у бал. Ніх, каля хут. Крапіўня, р. Ведрыч паміж вёскамі Дземяхі і пас. Антопаль, паміж вв. Горваль і Атрубам, ур. Ман-Барок.

У раёне ёсьць 4036 га балот са значнымі запасамі торфу.

Сельская гаспадарка раёну спэцыялізуецца ў жывёлаводна-канапляным напрамку. Саўгасаў і коопгасаў у раёне — 5: Жмураўка, гародна-малочная спэцыялізацыя, тэрыторыя 1698 га, рабочых — 105; Рэчыца, лугаводная спэцыялізацыя, тэрыторыя 1822 га, рабочых 179; Ведрыч, лугавая спэцыялізацыя, тэрыторыя 2000 га, рабочых 127; Гарадок, малочна-гародная спэцыялізацыя, рабочых — 65; Прыгарадны с.-г. комбінат, рабочых — 379.

У раёне налічваецца 17 522 гаспадаркі, з іх на 1/1-33 г. колектывізавана 4739, што складае 27,0 %.

У раёне ёсць МТС, трактарны парк якой складаецца з 29 трактараў, агульнай магутнасьцю 330 НР, якая абслугоўвае 41 колгас, з плошчай сенапахаці — 15 635 га, што складае 43,6 % усёй колектывізаванай сенапахаці ў раёне.

У колгасах раёну налічваецца наступная колькасьць с.-г. машын: сенакасілак — 35, конных грабляў — 44, жняярак-самаскідак — 64, снопавязалак — 5, бульбакапалак — 12, сеялак-радковых — 86, складаных малатарняў — 14, аўтомобіль — 1. Акрамя таго, у МТС ёсьць складаных малатарняў — 13, ільнацерабілак — 4, сеялак — 8, з іх радковых — 6.

Пасеўная плошча ў 1932 г. складала 57 245 га, у тым ліку зернавых культур — 65,4 %, бульбы — 21,6 %, тэхнічных культур — 7,2 %, траў — 2,7 %, інш. — 3,1 %.

Загатоўкі 1932 г. на 1/11-33 г. далі ў тонах: ільнавалакна — 191, пянькі — 17,5, ільнасемя — 289, канапель — 31,4, саломы — 253.

Сетка навучальных установаў па раёне: тэхнікумаў — 1, з лікам студэнтаў — 202; профтэхшкол — 2, з лікам вучняў — 319; рабфакаў — 1, з лікам студэнтаў — 264; ФЗС — 5, ШКМ — 25, з лікам вучняў — 2811 (у V, VI і VII гр. гр.), 4-годак — 90; у іх вучн. — 14 291, уключаючы групы малодш. канц. ФЗС і ШКМ.

Процант пісьменнасьці па раёне — 92,5.

У раёне выдаюцца наступныя газэты: «Рэчыцкая Праўда», орган РК КП(б)Б, РВК і Райпрофсавету, і «Штурмоўка», орган фабкому ф-кі «Х Кастрычнік».

«Усе раёны БССР». Мн.: Выдавецтва Беларускай Акадэміі навук: 1933, с. 323—326

Першыя трактары

З успамінаў А. С. Глебава, аднаго з першых механізатараў раёна

Рэчыцкая МТС была арганізавана ў лістападзе 1931 г. Адразу ж туды пачалі паступаць трактары і сельскагаспадарчыя машыны. Каб кіраваць імі, патрэбны былі кадры механізатараў. Таму ў снежні таго ж 1931 г. адкрыліся курсы трактарыстаў. На іх вучыліся 126 юнакоў і дзяўчат. Раздзелены былі на тры групы, у залежнасці ад адукацыі навучэнцаў. Мы вывучалі трактары і сельгасмашыны, матэматыку, аграномію і два разы ў тыдзень — ваенную справу.

Накіроўвалі моладзь на курсы механізатараў у калгасы. Мяне, Глебава А. С., Сівуху А. П., Сівуху Кірэя, Мацюшэнку Марыю, Маеўскую Веру, Сівуха Таццяну вучыцца выправіла праўленне калгаса імя Дзяржынскага. Мы пачулі ад кіраўніцтва гаспадаркі пажаданне за тры месяцы засвоіць «навуку» і ўжо вясною выехаць у поле.

І сапраўды, вясной 1932 г. нас, навучэнцаў Рэчыцкай машынна-трактарнай станцыі, пачалі выпраўляць у калгасы. Вядома, веды мы мелі павярхоўныя. Іншы раз як не са слязамі на вачах заводзілі свой «фардзон» ці «ХТЗ». Пакутвалі і па прычыне недахопу запасных частак. Што-нішто можна было зрабіць на такарным станку, але ён у Рэчыцкай МТС быў толькі адзін, ды і то найчасцей прастойваў: патрэбен быў метал.

Мы, маладыя механізатары, эканомілі на кожным кілаграме гаручага. Але, буду шчырым, мелі яго дастаткова. Па-другое, гаручае для нашых «фардзонаў» і «ХТЗ» вяскоўцы дастаўлялі коньмі прама ў поле.

Аплата нашай працы была надзвычай нізкай. І ўсё ж моладзь літаральна рвалася да тэхнікі.

Памятаю такі выпадак. Таня Сівуха заводзіла трактар, нешта не разлічыла, і завадная ручка ўдарыла ёй па твару: былі выбіты некалькі зубоў. Але неўзабаве дзяўчына зноў села на свой «фардзон», не паспеўшы як след ачуняць.

...Як жаданых гасцей сустракалі нас, эмтээсаўцаў, у вёсках раёна. Нагадваецца,

як прыехалі на чатырох трактарах у Глыбаў. Напэўна, усё насельніцтва гэтай вёскі выйшла са сваіх хат.

І вось, нарэшце, выезд у поле. Праўленне мясцовага калгаса адвяло нам пад ворыва цаліну. Паставілі мы плугі на глыбіню 35 сантыметраў. Але ... трактары не цягнулі.

— Нічога, відаць, без каня ці вала не будзе, — пачулі ад самых недаверлівых.

Выйсце з прыкрага становішча было знойдзена — крыху зменшылі глыбіню ворыва, і трактары рушылі па полю.

Спыніўся адпачыць, а да мяне мясцовы дзядок спяшаецца. Хістае галавою, кажа: «Машына от добрая, ды гною ад яе нямашака, адно смурод...» Стаіць і хітра ўсміхаецца. Ну што тут зробіш? Адчуваецца ў людзей недавер да сталёвых «коней». Але нічога, мінецца. Так яно і было.

У Глыбаве мы рабілі тады два тыдні. І ўвесь гэты час мясцовая школа... не працавала, бо дзеці не адыходзілі ад трактароў. Не дапамагалі ні пагрозы бацькоў, ні ўгаворванні настаўнікаў. Дырэктар школы прасіў нас, механізатараў: «Вы ўжо, хлопцы, хутчэй даворвайце, бо зрываецце нам вучэбны план».

Урэшце справа дайшла да таго, што кіраўніцтва калгаса выдзеліла спецыяльную варту, каб яна не пускала на поле дзятву, што часам замінала нам у рабоце.

...Трактарны парк Рэчыцкай МТС рос даволі хутка. Калі ў 1932 г. у ёй былі толькі чатыры трактары, то ў наступным годзе былі атрыманы яшчэ дваццаць чатыры машыны, у хуткім часе — яшчэ восем.

Механізатары Рэчыцкай МТС мелі магчымасць абслугоўваць усе калектыўныя гаспадаркі раёна. Але каторыя з калгасаў дагаворы з намі не заключалі. Яны лічылі, што апрацоўваць зямлю коньмі і валамі больш зручна і эканомна. Затое ад нашых малатарань для абмалоту збожжа ніхто не адмаўляўся.

У 1937 г. у МТС прыбылі першыя два камбайны. Для вяскоўцаў гэта быў яшчэ большы цуд, чым некалі трактары. Паступова механізацыя ўсё больш грунтоўна замацоўвалася на Рэчыцкай зямлі.

Вучлёты

З успамінаў М. П. Атаманчука, былога намесніка камісара філіяла Гомельскага аэраклуба ў Рэчыцы

...У трыццатыя гады камсамол узяў шэфства над Чырвонай Арміяй і Ваенна-Марскім Флотам, а ЦК ВЛКСМ звярнуўся да юнакоў і дзяўчат з заклікам — «Камсамол — на флот!», «Камсамол — на самалёты!».

Моладзь Рэчыцы і раёна актыўна адгукнулася на заклік. У нашым горадзе пачаў дзейнічаць філіял Гомельскага аэраклуба.

Першыя два наборы так званых вучлётаў ляталі на планерах і самалётах У-2. Планеру, як вядома, не патрэбен матор і гаручае. Праўда, ёсць у эксплуатацыі яго і сур'ёзны недахоп — на планеры далёка не паляціш.

Трэці ж набор вучлётаў, і, дарэчы, апошні, праводзіўся ў 1938—1939 гадах. У гэты час мы ляталі толькі на самалётах. Што да абучэння, то было яно без адрыву ад вытворчасці ці вучобы. Тэарэтычныя заняткі — толькі ўвечары.

Вывучалі мы статуты Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, тэорыю палётаў (аэрадынаміку), аэранавігацыю, матор М-11, будову самалёта У-2.

Вялікая ўвага надавалася палітычнай падрыхтоўцы.

Вядома, з найбольшай нецярплівасцю вучлёты чакалі практычных заняткаў. Да іх прыступалі вясной. Заняткі праводзіліся ў дзве змены: з 4 гадзін раніцы і да 12 гадзін дня, а затым з 14 да 22 гадзін вечара.

Як правіла, палётам папярэднічаў курс лётнай падрыхтоўкі.

З вясны вучоба ішла непасрэдна на аэрадроме, які знаходзіўся на захадзе ад горада.

Для кожнага вучлёта шлях у паветра пачынаўся з дасканалай наземнай падрыхтоўкі. Тым не менш першы вылет быў разам з інструктарам. Але прыходзіў, нарэшце, час, калі вучлёты ўзнімалі самалёт у палёты самастойна.

Як жа фарміраваўся тады атрад рэчыцкіх вучлётаў? Набіраліся ў яго хлопцы і дзяўчаты са студэнтаў педагагічнага тэхнікума і педагагічнага рабфака, лепшыя маладыя рабочыя, вучні старэйшых класаў.

Жадаючых патрапіць у атрад вучлётаў было шмат. Але не ўсім шанцавала здзейсніць мару. Апрача ахвоты, заявы і іншых неабходных дакументаў, належала прайсці

і медыцынскую камісію. Гэта камісія і вызначала прыгоднасць да палётаў.

Вакол камісіі хадзілі розныя чуткі і легенды. Было нават і так, што каторыя з ахвотнікаў лятаць ішлі на хітрыкі, пасылалі да ўрачоў каго з сяброў, у якіх было больш моцнае здароўе.

Што да мяне, то ў аэраклуб патрапіў яшчэ навучэнцам педагагічнага рабфака. У далёкім 1938 г. Рэчыцкі райкам камсамола прызначыў і зацвердзіў мяне намеснікам камісара Гомельскага аэраклуба ў Рэчыцы.

Якое шчасце было для кожнага вучлёта, калі пасля здачы экзаменаў яго накіроўвалі ў ваенна-лётную школу! Кожны хацеў быць сярод тых, каму пашанцавала.

Дарэчы, Гомельскі аэраклуб быў замацаваны за Адэскай лётнай школай імя П. Асіпенка.

На Беларусі пачынаюць дзейнічаць дзве лётныя школы: адна ў горадзе Паставы, другая — на Случчыне. Пры школах пілотаў ствараліся школы малодшых авіяцыйных спецыялістаў, паветраных стралкоў-радыстаў.

Сапраўднай кузняй лётчыкаў стала былая школа Грамадзянскага паветранага флоту ў горадзе Балашове Саратаўскай вобласці. Патрапілі ў яе з Рэчыцы двое — я і Л. А. Кастэнка.

Амаль усе вучлёты, якія заканчвалі лётныя школы, змагаліся потым на франтах Вялікай Айчыннай вайны. У паветраных баях гераічна загінулі многія з нашых землякоў. Гэта В. Кордзік з Салтанова, Я. Дземянок з вёскі Перасвятое, М. Скаромны, М. Сафранкоў, Б. Сташук. Праз усе віхуры Вялікай Айчыннай прайшлі С. Гошка, Р. Скаромны, Л. Кастэнка. На жаль, сярод нас іх ужо няма.

З былых вучлётаў добра ведаю Рыгора Бондарава з Дземяхоў, рэчычан Аляксандра Ісаенку, Міхаіла Казака, Міхаіла Быхоўскага. Не ўсім ім выпала стаць лётчыкамі, але і яны зрабілі нямала, каб прыйшоў светлы дзень Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Пра тое, што памятаецца

З успамінаў Марыі Самуілаўны Рубінчык, адной са старэйшых настаўніц Рэчыцы

...30-ыя гады — час наступу на непісьменнасць. Паўсюдна ствараліся лікбезы. Для работы ў іх прыцягваліся культармейцы. Гэта не толькі настаўнікі, але і вучні старэйшых класаў. Расла колькасць школ. У вёсцы пачатковыя школы пераўтвараліся ў школы сялянскай, а потым — калгаснай моладзі. Вядома ж, патрэба ў настаўніцкіх кадрах увесь час павялічвалася. Іх рыхтавалі часам надта паспешліва. Ствараліся школы-дзевяцігодкі з педагагічным ухілам, кароткатэрміновыя курсы, педтэхнікумы. Педагагічныя інстытуты аб'яўлялі наборы па 2—3 разы на працягу года.

У Рэчыцы школай з педагагічным ухілам з'яўлялася № 2 імя К. Маркса. Размяшчалася яна ў памяшканні, якое зараз належыць маслазаводу. У школе гэтай вучылася і я. Атэстат сталасці атрымала датэрмінова, недзе ў канцы красавіка. Мяне і яшчэ шасцёра маіх аднакласнікаў накіравалі працаваць у школы Гомельшчыны настаўнікамі. Ішоў 1931 г.

Я атрымала накіраванне ў вёску Баршчоўка, якая зусім нядаўна ўваходзіла ў Гомельскі раён і толькі што была далучана да Рэчыцкага.

Вось і яна, школа. Вялікі драўляны дом з ганкамі. Аднапавярховы. Насупраць, праз дарогу, вялікая і прыгожая царква (служба ў ёй ужо не вялася).

Тут жа і хата-чытальня. Заняткі праводзіліся і ў ёй.

Дырэктар школы Альбіцкі сустрэў мяне, маладую настаўніцу, ветліва, паведаміў, што буду працаваць з чацвёртым класам.

Першая цяжкасць, якую сустрэла ў Баршчоўцы, — няма дзе жыць. Сакратар сельсавета абышоў са мной некалькі хат — усюды адмова. І толькі ў канцы вёскі гаспадыня згадзілася ўзяць мяне да сябе. Праўда, з умовай, што буду аддаваць ёй свой паёк. Настаўнікі атрымлівалі тады муку, а зрэдку нават цукар і алей. Давялося згадзіцца, хаця зрабіць тое было нялёгка. Я ж марыла частку пайка адвозіць у Рэчыцу дамоў, бо і ў горадзе ў той час жылося далёка не салодка.

...1-ае мая 1931 г. Свята міжнароднай салідарнасці працоўных. Мяне, як адзіную камсамолку, паставілі на загадзя збудаваную трыбуну. Сказалі, што трэба выступіць з прамовай. Мяне змяніў Карп Андрэеў. Ён толькі што вярнуўся з арміі. А павага тады да Чырвонай Арміі была вялізнай.

Неўзабаве з арміі вярнуўся і Фёдар Мартыненка. Ён, як і Андрэеў, таксама быў

камсамольцам. Такім чынам, у Баршчоўцы ўжо тры камсамольцы.

З райкама камсамола прыехаў інструктар, які аб'явіў нас ячэйкай, даў параду на павелічэнне сваіх «радоў».

Але навучальны год скончыўся, і я паехала піянерважатай у вёску Мілаград, дзе знаходзіўся піянерскі лагер. Удалося ўзяць з сабою дзвюх баршчоўскіх піянерак — Таню Мартыненку і Тамару Янкову.

Новы навучальны год школа вёскі Баршчоўка распачала ў якасці сямігадовай. Былога дырэктара Альбіцкага змяніў Генадзь Восіпавіч Квяткоўскі. Паболела настаўнікаў. Новыя настаўнікі Скібуноў і Нікіценка з'яўляліся камсамольцамі. Яны таксама разгарнулі сярод моладзі агітацыю за ўступленне ў нашу ячэйку. Але вясковыя хлопцы і дзяўчаты не надта ахвотна адгукваліся на такія прапановы. Затое ў камсамол ахвотна ўступалі вучні сёмага класа — Андрэй Бокун, Феня Грыгарэнка, Зоя Дзятлава, Павел Козыраў, Каця Ларкова, Таня Мартыненка, Іван Навуменка, Марыя Фідэльская, Тамара Янкова, Фёдар Янкоў, Юзэф Фідэльскі, Надзя Чаплінская (Чапленка)...

Новы навучальны год стаў адметны яшчэ адной падзеяй: настаўнікам выдзяляліся казённыя кватэры.

Баршчоўку таксама не мінулі раскулачванні. Пад высылку падпадалі сем'і маіх вучняў Колі і Федзі Акулавых. Праведаўшы пра тое, хлапчукі горка плакалі. А за імі і ўвесь клас. Плакала і я, настаўніца.

З Рэчыцы рэгулярна наведваліся ўпаўнаважаныя. Агітавалі за калгасы. Мясцовая сельгасарцель «Мудрэц» была яшчэ надта кволай, але «агітатары» не шкадавалі слоў на тое, каб даказаць, што калгаснікам жывецца лепш і весялей, чым аднаасобнікам.

Зіма 1932/33 г. была, як памятаецца, надзвычай цяжкой. У маі Баршчоўку напаткала стыхійнае бедства — выпаў моцны град. Ён выбіў шыбы, знішчыў збожжавыя. Пацярпелі і авечкі, што пасвіліся ў полі.

З Рэчыцы прыехала камісія. Было вырашана пасеяць грэчку. Але гэта не выратавала становішча. Баршчоўцаў чакалі галодныя дні. Ды і не толькі іх. У краіне ўводзіліся пайкі, сістэма картак і г. д.

Беззаконне

Прага як мага хутчэй дасягнуць высокіх тэмпаў калектывізацыі прыводзіла да грубага ўціску тых, хто меркаваў рабіць аднаасобнікам. На іх у першую чаргу накладваліся праз сельсаветы дадатковыя падаткі. Нярэдка непасільныя для чалавека і ягонай сям'і.

На высяленні ў Сібір і Казахстан выправіліся першыя раскулачаныя. З сем'ямі. З сабой дазвалялася браць толькі тое, што можна было несці ў руках.

У 1929 г. выпадкі раскулачвання ў Рэчыцкім раёне былі адзінкавымі. Але з вясны наступнага, 1930 г. працэс раскулачвання набыў шырокі размах.

Карныя органы ўжо мелі на руках тлумачэнні асобай часткі крымінальнага кодэксу і, у прыватнасці, сумна славутага артыкула 58. Былі там і такія радкі: «С конца 1929 г. в районах сплошной коллективизации стала на практике осуществляться директива Партии и Правительства о ликвидации кулачества как класса. В процессе этой ликвидации имеют место попытки кулацко-зажиточной части крестьянства разными приемами и способами подорвать экономическую мощь организуемых колхозов. Попытки эти могут заключаться как в умышленном уничтожении имущества колхозов, так и в разложении колхозов изнутри со стороны попавших туда кулаков и подкулачников. Во всех этих случаях, когда будет установлено, что действия этих лиц преследовали цель ослабления экономической мощи колхоза с целью подрыва колхозного строительства, действия эти должны рассматриваться как экономическая контрреволюция и квалифицироваться по ст. 58^7 УК».

Вось так — эканамічная контррэвалюцыя. А гэта і пазбаўленне волі, і расстрэл.

На першым этапе раскулачвання Рэчыцкі раён не ўваходзіў у зону «сплошной коллективизации». Але гэта не перашкаджала адпаведным органам беспадстаўна кідаць людзей у канцлагеры, на іхніх касцях будаваць гарады і чыгункі. І, вядома ж, расстрэльваць, расстрэльваць...

Звычайна ідэалагічнай выдумкай было тое, што кулацка-заможная частка сялянства рознымі прыёмамі і спосабамі хацела падарваць эканамічную магутнасць калгасаў. Затое мела месца іншае: эканамічна першыя калгасы былі надзвычай слабымі; і каб неяк выправіць становішча, маёмасць забіралася

ў больш заможных, якія мелі тую ж малацілку, маслабойку, млын-вятрак і г. д.

Рэпрэсіі напаткалі не толькі вяскоўцаў, якія не жадалі ўступаць у калгасы, але і многіх з тых, каторыя ўжо з'яўляліся членамі сельгасарцелей.

У пачатку 1930 г. сельсаветы Рэчыцкага раёна атрымалі інструкцыі па чыстцы калгасаў. Дакумент тлумачыў: «Чыстка калгасаў мае мэтай вызваленне калгасаў ад кулацкіх і антысавецкіх элементаў, як класавых ворагаў калгаснага будаўніцтва.

Выключэнню з калгасаў падлягаюць:

1) кулакі і нэпманы; 2) асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў; 3) асобы, сістэматычна вядучыя работу па падрыву калгасаў; 4) асобы, якія сістэматычна скарыстоўвалі да ўступлення ў калгас наёмную сілу альбо займаліс іншай эксплёататарскай дзейнасцю» *(ДА Гомельскай вобл., ф. 138, воп. 1, спр. 95, л. 6).*

Паўсюдна ў раёне прайшлі пасяджанні камісій па чыстцы калгасаў. Найбольш сур'ёзным «злачынствам» для камісій было тое, што перад уступленнем у калгас чалавек прадаў карову ці іншую маёмасць. Так, 13 сакавіка 1930 г. быў выключаны з калгаса імя Леніна (в. Рудзец) Сямён Пракопавіч Макаранка. Фармулёўка выключэння наступная: «...как разбазарившего скот до вступления в колхоз и ведущего работу по подрыву колхоза». І гэта нягледзячы на тое, што ў сям'і С. П. Макаранкі было 8 душ.

Такіх, як Макаранка, у калгасе імя Леніна мелася некалькі чалавек. Але іх у арцелі пакінулі. Праўда, абавязалі ўнесці ў калгасную касу ўсе тыя грошы, што яны атрымалі ад продажу жывёлы.

У рашэннях камісій па чыстцы было шмат суб'ектывізму. Лёс чалавека найчасцей залежаў ад таго, як ставяцца да яго ў сельскім Савеце, старшыня калгаса. Пацвярджэнне таго зноў-ткі ў пратаколе пасяджэння камісіі па чыстцы калгаса імя Леніна. На Мікалая Козінцава мелася заява, што да ўступлення ў калгас ён прадаў жывёлу, меў сувязь з Самуілам Шульгой, арыштаваным ГПУ. У заяве згадвалася нават: у 1920 г. Козінцаў супрацьдзейнічаў харчатраду. Але Мікалая Козінцава камісія па чыстцы ў калгасе пакінула. Дапамагло хадайніцтва старшыні арцелі.

Шырокі «малюнак» таго, як на пачатку 1930 г. калектывізацыя і раскулачванне праходзілі ў Рэчыцкім раёне, — у матэрыяле «Неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі» *(Газета «Полесская правда», № 44 ад 21 лютага 1930 г.).*

Артыкул канстатаваў: па лініі раскулачвання ў раёне дапушчаны палітычныя памылкі. Аказваецца, «...у некаторых сельсаветах раскулачваньне пачалося без сувязі з разрашэньнем задачы суцэльнае калектывізацыі, без арганізацыі беднаты і серадняком, што на практыцы вылілася ў адміністрацыйнае раскулачваньне. Пагэтаму ліквідацыя кулацтва як кляса зьявілася як голае раскулачваньне без увязкі з масавай калектывізацыяй».

Д. Б. Фіш, аўтар артыкула, паведамляў: у Рэчыцкім раёне ў справе раскулачвання няўзгодненасць паміж райвыканкамам і райкамам партыі. Так, фракцыя райвыканкама ўпаўнаважыла сакратара сельпартчэйкі на раскулачванне двух сельсаветаў, а райкам даслаў у ячэйкі патрабаванне «...раскулачваньне праводзіць, не чакаючы зацьвярджэньня райвыканкаму». Гэта, як рабіў вывад аўтар артыкула «Неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі», дало падставы асобным партыйным ячэйкам у вёсцы няправільна тлумачыць дырэктыву партыі па калектывізацыі і раскулачванні. Таму раскулачванне ў раёне пачалі праводзіць метадам ваеннага камунізму.

З артыкула Д. Б. Фіша відаць і наступнае. Частка сельскіх Саветаў і партыйных ячэек раёна, каб «гарантаваць» сябе ад правага ўхілу, пачалі запісваць у спісы заможных і серадняком. Разам з тым «...былі няправільныя арышты за «зрыў» ці «бузацёрства» на сходах, дзе абгаварвалася пытаньне аб калектывізацыі, што стварыла розныя крыватолкі сярод беднаты і серадняцтва».

На жаль, сельсаветы і парт'ячэйкі ўжо не прыслухоўваліся да голасу ні серадняком, ні беднаты. Ужо ва ўсю дзейнічала правіла: выказаў слова незадавальнення супраць улад ці калгаса — ты вораг. Меў неасцярожнасць выказаць такое слова адзін з братоў Акулавых, жыхар пасёлка Свідаўка Баршчоўскага сельсавета. Гэтага было дастаткова для таго, каб і родных, і стрыечных братоў Акулавых абвінаваціць у тым, што яны з'яўляліся ўдзельнікамі антысавецкай групоўкі, мелі мэту разваліць калгас, пагражалі сельскім актывістам. І апынуліся браты ў Сібіры і Казахстане, займелі магчымасць прайсці «перакоўку» працай.

Увогуле, калектывізацыя ў Рэчыцкім раёне ішла больш сціплымі тэмпамі, чым

у сярэднім па рэспубліцы. Таму раён неаднаразова крытыкаваўся.

Безумоўна, самі «крытыкі» добра ведалі, што іхнія «сігналы» прывядуць да новых ахвяраў, што ў людзей, якіх яны абвінавачваюць, ёсць і дзеці, і бацькі. Карныя органы не мелі недахопу ў кампрамаце, высмактаным з пальца сельскімі і заводскімі актывістамі.

Кампрамат вышукваўся на ўсіх узроўнях улады — дзяржаўнай і партыйнай.

У дакладной запісцы ЦК КП(б) Беларусі ў ЦК ВКП(б) аб стане калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР, дасланай І. В. Сталіну ў Маскву 27 верасня 1934 г. і падпісанай сакратаром ЦК КП(б)Б М. Гікалам, ёсць радкі і пра калгас «Х-годдзе БССР» (в. Заходы): «...Колхоз «10-летие БССР» Речицкого района Дубровенскага (правільна — Дуброўскага) сельсовета, бывший гигант, с общей площадью до 20 тыс. га. Было получено около 300 тыс. р. кредитов, сейчас задолженность 249 тыс. р. Разукрупнился, вышло более 80 % состава.

Кредиты затрачены на восстановление скота, который в основном пал благодаря отсутствию кормовой базы и вредительству» *(НА РБ, ф. 4, воп. 3, спр. 186).*

Такі сігнал вышэйшага кіраўніцтва рэспублікі «наверх» не застаўся незаўважаным. Карныя органы «пільна» зірнулі не толькі на калгас «Х-годдзе БССР», а і на Рэчыцкі раён у цэлым, адшукалі варожую «руку».

Сумны фінал спаткаў урэшце і М. Гікалу. Ці згадаў былы сакратар ЦК КП(б)Б у час допытаў, калі яго збівалі да страты прытомнасці, прымушаючы назваць «ворагаў», пра сваю дакладную запіску І. В. Сталіну, у якой, фактычна, выносіў смяротны прысуд дзесяткам рупным працаўнікам Рэчыцкага раёна? А мо згадаў тады, калі вывелі з камеры на расстрэл? Ці ішоў пад кулю з цвёрдай верай: інфармаваў аб «вредительстве» ў рэспубліцы, у тым ліку і ў Рэчыцкім раёне, правільна?..

Звер, які паспытаў крыві, прагне новай, яшчэ ў большай колькасці. Гэта ў першыя гады разгортвання суцэльнай калектывізацыі асобыя тройкі, спецкалегіі, суды («народныя») абгрунтоўвалі сваю жорсткасць неабходнасцю класавай барацьбы, існаваннем кулакоў і падкулачнікаў. Пасля забойства С. М. Кірава, абставіны якога да канца так і не былі разблытаны, рэпрэсіўны сталінскі апарат адкінуў усялякае «ліберальнічанне». «Чорныя варанкі» не ведалі спакою ні днём ні ноччу. Днём найчасцей людзей забіралі ў вёсках, ноччу — у горадзе. Бралі за ўсё: слова крытыкі ці звычайнага незадавальнення, мо нават выказанае некалькі гадоў таму; за тое, што твой родзіч быў арыштаваны; што паламаўся трактар ці заводскі станок, хаця да гэтай паломкі чалавек не меў аніякага дачынення... З усяго гэтага ляпіліся справы.

Слова згубіла жыхара вёскі Гранаўка Пятра Цітавіча Кошалева. Калі арганізоўваўся калгас, то вырашыў пачакаць. Але на просьбу праўленцаў адгукнуўся: пазычыў арцелі грошы. Здагадаўся, урэшце, што яго ашукалі. На сходзе, ужо будучы калгаснікам, нагадаў праўленцам пра пазычаныя грошы. Ягоны напамінак павярнуўся гэткім чынам, што П. Ц. Кошалеў, актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны і паважаны ў вёсцы чалавек, быў арыштаваны з абвінавачваннем у правядзенні контррэвалюцыйнай прапаганды. Дамоў Пятро Цітавіч так і не вярнуўся.

Перад сталінскімі апрычнікамі аднолькава безабароннымі былі просты калгаснік і старшыня праўлення арцелі, рабочы і дырэктар, беспартыйны і член кіруючай ВКП(б), поўны здароўя чалавек і нямоглы стары ці школьнік...

Быў арыштаваны і аб'яўлены «ворагам народа» дырэктар Рэчыцкага дубільна-экстрактавага завода імя К. Я. Варашылава Аляксей Васільевіч Лапцеў. І гэта ў той час, калі прадпрыемства трывала стаяла на нагах: нарошчваўся выпуск прадукцыі, зніжаўся расход сыравіны і сабекошт гатовай прадукцыі, павышалася прадукцыйнасць працы, строга захоўваўся тэхналагічны рэжым, шырыўся стаханаўскі рух.

Чалавек згінуў у сталінскіх канцлагерах. Цалкам быў рэабілітаваны і адноўлены ў партыі толькі ў канцы студзеня 1990 г.

Толькі хадайніцтва камандзіра 37-ай дывізіі І. С. Конева, будучага Маршала Савецкага Саюза, дапамагло выйсці з лагера праз тры гады пасля арышту загадчыку Рэчыцкага раённага зямельнага аддзела Сцяпану Данілавічу Малчанаву.

1 лістапада 1937 г. быў расстраляны жыхар вёскі Борхаў Іоў Карпавіч Удодаў. Ён абвінавачваўся ў правядзенні антысавецкай агітацыі, выказванні тэрарыстычных намераў у дачыненні кіраўніцтва партыі і дзяржавы. «Тэрарысту», аднаасобніку І. К. Удодаву, было... 72 гады.

Разам з Іовам Карпавічам быў расстраляны 70-гадовы Іван Піліпавіч Катляроў, які жыў недалёка ад Борхава на хутары Пераходы і, як вынікае з абвінавачвання, таксама выказваў тэрарыстычныя намеры ў дачыненні І. В. Сталіна, К. Я. Варашылава і г. д.

Звыш тысячы жыхароў ці ўраджэнцаў Рэчыцы і раёна прайшлі ў даваенны перыяд праз высылкі ў Сібір, Казахстан, Горкаўскую вобласць і г. д., былі расстраляны, закатаваны ў час допытаў, загінулі ад голаду і здзекаў у лагерах. Большасць з нямчасных былі «контрэвалюцыянерамі» і «агентамі» Польшчы, Германіі, Францыі, ЗША, Японіі. Звыш 30 польскіх «шпіёнаў» было выяўлена ў вёсцы Балашаўка, звыш 10 германскіх — у вёсцы Заходы...

Названую вышэй лічбу рэпрэсіраваных можна смела памнажаць у некалькі разоў, бо за кожным з гэтых людзей былі родныя, якім прыклейваўся ганебны ярлык — сын, дачка, жонка, бацька, маці, брат, сястра «ворага народа».

П. П. Рабянок

За што?!

(Дзеянні адбываліся ў вёсцы Шоўкавічы ў 30-ыя гг.)

...1931-ы год. Выступаюць раённыя начальнікі. Не будзем называць іхнія пасады, а лепш услухаемся, пра што і якім тонам яны гавораць (пратакол вядзецца па-беларуску).

«Сарокін: — Трэба адзначыць ненармальнай з'явай тое, што з маючыхся ў леспрамгасе дзевяці трактароў працуе толькі адзін. Чаму? Нібыта астатнія не прыгодныя для працы. Лічу неабходным перадаць гэту справу пракурору для расследавання і тэрміновага прыцягнення вінаватых да адказнасці...»

Сарокін нават не дапускае думкі, што могуць адсутнічаць запасныя дэталі для трактароў, што не хапае рамонтнай базы. Перад яго вачыма кішма кішаць адны ворагі. Страшна ад гэтага нават цяпер.

Мо саляркі не было, мо не было каму ездзіць на тых трактарах? Але будзьце спакойныя, пракурор знойдзе вінаватых. І загрымяць яны, як ворагі і шпіёны, падрыўшчыкі і сабатажнікі...

«Гольдберг: — Ніводзін сельсавет да гэтага часу не паклапаціўся аб тым, што яны павінны да першага верасня выканаць план па дзяржаўнай пазыцы: «Пяцігодка — за чатыры гады». Па сялянскім сэктары мы павінны выканаць план на дзевяноста дзве тысячы рублёў...»

Уявіце, як забегалі «хвінагенты». Яны дойдуць да кожнай вёскі, увойдуць у кожны двор, зазірнуць у кожны хлеў. Умела выкруцяць рукі кожнаму, а намечаны па «сялянскім сэктары» план выканаюць. І нават крыху перавыканаюць, каб іх прыкмецілі і пахвалілі. Ніхто ў свеце не адважыцца на іх паскардзіцца. Якімі прыёмамі ні пакарыстаюцца — заўсёды правы.

«Лазараў: — Да гэтага часу ніяк не можам скончыць з кулакамі, за якімі лічыцца запазычанасць. Ніводзін сельсавет не расчысціў кулакоў, і праца па выяўленні кулацказаможных гаспадарак выпушчана з нашага поля зрэння. Усе гэтыя недахопы ў працы паставілі наш раён амаль на апошняе месца ў рэспубліцы...»

«Мацкевіч: — Трэба да гэтай справы падыходзіць выключна з мерамі рэпрэсій...»

«Хацімскі: — За невыкананне дэкады штурму па ліквідацыі ўсіх прарываў па галоўцы гладзіць не будзем. З прыняццем належных мер даб'ёмся належных вынікаў...»

«Левін: — У нас яўна апартуністычныя адносіны ў справе абкладання кулака. Неабходна зараз жа даабкласці на пятнаццаць працэнтаў. Мы не павінны глядзець на слёзы кулакоў і мяккасардэчнасці да іх не праявім...»

«Пасутман: — Неабходна падняць новую хвалю калектывізацыі. Чым рашучай мы будзем па кулаках удараць, тым лягчэй нам будзе выканаць усе заданні...»

«Мазур: — Кулакі яшчэ не распатрушаны. Трэба пераключыцца на рашучыя баявыя тэмпы. Неабходна ўзяць шырокі рух мас на бальшавіцкую вясну...»

Так гаварылі. Так і дзейнічалі.

Пастанавілі: «Прымацаваць прадстаўнікоў раённых устаноў для дапамогі сельсаветам у выкананні палітычна-гаспадарчай кампаніі па ліквідацыі ўсіх прарываў».

Маладых гарадскіх хлопцаў узброілі, выдалі ім інструктаж, спісы «ворагаў». І пакацілі ва ўсе вялікія і малыя вёскі «чорныя варанкі»...

У Шоўкавічах тады забралі Тодара.

Гэтаму чалавеку было гадоў пад пяцьдзесят. Лысаваты. Накульгваў. Нешта ў маладосці здарылася з нагой: пасек ці нарыў

быў. Казалі, сам лячыў: засыпаў рану нейкім чорным парашком, дык нага доўга не гаілася.

Вясною басяком хадзіў. Ці то не меў чаго абуць, ці шкадаваў бахілы.

З сям'і вялікай, гарушчай. Бацька некалі выдзеліў чатыром сынам — Тодару, Сцяпану, Івану, Міколу — зямлі па дзве дзесяціны. Вось з такім пасагам кожны з іх і разжываўся ў Шоўкавічах, як хто ўмеў.

Адно можна сцвердзіць: куёўдзіліся на сваіх латках зямлі да сёмага поту. Не было калі высмаркацца. Едзе ў поле на коніку і скібку хлеба з салам уплятае. Сядзе адпачыць — лапці пляце. Ляжа спаць — блохі ганяе. Пад раніцу зморыцца, толькі засне, дык ужо карова рыкае, у поле просіцца, свінкі хляўчук разрываюць. Уставай, кулак! За работу, фермер!

Тодар з радасцю сустрэў перамены. Новая ўлада абяцала вольнасць і падмогу гаспадарам зямлі. Ён, як і ўсе шоўкаўцы, паверыў у гэта і з настроем выконваў усе заданні.

Захаваўся ў архіве пратакол пасяджэння Вузнажскага сельсавета № 22 ад 9 лютага 1924 года. Як заўсёды, сельсаветчыкі абгаворвалі важныя пытанні. У той дзень думалі, як найлепш падмагчы беднякам Вузнажы і Шоўкавічаў пабудаваць свае хаты, як наладзіць палітычную работу сярод моладзі, як сагітаваць вяскоўцаў, каб выпісвалі газеты, як найхутчэй сабраць страховачныя ўзносы.

Асобна стаяла пытанне аб вартаўніку амбара. Вырашылі: плаціць вартаўніку 80 пудоў збожжа ў год. Даручылі члену Камузаемадапамогі Тодару Янавічу сабраць збожжа ў грамадзян вёскі Шоўкавічы. А яшчэ даручылі яму купіць вісячы замок на ссыпны амбар.

Тодар не мог не выканаць даручэнне сельсавета. А паколькі ён хадзіў у актывістах новай улады, то і даручэнняў, відаць, у яго было нямала.

Ды вось узнялася «хваля» калектывізацыі. Не кожны аднаасобнік зразумеў: для чаго зганяць у гурт кароў і коней, навошта зносіць усіх курэй у нечы хлеў? Які ж ён гаспадар, калі зямля цяпер становіцца не яго, калі ім пачынаюць патураць: ідзі туды, рабі тое! Ён жа сам добра ведаў, як і калі, што яму рабіць. Ён жа і так дзяліўся з новай уладай усімі сваімі лішкамі, моўчкі выконваў кабальныя падаткі. Ведаў: трэба падмагчы. Верыў: гэта часовая з'ява, вытрымаем, выдзюжым, а там — і на сялянскай вуліцы будзе свята. Аж на табе — ідзі ў калгас. І не раздумвай, не азірайся, а бягом бяжы.

Шоўкаўцаў сабралі на сход: трэба запісвацца ў калгас. Адны падалі заявы адразу, другія — адмовіліся, вырашылі падумаць, памазгаваць. А Тодар, кажуць, прыйшоў на сход з вяровачкай, сказаў:

— Бярыце мяне на вяровачку. Як не парвецца, то буду ў калгасе. А як парвецца, то выбачайце...

От і пад'ехалі да яго хаты на «чорным варанку».

Цяпер на тым жа пляцы стаіць новая, што звон, хата. Жыве ў ёй Тодарава дачка — Марынька.

З успамінаў Марыі Тодараўны (Марынькі)

...Бацька наш красівы быў. Чорныя вусы насіў, закручаныя. Акураціст ва ўсім. Вось не скажу, братка, з якога ён года, але нарадзіўся тутака, у Шоўкавічах... Маму Ганнай звалі, таксама не скажу, калі нарадзілася. Я й не помню, калі памерла, бо вельмі ўжо даўно адна жыву... Так во жылі, жылі, разжываліся, і стаў бацька кулаком. Ну і што? Узялі і саслалі. Шостага жніўня, помню, падбегла пад дом машына, заходзяць нейкія незнаёмыя людзі. Адзін, пры кабуры, кажа: «Збірайцеся, паедзем у сельсавет». Так паважліва сказаў: «Збірайцеся...» Бацька світку ўскінуў на плечы, вельмі з намі не развітваўся. Сказаў: «Да свідання» — і пайшоў. Выходзіў з хаты, дак яшчэ песню нейкую трынкнуў. Маці на яго: «От дурань, плакаць трэба, а ты спяваеш...» Толькі ўсміхнуўся. Як у машыну садзіўся, сказаў: «Не трывожцеся... К вечару вярнуся...» Так быў упэўнены, што чысты і чэсны... Пяць месяцаў нічога не чулі пра яго. Усюды стукаліся, шукалі. Урэшце сказалі: «Далёка ён, з Шоўкавічаў не відаць...» Аж і праўда, прыходзіць пісьмо з Архангельскай вобласці. Піша татка: «Жывы, таплю начальнікам баню, хлеба хапае. Не журыцеся па мне. Як вы там?..» Як мы? Прыдзірак хапала адусюль. А найперш нас выкінулі з хаты. Мама і нас, трое дзяцей, засталіся пад небам. Добра, людзі прыюцілі... Хату бацькаву перавезлі ў Чарнейкі, зрабілі магазін. А з хлява — амбар у Шоўкавічах. Стопку адкупіў сусед, а мы ў яго перакупілі. Паветачку да яе прыладкавалі — так і жылі, мадзелі. А як вайна пачалася, дак

і ета наша жытло спалілі. Во як было, мой братка... Каб не вайна, дак мо б і татка наш вярнуўся, а то не ведаем нават, дзе яго костачкі... У нас жа тады ўсё чыста вымелі: з хлява, з засекаў, з шафаў. І сталі мы кулацкімі дочкамі. Нават на сходы не пускалі як шкодных «элементаў». От пасылаюць дарогі рабіць. Усім па дзесяць дзён адрабіць, а нам — па дваццаць, бо кулацкія дзеці. Няхай Бог крые ўсіх людзей ад такой напасці...

* * *

Ляжыць баба Арыша ў ложку. Ногі адмаўляюць хадзіць. Стогне душа ад немачы. Вясну бачыць толькі праз шыбіну. Да тэлевізара не дацягнецца. Ёсць кніжкі ў хаце, дык жа чытаць не вучылася. Вось і ляжыць баба Арыша, пазірае на столь, думае, перадумвае сваё жыццё і ціха плача. Крыўдна: восем дзесяткаў гадоў пражыла, а свету белага не бачыла.

Толькі той і радасці, калі збярэцца каля ложка дачка і сын, нявестка і зяць, унукі і праўнукі. Яны нешта збаяць ёй, яна нешта адкалупне ад запечанай памяці. Вось і я аднойчы прысеў каля хворай бабы Арышы. Яе аповед паласнуў па сэрцы.

А пачалося з таго, што баба Арыша дастала з-пад падушкі старую паперку, папрасіла прачытаць услых.

Чытаю: «Янушэўскі Павел Адамавіч, 1903 года нараджэння, пражываў у вёсцы Вялікі Лес Стрэшынскага раёна, арыштаваны ў ліпені 1938 года, абвінавачваўся ў шпіёнскай дзейнасці на карысць буржуазнай Польшчы. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28 верасня 1938 года расстраляны 9 кастрычніка таго ж года. Месца выканання не ўказана. Ваенны трыбунал БВА ад 9 лютага 1959 года пастанову асобай тройкі ў адносінах да Янушэўскага Паўла Адамавіча адмяніў, і справа на яго закрыта з-за адсутнасці саставу злачынства...»

З успамінаў Ірыны Данілаўны Янушэўскай (бабы Арышы)

...Як майго Паўла арыштавалі? От прыйшлі і забралі. Месяц не помню і дзень... Два чалавекі прыйшлі. Кажуць, да гэтага ў Абольцах былі. Там узялі аднаго чалавека і з ім прыехалі... Зайшлі спачатку да старшыні Вядзьгуна. Жонка старшыні дый кажа ім: «Як жа вы будзеце Янушэўскага браць, калі яго жонка ўвечары радзіла?» Прамаўчалі... А я тады якраз Шурку радзіла. Дома абрадзілася. Павел памагаў. Бабіла Астапіха. Радзіла ўвечары. Павел пачаставаў бабку, правёў дадому. А вутрачкам, толькі пачало развідняць, стукаюць у вакно... Павел адкрыў. За ім ідуць удвох. Я не ўставала. Чую, адзін кажа: «Разрашыце вобыск зделаць». Культурны такі, а тады як пачалі ўсё варочаць, як пачалі пераварочваць, як свінні тыя. Што яны знайшлі? Нічога. Паўлаў брат меншы быў камсамольскі сакратар, памёр рана, дак яго дакументы чамусьці забралі... Адзін на Паўла: «Збірайся!..» Што ж, я ляжу. Дзеці бегаюць, плачуць. Я плачу, галашу, а яны што сцяна глухая...

Дзеці крычаць. У Юзіка нага зламаная, у гіпсе. А Лілька — ад страху. Зноў да Паўла: «Збірайся!» Я абазвалася: «Куды вы яго? За што?» Нічога, маўчаць... Павел падышоў да мяне: «Не плач, я хутка вярнуся...» Пацалаваў мяне... Я толькі паспела сказаць: «Вазьмі кухвайку». Адзін з іх буркнуў: «Яму пачці не спатрэбіцца кухвайка». Ета я добра пачула і запомніла на ўсё жыццё. Вывелі, пасадзілі ў машыну. Я пазіраю ў вакно. Дак яшчэ крыкнуў: «Я вярнуся!.. Глядзі дзяцей!..» От і ўсё. Што чалавек быў, што няма. Ад першага дня — як у ваду ўкінулі... Дак жа яшчэ паехалі на луг і забралі Пецю Караткевіча. Касца забралі, можа, яшчэ і з касой. Во як знішчалі «ворагаў народа». А ён жа, той Пецька, толькі ажаніўся. Дзяцей яшчэ не было... Я сама няграматная, пісаць не ўмею. Людзей прасіла, пасылалі канверты ў Гомель, у Жлобін, у Стрэшын. Нічаво, ні слыху ні дыху. От як...

Забралі Паўла, і засталася я сіратлівай былінкай на чацвёра дзяцей. Наказала ў Шоўкавічы, там былі ў замужжы дзве яго сястры, Маня і Анюта. Прыйшлі да мяне, паплакалі разам. А чым яны дапамогуць? У іх свае сем'і, свае клопаты... Закукавала я адзінокай зязюлькай. Ліля — малая памочніца. Юзік ножку зламаў. Шурка мая паўтара годзіка пражыла, балезь нейкая напала — перастала бачыць... А тады і Паўлік памёр. Яго кабыла ўдарыла. Розачкай яе сцебануў, а яна як трахнула яго. Упаў — нежывы. Тры швы ў Стрэшыне наклалі. Тры годзікі мучыўся, абарвалася сэрца... Так і гаравала з Лількай і Юзікам. Ад налогаў не вызвалялі, бо муж — вораг, шпіён... Мяса здай, малако здай. А дзе ўзяць? Некаторых вызвалялі і на дзяцей плацілі.

А мне — фінтос пад нос. Госпадзі, не было дабра і не будзе. От і цяпер — галыдзьба. Як жыць? Усё жыццё кувырком...

Вох ты, Божа мой... Нажылі мы з Паўлам кароўку, коніка і парсючка. Краваць дзеравяную сам зрабіў. От табе і ўсё наша багацце. Сталі калгас збіраць. Назвалі «Светлы пуць». Яго дзесяць разоў пераймяноўвалі. Хацелі, каб у нас быў светлы пуць, да не выйшла па-іхняму... Сталі кароў збіраць у адзін, калгасны гурт. Аддалі кароў, а пасля пайшлі прасіць малака для дзяцей. От табе і калгас... А наш стары Янушэўскі, бацька Паўлаў, выпісваў газеты. І польскую газету выпісваў. Як толькі бабы збяруцца, чытае ім. Аднойчы дый кажа: «Тут напісана, што кожны хадзяін мае права мець сваю карову, а здаваць у калгас трэба лішніх, у каго іх багата. Ідзіце, бабы, па свае каровы...» От і пабеглі бабы па свае каровы. І мы забралі сваю Рабку... Назаўтра — сабранне. Сцяпана, майго брата, скінулі з прадсядацеля. От так, негадзіцься ты кіраваць, бо бедакі кароў пазабіралі з калгаса... Нам прыслалі прадсядацелям пяцітысячніка са Жлобіна Раманькова. Здаровы дзядзька, гаварыў не па-нашаму, а па-расейску. Ніхто ў хату не хацеў пускаць. Мы ўзялі да сябе. Дак і ён мала пакіраваў калгасам. Некуды адправілі... Ай, гэтых прадсядацеляў было, што сабак на вуліцы. А нам пры кожным трэба было гараваць. Я даяркай пайшла. Павел стаў загадчыкам фермы. І ўсё хацеў, каб калгас разбагацеў. Паехаў у Чарнейкі ды сагітаваў у наш калгас Макара. З Вітава прывёз Гурчанку. Са Зломнага некага перацягнуў. А тады захварэў мой Павел на тыфус... А далей? На табе, прыходзя мой брат Сцяпан з сабрання, ён у нас парцейны быў, дый кажа: «Павел, Павел, ці знаеш, што цябе хочуць забраць?» Павел я-як мацюкнецца: «А ё... тваю маць, да як жа мяне забяруць? Хто? За што? Каму я што здзелаў? Я ж калгас строіў. Навошта пляцеш небыліцу?» А Сцяпан сваё: «Можа б, дзе скрыўся часова, можа б, куды з'ехаў?..» Павел: — «Вой, хай людзі збяруцца, хай перад імі страляюць, а я скажу, што невінаваты...» А вось відзіш — падпісаліся пад пісьмом няграматныя праўленцы. Ксянзоў быў тады ў праўленні калгаса, Аляксандр Гаўрыленкаў... Дак яны ж пісаць не ўмелі. А хто напісаў? Мо хто з старшыняў? Іх часта здымалі: Кудаў быў, Шыкуноў быў, Антускоў быў... І нікуды мой Павел не пайшоў хавацца. Нявінаваты ён, вось што. А пасля вайны прыехаў адзін нейкі ваенны з вобласці. У хаце Панцеляймона атабарыўся, усіх дапрашваў. Выклікаў і мяне. Так і так, на вашага мужа напісалі чуш. Нібыта ён з нейкім Бараноўскім нейкую сувязь меў. За граніцу пісьмы пасылаў. Я кажу: «Божа, Божа, мы ў Бараноўскага раз бульбу капалі. А тады яны з'ехалі некуды. Мы ж адкуль ведаем?.. Яны нават да нас ніколі не хадзілі. Павел з імі нічога ніякага ніколі не меў. Наплявузгалі...»

А я ўсе дзянёчкі мардавалася. Свету белага не бачыла... Забралі Паўла, дак я ж у той дзень і паднялася: дзяцей трэба глядзець, кароўку даіць трэба. З таго часу і не прысаджвалася. Вось толькі хвароба звалі-ла. Сёмы гадочак «адпачываю»... Усяго было: і бульбу гнілую елі, і галадалі, пухлі з голаду, і скаргі глытала разам з слязьмі... Панакладалі былі на мяне падаткаў, як на сям'ю ўрадзіцеля. Здавалі ўсё: яйкі, малако, мяса, зерне, грошы... Хоць памры, а здай. Вайну прасядзелі, што мышы. Усё ж чыста разбурылі. Кароўку маю Красулю былі ўкралі. Разведчыкі, дай ім Бог здароўя, вярнулі. Кароўка-карміцелька, як без яе з дзецьмі малымі... Я хаця няграматная, але не дурная баба...

З успамінаў Юзэфа Паўлавіча Янушэўскага

...Помню, паднеслі мяне да машыны, крычаў: «Аддайце бацьку!» Ён мяне падняў на рукі, пацалаваў, і ўсё. Нагу быў зламаў. Пасля руку быў зламаў. З сямі гадоў пачаў курыць і піць (смяецца). Пайшоў у армію — схлусіў пра бацьку, сказаў, што загінуў. Сыну свайму схлусіў, во як жыць трэ было. У вайну на карове араў. Партызанам у лес хлеб вазіў. Страшна, што было. Адкуль тое здароўе. Бацька — шпіён. Смех!.. Забілі мужа і бацьку, калгасніка і маладога чалавека, касца і аратага. За што? Ды проста так. Трэба было выканаць план па знішчэнні ворагаў народа. Пад гэту грабёнку падпадалі сумленныя, чыстыя людзі. Жах! Валасы і цяпер уздымаюцца дыбам.

Забілі Паўла Адамавіча Янушэўскага праз два месяцы, як забралі. Недалёка адвезлі ад дома. Упаў бязвінны на крывавую зямельку, можа, у Курапатах. Душа стогне: за што?!

Уладзімір Ліпскі
«Адпяванне жывых». Мн.: «Мастацкая літаратура», 1993, сс. 57—68.

Без суда і дазнання

З успамінаў Івана Рыгоравіча Катлабая, жыхара в. Дземяхі

Жыў я некалі на пасёлку Новае Святло. У 30-ых гадах ссяліўся ў Коззе. Сям'ю сваю меў: жонка ды трое дзетак. Старэйшы сын Віця нарадзіўся ў нас у 28-ым. Праз чатыры гады здабылі з жонкай дачку Ефрасінню. Яшчэ адзін сын — Ілья — з 34-га года.

У Коззі тады калгас браўся ў сілу, а я са сваім каньком на чыгунцы рабіў. Сельсавет на сям'ю нашую не забываецца: падаткамі цісне. Трэба і грашыма аддаваць, і лёнам, і хлебам трэба... Цяжка, вядома, ды я ў калгас і не думаю. А як часіна вольная, то ў царкву іду. Актывісты на мяне пазіраюць касяком.

На пачатку лістапада 37-га да нас у «госці» міліцыянер Ян Палячок. На Антопалі ён жыў. Завуць Янам, а Палячок — мянушка, бо з палякаў сам.

«Давай, — кажа, — зраблю ў цябе вобыск».

Ну вобыск дык вобыск.

Шукаў, ды нічога не знайшоў. І паперу напісаў што так. Падпісаўся я ўнізе.

А Палячок і кажа: «Садзіся на воз ды паедзем».

«Куды?» — пытаюся.

«Там пабачыш».

Апынуўся неўзабаве я ў Гомелі.

Забралі ў нас тады бацюшку Васіля Мілановіча, псаломшчыка Сцяпана з Лісак, царкоўнага старасту Сцяпана Бондара з Коззя, пеўчую Соню са Стара-Краснага...

У Гомелі, лічы, і дазнання ніякага не было. Праўда, папера на мяне мелася. Чыркануў яе сельсавецкі актывіст. Маўляў, як хадзіў па Коззі з агітацыяй па сталінскай канстытуцыі, то і да Катлабая, маўляў, заходзіў. А я быццам і сказаў: «Няправядлівая яна». Гэта пра канстытуцыю.

А чацвёртага лістапада таго ж 37-га прыводзяць нас у клуб. За сталом тут асобая тройка НКУС.

Выклікаюць — а нас 270 чалавек — кожнага. Падыдзі ды распішыся. І я распісаўся. На дзесяць гадоў лагераў... От так... Без суда і дазнання...

Прымус адбываў найперш у Манголіі. На лесапавале.

Па дарозе туды — у Краснаярску — нешчасце здарылася са мною. У лазні, калі былі на каранціне, згарэла мая апратка. Застаўся, лічы, у нацельным.

От так і ішоў далей. Задубеў. Няма ніякае рады, каб паўзці далей. Нкусаўцы «пашкадавалі». Пытаюцца: «Хто землякі ягоныя?» Адазваліся браты Процыкі з Ямпаля — Андрэй, Васіль ды Іван. То яны і цягнулі мяне далей.

Іван з лагероў не вярнуўся. Андрэй з Васілем ацалелі. Як і я...

Пасля Манголіі — Комі. Котлас ды Варкута. І тут лесапавал. Пашчасціла яшчэ, што ўзяў да сябе ў хімлабараторыю інжынер Васіль Анатольевіч Лашчанка. Усё ж лягчэй.

Але ўрэшце дайшоў, што далей няма куды. Чатыры месяцы ў больніцы валяўся. Акціравалі мяне. Словам, можна і дамоў. А дамоўка ўжэ пад немцам. Вайна кругом. То накіравалі мяне ў Башкірыю. У збожжасаўгас.

Прыбіўся туды. Дырэктар саўгаса, з яўрэяў сам, мне рады. Умею ж і па плотніцтву, і па сталярству.

Акрыяў тут. Ад ветру ўжэ не хістаюся.

Прачулі пра мяне з ваенкамата. Прыязджаюць: «Збірайся. Трэба ваенкамат рамантаваць».

Раблю ў ваенкамаце. Жыву на кватэры разам з ваенкаматаўцам. Ён да гаспадыні заляцаецца. А я, як здалося яму, на маладзіцу нейк не так зірнуў. Словам, адправілі мяне на фронт.

Маёр, камандзір часці, даведаўся пра маё плотніцтва ды сталярства — загадаў будаваць зямлянкі.

Скончыў неўзабаве школу малодшых камандзіраў. Вазіў ва Уладзівасток башкіраў — хлопцаў 27-га года нараджэння.

Здалі башкіраў. Назад ехалі. На станцыі Бірабінск цягнік супыніўся. Маёр і казаў, каб нікуды не адыходзіў ніхто. Я ў вакзал, а цягнік крануўся. Словам, не ўправіўся скочыць назад у вагон. А тут патруль: «Дакументы!»

Апынуўся неўзабаве на фронце. Дайшоў да Берліна. Ваяваў другім нумарам кулямёта ў 37-ай артылерыйскай брыгадзе.

У Германіі быў да 48-га. Ужэ як вольнанаёмным. Аказваецца, што без навукі атрымалася ў мяне поварства. Ладзіцца за што ні вазьмуся. Быццам сіла нейкая святая мне прыяе.

Дамоў сэрца ірвецца, а я ўсё ў Германіі. Ведаю: у Коззі маім галеча. А мне плоцяць добра, то ўсё дамоў шлю...

Як вярнуўся, то рабіў у калгасе, у Салтанове на адкорме бычкоў.

...Цяжкі перажыў час. Ды каб у крыўдзе на каго вялікай, дык не. Усё ж ацалеў. Дапамагла выжыць, відаць, мая вера. І зараз верую. Езджу ў царкву ў Васілевічы.

Цяпер я «чысты». У мяне рэабілітацыя. 58 тысяч атрымаў грашыма. Во-во павінны аддаць і за каня, з якім рабіў у 37-ым на чыгунцы і не схацеў аддаць у калгас...

Запіс *П. П. Рабянка*

Хацелі жыць

З успамінаў Ганны Мікітаўны Бур'як, дачкі былога жыхара в. Капараўка Капараўскага сельсавета Мікіты Сільвестравіча Бондара

...Сям'я ў бацькі нашага была ў сем душ. Трое сыноў ды дзве дачкі. Жылі так сабе. Сярэдне жылі. Было чатыры га зямлі, конь быў, дзве каровы дойныя. Шчэ гумно, клуня. Праўда, хату бацька паставіў бальшэнную. На тры комнаты. Гэта каб кожнаму сыну жыць дзе было. Адно прарэж дзверы і — свая хата.

У калгас, калі надышоў час, бацька доўга не запісваўся. Хацеў старацца аднаасобна. А калі налогамі прыціснулі, што не дыхнуць, то таксама панёс заяву. Каб прынялі калгаснікам. Але малады старшыня сельсавета (з лазараўскіх мужчын) і кажа яму. Вочы ў вочы кажа: «Вот што, дзядзька Мікіта, ты нам у калгасе непатрэбен. А вот хата твая спанадабіцца. Сельсавету цесна ў етай, дак мы хацелі б перайсці ў тваю. Так забраць яе ў цябе мы не маем правоў. Значыць, будзем штось думаць...»

Ну і надумаліся. У трыццаць першым бацьку арыштавалі і прад'явілі абвінавачанне, у каторым гаворыцца, што аднаасобнік Мікіта Бондар выйшаў на вуліцу (наша хата стаяла пасярод сяла, яна і зараз там стаіць) ды стаў агітаваць людзей, каб не здавалі дзяржаве збожжа.

Пасадзілі бацьку ў школу. Забралі ноччу. Там жа і судзілі. Без людзей. Былі адзін-двое «сведкаў». Адзін з іх падымаецца ды й кажа: «Дак такога ж Бондар не гаварыў...» А старшыня таму сведку: «Ты што, хочаш разам сесці з Бондарам?..» Ну той і змоўк.

Восем гадоў далі тады бацьку. Сядзеў, як ведаю, у Гомелі. Памёр ад голаду ў трыццаць трэцім... А так хацеў па-людску жыць. Ды і ўсе мы хацелі.

Запіс Ф. С. Вішняка

За радком спецзводак органаў ГПУ

Совершенно секретно

Специальная сводка № 11
о настроениях рабочих предприятий и артелей г. Речицы

по состоянию на 15 февраля 1933 г.

Поступившие материалы вновь отмечают ряд отрицательных настроений рабочих на почве продзатруднений и задержки в выплате заработной платы.

СПИЧЕЧНАЯ ФАБРИКА «Х ОКТЯБРЬ». Старый рабочий фабрики Шатон Митрофан, б/п, 1.11.1933 г. в присутствии рабочих Железинского Александра, Козловского Петра, Рогозина Александра и Рашко Даниила говорил: «Что это за обеды в столовой, что идешь на работу голодный и со столовой также, а выдаваемый нам фунт хлеба съешь в один раз за столом, а дома приходится сидеть не евши». Железинский Александр добавил: «Но почему-то зав. цехов дали по полтора кило сыру, а рабочим ничего не дали. Это потому, что местная власть крутит по-своему для того, чтобы набить себе карманы, несмотря на то, что есть телеграмма из Минска, чтобы давали рабочим нашей фабрики 600 граммов хлеба. Но возьмем, к примеру: пришла спецодежда, а ее получили не рабочие, а администрация и служащие. Если бы рабочие, как один, не вышли на работу, то скорее бы обеспечили рабочего».

ЗАВОД ИМ. ВОРОШИЛОВА. Рабочий Студенский Павел, б/п, 6.11.1933 г. в присутствии группы рабочих Сорокина, б/п, Старостенко и др. говорил: «Поблюдная система обедов не улучшает быта рабочих, а наоборот, рабочие из-за дороговизны не в состоянии покупать, потому что низкая зарплата, а и цены день ото дня на обеды повышаются. А зарплата не прибывает, вот и живи как хочешь. Если бы давали вовремя зарплату, то рабочий смог бы купить себе необходимые товары на рынке, а то сам в столовой покупаешь, а дома семья голодает. Особенно дети, которым нет дела, что нет ничего, а давай».

ЗАВОД ИМ. ТОМСКОГО. В связи с несвоевременной выдачей зарплаты за январь месяц с/г среди рабочих завода слышны нарекания на советскую власть о том, что нет справедливости и порядка. 8.11.1933 г. старый рабочий завода Ворона Мирон, б/п, житель гор. Речицы, среди рабочих говорил в конторе заводоуправления: «Раз не дают денег, то жить невозможно. Чтоб их разорвало с их советской властью и их порядками».

ЗАВОД ИМ. ГОЛОДЕДА. 9 февраля с/г рабочий смены «а» Малицкий, б/п, в присутствии рабочих Чижика Осипа, Гришай Петра, б/п, и др. говорил: «Настолько в столовой плохо кормят, что даже домой неохота идти, так как в квартире холодно, хоть волков гоняй, потому что не дают дров». Чижик добавил: «Скоро додумаются давать рабочим вместо пайка по полену дров, так как кроме несчастного фунта хлеба сколько уже времени не дают никаких продуктов, как хочешь, так и живи. Что это за обеды в столовой, что всегда голодный. Если бы рабочие, как один, отказались от обедов, то неправда, улучшили бы питание».

ВЕРЕВОЧНЫЙ ЗАВОД. ...среди рабочих завода имеются разговоры о том, что если только урежут обеды с хлебом, то пусть сами работают.

Вр. нач. Речицкого горотделения ПП ОГПУ БССР (Симановский)
Уполномоченный (Костюковский)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл., ф. 254, воп. 8, спр. 156, лл. 43—44.

Спецсводка № 13
о ходе подготовки к весеннему севу по Речицкому району

по данным на 25 февраля 1933 г.

...В Ровенско-Слободском и Заспенском сельсоветах план сева доведен до каждого единоличника, посредством дачи выписки каждому крестьянину, сколько ему по плану нужно сеять яровых культур. И каждый крестьянин должен расписаться об этом в списке. В этих сельсоветах отмечено, что значительная часть единоличников совершенно отказалась от подписи на сев, мотивируя тем, что отсутствуют семена, а также многие говорили, что «сеять будем, но взять на себя обязательство посредством дачи подписки отказываемся».

Нами принимаются меры к выявлению инициаторов саботажа сева в этих сельсоветах...

Вр. нач. Речицкого горотделения ПП ОГПУ БССР (Симановский)
Уполномоченный (Костюковский)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл., ф. 254, воп. 8, спр. 156, л. 46.

Совершенно секретно

Секретарю Речицкого РК КП(б)Б.
Председателю райисполкома.

3 мая 1934 г.[1]

Сообщаем, что 1/VI с. г. в Ново-Борсуковском сельсовете выездным нарсудом привлечено к ответственности правление колхоза, в которое входили: Таратын Михаил, б. пред. колхоза, Медведев Павел — член правления, бывший твердозаданник, Куркаев Александр — до вступления в колхоз зажиточный середняк, и Кириченко Илья — член правления колхоза, бывший твердозаданник. Судом приговорены к 10 годам лишения свободы за умышленное уничтожение свинной фермы и убой скота.

Осужденные написали заявление правлению колхоза, в котором просили характеристики о своей работе. Счетовод колхоза Мельницкий собрал собрание и жалобным тоном зачитывал это заявление, где было написано: «Прощайте товарищи, может быть, мы больше и не увидимся, и т. д.» На собрании поднялся плач, особенно женщин. Мельницкий старался доказать, что суд неверно вынес приговор, за исключением председателя колхоза Таратына. В результате 2 июня с. г. на прополочную не вышло более 30 человек женщин. Со стороны имеющегося парторга и партийцев в сельсовете никакой разъяснительной работы не проведено в отношении подсудимых.

О чем ставим Вас в известность.

Нач. Речицкого р/о ПП ОГПУ БССР (Рожанский)
Пом. уполномоченного (Кравцов)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобл., ф. 254, воп. 2, спр. 158, л. 107.

[1] *3 мая 1934 г. — памылка. Дакумент напісаны хутчэй за ўсё 3 чэрвеня 1934 г.*

Рэпрэсіраваныя ў 1920—1941 гг. (да 22 чэрвеня)*

АЗЕРШЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЗЕРШЧЫНА

ДВОРНІК Пётр Іванавіч, н. у 1863. Жыў у Рэчыцы, працаваў конюхам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобага трыбунала НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.10.1937. Рэабілітаваны 14.12.1964.

ЧАРНЕЎСКІ Станіслаў Францавіч, н. у 1902 у Ноўгарадзе. Жыў у Азершчыне, працаваў настаўнікам. Як пазначана ў судовай справе: з дваран. Арыштаваны ў студзені 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 9.7.1957.

Пасёлак БОРХАЎ

ГРЫГОР'ЕЎ Аляксей Міхайлавіч. Раскулачаны ў 1930. Быў высланы ў Комі АССР, дзе і памёр. Разам з ім была выслана сям'я: жонка Лізавета Пятроўна, дзеці Аляксандр, 1923 г. н., Васіль, 1926 г. н.

ВЁСКА УНОРЫЦА

ДЗЕНІСЕНКА Трафім Сцяпанавіч, н. у 1890. Жыў у Рэчыцы, працаваў у шавецкай арцелі. Арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 21.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 4.10.1989.

КАЗАЧЭНКА Ілья Якаўлевіч, н. у 1888, працаваў у калгасе «Чырвоная Беларусь». Арыштаваны 24.1.1937. Па пастанове Спецыяльнай калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 25.4.1937 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 3 гады. Вызвалены з месца зняволення ў 1942. Рэабілітаваны 26.7.1961.

СЕВЯРЫНЕЦ Яўсей Данілавіч. Раскулачаны.

АРТУКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АРТУКІ

БАНДАРЭНКА Мікіта Кірылавіч, н. у 1875. Арыштаваны 26.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.7.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 10.7.1989.

БАНДАРЭНКА Мікіта Кірылавіч, н. у 1882, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ДЗЕЖКА Герасім Лукіч, н. у 1898, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 4.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.11.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 14.5.1962.

КАМЕКА Васіль Рыгоравіч, н. у 1908, повар асапр. Арыштаваны 9.4.1932. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 9.9.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 4.4.1960.

КАМЕКА Пётр Рыгоравіч, н. у 1900. Арыштаваны 4.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 23.7.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 10.7.1989.

КАМЕКА Ульяна Аляксандраўна, н. у 1907. Раскулачана.

ПЯШКУН Аляксандр Кірылавіч, н. у 1900, жыў у пас. Дабраволец. Арыштаваны 7.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.7.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Пайшоў працаваць у калгас «Трэці рашаючы». Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 30.5.1989.

ПЯШКУН Аляксей Яфімавіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 4.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 14.5.1962.

ПЯШКУН Антон Іванавіч, н. у 1894. Арыштаваны 7.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.7.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 10.7.1989.

ПЯШКУН Барыс Лаўрэнавіч, н. у 1891, працаваў у калгасе. Арыштаваны 24.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.8.1961.

ПЯШКУН Ісак Фёдаравіч, н. у 1900, жыў у в. Жмураўка. Арыштаваны 5.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.7.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 10.7.1989.

ПЯШКУН Кірыл Гаўрылавіч, н. у 1876. Арыштаваны 26.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.7.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 10.7.1989.

ПЯШКУН Клім Фёдаравіч, н. у 1872, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір па 2-ой катэгорыі. Рэабілітаваны 15.12.1989.

---

* Спісы складзены на падставе падворных абходаў і апытанняў грамадзян, архіўных звестак і дакументаў.

ПЯШКУН Мануіл Мікітавіч, н. у 1899, жыў у пас. Дабраволец. Арыштаваны 28.10.1936. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 7.2.1937 зняволены на 6 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 22.1.1992.

ПЯШКУН Нічыпар Піліпавіч, н. у 1882, жыў у пас. Дабраволец, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 21.8.1940. Асуджаны 20.10.1940 Віцебскім абласным судом на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 22.1.1992.

ПЯШКУН Фёдар Іванавіч, н. у чэрвені 1884, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.6.1989.

СКАРОМНЫ Васіль Ільіч, н. у 1898, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 23.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.2.1962.

ХАЛАЛЕЕНКА Мірон Авакумавіч, н. у 1896, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 31.8.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 9.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЛАМАЧОЎ Пётр Апанасавіч, н. у 1910, чырвонаармеец 148 ад войск АГПУ. Арыштаваны 11.5.1933. Па пастанове ваеннага трыбунала пагранічных войск АГПУ Паўночна-Каўказскага краю ад 14.9.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Пакаранне адбываў у Пячорлагеры. Вызвалены з месца зняволення 19.5.1943. Рэабілітаваны 14.12.1959.

ЛЕШЧАНКА Павел Андрэевіч, н. у 1905, працаваў рабочым Васілевіцкага леспрамгаса. Арыштаваны 30.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 17.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Бамлагеры. Рэабілітаваны 15.1.1963.

НАЗАРАНКА Кузьма Сямёнавіч, н. у 1883, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 10.4.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Але неўзабаве пакаранне было заменена 3 гадамі высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 29.5.1962.

НАЗАРАНКА Сяргей Сямёнавіч, н. у 1878, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 10.4.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. 23.4.1933 пакаранне было заменена на пазбаўленне права пражывання ў

12 пунктах краіны і Уральскай вобл. Рэабілітаваны.

РАДЗЮЖКА (РАДЗЮШКА) Пётр Васільевіч, н. у 1895, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.1.1933. Асуджаны пастановай тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 10.4.1933. Рэабілітаваны 29.5.1962.

ГОРАД ВАСІЛЕВІЧЫ

АЛІФЕРАВЕЦ Мікалай Архіпавіч, н. у 1899 (Жыткавіцкі р-н), жыў у Васілевічах, працаваў дзесятнікам Гомельскага гартопа. Арыштаваны 28.6.1938. Па пастанове Асобага Трыбунала НКУС БССР ад 3.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.11.1938. Рэабілітаваны ў 1966.

БЕЛЫ Андрэй Яфімавіч, н. у 1881, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове Асобага Трыбунала НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 30.12.1960.

БЕЛЫ Архіп Мінавіч, н. у 1892, працаваў майстрам на чыгунцы. Арыштаваны 26.11.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.4.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 5.11. 1959.

БЕЛЫ Мікалай Кузьміч, н. у 1896, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.1.1938. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Адбыўшы тэрмін пакарання, вярнуўся дамоў. Працаваў рабочым у луггасе «Ведрыч». Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Архангельскай вобл. Памёр у лагеры 7.2.1942. Рэабілітаваны 16.12.1960.

БЕЛЫ Піліп Міхайлавіч. Быў раскулачаны. Як пазначана ў дакументах, у яго канфіскавалі «...поросенка 1 г., стопку, 2 поношенных штанов, 6 стульев старых, сундук, шкаф...». Рэабілітаваны 31.8.1961.

БЛІШЧ Іосіф Паўлавіч, н. у 1892, працаваў машыністам паравоза. Арыштаваны 18.7.1938. Па пастанове Асобага Трыбунала НКУС БССР ад 10.10.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 17.8.1960.

БРЭЛЬ Агаф'я Пятроўна, н. у 1897, жыла на х. Ляды, працавала на ўласнай гаспадарцы. Арыштавана 6.4.1935. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 31.8.1935 зняволена на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбывала ў Сіблагеры. Рэабілітавана 19.4.1989.

БРЭЛЬ Андрэй Паўлавіч, н. у 1900, працаваў загадчыкам гаспадаркі ў бальніцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 28.9.1960.

БРЭЛЬ Барыс Майсеевіч, н. у 1892, працаваў памочнікам машыніста паравоза на ст. Гомель. Арыштаваны 2.12.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 23.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938. Рэабілітаваны 14.9.1959.

БРЭЛЬ-ВАСЕНДА Ірына Нічыпараўна, н. у 1897, жыла на х. Ляды, працавала на ўласнай гаспадарцы. Арыштавана 6.4.1935. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 31.8.1935 зняволена на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбывала ў Сіблагеры. Вызвалена з месца зняволення 23.4.1940. Рэабілітавана 19.4.1989.

БРЭЛЬ Кузьма Сілавіч, н. у 1869. Арыштаваны 10.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 14.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у турме г. Чэрвеня 8.6.1938. Рэабілітаваны 12.6.1989.

БРЭЛЬ Марыя Савельеўна, н. у 1877, жыла на х. Ляды ў сям'і сына — Міхаіла Нічыпаравіча Брэля. Арыштавана 6.4.1935. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 31.8.1935 асуджана да высылкі ў Краснаярскі край тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітавана 19.4.1989.

БРЭЛЬ Міхаіл Нічыпаравіч, н. у 1896 (муж Брэль Агаф'і Пятроўны), жыў на х. Ляды, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.4.1935. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 31.8.1935 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. 31.8.1937 асобай тройкай НКУС СССР прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.9.1937. Рэабілітаваны 19.4.1989.

БРЭЛЬ Сямён Кузьміч, н. у 1879, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.4.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 12.12.1960.

ВАСЕНДА Сцяпан Дарафеевіч, н. у 1897 (муж Брэль-Васенды Ірыны Нічыпараўны), жыў на х. Ляды. Арыштаваны 6.4.1935. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 31.8.1935 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Белбалтлагеры. Рэабілітаваны 19.4.1989.

ВАСІЛЬЕЎ Аляксандр Піліпавіч, н. у 1901, жыў у Гомелі. Арыштаваны 11.3.1938. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 26.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.8.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ВЯНГЛІНСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1881 у мястэчку Гарадня Чарнігаўскай губерні, жыў у Васілевічах, працаваў дзяжурным па ст. Васілевічы. Арыштаваны 19.1.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 12.3.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Была выслана за межы рэспублікі ягоная сям'я. Рэабілітаваны 1.12.1989.

ГУРСКІ Парфен Яфімавіч, н. у 1889, працаваў памочнікам каменданта Выбаргскага райхарчгандлю. Арыштаваны 5.6.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 25.8.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 27.8.1937. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ДЗЕЙКУН Павел Іванавіч, н. у 1865, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны ў 1933. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 15.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.12.1960.

ДОЎЖЫК Васіль Іванавіч, н. у 1904, працаваў машыністам паравоза. Арыштаваны 3.12.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 23.4.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 21.3.1960.

ДОЎЖЫК Павел Гаўрылавіч, н. у 1896, працаваў дзесятнікам арцелі «Рассвет». Арыштаваны 13.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.10.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 15.2.1963.

ДОЎЖЫК Павел Іванавіч, працаваў машыністам паравоза ст. Васілевічы. Арыштаваны 4.1.1938. Па пастанове наркома НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.3.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.4.1938. Рэабілітаваны 21.3.1960.

ДРАП Яўгенія Уладзіміраўна, н. у 1897 у в. Белая Пінскага павета, жыла ў Васілевічах, працавала настаўніцай у мясцовай сярэдняй школе. Арыштавана 12.7.1939. Па пастанове Ваеннай калегіі Вярхоўнага Суда СССР ад 11.12.1939 зняволена на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбывала ў Краснаярскім краі. Рэабілітавана 25.10.1956.

ЗЯМЛЯНСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1886 у в. Бабёр Бабруйскага павета, жыў у Васілевічах, працаваў у гандлі. Арыштаваны 25.2.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 4.5.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 25.5.1960.

КАВАЛЬКОЎ Андрэй Кандратавіч, н. у 1889 у в. Анісімавічы, жыў у Васілевічах, працаваў рахункаводам Васілевіцкага лесаўчастка. Арыштаваны 6.1.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 9.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 20.3.1938 у Мазыры. Рэабілітаваны 14.1.1960.

КАЛОША Анастасія Сямёнаўна, н. у 1891 у в. Лань Слуцкага павета (Польшча), працавала настаўніцай у Васілевіцкай няпоўнай сярэдняй школе. Арыштавана 24.8.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 20.11.1937 прыгаворана да ВМП. Расстраляна 29.11.1937 у Гомелі. Рэабілітавана 26.7.1989.

КАЛУБАЕЎСКІ Аляксандр Антонавіч, н. у 1890 у Ваўкавыскім павеце Гродзенскай губерні, жыў у Васілевічах, быў святаром. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 19.6.1989.

КУЛІН Уладзімір Іванавіч, н. у 1906 у в. Сычоўка Віленскай губерні, жыў у Васілевічах, працаваў шафёрам на торфазаводзе «Закрашынскі Мох». Арыштаваны ў 1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 23.11.1937. Рэабілітаваны.

КУЛІЦКІ Карл Іванавіч, н. у 1887 у в. Берасцечка Хойніцкай воласці Рэчыцкага павета, жыў у Васілевічах, працаваў грузчыкам на ст. Васілевічы. Арыштаваны 11.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 20.11.1938. Рэабілітаваны 7.12.1962.

КУХАРЭВІЧ (КУХАРАЎ) Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1889 у в. Вялікія Васкраніцы (Польшча), жыў у Васілевічах, працаваў у калгасе імя Сталіна. Арыштаваны 14.2.1940. Па пастанове Палескага абласнога суда ад 10.6.1940 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер з пазбаўленнем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Пакаранне адбываў у Амурлагеры. Памёр у месцы зняволення 13.6.1943. Рэабілітаваны 18.3.1965.

ЛАЎШУК Пётр Маркавіч, н. у 1897, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 12.12.1960.

МАКОВІЧ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1904 у Гомелі, жыў у Васілевічах, працаваў старшым кандуктарам ст. Васілевічы. Арыштаваны 26.11.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 20.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938. Рэабілітаваны 8.4.1958.

МЕЛЕХ Ісак Іванавіч, н. у 1894 у в. Вербавічы Нараўлянскай воласці Рэчыцкага павета, жыў у Васілевічах, працаваў настаўнікам. Арыштаваны 29.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.2.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.8.1988.

МЕТНЕР Іван Карлавіч, н. у 1896. Як пазначана ў судовай справе, па нацыянальнасці немец, сын гандляра лесам. Арыштаваны 5.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 20.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.12.1937. Рэабілітаваны 21.9.1959.

НАЗАРАЎ Іван Яфімавіч, н. у 1901, працаваў качагарам ст. Васілевічы. Арыштаваны 15.6.1938. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 10.2.1941 вызвалены на волю. У якасці пакарання залічаны тэрмін знаходжання пад арыштам. Рэабілітаваны 10.10.1989.

НАЗАРАЎ Яўціхій Яфімавіч, н. у 1900, працаваў брыгадзірам на чыгунцы, жыў у в. Аляксандраўка Мазырскага р-на. Арыштаваны 14.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 10.10.1938 асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 19.2.1956.

ПАЎЛОЎСКІ Уладзімір Іванавіч, н. у 1894 у Гомелі, жыў у Васілевічах, працаваў на чыгунцы. Арыштаваны 16.9.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ па БССР ад 20.11.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 9.12.1992.

САКАЛОЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1893 у в. Воля Пінскага павета (Польшча), жыў у Васілевічах, быў святаром. Арыштаваны 7.2.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.2.1938 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 13.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 2.6.1958.

СЕРАДА Карп Кліменцьевіч, н. у 1922, з'яўляўся вучнем 7-га класа Васілевіцкай СШ. Жыў з маці. Бацька ж знаходзіўся ў зняволенні. Арыштаваны 11.2.1938. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 19.6.1938 асуджаны на 5 гадоў працоўнай калоніі. Пакаранне адбываў у Прыволжлагеры (Саратаўская вобл.). Вызвалены з месца зняволення 24.2.1943. Рэабілітаваны 31.5.1989.

СІДАРУК Антон Ігнатавіч, н. у 1890 у в. Целяцічы Брэсцкага павета, жыў у Васілевічах, працаваў на торфазаводзе «Закрашынскі Мох». Арыштаваны 26.11.1939. Па пастанове Палескага абласнога суда ад 3.6.1940 зняволены ў папраўча-працоўны лагер тэрмінам на 3,5 года з паражэннем у грамадзянскіх правах на 3 гады. Рэабілітаваны 6.12.1991.

СОПАТ Ціт Васільевіч, н. у 1876. Згодна з іншымі данымі — у 1881. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.4.1933 прыгавораны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 5 гадоў. У другі раз арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.12.1960.

СУПЕЕЎ (СУПЕЙ) Іван Васільевіч, н. у 1905, працаваў старшынёй Раманавіцкага с/с, Гомельскага р-на. Член ВКП(б). Арыштаваны 28.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1934. Рэабілітаваны 8.8.1989.

СЯЛЦКІ Кірыл Максімавіч, н. у 1879 у Жлобіне, жыў у Васілевічах, працаваў фельчарам ст. Васілевічы. Арыштаваны 3.11.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.11.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Пасля вызвалення вярнуўся ў Васілевічы. Працаваў загадчыкам раённай амбулаторыі. Зноў арыштаваны 4.2.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 4.5.1933 асуджаны да ВМП. У дачыненні першага прыгавору рэабілітаваны 17.10.1989, другога — 26.5.1960.

ТАБУЛІН Іван Антонавіч, н. у 1880, працаваў вагаўшчыком на ст. Васілевічы. Арыштаваны 4.9.1930. Быў вызвалены 26.12.1930. Зноў арыштаваны 23.6.1931. Па пастанове асобай тройкі АГПУ па БССР быў асуджаны на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 5.6.1963.

ЦУКАРАЎ Ісак Ісаевіч, н. у 1904 у в. Жарэбнае Гомельскага павета, жыў у Васілевічах, працаваў рабочым торфазавода «Закрашынскі Мох». Арыштаваны 23.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 30.12.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 27.12.1989.

ВЫШАМІРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЫШАМІР

ІВАНОЎ Якаў Мікітавіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.3.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.9.1965.

КРОТАВА Ганна Фядосаўна, н. у 1897, працавала ў калгасе імя Варашылава. Арыштавана 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволена на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбывала ў Новасібірскай вобл. Рэабілітавана 27.10.1989.

КРОТАЎ Васіль Піліпавіч, н. у 1895, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 17.11.1989.

КРОТАЎ Георгій Аляксеевіч, н. у 1895, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.3.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.9.1965.

КРОТАЎ Касьян Ануфрыевіч, н. у 1900, працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 18.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

КРОТАЎ Міхаіл Піліпавіч, н. у 1881, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 17.11.1989.

КРОТАЎ Пётр Максімавіч, н. у 1907. Раскулачаны. Арыштаваны 20.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 14.6.1989.

НОВІК Лука Цімафеевіч, н. у 1896, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Біраб іджане. Вызвалены з месца зняволення ў 1937. Зноў арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў на Паўднёва-Усходняй чыгунцы. Вызвалены з месца зняволення ў 1947. Рэабілітаваны 31.5.1965.

ПРАХАРЭНКА Герасім Яфімавіч, н. у 1904, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.3.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер с канфіскацыяй маёмасці. Пакаранне адбываў у Сібіры. Памёр у месцы зняволення 9.10.1943. Рэабілітаваны 13.9.1965.

ПРАХАРЭНКА Дзям'ян Яфімавіч, н. у 1898, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.3.1933 зняволены на 10 гадоў у па-

праўча-працоўны лагер з канфіскацыяй маёмасці. Пакаранне адбываў у Сібіры. Вызвалены з месца зняволення 28.9.1943. Рэабілітаваны 13.9.1965.

ПРАХАРЭНКА Дзяніс Парфенавіч, н. у 1877, працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.3.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 13.9.1965.

ПРАХАРЭНКА Кузьма Мітрафанавіч, н. у 1889. Жыў у в. Лецяшын, працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 19.1.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ПРАХАРЭНКА Улас Паўлавіч, н. у 1897, працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 31.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1935. Рэабілітаваны 31.5.1965.

ПЯТРОЎ Андрэй Дзмітрыевіч, н. у 1896, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны ў лістападзе 1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.6.1981.

СІВІЦКІ Аляксей Іванавіч, н. у 1897, працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.3.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення 23.3.1936. Рэабілітаваны 13.9.1965.

СІВІЦКІ (САВІЦКІ) Іван Сямёнавіч, н. у 1904. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.11.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 19.9.1989.

СІВІЦКІ Ілья Сямёнавіч, н. у 1878, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Пасля адбыцця пакарання працаваў у калгасе імя Варашылава. Зноў арыштаваны 10.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1930 г. рэабілітаваны 17.11.1989, па прысуду 1937 г.— 9.6.1989.

СІВІЦКІ Лявон Маркавіч, н. у 1902, працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 18.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

СІВІЦКІ Сямён Андрэевіч, н. у 1858. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 6.6.1989.

СІВІЦКІ Ціхан Малахавіч, н. у 1887, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 2.12.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Зноў арыштаваны 20.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1932 г. рэабілітаваны 12.9.1989, па прысуду 1937 г.— 26.6.1989.

СКЛІМЯНОК Дар'я Цярэнцьеўна, н. у 1905, працавала свінаркай у калгасе імя Варашылава. Арыштавана 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволена на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбывала ў Сібіры (станцыя Яя Томскай чыгункі). Пастановай НКУС БССР ад 17.1.1940 тэрмін зняволення зніжаны да 3 гадоў. Рэабілітавана 4.7.1989.

СКЛІМЯНОК Канстанцін Яўменавіч, н. у 1894, працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 18.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ХУЛУП Аляксей Яўменавіч, н. у 1888—1890(?), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пасля адбыцця пакарання працаваў у калгасе імя Варашылава. Зноў арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1932 г. рэабілітаваны 12.9.1989, па прысуду 1937 г.— 16.6.1989.

ХУЛУП Мікалай Яфімавіч, н. у 1904, працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны 31.12.1932. Раскулачаны. Пастановай тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Памёр у месцы зняволення 26.12.1938. Рэабілітаваны 31.5.1965.

ХУЛУП Мікіта Міхайлавіч, н. у 1877, працаваў у калгасе імя Варашылава. Раскулачаны. Арыштаваны 16.1.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ЦІМАШЭНКА Цімафей Іванавіч, н. у 1876. Жыў у в. Духанаўка, працаваў у калгасе «13-ы Кастрычнік». Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 31.10.1991.

ВЁСКА ГАНЧАРОЎКА (ГАНЧАРОЎ ПАДЗЕЛ)

БАЛЮНОЎ Міхаіл Кірылавіч, н. у 1889, працаваў у калгасе. Арыштаваны 31.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены датэрмінова з месца зняволення ў 1935. Рэабілітаваны 31.5.1965.

БАЛЮНОЎ Фадзей Патапавіч, н. у 1868 у в. Новы Крупец (Добрушскі р-н). Жыў у Ганчароўцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП

АГПУ па БССР ад 11.5.1932 асуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагер умоўна. З-пад арышту вызвалены. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ТКАЧ Акім Пракопавіч, н. у 1902, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 17.11.1989.

ТКАЧ (ТКАЧОЎ) Сазон Якаўлевіч, н. у 1883. Жыў у Рэчыцы, працаваў вартаўніком Рэчыцкай будканторы. Арыштаваны 17.7.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.5.1957.

ВЁСКА ГРУШАЎКА (не існуе)

РАМАНЮГА Рыгор Андрэевіч, н. у 1875. Раскулачаны ў 1930. Памёр у 1967 у Рэчыцы.

ВЁСКА ДЗЯТЛАЎКА

ГРУШАНАЎ Мітрафан Захаравіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ВЁСКА ДУХАНАЎКА

МІКУЛІНСКІ Аляксандр Касьянавіч, н. у 1899, працаваў у калгасе «13-ы Кастрычнік». Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.3.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 13.9.1965.

СЕМЯНЕНКА Макар Маркавіч, н. у 1900 у в. Рудня-Бурыцкая (Лоеўскі р-н). Жыў у Духанаўцы, працаваў у калгасе «13-ы Кастрычнік». Арыштаваны 12.6.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 23.9.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 15.9.1989.

ЧАЙКО (ЧАЙКА) Пімен Якаўлевіч, н. у 1901, працаваў у калгасе «13-ы Кастрычнік». Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.3.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Памёр у месцы зняволення 19.2.1938. Рэабілітаваны 13.9.1965.

ЧВАНЬКОЎ Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1894 у в. Заскор'е. Жыў у Духанаўцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 4.6.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага раёна ад 8.10.1935 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 5.11.1991.

ШАМЕЛАЎ Цімафей Сямёнавіч, н. у 1900 у в. Рудня Холмецкага с/с. Жыў у Духанаўцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 1.11.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ШКУРАТАЎ Навум Мітрафанавіч, н. у 1896 у в. Рудня-Бурыцкая (Лоеўскі р-н). Жыў у Духанаўцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 20.7.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на ад 8.10.1935 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 5.11.1991.

ВЁСКА ЗАСКОР'Е (не існуе)

ЗАЙЧАНКА Іван Сцяпанавіч, н. у 1910. Раскулачаны. Арыштаваны 4.8.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.8.1930 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 14.5.1990.

ЗАЙЧАНКА Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1874 у в. Шалухоўка Гомельскага павета. Жыў у Заскор'і, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 17.11.1989.

ЦІМАШЭНКА Рыгор Іванавіч, н. у 1903, працаваў у калгасе. Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.3.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 13.9.1965.

ЦІМАШЭНКА Фёдар Цімафеевіч, н. у 1915, працаваў качагарам на заводзе «Інтэрнацыянал» у Рэчыцы. Арыштаваны 29.4.1935. Па пастанове Судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 20.7.1935 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 23.8.1955.

ЦІМАШЭНКА Фядос Іванавіч, н. у 1900, працаваў у калгасе. Арыштаваны 26.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.1.1933 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 31.5.1965.

ЦІМАШЭНКА Цімафей Іванавіч, н. у 1885. Жыў у в. Духанаўка, працаваў у калгасе «13-ы Кастрычнік». Арыштаваны 18.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ВЁСКА КУЗЬМІНКА

БАБРАЎНІЧЫ Васіль Несцеравіч, н. у 1914, працаваў бухгалтарам торфазавода «Лукское» (Жлобінскі р-н). Арыштаваны 7.1.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 9.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.3.1938 у Магілёве. Рэабілітаваны 13.6.1989.

БАБРАЎНІЧЫ Карней Мікітавіч, н. у 1887. Жыў у в. Сямёнаўка, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.2.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 29.5.1962.

БАБРАЎНІЧЫ Несцер Яфімавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 зняволены на 3 гады. Рэабілітаваны 12.9.1960.

КАЗАННІКАЎ Сямён Рыгоравіч, н. у 1870, працаваў у калгасе. Арыштаваны 12.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 асуджаны на 3 гады канцлагера ўмоўна. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ВЁСКА ЛЕЦЯШЫН

КУПРЭЙЧЫК Малах Іванавіч, н. у 1859. Рэпрэсіраваны ў 1929. Высланы ў Сібір. Дамоў вярнуўся праз 6 гадоў, дзе і памёр.

СІВІЦКІ Васіль Малахавіч, н. у 1904, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны і высланы ў Сібір. Зноў арыштаваны 4.8.1930. Абвінавачваўся ў тым, што ўцёк з месца высылкі. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.8.1930 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пасля адбыцця пакарання працаваў у калгасе імя Варашылава. Арыштаваны ў трэці раз 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1930 г. рэабілітаваны 14.5.1990, па прысуду 1937 г.— 23.6.1989.

ВЁСКА СЯМЁНАЎКА

БАРАНАЎ Ігнат Яфімавіч, н. у 1870, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.2.1932 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 29.5.1962.

ЕЛІСЕЕЎ Мікалай Якаўлевіч, н. у 1889. Рэпрэсіраваны ў 1933.

КАВАЛЬЧУК Раман Андрэевіч, н. у 1898 у Пружанскім павеце. Жыў у Сямёнаўцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.2.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 29.5.1962.

САФРОНАЎ Ігнат Лазаравіч, н. у 1898, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.4.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 29.5.1962.

СІНІЛА Еўдакія Міхееўна, н. у 1913. Рэпрэсіравана.

СІНІЛА Міхей Піліпавіч. Рэспрэсіраваны ў 1931—1932.

ЧАРНЫШ Іван Сцяпанавіч, н. у 1897, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.12.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 29.5.1962.

ЧАЧЫЛА Яфім Іванавіч, н. у 1902, працаваў старшынёй Сямёнаўскага с/с. Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.2.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 29.5.1962.

ГЛЫБАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЕРАГАВАЯ СЛАБАДА

ГАЛАВІНСКІ Міхаіл Людвігавіч, н. у 1893, жыў у пас. Старына. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 1.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 19.4.1989.

КАЗЛОЎСКІ Флерка Валяр'янавіч, н. у 1875, жыў у Парыцкім р-не, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 10.4.1989.

КАРНЕЕНКА (КАРНІЕНКА) Павел Лаўрэнавіч, н. у 1901, працаваў прадаўцом у краме в. Хоўхла Уваравіцкага р-на. Арыштаваны 2.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.4.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 2.9.1960.

СІВАДЗЕДАЎ Апанас Яфімавіч, н. у 1885, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.6.1927. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 8.8.1927 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пакаранне адбываў на Салаўках. Вярнуўся дамоў. У другі раз арыштаваны 1.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.1.1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Вярнуўся дамоў. Уладкаваўся працаваць у прамысловую арцель. Арыштаваны ў трэці раз 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у турме г. Чэрвеня. Па прыгавору 1927 г. рэабілітаваны 17.11.1932, па прыгавору 1933 г.— 12.9.1989, па прыгавору 1937 г.—5.7.1989.

ВЁСКА ВАЛАДАРСК

БЕЛЯЙ Самуіл Аляксеевіч, н. у 1897, жыў у пас. Першае Мая, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 21.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у г. Улан-Удэ. Вызвалены з месца зняволення ў 1948. Рэабілітаваны 6.4.1959.

ГАЎРЫЛЕНКА Павел Іванавіч, н. у 1885, жыў у Рэчыцы, працаваў на заводзе імя Варашылава. Арыштаваны 30.4.1937. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 14.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Пакаранне адбываў на ст. Сухабязводная Горкаўскай вобл. Загінуў у месцы зняволення. Рэабілітаваны 15.11.1991.

ГРЫБ Андрэй Мартынавіч, н. у 1902. Жыў у пас. 1 Мая, працаваў кавалём на 11-ым участку ваенна-будаўнічых работ. Арыштаваны ў сакавіку 1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. 23.6.1933 першапачатковае рашэнне было зменена на пазбаўленне волі

тэрмінам на 3 гады (умоўна). Рэабілітаваны 27.1.1961.

ГРЫБ Васіль Мартынавіч, н. у 1896—1898(?). Жыў у в. Стасеўка, працаваў на лесараспрацоўках. Арыштаваны 24.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. 23.6.1933 першапачатковае рашэнне было зменена на пазбаўленне волі тэрмінам на 3 гады (умоўна). Арыштаваны ў другі раз 18.3.1944. Па пастанове ваеннага трыбунала 5-ай арміі зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Пакаранне адбываў у Сібіры. Вызвалены з месца зняволення 18.3.1954. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 24.7.1961, па прысуду 1944 г.— 2.8.1961.

ГРЫБ Максім Мартынавіч, н. у 1905, працаваў рабочым у прамысловай арцелі «8-ы з'езд Саветаў». Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Свярдлоўскай вобл. Рэабілітаваны 14.3.1960.

ГРЫБ Сяргей Мартынавіч, н. у 1900. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым у райбальніцы. Арыштаваны 19.9.1937.Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Карэліі. Вызвалены з месца зняволення 17.9.1947. Рэабілітаваны 11.6.1962.

КАНАВАЛЬЧЫК Герасім Рыгоравіч, н. у 1888, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у г. Улан-Удэ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КАСТРАМА Аляксандр Васільевіч, н. у 1883, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.11.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 26.12.1930 асуджаны да высылкі ў Заходне-Сібірскі край. Рэабілітаваны 27.9.1989.

КАСТРАМА Пётр Мінавіч, н. у 1867. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым у гарадской бальніцы. Арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у турме г. Чэрвеня Мінскай вобл. Памёр у месцы зняволення ў 1938. Рэабілітаваны 8.9.1989.

КАСТРАМА Яфім Васільевіч, н. у 1885, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 25.3.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 27.8.1931 зняволены на 1 год. Рэабілітаваны 11.12.1989.

КВЯТКОЎСКІ Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1902. Працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 25.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.4.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 31.7.1989.

КВЯТКОЎСКІ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1897, працаваў дзесятнікам у леспрамгасе. Арыштаваны 25.3.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 27.8.1931 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 11.12.1989.

ЛЁГКІ Ярох Кандратавіч, н. у 1903. Жыў у Рэчыцы, працаваў кавалём на ваенным будаўніцтве. Арыштаваны 21.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 11.5.1938 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.7.1961.

МЯШКО Мікалай Андрэевіч, н. у 1908. Арыштаваны 25.3.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 27.8.1931 зняволены на 1 год. Рэабілітаваны 11.12.1989.

ШУГАЙ Мікалай Сафронавіч, н. у 1885. Арыштаваны 25.3.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 27.8.1931 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Вызвалены з месца зняволення 20.7.1935. Рэабілітаваны 11.12.1989.

ВЁСКА ГАРНОЎКА

КРАСОЎСКІ Іосіф Васільевіч, н. у 1909, працаваў у Рэчыцкім леспрамгасе. Арыштаваны 19.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 19.2.1963.

КРАСОЎСКІ Канстанцін Рыгоравіч, н. у 1902, працаваў у калгасе імя Молатава. Арыштаваны 18.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 29.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 28.8.1958.

КРАСОЎСКІ Рыгор Казіміравіч, н. у 1880, працаваў у калгасе імя Молатава. Арыштаваны 19.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1960.

КРАСОЎСКІ Уладзімір Васільевіч, н. у 1912, працаваў у Рэчыцкім леспрамгасе. Арыштаваны 19.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 29.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 19.2.1963.

МАНКЕВІЧ Іосіф Іванавіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР асуджаны на 6 месяцаў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 6.1.1993.

ХАЛЕЦКАЯ Ганна Іванаўна, н. у 1891, працавала на ўласнай гаспадарцы. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1941 асуджана да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітавана 6.1.1993.

ВЁСКА ГЛЫБАЎ

ЛЯМЕШКА Ціхан Аляксандравіч, н. у 1871 у Кіеве, жыў у Глыбаве, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 21.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Вызвалены з месца высылкі ў 1933. Рэабілітаваны 6.1.1993.

ПЕСТРАЖЫЦКАЯ Сцяфанія Аляксандраўна, н. у 1884 на х. Любовічы Рагачоўскага павета, жыла ў Глыбаве, працавала на ўласнай гаспадар-

цы. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 асуджана да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Пакаранне адбывала ў Нарымскім краі. Загінула там 19.6.1931. Рэабілітавана 6.1.1993.

ПЕСТРАЖЫЦКІ Казімір Іванавіч, н. у 1869, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 6.1.1993.

САДОЎНІКАЎ Андрэй Яфімавіч, н. у 1912, жыў у Гомелі. Арыштаваны 8.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 1.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.4.1989.

СУШЫНСКІ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1901 на х. Кабышоўка Уваравіцкага р-на, жыў у Глыбаве, працаваў у калгасе «Сацыялізм». Арыштаваны 17.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 25.7.1989.

ТРАЦЭЎСКІ Валянцін Канстанцінавіч, н. у 1911, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 12.7.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны.

ТРАЦЭЎСКІ Канстанцін Канстанцінавіч, н. у 1870, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Пакаранне адбываў у Томскай вобл. Рэабілітаваны 6.1.1993.

ХАЛЕЦКІ Антон Уладзіміравіч, н. у 1880, жыў у Рэчыцы, працаваў сталяром на заводзе імя Кірава. Арыштаваны 5.10.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.11.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 22.6.1989.

ХАЛЕЦКІ Отта Уладзіміравіч, н. у 1861, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 21.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 6.1.1993.

ХАЛЕЦКІ Станіслаў Уладзіміравіч, н. у 1884. Як пазначана ў судовай справе «...поляк, с дворян, инвалид, без определенных занятий». Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 9.9.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 26.3.1931 асуджаны да высылкі спецканвоем на Урал (тэрмін высылкі не ўказаны). У другі раз арыштаваны 5.10.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.11.1937 у Гомелі. Па прыгавору 1931 г. рэабілітаваны 19.10.1989, па прыгавору 1937 г.— 22.6.1989.

ВЁСКА ГОРВАЛЬ

БАБІЧ Нічыпар Ільіч, н. у 1877, жыў у г. Жлобіне, працаваў машыністам на чыгунцы. Арыштаваны 10.12.1928. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 19.7.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 22.4.1922.

ГАРЭЛІК Зяма Герцавіч, н. у 1886, працаваў шаўцом у мясцовай арцелі «Прагрэс». Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.11.1938. Рэабілітаваны 18.3.1958.

ЗАЛЕССКІ Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1889 на Жлобіншчыне, жыў у Горвалі, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.12.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 4.7.1931 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 16.10.1989.

КАНОДА Пётр Захаравіч, н. у 1878, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.1.1933 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Высылаўся разам з сям'ёй. Рэабілітаваны 12.9.1989.

КАСТРАМА Зінавей Адамавіч, н. у 1885, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.1.1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Вярнуўся, адбыўшы пакаранне, дамоў. Зноў арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 12.9.1989, па прысуду 1938 г.— 28.10.1989.

КУКАРА Андрэй Дзмітрыевіч, н. у 1874, працаваў у калгасе. Арыштаваны 1.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.1.1933 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 12.9.1989.

КУХАРЭНКА Яўген Якаўлевіч, н. у 1916 у в. Рудня Уваравіцкай вол. (Буда-Кашалёўскі р-н). Працаваў настаўнікам Горвальскай няпоўнай СШ. Арыштаваны ў 1937. Па пастанове Наркома Унутраных Спраў СССР і Пракурора СССР за № 1083 ад 12.4.1938 асуджаны да ВМП. Расстраляны 5.6.1933 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.6.1989.

ЛАПЫКА Іосіф Сцяпанавіч, н. у 1891 у г. Пінску, жыў у Горвалі, працаваў дырэктарам няпоўнай СШ. Арыштаваны 20.8.1937. Па пастанове Наркома Унутраных Спраў СССР і Пракурора СССР за № 1083 ад 12.4.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 7.8.1957.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Рыгор Фёдаравіч, н. у 1889, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.1.1938. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.1.1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

НАВІЦКІ Леанід Мікалаевіч, н. у 1897 на Піншчыне. Жыў у Горвалі, працаваў рабочым на лесасплаве. Арыштаваны 19.7.1929. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 3.11.1929 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1934. Зноў арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС

БССР ад 24.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.11.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 20.3.1967.

НАВІЧКОЎ Максім Трыфанавіч, н. у 1887 у н. п. Ведзінякіна Сярэдне-Волжскага краю. Жыў у Горвалі, працаваў трактарыстам Белдарбуда. Арыштаваны 11.5.1937. Па пастанове Спецыяльнай судовай Калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 29.7.1937 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 15.11.1991.

ПЕТРАВЕЦ Васіль Кірылавіч, н. у 1881, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.1.1938. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.1.1938 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 12.9.1989.

РАГОЎСКІ Васіль Васільевіч, н. у 1886, працаваў у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.10.1937 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.10.1989.

РАГОЎСКІ Мітрафан Васільевіч, н. у 1880, працаваў у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.10.1937 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.10.1989.

РЫМША Сямён Баніфацьевіч, н. у ліпені 1886, працаваў рахункаводам мясцовага спажывецкага таварыства. Арыштаваны 28.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 29.5.1958.

ТЭЛЬМАН Дора Рувімаўна, н. у 1911 у Польшчы. Жыла ў Горвалі, працавала ўрачом мясцовага дзіцячага санаторыя. Арыштавана 13.11.1937. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 19.10.1938 пазбаўлена права пражывання ў 15 пунктах краіны тэрмінам на 5 гадоў, выслана ў Саратаўскую вобл. Рэабілітавана 16.1.1989.

УШАКОЎ Мяфодзій Данілавіч, н. у 1896. Жыў у пас. Сеназавод (Баршчоўскі с/с), працаваў загадчыкам сенасклада. Арыштаваны 23.3.1938. Па пастанове Камісіі НКУС і Пракурора СССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 17.9.1938. Рэабілітаваны 27.10.1989.

ХАЙТОВІЧ Барыс Мееравіч, н. у 1889, працаваў старшынёй калгаса «Чырвоны Кастрычнік». Арыштаваны 5.11.1935. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 13.4.1936 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 10.1.1992.

ЧАКІЛЕЎ (ЧЭКІЛЕЎ) Макар Сцяпанавіч, н. у 1910 на Жлобіншчыне. Жыў у Горвалі, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.12.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 4.7.1931 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны пастановай пракурора Гомельскай вобл. ад 11.10.1991.

ЧЫРЫК Таццяна Яфімаўна, н. у 1884, працавала на ўласнай гаспадарцы. Арыштавана 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволена на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітавана 26.6.1989.

ШКУРЫН Васіль Яўстаф'евіч, н. у 1877, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 2.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.1.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Высылаўся разам з сям'ёй. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ШКУРЫН Ілья Іванавіч, н. у 1890, жыў у Рэчыцы, працаваў на фанерным заводзе. Арыштаваны 24.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.5.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. У другі раз арыштаваны 14.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны па прысуду 1933 г. 22.12.1958, па прысуду 1937 г. – у 1958 годзе.

ШЫЛЯНОК Васіль Іванавіч, н. у 1904. Жыў у Мазыры, працаваў сакратаром Мазырскага акрвыканкама. Удзельнік грамадзянскай вайны (палітрук кавалерыйскага эскадрона). Член ВКП(б). Арыштаваны 3.8.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 11.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.12.1937 у Мазыры. Рэабілітаваны ў 1957.

ШЫЛЯНОК Пётр Емяльянавіч, н. у 1894. Удзельнік грамадзянскай вайны. Працаваў манцёрам Днепрадзвінскага параходства. Арыштаваны ў 1938. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 12.4.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 17.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 8.4.1958.

ВЁСКА МАСКАЛІ

ДВОРНІК Іосіф Пятровіч. Рэпрэсіраваны.

ДВОРНІК (ДВОРНІКАЎ) Мікалай Аляксандравіч, н. у 1901. Рэпрэсіраваны ў 1931.

ВЁСКА МІЛАГРАД

ФІЛОНЧЫК Канстанцін Міхайлавіч, н. у 1888. Арыштаваны 12.7.1920. Па пастанове асобага аддзела Паўднёвай Мазырскай групы войскаў Заходняга фронту ад 26.7.1920 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 6.8.1992.

ФІЛОНЧЫК Рыгор Міхайлавіч, н. у 1903 у в. Талы (Буда-Кашалёўскі р-н), жыў у Мілаградзе, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.1.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Астраханскай вобл. ад 30.6.1989.

ВЁСКА СВІДЭРА

БАРАНОЎСКІ Канстанцін Іосіфавіч, н. у 1876. Працаваў у калгасе в. Калінаўка Жлобінскага р-на. Арыштаваны 15.11.1937. Па пастанове

П. Е. Шылянок (сядзіць)

асобай тройкі НКУС БССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 19.6.1958.

ГАЛАВІНСКІ Іван Людвігавіч, н. у 1885 у Мінску. Жыў у в. Свідэра, працаваў у калгасе «Чырвоная Зорка». Арыштаваны 19.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10. 1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10. 1938. Рэабілітаваны 25.7.1989.

ВЁСКА СТАРЫНА

КАНОДА Даніла Маркавіч. Рэпрэсіраваны.

ВЁСКА СТАСЕЎКА

ЦЫБУК Прохар Іванавіч, н. у 1873, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.2.1928. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 15.6.1928 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.11.1992.

ДЗЕМЯХОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БУДКА-ШЫБЕНКА

КВЯТКОЎСКІ Фёдар Якаўлевіч, н. у 1896, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.9.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на ад 10.11.1935 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. 27.4.1936 тэрмін пакарання зніжаны да 1 года папраўча-працоўных работ. 23.5.1936 судовая справа ў дачыненні Квяткоўскага Ф. Я. закрыта. Рэабілітаваны 31.1.1992.

ШЧАПАНСКІ Адам Антонавіч, н. у 1892 у Варшаве, жыў у Будцы-Шыбенцы, працаваў загадчыкам склада ў калгасе. Арыштаваны 6.12.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.3.1962.

ВЁСКА ДЗЕМЯХІ

ВЕРАБЕЙ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1886 у Польшчы, жыў у Дземяхах, працаваў дырэктарам мясцовай сярэдняй школы. Арыштаваны 11.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ДЗЕНІСЮК Ульян Якаўлевіч, н. у 1891 у Гродзенскай губерні, жыў у Дземяхах, працаваў сталяром у в. Ліскі. Арыштаваны 10.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 6.11.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 25.7.1989.

ДРАЗДОЎ Іван Макаравіч, н. у 1896, працаваў сезонным рабочым. Арыштаваны 4.11.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.4.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 2.9.1960.

МАРКАЛЬ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 26.10.1989.

МІЛАНОВІЧ Васіль Андрэевіч, н. у 1877 у в. Нядрэск Заслаўскай воласці Мінскай губерні, жыў у Дземяхах. Святар. Арыштаваны ў 1932. Быў вызвалены ў 1933. Арыштаваны ў другі раз 14.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 19.10.1939.

МІЛАНОВІЧ Ганна Васільеўна, н. у 1872 у в. Міхалькі Нараўлянскай воласці, жыла ў Дземяхах. Хатняя гаспадыня. Арыштавана 5.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволена на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбывала ў Казахстане. Загінула ў месцы зняволення 27.12.1941. Рэабілітавана 13.9.1965.

ПАНІМАТКА Рыгор Тарасавіч, н. у 1895, працаваў машыністам мясцовага спіртзавода. Арыштаваны 1.3.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 23.4.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.7.1938. Рэабілітаваны 12.9.1957.

ПІНЧУК Максім Рыгоравіч, н. у 1864, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны ў 1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад

30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.9.1965.

СУПЕЕЎ (СУПЕЙ) Мікалай Іванавіч, н. у 1889, працаваў у калгасе «Чырвоная кветка». Арыштаваны 6.12.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.4.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 10.12.1955.

ХВАТ Андрэй Мікалаевіч, н. у 1882 у в. Курыловічы Гродзенскай губерні, жыў у Дземяхах, працаваў дзяжурным па чыгуначнай станцыі. Арыштаваны 21.7.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 18.9.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 17.11.1989.

ВЁСКА ДЗЯРАЖНЯ

БАТУРА Піліп Сцяпанавіч, н. у 1877, жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.9.1989.

ЛЯМЕШКА Ганна Васільеўна, н. у 1907, жыла ў Рэчыцы, працавала рабочай арцелі «Харчавік». Арыштавана 10.11.1940. Па пастанове Гомельскага абласнога суда ад 7.4.1941 зняволена на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 3 гады. Вызвалена з месца зняволення 10.2.1948. Рэабілітавана 2.11.1962.

СЫС Ігнат Ульянавіч, н. у 1873, працаваў у калгасе «Новае жыцце». Арыштаваны 29.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ЯКУШ Пётр Іванавіч, н. у 1889, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.5.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 2.11.1989.

ПАСЁЛАК ЧЫРВОНЫ МОСТ

ГЕРЫЛОВІЧ Іван Емяльянавіч, н. у 1874, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.12.1929. Па пастанове Калегіі АГПУ БССР ад 13.1.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 9.10.1989.

КАМСАМОЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК АКОЛІЦА

ТРАЦЭЎСКІ Браніслаў Вікенцьевіч, н. у 1879. Працаваў у калгасе. Арыштаваны 10.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

ВЁСКА БАЛАШАЎКА

АСЕЦКІ Адам Іванавіч, н. у 1909. Працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 18.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 10.9.1960.

АСЕЦКІ Баніфат Іванавіч, н. у 1902. Жыў у пас. Баранаўка, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.4.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Сям'я Асецкага Б. І. была выслана ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 31.7.1989.

АСЕЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1914. Чырвонаармеец 117-га будаўнічага батальёна. Арыштаваны 28.9.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 10.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.10.1937. Рэабілітаваны 4.6.1957.

АСЕЦКІ Іосіф Іванавіч, н. у 1902. Працаваў на розных работах. Арыштаваны 24.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Амурскай вобл. Памёр у месцы зняволення 1.4.1943. Рэабілітаваны 28.10.1959.

АСЕЦКІ Пётр Сямёнавіч, н. у 1889. Жыў у пас. Акаліца, працаваў рабочым у Горвальскім лясніцтве. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

АСЕЦКІ Франц Іванавіч, н. у 1901. Жыў у пас. Майдан, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.2.1934 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. 23.2.1939 асуджаны на 7 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Памёр у месцы зняволення 13.1.1946. Рэабілітаваны 13.11.1974.

БАРАНОЎСКІ Антон Браніслававіч, н. у 1887, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.8.1938. Па пастанове тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 10.9.1960.

ВАЛОВІЧ Юлій Францавіч, н. у 1904. Жыў у пас. Гарадок, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 10.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 14.6.1961.

ДАМАРАЦКІ Мікалай Вікенцьевіч, н. у 1885 у в. Бычкі (Магілёўская вобл.). Жыў у Балашаўцы, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25. 9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

ІВАНОЎСКІ Казімір Францавіч, н. у 1904, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

КОРБУТ Рыгор Яфрэмавіч, н. у 1902 у в. Майсееўка (Мазырскі р-н). Жыў у Балашаўцы, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны пастановай ваеннага трыбунала ЧБВА ад 27.8.1959.

КРУКОЎСКІ Мікалай Паўлавіч, н. у 1895. Жыў у в. Дуброва. Арыштаваны 18.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 10.9.1960.

КУНІЦКІ Аўтусцін Герасімавіч, н. у 1888, згодна іншых даных – 25.8.1894. Жыў у Рэчыцы, працаваў млынаром. Арыштаваны 27.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 зняволены на 6 месяцаў. Вярнуўшыся пасля адбыцця пакарання дамоў, працаваў цесляром у гаркамунаддзеле. Зноў арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 23.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 14.6.1958.

КУНІЦКІ Міхаіл Карлавіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 24.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў ў Карэліі. Вызвалены з месца зняволення ў 1943. Рэабілітаваны 28.10.1959.

КУНІЦКІ Фабіян Іосіфавіч, н. у 1905. Жыў у пас. Майдан, працаваў рабочым Ведрыцкага ўчастка Белрэза. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

КУНІЦКІ Франц Герасімавіч, н. у 1902, працаваў рабочым на цагельным заводзе. Арыштаваны 10.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 22.9.1958.

МАЕЎСКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1910, працаваў дзесятнікам Белрэза. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

МАЕЎСКІ Іван Карлавіч, н. у 1888. Працаваў цесляром арцелі ў Шацілках (Светлагорск). Арыштаваны 24.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Хабараўскім краі. Памёр у месцы зняволення 15.8.1945. Рэабілітаваны 28.10.1959.

МАЕЎСКІ Іван Людвігавіч, н. у 1893. Жыў у Рэчыцы, працаваў на розных работах па найму. Арыштаваны 17.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.4.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Працаваў шаўцом ботаў у арцелі інвалідаў. Зноў арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 7.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 29.9.1989, па прысуду 1937 г. – 11.9.1958.

МАЕЎСКІ Іосіф Карлавіч, н. у 1909, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 18.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 10.9.1960.

МАЕЎСКІ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1898, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

МАЕЎСКІ Нікадзім Феафілавіч, н. у 1902, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

МАЕЎСКІ Пётр Карлавіч, н. у 1891, праца-

ваў будаўніком. Арыштаваны 24.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.10.1959.

МАЕЎСКІ Рыгор Іванавіч, н. у 1901, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 7.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

ПАЧКОЎСКІ Адам Іпалітавіч, н. у 1902. Жыў у пас. Дуброўка, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 24.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Працаваў у калгасе імя Чапаева. Зноў арыштаваны 24.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Па прысуду 1929 г. рэабілітаваны 8.4.1993, па прысуду 1937 г.— 28.10.1959.

ПАЧКОЎСКІ Адам Сямёнавіч, н. у студзені 1907. Жыў у пас. Майдан, працаваў будаўніком у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 10.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.9.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 10.12.1959.

ПАЧКОЎСКІ Антон Сямёнавіч, н. у 1897, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

ПАЧКОЎСКІ Іосіф Сямёнавіч, н. у 1889 у в. Верхалессе (Вярхлессе) (Светлагорскі р-н). Жыў у Балашаўцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.7.1938. Закатаваны ў турме 15.9.1938, не дачакаўшыся рашэння асобай тройкі НКУС БССР. Рэабілітаваны 27.8.1959.

ПАЧКОЎСКІ Казімір Кліменцьевіч, н. у 1906. Жыў у Рэчыцы, працаваў начальнікам змены на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 26.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны пастановай ваеннага трыбунала ЧБВА ад 20.11.1989.

ПАЧКОЎСКІ Рыгор Іпалітавіч, н. у 1904. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 26.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 28.10.1989.

ПАЧКОЎСКІ Франц Іпалітавіч, н. у 1908, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.12.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

САВІЦКІ Іван Францавіч, н. у 1904, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

СЫРАВЕЖКІН Цімафей Фёдаравіч, н. у 1907 у в. Альхоўка (Буда-Кашалёўскі р-н). Жыў у Балашаўцы, працаваў настаўнікам. Арыштаваны 21.11.1936. Па пастанове Судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 7.2.1937 зняволены на 7 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Зноў быў арыштаваны і высланы за межы рэспублікі ў 1950. Рэабілітаваны 21.6.1967.

ТРАЦЭЎСКІ Антон Іванавіч, н. у 1893, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 17.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 10.9.1960.

ТРАЦЭЎСКІ Эдуард Людвігавіч.

ШЧЫГЕЛЬСКІ (ШЧАГОЛЬСКІ) Мікалай Якаўлевіч, н. у 1899. Раскулачаны. Працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 26.6.1989.

ЯНОВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1876 на х. Магільцы (Магілёўская вобл.). Жыў у Балашаўцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.8.1959.

ПАСЁЛАК ДАБУЖА

КАРАТКЕВІЧ Януар Іванавіч, н. у 1881 на х. Дзедна (Дзеднае). Жыў у Дабужы, працаваў у калгасе. Як пазначана ў судовай справе, з дваран. Арыштаваны 5.9.1930. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 25.11.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Вызвалены з месца зняволення 23.10.1932. Рэабілітаваны 27.9.1989.

СЫЩЬКО Фёдар Сямёнавіч, н. у 1876, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 25.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.2.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Карэліі. Рэабілітаваны 13.11.1974.

ВЁСКА КАМСАМОЛЬСК (ДЗЮРДЗЕЎ)

БАРАНОЎСКІ Ігнат Уладзіміравіч, н. у 1903. Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром у будаўнічай канторы. Арыштаваны 6.4.1938. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 25.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.7.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 11.10.1957.

БАРАНОЎСКІ Мікалай Якаўлевіч, н. у 1868. Жыў у в. Ліпнікі (Светлагорскі р-н), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.8.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.11.1959.

БАРАНОЎСКІ Фелікс Якаўлевіч, н. у 1876. Жыў у в. Глыбаў (Падалескі с/с), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 20.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ

СССР ад 20.6.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Вызвалены ў 1932. Рэабілітаваны 8.4.1993.

БОЦЬКА (БОДЗЬКА) Васіль Карпавіч, н. у 1874, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 17.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 26.1.1990.

ГУЛЯЙ Яфім Дзмітрыевіч, н. у 1906, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 асуджаны на 1 год пазбаўлення волі ўмоўна. Рэабілітаваны 26.1.1989.

ДАРАШКЕВІЧ Антон Францавіч, н. у 1904, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 17.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 10.9.1960.

ДАРАШКЕВІЧ Уладзімір Людвігавіч, н. у 1890, працаваў у калгасе імя Чапаева. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 27.9.1959.

ЗАКРУЖНЫ Андрэй Іванавіч, н. у 1881, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 тэрмін зняволення залічаны ў пакаранне. Закружны А. І. быў вызвалены з-пад варты. Рэабілітаваны 26.1.1969.

КАЗЛОЎСКІ Аляксандр Станіслававіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 зняволены на 6 месяцаў. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Пайшоў працаваць у калгас. Зноў арыштаваны 25.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 30.12.1960.

КОЗЫР Андрэй Карпавіч, н. у 1889, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.9.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на ад 10.2.1936 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. 27.4.1936 тэрмін зняволення павялічаны да 5 гадоў. 23.5.1936 тэрмін зняволення зніжаны да 2 гадоў. Рэабілітаваны 31.1.1992.

КОЗЫР Арцём Якімавіч, н. у 1865, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 тэрмін папярэдняга зняволення залічаны ў пакаранне. Козыр А. Я. быў вызвалены з-пад варты. Рэабілітаваны 26.1.1990.

КОЗЫР Малах Іванавіч, н. у 1871, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.12.1927. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 15.6.1928 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.11.1992.

ПАЛУБАН Антон Іванавіч, н. у 1869, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 16.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 тэрмін папярэдняга зняволення залічаны ў пакаранне. Палубан А. І. быў вызвалены з-пад варты. Рэабілітаваны 26.1.1989.

ПАЛУБАН Гаўрыла Данілавіч, н. у 1883, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 5.6.1989.

ПАЛУБАН Рыгор Цярэнцьевіч, н. у 1895, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 асуджаны на 6 месяцаў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 26.1.1989.

СІЛІН Рыгор Максімавіч, н. у 1894, працаваў у калгасе «Шлях да сацыялізму». Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 16.1.1933 асуджаны да высылкі этапам у Сібір тэрмінам на 3 гады. Арыштаваны ў другі раз 23.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.9.1937. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 3.8.1989, па прысуду 1937 г.— 16.1.1989.

ФІЛЕЙ Міна Васільевіч, н. у 1895, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 асуджаны на 6 месяцаў пазбаўлення волі. Адбыў пакаранне, вярнуўся дамоў. Жыў у пас. Вялікі Лес. Арыштаваны ў другі раз 8.9.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. З 11.10.1937 ім пачынаюць «цікавіцца» органы НКУС. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 Філей М. В. прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.11.1937. Па прысуду 1931 года рэабілітаваны 26.1.1990, па прысуду 1936 г.—31.1.1992, па прысуду 1937 г.— 16.1.1989.

ЧАРНЕЙКА Васіль Данілавіч, н. у 1896, жыў на х. Пагарэлец. Арыштаваны 9.9.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на ад 10.2.1936 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 31.1.1992.

ЧАРНЕЙКА Фёдар Данілавіч, н. у 1882. Жыў на х. Пагарэлец, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.9.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на ад 10.2.1936 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. 16.3.1936 тэрмін пакарання зніжаны на 2,5 года. Рэабілітаваны 31.1.1992.

ЧЫРЫК Васіль Іванавіч, н. у 1873, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 5.6.1989.

ЧЫРЫК Мікалай Іовавіч, н. у 1898. Працаваў цесляром. Арыштаваны 9.9.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на ад 10.2.1936 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 31.1.1992.

ЯЛЕНІЧ Аляксандр Арцёмавіч. Раскулачаны ў 1930—1931.

ЯЛЕНІЧ Макар Аляксандравіч. Раскулачаны ў 1930—1931.

ЯСКОВІЧ Мацвей Васільевіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 16.1.1933 асуджаны да высылкі этапам у Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 9.8.1989.

ЯСКОВІЧ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1868, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 24.2.1928. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 15.6.1928 асуджаны да высылкі этапам у Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.11.1992.

ВЁСКА КРАПІЎНЯ

ЮНАС Фрыдрых Карлавіч, н. у 1890 (Любанскі р-н Мінскай вобл.). Немец. Жыў у Крапіўні. Працаваў лесатэхнікам Горвальскага лесапункта. Арыштаваны 5.11.1935. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 9.3.1936 зняволены на 4 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Хабараўскім краі. Па прысуду 1936 г. рэабілітаваны 8.8.1990.

КАРАЛЕНКА Іван Апанасавіч, н. у 1876, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 асуджаны да высылкі этапам у Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 13.11.1989.

ПІСЮК Рыгор (Юрый) Якімавіч, н. у 1881, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.1.1933 асуджаны да высылкі этапам у Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 3.8.1989.

РЫЛІК (РЫЛІКАЎ) Дзмітрый Парфёнавіч, н. у 1884, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 26.1.1990.

ЧАРНЕЙКА Цімафей Піліпавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 асуджаны на 1 год пазбаўлення волі. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Арыштаваны ў другі раз 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.1.1933 асуджаны да высылкі этапам у Казахстан тэрмінам на 3 гады. Зноў пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Уладкаваўся працаваць сплаўшчыкам лесу ў Рэчыцкі лясгас. Арыштаваны ў трэці раз 24.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў на Далёкім Усходзе. Па прысуду 1931 г. рэабілітаваны 26.1.1989, па прысуду 1933 г.— 3.8.1989, па прысуду 1938 г.— 26.6.1989.

ВЁСКА ПЕРШАМАЙСК (СВЯТОЕ)

АХРАМЧУК Аляксандр Раманавіч, н. у 1894. Жыў у Рэчыцы, працаваў на ваенным будаўніцтве. Арыштаваны 22.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. 23.6.1933 пакаранне было зменена на пазбаўленне права пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. Ахрамчук А. Р. быў вызвалены з-пад варты. Рэабілітаваны 24.7.1961.

АХРАМЧУК Сцяпан Мацвеевіч, н. у 1883. Жыў у Жлобінскім р-не, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.2.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.2.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938 у Магілёве. Рэабілітаваны 12.9.1960.

ВЕРАБЕЙ Васіль Ільіч, н. у 1874, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 16.1.1933 асуджаны да высылкі этапам у Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 9.8.1989.

ВЕРАБЕЙ Даніла Сцяпанавіч, н. у 1890. Раскулачаны ў 1932.

ВЕРАБЕЙ (ВАРАБ'ЁЎ) Мартын Іванавіч, н. у 1887. Раскулачаны ў 1930.

ВЕРАБЕЙ Мікалай Трафімавіч, н. у 1875, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.5.1989.

ВЕРАБЕЙ Мікіта Трафімавіч, н. у 1875, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 9.9.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на ад 11.2.1936 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 31.1.1992.

КАШАВАР (КАШАВАРАЎ) Пракоп Фядосавіч, н. у 1875, працаваў на уласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 16.1.1933 асуджаны да высылкі этапам у Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 9.8.1989.

МАХОНЬКА Ганна Іванаўна, н. у 1895, працавала на ўласнай гаспадарцы. Арыштавана 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволена на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбывала ў г. Рыбінску Яраслаўскай вобл. Рэабілітавана 19.7.1989.

МАХОНЬКА Мікіта Аляксандравіч, н. у 1877. Жыў у в. Нова-Святое (Дубраўскі с/с), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр 2.3.1938 у турэмнай бальніцы г. Гомеля. Рэабілітаваны 9.6.1989.

ЧАРНЕЙКА Георгій Васільевіч, н. у 1884. Жыў у Рэчыцы, працаваў вартаўніком у пажарна-вартаўнічай ахове Саюзтранса. Арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 5.7.1989.

ЧАРНЕЙКА Мікіта Васільевіч, н. у 1880, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.9.1935. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на ад 11.2.1936 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 31.1.1992.

ВЁСКА СВЕДСКАЕ

БАТУРА Андрэй Васільевіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны ў 1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 27.8.1931 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 15.9.1989.

ГАЎРЫЛЕНКА Антон Іосіфавіч, н. у 1876, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.4.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ГАЎРЫЛЕНКА Сямён Іосіфавіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Працягваў працаваць на ўласнай гаспадарцы. Зноў арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 20.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 24.11. 1989, па прысуду 1937 г. — 4.7.1989.

ІГНАЦЕНКА Сяргей Дзмітрыевіч, н. у 1882, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 29.11.1989.

КАРАКА Барыс Юр'евіч, н. у 1880, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 5.7.1989.

КАРАКА Гаўрыла Пятровіч, н. у 1887, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.11.1989.

КІРКЕВІЧ Яўген Іванавіч, н. у 1888. Жыў у в. Чыркавічы Светлагорскага р-на. Служыў святаром мясцовай царквы. Арыштаваны 13.9.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 28.9.1931 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 9.6.1989.

МАХОНЬКА Савелій Сідаравіч, н. у 1879, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Працягваў працаваць на ўласнай гаспадарцы. Зноў арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 24.11.1989, па прысуду 1937 г. — 26.6.1989.

ПАРЧАНКА Мікіта Мікітавіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.11.1989.

Я. Д. Яўсеенка

ПІНЧУК Давыд Фёдаравіч, н. у 1897, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Рэабілітаваны 26.6.1989.

ПІНЧУК Платон Канстанцінавіч, н. у 1907. Ваеннаслужачы 28 сп г. Волагды. Член ВКП(б). Арыштаваны 11.1.1938. Па пастанове Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 9.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938 у Волагдзе. Рэабілітаваны 22.2.1958.

ПЯТУШЭНКА Пётр Фёдаравіч, н. у 1908, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. У судовай справе занатавана, што Пятушэнка П. Ф. з месца зняволення ўцёк. Рэабілітаваны 26.6.1989.

ХВАЙНІЦКІ Якаў Паўлавіч, н. у 1897, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ЧЫРЫК Адам Іванавіч, н. у 1874, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.6.1989.

ШЫЛЯНОК Адам Усавіч. Раскулачаны.

ЯЎСЕЕНКА Яфім Данілавіч, н. у 1899, працаваў конюхам у калгасе. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у лагеры г. Уладзівастока. Вызвалены з месца зняволення ў 1947. Рэабілітаваны 28.1.1956.

ВЁСКА УЗНАЖ

ГОШКА Арцём Антонавіч. Раскулачаны.

ГОШКА Ігнат Антонавіч, н. у 1876, працаваў кавалём на смалакурным заводзе. Арыштаваны 6.6.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Рас-

страляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 26.6.1990.

ГОШКА Кузьма Якаўлевіч, н. у 1886. Раскулачаны ў 1930.

ПЕТРАВЕЦ Андрэй Фёдаравіч. Раскулачаны.

ПЕТРАВЕЦ Мірон Андрэевіч. Раскулачаны.

ВЁСКА ШОЛКАВІЧЫ (ШОЎКАВІЧЫ)

СЫДЬКО Аляксандр Мяфодзьевіч, н. у 1868. Жыў у в. Дзеднае (былы Парыцкі р-н), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.7.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 7.8.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.8.1937. Рэабілітаваны 20.11.1961.

СЫДЬКО Мітрафан Сямёнавіч, н. у 1877. Жыў у в. Старына (Жлобінскі р-н), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.2.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.2.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938 у Магілёве. Рэабілітаваны 15.9.1989.

ТРАЦЭЎСКІ Іосіф Паўлавіч, н. у 1877 у в. Расава (Светлагорскі р-н). Жыў у Шолкавічах, працаваў у калгасе. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 2.11.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 25.2.1963.

КАПАРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БУДКА

ГОРБАЧ Ісідар (Сідар) Максімавіч, н. у 1896, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 17.9.1935. Па пастанове Рэчыцкага раённага народнага суда ад 7.2.1936, а потым і Вярхоўнага суда БССР ад 29.2.1936 асуджаны на 2 гады пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 22.11.1991.

ГРЫГАРЭНКА Фёдар Ігнатавіч, н. у 1871, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 29.6.1932 з-пад варты вызвалены, але пазбаўлены права пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1990.

ГРЫГАРЭНКА Фёдар Ігнатавіч, н. у 1880, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.12. 1989.

САПОНЧЫК Марк Васільевіч, н. у 1891—1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 10.11.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.11.1930 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Вызвалены з месца зняволення датэрмінова. Пасля таго як вярнуўся дамоў, пайшоў працаваць у калгас. Зноў арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 1.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.1.1989.

СТРЭЛЬЧАНКА Мікалай Навумавіч, н. у 1881, працаваў у калгасе «Дабраволец». Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 30.6. 1989.

ВЁСКА КАПАРАЎКА

БОНДАР Мікіта Сільвестравіч, н. у 1885, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны ў 1930. Арыштавалі ў 1931. Быў асуджаны на 8 гадоў. Памёр у турме г. Гомеля ў 1933.

ПРЫХОДЗЬКА Фама Майсеевіч, н. у 1878. Жыў у в. Будка, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 17.9.1935. Па пастанове Рэчыцкага раённага народнага суда ад 7.2.1936, а потым Вярхоўнага суда БССР ад 29.2.1936 зняволены на 5 гадоў. Рэабілітаваны 22.11.1991.

САПОНЧЫК Еўдакім Захаравіч, н. у 1897. Раскулачаны.

СЯДЗЬКО Іван Майсеевіч, н. у 1877. Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром у дзіцячым доме. Арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 9.6.1989.

СЯДЗЬКО Парфен Міронавіч, н. у 1883, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Прыціснуты вялізнымі падаткамі, быў змушаны прадаць хату і перабрацца ў Рэчыцу. Неўзабаве купіў сабе тут жытло. Але гарадскія ўлады праявілі «пільнасць». Хата, набытая за ўласныя сродкі селяніна, была перададзена ў ЖЭК. Сям'я Парфена Міронавіча некалькі месяцаў тулілася ў падвале свайго, а цяпер ужо дзяржаўнага, дома. Нехта падвучыў Парфена Міронавіча ехаць у Маскву ды шукаць там праўду. Ён так і зрабіў. Месяц чакаў прыёму ў М. І. Калініна. Урэшце прычакаўся. Напрыканцы пачуў ад Усесаюзнага старасты такія словы: «Езжайте, товарищ, домой. Всё уладится». Сапраўды, праз тыдзень рэчыцкія ўлады вярнулі сям'і Сядзько забраны незаконна дом.

ЧАРНАЛЕЎСКІ Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1874, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.12.1929. Раскулачаны. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 13.1.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 19.10.1989.

ЧАРНАЛЕЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч. Раскулачаны.

ЧАРНАЛЕЎСКІ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1909, працаваў у калгасе «Новае жыццё». Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны пастановай пракурора Гомельскай вобл. ад 23.5.1989.

ВЁСКА ЛАЗАРАЎКА

ДОРАХ Павел Іванавіч, н. у 1907, працаваў сталяром на Дземяхоўскім спіртзаводзе. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 30.6. 1989.

ваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.10.1989.

ЖОЛУЗЬ Максім Восіпавіч, н. у 1914. Працаваў рабочым фабрыкі «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 14.9.1936. Па пастанове Спецыяльнай судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 4.2.1937 зняволены на 7 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.8.1990.

СКАДЗЕЦКІ Канстанцін Кірылавіч, н. у 1881. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 3.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 9.6.1989.

СТРЭЛЬЧАНКА Аляксандр Макаравіч, н. у 1919, працаваў у калгасе «Камунар». Арыштаваны 11.10.1936. Па пастанове Спецыяльнай судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 4.2.1937 зняволены на 7 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.8.1990.

СТРЭЛЬЧАНКА Емяльян Андрэевіч, н. у 1860, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 2.1.1937. Па пастанове Спецыяльнай судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 4.2.1937 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.8.1990.

СТРЭЛЬЧАНКА Фёдар Емяльянавіч, н. у 1909. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.9.1937 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 22.3.1989.

ПАСЁЛАК ПРУДЗІШЧА

ЖОЛУДЗЬ Андрэй Антонавіч, н. у 1877, працаваў у калгасе. Арыштаваны 7.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 29.6.1932 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.6.1989.

КАРАВАЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАРАВАЦІЧЫ

БЛІЗНЕЦ Восіп Мікалаевіч, н. у 1878. Жыў у Рэчыцы, працаваў конюхам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 4.3.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 14.3.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 2.4.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 10.10.1989.

ДЗЕЙКУН Даніла Яфімавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 30.1.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.9.1965.

ДЗЕЙКУН Лука Фёдаравіч, н. у 1889, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 30.1.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.9.1965.

МІХАЛКА Нікан Міхайлавіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 30.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1936. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў на Беламорска-Балтыйскім канале. Вызвалены з месца зняволення ў 1947. Пайшоў працаваць у калгас «Запаветы Леніна». Арыштаваны ў трэці раз 22.12.1948. Па пастанове Асобай нарады пры МДБ СССР ад 9.3.1949 асуджаны да высылкі на пасяленне ў Джамбульскую вобл. (Казахстан). Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 27.9.1965, па прысуду 1937 г. — 4.2.1963, па прысуду 1949 г. — 15.9.1989.

МІХАЛКА Павел Трафімавіч, н. у 1892, працаваў у калгасе. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 30.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.9.1965.

МІХАЛКА Пімен Яфімавіч, н. у 1880. Жыў у пас. Чырвоная Дуброва (цяпер вёска), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 4.2.1963.

НОВІК Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1881. Жыў у в. Жмураўка, працаваў у саўгасе. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення ў 1941. Рэабілітаваны 4.2.1963.

ПІГУЛЕЎСКІ Яўген Яўгенавіч, н. у 1876 у в. Дудзічы (Калінкавіцкі р-н). Жыў у Каравацічах, працаваў рахункаводам механізаванага лесапункта «Бабічы». Арыштаваны 5.3.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 14.3.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 27.4.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны пастановай прэзідыума Гомельскага абласнога суда ад 22.11.1956.

СМОЛЬСКІ Лявон Дзмітрыевіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 30.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.9.1965.

ТУЖЫК Іван Іванавіч, н. у 1900, працаваў у калгасе «Запаветы Леніна». Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 1.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Новасібірскай вобл. Рэабілітаваны 12.7.1989.

ХАЛІМОНЕНКА Ілья Васільевіч, н. у 1882, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 30.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.9.1965.

ЯРАЦ Андрэй Рыгоравіч, н. у 1903, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па

БССР ад 30.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.9.1965.

ВЁСКА ПЕРАВАЛОКА

ДОРАХ Іван Кузьміч, н. у 1874. Жыў у в. Лазараўка, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.12.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 13.1.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 19.10.1989.

ЛУЦКО Сямён Кірэевіч, н. у 1877, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення 16.2.1943. Рэабілітаваны 4.2.1963.

СЕМЧАНКА Міхаіл Васільевіч, н. у 1879. Жыў у пас. Новы Свет (Дзямяхоўскі с/с), працаваў пастухом па найму. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 4.2.1963.

СМОЛЬСКІ Захар Дзмітрыевіч, н. у 1896, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 30.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Адбыў пакаранне, вярнуўся дамоў. Уладкаваўся працаваць рабочым на Капараўскі механізаваны лесапункт. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 27.9.1965.

СМОЛЬСКІ Фёдар Свірыдавіч, н. у 1881, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 30.1.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.9.1965.

ВЁСКА ПЕРШАМАЙСК (КАБЫЛЕВА)

ЕМЕЛЬЯНЕНКА Мікіта Восіпавіч, н. у 1872, працаваў ў калгасе. Арыштаваны 11.4.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 20.11.1989.

КАРНЕЕНКА Аляксей Паўлавіч, н. у 1873, працаваў у калгасе «1-ае Жніўня». Арыштаваны 11.10.1940. Па пастанове Судовай калегіі па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда ад 30.11.1940 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.11.1989.

КУНЦЭВІЧ Аксён Восіпавіч, н. у 1898. Жыў у Хойніках, працаваў загадчыкам склада аб'яднання «Заготзярно». Арыштаваны 2.1.1934. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.2.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. 1.4.1934 пакаранне было заменена на высылку ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 10.1.1991.

МУХА Фёдар Іванавіч, н. у 1875, працаваў у калгасе «Кастрычнік». Арыштаваны 11.8.1938. Па пастанове асобай трокі НКУС БССР ад 2.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 22.11.1938 у Мазыры. Рэабілітаваны 16.7.1989.

ВЁСКА ЦІШКАЎКА

СЫЧ Гаўрыла Яфімавіч, н. у 1906, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 1.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Рэабілітаваны 19.7.1989.

СЫЧ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1870. Жыў на х. Баравое. Арыштаваны 13.3.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.11.1930 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 27.9.1989.

ТУЖЫК Якаў Аляксандравіч, н. у 1879, працаваў рабочым па найму на будаўніцтве дарог. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Мардоўскай АССР. Памёр у месцы зняволення 22.3.1942. Рэабілітаваны 6.6.1989.

ЛІСКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРЫНКІ

БЛІЗНЕЦ Антон Пятровіч, н. у 1881—1883, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.3.1928. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ БССР ад 8.6.1928 асуджаны на 4 месяцы пазбаўлення волі. Арыштаваны ў другі раз 17.4.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 5.6.1932 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.9.1989.

ГВОЗДЗЬ Аляксей Майсеевіч, н. у 1888, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 22.5.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.7.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.7.1961.

ДЗЕНІСЕНКА Дзмітрый Іванавіч. Раскулачаны ў 1930.

КАЦУРА Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1876, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 7.4.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 5.6.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.9.1989.

КЛЕШЧАНКА Яфрэм Адамавіч, н. у 1898. Член ВКП(б). Працаваў брыгадзірам калгаса «Піянер». Арыштаваны 30.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 12.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 9.5.1959.

КОЦУР Апанас Кузьміч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1933 быў асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі ўмоўна. Рэабілітаваны 24.7.1961.

РАСОЛ Ігнат Сцяпанавіч, н. у 1887, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны

22.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 2.4.1961.

РАСОЛ Мікалай Андрэевіч, н. у 1882, жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром на ваенным будаўніцтве. Арыштаваны 17.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.7.1961.

РАСОЛ Сысой Андрэевіч, н. у 1878, жыў на х. Качэтава, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 17.11.1928. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ БССР ад 15.6.1928 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.11.1992.

ВЁСКА ЛІСКІ

АСТАПЕНКА Андрэй Харытонавіч, н. у 1898, працаваў рабочым на мясцовым торфазаводзе. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.10.1937. Рэабілітаваны 28.8.1959.

АСТАПЕНКА Барыс Сільвестравіч, н. у 1880 у в. Салтанова, жыў у в. Ліскі, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 5.4.1968.

АСТАПЕНКА Сцяпан Апанасавіч, н. у 1892. Член ВКП(б). Працаваў старшынёй калгаса «КІМ». Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 10.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 10.9.1960.

АСТАПЕНКА Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1898, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Вярнуўшыся з месца зняволення працаваў рабочым торфапрадпрыемства Дземяхоўскага спіртзавода. Арыштаваны ў другі раз 30.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.11.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прыгавору 1933 г. рэабілітаваны 13.11.1989, па прыгавору 1938 г. — 5.4.1968.

АСТАПЕНКА Тарас Цімафеевіч, н. у 1886, працаваў у калгасе «КІМ». Арыштаваны 30.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 5.4.1968.

АСТАПЕНКА Цімафей Майсеевіч, н. у 1884—1886, працаваў у калгасе «КІМ». Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Арыштаваны ў другі раз 30.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны пастановай ваеннага трыбунала ЧБВА ад 5.4.1968.

БЛІЗНЕЦ Васіль Адамавіч, н. у 1887, жыў на х. Зарэцкі, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны ў 1934—1935. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Амурскай вобл. Вызвалены з месца зняволення 4.2.1943. Рэабілітаваны 4.8.1969.

ЛАСІЦА Георгій (Рыгор) Уладзіміравіч, н. у 1905, працаваў рабочым на торфапрадпрыемстве Дземяхоўскага спіртазавода. Арыштаваны 30.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.11.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Архангельскай вобл. Вызвалены з месца зняволення ў 1948. Рэабілітаваны 5.4.1968.

ЛАСІЦА Мікіта Цітавіч, н. у 1897, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 12.9.1960.

ЛАСІЦА Сцяпан Уладзіміравіч, н. у 1900. Псаломшчык Дземяхоўскай царквы. Арыштаваны ў 1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Загінуў у месцы зняволення 26.1.1942. Рэабілітаваны 13.9.1965.

ЛОБАН Дзмітрый Мікалаевіч, н. у 1886, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 25.1.1933. Па пастанове тройкі НКУС БССР ад 1.2.1936 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 24.7.1961.

МУРАШКА Якаў Самсонавіч. Раскулачаны ў 1930.

НАВАСАД Павел Мартынавіч, н. у 1888, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 13.11.1989.

НОВАБАРСУЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛЯСНОЕ (ЧЫРВОНЫ ВОСТРАЎ)

ЛУЦКЕВІЧ Эмілія Ульянаўна, н. у 1905. Жыла ў в. Паташня Хойніцкага р-на, працавала на ўласнай гаспадарцы. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 12.7.1929 асуджана да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітавана 3.12.1992.

ТАМАШЭЎСКІ Іван Антонавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 20.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 20.1.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.2.1990.

ЧЭЧАТ Мечыслаў Генрыхавіч, працаваў лесніком Хойніцкага лясніцтва. Арыштаваны 19.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 пазбаўлены волі тэрмінам на 3 месяцы. Вызвалены з месца зняволення 31.8.1929. Рэабілітаваны 11.9.1961.

ВЁСКА МАЛАДУША

КАЗАЧЭНАК (КАЗАЧЭНКА) Іван Аляксеевіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 12.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Вярнуўся, адбыўшы пакаранне, дамоў. Пайшоў працаваць у мясцовы калгас «Непераможны». Зноў арыштаваны 17.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.11.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 29.7.1989, па прысуду 1937 г.—27.5.1960.

КЕЧКА Мікалай Іванавіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 12.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Пайшоў працаваць у мясцовы калгас «Непераможны». Арыштаваны зноў 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 23.11.1942. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 29.7.1989, па прысуду 1937 г.—27.5.1960.

КУДАРЭНАК (КУДАРЭНКА) Мірон Андрэевіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 24.7.1989.

НОВІК Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1891 у в. Стары Барсук, жыў у Маладушы, працаваў у калгасе «Непераможны». Арыштаваны 30.10.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 25.5.1989.

НОВІК Канстанцін Іосіфавіч, н. у 1886, жыў у в. Баршчоўка, працаваў аб'ездчыкам Рэчыцкага лясгаса. Арыштаваны 9.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 25.9.1989.

НОВІК Фёдар Гардзеевіч, н. у 1869, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.2.1934 асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі ўмоўна і з-пад арышту вызвалены. Рэабілітаваны 8.8.1988.

НОВІК Фёдар Дзямідавіч, н. 15.8.1889, працаваў у Маладушы ветэрынарным фельчарам. Арыштаваны 10.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 8.10.1938. Рэабілітаваны 12.5.1960.

САВЯНОК (САВЕНКА) Лявон Арсенцьевіч, н. у 1890—1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Пайшоў працаваць у мясцовы калгас «Непераможны». Зноў арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Памёр у месцы зняволення 31.1.1941. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 24.7.1989, па прысуду 1937 г.—27.5.1960.

СЕМУКОЎ Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1898, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 26.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.4.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пасля адбыцця пакарання ўладкаваўся працаваць рабочым у саўгас «10 гадоў Кастрычніка» (Рэчыца). Зноў арыштаваны 17.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.11.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Па прысуду 1932 г. рэабілітаваны 19.10.1989, па прысуду 1937 г.—27.6.1960.

ШАПАВАЛАЎ Іван Андрэевіч, н. у 1892, працаваў кладаўшчыком у калгасе «Непераможны». Арыштаваны 17.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.11.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 27.5.1960.

ШАЎЧУК Кесарый Сямёнавіч, н. у 1875—1878 у с. Ардынцы Валынскай губерні (Украіна). Жыў у Маладушы. Святар. Арыштаваны 19.6.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ ад 26.7.1931 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Вярнуўся, адбыўшы пакаранне, у Маладушу. Зноў арыштаваны 2.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1931 г. рэабілітаваны 14.11.1989, па прысуду 1937 г.—8.9.1989.

ВЁСКА НОВЫ БАРСУК

АСТАПЕНКА Аляксандр Паўлавіч, н. у 1898, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 2.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 23.11.1989.

БАЛМАКОЎ Гаўрыла Лявонавіч, н. у 1894, працаваў старшынёй калгаса імя Фрунзе. Арыштаваны 15.10.1932. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 15.1.1933 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.1.1933 у Гомелі. Рэабілітаваны 10.3.1993.

БАЛМАКОЎ Іван Лявонавіч, н. у 1879 у в. Церахоўка (Добрушскі р-н), жыў у Новым Барсуку, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 23.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 15.5.1991.

БАЛМАКОЎ Фёдар Фёдаравіч, н. у 1907, працаваў у калгасе імя Фрунзе. Раскулачаны. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Хабараўскай вобл. Рэабілітаваны 13.1.1958.

БАРЫСЁВІЧ Міхаіл Мікітавіч, н. у 1908. Жыў на хутары, працаваў шаўцом. Арыштаваны

19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Бурацка-Мангольскай АССР. Вызвалены з месца зняволення 24.11.1947. Рэабілітаваны 11.3.1963.

БІРЫЛА Андрэй Яфімавіч, н. у 1883. Раскулачаны ў 1931—1932.

БІРЫЛА Васіль Тарасавіч, н. у 1905. Раскулачаны. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Хабараўскай вобл. Рэабілітаваны 13.1.1958.

БІРЫЛА Іван Феакціставіч, н. у 1893, працаваў у калгасе імя Фрунзе. Арыштаваны 10.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.1. 1990.

БІРЫЛА Парфен Яфімавіч, н. у лютым 1893. Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром-лесарубам Рэчыцкага лясгаса. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 19.4.1989.

БІРЫЛА Тарас Яфімавіч, н. у 1883, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 8.1.1990.

ГЕРАСІМЕНКА Дзяніс Фёдаравіч, н. у 1878 у в. Глыбоцкае (Гомельскі р-н). Жыў у Новым Барсуку, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 23.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Сям'я Герасіменкі Д. Ф. была выслана за межы рэспублікі. Рэабілітаваны 15.5.1991.

ГУЦ Фёдар Уладзіміравіч, н. у 1879, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 23.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Яго сям'я была выслана за межы рэспублікі. Рэабілітаваны 15.5.1991.

ДАНІЛЬЧАНКА Ганна Кузьмінічна, н. у 1882. Раскулачана ў 1932.

ДАНІЛЬЧАНКА Пётр Сідаравіч, н. у 1908, працаваў бухгалтарам у калгасе імя Фрунзе. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Хабараўскай вобл. Рэабілітаваны 13.1.1958.

ДАНІЛЬЧАНКА Савелій Данілавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.1.1990.

ДУДЗЯН (ДУДЗЯНОЎ) Емяльян Андрэевіч, н. у 1863 у в. Уць Магілёўскай губерні. Жыў у Новым Барсуку, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 19.4.1989.

ДУДЗЯН (ДУДЗЯНОЎ) Іван Емяльянавіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 2.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны пастановай пракурора Гомельскай вобл. ад 23.11.1989.

ДУДЗЯН (ДУДЗЯНОЎ) Мікалай Емяльянавіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 16.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 16.6.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 30.8.1989.

ЕКУТОВІЧ Іосіф Мікалаевіч, н. у 1892 у мястэчку Целеханы Пінскага павета. Жыў у Новым Барсуку, працаваў у калгасе імя Фрунзе. Арыштаваны 3.10.1940. Па пастанове Судовай калегіі па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда ад 31.10.1940 асуджаны на 5 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЖАЎНОЎ Іван Кузьміч, н. у 1873 у в. Жгунь (Добрушскі р-н). Жыў у Новым Барсуку, працаваў у калгасе імя Фрунзе. Раскулачаны. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Карагандзе (Казахстан). Рэабілітаваны 13.1.1958.

ЖУРАЎЛЁЎ Раман Дзмітрыевіч, н. у 1868 у Гомельскім павеце. Жыў у Новым Барсуку, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Карагандзе (Казахстан). Рэабілітаваны 13.1.1958.

КІРЫЧЭНКА Дзмітрый Ісаевіч, н. у 1879 у в. Завідаўка Церахоўскай воласці (Добрушскі р-н). Жыў у Новым Барсуку, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 26.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 зняволены на 3 гады ў канцлагер. 16.12.1932 з месца зняволення вызвалены і пазбаўлены пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. Рэабілітаваны 15.5.1991.

КУРАЧОЎ Міхаіл Лявонавіч, н. у 1897, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.4.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 5 гадоў. Быў раскулачаны. Рэабілітаваны 8.1.1990.

КУРАЧОЎ Павел Майсеевіч, н. у 1875, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Быў раскулачаны. Рэабілітаваны 8.1.1990.

МАЙСЕЕНКА Андрэй Макаравіч, н. у 1888, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Новасібірскай вобл. Рэабілітаваны 20.3.1961.

МІНАРЧАНКА Сцяпан Аксёнавіч, н. у

1897, працаваў у калгасе імя Фрунзе. Раскулачаны. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Хабараўскім краі. Рэабілітаваны 1.5.1958.

МЫТНІК (МЫТНІКАЎ) Рыгор Іванавіч, н. у 1896. Адзінокі. Працаваў на розных часовых работах. Арыштаваны 18.7.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 19.9.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 10.4.1989.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Александр Іванавіч, н. у 1905, працаваў кавалём у калгасе імя Фрунзе. Раскулачаны. Арыштаваны 11.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 6.6.1989.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Іван Ігнатавіч, н. у 1872, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 10.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 8.1.1990.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1899, працаваў у калгасе імя Фрунзе. Арыштаваны 15.10.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.10.1932 зняволены на 10 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 10.3.1993.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Фядот Захаравіч, н. у 1897, працаваў рахункаводам у мясцовым сельсавеце. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Карагандзе (Казахстан). Рэабілітаваны 13.1.1958.

НІКІЦЕНКА Трафім Фёдаравіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 23.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 15.5.1991.

НІКІЦЕНКА Фёдар Аляксеевіч, н. у 1872 у в. Кругавец (Добрушскі р-н), жыў у Новым Барсуку, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 20.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 15.5.1991.

НІКІЦЕНКА Якаў Аляксеевіч, н. у 1885, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 23.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 15.5.1991.

ПРАХАРЭНКА Андрэй Парфенавіч, н. у 1881, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.4.1932 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.1.1990.

ПРЫХОДЗЬКА Даніла Рыгоравіч, н. у 1897, працаваў млынаром. Арыштаваны 5.4.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.6.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Пазней пакаранне было заменена на высылку з сям'ёй па 2-ой катэгорыі. Рэабілітаваны 30.9.1989.

ПРЫХОДЗЬКА Дзмітрый Малахавіч, н. у 1910, працаваў у калгасе імя Фрунзе. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Хабараўскім краі. Рэабілітаваны 13.1.1958.

ПРЫХОДЗЬКА Малах Сямёнавіч, н. у 1876 у в. Папоўка Гомельскага павета, жыў у Новым Барсуку, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 12.12.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 9.4.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 15.9.1989.

ПРЫХОДЗЬКА Фёдар Рыгоравіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 20.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 15.5.1991.

ПРЫХОДЗЬКА Сямён Малахавіч, н. у 1910, працаваў у калгасе імя Фрунзе. Арыштаваны 15.10.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.10.1932 зняволены на 10 гадоў у канцлагер. 21.6.1936 тэрмін зняволення быў скарочаны да 5 гадоў. Рэабілітаваны 10.3.1993.

ПШАНОЎ Васіль Іосіфавіч, н. 12.4.1903. Жыў у Рэчыцы, працаваў шафёрам 717-га ўчастка дарожнага будаўніцтва. Арыштаваны 27.4.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 6.6.1989.

САВЯНОК Алена Аляксееўна, н. у 1881. Раскулачана ў 1928—1929.

СІЗЫ Іван Іванавіч, н. у 1895, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 2.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 23.11.1989.

СУРАВЕЦ Яфім Мікалаевіч, н. у 1873 у в. Завідаўка (Добрушскі р-н). Жыў у Новым Барсуку, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Карагандзе (Казахстан). Рэабілітаваны 13.1.1958.

ТРАПАЧОЎ Мікалай Раманавіч, н. у 1895. Жыў у в. Сямёнаўка (Вышамірскі с/с), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ БССР ад 14.2.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 29.5.1962.

ХАДОРКІН Міхаіл Сяргеевіч, н. у 1894. Жыў у пас. Зара Свабоды, працаваў у калгасе імя Фрунзе. Арыштаваны 7.2.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.2.1938 прыгавора-

ны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 13.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ЦІМАШЭНКА Ганна Паўлаўна, н. у 1910. Жыла ў в. Андрэеўка (Ровенска-Слабодскі с/с), працавала ў калгасе імя Мянжынскага. Па пастанове Асобай нарады пры МДБ СССР ад 20.5.1947 асуджана да высылкі ў Краснаярскі край тэрмінам на 5 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітавана 27.1.1993.

ВЁСКА СТАРЫ БАРСУК

АТРОШКА Аляксей Фёдаравіч, н. у 1874, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.8.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.9.1932 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 7.4. 1964.

АТРОШКА Цімафей Аляксеевіч, н. у 1906, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.1.1990.

БУДЗІН (БІДЗІК) Аляксандр Архіпавіч, н. у 1884, працаваў у калгасе. Арыштаваны 12.2.1934. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.2.1934 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.8.1988.

КЕЧКА Цімафей Сцяпанавіч, н. у 1875, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 24.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.2.1934 зняволены на 5 гадоў ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.8.1988.

КРЫСЬКО Іван Фёдаравіч, н. у 1882, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 3.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 23.11.1989.

КРЫСЬКО Пётр Іванавіч, н. у 1913, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.4.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.9.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Вызвалены з месца зняволення 2.6.1934. Рэабілітаваны 7.4.1964.

ВЁСКА СЯРГЕЕЎКА

КАРНЕЙЧУК Рыгор Фёдаравіч, н. у 1903, працаваў аб'ездчыкам Хойніцкага лясгаса. Арыштаваны 21.4.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 21.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 22.9.1958.

ПАРХОМЧЫК Макар Сцяпанавіч, н. у 1888 у мястэчку Пухавічы (Мінская вобл.). Жыў у Сяргееўцы. Раскулачаны. Арыштаваны 29.4. 1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.8.1931 зняволены на 3 гады у канцлагер. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ПЕРАСВЯТОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БУГРЫМАЎКА

БУГРЫМАЎ Аляксей Пятровіч, н. у 1907. Высланы разам з сям'ёй у Сібір. Але неўзабаве без дазволу ўлад пакінуў месца высылкі і вярнуўся ў родную вёску. Арыштаваны 4.9.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 27.9.1930 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Датэрмінова вызвалены з месца зняволення 8.8.1934 і высланы ў Сібір да сям'і. Рэабілітаваны 20.4.1993.

БУГРЫМАЎ Пётр Фёдаравіч, н. у 1877. Высланы з сям'ёй у Сібір. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў, працаваў у калгасе імя Будзённага. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 1.1.1938. Рэабілітаваны.

ШЫШОЎ Васіль Сямёнавіч, н. у 1907. Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром у райспажыўсаюзе. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у г. Казані. Вызвалены з месца зняволення 6.5.1946. Рэабілітаваны 10.4.1989.

ШЫШОЎ Рыгор Мацвеевіч, н. у 1908. Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром у будаўнічай канторы. Арыштаваны 17.7.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 18.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны.

ВЁСКА ГАРЫВАДА

ВІШНЯК Іван Дзянісавіч, н. у 1885, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны ў 1930. Памёр у 1933.

ВІШНЯК Мікалай Дзянісавіч, н. у 1875, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны ў 1930. Зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Памёр у 1963.

ЗУХ Сямён Васільевіч. Раскулачаны ў 1930. Скончыў жыццё самагубствам.

КАРАЛЕНКА Емяльян Апанасавіч. Раскулачаны.

МАРОЗ Пракоп Рыгоравіч, н. у 1885, працаваў на ўласнай гаспадарцы. У 1935 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення датэрмінова ў 1939. Памёр у 1982.

ЦЫРУЛЬНІК Сцяпан Сямёнавіч, працаваў на ўласнай гаспадарцы. У 1930 разам з сям'ёй сасланы ў Сібір, дзе неўзабаве памёр.

ЧАРАДНІК Рыгор Іовавіч, н. у 1884, працаваў у калгасе імя Калініна. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Архангельскай вобл. Вызвалены з месца зняволення 19.10.1947. Рэабілітаваны 8.8.1961.

ВЁСКА КОРАСЦЕНЬ

БУЛАВЕЦКІ Сяргей Піліпавіч, н. у 1887, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 3.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 11.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ЖАЎНЯРЭНКА Сцяпан Антонавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 11.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ШАЎЧЭНКА Цімафей Восіпавіч, н. у 1921. Жыў у в. Дзеражня, працаваў настаўнікам Салтаноўскай сямігодкі. Арыштаваны 13.2.1950. Па пастанове ваеннага трыбунала БВА ад 29.7. 1950 зняволены на 20 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення 11.11.1955. Рэабілітаваны 7.10.1955.

ВЁСКА МАЎЧАНЫ

ДУБАВЕЦ Іван Сцяпанавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 10.11.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.11.1930 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 19.7.1989.

МАЕЎСКІ Лаўрэн Пятровіч, н. у 1911. Раскулачаны. Працаваў рабочым фабрыкі «10-ы Кастрычнік» (Рэчыца). Арыштаваны 14.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

МАЕЎСКІ Сямён Пятровіч, н. у 1906, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 14.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

МАНДРЫК Андрэй Аляксандравіч, н. у 1873, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 9.12.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 13.1.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 19.10.1989.

МНУХІН Яўген Міхайлавіч, н. у 1911 у н. п. Астроленка (Польшча). Жыў у Маўчанах. Працаваў настаўнікам. Арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ВЁСКА ПЕРАСВЯТОЕ

ДЗЕМЯНОК Пётр Антонавіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.6.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Пайшоў працаваць у калгас імя Будзённага. Арыштаваны ў другі раз 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 1.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. З месца зняволення вызвалены ў 1947. Па прысуду 1932 г. рэабілітаваны 20.9.1989, па прысуду 1937 г.—12.2.1962.

ЖАЛЕЗКА Сцяпан Яўціхіевіч, н. у 1890. Жыў на х. Бугрымаўка, працаваў рабочым на Дземяхоўскім спіртзаводзе. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Архангельскай вобл. Вызвалены з месца зняволення ў 1943. Рэабілітаваны.

КАСКЕВІЧ Рыгор Іосіфавіч, н. у 1898 у в. Стрэхава (Віцебская вобл.). Жыў у Перасвятым, працаваў рабочым сельскагаспадарчай майстэрні ў Рэчыцы. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 9.8.1961.

ЛІСОЎСКІ Мацвей Піліпавіч, н. у 1877. Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 6.12.1934. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 17.5.1935 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 7.10.1964.

ПАТАРОЧА Міхаіл Адамавіч, н. у 1896—1898. Жыў у пас. Асавец, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.6.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Пайшоў працаваць цесляром у калгас імя Будзённага. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Архангельскай вобл. Па прысуду 1932 г. рэабілітаваны 20.9.1989, па прысуду 1937 г.—10.4.1989.

ВЁСКА РАБУСА

КАРАЛЕНКА Дзяніс Іванавіч, н. у 1915. Жыў у Рэчыцы, працаваў медфельчарам у саўгасе «10 гадоў Кастрычніка». Арыштаваны 6.9.1940. Па пастанове Судовай калегіі па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда ад 10.10.1940 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 22.1.1990.

КАРАЛЕНКА Ігнат Пятровіч, н. у 1893. Жыў на хутары Шаўлоў, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 27.3.1932. Па пастанове асобай тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.6.1932 пазбаўлены права пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. тэрмінам на 3 гады. Пасля высылкі працаваў вартаўніком у піянерскім лагеры. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1932 г. рэабілітаваны 20.9.1989, па прысуду 1937 г.—11.6.1962.

КАРАЛЕНКА Міхаіл Нічыпаравіч, н. у 1897. Жыў у Калінкавічах, працаваў дзяжурным па ст. Калінкавічы. Арыштаваны 25.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 10.5. 1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 19.2.1965.

КАХАНОЎСКІ Пётр Еўдакімавіч, н. у 1881. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на льнонасеннай базе. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 4.7.1989.

КАХАНОЎСКІ Рыгор Конанавіч, н. у 1909. Жыў у Рэчыцы (інтэрнат завода імя Варашылава), працаваў на заводзе па вырабу дубіцеляў чорнарабочым. Арыштаваны 16.1.1938. Па пастанове Гомельскага абласнога суда ад 19.1.1939 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 2 гады. Памёр у турме г. Гомеля 19.4.1939. Рэабілітваны 26.6.1990.

РОВЕНСКА-СЛАБОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АНДРЭЕЎКА

БЛІШЧ Арсен Мікалаевіч, н. у 1872 у в. Смагарын. Жыў у Андрэеўцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 8.12.1929. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 13.1.1930 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1932. Рэабілітаваны 7.4.1964.

БЛІШЧ Канстанцін Рыгоравіч, н. у 1907, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 26.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.9.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 7.4.1964.

ВАСІЛЕЦ Нічыпар Васільевіч, н. у 1878, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 8.12.1929. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 13.1.1930 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Вызвалены з месца зняволення 22.3.1933. Рэабілітаваны 7.4.1964.

ВАСІЛЕЦ Фёдар Фядосавіч, н. у 1900, працаваў пажарнікам у аб'яднанні «Саюзмука». Арыштаваны 25.3.1938. Па пастанове Гомельскага абласнога суда ад 16.3.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 26.8.1991.

ЗВЯРТОЎСКІ Адам Раманавіч, н. у 1886. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым дарожна-будаўнічага ўпраўлення. Арыштаваны 26.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.9.1932 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Вызвалены датэрмінова з месца зняволення 14.11.1933. Рэабілітаваны 7.4.1964.

КАСЦЯНОК Антон Лаўрэнавіч, н. у 1884, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 20.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.4.1933 зняволены ў папраўча-працоўны лагер тэрмінам на 10 гадоў. Сям'я Касцянка А. Л. была выслана ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 31.7.1989.

КАСЦЯНОК Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1902. Жыў у в. Маладуша Новабарсуцкага с/с, працаваў майстрам радыёвузла. Арыштаваны 12.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 24.7.1989.

КУДАРЭНКА Восіп Севасцьянавіч, н. у 1878. Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром на лесапільным заводзе імя Томскага. Арыштаваны 24.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.7.1933 зняволены ў папраўча-працоўны лагер тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КУДАРЭНКА Купрыян Кузьміч, н. у 1872, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 8.12.1929. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 13.1.1930 зняволены ў папраўча-працоўны лагер тэрмінам на 3 гады. Вызвалены з месца зняволення ў 1932. Вярнуўшыся дамоў, пайшоў працаваць у калгас «Праца». Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 7.4.1964.

КУДАРЭНКА Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1909—1910, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 8.12.1929. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 13.1.1930 зняволены ў папраўча-працоўны лагер тэрмінам на 3 гады. Пасля адбыцця пакарання пайшоў працаваць у калгас. Зноў арыштаваны 17.6.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1930 г. рэабілітаваны 7.4.1964, па прысуду 1937 г.—19.4.1989.

КУДАРЭНКА Рыгор Мікітавіч, раскулачаны ў 1930—1931.

КУЗАР Рыгор Лаўрэнавіч, н. у 1883, працаваў у калгасе. Арыштаваны 15.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. З месца зняволення вызвалены датэрмінова. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 23.4.1963, па прысуду 1937 г.—7.4.1964.

МУХА Вячаслаў Піліпавіч, н. у 1904, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.4.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.9.1932 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1947. Арыштаваны ў трэці раз 17.12.1948. Па пастанове Асобай нарады пры МДБ СССР ад 2.4.1949 асуджаны да высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 7.4.1964.

МУХА Даніла Сямёнавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.4.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.9.1932 асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі ўмоўна. Рэабілітаваны 7.4.1964.

МУХА Піліп Пятровіч, н. у 1872—1874,

працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.4.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.9.1932 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Працягваў працаваць на ўласнай гаспадарцы. Зноў арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у турме г. Чэрвеня Мінскай вобл. 22.4.1938. Рэабілітаваны 7.4.1964.

МУХА Рыгор Іпалітавіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1. 1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 23.4.1963.

МУХА Фёдар Карнеевіч, н. у 1887, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.8.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.9.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Працаваў рабочым Рэчыцкага дарожнабудаўнічага ўпраўлення. Зноў арыштаваны 18.7.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у турме г. Гомеля 14.3.1938. Рэабілітаваны 7.4.1964.

ВЁСКА БЯЗУЕЎ

БАЛАШЧАНКА Андрэй Мінавіч, н. у 1902, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.5.1932 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.7.1989.

БАЛАШЧАНКА Антон Рыгоравіч, н. у 1899. Жыў на х. Цеснае (Цесна) Хойніцкага р-на. Арыштаваны 7.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 19.7.1989.

БАЛАШЧАНКА Іван Лявонавіч, н. у 1886, працаваў у калгасе «Чырвоны баец». Раскулачаны. Арыштаваны 7.2.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.2.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 30.9.1989.

БАЛАШЧАНКА Міхаіл Лявонавіч, н. у 1888, працаваў у калгасе «Чырвоны баец». Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.5.1932 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Датэрмінова вызвалены з месца зняволення ў 1934. Зноў арыштаваны 7.2.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.2.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.3.1938 у Гомелі. Па прысуду 1932 г. рэабілітаваны 3.9.1991, па прысуду 1938 г.— 30.9.1989.

БАЛАШЧАНКА Павел Лявонавіч, н. у 1892, працаваў у калгасе «Чырвоны баец», жыў у пас. Ігар. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Паказранне адбываў у Амурскай вобл. Памёр у месцы зняволення 2.5.1938. Рэабілітаваны 19.10.1959.

БАЛАШЧАНКА Рыгор Анісавіч, н. у 1855. Жыў на х. Цеснае (Цесна) Хойніцкага р-на. Арыштаваны 7.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ЗАБІРАН Іван Сямёнавіч, н. у 1892, працаваў рабочым Бязуеўскага лесаўчастка. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 14.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 7.9.1960.

КАРЖАНЕЎСКІ Генрых (Генадзь) Вікенцьевіч, н. у 1913. Працаваў кавалём у леспрамгасе трэста «Поўначкарэллес» (Карэлія). Арыштаваны 20.5.1946. Па пастанове Рэчыцкага райаддзела міліцыі ад 22.5.1946 высланы на спецпасяленне тэрмінам на 6 гадоў. Вызвалены з месца высылкі 21.9.1955. Рэабілітаваны 8.5.1968.

ЛЫСЕНКА Васіль Ларывонавіч, н. у 1891. Жыў у Рэчыцы, працаваў настаўнікам. Арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.9.1938 . Рэабілітаваны 9.7.1957.

ВЁСКА БЯРОЗАЎКА

МУЧКОЎСКІ Іван Якаўлевіч, н. у 1898, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 16.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1935. Зноў арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10. 1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 23.4.1963.

ХУТАР ДУБАВОЕ (не існуе)

МАЦЮШЭНКА Сямён Васільевіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны ў 1933. Каб не быць арыштаваным, вымушаны быў хавацца ад улад.

ВЁСКА ПАСЕКА

СІВУХА Андрэй Фаміч, н. у 1896, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.4.1963.

СІВУХА Васіль Кандратавіч, н. у 1904, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.8.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.8.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 7.4.1964.

ВЁСКА РАМАНАЎКА

КАШЫЦКІ Васіль Рафаілавіч, н. у 1877, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны

13.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 «...на 3 года закреплен к определенному месту жительства». Рэабілітаваны 24.7.1989.

КАШЫЦКІ Мітрафан Рафаілавіч, н. у 1883 у в. Гасцівель (Свірыдавіцкі с/с). Жыў у Раманаўцы. Арыштаваны 1.11.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 12.7.1989.

КАШЫЦКІ Пётр Рафаілавіч, н. у 1900, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 12.7.1989.

МЯЖЭВІЧ Аляксей Васільевіч, н. у 1873 у в. Аляксандраўка (Баршчоўскі с/с). Жыў у Раманаўцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 12.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 «...лишен права проживания в 12 пунктах и Уральской обл. с прикреплением к определенному месту жительства сроком на 3 года». Рэабілітаваны 24.7.1989.

МЯЖЭВІЧ Фрол Мікітавіч, н. у 1896, працаваў рахункаводам у калгасе імя Літвінава. Арыштаваны 12.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 24.7.1989.

СТАРЧАНКА Сямён Міхайлавіч, н. у 1887 у Гомельскім павеце. Жыў у Раманаўцы. Арыштаваны 1.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 12.7.1989.

ВЁСКА РОВЕНСКАЯ СЛАБАДА

ДВОРНІК Дзяніс Макаравіч, н. у 1867, працаваў у калгасе. Арыштаваны 24.12.1932. Па пастанове тройкі ПП АГПУ па БССР ад 10.4.1933 асуджаны да высылкі за межы рэспублікі тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.5.1957.

ДВОРНІК Клімент Максімавіч, н.у 1876, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 30.6.1992.

КАЛЬЧУК Гаўрыла Ерамеевіч, н. у 1895, працаваў у калгасе. Арыштаваны 24.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 10.4.1933 асуджаны да высылкі за межы рэспублікі тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.5.1957.

КУЦЕНЬ Васіль Сілавіч, н. у 1874, працаваў у калгасе імя Дзяржынскага. Раскулачаны. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 21.4.1942. Рэабілітаваны 14.6.1989.

МАЦЮШЭНКА Уладзімір Маркавіч, н. у 1872, працаваў у калгасе. Арыштаваны 24.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 10.4.1933 асуджаны да высылкі за межы рэспублікі тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.5.1957.

СІВУХА Аляксей Паўлавіч, н. у 1908, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.8.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў на будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага канала. Вызвалены з месца зняволення датэрмінова 20.1.1933. Рэабілітаваны 7.4.1964.

СІВУХА Антон Кандратавіч, н. у 1908. Жыў у Рэчыцы, працаваў грузчыкам на станцыі Рэчыца. Арыштаваны 11.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 23.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў верасні 1947. Рэабілітаваны 22.6.1970.

СІВУХА Васіль Кандратавіч, н. у 1904. Жыў у Рэчыцы, працаваў вагаўшчыком на хлебазаводзе. Арыштаваны ў 1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР быў зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Зноў арыштаваны 7.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 7.4.1964.

СІВУХА Восіп Мікалаевіч, н. у 1902, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.2.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 5.7.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Вызвалены з месца высылкі (Новасібірская вобл.) датэрмінова 16.8.1930. Рэабілітаваны 31.10.1989.

СІВУХА Іван Мікалаевіч, н. у 1902, працаваў старшынёй калгаса. Арыштаваны 24.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.1.1933 зняволены на 10 гадоў. Рэабілітаваны 24.5.1957.

СІВУХА Іван Яфімавіч, н. у 1897. Жыў у в. Бярозаўка, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.7.1931 з-пад варты вызвалены. Рэабілітаваны 14.11.1989.

СІВУХА Ісідар Сцяпанавіч, н. у 1884, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 18.7.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.7.1931 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Пасля адбыцця пакарання жыў у Рэчыцы. Арыштаваны ў другі раз 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Па прысуду 1931 г. рэабілітаваны 14.11.1989, па прысуду 1937 г.— 20.9.1989.

СІВУХА Кандрат Трафімавіч, н. у 1870. Раскулачаны ў 1932—1933.

СІВУХА Канстанцін Восіпавіч, н. у 1897, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.4.1963.

СІВУХА Пётр Іванавіч, н. у 1898, працаваў у калгасе імя Дзяржынскага. Член ВКП(б) з 1926. Арыштаваны 24.12.1932. Па пастанове трой-

кі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.1.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.5.1957.

СІВУХА Уладзімір Сідаравіч, н. у 1910, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.4.1963.

ТАРАСЕНКА Восіп Іванавіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Раскулачаны. Вызвалены з месца зняволення 1.1.1936. Зноў арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 21.10. 1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 23.4.1963.

ТАРАСЕНКА Лаўрэн Іванавіч, н. у 1876, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 7.12.1929. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.1.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 10.11.1989.

ВЁСКА РОЎНАЕ

КАЛЬЧУК Кандрат Аксёнавіч, н. у 1908. Жыў у пас. Новастружынскі, працаваў у калгасе. Арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 27.3.1943. Рэабілітаваны 1.2.1983.

КАЛЬЧУК Пётр Каленікавіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.1.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.4.1963.

МАЕЎСКІ Валерый (Мамерый) Браніслававіч, н. у 1912. Працаваў рабочым хлебазавода ў г. Рэчыцы. Арыштаваны 8.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ЧАРНАШЭЙ Аляксандр Ільіч, н. у 1905, працаваў у калгасе. Арыштаваны 18.10.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.10.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 17.10.1989.

ЧАРНАШЭЙ Андрэй Ільіч, н. у 1895, працаваў у калгасе. Арыштаваны 17.10.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.10.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 17.10.1989.

ЧАРНАШЭЙ Васіль Клімавіч, н. у 1883. Жыў на х. Дубавое (Дзедаў Востраў), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. У Архангельскую, а затым у Пермскую вобл. была выслана яго сям'я. Рэабілітаваны 17.7.1989.

ЧАРНАШЭЙ Цімафей Анісавіч. Раскулачаны.

ВЁСКА СМАГАРЫН

БЛІШЧ Іван Рыгоравіч, н. у 1872, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 2.4.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1932 з-пад арышту вызвалены, але пазбаўлены права пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. Рэабілітаваны 19.10.1989.

БЛІШЧ Якаў Яфімавіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 11.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 24.7.1989.

ДАЎЖАНОК Максім Міхайлавіч, н. у 1890, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Раскулачаны. Арыштаваны 12.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 24.7.1989.

ДАЎЖАНОК Фёдар Лявонавіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 24.7.1989.

КАСОЎСКІ Віктар Мітрафанавіч, н. у 1898, працаваў рабочым Рэчыцкага мехлесапункта. Арыштаваны 1.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 29.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.10.1938. Рэабілітаваны 10.10.1989.

ЛІХАЧ Васіль Сафронавіч, н. у 1885. Раскулачаны. За нявыплату падаткаў асуджаны на 3 гады. Пакаранне адбываў у Гомелі.

ЛЯПЕШКА Андрэй Сямёнавіч, н. у 1890, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 23.5.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 19.10.1989.

ЛЯПЕШКА Іван Іванавіч, н. у 1906. Жыў у в. Бярозаўка, працаваў у калгасе імя Дзяржынскага. Арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 4.7.1989.

ЛЯПЕШКА Іван Яфімавіч, н. у 1881. Жыў у в. Бярозаўка, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.8.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.9.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 7.4.1964.

ПАРУКЕВІЧ Адольф Іванавіч, н. у 1874 у в. Байдакі Рэчыцкага павета. Жыў у Смагарыне. Працаваў аб'ездчыкам Рэчыцкага лясгаса. Арыштаваны 27.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 высланы ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 6.1.1993.

СВІРЫДАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК ВЯСЁЛЫ

ЧАРНЕЦКІ Міна Паўлавіч, н. у 1901, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 4.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 14.5.1962.

ВЁСКА ГАСЦІВЕЛЬ

КАШЫЦКІ Пётр Карпавіч, н. у 1860, жыў на х. Чырвоная Ветка, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 прыгаворан да ВМП. Расстраляны 1.11.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 8.9.1989.

СУРТА Пётр Іванавіч, н. у 1879, жыў у в. Раманаўка (Ровенска-Слабодскага с/с), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны.

ПАСЁЛАК ЗОРКА

КУРЛОВІЧ Васіль Іванавіч. Раскулачаны.

ВЁСКА КАЗАНАЎКА

ЕРАХОВІЧ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1900 на Піншчыне. Жыў у Казанаўцы, працаваў у калгасе. Арыштаваны 12.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 25.10.1955.

ЖУК Аляксандр Іванавіч, н. у 1878, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 15.12.1989.

МІКУЛІНСКІ Павел Максімавіч, н. у 1865, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 прыгаворан да ВМП. Рэабілітаваны 15.12.1989.

НАВУМЕНКА Міхаіл Георгіевіч, н. у 1879, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.2.1930. Раскулачаны. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 прыгаворан да ВМП. Рэабілітаваны 15.12.1989.

ЧАРНЯЎСКІ Рыгор Пятровіч, н. у 1900 у в. Рудня-Целяшоўская (Буда-Кашалёўскі р-н), жыў у Казанаўцы, працаваў у калгасе «Беларус». Арыштаваны 12.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгаворан да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 28.6.1958.

ВЁСКА СВІРЫДАВІЧЫ

ГУЗ Іосіф Мікітавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 25.5.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнік патрыятычнага падполля. Расстраляны фашыстамі ў 1943. Рэабілітаваны 2.11.1989.

ГУЛІК Ануфрый Піліпавіч. Раскулачаны.

ГУЛІК Павел Кузьміч, н. у 1892. Раскулачаны.

ЗУБАХА Сямён Прохаравіч, н. у 1916 у в. Ручаёўка (Лоеўскі р-н), жыў у Свірыдавічах, працаваў настаўнікам. Арыштаваны 15.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 6.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1946. Рэабілітаваны 14.7.1969.

КАЛАЦЭЙ Арцём Сільвестравіч, н. у 1887, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.5.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 2.11.1989.

КАЛАЦЭЙ Герасім Іванавіч, н. у 1879. Раскулачаны.

КАЛАЦЭЙ Сцяпан Паўлавіч, н. у 1907, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.5.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 2.11.1989.

КУЗЬКО Парфен Цітавіч, н. у 1882, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.5.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 2.11.1989.

КУЗЬКО Пракоп Нічыпаравіч, н. у 1884, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 24.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.2.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.8.1988.

МІКУЛІНСКІ Раман Касьянавіч, н. у 1897, працаваў у калгасе в. Духанаўка (Вышамірскі с/с). Арыштаваны 7.2.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.2.1938 прыгаворан да ВМП. Расстраляны 13.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны.

РАПЕКА Сільвестр Нічыпаравіч, н. у 30.12.1893, працаваў у калгасе «Свет». Арыштаваны 28.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгаворан да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 14.8.1956.

ВЁСКА ЯМПАЛЬ

БОРСУК Кандрат Лукіч, н. у 1899, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 17.1.1933 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 28.8.1989.

ВЕРАБЕЙ Аляксандр Іванавіч, н. у 1905, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 20.5.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па

БССР ад 29.6.1933 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ВЕРАБЕЙ Мікалай Піліпавіч, н. у 1900, працаваў у калгасе. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРОЖЫК Мацвей Фёдаравіч, н. у 1882, працаваў вартаўніком у калгасе «Ленінскі шлях». Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 19.6.1989.

ЕЎДАЧЭНКА Віктар Іванавіч, н. у 1903, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 17.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 28.8.1989.

ЗІНОЎЕЎ Агей Іванавіч, н. у 1877 (1878?), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 14.1.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Адбыўшы пакаранне, працаваў рабочым лесазавода імя Кірава ў Рэчыцы. Арыштаваны ў другі раз 29.12.1936. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 10.8.1989, па прысуду 1937 г — 22.6.1989.

ІШЧАНКА Ерафей Васільевіч, н. у 1868 у с. Леўчанкі Палтаўскай губерні (Украіна). Святар Ямпальскай царквы. Адзінокі. Арыштаваны 13.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 10.8.1989.

КАСЦЯНОК Восіп Іванавіч, н. у 1868—1872(?), працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 17.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. 29.6.1933 пакаранне заменена на высылку ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

КАСЦЯНОК Павел Іванавіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 17.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 28.8.1989.

КАСЦЯНОК Фядос Мікалаевіч, н. у 1902, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 17.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 28.8.1989.

МУХА Андрэй Сідаравіч, н. у 1883, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 17.1.1933 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 28.8.1989.

НОВІК Цімафей Кузьміч, н. у 1909, працаваў сакратаром Свірыдавіцкага с/с. Арыштаваны ў 1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР зняволены на 7 гадоў. Пакаранне адбываў у Сібіры. Дамоў вярнуўся ў 1940 зусім хворым. А неўзабаве памёр. Рэабілітаваны у 1989.

ПАЎЛЯНОК Андрэй Сямёнавіч, н. у 1885, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 31.1.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 27.7.1989.

ПАЎЛЯНОК Антон Міхайлавіч, н. у 1906. Арыштаваны 27.11.1937. Па пастанове тройкі НКУС БССР ад 7.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 10.7.1989.

ПАЎЛЯНОК Рыгор Іванавіч, н. у 1886. Жыў у Рэчыцы, працаваў дворнікам у дзіцячым садзе № 5. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у турэмнай бальніцы ў Мінску 4.3.1938. Рэабілітаваны 12.6.1989.

СВЕТАГОР Андрэй Станіслававіч, н. у 1895, працаваў кавалём. Арыштаваны 15.1.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 10.8.1989.

ВЁСКА ЯНОЎКА

КУРЛОВІЧ Васіль Іванавіч, н. у 1892, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.11.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 8.8.1989.

ПЫРХ Пётр Паўлавіч, н. у 1897, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 20.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 16.6.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 30.8.1989.

ХОЛМЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДВАРЭЦ

КАМЕКА Андрэй Данілавіч, н. у 1877, працаваў у калгасе «Перамога». Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 12.2.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 2.11.1989.

КАМЕКА Іван Андрэевіч, н. у 1899, працаваў у калгасе «Перамога». Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 12.2.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 2.11.1989.

МАЛАШ Апанас Пятровіч, н. у 1894, працаваў у калгасе «Перамога». Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 12.2.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 2.11.1989.

ШНЧУК Георгій Ісакавіч, н. у 1899, працаваў у калгасе «Перамога». Арыштаваны 4.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 12.2.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 2.11.1989.

ШНЧУК Кірыл Ігнатавіч, н. у 1867, працаваў рабочым арцелі па вырабу лазовых кошыкаў у в. Чырвоная Слабада Баршчоўскага с/с.

Арыштаваны 22.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у турме г. Гомеля 27.2.1938. Рэабілітаваны 6.6.1989.

ШНЧУК Рыгор Нічыпаравіч, н. у 1900, працаваў у калгасе «Перамога». Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 12.2.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 2.11.1989.

САБКО Фёдар Данілавіч, н. у 1905, працаваў у калгасе «Перамога». Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 12.2.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 2.11.1989.

СЯМКОЎ Восіп Мікітавіч, н. у 1891, працаваў у калгасе «Перамога». Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 12.2.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 2.11.1989.

СЯМКОЎ Купрыян Мікітавіч, н. у 1895, працаваў у калгасе «Перамога». Раскулачаны ў 1930. Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 12.2.1933 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 2.11.1989.

ЧУЯШОЎ Сцяпан Кузьміч, н. у 1899, працаваў у калгасе «Перамога». Арыштаваны 6.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 12.2.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 2.11.1989.

ВЁСКА ХОЛМЕЧ

БАГДАНОВІЧ Вікенцій Вікенцьевіч, н. у 1873 у в. Стараўшчына Гродзенскай губерні. Жыў у в. Холмеч, працаваў у калгасе «Гігант». Арыштаваны 30.1.1935. Па пастанове Спецыяльнай калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 20.6.1935 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 15.11.1991.

КАМАРОЎСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1884, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 16.3.1935. Па пастанове Спецыяльнай калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 20.6.1935 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 10.3.1942. Рэабілітаваны 15.11.1991.

КРАЙЧЭЎСКІ Баляслаў Францавіч, н. у 1886 у Гродзенскай губерні. Жыў у в. Холмеч, працаваў вартаўніком мясцовай бальніцы. Арыштаваны 20.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 7.8.1989.

КУЛІК Піліп Аляксеевіч, н. у 1901, працаваў у калгасе в. Новая Баршчоўка (Лоеўскі р-н). Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ЛАПКОЎСКІ Канстанцін Аляксандравіч, н. у 1922. Вучань 9-га класа Лоеўскай СШ. Арыштаваны 16.4.1939. У судовай справе пазначана, што ягоны бацька арыштаваны ў 1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 5.2.1940 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Свярдлоўскай вобл. Вызвалены з месца зняволення 19.5.1942. Рэабілітаваны 10.7.1989.

ЛЕРМАН Броха Барысаўна, н. у 1905. Жыла ў Мазыры, працавала ўрачом. Арыштавана 25.1.1941. Па пастанове Палескага абласнога суда ад 19.3.1941 зняволена на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітавана 26.6.1990.

МАЧУЛЬСКІ Пётр Максімавіч, н. у Мазырскім павеце. Жыў у в. Холмеч. Святар. Арыштаваны 8.2.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.2.1938 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 13.3.1938. Рэабілітаваны 14.6.1989.

ПРУС Сяргей Антонавіч, н. у 1867, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 7.12.1929. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.1.1930 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 11.12.1989.

ТУРОЎСКІ Захар Давідавіч, н. у 1900. Меў уласны млын. Арыштаваны 6.12.1929. Па пастанове тройкі ПП АГПУ па БССР ад 13.1.1930 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Архангельскай вобл. Вызвалены датэрмінова ў снежні 1932. Рэабілітаваны 11.12.1989.

ШВЕЦ Сяргей Фаміч, н. у 1901, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 25.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пакаранне адбываў у Ленінградскай вобл. Памёр у месцы зняволення 25.11.1930. Рэабілітаваны 6.1.1993.

ШОЛКАВІЧ Іван Максімавіч, н. у 1884 у в. Малыя Аўцюкі (Калінкавіцкі р-н), жыў у Холмечы, працаваў дзесятнікам на будаўніцтве дарогі. Арыштаваны 11.6.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 23.9.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 14.11.1989.

ЯНІЦКІ Рыгор (Георгій) Андрэевіч, н. у 1881, працаваў на ўласнай гаспадарцы, быў выдатным цесляром. Арыштаваны 7.12.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 13.1.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер з канфіскацыяй маёмасці. Вярнуўся, адбыўшы пакаранне, дамоў. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 2.6.1989.

ГОРАД РЭЧЫЦА

АБРАМОВІЧ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1882, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.2.1938. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 15.6.1928 пазбаўлены

права пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. Рэабілітаваны 24.11.1989.

АБРАМОВІЧ Павел Дзям'янавіч, н. у 1890, працаваў слесарам на фанерным заводзе. Арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 12.3.1938. Рэабілітаваны 12.5.1958.

АБРАМОВІЧ Сцяпан Яфімавіч, н. у 1885, працаваў памочнікам майстра лесапільнага цэха фабрыкі «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 24.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у г. Акмалінску. Памёр у месцы зняволення 14.4.1934. Рэабілітаваны 16.9.1966.

АБРАМОВІЧ Сяргей Мікалаевіч, н. у 1912, працаваў рабочым на лесапільным заводзе імя Томскага. Арыштаваны 3.11.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 26.12.1930 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 20.9.1989.

АДАМЕНКА Адам Пятровіч, н. у 1897 у Нараўлянскай воласці Рэчыцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым у саўгасе «10 гадоў Кастрычніка». Арыштаваны 21.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1989.

АДАМУШКА Уладзімір Кандратавіч, н. у 1908 у г. Баранавічы. Жыў у Рэчыцы, працаваў дырэктарам педагагічнага вучылішча. Арыштаваны 13.6.1938. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 14.6.1940 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пазней пакаранне было зменена на пасяленне ў Сібір. Быў вызвалены ў 1949. Рэабілітаваны 14.5.1955.

АКУЛІЧ Ігнат Восіпавіч, н. у 1880 у в. Прусевічы Мінскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на чыгунцы. Арыштаваны 12.11.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ на БВА ад 12.12.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір (тэрмін высылкі не ўказаны). Рэабілітаваны 13.10.1989.

АЛАДЗІН Васіль Сямёнавіч, н. у 1904 у в. Клён (Бранская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў стралком узвода ваенізаванай аховы на ст. Рэчыца. Арыштаваны 22.5.1931. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.7.1931 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 19.10.1989.

АНДРЖАЕЎСКІ Іосіф Паўлавіч, н. у 1896 у в. Млынок (Ельскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў бухгалтарам мясцовага ваенторга. Член ВКП(б). Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 25.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 30.8.1957.

АНДРУСЕНКА Марыя Іванаўна, н. у 1896 на Чарнігаўшчыне. Жыла ў Рэчыцы, працавала прыбіральшчыцай на ст. Рэчыца. Арыштавана 9.5.1940. Па пастанове лінейнага суда Беларускай чыгункі ад 27.7.1940 зняволена на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітавана 17.3.1992.

АРЛОЎ-ШКУРКО Герасім Іванавіч, н. у 1876 у в. Буркі Рэчыцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 24.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Затым пакаранне было зменена на высылку ў Казахстан. Рэабілітаваны 19.9.1966.

АТАМАНЧУК Дзмітрый Пятровіч, н. у 1896. Пенсіянер. Дагэтуль працаваў слесарам. Арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 14.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 28.7.1958.

АЎСЕЕНКА Сяргей Рыгоравіч, н. у 1901 на ст. Ласінаастраўская (Яраслаўская вобл.). Жыў у Рэчыцы. Памочнік камандзіра 37 ап. Быў дэмабілізаваны з вайсковай службы 15.3.1933. Арыштаваны ў той жа дзень. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 11.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў на будаўніцтве канала Масква — Волга. Вызвалены з месца зняволення 31.10.1936. Рэабілітаваны 25.8.1989.

АЎСЕЙЧЫК Васіль Іванавіч, н. у красавіку 1894 у в. Ражкі Гродзенскай губерні. Жыў у Рэчыцы. Член ВКП(б). Працаваў загадчыкам пад'яздных пуцей фанернага завода № 19. Арыштаваны 9.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 6.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 26.7.1989.

БАБІНСКІ Барыс Канстанцінавіч, н. у 1904 у Гомелі. Жыў у Рэчыцы. Працаваў бухгалтарам на заводзе імя Інтэрнацыянала. Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 21.12.1965.

БАБІНСКІ Уладзімір Канстанцінавіч, н. у 1901 на Украіне. Жыў у Рэчыцы, працаваў рахункаводам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.9.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 9.7.1957.

БАБІЧ Нічыпар Нічыпаравіч, н. у 1874 у в. Дамашыцы Пінскага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў вартаўніком агародаў рабочых запалкавай фабрыкі «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 2.10.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.6.1989.

БАБЧАНОК Павел Герасімавіч, н. у 1892, працаваў маляром і старшынёй арцелі «Красный мебельщик». У судовай справе пазначана, што ягоны бацька быў стражнікам царскай паліцыі. Арыштаваны 18.10.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 21.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.11.1938. Рэабілітаваны 28.6.1958.

БАГДАНОВІЧ Станіслаў Аляксандравіч, н. у 1898. Літовец. Жыў у Рэчыцы, працаваў механікам аб'яднання «Дрэўлесхімсаюз». Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 29.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 10.12.1937. Рэабілітаваны 1.4.1958.

БАГДАНОВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч, н. у 1905 на Віцебшчыне. Жыў у Рэчыцы. Пенсіянер. Арыштаваны 19.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 8.10.1938. Рэабілітаваны 31.10.1989.

БАКУНОЎ Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1915 у г. Пінску. Жыў у Рэчыцы, працаваў дзяжурным па ст. Рэчыца. Арыштаваны 30.3.1935. Па пастанове лінейнага суда Беларускай чыгункі ад 18.5.1935 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў на будаўніцтве канала Масква – Волга. Вызвалены з месца зняволення ў 1937. Рэабілітаваны 9.2.1965.

БАНЬ Іван Піліпавіч, н. у 1905 у в. Малы Раглан (Мінская вобл.), працаваў аграномам рэчыцкага райземаддзела. Арыштаваны 9.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 6.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны.

БАРАНОЎСКІ Сцяпан Аўгусцінавіч, н. у 1881 у в. Баранаўка (Жлобінскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў швейцарам у сталоўцы № 1. Арыштаваны 17.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 18.2.1959.

БАРАШ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1892, працаваў юрыстам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 6.12.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 4.8.1958.

БАРАШ Пётр Сазонавіч, н. у 1898 у в. Кажушкі (Хойніцкі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў рахункаводам аб'яднання «Саюзмука». Арыштаваны 17.7.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.2.1959.

БЕК Дзмітрый Паўлавіч, н. у 1904 на Петрыкаўшчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў грузчыкам на чыгунцы. У пачатку 1930-ых гадоў быў высланы за межы рэспублікі, але неўзабаве без дазволу ўладаў вярнуўся дамоў. У 1933 быў зняволены за гэта на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Зноў быў арыштаваны 14.12.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў на ст. Сухабязводная Горкаўскай вобл. Вызвалены з месца зняволення ў 1945. Рэабілітаваны 13.2.1967.

БЕНІДЗІКЧУК Франц Людвінавіч (Людвігавіч), н. у 1894 на Гродзеншчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў травільшчыкам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 12.11.1938 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 6.2.1942. Рэабілітаваны 7.5.1958.

БЕР Пінхус Абрамавіч, н. у 1880, працаваў бухгалтарам дзяржаўнага акцыянернага таварыства «Дубіцель». Арыштаваны 24.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 10.5.1930 асуджаны на 1 год пазбаўлення волі ўмоўна. Рэабілітаваны 11.12.1989.

БЕРКЕШ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1892. Венгр. Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам на заводзе «Інтэрнацыянал». Член ВКП(б). Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 12.11.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 7.5.1958.

БІДОКА Ігнат Мікалаевіч, н. у 1885 на тэрыторыі Аўстра-Венгерскай манархіі. Жыў у Рэчыцы, працаваў конюхам. Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

БРАНЦ Мордух Якаўлевіч, н. у 1897 у м. Старобін (Мінская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў аграномам у саўгасе «10 гадоў Кастрычніка». Арыштаваны 21.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 21.11.1989.

БРАШНЕВІЧ Герман Германавіч, н. у 1899 у г. Лібава (Латвія). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Немец. Член ВКП(б). Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 12. 11.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Магаданскай вобл. Памёр у месцы зняволення 20.9.1943. Рэабілітаваны 7.5.1958.

БРУЦКІ Назар Фёдаравіч, н. у 1899. Жыў у Гомелі. Арыштаваны 14.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 5.5.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 11.12.1989.

БУГРЫМАЎ Бер Хаймавіч, н. у 1878. Жыў у Рэчыцы. Бундавец. Арыштаваны 1.10.1922. Быў высланы на 2 гады ў Арэнбургскую вобл. і пазбаўлены права пражывання ў 12 пунктах краіны тэрмінам на 3 гады. Вызвалены з месца адбыцця пакарання ў 1924. Рэабілітаваны 7.6.1993.

БУДНІЦКІ Давыд Карпавіч, н. у 1897 у в. Ліпнякі (Лоеўскі р-н.). Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам на дубільным заводзе імя Варашылава. Арыштаваны 22.8.1936. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 22.10.1936 зняволены на 4 гады ў папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 8.8.1990.

БУЙНЕВІЧ Казімір Браніслававіч, н. у 1904 у Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў дзесятнікам на будаўніцтве дзіцячага сада. Арыштаваны 28.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны 20.11.1989.

БУНЬ Канстанцін Фёдаравіч, н. у 1896 у в. Астравіцы Пінскага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў на заводзе імя Кірава. Арыштаваны 21.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 31.3.1958.

БУТОМА Леанід Данілавіч, н. у 1888 у г. Магілёве. Жыў у Рэчыцы. Святар. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 6.6.1989.

БЫКОЎСКІ Іван Пятровіч, н. у 1899 у в. Васільеўка (Гомельскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў бухгалтарам МТС. Арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.9.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 29.4.1958.

БЫКОЎСКІ Мікалай Фёдаравіч, н. у 1877 у в. Бярвенаўка (Буда-Кашалёўскі р-н). Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 18.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пазней пакаранне было зменена на высылку ў Башкірыю тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.9.1957.

БЫКОЎСКІ Нічыпар Апанасавіч, н. у 1881 у в. Бярвенаўка (Буда-Кашалёўскі р-н). Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 18.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў маі 1943. Рэабілітаваны 12.7.1962.

БЯЛЕЙШЫС (БІЛЕЙШЫС) Купрыян Францавіч, н. у 1884 у в. Жыздра Нова-Аляксандраўскага павета Ковенскай губерні. Жыў у Рэчыцы (пас. Новы Свет), працаваў рабочым на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 9.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 27.2.1959.

БЯЛЫ (БЯЛЫЙ) Перац Ідлевіч, н. у 1912 у м. Дубечка Люблінскага ваяв. (Польшча). Жыў у Рэчыцы, працаваў электраманцёрам на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 23.7.1940. Па пастанове Асобай нарады НКУС СССР ад 11.12.1940 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Датэрмінова вызвалены з месца зняволення 26.8.1941. Рэабілітаваны 16.12.1963.

БЯРКОВІЧ Міхаіл Восіпавіч, н. у 1895, працаваў рабочым на лесазаводзе імя Кірава. Член ВКП(б). Арыштаваны 6.12.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны.

ВАБУЛЕВІЧ Іван Пятровіч, н. у 1892 у г. Вільна (Літва). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ВАЙСБАРД Лейцер Эльевіч, н. у 1880 у м. Зэльва Гродзенскай губерні. Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 21.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 10.5.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 11.12.1989.

ВАНСОВІЧ Аркадзь Паўлавіч, н. 20.5. 1889. Жыў у Рэчыцы. Як пазначана ў судовай справе, сын заводчыка. Працаваў лінейным тэхнікам Рэчыцкага ўчастка сувязі Гомельскага вузла сувязі. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.3.1938. Рэабілітаваны 9.10.1957.

ВАРОНА Мірон Пракопавіч, н. у 1874, працаваў станочнікам на заводзе імя Томскага. Арыштаваны 7.5.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.6.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пазней пакаранне было зменена на высылку ў Заходне-Сібірскі край (тэрмін высылкі не ўказаны). Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВІТОЎСКІ Лявон Якімавіч, н. у 1904, працаваў рабочым у луггасе «Рэчыца». Арыштаваны 17.3.1940. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 20.6.1940 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 1.8.1989.

ВОЛЬСКАЯ Аляксандра Іосіфаўна, н. у 1896, працавала аграномам Рэчыцкай МТС. Арыштавана 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 14.12.1937 прыгаворана да ВМП. Расстраляна 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітавана 31.3.1989.

ВРУБЛЕЎСКІ Андрэй Адольфавіч, н. у 1900, жыў у Рэчыцы. Працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 26.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 7.1.1958.

ВЯРБІЦКІ Іосіф Вікенцьевіч, н. у 1900 у н. п. Рагозіца (Польшча). Жыў у Рэчыцы, працаваў на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 18.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 13.11.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЯРКОВІЧ Іван Ігнатавіч, н. у 1907 у в. Крыштофава (Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 22.5.1967.

ГАЙГЕРТ Якаў Ісакавіч, н. у 1890, працаваў майстрам па вырабу каўбасы. Арыштаваны 9.11.1937. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 10.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЙДАШ Мікалай Адамавіч, н. 11.1.1900. Жыў у райцэнтры Касцюковічы (Магілёўская вобл.), працаваў начальнікам раённага аддзялення сувязі. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 19.2.1937 прыгаво-

раны да ВМП. Расстраляны 20.12.1937 у Мінску. Рэабілітаваны.

ГАЙДАШ Якаў Іванавіч, н. у 1885, працаваў рабочым на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Памёр у месцы зняволення 3.3.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ГАЛАЙША Антон Сямёнавіч, н. у 1871 у Гродзенскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў настаўнікам у школе ФЗН фанернага завода № 19. Арыштаваны 20.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 17.4.1958.

ГАРАВАЯ Софія Натанаўна, н. у 1906. Арыштавана 14.12.1925. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 26.2.1926 асуджана на 3 гады высылкі. Вызвалена ў 1928. Рэабілітавана 18.3.1993.

ГЕРМАН Канстанцін Каэтанавіч, н. 24.3. 1901, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 12.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.11.1938. Рэабілітаваны 2.6.1958.

ГОЛЯК-КОВАЛЬ Васіль Васільевіч, н. у 1913 у в. Аляксееўка (Брагінскі р-н.). Жыў у Рэчыцы, працаваў трактарыстам. Арыштаваны 1.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.3.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Неўзабаве пакаранне было зменена на высылку ў Казахстан тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ГОЛЯК-КОВАЛЬ Міхаіл Васільевіч, н. у 1907 у в. Аляксееўка (Брагінскі р-н.). Жыў у Рэчыцы, працаваў гідратэхнікам на мясцовым сеназаводзе. Арыштаваны 1.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.3.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Неўзабаве пакаранне было зменена на высылку ў Казахстан тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ГОРСКІ Васіль Аляксеевіч, н. 28.2.1880, працаваў рабочым на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.6.1989.

ГОРСКІ Сямён Сцяпанавіч, н. у 1883. Жыў у Васілевічах, працаваў рабочым па падвозу лесаматэрыялаў. Арыштаваны 2.4.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 26.4.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ГРАБОЎСКІ Мартын Ануфрыевіч (Францавіч), н. у 1907 на Віцебшчыне. Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны ў 1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1947. Рэабілітаваны 13.4.1964.

ГРАЧОЎ Іван Кузьміч, н. у 1906 у с. Лугавое (Барысаглебскі р-н Варонежскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам механічнай майстэрні запалкавай фабрыкі «10-ы Кастрычнік». Член ВКП(б). Арыштаваны 3.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 21.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 10.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 30.10.1989.

ГРУДНІЦКІ Аляксандр Георгіевіч, н. у 1904 на Бабруйшчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў эканамістам на дубільным заводзе імя Варашылава. Арыштаваны ў 1932. Быў зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1936. Зноў арыштаваны 15.5.1948. Па пастанове Гомельскага абласнога суда ад 6.8.1948 зняволены на 25 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Пакаранне адбываў у Пермскай вобл. Вызвалены з месца зняволення ў 1955. Рэабілітаваны 16.7.1992.

ГРЫБ Разалія Міхайлаўна, н. у 1897 у Польшчы. Жыла ў Рэчыцы, працавала прыбіральшчыцай у аб'яднанні «Заготзбожжа». Арыштавана 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.11.1937 прыгаворана да ВМП. Расстраляна 23.11.1937 у Гомелі. Рэабілітавана 26.7.1989.

ГЮНТЭР Аляксандр Іванавіч, н. у 1897 у Паволжы. Немец. Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 30.6.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1933 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Датэрмінова вызвалены з месца зняволення ў 1934. Рэабілітаваны 27.9.1957.

ДАБРАВОЛЬСКІ Мікалай Парфіравіч, н. у 1902 (Добрушскі р-н). Жыў у Рэчыцы. З сям'і святара. Працаваў маляром у мясцовай вайсковай часці. Арыштаваны 24.1.1938. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 26.2.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 2.4.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 9.2.1959.

ДАВЫДЗЕНКА Дзмітрый Ісакавіч, н. у 1888 у в. Перасвятое. Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром у арцелі. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 15.2.1958.

ДАШЧЫНСКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1892, працаваў тэхнікам-будаўніком на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 6.2.1934. Па пастанове Ваеннай калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Зноў арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938. Па прысуду 1934 г. рэабілітаваны 20.10.1956, па прысуду 1938 г.— 21.4.1958.

ДЗЕККЕР Барыс Аляксандравіч, н. у 1912. Немец. Чырвонаармеец Тамбоўскага пяхотнага вучылішча. Арыштаваны 14.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС СССР па Тамбоўскай вобл. ад 14.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 22.10.1938 у г. Тамбове. Рэабілітаваны ў 1959.

ДЗЕМІДЗЕНКА Усцін Іванавіч, н. у 1889. Працаваў маляром на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 4.12.1934. Па пастанове народнага суда Рэчыцкага р-на ад 9.2.1935 зняволены на 2 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 30.10.1989.

ДЗЕМЧАНКА Парфен Максімавіч, н. у 1875, працаваў агентам па распрацоўцы драўніны. Арыштаваны 18.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Неўзабаве пакаранне было зменена на высылку ў Башкірыю тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.9.1957.

ДЗЕНІСОЎ Іосіф Сямёнавіч, н. у 1891 у г. Беластоку (Польшча). Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 24.6.1938. Абвінавачваўся як агент польскіх разведвальных органаў. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 21.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.9.1938. Рэабілітаваны 4.4.1958.

ДЗЯДЗЕКА Іосіф Іосіфавіч, н. у 1877 у в. Каменка Дрысенскага павета Віцебскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў касірам радыёвузла. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Казахстане. Рэабілітаваны 11.8.1959.

ДОННІКАЎ Дзмітрый Мікалаевіч, н. у 1887 у Арлоўскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938. Рэабілітаваны 2.6.1958.

ДРАБЫШЭЎСКІ Цімафей Яфімавіч, н. у в. Бярвенаўка (Буда-Кашалёўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў настаўнікам. Арыштаваны 18.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1938 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Датэрмінова вызвалены 18.10.1938. Рэабілітаваны 27.9.1957.

ДРОЖЖА Валерый Казіміравіч, н. у 1891 у м. Хойнікі. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 6.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны 21.6.1968.

ДУБКОЎ Васіль Іосіфавіч, н. у 1896 у в. Чашэвічы Лідскага павета Гродзенскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў прыёмшчыкам склада аб'яднання «Заготзбожжа. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.12.1937. Рэабілітаваны 21.6.1989.

ДУБРОЎСКІ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1890, працаваў інструктарам па лесанарыхтоўках. Арыштаваны 25.1.1938. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 16.2.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 4.4.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.6.1989.

ЕЛІЗАРАНКА Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1898 у в. Высокае (Бранская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў электраманцёрам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 4.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у г. Улан-Удэ (Бурація). Рэабілітаваны 13.8.1957.

ЕМЕЦ Вячаслаў Дзмітрыевіч, н. у 1909, працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 18.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.11.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.7.1989.

ЕЎТУШКОЎ Марк Харлампіевіч, н. у 1901 у в. Новыя Маркавічы (Жлобінскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 29.4.1958.

ЕЎТУШЭНКА Фядот Аляксеевіч, н. у 1900 у в. Клімаўка (Гомельскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў пажарнікам на запалкавай фабрыцы «Вязувій». Арыштаваны 24.10.1933. Па пастанове АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.10.1956.

ЖАЛЯЗІНСКІ Аляксандр Сцяпанавіч, н. 22.3.1887, працаваў бухгалтарам на выратавальнай станцыі. Арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 26.7.1989.

ЖАЛЯЗІНСКІ Захар Сямёнавіч, н. у 1875, працаваў вартаўніком шавецкай майстэрні. Арыштаваны 11.7.1935. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 30.8.1935 зняволены на 2 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.8.1990.

ЖАЛЯЗІНСКІ Іван Андрэевіч, н. у 1892, працаваў шафёрам на лесапільным заводзе імя Кірава. Арыштаваны 2.9.1937. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 22.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 30.7.1990.

ЖАЛЯЗНЯК Міхаіл Канстанцінавіч, н. у 1907 у в. Старынкі (Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў пажарнікам на заводзе імя Кірава. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.10.1959.

ЖУКОЎСКІ Антон Аляксандравіч, н. у 1907, працаваў слесарам у Рэчыцкай МТС. Арыштаваны 20.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.12.1937 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Бурацка-Мангольскай АССР. Рэабілітаваны 20.4.1955.

ЖУРАЎСКІ Адам Іванавіч, н. у 1888, працаваў кавалём. Арыштаваны 3.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны ла-

гер. Памёр у месцы зняволення 8.5.1938. Рэабілітаваны 21.2.1959.

ЖЫВАЛОВІЧ Мікалай Ціханавіч, н. у 1899 у м. Целеханы Пінскага павета. Жыў у Рэчыцы. Працаваў на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік», а затым прыёмшчыкам на складзе мукі дзяржаўнага млына № 2. Член ВКП(б). З партыі выключаны ў 1937. Арыштаваны 7.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 3.5.1939. Рэабілітаваны 15.5.1958.

ЖЫГЛАЙЦІС Віктар Іванавіч, н. у 1895 у Літве. Жыў у Рэчыцы, працаваў машыністам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 10.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 14.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937. Рэабілітаваны 29.4.1958.

ЗАВАЛА Антон Антонавіч, н. у 1910 у в. Старынка (Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў грузчыкам на ст. Рэчыца. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР да 29.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 10.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.6.1989.

ЗАРЭЦКІ Хайм Абрамавіч, н. у 1909. Авіямеханік знішчальнай эскадрыллі (г. Котлы Ленінградскай вобл.). Арыштаваны ў 1938. Па пастанове ваеннага трыбунала Балтыйскага флоту ад 22.8.1938 пазбаўлены вайсковага звання і зняволены на 6 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 3 гады. Памёр у месцы зняволення 8.1.1942. Рэабілітаваны 19.4.1967.

ЗВЯРЖАНСКІ Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1895 у с. Добры Кут (Украіна). Жыў у Рэчыцы, працаваў учотчыкам на дубільным заводзе імя Варашылава. Арыштаваны 28.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 18.2.1958.

ЗВЯРЖАНСКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1888 у в. Добры Кут (Украіна). Жыў у Рэчыцы, працаваў на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік» (рабочы, начальнік цэха, начальнік вытворчасці). Арыштаваны ў студзені 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 20.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 9.7.1957.

ЗЕЛЬЧОНАК Рыва Залманаўна, н. у 1909 у м. Уваравічы (Буда-Кашалёўскі р-н). Жыла ў Рэчыцы. Арыштавана ў 1926. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 26.2.1926 асуджана да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Пакаранне адбывала ў г. Какчэтаве. Вызвалена ў 1928. Рэабілітавана 18.3.1993.

ЗІСМАН Рыгор Лейбавіч, н. у 1918 у г. Сядлец Люблінскага ваяводства (Польшча). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 10.2.1940. Па пастанове НКУС СССР ад 20.6.1940 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЗПАЛКОЎСКІ Браніслаў Мікалаевіч, н. у 1891, працаваў машыністам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 17.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 3.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.11.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 12.8.1989.

І. І. Звяржанскі

ЗУБРЫЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1896. Жыў у Гомелі. Інжынер-механік. Часова не працаваў. Арыштаваны 16.5.1937. Па пастанове Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 21.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1937. Рэабілітаваны 13.5.1958.

ЗУБРЫЦКІ Павел Рыгоравіч, н. у 1872, працаваў касірам у будаўнічай канторы. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.11.1959.

ІГНАЦЕНКА Сямён Мікалаевіч, н. у 1879 у Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 4.5.1939. Рэабілітаваны 10.11.1958.

КАВАЛЕЎСКІ Антон Якаўлевіч, н. у 1896, працаваў слесарам-мантажнікам на лесапільным заводзе імя Кірава. Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 14.7.1958.

КАВАЛЕЎСКІ Іван Вікенцьевіч, н. у 1887 у Польшчы. Жыў у Рэчыцы, працаваў настаўнікам. Арыштаваны ў студзені 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938. Рэабілітаваны 21.4.1958.

КАВАЛЁЎ Мікіта Савельевіч, н. у 1874 у в. Урыцкае (Гомельскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром па найму. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 12.12.1958.

КАЗЛОЎСКІ Казімір Антонавіч, н. у 1902, працаваў слесарам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 26.8.1938. Па

пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Рэабілітаваны 30.12.1956.

КАЗЛОЎСКІ Франц Антонавіч, н. у 1906, працаваў рабочым на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 24.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення ў 1939. Рэабілітаваны 30.12.1956.

КАЗЛОЎСКІ Цярэнцій Мікалаевіч, н. у 1889, працаваў бракёрам на фабрыцы. Арыштаваны 17.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 4.5.1933 пазбаўлены права пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны ў маі 1960.

КАЗУБОЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1901 у в. Паршэвічы Пінскага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў конюхам на лесапільным заводзе імя Кірава. Член ВКП(б). Арыштаваны ў 1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.2.1938. Рэабілітаваны 31.1.1964.

КАЛАМЕЕЦ Яўгенія Мікалаеўна, н. у 1905. Жыла ў Гомелі. Арыштавана 6.9.1940. Па пастанове Гомельскага абласнога суда ад 26.10.1940 зняволена на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 2 гады. 8.8.1942 тэрмін зняволення зніжаны да 1 года 8 месяцаў. Рэабілітавана ў 1991.

КАЛЮЦІЧ Пелагея Піліпаўна, н. у 1906 у в. Сімановічы Гродненскай губерні. Жыла ў Рэчыцы, працавала рабочай на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Член ВКП(б). Арыштавана 24.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляна 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітавана 26.7.1989.

КАЛЯДЗІЧ Мікалай Восіпавіч, н. у 1917. Рад. 221 сп. Арыштаваны 30.5.1941. Па пастанове ваеннага трыбунала Ленінградскай ВА зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 16.2.1960.

КАНЯ Браніслаў Іосіфавіч, н. у 1898 у Люблінскім ваяводстве (Польшча). Жыў у Рэчыцы, працаваў начальнікам цэха біржы сыравіны на заводзе імя Кірава. Член ВКП(б). Арыштаваны 28.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 3.4.1961.

КАПЧЫНСКІ Уладзімір Генрыхавіч, н. у 1910 у м. Гарадніца Кіеўскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў чорнарабочым на дубільным заводзе імя Варашылава. Арыштаваны 29.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны.

КАРАТКЕВІЧ Пётр Яфімавіч, н. у 1882. Жыў у в. Гарноўка. Арыштаваны 13.6.1920. Па пастанове асобага аддзела Паўднёва-Мазырскай групы Заходняга фронту прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 6.8.1992.

Дз. С. Кацура

КАРЗЮК Піліп Францавіч, н. у 1889 на Міншчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў загадчыкам хлебапякарні. Арыштаваны 6.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 28.2.1962.

КАРПЕНКА Пётр Пятровіч, н. у 1908 у в. Салтоў (Валгаградская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў механікам у 37 сд. Арыштаваны 7.10.1937. Вызвалены з Гомельскай турмы без суда ў красавіку 1939. Рэабілітаваны 11.3.1969.

КАСАТЫ Сцяпан Гаўрылавіч, н. у 1899 у в. Касацце Віленскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым па распілоўцы драўніны на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 28.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 18.2.1958.

КАСЦЮК Ілья Пятровіч, н. у 1897 у в. Лукавіцы Слуцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў бухгалтарам на электрастанцыі. Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 11.9.1962.

КАСЦЮК Трафім Андрэевіч, н. у 1895 у в. Кольна (Жыткавіцкі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром у будаўнічай канторы. Арыштаваны 9.12.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 8.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.6.1989.

КАХАНОЎСКІ Васіль Пятровіч, н. у 1910. Жыў у в. Астравы Лоеўскага р-на, працаваў дырэктарам школы. Як пазначана ў судовай справе: сын былога памешчыка. Арыштаваны ў 1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 8.5.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 18.10.1938. Рэабілітаваны 31.12.1960.

КАЦУРА Дзяніс Сцяпанавіч, н. у 1886, працаваў на фанерным заводзе № 19. Член ВКП(б). Арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.4.1958.

КАЦУРА Цярэнцій Карнеевіч, н. у 1890 у в. Бярвенаўка (Буда-Кашалёўскі р-н). Жыў у Рэ-

чыцы, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 3.5.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1933 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1941. Рэабілітаваны 27.9.1957.

КАЧАНОЎСКІ Адольф Рышардавіч, н. у 1908 на Мазыршчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 24.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 28.8.1958.

КЕДРАЎ Рыгор Іванавіч, н. у 1891. Жыў у Казахстане, працаваў загадчыкам прамкамбіната ў г. Карагандзе. Арыштаваны 7.11.1938. Па пастанове ваеннага трыбунала Беларускай асобай ВА ад 8.10.1939 зняволены на 15 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 23.7.1955.

КЕНДЫШ Адам Пракопавіч, н. у 1883 на Міншчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў настаўнікам. Арыштаваны ў студзені 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938. Рэабілітаваны 21.4.1958.

КЛАДКЕВІЧ Рыгор Данілавіч, н. у 1878 у в. Ручаёўка (Лоеўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў вартаўніком на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 5.3.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 14.3.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 27.4.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 3.10.1989.

КЛІМАШЭЎСКІ Казімір Антонавіч, н. у 1901 у Вільні (Літва). Жыў у Рэчыцы, працаваў рахункаводам на дубільным заводзе імя Варашылава. Арыштаваны 10.2.1940. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 20.6.1940 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 12.7.1989.

КОЗЕЛ Аляксандр Іванавіч, н. у 1893, працаваў рабочым у гаражы леспрамгаса. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 26.6.1989.

КОЗЕЛ Дзяніс Кірылавіч, н. у 1882, працаваў цыркуляршчыкам на заводзе імя Томскага. Арыштаваны 7.5.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.6.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення датэрмінова. Арыштаваны зноў 19.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Мардовіі. Вызвалены з месца зняволення 14.11.1942. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КОЗЕЛ Ілья Рыгоравіч, н. у 1880, працаваў рабочым у Рэчыцкім райздраве. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КОТЛАЎ Ігнат Адамавіч, н. у 1872 у г. Барысаве. Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 17.2.1934. Па пастанове АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.10.1956.

КОЎНАЦКІ Адам Іосіфавіч, н. у 1880 у с. Пышны Бор Валынскай губерні (Украіна). Жыў у Рэчыцы. Працаваў рабочым на лесапільным заводзе імя Кірава. Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 24.12.1957.

КОШМАН Іван Міхайлавіч, н. у 1911 на Тураўшчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 27.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 7.8.1989.

КРАЎЧАНКА Пётр Сцяпанавіч, н. у 1895 у в. Каўпень (Лоеўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў дарожным майстрам. Арыштаваны 4.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.5.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 19.9.1960.

КРАЎЧЭНЯ Мікіта Адамавіч, н. у 1894 у в. Адамаўшчына Навагрудскага павета (Гродзенская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Член ВКП(б). Арыштаваны 18.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 11.1.1961.

КРЫЦКІ Апанас Фёдаравіч, н. у 1872 у Мазыры. Жыў у Рэчыцы, працаваў фельчарам венералагічнага дыспансера. Арыштаваны 10.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.7.1989.

КРЭПСКІ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1895 у в. Крывела (Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў кучарам-конюхам на плодавінзаводзе. Арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове НКУС і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.12.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.7.1959.

КРЭЧАТАЎ Мікалай Васільевіч, н. у 1907, працаваў шафёрам у леспрамгасе. Арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 24.6.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 21.4.1958.

КУЗНЯЦОЎ Васіль Андрэевіч, н. у 1893 у в. Амулька Дзвінскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 7.7.1958.

КУЛІНІЧ Валянцін Сцяпанавіч, н. 16.2.1899. Жыў у Гомелі, працаваў галоўным бухгалтарам Гомельскага ваенторга. Арыштаваны 10.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 18.10.1989.

КУНІЦКІ Станіслаў Андрэевіч, н. у

1918 у в. Карачуны (Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым у транспартнай канторы. Арыштаваны 26.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 22.6.1989.

КУНЧЫК Канстанцін Іванавіч, н. у 1898 у в. Малыя Канюшыны Віленскай губерні. Жыў у Рэчыцы. Працаваў шафёрам у Рэчыцкім леспрамгасе. Арыштаваны 26.1.1938. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 24.4.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.6.1938. Рэабілітаваны 29.9.1959.

КУРЫЛОВІЧ Канстанцін Восіпавіч, н. у 1896 у в. Свяціца Мінскага павета. Жыў у Рэчыцы. Працаваў слесарам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ЛАПАТКІН Фама Іванавіч, н. у 1902 у Баранавіцкім павеце. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым гаркамунаддзела. Арыштаваны 27.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 25.7.1989.

ЛАПЦЕЎ Аляксей Васільевіч, н. у 1899 у в. Ланава Маскоўскай вобл. Жыў у Рэчыцы. Працаваў дырэктарам дубільнага завода імя Варашылава. Член ВКП(б). Арыштаваны 16.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 29.6.1938 зняволены на 15 гадоў у папраўча-працоўны лагер з канфіскацыяй маёмасці. Загінуў у месцы зняволення. Рэабілітаваны 9.7.1957.

ЛАТОЦКІ Яўстрат Міхайлавіч, н. у 1872 у в. Дубянец Мінскай вобл. Жыў у Рэчыцы, служыў святаром рэчыцкай Мікалаеўскай царквы. Арыштаваны 26.8.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 27.9.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір. Тэрмін высылкі не ўказаны. Рэабілітаваны 29.11.1989.

ЛЕВІНСОН Бер Хаймавіч, н. у 1879. Бундавец. Арыштаваны 1.10.1922. 28.10.1922 асуджаны на 2 гады высылкі ў Арэнбургскі край. Рэабілітаваны 7.6.1993.

МАЙБАРАДА Васіль Арцёмавіч, н. у 1895 у г. Чаркасы (Украіна). Жыў у Рэчыцы, працаваў токарам на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 28.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 6.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.12.1937. Рэабілітаваны 2.11.1965.

МАЙБАРАДА Сцяпан Арцёмавіч, н. у 1875 у г. Чаркасы (Украіна). Жыў у Рэчыцы, працаваў механікам трэста «БЕЛКМО». Арыштаваны 28.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 7.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.7.1989.

МАЙЗІКАЎ Даміан Прохаравіч, н. у 1896 у в. Хізава (Хізаў) (Кармянскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў юрыстам. Арыштаваны 1.10.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 23.11.1929 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 6.1.1993.

МАЛАНЧЫК Харытон Фёдаравіч, н. у 1895, працаваў слесарам-электраманцёрам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 17.2.1934. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Працаваў слесарам-манцёрам на заводзе «Інтэрнацыянал». Зноў арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Па прысуду 1934 г. рэабілітаваны 20.10.1956, па прысуду 1938 г. — 21.4.1958.

МАРКОВІЧ Мартын Майсеевіч, н. у 1879 у в. Туміловічы Барысаўскага павета (Мінская вобл). Жыў у Рэчыцы, працаваў рахункаводам на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 3.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 31.8.1989.

МАСАЛЬСКІ Рыгор Мікітавіч, н. 10.1.1874 у Ветцы. Жыў у Рэчыцы, меў майстэрню, у якой выраблялі дзіцячыя цацкі. Арыштаваны 24.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 3.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 9.6.1989.

МАЧАДЛІНСКІ Бэрль Лейбавіч, н. у 1915 у Польшчы. Жыў у Рэчыцы, працаваў грузчыкам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 12.8.1940. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС БССР ад 9.1.1941 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 1.8.1989.

МАЧУЛЬСКІ Іосіф Баляслававіч, н. у 1892 у Лоеўскай воласці Рэчыцкага павета. Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 2.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.3.1938. Рэабілітаваны 8.1.1961.

МЕЛАМЕД Майсей Барысавіч, н. у 1882 у Мазыры. Жыў у Рэчыцы. Працаваў галоўным механікам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 2.1.1934. Па пастанове калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 1.6.1940. Рэабілітаваны 20.10.1956.

МЕЛЬНІКАЎ Савелій Мінавіч, н. у 1894 у Даманавіцкай воласці. Жыў у Рэчыцы, працаваў на цвікавым заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 14.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 26.8.1989.

МІЛЯНЕЦ (МІЦЯНЕЦ) Дзмітрый Маркавіч, н. у 1902 у Пяцігорску. Жыў у Рэчыцы. Працаваў на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 10.2.1940. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 20.6.1940 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Карэліі. Рэабілітаваны 3.8.1989.

МІСЮК (МІСЮН) Фелікс Канстанцінавіч, н. у 1893 у Вільні. Жыў у Рэчыцы, працаваў загадчыкам майстэрні па пашыву ботаў. Арыштаваны 2.8.1937. Памёр у турме ў г. Гомелі ў 1938, не дачакаўшыся прыгавору. Рэабілітаваны 7.4.1958.

МНІХІН (МНУХІН) Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1884 у Бабруйску. Жыў у Рэчыцы, працаваў бухгалтарам аб'яднання «Белхарчпрамгандаль». Арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.9.1938. Рэабілітаваны 21.4.1958.

МУРАШКА Аляксандр Фядосавіч, н. у 1891. Арыштаваны 6.12.1934. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 17.5.1935 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Памёр у месцы зняволення 16.6.1939. Рэабілітаваны 7.10.1964.

МУРАШКА Іоў Цярэнцьевіч, н. у 1878, працаваў на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 3.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.1.1989.

МЫСЛІЦКІ Міхаіл Феліксавіч, н. у 1905 на Міншчыне. Камандзір узвода 3 сп 37 сд, якая дыслацыравалася ў Рэчыцы і раёне. Арыштаваны 15.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938. Рэабілітаваны 28.6.1961.

НАВАКОВІЧ Рыгор Пятровіч, н. у 1884 у Германіі. Жыў у Рэчыцы, працаваў санітарам, вартаўніком на базары. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 10.1.1938. Рэабілітаваны 26.2.1959.

НАВАЦКІ (НАВІЦКІ) Анатоль Іванавіч, н. у 1907 у Гомелі. Жыў у Рэчыцы, працаваў дзесятнікам-будаўніком. Член ВКП(б). Арыштаваны 16.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 31.8.1959.

НАВІЦКІ Іосіф Антонавіч, н. у 1900 у в. Рудня (Лоеўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 20.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938. Рэабілітаваны 21.5.1959.

НАВІЦКІ Іосіф Мартынавіч, н. у 1898 у Варшаўскім ваяводстве (Польшча). Жыў у Рэчыцы, працаваў на дубільным заводзе імя Варашылава. Арыштаваны 29.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 23.9.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 29.4.1958.

НЕВАР Віктар Іванавіч, н. у 1900, працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 24.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.3.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 3.12.1957.

НЕМЯРЗЯЛЛІ Іосіф Фадзеевіч, н. у 1895. Жыў у Ленінградзе, працаваў у ваенна-палітычнай акадэміі. Член ВКП(б). Арыштаваны ў 1937. Па пастанове Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 21.9.1938 прыгавораны да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 22.9.1938 у Ленінградзе. Рэабілітаваны 13.10.1956.

НОВІК Рыгор Іванавіч, н. у 1904, працаваў інжынерам па тэхніцы бяспекі працы на дубільным заводзе імя Варашылава. Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 3.10.1938. Рэабілітаваны 16.1.1989.

НОСКА Дзмітрый Рыгоравіч, н. у 1898, працаваў машыністам сілавой станцыі запалкавай фабрыкі «Вязувій». Арыштаваны 3.1.1934. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1935 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.10.1956.

ПАВЕЛЬСКІ Браніслаў Карлавіч, н. у 1897 у мястэчку Блонаў Варшаўскага ваяводства (Польшча). Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам у леспрамгасе. Арыштаваны 9.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938. Рэабілітаваны 28.8.1959.

ПАГАРЭЛЬЦАЎ Міхаіл Васільевіч, н. у 1897 у м. Злынка (Бранская вобл.). Жыў у Рэчыцы. Працаваў тэхнаруком запалкавай фабрыкі «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 9.1.1934. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.10.1956.

ПАДНЯСЕНСКІ Браніслаў Адамавіч, н. у 1899 у г. Сядлец (Польшча). Жыў у Рэчыцы, працаваў загадчыкам забеспячэння на дубільным заводзе імя Варашылава. Арыштаваны 9.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.2.1938. Рэабілітаваны 5.6.1958.

ПАЗНЯК Аляксандр Лявонавіч, н. у 1901 у в. Каменка (Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў грузчыкам на ст. Рэчыца. Арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.6.1989.

ПАЗНЯК Іван Лявонавіч, н. у 1894 у в. Каменка (Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на цвікавым заводзе «Інтэрнацыянал». У 1932 асуджаны на 3 гады пазбаўлення волі. Зноў арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.6.1989.

ПАКРОЎСКІ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1913, працаваў настаўнікам у Мазырскім р-не. Арыштаваны 14.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.12.1937 у Мазыры. Рэабілітаваны 13.11.1957.

ПАЛІТЫКА Дзмітрый Апанасавіч, н. у 1907 у Добрушы. Жыў у Рэчыцы, працаваў інструктарам райсаюза «Лесдрэў». Арыштаваны

18.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1933 асуджаны за 3 гады пазбаўлення волі ўмоўна і з-пад варты вызвалены. Рэабілітаваны 24.7.1961.

ПАПОЎ Радзівон Фёдаравіч, н. 8.4.1906 у с. Грубно (Бесарабія). Жыў у Рэчыцы, працаваў на цвікавым заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 4.3.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 12.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.11.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАРЭМСКІ Павел Лаўрэнавіч, н. у 1901 у Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў шаўцом ботаў. Арыштаваны 28.3.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАТАПАЎ Аляксандр Антонавіч, н. у 1905. Працаваў сакратаром Рэчыцкага райвыканкама. Арыштаваны 27.8.1936. Па пастанове Асобай нарады НКУС СССР ад 5.10.1936 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Рэабілітаваны 5.7.1989.

ПАТАПАЎ Міхаіл Дзямідавіч, н. у 1873, працаваў на пошце. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 28.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 26.7.1989.

ПАТАПОВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. у 1903 у в. Каўпень (Лоеўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 26.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 28.7.1958.

ПАЎЛЯНОК Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1891 у в. Ямпаль (Свірыдавіцкі с/с). Жыў у Рэчыцы, працаваў бондарам. Арыштаваны 6.7.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ПАЎЧЫНСКІ Уладзімір Уладзіміравіч, н. у 16.1.1895 у г. Жытоміры (Украіна). Жыў у Рэчыцы, працаваў мастаком у клубе фанернага завода № 19. Арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 17.10.1937 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 8.6.1957.

ПАЦЕЕНКА Мікалай Мінавіч, н. у 1881, працаваў цесляром у арцелі «Палескі смалакур». Арыштаваны 19.11.1937. Па пастанове тройкі НКУС БССР ад 2.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 9.6.1989.

ПЕКУН Пімен Васільевіч, н. у 1897 у в. Купяцічы Пінскага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў сартавальшчыкам на лесазаводзе імя Кірава. Арыштаваны 21.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 29.9.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 19.2.1957.

ПЕТРЫК Дзяніс Міхайлавіч, н. у 1897 на Чарнігаўшчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў машыністам на фанерным заводзе № 19. Член ВКП(б). Арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ПІНЕВІЧ Надзея Канстанаўна (Канстанцінаўна), працавала настаўніцай. Арыштавана 25.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляна 26.12.1937. Рэабілітавана 2.6.1958.

ПРАЗЕЦКІ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1877 на Міншчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў вартаўніком на гарадскіх могілках. Арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове НКС СССР і Пракурора СССР ад 6.12.1937 прыгавораны на ВМП. Расстраляны 29.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.6.1989.

ПРАКАПОВІЧ Яфім Кандратавіч, н. у 1889 у в. Брановічы Слуцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў у леспрамгасе. Арыштаваны ў 1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 20.1.1934 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.6.1958.

ПРАНУЗА (ПРАНУЗАЎ) Павел Піліпавіч, н. у 1899 у в. Барвенаўка (Буда-Кашалёўскі р-н). Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 18.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1933 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Сібіры. Рэабілітаваны 27.9.1957.

ПЯТРОВА-САЙНТПАУЛЬ Ганна Карлаўна, н. у 1906 у Вільні. Немка. Жыла ў Рэчыцы. Арыштавана 7.10.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляна 29.12.1937 у Гомелі. Рэабілітавана 21.6.1989.

ПЯТРОЎ Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1908 у в. Свіная Гара (Карэлія). Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 7.10.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 26.2.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны пастановай ваеннага пракурора ЧБВА ад 21.6.1989.

РАГІНСКІ Барыс Натанавіч, н. у 1888, член ВКП(б), працаваў хімікам на запалкавай фабрыцы. Арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 21.7.1958.

РАГІНСКІ Мордух Гіршавіч, н. у 1888, працаваў кіраўніком Рэчыцкага таварыства ўзаемнага крэдыту. Арыштаваны 21.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 10.5.1930 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 11.12.1989.

РАЛЬГАУЗЕР (РАГАЛЬГАУЗЕР) Іосіф Адамавіч, н. у Паволжы. Немец. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на дубільным заводзе імя Варашылава. Арыштаваны 28.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 3.11.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Краснаярскім краі. Вызвалены з месца зняволення ў 1948. Рэабілітаваны 1.10.1957.

РАМАНОЎСКІ Станіслаў Мацвеевіч, н. у 1893 у Літве. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 24.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 26.2.1959.

РАФАЛЬСКІ Уладзімір Вайцехавіч, н. у 1899 у в. Дзямідава Нараўлянскай воласці Рэчыцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў у канторы сувязі. Арыштаваны 17.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 15.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.11.1938. Рэабілітаваны 26.11.1959.

РОЗЕНБЛЮМ Пейсах Іоселевіч, н. у 1923 у Польшчы. Жыў у Рэчыцы. На дубільным заводзе імя Варашылава вучыўся на электраманцёра. Арыштаваны 24.7.1940. Па пастанове Асобай нарады НКУС СССР ад 30.12.1940 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення 12.8.1941. Рэабілітаваны 10.7.1989.

РУЖЫЦКІ Вікенцій Антонавіч, н. у 1876, працаваў вартаўніком на ст. Рэчыца. Арыштаваны 9.5.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 14.7.1932 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 11.12.1989.

РУСАК Канстанцін Маркавіч, н. у 1889 у в. Чанавіцы Слуцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў настаўнікам. Арыштаваны ў студзені 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938. Рэабілітаваны 9.7.1957.

РЫДЗЕЎСКІ (РЫДЗІЕЎСКІ) Станіслаў Ігнатавіч, н. у 1909. Арыштаваны 7.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 1.4.1958.

РЫДЗЕЎСКІ (РЫДЗІЕЎСКІ) Уладзімір Антонавіч, н. у 1892, працаваў садоўнікам у гархарчпрамгандлі. Арыштаваны 10.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 29.4.1958.

РЫЖАЛОЎСКІ Вікенцій Іванавіч, н. у 1894 у в. Старынкі (Дзяржынскі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў вартаўніком на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 5.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 31.7.1989.

РЫК Барыс Апанасавіч, н. у 1874 у м. Баркулабава Магілёўскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў тэхнаруком на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Як пазначана ў судовай справе: з сям'і заводчыкаў. Арыштаваны 8.11.1933. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1934 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 20.10.1956.

РЭУТ Аляксей Васільевіч, н. у 1903 у в. Зімовая Буда (Петрыкаўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў грузчыкам на ст. Рэчыца. У 1933 асуджаны на 3 гады высылкі, але без дазволу ўладаў вярнуўся дамоў. Зноў арыштаваны 14.12.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў на ст. Сухабязводная Горкаўскай вобл. Вызвалены з месца зняволення ў 1946. Рэабілітаваны 13.2.1967.

САВІЦКІ Антон Іванавіч, н. у 1901 у Польшчы. Жыў у Рэчыцы, працаваў майстрам на хлебазаводзе. Член ВКП(б) з 1927 па 1932. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 20.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 1.6.1959.

САВІЦКІ Аркадзь Міхайлавіч, н. у 1896 у в. Радзівонікі Віленскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў настаўнікам у Рэчыцкай сямігодцы. Арыштаваны 29.11.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ БССР ад 26.12.1930 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.1.1989.

САВЯНОК Мікалай Максімавіч, н. у 1885 у в. Вязок (Брагінскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў на чыгунцы. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 13.3.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 11.9.1958.

САЛАВЕЙ Фёдар Антонавіч, н. у 1913 у в. Прошаны Слуцкага павета (Мінская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам мукамольнага завода. Арыштаваны 2.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 1.10.1957.

САЛАНЕЦ Даніла Іванавіч, н. у 1895, працаваў цесляром на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 11.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 1.12.1958.

САСНОЎСКІ Пётр Данілавіч, н. у 1908 у Вільні. Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 11.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.11.1938. Рэабілітаваны 21.5.1959.

САСНОЎСКІ Станіслаў Данілавіч, н. у 1893 у Вільні. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 6.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937. Рэабілітаваны 2.6.1958.

СВЕТАГОР Аляксей Іванавіч, н. у 1897 у Рэчыцкім павеце. Жыў у Рэчыцы, працаваў у леспрамгасе. Арыштаваны 6.7.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.11.1938. Рэабілітаваны 21.6.1989.

СЕЛІВОНЕЦ (СІЛІВОНЕЦ) Рыгор Васільевіч, н. у 1888 у в. Рог (Петрыкаўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром па найму. Арыштаваны 2.11.1937. Па пастанове тройкі НКУС СССР ад 28.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 24.12.1937 у Мазыры. Рэабілітаваны 10.11.1956.

СІДАРАЎ Васіль Георгіевіч, н. 4.3.1891 у

в. Яндноўка (Маскоўская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў галоўным бухгалтарам Рэчыцкага аддзялення «Белваенгандаль». Арыштаваны 14.10.1937. Па пастанове Вярхоўнага суда БССР ад 29.3.1938 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Пакаранне адбываў на ст. Юрга Кемераўскай вобл. Вызвалены з месца зняволення ў 1944. Рэабілітаваны 11.12.1957.

СКАЛЬСКІ Браніслаў Карлавіч, н. у 1889 (Сквірскі р-н Кіеўскай вобл.). Чэх. Жыў у Рэчыцы, працаваў майстрам па кандытарскіх лініях Рэчыцкага хлебазавода. Арыштаваны 7.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны.

СКАРАЦЕЦКІ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1898 у мястэчку Хойнікі Рэчыцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 17.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.11.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 4.3.1942. Рэабілітаваны 28.7.1958.

СКАРУБСКІ Павел Уладзіміравіч, н. у 1885 у в. Івольск (Буда-Кашалёўскі р-н). Жыў у Рэчыцы. Служыў святаром. Арыштаваны 28.4.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 20.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.9.1938. Рэабілітаваны 18.9.1989.

СКОБЛАЎ (СКОБЛЕЎ) Аляксей Антонавіч, н. у 1890, працаваў механікам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 18.3.1958.

СЛАВУЦІН Майсей Яфімавіч, н. у 1903 у Гомелі. Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 2.4.1941. Па пастанове Судовай калегіі па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда ад 21.4.1941 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 4 гады. Пакаранне адбываў у Архангельскай вобл. Памёр у месцы зняволення 3.3.1942. Рэабілітаваны 8.8.1990.

СЛОНІМСКІ Піліп Іванавіч, н. у 1886 у в. Габруны Слуцкага павета (Мінская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў загадчыкам гаспадаркі ў дзіцячым садзе № 3. Арыштаваны 6.12.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 14.3.1938. Рэабілітаваны 2.6.1958.

СЛОНІМСКІ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1900 у в. Габруны Слуцкага павета (Мінская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 17.9.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.11.1938. Рэабілітаваны 5.11.1959.

СНЕГУРОЎ Іван Рыгоравіч, н. у 1904, працаваў рабочым у арцелі інвалідаў. Член ВКП(б). Як пазначана ў судовай справе, сын афіцэра. Арыштаваны 10.6.1938. Па пастанове ваеннага трыбунала № 433 ад 11.6.1938 зняволены на 25 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. 3.11.1938 пакаранне зменена на 5 гадоў зняволення і наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 2 гады. Памёр у месцы зняволення ў студзені 1942. Рэабілітаваны 25.4.1973.

СТАРЫКАЎ Ермалай Андрыянавіч, н. у 1891 у м. Радуль Чарнігаўскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «Дняпро». Арыштаваны 27.11.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 26.12.1980 асуджаны да высылкі ў Сібір без сям'і. Вызвалены 1.11.1933. Рэабілітаваны 27.7.1989.

СТАШУК Платон Мацвеевіч, н. у 1898, працаваў машыністам сілавой станцыі на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 3.1.1934. Па пастанове АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.10.1956.

СТРАКОЎСКІ Мікалай Іпалітавіч, н. у 1875 у в. Крывічы (Мінскі р-н). Жыў у Рэчыцы. Святар Мікалаеўскай царквы. Арыштаваны 24.8.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 27.9.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 22.11.1989.

СУХІНА Піліп Аляксандравіч, н. 25.1.1893 у с. Азярышча Кіеўскай губерні. Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны ў 1937. Па пастанове Судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР ад 23.12.1937 зняволены на 6 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 18.1.1990.

СЦЕПАНЕНКА Даніла Рыгоравіч, н. у 1877 у в. Вялікія Шчарбінічы (Навазыбкаўскі р-н Бранскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў кантралёрам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 17.2.1934. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.10.1956.

СЦЯПАНАЎ Пётр Зіноўевіч, н. у 1898 у в. Касцюкі Рэчыцкага павета. Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 9.12.1945. Рэабілітаваны 7.7.1958.

СЫДЬКО Аляксандр Мацвеевіч, н. у 1915 у в. Зацішша (Магілёўская вобл.). Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 16.5.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 28.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.12.1937 ў Мінску. Рэабілітаваны 4.12.1989.

СЫДЬКО Аляксандра Сямёнаўна, н. у 1896 у в. Зацішша (Магілёўская вобл.). Жыла ў Рэчыцы. Арыштавана ў 1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 28.11.1937 прыгаворана да ВМП. Расстраляна 15.12.1937 у Мінску. Рэабілітавана 4.12.1989.

ТАБУЛІН Іван Антонавіч, н. у 1880. Жыў у Васілевічах, працаваў памочнікам начальніка

ст. Васілевічы. Арыштаваны 24.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 4.5.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 26.5.1960.

ТАМАШУК Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1901 у в. Трасцяная Гродзенскай губерні. Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам на лесазаводзе імя Кірава. Арыштаваны 21.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў на ст. Сухабязводная Горкаўскай вобл. Рэабілітаваны 2.6.1958.

ТАПЕЦ (ТОПЕЦ) Браніслаў Мацвеевіч, н. у 1897 у Латвіі. Жыў у Рэчыцы, працаваў майстрам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны пастановай ваеннага трыбунала ЧБВА ад 7.7.1958.

ТАРЛЕЦКІ Віктар Сільвестравіч, н. у 1897 у в. Антопаль (Адэская вобл.). Жыў у Рэчыцы. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 14.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 7.8.1989.

ТВАРДОЎСКІ Іосіф Іосіфавіч, н. у 1891. Працаваў электраманцёрам у арцелі. Арыштаваны 4.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 14.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 22.10.1957.

ТРАДЗІНСКІ Іосіф Іосіфавіч, н. у 1895. Жыў у мястэчку Уваравічы (Буда-Кашалёўскі р-н), працаваў майстрам у мясцовай хлебапякарні. Арыштаваны ў 1938. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 25.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.7.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 11.9.1989.

ТРАДЗІНСКІ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1890. Жыў у Гомельскім р-не, працаваў пекарам у доме адпачынку «Клёнкі». Арыштаваны 23.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 22.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.11.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 17.4.1964.

ТРУБІН Мікалай Іванавіч, н. у 1883 у г. Ліўны (Арлоўская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на пароме. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 9.1.1962.

ТРЫФАНАЎ Фёдар Сямёнавіч, н. 6.5.1896 у в. Целяшы (Гомельскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў статыстыкам у дарожна-будаўнічым управленні. Арыштаваны 20.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Магадане. Рэабілітаваны 29.11.1956.

ТУРАВЕЦ Яўстафій Фаміч, н. у 1890 у в. Ляскавічы (Петрыкаўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым у бальніцы. Арыштаваны 1.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 14.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 7.8.1989.

ТУРОЎСКІ Фабіян Антонавіч, н. у 1891 на х. Жарабецкі (Украіна). Жыў у Рэчыцы, працаваў экспартнікам па драўніне у Рэчыцкім лясгасе. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.9.1957.

ТЫЧКОЎ Барыс Ільіч, н. у 1885 у в. Сіні Калодзеж (Навазыбкаўскі р-н Бранскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны ў 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.7.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 21.4.1958.

УРБАНОВІЧ Сцяпан Францавіч, н. у 1894. Працаваў бухгалтарам на хлебазаводзе. Арыштаваны 16.7.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 2.8.1956.

УСХОПАЎ Іван Дзямідавіч, н. у 1887. Жыў у Хойніках, працаваў галоўным бухгалтарам у мясцовым леспрамгасе. Арыштаваны 3.3.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 10.5.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 21.6.1938 у Мазыры. Рэабілітаваны 4.12.1957.

УСХОПАЎ Фёдар Паўлавіч, н. у 1911 на х. Астраўкі Падалесскага с/с. Жыў у Рэчыцы, працаваў кавалём на ваенным будаўніцтве. Арыштаваны 22.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 11.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 24.7.1961.

ФІЛОНАЎ Ігнат Восіпавіч, н. у снежні 1876. Арыштаваны 5.3.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 14.3.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 2.4.1938. Рэабілітаваны 15.1.1958.

ФРЭЙНБЕРГ Антон Мартынавіч, н. у 1909 у с. Сумарокава (Яраслаўская вобл.). Жыў у Рэчыцы. Латыш. Працаваў грузчыкам на прыстані. Арыштаваны 26.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 12.11.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 19.8.1944. Рэабілітаваны 7.5.1958.

ФРЭЙНБЕРГ Эдуард Мартынавіч, н. у 1905 у с. Сумарокава (Яраслаўская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў шафёрам у пажарнай камандзе. Арыштаваны 10.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 29.4.1958.

ФЯСЬКОЎ Фёдар Андрэевіч, н. у 1781. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ХАЙКІН Іосіф Якаўлевіч, н. у 1903, пра-

цаваў рабочым у арцелі «Рассвет». Член ВКП(б). Арыштаваны 24.6.1938. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 9.2.1940 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.2.1960.

ХАЙТОВІЧ Мацвей Іотіч, н. у 1897. Жыў у Гомелі, працаваў інструктарам па кадрах аб'яднання «Швейпрамсаюз». Арыштаваны 12.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у г. Улан-Удэ (2-ое аддзяленне 11-ай калоны). Рэабілітаваны 26.6.1989.

ХАЛЯЎКІН Арцём Рыгоравіч, н. у 1895 у в. Уборкі (Лоеўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам-матарыстам у Рэчыцкай МТС. Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 21.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.9.1938. Рэабілітаваны 29.5.1958.

ХАМЯНОК Аляксей Іванавіч, н. у 1862. Жыў у Гомелі, працаваў галоўным кандуктарам Гомельскага рэзерву рэспубліканскай чыгункі. Арыштаваны 23.9.1928. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 5.4.1929 асуджаны на 1 год пазбаўлення волі ўмоўна. З-пад варты вызвалены. Рэабілітаваны 31.8.1989.

ХАМЯНОК Васіль Кузьміч. Працаваў возчыкам у арцелі «Чырвоны транспартнік». Арыштаваны 5.1.1941. Па пастанове Гомельскага абласнога суда ад 19.1.1941 зняволены на 4 гады ў папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 2 гады. Рэабілітаваны 8.8.1990.

ХВАЙНІЦКІ Хонан Цалевіч, н. у 1895. Жыў у мястэчку Хальч (Веткаўскі р-н). Арыштаваны 3.9.1937. Па пастанове ваеннага трыбунала пагранічнай і ўнутранай аховы БССР ад 16.4.1938 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 23.1.1958.

ХРАПАВІЦКІ Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1906 у Вільні. Жыў у Рэчыцы, працаваў загадчыкам клуба на чыгунцы. Член ВКП(б). Арыштаваны 22.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 17.11.1937. Рэабілітаваны 31.3.1966.

ЦІШКЕВІЧ (ТЫШКЕВІЧ) Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1898, працаваў старшым электраманцёрам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 17.2.1934. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 20.10.1956.

ЦІШКЕВІЧ (ТЫШКЕВІЧ) Іван Іосіфавіч, н. у 1896. Жыў у Новабеліцы. Арыштаваны ў лістападзе 1933. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Працаваў вартаўніком у рамесным вучылішчы № 1 (г. Гомель). Зноў арыштаваны 10.7.1950. Па пастанове Асобай нарады пры МДБ СССР ад 25.10.1950 высланы на пасяленне ў Краснаярскі край. Тэрмін высылкі не ўказан. Па прысуду 1934 г. рэабілітаваны 20.10.1956, па прысуду 1950 г.— 16.1.1989.

ЧУДНОЎСКАЯ Таццяна Пятроўна, н. у 1884. Арыштавана ў 1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораана да ВМП. Расстраляна 15.2.1938 у Мінску. Рэабілітавана 20.11.1989.

ЧУМАК Кузьма Цімафеевіч, н. у 1897 у мястэчку Кайнова (Мінская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў старшынёй рэчыцкага аддзялення Белваенгандлю. Арыштаваны 11.9.1937. Па пастанове ваеннага трыбунала БВА ад 15.5.1937 зняволены на 6 гадоў у папраўча-працоўны лагер. 11.11.1939 пакаранне зніжана да 2 месяцаў і Чумак К. Ц. быў вызвалены з-пад варты. Рэабілітаваны 17.4.1992.

ЧЫЖЫК Аляксандр Іванавіч. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 20.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Карагандзе (Казахстан). Рэабілітаваны 9.6.1989.

ЧЫЖЫК Майсей Восіпавіч, н. у 1895. Працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 12.5.1960.

ЧЫЖЫК Рыгор Карпавіч, н. у 1884, працаваў сартавальшчыкам на лесапільным заводзе імя Томскага. Арыштаваны 7.5.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 7.6.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у пас. Явас (Мардовія). Пасля адбыцця пакарання вярнуўся дамоў. Працаваў рабочым на заводзе імя Кірава. Зноў арыштаваны 18.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Памёр у месцы зняволення 25.7.1942. Па прысуду 1933 г. рэабілітаваны 16.1.1989, па прысуду 1937 г.— 17.10.1958.

ЧЫЖЫК Якаў Міхайлавіч, н. у 1890. Працаваў электраманцёрам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 9.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1947. Рэабілітаваны 13.8.1957.

ЧЭПЧЫЦ Трафім Якаўлевіч, н. у 1891 у Польшчы. Жыў у Рэчыцы, працаваў конюхам на ваенна-будаўнічай пляцоўцы. Арыштаваны 21.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 22.11.1938 у Мазыры. Рэабілітаваны 18.7.1989.

Ч... Мікалай Мікалаевіч, н. у 1895. Працаваў на плодаагароднінной базе. Член ВКП(б). Арыштаваны 24.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 17.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 21.1.1958.

ШАЛЕЙКА (ШЫЛЕЙКА) Фелікс Антонавіч, н. у 1905. Жыў у Калінкавічах. Камандзір узвода 109 сп. Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове НКУС СССР ад 5.8.1939 зняволены на 3 гады

ў папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення 21.7.1942. Рэабілітаваны 27.8.1957.

ШАНДЗЕЦКІ Казімір Емяльянавіч, н. у 1900 у Гомелі. Жыў у Рэчыцы, працаваў на лесазаводзе. Арыштаваны 21.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ШПАКОЎСКІ Антон Іванавіч, н. у 1895 (Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў маляром. Арыштаваны 22.2.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 10.10.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 31.1.1962.

ШПАКОЎСКІ Антон Казіміравіч, н. у 16.6.1893 на Віцебшчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў бухгалтарам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 25.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 22.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 29.4.1958.

ШОСТАК (ШАСТАК) Аляксандр Браніслававіч, н. у 1902 у Гомелі. Жыў у Рэчыцы, працаваў майстрам каўбаснага цэха. Арыштаваны 29.1.1938. Па пастанове ваеннага трыбунала БВА ад 4.7.1938 зняволены на 15 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў (з канфіскацыяй маёмасці). Вызвалены з месца зняволення ў 1953. Рэабілітаваны 2.6.1959.

ШОСТАК Георгій Браніслававіч, н. у 1899. Жыў у м. Нароўля, працаваў загадчыкам базы спажывецкага таварыства. Арыштаваны 9.2.1938. Па пастанове ваеннага трыбунала БВА ад 4.7.1938 зняволены на 12 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 2.6.1959.

ШОСТАК Сяргей Браніслававіч, н. у 1894 у Бабруйску. Жыў у Рэчыцы, працаваў майстрам каўбаснага цэха запалкавай фабрыкі «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 29.1.1938. Па пастанове ваеннага трыбунала БВА ад 4.7.1938 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер з наступным паражэннем у грамадзянскіх правах тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 2.6.1959.

ШРЭЙТУЛЬ Карп (Карл) Адамавіч, н. у 1992 у Латвіі. Жыў у Рэчыцы, працаваў білетным касірам на ст. Рэчыца. Арыштаваны 25.10.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 20.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 28.12.1937. Рэабілітаваны 22.9.1970.

ШТЫХАЎ Васіль Лявонавіч, н. у 1889 у в. Старая Беліца (Гомельскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў настаўнікам. Арыштаваны 18.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Затым пакаранне было заменена на высылку ў Казахстан тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 12.7.1962.

ШУЛЬЖАНОК Іван Фёдаравіч, н. у 1884, працаваў цесляром па дамоўленасці ў аб'яднанні «Белваенгандаль». Арыштаваны 3.11.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.12.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Яраслаўскай вобл. Рэабілітаваны 18.3.1958.

ШУСТАЎ Павел Рыгоравіч, н. у 1895 на Смаленшчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў на фанерным заводзе № 19. Член ВКП(б). Арыштаваны ў студзені 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ШЫЛАК Андрэй Маркавіч, н. у 1898 у Мінску. Жыў у Рэчыцы, працаваў на чыгунцы. Арыштаваны 27.9.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.12.1933 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 8.10.1957.

ЭСТРЫН-ФІШКІН Янкель Львовіч, н. у 1895, працаваў электраманцёрам на фанерным заводзе № 19. Арыштаваны 28.4.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 20.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.9.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 19.10.1976.

ЯКУШКА Антон Пятровіч, н. у 1900 у в. Уборкі (Лоеўскі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў ахоўнікам у арцелі «Кустметал». Арыштаваны 28.6.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 18.1.1966.

ЯЛОЎСКІ Іван Ануфрыевіч, н. у 1883 у в. Вялікія Шчарбінічы (Навазыбкаўскі р-н Бранскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам на запалкавай фабрыцы «10-ы Кастрычнік». Арыштаваны 6.2.1934. Па пастанове Калегіі АГПУ СССР ад 15.3.1934 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Пасля адбыцця пакарання вярнуўся ў Рэчыцу. Працаваў слесарам на цвікавым заводзе «Інтэрнацыянал». Зноў арыштаваны ў студзені 1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 28.5.1938 прыгавораны да ВМП. Па прысуду 1934 г. рэабілітаваны 20.10.1956, па прысуду 1938 г.— 21.4.1958.

ЯНОВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1876 у в. Танежыцы Слуцкай воласці (Мінская вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў цесляром. Арыштаваны 27.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.5.1938 асуджаны да высылкі ў Башкірыю тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 2.12.1963.

ЯПШКА Аляксандр Пятровіч, н. у 1899 у г. Ковелі Валынскай губерні (Украіна). Жыў у Рэчыцы, працаваў слесарам на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 24.8.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 6.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 2.6.1958.

ЯРМОЛЬЧЫК Максім Якаўлевіч, н. у 1895 на Мазыршчыне. Жыў у Рэчыцы, працаваў бракёрам на лесазаводзе. Арыштаваны 9.11.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 28.11.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 29.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 19.11.1968.

ЯРОЦКІ Канстанцін Фролавіч, н. у 1895 у м. Градзешкі Віленскай губерні. Жыў у Рэчыцы,

працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 20.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 26.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 7.7.1958.

ЯСІНСКІ Пётр Мікалаевіч, н. у в. Навасёлкі (Калінкавіцкі р-н). Жыў у Рэчыцы, працаваў намеснікам дырэктара Рэчыцкай НСШ № 1. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 27.11.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1954. Рэабілітаваны 5.9.1955.

ЯЦКЕВІЧ Эдуард Валяр'янавіч, н. у 1913 у в. Падгуб'е (Плешчаніцкі р-н Мінскай вобл.). Жыў у Рэчыцы, працаваў рабочым на заводзе «Інтэрнацыянал». Арыштаваны 17.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 11.10.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.8.1989.

Рэпрэсіраваныя землякі, дакладнае месца нараджэння якіх не ўстаноўлена

АНДРЭЕНКА (АНДРЭЙКА) Майсей Васільевіч, н. у 1904, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.7.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 11.12.1989.

АСТАПЕНКА Сяргей Пятровіч, н. у 1894, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 26.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.6.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.12.1989.

АФАНАСЬЕЎ Даніла Ільіч, н. у 1895, працаваў пажарнікам у аб'яднанні «Заготзбожжа». Арыштаваны 28.3.1937. Па пастанове лінейнага суда Беларускай чыгункі ад 14.1.1938 прыгавораны да ВМП. Пазней расстрэл быў заменены на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 11.11.1964.

АФАНАСЬЕЎ Кірыл Ільіч, н. у 1905, працаваў вартаўніком на вінакурным заводзе. Арыштаваны 28.3.1937. Па пастанове лінейнага суда Беларускай чыгункі ад 14.1.1938 прыгавораны да ВМП. Пазней расстрэл быў заменены на 10 гадоў зняволення ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 11.11.1964.

БЕЛЫ Аляксандр Паўлавіч. Жыў на х. Ляды. Раскулачаны ў пачатку 30-ых гадоў.

БЕРНАТОВІЧ Іосіф Людвігавіч, н. у 1899, жыў у пас. Астраўкі Падалескага с/с, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.12.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.12.1937 прыгавораны да ВМП. Памёр у турме. Рэабілітаваны 26.6.1989.

БОРСУК Ігнат Восіпавіч, н. у 1913, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 26.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.12.1989.

БОРСУК Лявон Міхайлавіч. Быў раскулачаны ў пачатку 1930-ых гадоў.

БОРСУК Філімон Восіпавіч, н. у 1907, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 26.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.12.1989.

БЫКОЎСКІ Фёдар Антонавіч, н. у 1875. Арыштаваны 27.12.1929. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 1.12.1989.

ВАСЬКОЎСКІ Восіп Іванавіч, н. у 1893, працаваў у калгасе. Арыштаваны 15.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 26.9.1960.

ВІШНЕЎСКАЯ Фядора Іванаўна, н. у 1894, працавала ў калгасе. Па пастанове Асобай нарады пры НКУС СССР ад 9.6.1945 была асуджана да высылкі ў Краснаярскі край тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітавана 2.2.1993.

ГАВАРОЎСКІ Аркадзь К., н. у 1896, працаваў у калгасе. Арыштаваны 25.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.2.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Маскоўскай вобл. Вызвалены з месца зняволення 7.7.1937. Рэабілітаваны 13.9.1974.

ГАЛІЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1893, працаваў у калгасе «1-ы Кастрычнік». Арыштаваны 3.5.1937. Па пастанове Вярхоўнага Суда БССР ад 27.8.1937 зняволены на 5 гадоў. Рэабілітаваны 7.2.1990.

ГАЎРЫЛЕНКА Пётр Адамавіч, н. у 1906, працаваў у калгасе. Арыштаваны 26.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.6.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.12.1989.

ГРЫШКАВЕЦ Яўстрат Міканоравіч, н. у 1870, жыў у пас. Зара, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 7.12.1929. Па пастанове Калегіі АГПУ БССР ад 13.1.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 11.12.1989.

ГУЗОЎСКІ Антон Вікенцьевіч, н. у 1890, жыў у в. Сялюцічы Петрыкаўскага р-на, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 18.9.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 30.9.1937 (згодна з іншымі даннымі — 2.10.1937) у г. Мазыры. Рэабілітаваны 21.4.1989.

ДВАРАНІНОВІЧ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1903, працаваў у Рэчыцкім леспрамгасе. Арыштаваны 6.12.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 8.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 15.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 21.6.1989.

ДРАБЫШЭЎСКІ Антон Сцяпанавіч, н. у 1902. Арыштаваны 25.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.11.1974.

ДРАГУН Адам Кірылавіч, н. у 1882, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.3.

1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.6.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1991.

ДРАПЕЗА Павел Восіпавіч, н. у 1890, працаваў рабочым на цвікавым заводзе імя Інтэрнацыянала (г. Рэчыца). Арыштаваны 6.8.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 18.6.1960.

ЖАРЫН Якаў Кузьміч, н. у 1907, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 1.9.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 28.12.1989.

ЖЫЗНЕЎСКІ Станіслаў Пятровіч, н. у 1888, працаваў у калгасе. Арыштаваны 10.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 21.6.1989.

ЗАЙЦАЎ Адам Іванавіч. Быў раскулачаны ў пачатку 1930-ых гадоў.

ЗАЙЦАЎ Фёдар Антонавіч, н. у 1887, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.4.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ЗУБРЫЦКІ Франц Феліксавіч, н. у 1910. Як пазначана ў судовай справе: з дваран. Працаваў у калгасе в. Каменка Жлобінскага р-на. Арыштаваны 9.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 30.9.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 9.10.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 26.7.1989.

ІСКРЫЦКІ Фёдар Ігнатавіч, н. у 1886, жыў у Маскве, працаваў дацэнтам Маскоўскага інжынерна-будаўнічага інстытута. Арыштаваны 10.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 29.7.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Там, у лагеры, выслухаў новы прысуд — ВМП. Быў расстраляны 4.12.1937. Рэабілітаваны 6.8.1957.

КАВАЛЕЎСКІ Адам Іванавіч, н. у 1885, жыў у Петрыкаўскім р-не, працаваў у калгасе «Новая Глінка». Арыштаваны 24.3.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 28.9.1931 быў вызвалены. Рэабілітаваны 24.1.1990.

КАВАЛЁЎ Рыгор Ігнатавіч, н. у 1871. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА высланы за межы рэспублікі, пазбаўлены права пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 12.9.1991.

КАВАЛЬЧУК Ігнат Канстанцінавіч, н. у 1885, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 29.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 6.1.1993.

КАМІНСКІ Восіп Васільевіч, н. у 1896. Арыштаваны 28.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 11.12.1989.

КАМІНСКІ Павел Васільевіч, н. у 1906, працаваў у калгасе. Арыштаваны 28.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 11.12.1989.

КАПШАЙ Восіп Цярэнцьевіч, н. у 1896, жыў у в. Аляксандраўка Кармянскага р-на. Арыштаваны 13.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 17.4.1933 зняволены на 5 гадоў. Рэабілітаваны 15.7.1991.

КАРПЕНКА Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1873, працаваў загадчыкам шпала-прапітачнага завода на ст. Злынка Бранскай вобл. Арыштаваны 21.9.1928. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 5.4.1929 зняволены на 1 год. Рэабілітаваны 31.8.1989.

КАШАВАРАЎ Якаў Фёдаравіч, н. у 1893, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.4.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 19.7.1989.

КЛІМЕНКА Мікалай Сямёнавіч, н. у 1887, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА высланы за межы рэспублікі, пазбаўлены права пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 12.9.1991.

КЛІМЕНКА Савасцян Ісакавіч, н. у 1872, працаваў у калгасе. Арыштаваны 19.9.1937. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 16.10.1937 асуджаны да ВМП. Расстраляны 21.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 30.9.1989.

КОВАЛЬ Антон Васільевіч, н. у 1877, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 26.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.6.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.12.1989.

КОВАЛЬ Апанас Андрэевіч, н. у 1913, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 26.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.6.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення ў 1935. Рэабілітаваны 29.12.1989.

КОВАЛЬ Макар Васільевіч, н. у 1870, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 25.10.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 26.1.1931 асуджаны да высылкі ў Сібір (тэрмін не ўказаны). Рэабілітаваны 15.9.1989.

КОРБУТ Андрэй Фаміч, н. у 1883, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 27.12.1929. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 8.3.1930 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 26.9.1961.

КОРЗУН Аляксандр Вікенцьевіч, н. у 1910, працаваў цесляром у калгасе імя Молатава Падалескага с/с. Арыштаваны 19.8.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 2.11.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 19.11.1938. Рэабілітаваны 3.8.1958.

КРОТ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1869, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 12.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па

БВА прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 30.8.1989.

КРОТ Трыфан Васільевіч, н. у 1905, жыў на х. Чорны Осаў, працаваў рабочым у Васілевіцкім лясніцтве. Арыштаваны 20.4.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 29.7.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 6.8.1957.

КУЗЬКО Кандрат Мітрафанавіч, н. у 1884, працаваў у калгасе «Свет». Арыштаваны 6.12.1937. Па пастанове НКУС СССР і Пракурора СССР ад 5.1.1938 прыгавораны да ВМП. Памёр у турме г. Гомеля. Рэабілітаваны 21.6.1989.

КУКАР (КУКАРА) Трафім Паўлавіч, н. у 1901. Арыштаваны 26.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.6.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 29.12.1989.

КУЛІК Свірыд Еліферавіч (Аліферавіч). Быў раскулачаны ў пачатку 1930-ых гадоў.

ЛАБУДЗЕЎ Аркадзь Піліпавіч, н. у 1888, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 11.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 17.11.1989.

ЛЕВІН Ігар Міхайлавіч, н. у 1916, працаваў загадчыкам склада ў Германіі. Арыштаваны 1.4.1947. Па пастанове Асобай нарады пры МДБ СССР ад 20.11.1947 зняволены на 10 гадоў. Тэрмін пакарання адбываў у г. Омску. Рэабілітаваны 13.12.1954.

ЛЕШЧАНОК (ЛЕШЧАНКА) Пётр Паўлавіч, н. у 1902. Арыштаваны 23.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.11.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.12.1974.

ЛІЎШЫЦ Уладзімір Аркадзьевіч, н. у 1905, жыў у г. Кіеве. З'яўляўся кандыдатам у члены ВКП(б), працаваў начальнікам 1-га аддзялення будаўніча-кватэрнага аддзела Кіеўскай ВА. Арыштаваны 9.8.1937. Па пастанове Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 16.10.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 17.10.1937 у Кіеве. Рэабілітаваны 14.3.1957.

МАЖЭЙКА Адам Вікенцьевіч, н. у 1842, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 27.11.1989.

МАЖЭЙКА Канстанцін Адамавіч, н. у 1907, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 27.11.1989.

МАЖЭЙКА Уладзімір Адамавіч, н. у 1907, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 5.2.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 21.2.1930 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 27.11.1989.

МАЗУРКЕВІЧ Сабін Ігнатавіч, н. у 1877, працаваў пуцявым абходчыкам ст. Калінкавічы, Арыштаваны 14.1.1938. 15.3.1938 быў прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны 25.11.1957.

НІЖНІКАЎ Сцяпан Іванавіч, н. у 1897, працаваў настаўнікам у школе в. Сяўкі Брагінскага р-на. Арыштаваны 10.12.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.7.1932 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. У другой палове 1937 быў прыгавораны да ВМП. Расстраляны 11.1.1938. Рэабілітаваны 9.11.1964.

ПЛЯЦІНСКІ (ПЛЮЦІНСКІ) Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1912, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 6.11.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.12.1933 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 19.2.1957.

ПОПЧАНКА Еўдакім Андрэевіч, н. у 1898, працаваў у калгасе. Арыштаваны 31.12.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.4.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ПОПЧАНКА Станіслаў Андрэевіч, н. у 1900, працаваў у калгасе. Арыштаваны 7.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 16.4.1933 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 5 гадоў. Рэабілітаваны 31.7.1989.

ПРЫМАЧЭНКА Іван Савельевіч, н. у 1907, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.6.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1991.

РУБАН Акім Іванавіч, н. у 1882, працаваў у калгасе. Арыштаваны 1.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.7.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 9.11.1964.

РУБАН Пётр Іванавіч, н. у 1879, працаваў у калгасе. Арыштаваны 1.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 23.7.1932 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 9.11.1964.

САВІЦКІ Гіляр Антонавіч, н. у 1871. Арыштаваны 27.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.11.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.11.1974.

СЕЛЯЗНЁЎ Фёдар Сазонавіч, н. у 1909, жыў у в. Аляксандраўка Кармянскага р-на. Арыштаваны 13.1.1933. Па пастанове тройкі ПП АГПУ па БССР ад 17.4.1933 зняволены на 10 гадоў. Рэабілітаваны пастановай Вярхоўнага суда БССР ад 15.7.1967.

СІНІЛА Іван Іванавіч, н. у 1910, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 10.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.2.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.9.1965.

СІНІЛА Іван Сцяпанавіч, н. у 1877, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 10.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.2.1933 асуджаны на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны 13.9.1965.

СІНІЛА Павел Іванавіч, н. у 1912, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны

10.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.2.1933 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.9.1965.

СМАЛЯНЧУК Мікіта Андрэевіч, н. у 1905, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1991.

СМАЛЯНЧУК Павел Андрэевіч, н. у 1912, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1991.

СТАНКЕВІЧ (СТАТКЕВІЧ) Антон Баляслававіч, н. у 1898, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 28.9.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.12.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 19.2.1957.

СТАНКЕВІЧ (СТАТКЕВІЧ) Уладзімір Альбінавіч, н. у 1906, працаваў у калгасе. Арыштаваны 23.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.12.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення 20.1.1939. Рэабілітаваны 13.11. 1974.

СУРЖЫК Ісак Іванавіч, н. у 1904, працаваў у калгасе. Арыштаваны 10.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.2.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 13.9.1965.

ТКАЧОЎ Ціхан Кузьміч, н. у 1897, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 18.2.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 11.5.1932 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ТКАЧОЎ Якаў Яфімавіч, н. у 1884, працаваў у калгасе. Арыштаваны 21.12.1931. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 23.7.1932 асуджаны да высылкі ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 9.11.1964.

ТРАВІНЧЫК Норберт Іосіфавіч, н. у 1875. Арыштаваны 7.3.1920. Па пастанове калегіі Гомельскай губернскай ЧК прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 6.8.1992.

ТРАЦЭЎСКІ Міхаіл Адольфавіч, н. у 1898. Арыштаваны 21.5.1929. Па пастанове Асобай нарады пры Калегіі АГПУ СССР ад 20.6.1929 асуджаны да высылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 6.1.1993.

ТРУБЯНЁЎ Іосіф Марк'янавіч, н. у 1887, працаваў у будаўнічай брыгадзе калгаса «Чырвоны будаўнік» Лоеўскага р-на. Арыштаваны 5.5.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.5.1933 зняволены на 3 гады ў папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 11.8.1989.

ТУМІЛОВІЧ Адам Вікенцьевіч, н. у 1908, працаваў начальнікам участка Косінскага леспрамгаса Уральскай вобл. Арыштаваны 28.12. 1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.2.1934 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Краснаярскім краі. Вызвалены з месца зняволення 31.5.1946. Рэабілітаваны 13.11.1974.

ТУРЧЫН Павел Андрэевіч, н. у 1889, жыў у пас. Горветка, працаваў вартаўніком Рэчыцкага леспрамгаса. Арыштоўваўся двойчы – у 1933 і 1940. Пастановай Асобай нарады пры НКУС БССР ад 5.6.1940 быў зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 11.12.1989.

УЛАСЮК Вікенцій Лявонавіч, н. у 1891. Арыштаваны 25.2.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 29.7.1933 зняволены на 10 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Варкуце. Рэабілітаваны 6.8.1957.

УЛАСЮК Еўдакія Фёдараўна, н. у 1895. Арыштавана 10.3.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 29.3.1933 зняволена на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Датэрмінова вызвалена ў 1934. Рэабілітавана 6.8.1957.

ХУЛУП Аўрам Іванавіч, н. у 1888, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.6.1932 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 12.9.1991.

ХУЛУП Мікалай Аўрамавіч, н. у 1915. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.6.1932 у якасці пакарання залічаны тэрмін знаходжання ў турме. Рэабілітаваны 12.9.1991.

ХУЛУП Павел Герасімавіч, н. у 1872, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 30.3.1932. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БВА ад 3.6.1932 высланы з тэрыторыі рэспублікі і пазбаўлены права пражывання ў 12 пунктах краіны і Уральскай вобл. тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 12.9.1991.

ЧАРНЯЎСКІ Браніслаў Іванавіч, н. у 1908, працаваў у калгасе. Арыштаваны 13.8.1937. Па пастанове Камісіі НКУС СССР і Пракурора СССР ад 20.1.1938 прыгавораны да ВМП. Расстраляны 16.2.1938 у Мазыры. Рэабілітаваны 7.5.1959.

ЧАРНЯЎСКІ Георгій Пятровіч. Быў раскулачаны ў 1933.

ЧУМАКОЎ Яфрэм Яфімавіч, н. у 1889. Арыштаваны 26.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.2.1934 зняволены на 5 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Вызвалены з месца зняволення 13.7.1937. Рэабілітаваны 13.11.1974.

ЧЫЖЭЎСКІ Іосіф Сігізмундавіч, н. у 1902, працаваў у калгасе. Арыштаваны 21.12.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 13.12.1933 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Рэабілітаваны 19.2.1957.

ШАФАРЭНКА Адам Яфімавіч, н. у 1890, працаваў у калгасе. Арыштаваны 13.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.1. 1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ШАФАРЭНКА Архіп Яфімавіч, н. у 1893, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Арыштаваны 13.1.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па

БССР ад 25.1.1933 зняволены на 5 гадоў у канцлагер. Рэабілітаваны 19.7.1989.

ШОЛКАВІЧ Аляксандр Максімавіч, н. у 1874. Святар. Жыў у Гомелі. Арыштаваны 6.2.1933. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 3.4.1933 прыгавораны да ВМП. Рэабілітаваны 2.9.1960.

ШЫШОЎ Васіль Сямёнавіч, н. у 1907, жыў на х. Бугрымаўка, працаваў на ўласнай гаспадарцы. Быў высланы за межы рэспублікі, але без дазволу ўлад вярнуўся дамоў. Арыштаваны 7.8.1930. Па пастанове тройкі пры ПП АГПУ па БССР ад 25.8.1930 зняволены на 3 гады ў канцлагер. Пакаранне адбываў на в. Салаўкі. Рэабілітаваны 14.5.1990.

Воіны-землякі, якія загінулі ў 1938—1940 гг.

Воіны-землякі, якія загінулі каля возера Хасан

РОВЕНСКА-СЛАБОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЯЗУЕЎ

БАЛАШЧАНКА Аляксандр Яўхімавіч, н. у 1918, чырвонаармеец, загінуў у 1938.

ВЁСКА РОЎНАЕ

ЧАРНАШЭЙ Міхаіл Карнеевіч, н. у 1908, мал. лейт., загінуў у 1939.

Воіны-землякі, якія загінулі ў час савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг.

ВАСІЛЕВІЦКІ ГАРСАВЕТ

ВЁСКА ЗАШЧОБ'Е

ЗЯНЬКО Мікалай Пятровіч, н. у 1916, лейт., кам. узвода сувязі 529 сп, загінуў 12.2.1940.

ЯРМОЛЕНКА Фёдар Рыгоравіч, н. у 1910, да вайны працаваў у калгасе «Іскра Ільіча», сярж., загінуў у 1940.

ДУБРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДУБРОВА

ЧЫРЫК Максім Пракопавіч, н. у 1901, да вайны працаваў у калгасе, рад., загінуў у 1939.

На жаль, устанавіць прозвішчы ўсіх землякоў, якія загінулі ў час савецка-фінляндскай вайны, не ўдалося.

1941

1945

У ПОЛЫМІ ВАЙНЫ

У трывожныя дні

У ліпені 1940 года па распараджэнню Гітлера была пачата распрацоўка плана нападу фашысцкай Германіі на СССР. Канчатковы варыянт яго меў кодавую назву «Барбароса», быў выкладзены ў дырэктыве камандавання ўзброенымі сіламі Германіі ад 18 снежня 1940 года, а разгорнутае афармленне — у дырэктыве ад 31 студзеня 1941 года.

Падрыхтоўка фашысцкай Германіі да вайны не была сакрэтам для партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва СССР.

Летам 1940 года сапёрныя, інжынерныя і аўтамабільныя батальёны прыступілі на тэрыторыі БССР да работы па расшырэнню стратэгічна важных чыгуначных вузлоў і ліній, рэканструкцыі старых і будаўніцтва новых аэрадромаў. У гарадах рэспублікі будаваліся і пераабсталёўваліся бомба- і газасховішчы, праводзіліся заняткі па святломаскіроўцы.

У пачатку 1941 года жыхары Рэчыцы і раёна прымалі ўдзел у масавых тактычных занятках па адбіцці магчымага нападу варожых дэсантнікаў. Найбольш актыўна заняткі, а затым і тактычнае вучэнне, прайшлі на рэчыцкім лесазаводзе імя С. М. Кірава, дырэктарам якога быў П. І. Васільеў.

На рэчыцкіх прадпрыемствах і ў гаспадарках раёна праводзіліся лекцыі па абарончай тэматыцы. З імі выступалі камандзіры і палітработнікі Чырвонай Арміі, за плячыма якіх быў вопыт баёў на Халхін-Голе і Хасане, у Іспаніі. Нярэдка перад слухачамі выступалі ўдзельнікі паходу ў Заходнюю Беларусь і савецка-фінскай вайны.

...22 чэрвеня 1941 года.

Аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны рэчычане і жыхары раёна даведаліся ў 12 гадзін дня, калі па радыё выступіў нарком замежных спраў СССР В. М. Молатаў. Над Рэчыцай трывожна загулі гудкі прамысловых прадпрыемстваў.

Праз некалькі гадзін у памяшканні клуба імя Калініна сабраўся раённы і гарадскі партыйна-гаспадарчы актыў. Нараду правялі сакратар РК КП(б)Б А. І. Куцейнікаў, старшыня райвыканкама В. А. Кастрама і райваенкам Андрэеў. Заклікалі працоўных Рэчыцы і раёна ўмацоўваць парадак і дысцыпліну, стараннай працай дапамагчы Чырвонай Арміі разграміць ворага.

22 чэрвеня быў арганізаваны атрад мясцовай абароны г. Рэчыцы і раёна. Начальнікам знішчальнай групы атрада быў прызначаны дырэктар прамысловага камбіната Аляксандр Браніслававіч Міклашэвіч.

З 25 чэрвеня ў Рэчыцы пачаў дзейнічаць знішчальны батальён. Разгарнулася работа па стварэнню народнага апалчэння. Для кіраўніцтва ім пры райвыканкаме быў арганізаваны раённы штаб на чале з П. І. Васільевым.

Да 1 ліпеня ў раёне быў арганізава-

А. Б. Міклашэвіч

П. І. Васільеў

М. Ф. Турчынскі

К. У. Дзедзік

ны партызанскі атрад з 42 чалавек. Камандзір атрада — М. Ф. Турчынскі.

Апалчэнцы і партызаны мелі на ўзбраенні вінтоўкі, 20 аўтаматаў, 12 ручных і 6 станковых кулямётаў, 4 мінамёты, зенітную ўстаноўку, 2 супрацьтанкавыя гарматы.

Базай народных мсціўцаў з'яўлялася памяшканне рэспубліканскага дзіцячага санаторыя на беразе ракі Бярэзіны каля вёскі Горваль. Была арганізавана вучоба. Заняткі праводзілі А. Б. Міклашэвіч, камандзіры рот і ўзводаў, афіцэры 66-га стралковага корпуса 3-яй арміі, якая прыняла на сябе першы ўдар фашысцкай зграі ў раёнах Гродна і Ліды. Да 8 ліпеня ваявала ў тыле ворага, а потым пачала выходзіць з акружэння.

Сітуацыя на фронце разгортвалася хутка і не на карысць Чырвонай Арміі. 26 чэрвеня фашысты падышлі да Мінска. На захадзе ад сталіцы былі акружаны часці 3-яй і 10-ай армій. Рэшткі 4-ай арміі адышлі ў Прыпяцкія лясы. Шмат якія з часцей, што панеслі ў баях з фашыстамі значныя страты, адыходзілі да Бярэзіны ў напрамку Рэчыцкага раёна.

Да зыходу дня 28 чэрвеня злучэнні нямецка-фашысцкай групы армій «Цэнтр» уварваліся ў Мінск, а ў пачатку ліпеня першыя варожыя падраздзяленні з'явіліся на тэрыторыі былога Парыцкага раёна, які межаваў з Рэчыцкім. Пад Парычы былі накіраваны баявыя групы Рэчыцкага партызанскага атрада з мэтай арганізацыі засад (Гл. матэрыял «З дзённіка рэчыцкага партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава аб баявой дзейнасці атрада з 1 ліпеня 1941 года па 15 кастрычніка 1942 года»).

Усе байцы і камандзіры рэчыцкіх знішчальнага батальёна і партызанскага атрада паказалі ў барацьбе з ворагам мужнасць і адвагу. Асабліва ж вызначыліся А. М. Зімніцкі, К. У. Дзедзік, Ф. Ю. Мір і ягоны сын Уладзімір, У. Ф. Шчарбінскі, М. М. Марыеўскі, А. І. Хадыка, Дз. М. Кузьмянок, М. Ф. Максімаў, А. І. Варона. Шмат зрабілі ў складзе атрада армейцы з акружэнцаў — У. І. Палтавец, М. І. Бабенка, П. С. Жыленка, А. Б. Лук'яненка, Т. Л. Лаўрыненка. Пра баявыя справы рэчыцкага партызанскага атрада пісала рэспубліканская газета «Звязда», у нумары ад 22 ліпеня 1941 года газеты «Правда» пісаў аб гэтым першы сакратар ЦК КП(б) Беларусі П. К. Панамарэнка. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 жніўня 1941 года байцы і камандзіры атрада, якія найбольш вызначыліся ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, былі адзначаны ордэнамі і медалямі. Ордэн Чырвонага Сцяга атрымалі М. Ф. Турчынскі, Дз. М. Кузьмянок, У. Ф. Шчарбінскі.

На жаль, да канца не высветлена гісторыя арганізацыі барацьбы з фа-

шыстамі ў першапачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў Васілевічах і раёне, якія ўваходзілі пад той час у састаў былой Палескай вобласці, а цяпер у Рэчыцкі раён. Па-першае, захавалася мала дакументаў. Па-другое, успаміны непасрэдных удзельнікаў падзей носяць часам супярэчлівы характар.

У інфармацыйнай запісцы аб становішчы ў вобласці, накіраванай у ЦК КП(б) Беларусі 13 ліпеня 1941 года, першы сакратар Палескага абкома партыі П. А. Лявіцкі паведамляў: «...В Василевичском районе работу истребительных отрядов возглавляет бывший партизан, орденоносец, коммунист тов. Филончик». Але ў перыяд, калі пісалася інфармацыйная запіска, дзейнічаў толькі адзін знішчальны батальён, камандзірам якога быў зацверджаны Аляксандр Захаравіч Духанін, начальнік раённага аддзела НКУС. На батальён ускладвалася задача барацьбы з варожымі дэсантамі, ахова важнейшых аб'ектаў у Васілевічах, барацьба са злачыннасцю.

Распачалося фарміраванне атрада народнага апалчэння. Камандзірам яго быў зацверджаны трэці сакратар Васілевіцкага РК КП(б)Б Павел Васільевіч Атрошчанка.

7 ліпеня над Васілевічамі з'явіліся 17 фашысцкіх самалётаў. Некаторыя з іх скінулі бомбы. Згарэлі станцыйная лазня і лаўка прамысловых тавараў, было пашкоджана чыгуначнае палатно.

У сярэдзіне ліпеня Васілевіцкі РК КП(б)Б атрымаў дырэктыву Палескага абкама партыі аб неабходнасці распачаць работу па арганізацыі партызанскага атрада. Стварыць яго на базе знішчальнага батальёна бюро райкама даручыла А. З. Духаніну і П. В. Атрошчанку. Ядро атрада склалі: П. П. Алісейка, А. Я. Залатароў, Н. І. Дзейкун, М. А. Лейзяронак, Р. Д. Ліс, Н. М. Лаўшук, С. Г. Рыбак, А. В. Сіроцін, В. П. Шульга, Е. В. Шаплыка, У. К. Філончык, Крэшнеў, Куляшоў, Музычэнка, Макараў. Дакладна не ўстаноўлена, хто з'яўляўся камандзірам Васілевіцкага партызанскага атрада. Даныя наконт гэтага супярэчлівыя, яны сведчаць пра тое, што арганізацыя партызанскага атрада насіла на першым часе фармальны характар.

А. З. Духанін

У сярэдзіне ліпеня ў Васілевічах распачалося фарміраванне кавалерыйскай групы пад кіраўніцтвам палкоўніка А. І. Бацкалевіча, у якую павінны былі ўвайсці 32-ая, 43-яя і 47-ая дывізіі. Яны камплектаваліся з кавалерыйскіх часцей, якія па загаду Стаўкі Вярхоўнага Камандавання ад 27 чэрвеня 1941 года былі адведзены ў Пінскія лясы.

Палкоўнік Бацкалевіч атрымаў загад прарвацца кавалерыйскай групай у варожы тыл і знішчаць тылавыя камунікацыі фашыстаў. Ён звярнуўся да кіраўніцтва Васілевіцкага партызанскага атрада з просьбай выдзеліць 15 чалавек для ўдзелу у сумесным рэйдзе. Пры гэтым на партызан ускладвалася канкрэтная задача весці барацьбу з варожай агентурай. У рэйд з кавалерыстамі адправілася група на чале з камандзірам разведкі атрада Аляксеем Якаўлевічам Залатаровым. З 24 ліпеня па 5 жніўня група А. Я. Залатарова знаходзілася ў варожым тыле і заслужыла высокую адзнаку палкоўніка Бацкалевіча.

12 жніўня 1941 года фашысты з'явіліся на тэрыторыі Васілевіцкага раёна, захапілі вёскі Чарнейкі і Ліпаў. Але да зыходу наступнага дня гіт-

лераўцы былі выбіты з гэтых населеных пунктаў.

6 ліпеня 1941 года часці 117-ай дывізіі 63-га стралковага корпуса 21-ай арміі правялі разведку боем, выбілі фашыстаў са Жлобіна, які быў захоплены ворагам 3 ліпеня, прасунуліся ўздоўж шашы. Гітлераўцы падцягнулі матарызаваную і пяхотную дывізіі. 117-ая стралковая адышла на зыходныя рубяжы, нанёсшы праціўніку значныя страты і сарваўшы разлікі камандавання групы армій «Цэнтр» з ходу фарсіраваць Дняпро на гэтым участку фронту. 12 ліпеня 21-ая армія атрымала загад сіламі 63-га і 66-га стралковых карпусоў нанесці контрудары ў напрамку Бабруйска, а 67-му стралковаму корпусу наступаць уздоўж Дняпра з мэтай знішчэння варожай групоўкі, якая прарвалася ў раён Быхава.

На першым часе поспех спадарожнічаў 21-ай арміі. Удалося вызваліць Жлобін і Рагачоў, развіць наступленне на Бабруйск. Часці 63-га корпуса да канца ліпеня ўклініліся на 30 км у размяшчэнне ворага. Фашысты кінулі супраць корпуса 8 дывізій. 14 жніўня прарвалі ягоную абарону і зайшлі ў тыл. З 17 жніўня часці 63-га корпуса пачалі з баямі выходзіць з акружэння. Асноўная частка ў напрамку Гомеля, астатнія — уздоўж Дняпра да Рэчыцы.

Сітуацыя пад Гомелем была крытычнай. У пачатку жніўня фашысты перакінулі сюды часці 2-ой палявой арміі, з раёна Смаленска — 2-ую танкавую групу генерала Гудэрыяна. На Гомель былі нацэлены 25 нямецка-фашысцкіх дывізій.

8—10 жніўня вораг прарваў абарону 21-ай арміі на ўчастку Крычаў — Прапойск — Рэчыца і выйшаў на подступы да Гомеля. 12 жніўня часці 2-ой нямецкай арміі распачалі штурм горада, а варожая авіяцыя без супынку бамбіла яго, аднак горад неабходна было ўтрымаць на працягу некалькіх дзён, каб даць магчымасць 3-яй арміі, якая выходзіла з акружэння праз Рэчыцкі раён, перайсці каля Лоева на левы бераг Дняпра.

19 жніўня фашысты занялі абласны цэнтр. Часці 3-яй арміі яшчэ працягвалі адыход да лоеўскай пераправы. У раёне Горваля фашыстаў стрымлівалі байцы Жыткавіцкага пагранічнага атрада. У той жа дзень група рэчыцкіх апалчэнцаў на чале з Несцерам Сільвестравічам Аляксеенкам прыняла з фашыстамі бой у раёне вёскі Баршчоўка (Гл. матэрыял «Бой каля вёскі Баршчоўка»).

Яшчэ адна група рэчыцкіх апалчэнцаў каля вёскі Сеназавод уступіла ў бой з варожымі матацыклістамі, рассеяла іх. Трафеямі апалчэнцаў сталі 12 матацыклаў.

Ноччу з 21 на 22 жніўня рота рэчыцкага знішчальнага атрада на чале з капітанам Ганчаровым заняла рубеж непадалёку ад рэчкі Ведрыч у напрамку вёскі Азершчына. Ганчароў аддаў загад на падрыў ведрыцкага моста. Узрыўчаткі было мала, таму мост давялося дапальваць.

Раніцай з Азершчыны да рэчкі пад'ехалі нямецкія матацыклісты, а затым падышлі 100—120 варожых аўтаматчыкаў. Адкрылі агонь па пазіцыях знішчальнага атрада. Пачаўся бой. У ходзе яго асабліва ўдала дзейнічаў кулямётчык Фелікс Фідэльскі.

У гэты час ішоў бой і на дарозе, якая вяла да Шацілак. Абарону там трымалі чырвонаармейцы.

Вечарам 22 жніўня капітан Ганчароў атрымаў звесткі, што гітлераўцы прарваліся па шацілкаўскай дарозе. Узнікла пагроза акружэння. Ганчароў аддаў загад адыходзіць.

23 жніўня гітлераўцы ўвайшлі ў Рэчыцу, з якой на Усход своечасова была эвакуіравана большая частка абсталявання мясцовых прадпрыемстваў.

Фашысты ўжо гаспадарылі і ў Васілевічах.

Над Рэчыцкім раёнам навіс злавесны цень варожай акупацыі.

А. П. Рабянок, П. П. Рабянок

Бой каля вёскі Баршчоўка

З успамінаў Несцера Сільвестравіча Аляксеенкі, былога камандзіра батальёна Рэчыцкага народнага апалчэння

Было каля шасці гадзін вечара, як я выйшаў з ваенкамата. Меў на руках дакумент аб вызваленні мяне ад мабілізацыі. Аднак такое не радавала: тры дні, як ідзе вайна, а я, фактычна, без справы.

У Гомелі, дзе быў на павышэнні кваліфікацыі ў лесатэхнічным інстытуце, нямала часу страціў на тое, каб дабіцца дазволу зноў выехаць у Рэчыцу. Але і тут замест адпраўкі на фронт загадалі з'явіцца ў распараджэнне раённага камітэта партыі.

Нягледзячы на позні час, у райкаме шматлюдна. У кабінет і з кабінета сакратара заходзілі і выходзілі невядомыя мне людзі, а разам з імі і тыя, якіх я добра ведаў. Кожны заклапочаны, засяроджаны.

Сакратар райкама даваў кароткія адказы на пастаўленыя перад ім пытанні, быў вымушаны раз-пораз адрывацца да тэлефона. Калі дайшла мая чарга, ён уважліва прачытаў паперку, якую атрымаў я ў ваенкамаце, задумаўся, а потым паведаміў, што ў Рэчыцы арганізаваны знішчальны батальён, камандзірам яго прызначаны т. Міклашэвіч. «Вось да яго і накіруецеся камандзірам роты», — сказаў, як загадаў, сакратар і пажадаў мне поспеху.

З Міклашэвічам у той вечар я ўжо не сустрэўся. Затое патрапіў на завод імя Кірава, пагутарыў з дырэктарам прадпрыемства Пятром Іванавічам Васільевым. Дарэчы, завод імя Кірава мне як родны. Да вайны я працаваў тут начальнікам цэха, адсюль і быў пасланы на вучобу ў Гомель.

Калі ўвайшоў у кабінет дырэктара, то там ужо знаходзіліся сакратар парткама завода Аляксандр Іванавіч Варона і яшчэ двое знаёмых мне таварышаў. Адразу ж завязалася гутарка на галоўную тэму дня. Пятро Іванавіч выказаўся за тое, што я быў бы патрэбен і на заводзе. Аднак загад, атрыманы ад сакратара райкама, нельга было парушаць, і я ўрэшце накіраваўся ў знішчальны батальён. Ягоная другая рота размяшчалася ў Фабрычна-Заводскім раёне, была ўкамплектавана рабочымі і служачымі, якія па той ці іншай прычыне не былі мабілізаваны ў Чырвоную Армію.

У абавязкі роты ўваходзілі: эвакуацыя насельніцтва і прадпрыемстваў, іх ахова, барацьба з дыверсантамі, са спекуляцыяй, панікай і г. д.

У гэтай абстаноўцы мне надта спатрэбіліся веды, набытыя ў час службы ў Чырвонай Арміі. Асабліва гэта дало сябе адчуць 5 ліпеня 1941 г. пры фарміраванні ў Рэчыцы народнага апалчэння. У гэты дзень я быў прызначаны камандзірам батальёна. Дарэчы, народнае апалчэнне выконвала тыя ж функцыі, што і знішчальны батальён.

Тым часам вораг набліжаўся. Таварыш Васільеў, якому выпала ўзначаліць народнае апалчэнне Рэчыцы, не меў магчымасці ўдзяляць яму на першым часе шмат увагі, бо ад работы на заводзе вызвалены не быў. А прадпрыемства, як і раней, працягвала выпуск прадукцыі.

Фронт бліжэй і бліжэй. Пачалі актывізавацца варожыя савецкай уладзе элементы, у тым ліку і вызваленыя з турмы крымінальнікі. Быў такі выпадак, калі ў лесе каля вёскі Стары Барсук з'явілася група ўзброеных бандытаў. Давялося выязджаць туды і ў баявой сутычцы знішчаць іх.

Вядома, нярэдка ўспамінаў Міклашэвіча: з ім было б лягчэй. Але той ужо знаходзіўся ў дзеючай арміі.

Не лішне зазначыць, што ў наш батальён увайшоў і атрад пагранічнікаў у складзе прыкладна трыццаці чалавек, якім камандавалі капітан Галіеў і камісар Агееў. На ўзбраенні пагранічнікаў былі ручныя кулямёты, дзве спараныя кулямётныя ўстаноўкі. Фактычна пагранічнікі і складалі ядро батальёна.

18 жніўня я быў у вёсцы Белае Балота. Калі вяртаўся адтуль у Рэчыцу, то сустрэўся з чырвонаармейцамі, якія паведамілі: у вёску Борхаў уступілі немцы.

У Рэчыцы аб пачутым ад чырвонаармейцаў я расказаў у райкаме партыі. Там жа было прынята рашэнне забраць з батальёна ўсіх баяздольных і выехаць у раён вёскі Баршчоўка, каб, сустрэўшыся з ворагам, прыкрыць адыход нашых войск да Дняпра.

Праз паўгадзіны я быў у памяшканні лясгаса, дзе і знаходзіўся ў гэты час штаб народнага апалчэння. Даручыў камандзіру роты Івану Іванавічу Бідо адабраць людзей для выезду. Яму дапамог зрабіць гэта старшына батальёна Мікіта Рыгоравіч Шыкла.

На аўтамашынах пад'ехалі да моста

праз раку Днепр. Там нас сустрэў армейскі капітан, які разам з салдатамі мост гэты ахоўваў. Ён з упэўненасцю заявіў: за Днепр ехаць нам нельга, бо ў Баршчоўцы ўжо немцы, і што праз некалькі хвілін ён будзе ўзрываць мост.

І ўсё ж мы пераканалі афіцэра пачакаць са сваім рашэннем.

Пакінуўшы каля моста некалькі сваіх байцоў на чале з камандзірам роты таварышам Бідо, мы пераехалі на другі бок ракі.

Час быў позні. Таму, ад'ехаўшы кіламетры тры, мы спынілі машыны і занялі абарону. Аўтамабілі шкада было пакідаць пры сабе, бо калі давядзецца мост узрываць, то тэхніку нельга будзе пераправіць у горад. А там яна так патрэбна.

Прыйшоў да рашэння — адну машыну пакінуць, а астатнія накіраваць назад. Так і было зроблена. Я ўпэўніўся, што машыны на тым беразе ракі, развітаўся з капітанам і ягонай камандай, вярнуўся ў атрад. Пачуў, як грымнуў выбух: мост быў падарваны.

Вырашыў правесці дэталёвую разведку. Для гэтага былі адабраны дваццаць добраахвотнікаў. Яны размясціліся ў кузаве аўтамашыны, якая ўзяла кірунак на Баршчоўку.

Як высветлілася, вёска яшчэ была свабоднай ад ворага. Даведаўшыся аб тым, мы падцягнулі ў Баршчоўку ўвесь атрад. Улічыўшы два асноўныя напрамкі магчымага ўдару, а гэта дарогі з Гомеля і Борхава, замініравалі іх, пакінуўшы там па ўзводу апалчэнцаў з кулямётамі.

Ноч увогуле прайшла спакойна. Раніца. Даю сувязным апошнюю ўстаноўку, як паводзіць сябе, калі з'явяцца фашысты. І тут на камандны пункт зайшоў армейскі палкоўнік. Ён сказаў, што з ім ідуць яшчэ 12 чалавек, сярод якіх і малодшыя камандзіры. Мы не паспелі як след дамовіцца з палкоўнікам аб сумесных дзеяннях, а ўжо пачуўся рокат варожых танкаў. Яны ішлі з боку Борхава. Праз якую хвіліну на шашы ад Гомеля паказаліся фашысцкія пехацінцы. Завязаўся няроўны бой.

Трапнымі стрэламі нам удалося прыпыніць варожую пяхоту, а на мінах, устаноўленых загадзя, падарваліся некалькі аўтамашын. Змагацца ж з танкамі было значна цяжэй. У выніку немцы ўварваліся ў вёску. У атрадзе з'явіліся першыя забітыя і параненыя. Загінуў наш кулямётчык Жураўскі, быў цяжка паранены баец Чараднік, потым яшчэ некалькі чалавек. Раненых мы вынеслі з поля бою і адправілі да пераправы.

У хуткім часе варожыя танкі канчаткова вывелі са строю ўсе нашы кулямёты. Фактычна мы засталіся без зброі. Я аддаў загад рухацца праз лес у бок вёскі Аляксандраўка, дзе нас чакалі загадзя падрыхтаваныя лодкі, каб можна было пераправіцца праз Днепр. І мы рушылі адступаць. Рабілі гэта з верай у сэрцах: мы яшчэ вернемся. Вернемся з перамогай.

У няпоўныя 16 гадоў

З успамінаў Лідзіі Адамаўны Дворнік

Перад вайной мой бацька Адам Цітавіч Дворнік працаваў у мястэчку Холмеч старшынёй калгаса «Гігант». У ліпені 1941 года ў Холмецкім сельсавеце быў арганізаваны апалчэнцкі атрад з 20—25 чалавек.

У другой палове жніўня, калі падраздзяленні Чырвонай Арміі ў асноўным адышлі праз тэрыторыю Рэчыцкага раёна да Лоева, дзе была наладжана пераправа на левы бераг Дняпра, да памяшкання сельсавета пад'ехала аўтамашына. Частка байцоў апалчэнцкага атрада павінна была праз Лоеў выехаць у Амелькаўскія лясы на загадзя падрыхтаваную партызанскую базу. Разам з бацькам у аўтамашыну села і я.

Пад'ехалі да Лоева. На мястэчка налятралі варожыя самалёты. Скідвалі бомбы, жадаючы разбіць пераправу. Пад бамбёжку патрапілі і мы, холмецкія апалчэнцы. Шукалі паратунку ў ямах і канавах. А потым, калі бамбёжка крыху сціхла, кінуліся да аўтамашыны. Сталася так, што я закінула ў кузаў санітарную сумку, вайсковыя боты, нешта яшчэ з адзення. Залезці ж сама не змагла, бо машына ўжо кранулася...

Так і засталася ў Лоеве. Неўзабаве прыбілася да падраздзялення старшага лейтэнанта Ювеналія Юльевіча Розенмана, камандны пункт якога знаходзіўся ў вёсцы Мохаў. Прасілася, каб вайскоўцы ўзялі мяне з сабой. Старшы лейтэнант адказаў, што выканаць маю просьбу не можа. Затое запісаў свой дамашні адрас, сказаў: «Калі будзеш

Л. А. Дворнік

у гэтых мясцінах, то перадай прывітанне маім родным. У іх можаш і пажыць...»

Пад той час мне не было і 16 гадоў. Хаваючы ў душы роспач, што вайскоўцы не могуць мяне ўзяць на фронт, я вымушана была вяртацца дамоў.

У Ровенскую Слабаду прыйшла 5 верасня. Неўзабаве вярнуўся дамоў і бацька. З хворымі вачыма, цяжкім кашлем. Аказваецца, восенню Рэчыцкі партызанскі атрад, які базіраваўся ў Амелькаўскіх лясах, быў высачаны і разбіты карнікамі. Частка ацалелых партызан накіравалася за лінію фронту, некаторыя сталі партызанамі лоеўскага атрада «За Радзіму!», а некаторыя пайшлі дамоў, каб у родных вёсках наладзіць барацьбу супраць акупантаў.

Майго бацьку, Гаўрылу Платонавіча Ганчарэнку і Малаха Іванавіча Звяртоўскага арыштавалі маладушскія паліцаі, адвезлі ў рэчыцкую жандармерыю. Але праз два дні бацька і Ганчарэнка вярнуліся дамоў. На першым часе акупанты калі-нікалі праяўлялі «лагоднасць». А мо жадалі ўстанавіць за адпушчанымі нагляд. Так, да нас наведваліся паліцаі з Андрэеўкі, некалькі разоў прыязджаў начальнік маладушскай паліцыі Майер. Іх цікавіла адно: дзе бацька?

У Ровенскай Слабадзе пачала складвацца падпольная патрыятычная група. Яе арганізатарамі сталі мой бацька А. Ц. Дворнік, Г. П. Ганчарэнка і М. І. Звяртоўскі. У студзені 1942 года да нас далучыўся І. А. Дворнік.

Наша група наладзіла сувязь з падпольшчыкамі Рэчыцы, Холмеча, вёсак Вятхінь, Арол, Андрэеўка, Церабееўка.

Урач Віктар Адамавіч Казюк меў радыёпрыёмнік. Мы слухалі навіны з Масквы, перапісвалі зводкі Саўінфармбюро. Распаўсюджвалі іх сярод насельніцтва. Пісалі адозвы з заклікамі не верыць фашысцкай хлуслівай прапагандзе, збіралі зброю і боепрыпасы.

Мне ўдалося ўладкавацца працаваць на камутатар. Гэта дало магчымасць для збору інфармацыі аб паліцэйскіх участках Холмеча, Маладушы, Караваціч, Салтанова.

І. А. Дворнік працаваў пісарам Ровенска-Слабодскай воласці. Здабываў не толькі каштоўныя звесткі, але і бланкі нямецкіх пашпартоў.

Названы вышэй В. А. Казюк і ўрач з Рэчыцы Пятро Хамянок дапамаглі нашай групе сарваць адпраўку моладзі ў Германію. Каму былі зроблены фіктыўныя даведкі аб хваробах, у іншых былі выкліканы часовыя захворванні скуры.

Па заданню бацькі я часта наведвалася да падпольшчыкаў іншых вёсак. Хадзіла ў вёску Арол да Івана Фрола, у вёску Андрэеўка да Фёдара Васільца, у вёску Вятхінь да М. Л. Саламахі. 8 красавіка 1942 года па заданню Макара Фёдаравіча Турчынскага з вёскі Завужаль Холмецкага сельсавета прывяла да партызан Сяргея Васільевіча Бронскага-Капелюша, які да вайны працаваў пракурорам.

Вясной 1942 года каля Ровенскай Слабады пачаў арганізоўвацца Рэчыцкі партызанскі атрад. У нашу хату прыходзілі людзі. Я павінна была адвесці іх у лес.

7 ліпеня 1942 года я стала партызанкай. Неўзабаве ў атрадзе была і ўся наша сям'я — бацька, маці, дзве сястры.

ПАРТЫЗАНСКІ РУХ І ПАДПОЛЛЕ

Перад ворагам не скарыліся

...23 жніўня 1941 года з захопленай фашыстамі Рэчыцы невялікімі групамі і ў адзіночку выходзілі ў напрамку Амелькаўскіх лясоў тыя, хто былі пакінуты на акупіраванай тэрыторыі для партызанскай дзейнасці.

16 верасня карны атрад высачыў месцазнаходжанне партызан і акружыў раён іх-

няй базы. Быў бой, у ходзе якога партызаны пацярпелі паражэнне.

У пісьме першага сакратара Гомельскага падпольнага абкама партыі І. П. Кожара на імя першага сакратара ЦК КП(б) Беларусі П. К. Панамарэнкі аб гэтай падзеі сказана так: «Речицкий отряд под руководством секретаря райкома КП(б) Белоруссии А. И. Кутейникова в середине сентября 1941 года подвергся нападению со стороны немцев и, хотя понес незначительные потери, был деморализован и распался. После нападения немцев т. Кутейников оставил отряд и ушел неизвестно куда. Только небольшая группа (6 человек) присоединилась к Лоевскому отряду».

НА РБ, ф. 4, воп. 33[а], спр. 68, л. 65.

А вось Муравінскі, загадчык аднаго з аддзелаў Лоеўскага РК КП(б) Беларусі, які быў паранены і вывезены на лячэнне ў Маскву, аб цяжкай падзеі з жыцця Рэчыцкага партызанскага атрада апавядаў так: «...К осени 1941 года карательный отряд немцев выследил отряд т. Кутейникова в одном лесу, разгромил его продовольственные базы, окружил партизан и в упорном бою рассеял отряд Кутейникова. Группа т. Турчинского пришла в отряд т. Синякова, где вместе с ним и зимовала; другая группа во главе с Маевым направилась к линии фронта. Что произошло в этом бою с т. Кутейниковым, точно никто не знает. Но со слов Маева, он видел, как т. Кутейников отстреливался из автомата от группы немцев. Но что было дальше, Маев не знает. Он в это время вырвался из окружения в другом направлении».

НА РБ, ф. 3500, Воп. 4, спр. 197, л. 15.

Не менш трагічным быў лёс і Васілевіцкага партызанскага атрада.

8 ліпеня 1941 года на тэрыторыю Рэчыцкага раёна была накіравана дыверсійная группа чэкіста А. А. Маева. 15 жніўня ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне аб адпраўцы ў Рэчыцкі раён яшчэ трох дыверсійных груп — Турчынскага, Анікеева і Нямкевіча. Перад імі ставілася задача: «...в случае вынужденного отхода Красной Армии из Речицкого района и временного занятия его противником оставаться на территории района и непрерывными диверсиями парализовывать движение противника по железной дороге на участке Гомель — Калинковичи и шоссейными дорогами на участке Гомель — Калинковичи, Речица — Уваровичи, Речица — Лоев, взрывать мосты, производить крушение поездов, минировать отдельные участки шоссейных и грунтовых дорог, уничтожать базы горючего, боеприпасов и продовольствия, уничтожать танки и авиатранспорт противника, забрасывать их бутылками с горючим».

Групы не змаглі, ды і не маглі па аб'ектыўных абставінах выканаць задачы, пастаўленыя перад імі. З кіраўнікоў груп толькі М. Ф. Турчынскі добра ведаў раён і людзей.

Няма звестак, пацверджаных дакументамі ці ўспамінамі, аб значнай дыверсійнай дзейнасці групы Нямкевіча. На рахунку ж групы Анікеева тры спаленыя драўляныя масты: 20-метровы на шашы Гомель — Калінкавічы, 30-метровы — на прасёлку Будка-Цішкаўка, 40-метровы праз рэчку Ведрыч каля вёсак Коззе і Дземяхі. Але неўзабаве Цярэнцій Сяргеевіч Анікееў быў схоплены фашыстамі і расстраляны.

Разграміўшы мясцовыя партызанскія атрады, карныя органы нямецка-фашысцкіх акупантаў на першым часе маглі быць задаволенымі, бо значных дыверсій на тэрыторыі Рэчыцкага і Васілевіцкага раёнаў не было на працягу некалькіх месяцаў.

Пазбавіўшыся на пэўны перыяд магчымасці наносіць адчувальныя ўдары з лесу, патрыёты Рэчыцы і раёна актыўную барацьбу павялі з ворагам праз падпольную дзейнасць.

Так, у Холмецкім сельсавеце дзейнічалі дзве падпольныя патрыятычныя групы — камсамольская і партыйная. Камсамольская, у якую ўваходзіла моладзь вёсак Холмеч і Завужаль, была створана ў жніўні 1941 года. На першым часе хлопцы і дзяўчаты з'яўляліся байцамі мясцовага знішчальнага атрада. Яны ажыццяўлялі ахову вёсак, што ўваходзілі ў састаў сельсавета, сачылі за тым, каб у населеныя пункты не прабраліся варожыя дыверсанты, неслі дзяжурства на назіральнай вышцы. Нярэдка пераязджалі за Дняпро з мэтай разведкі: ці не ўдалося фашыстам высадзіць тут дэсант?

Перад непасрэдным прыходам немцаў у Холмеч шмат хто з хлопцаў, якія мелі прызыўны ўзрост, адправіліся на фронт. Астатнія, хто застаўся ў знішчальным атрадзе, пайшлі ў лес. Неўзабаве некаторыя падаліся за лінію фронту, астатнія вярнуліся дамоў, сталі членамі падпольнай групы. Яе узначальваў Міхаіл Фёдаравіч Яўланчык. Членамі групы з'яўляліся камсамольцы Уладзімір Іванавіч Саматкан, Мікалай Іванавіч Назаранка, Марыя Пятроў-

на Худароба, Уладзімір Сцяпанавіч Малчанаў, Леанід Арцёмавіч Маторны, Мікалай Іванавіч і Леанід Іванавіч Вашчылы.

Партыйную ж падпольную групу вёскі Холмеч узначальваў Фёдар Паўлавіч Севераў. У саставе групы былі таксама: Мікалай Сямёнавіч Вайтовіч, Іван Цярэнцьевіч Назаранка, Іван Ульянавіч Саматкан, Іван Фёдаравіч Вашчыла, Лідзія Захараўна Кулік, Фёдар Фядосавіч Яўланчык, Ніна Васільеўна Кот, Пётр Пятровіч Худароба, Надзея Ульянаўна Шугаеўская. Сувязнымі з'яўляліся Феня Ульянаўна Шурпа, Кацярына Ульянаўна Сыс, Людміла Мікалаеўна Вайтовіч.

Патрыятычныя групы вёсак Холмеч і Завужаль распаўсюджвалі інфармацыю аб становішчы на фронце, вялі сярод вяскоўцаў работу, накіраваную на зрыў мерапрыемстваў, праводзімых акупантамі. Збіраліся даныя, звязаныя з дыслакацыяй варожых падраздзяленняў і паліцэйскіх гарнізонаў. Назапашвалася зброя, прадукты харчавання, адзенне і медыкаменты. Усё гэта накіроўвалася ў партызанскія атрады. Члены груп хавалі параненых народных мсціўцаў, вывозілі з Рэчыцы падпольшчыкаў, якім пагражала небяспека арышту. Камсамольцы Мікалай Назаранка і Уладзімір Саматкан нярэдка падслухоўвалі размовы па тэлефоне паміж паліцыяй Рэчыцы і Лоева, Мікалай Еўланчык і Леанід Вашчыла праводзілі разведку паліцэйскага гарнізона, што размяшчаўся ў вёсках Нагорнае і Рудня. Член падпольнай камсамольскай патрыятычнай групы Мікалай Вашчыла ў пачатку сакавіка 1942 года вывеў з Рэчыцы сакратара падпольнага райкама камсамола М. С. Храмчанка, якая жыла ў раённым цэнтры на нелегальным становішчы. Уладзімір Саматкан і Міхаіл Яўланчык адвозілі ў лес муку, сабраную мясцовым млынаром Гарбачовым.

З падполлем былі цесна звязаны некаторыя з акружэнцаў, якія змагаліся з ворагам на фронце, але пры адступленні не змаглі прабіцца да сваіх. Гэта — І. В. Васільеў, І. Курбацкі, Л. Дубінін. Па заданню падпольшчыкаў яны пайшлі служыць у паліцыю, збіралі звесткі пра ворага, а ў ліпені 1942 года дапамаглі партызанам разграміць мясцовы паліцэйскі гарнізон. Пасля гэтага і самі сталі партызанамі.

Члены падпольных груп вёсак Холмеч і Завужаль мелі цесную сувязь з такімі арганізатарамі партызанскага руху ў Рэчыцкім раёне, як М. Ф. Турчынскі, Д. М. Кузьмянок, І. Ц. Назаранка. З лістапада 1941 года такая ж сувязь падтрымлівалася і з патрыётамі вёсак Церабееўка, Пракісель, Ровенская Слабада.

А. В. Карбаценка

З канца жніўня 1941 года распачала патрыятычную дзейнасць падпольная група вёскі Гарноўка. Касцяком яе стала сям'я Рацыборскіх.

Палымянымі патрыётамі ў перыяд часовай акупацыі раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі паказала сябе сям'я Грабенчукоў з вёскі Мілаград.

З кастрычніка 1941 года распачынае патрыятычную дзейнасць падпольная група вёскі Свірыдавічы, якую ўзначальваў А. В. Карбаценка.

У вёсках Пасека і Андрэеўка актыўную работу, накіраваную на зрыў мерапрыемстваў акупантаў, праводзілі сярод насельніцтва члены партыі Рыгор Іванавіч і Сцяпан Іванавіч Васільцы, кандыдат у члены партыі Платон Майсеевіч Васілец. Членамі падпольнай патрыятычнай групы былі таксама Рыгор Ісакавіч Васілец, Савелій Аркадзьевіч Мурашка, Фядот Васільевіч Дворнік, Рыгор Рыгоравіч Сівуха, Мікалай Адамавіч Звяртоўскі і Фёдар Дзяніса-віч Васілец.

У канцы 1942 года пад пагрозай арышту група ў поўным саставе вымушана была пайсці ў партызанскі атрад.

Барацьбу з фашыстамі, поўную нягод і небяспекі, вяла і падпольная патрыятычная група вёскі Ровенская Слабада. Узначальваў яе член партыі, былы старшыня калгаса «Гігант» Адам Цітавіч Дворнік.

Малалікай, але па-сапраўднаму баявой была падпольная патрыятычная група вёскі Вятхінь. Рашэннем раённага камітэта па-

ртыі яе ўзначаліў былы старшыня Артукоўскага сельсавета Мірон Лукіч Саламаха. Разам з ім змагаліся з ворагам камуністы Іван Савельевіч Фрол і Яфрэм Дзянісавіч Манькоў, кандыдат у члены партыі Емяльян Прохаравіч Глушак, беспартыйны Кузьма Паўлавіч Чарнецкі. Члены групы былі заўсёды сярод людзей, неслі ім праўду аб становішчы на фронце, здабывалі каштоўныя даныя аб варожых гарнізонах і перадавалі іх партызанам.

У жніўні 1942 года гітлераўцы даведаліся аб дзейнасці ў Вятхіні падпольнай патрыятычнай групы. М. Л. Саламаха, Я. П. Глушак, Я. Д. Манькоў і К. П. Чарнецкі былі арыштаваны, а неўзабаве і расстраляны. Уратавацца ўдалося толькі І. С. Фролу, які крыху раней трагічных падзей стаў партызанам атрада імя Варашылава.

Для разгортвання патрыятычнай падпольнай дзейнасці ў вёсцы Церабееўка раённы камітэт партыі пакінуў былога старшыню калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Сцяпана Данілавіча Малчанава. І ён з гонарам апраўдаў давер таварышаў. Адразу ж,як толькі раён акупіравалі фашысты, пачаў збіраць вакол сябе мужных духам, гатовых да рашучай барацьбы з ворагам. Менавіта такімі людзьмі былі Мітрафан Іванавіч Мельнікаў, Сяргей Піменавіч Пархоменка і Алена Данілаўна Гурская (Хадоркіна), якія і сталі членамі падпольнай патрыятычнай групы вёскі Церабееўка.

Дзейнасць гэтай групы была заўважана акупацыйнымі карнымі органамі. У ліпені 1943 года фашысты схапілі кіраўніка групы С. Д. Малчанава. Пасля катаванняў ён быў расстраляны. Астатнім членам групы ўдалося, пакінуўшы вёску, прыйсці ў партызанскі атрад.

Жнівень 1941 — ліпень 1943 года — перыяд дзейнасці падпольнай патрыятычнай групы вёскі Борхаў. У яе састаў уваходзілі медыцынскія работнікі — М. Я. Долгая, Д. П. Галімская, сёстры Сірыкавы.

У лістападзе 1941 года падпольная патрыятычная група моладзі была створана ў вёсцы Салтанова. У яе ўваходзілі браты Іван і Віктар Петраўцы, Леанід Лагоўскі, Андрэй Майстрэнка, Рыгор Курс, Віктар Сяўрук, Іван Курс, Кайданаў. Сувязной з'яўлялася Люба Мацкевіч (Кузьмянок).

У маі 1942 года каля вёскі Салтанова быў узарваны чыгуначны мост. Прыехалі карнікі, якія хацелі расправіцца з партызанскімі сем'ямі. Даведаўшыся пра тое, члены мясцовай патрыятычнай групы адправіліся ў партызанскі атрад.

Пасля акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі Васілевіцкага раёна распачынае патрыятычную дзейнасць мясцовае партыйна-камсамольскае падполле. Ягоным кіраўніком з'яўляўся член партыі, былы загадчык дарожнага аддзела райвыканкама Ціхан Мінавіч Астапенка.

Вясной 1942 года ў Васілевічах дзейнічалі звыш 30 падпольшчыкаў, якія ўваходзілі ў 5 груп. У выніку здрады падполле было раскрыта гестапаўцамі. 32 патрыёты былі закатаваны і расстраляны *(Аб дзейнасці Васілевіцкага падполля чытайце матэрыял В. Сяргеевай «У глыбокім тыле фашыстаў»).*

Суровыя выпрабаванні выпалі і на долю Рэчыцкага гарадскога партыйна-камсамольскага падполля, якое налічвала больш за 40 змагароў *(Чытайце матэрыял І. А. Шафір «Іх не забудуць ніколі»).*

...Пасля разгрому ў сярэдзіне верасня 1941 года Рэчыцкага партызанскага атрада М. Ф. Турчынскі, Дз. М. Кузьмянок, А. Я. Міхайлаў, Ф. М. Статкевіч, а некалькі пазней і А. М. Акунёў прыбылі на базу Гомельскага падпольнага абкама партыі. Атрымалі згоду першага сакратара абкама І. П. Кожара на тое, каб застацца на правах асобнай групы пры Лоеўскім атрадзе.

Неўзабаве М. Ф. Турчынскі наладзіў сувязь з падпольнымі патрыятычнымі групамі вёсак Холмеч, Завужаль, Вятхінь, Церабееўка, Пасека, Ровенская Слабада.

4 красавіка 1942 года М. Ф. Турчынскі, А. Я. Міхайлаў, Дз. М. Кузьмянок і Ф. М. Статкевіч пакінулі Лоеўскі атрад і накіраваліся ў Рэчыцкі раён з мэтай распачаць непасрэдную работу па адраджэнню партызанскага атрада. У вёсцы Завужаль сустрэліся з другім сакратаром Рэчыцкага падпольнага райкама камсамола Марыяй Сцяфанаўнай Храмчанка, якая ў жніўні 1941 года рашэннем РК КП(б) Б была пакінута ў раёне для падпольнай работы. 5 красавіка, атрымаўшы ад М. С. Храмчанка інфармацыю аб гарадскім падполлі, група М. Ф. Турчынскага накіравалася да вёскі Ровенская Слабада, дзе і вырашана было стварыць партызанскі атрад.

Неўзабаве М. С. Храмчанка вярнулася ў Рэчыцу, паведаміла таварышам па падполлі, дзе іх будуць сустракаць, калі яны пачнуць выходзіць з горада, каб далучыцца да партызан.

І. П. Кожар

Такім чынам, у маі 1942 года быў адноўлены рэчыцкі партызанскі атрад імя К. Я. Варашылава. Камандзірам яго быў прызначаны М. Ф. Турчынскі, камісарам А. Я. Міхайлаў.

У чэрвені атрад здзейсніў 7, а ў ліпені — 10 нападзенняў на варожыя аб'екты. З іх дыверсій на чыгункі — 7, на гарадскіх прадпрыемствах — 3. Былі ліквідаваны 5 валасных управаў.

У пачатку восені атрад браў удзел у разгроме добра ўмацаванага фашысцкага апорнага пункта ў вёсцы Ручаёўка Лоеўскага раёна.

9 кастрычніка 1942 года М. Ф. Турчынскі павёў ударную групу атрада да вёскі Узнаж, каб разам з групай байцоў гомельскага атрада «Бальшавік» на чале з Е. І. Барыкіным разграміць варожыя гарнізоны на тэрыторыі раёна.

Была праведзена разведка. Сувязная Вольга Квяткоўская паведаміла: у вёсцы звыш 70 гітлераўцаў.

12 кастрычніка быў бой. Частка гітлераўцаў была перабіта, шмат хто паранены.

У баі загінулі партызаны П. І. Баранаў, С. П. Нацыеўскі, С. Н. Давыдзенка.

Поспех пры разгроме варожых гарнізонаў у вёсках Ручаёўка і Узнаж паказаў: партызаны здольны наносіць акупантам адчувальныя ўдары. Кіраўніцтва рэчыцкага атрада імя К. Я. Варашылава пачало падрыхтоўку да разгрому гарнізонаў у вёсках Новы Барсук, Заспа і інш.

29 чэрвеня 1942 года Гомельскі абкам КП(б)Б (у Маскве) прыняў рашэнне стварыць Рэчыцкі падпольны партыйны цэнтр і зацвердзіў ягоны састаў: Я. Н. Барсукоў (кіраўнік), які знаходзіўся ў Віцебскай вобласці, з'яўляўся камісарам партызанскай брыгады і сакратаром Мехаўскага падпольнага райкама КП(б)Б; В. П. Палавінка, А. С. Маліноўская.

Трэцяга ліпеня ў састаў Рэчыцкага падпольнага партыйнага цэнтра быў уведзены М. С. Арбузаў.

А. С. Маліноўская, В. П. Палавінка з групамі пад кіраўніцтвам М. С. Арбузава і К. І. Драздова ў верасні 1942 года праз «Суражскія вароты» выйшлі на тэрыторыю Васілевіцкага раёна. Спыніліся на адпачынак у 6 кіламетрах ад вёскі Узнаж. Група на чале з В. П. Палавінкам накіравалася ў вёску, каб здабыць прадуктаў. Неўзабаве на месцы прывалу ўсчалася ружэйна-кулямётная стралянінa, пачуліся ўзрывы гранат. Калі В. П. Палавінка і ягоныя байцы прыбеглі ў лагер, то ўбачылі жудасны малюнак: усе, з кім прыйшлі ў Васілевіцкі раён, забітыя. Фашысты знявечылі трупы камандзіраў: гомельскай групы — Кузьмы Іванавіча Драздова, рэчыцкай — Мікалая Сяргеевіча Арбузава, былой работніцы Дамановіцкага РК КП(б)Б Аўрэліі Сцяпанаўны Маліноўскай, якая мела заданне ўзначаліць Гомельскую раённую партыйную арганізацыю.

24 лістапада В. П. Палавінка склікаў аргбюро падпольнага райкама КП(б)Б для абмеркавання саставу Рэчыцкага падпольнага райкама партыі. Сакратаром быў абраны В. П. Палавінка, членамі райкама — А. Я. Міхайлаў, М. Ф. Турчынскі і У. Р. Хамянок. Месцам знаходжання падпольнага райкама стала база атрада імя К. Я. Варашылава.

8 лістапада 1942 года партызанскія разведчыкі прынеслі вестку: Лоеў заняты ўкраінскімі партызанскімі злучэннямі пад камандаваннем С. А. Каўпака і А. Н. Сабурава, якія выконваюць важнае заданне па разгрому варожых гарнізонаў у тыле нямецка-фашысцкіх войск. Камандаванне атрада імя К. Я. Варашылава накіравала ў вёску Стары Барсук, дзе знаходзіўся штаб С. А. Каўпака, некалькі сувязных. Найбольш каштоўнай інфармацыяй аб гарнізонах на тэрыторыі раёна і ў Рэчыцы з С. А. Каўпаком падзяліліся Каця Сівуха, Валянціна Блёскіна і Алена Катлабай.

13 лістапада ў штаб Каўпака, які перадыслацыраваўся ў вёску Лясное, прыбылі прадстаўнікі партызанскіх атрадаў паўднёвай зоны Гомельшчыны. Ад рэчыцкага атрада імя К. Я. Варашылава — М. Ф. Турчын-

Каўпакаўцы-рэчычане на адпачынку.
Злева направа:
В. А. Кашыцкі, К. М. Бліш,
М. Р. Васілец, А. І. Тарасенка

Разведчыкі-каўпакаўцы

скі, ад раённай партыйнай арганізацыі — В. П. Палавінка. Было прынята рашэнне аб сумесным удары ўкраінскіх і беларускіх партызан сіламі батальёна каўпакаўцаў і роты атрада імя К. Я. Варашылава па чыгуначнай станцыі Дземяхі.

Фашысцкі гарнізон на станцыі Дземяхі быў атакаваны ў ноч на 16 лістапада. Партызаны вывелі са строю сувязь, станцыйнае абсталяванне, разбурылі ўчастак чыгуначнага палатна. Страты ў жывой сіле былі з абодвух бакоў, бо фашысты чакалі нападу і падрыхтаваліся да яго.

У той жа дзень, 16 лістапада, партызанскія злучэнні Каўпака і Сабурава рушылі на захад, углыб варожага тылу, каб і там наносіць гітлераўцам адчувальныя ўдары. Украінскія злучэнні папоўнілі сотні жыхароў Рэчыцкага раёна. Каўпакаўцамі сталі 35 чалавек толькі з вёскі Новы Барсук.

У лістападзе камандзірам партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава быў прызначаны М. П. Аніпка, змяніўшы на гэтай пасадзе М. Ф. Турчынскага.

19 снежня ў атрадзе быў наладжаны першы канцэрт мастацкай самадзейнасці. Галоўная заслуга ў тым Марыі Каракі, Людмілы Блёскінай, Аляксандры Лісоўскай, Алены Дзяцінавай, сакратара падпольнага райкама камсамола У. Хамянка, М. П. Аніпкі.

Вялікая ўвага надавалася ў атрадзе ідэалагічнай рабоце. Партызанскія агітатары і прапагандысты наведваліся ў вёскі раёна, чыталі людзям зводкі Саўінфармбюро і газеты. Дзейнасць агітатараў і прапагандыстаў асабліва актывізавалася пасля перададзенага 23 лістапада 1942 года па радыё паведамлення, што Чырвоная Армія перайшла пад Сталінградам у контрнаступленне, акружыўшы і знішчыўшы перад гэтым 33 нямецка-фашысцкія дывізіі.

Пасля гэтай падзеі партызанскія атрады пачалі хутка папаўняцца за кошт насельніцтва, якое дагэтуль вагалася.

У снежні атрад імя К. Я. Варашылава разграміў варожыя гарнізоны ў Холмечах, Заспе, Маканавічах.

У канцы снежня ў Амелькаўскіх лясах сканцэнтраваліся значныя партызанскія сілы. Прыйшоў батальён украінскага злучэння Сабурава, які ў складанай абстаноўцы згубіў сувязь са штабам злучэння. Былі вымушаны часова пакінуць свае раёны жлобінскія, уваравіцкія, буда-кашалёўскія атрады. Праходзячы праз тэрыторыю Рэчыцкага раёна, яны здзяйснялі дыверсіі на чыгункі, уступалі ў сутычкі з варожымі гарнізонамі. Атрад імя В. І. Чапаева напаў на Узнажскі гарнізон, адабраў у карнікаў статак кароў і вярнуў іх жыхарам вёскі Стара-Краснае, раскруціў рэйкі на перагоне Рэчыца — Васілевічы, абстраляў цягнік.

Канцэнтрацыя партызанскіх сіл не засталася незаўважанай. Гітлераўцы таксама актывізавалі сваю дзейнасць. Цяжкі бой з карным атрадам давялося вытрымаць у пачатку 1943 года 7-ай роце атрада імя К. Я. Варашылава.

У баі забіты многія карнікі. Партызаны ўзялі трафеі: 3 ручныя кулямёты, 2 аўтаматы, 27 вінтовак.

Партызаны страцілі члена падпольнага райкама партыі Міхаіла Пацеенку, быў цяжка паранены Павел Лішафаеў.

24 студзеня 1943 года ў штабе Гомельска-

М. П. Аніпка

га партызанскага злучэння адбылася нарада камандзіраў атрадаў. М. П. Аніпка выказаўся за пераход у іншае месца.

Назаўтра разведчыкі Іван Суслікаў, Міхаіл Жураў і Уладзімір Маянц прывялі ў лагер афіцэра славацкай арміі Ладзіслава Дынду, які паведаміў: нямецкае камандаванне ведае аб колькасным саставе і размяшчэнні Гомельскага партызанскага злучэння. Супраць партызан сцягваюцца значныя сілы. Фашысты ўдакладняюць месцы базіравання партызанскіх атрадаў.

27 студзеня ў 10 гадзін раніцы атрады злучэння ўзялі кірунак на Акцябрскі раён. Да канца дня мінулі населеныя пункты, у якіх знаходзіліся варожыя гарнізоны. Досвіткам 28 студзеня падышлі да чыгункі Рэчыца — Калінкавічы. Па глыбокім снезе і бездарожжы прайшлі 40 кіламетраў. Шмат хто быў абмарожаны.

Разведка прынесла вестку: на станцыю Дземяхі прыбыў варожы браняпоезд. На падыходзе вайсковыя падраздзяленні. Камандаванне злучэння адмовілася ад першапачатковага плана перайсці чыгунку праз пераезд Крынкі. Месца пераходу было абрана непадалёку ад вёскі Бабічы.

Раніцай 29 студзеня штаб злучэння спыніўся ў вёсцы Валадарск. Атрады занялі вёскі Будка Шыбенка, Гарноўка, Першамайск, Балашаўка, Маскалі.

Вечарам партызаны зноў рушылі ў дарогу. Досвіткам 30 студзеня атрад імя К. Я. Варашылава выбіў фашыстаў з вёскі Дуброва. У якасці трафеяў былі ўзяты 3 ручныя кулямёты і 8 вінтовак.

Да 11 гадзін 30 студзеня партызанскія атрады былі па-за межамі Рэчыцкага раёна. У лесе на паўночны захад ад Рэчыцы засталіся толькі атрады імя Шчорса і Чапаева, камандзіры якіх Андрэй Пракопавіч Байкоў і Мікалай Дзянісавіч Сцефановіч атрымалі згоду абласнога камітэта партыі і камандавання злучэння на тое, каб не адыходзіць.

Ноччу 3 лютага партызанскія атрады поўдня Гомельшчыны прыбылі ў гарпасёлак Акцябр, дзе ў гэты час дыслацыравалася брыгада Героя Савецкага Саюза Фёдара Іларыёнавіча Паўлоўскага. Штаб злучэння спыніўся ў вёсцы Карпілаўка, а рэчыцкі атрад імя К. Я. Варашылава — у вёсцы Шкава.

У ноч з 19 на 20 лютага атрады Гомельскага злучэння ўзялі кірунак на месца ранейшай дыслакацыі.

Фашысты сачылі за Гомельскім злучэннем, мелі намер перарэзаць атрадам дарогу назад сіламі трох гарнізонаў — шацілкаўскага, васілевіцкага і калінкавіцкага. Але не паспелі заняць зыходных пазіцый.

Каля вёскі Хутар завязаўся бой. Асноўны цяжар лёг на рэчыцкі атрад імя К. Я. Варашылава. Фашысты адступілі, пакінуўшы багатыя трафеі.

Вечарам 22 лютага, мінуўшы без прыпынку вёску Узнаж, партызанскія атрады прыйшлі ў вёску Валадарск. Тут спыніліся штаб злучэння і атрад імя К. Я. Варашылава. Атрад «Балышавік» — у вёсцы Маскалі, атрад «За Радзіму» — у Балашаўцы, атрад «Смерць фашызму» — у вёсцы Святое. Некаторыя з падраздзяленняў накіраваліся ў вёскі Гарноўка і Будка Шыбенка.

У штаб злучэння прыбылі камандзіры атрадаў імя Шчорса і імя Чапаева — А. П. Байкоў і М. Д. Сцефановіч. Далажылі: за час, як злучэнне знаходзілася на Акцябршчыне, іхнія атрады разгромілі гарнізоны ў Елізаравічах і Дуброве, 10 лютага вялі бой з карнікамі каля вёскі Валадарск, зрабілі ўдалы напад на нямецкі маёнтак Ведрыч.

У пачатку сакавіка 1943 года па ініцыятыве В. П. Палавінкі і М. П. Аніпкі атрад імя К. Я. Варашылава пачаў базіравацца ў паўночнай частцы Рэчыцкага раёна. Ён вылучыў групу вопытных байцоў і камандзіраў, якія разгарнулі баявыя дзеянні ў асноўным на чыгунцы. Быў сфарміраваны новы атрад, які атрымаў назву «Мсціевец». Атрад узначаліў Іван Рыгоравіч Баруноў. Спачатку ён быў радавым партызанам, а потым паказаў сябе здольным камандзірам,

І. Р. Баруноў

прыняўшы 7-ую роту атрада імя К. Я. Варашылава.

Было прынята рашэнне аб базіраванні на тэрыторыі Рэчыцкага раёна абкамаў партыі і камсамола. Гэта давала магчымасць больш аператыўна ўплываць на баявую дзейнасць жлобінскіх, стрэшынскіх, уваравіцкіх і буда-кашалёўскіх атрадаў, мець пастаянную сувязь са штабамі Палескага і Мінскага злучэнняў, прадстаўнікамі ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ.

З 25 красавіка па 2 мая 1943 года прайшлі нарады каманднага саставу партызанскіх атрадаў Гомельскага злучэння. У ходзе іх была прааналізавана баявая дзейнасць, прынята рашэнне за кожнай брыгадай і кожным атрадам замацаваць пэўны ўчастак чыгункі і шашы, пачаць дзейсную падрыхтоўку да масавага разбурэння чыгуначнага палатна. Рэкамендавалася браць прыклад з лепшых падрыўнікоў. Пры гэтым называліся прозвішчы Андрэя Батуры, Ульяна Смоліча і Сямёна Шмаргунова — байцоў рэчыцкага атрада імя К. Я. Варашылава. На рахунку А. П. Батуры была баявая аперацыя па знішчэнню Герхарда, бургамістра Рэчыцы, якую ён здзейсніў разам з камсамольцам Фёдарам Вішняком.

10 мая 1943 года камандаванне Гомельскага злучэння атрымала звесткі, што ў Рэчыцу і Васілевічы прыбываюць варожыя часці.

13 мая карнікі зрабілі нечаканы напад на лоеўскі атрад «За Радзіму». У гэты ж дзень страшэнны крывавы след яны пакінулі ў вёсцы Кабылева (цяпер Першамайск) — расстралялі і спалілі 1050 мірных жыхароў. *(Гл. Акт надзвычайнай камісіі па вёсцы Кабылева, успаміны сведкаў трагічных падзей, спісы загінуўшых.)*

21 мая фашысты ў колькасці да тысячы салдат і афіцэраў занялі вёскі Гарноўка і Глыбаў. Партызаны сіламі трох атрадаў — імя К. Я. Варашылава, імя В. І. Чапаева і ўваравіцкага імя М. А. Шчорса прынялі бой. Агульнае камандаванне ў ходзе бою ажыццяўляў М. П. Аніпка. Ён цягнуўся 8 гадзін. Фашысты былі вымушаны адступіць.

10 чэрвеня ў штаб Гомельскага злучэння паступіла інфармацыя з Рэчыцы: у горад уступаюць новыя варожыя падраздзяленні. На другі дзень фашысты пачалі прыбываць і ў Васілевічы. У Рэчыцы былі сканцэнтраваны 1800 варожых салдат і афіцэраў, на станцыі Дземяхі — 700, у Бабічах — 800, у Васілевічах — каля 3 тысяч. Фашысты мелі на ўзбраенні 7 танкаў, 9 бронемашын, 2 гарматныя батарэі, кулямёты і мінамёты.

Стала зразумелым: фашысты рыхтуюцца да чарговай аперацыі супраць партызан.

Раніцай 12 чэрвеня немцы з'явіліся ў вёсцы Будка-Шыбенка. Прыехалі на аўтамашыне і 13 матацыклах. Застава атрада імя К. Я. Варашылава адкрыла агонь, прымусіла карнікаў адступіць. У гэты ж дзень, 12 чэрвеня, сутычкі з фашыстамі мелі месца і каля іншых населеных пунктаў раёна, што ўваходзілі ў партызанскую зону.

Камандаванне партызанскага злучэння насцярожыла тое, што карнікі, сутыкнуўшыся з партызанамі, не аказвалі належнага супраціўлення, а спешна адступалі. Быў зроблены вывад: вораг стараецца прыцягнуць увагу камандавання злучэння да раёна вёсак Валадарск і Гарноўка. А калі сілы партызан будуць звязаны боем менавіта тут, вораг разлічвае падраздзяленнямі, якія скапіліся ў Васілевічах, выйсці ў партызанскі тыл і, прыціснуўшы атрады да Бярэзіны і Дняпра, разграміць іх там.

У штабе злучэння адбылася нарада. М. П. Аніпка рашуча выказаўся за тое, каб, не прымаючы бою, адысці на захад. Камандзір рэчыцкага атрада імя К. Я. Варашылава зыходзіў з таго, што боепрыпасаў зусім мала.

Было прынята рашэнне: усім атрадам выйсці на паўночны захад ад вёскі Узнаж, каб там, калі давядзецца, даць карнікам бой. Атраду імя К. Я. Варашылава належала пакінуць адну роту ў раёне вёскі Валадарск, а калі з'явяцца фашысты — абстраляць іх і адысці да сваіх асноўных сіл.

Былі прыняты меры па мініраванню лясных дарог, па якіх маглі рухацца карнікі. Вылучаліся манеўровыя групы. Перад імі ставілася задача абстрэльваць фашыстаў, прымушаць разгортваць падраздзяленні раней часу.

Да раніцы 13 чэрвеня штаб злучэння і ўсе атрады перамясціліся ў лясны масіў за 2 кіламетры на захад ад вёскі Узнаж.

У 5 гадзін над лесам з'явіўся варожы самалёт, абстраляў з кулямёта раён вёсак Валадарск — Узнаж. У 10 гадзін рота атрада імя К. Я. Варашылава каля Валадарска сустрэла падраздзяленне карнікаў. У 11 гадзін у вёску Узнаж гітлераўцы прыбылі на 80 аўтамашынах, з боку вёскі Васількова — да 400 салдат і афіцэраў. Размясцілі на агародах 2 артылерыйскія батарэі, паставілі мінамёты.

Асноўныя сілы партызанскіх атрадаў змаглі своечасова выйсці за знешняе кальцо акружэння. На ўскрайку лесу на паўночны захад ад Узнажа абарону заняў буда-кашалёўскі атрад імя В. І. Чапаева. Справа ад чапаеўцаў — частка атрада імя К. Я. Варашылава. Злева — уваравіцкі атрад імя М. А. Шчорса.

Фашысты пачалі акопвацца каля вёскі Чарнейкі, канцэнтраваліся на ўскраіне вёскі Осаў.

Камандаванне партызанскага злучэння накіравала да Осава атрад «Бальшавік», да Чарнеек пайшлі рота атрада імя К. Я. Варашылава і рагачоўскі атрад імя Р. І. Катоўскага. Перад імі стаяла задача: да канца дня ўтрымліваць дарогу Осаў — Шоўкавічы — Сведскае, тым самым забяспечыць магчымасць адыходу асноўных сіл злучэння.

У 12 гадзін дня атрад імя В. І. Чапаева распачаў бой з фашыстамі ў колькасці да 600 салдат і афіцэраў. Падпусціўшы карнікаў, партызаны адкрылі шчыльны ружэйна-кулямётны агонь. Вораг адступіў, але неўзабаве зноў рушыў у наступ. Атрад імя В. І. Чапаева пачаў адступаць углыб лесу. Падраздзяленні фашыстаў пасунуліся следам, падставіўшы пад удар свой правы фланг. Гэта скарысталі атрад імя С. М. Кірава і 1-ая рота атрада імя М. А. Шчорса. Атакавалі карнікаў, прымусілі іх адступіць на зыходныя пазіцыі.

Не мела поспеху і трэцяя па ліку варожая атака. Тады фашысты зноў адкрылі інтэнсіўны агонь з гармат і мінамётаў. У паветры ўвесь час вісеў варожы самалёт, які карэкціраваў цэлі для ўдару. Але

У. Панятоўскі

асноўныя партызанскія сілы знаходзіліся ў глыбіні лесу.

Пасля агнявога налёту гітлераўцы зрабілі яшчэ адну спробу разбіць партызан. Занялі ўскраіну лесу і паглыбіліся ў яго на 700—800 метраў. Сітуацыя была для партызан нялёгкай. Але зыход бою ў многім вырашылі групы аўтаматчыкаў і 2-ая рота атрада імя М. А. Шчорса, якіх камандаванне злучэння своечасова накіравала з мэтай аказання атрадам дзейснай дапамогі.

Дзень хіліўся да канца, боепрыпасы былі на зыходзе. Атрады, якія займалі абарону на паўночны захад ад вёскі Узнаж, атрымалі загад заставацца пакуль на месцы, усімі сіламі стрымліваць ворага. А калі будзе зусім цяжка — агнём прымусіць карнікаў залегчы, хутка адступіць і далучыцца да асноўных сіл.

Калі сцямнела, партызанскі абоз зняўся з месца і ўзяў кірунак на захад. Пачалася навальніца. Фашысты заўважылі партызанскі адыход. Зрабілі спробу дагнаць абоз. Аднак бронемашыны, якія рухаліся ўперадзе калоны карнікаў, заселі ў гразі.

Даведаўшыся, што абоз у бяспечным месцы, усе партызанскія атрады зняліся і рушылі на захад.

За ноч быў зроблены пераход у 20 кіламетраў. На наступную ноч удалося прайсці яшчэ столькі ж.

Праз 10 дзён партызаны атрада імя К. Я. Варашылава зноў вярнуліся на тэрыторыю Рэчыцкага раёна. Даведаліся: сваю злосць гітлераўцы вылілі на мірнае насельніцтва. Спалілі дзесяткі населеных пунктаў, закатавалі і расстралялі сотні людзей.

У чэрвені 1943 года камандаванне Гомельскага злучэння і падпольны абкам

партыі вырашылі пытанне аб рэарганізацыі рэчыцкага партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава ў брыгаду. Камандзірам яе быў прызначаны М. П. Аніпка, камісарам — В. П. Палавінка. Атрад імя К. Я. Варашылава прыняў П. І. Васільеў, імя М. В. Фрунзе — М. Ф. Турчынскі, імя С. М. Будзённага — А. П. Еўтухоў. Камісарамі атрадаў сталі адпаведна С. А. Ягудкін, Д. Ц. Шыбінскі, К. І. Раманаў. Неўзабаве рашэннем упаўнаважанага ЦК КП(б)Б па Гомельскай вобласці М. Ф. Турчынскі быў накіраваны на курсы ў Маскву. Атрад ад яго прыняў У. С. Ціхвінскі.

21 ліпеня 1943 года абласны камітэт партыі і штаб Гомельскага злучэння атрымалі загад Цэнтральнага штаба партызанскага руху: распачаць энергічную падрыхтоўку да «рэйкавай вайны».

21 ліпеня стала для рэчыцкіх партызан адметным яшчэ адной гераічнай і ў той жа час трагічнай падзеяй. Камсамольцы Уладзімір Палавінка, Уладзімір Панятоўскі і Уладзімір Канеў ажыццявілі дыверсію на Рэчыцкім лесапільным заводзе. Мінай, падкладзенай імі, было падарвана машыннае аддзяленне. Канеў і Панятоўскі ў час выбуху загінулі. Палавінка адарваўся ад пагоні і прыбыў у атрад «Мсцівец».

1 жніўня з Масквы быў атрыманы загад у ноч з 3 на 4 жніўня распачаць аперацыю «рэйкавая вайна».

У вызначаны час чыгуначнае палатно ад станцыі Прыбар да Васілевіч ускалыхнулі сотні ўзрываў. Асноўны ўдзел у аперацыі прынялі падрыўнікі брыгады імя К. Я. Варашылава, асобага атрада «Мсцівец» і асобага атрада імя С. М. Кірава, які быў створаны ў маі 1943 года.

Увогуле, жнівень быў надзвычай плённым для рэчыцкіх партызан. Аб размаху барацьбы з акупантамі яскрава сведчаць падзеі нават аднаго дня — 18 жніўня 1943 года.

У ноч на 18 жніўня камсамольска-падрыўная група ў саставе 5 чалавек на чале з Ульянам Смолічам на перагоне Якімаўка — Прыбар пусціла пад адхон эшалон працаўніка з жывой сілай і тэхнікай. Пры гэтым былі знішчаны паравоз і вагоны. Гэтай жа ноччу дыверсійная група ў саставе Мікалая Кручкова, Барыса Фіськова і партызана Івана Тарасава ўзарвала чыгуначную вадакачку на станцыі Прыбар. Камсамольцы з атрада імя К. Я. Варашылава пад кіраўніцтвам намесніка камісара па камсамолу Фёдара

Падрыхтоўка да баявога задання дыверсійнай групы У. Я. Смоліча (першы злева)

Еўтушкова днём на перагоне Рэчыца — Дземяхі ўзарвалі 215 чыгуначных рэек. Другая падрыўная камсамольская група пад камандай Нікіткава вечарам гэтага ж дня на перагоне Бабічы — Васілевічы пусціла пад адхон эшалон працаўніка, у выніку чаго былі знішчаны 1 паравоз, 27 вагонаў са збожжам і 4 вагоны з піламатэрыяламі. На перагоне Салтаноўка — Хальч групай В. Вайтовіча быў знішчаны паравоз і 36 платформаў з аўтамашынамі. Падпольшчыкі вёскі Азершчына пад кіраўніцтвам Івана Янковіча цалкам знішчылі тэлефонную сувязь паміж Рэчыцай і Азершчынай. У немцаў былі адбіты 4 аўтамашыны...

23 жніўня 1943 года буйную аперацыю правялі супраць фашыстаў 99-ая калінкавіцкая, 101-ая даманавіцкая, васілевіцкая імя П. К. Панамарэнкі партызанскія брыгады. Быў зроблены напад на жывёлагадоўчую базу луггаса «Ведрыч». У ходзе бою кулямётным агнём былі падаўлены дзоты праціўніка, знішчаны кулямётчыкі на вышках. Партызаны авалодалі базай, выгналі за агароджу больш чым 500 галоў жывёлы.

Фашысты панеслі ў гэтым баі значныя страты. З боку партызан таксама было 12 чалавек загінуўшых і цяжкапараненых.

Летам 1943 года на тэрыторыі Рэчыцкага раёна распачалася баявая дзейнасць партызанскага спецатрада «Дружба», на чале якога быў І. А. Жолабаў. Касцяк атрада складала невялікая група дэсантнікаў-парашутыстаў, якая прыйшла на тэрыторыю

І. Дз. Вятроў

Рэчыцкага раёна з Палескага злучэння І. Дз. Вятрова.

На прыкладзе спецатрада «Дружба» бачна мужнасць і самаахвярнасць рэчычан і жыхароў раёна. Зброяй атраду дапамагала нават рэчыцкая падпольная цімураўская арганізацыя Сашы Буранкова. Вось як нагадваў пра тое Станіслаў Тулькевіч, які з'яўляўся членам групы:

«Нехта з нашых хлопцаў знайшоў склад, дзе было шмат зброі. Ён знаходзіўся на тэрыторыі хлебакамбіната. Вакол склада жылі немцы, і ён ахоўваўся. Але мы часта забіраліся ў яго і кралі зброю, хоць на кожным кроку нас маглі схапіць патрулі. Усю зброю, здабытую ў немцаў, перавозілі за горад у малады сасняк, затым на кані ў атрад. Аднойчы, калі мы пераязджалі праз рачулку Дзяражанку, конь загруз. У гэты час па дарозе ехалі немцы, заўважылі нас і пачалі смяяцца, што наш конь не можа выцягнуць калёсы...»

Дыверсант-адзіночка Уладзімір Тамашук па заданню камандавання спецатрада «Дружба» ўзарваў у Рэчыцы млын, дзе фашысты малолі для сваіх патрэб збожжа. Рыгор Чырык не пакінуў поля бою нават тады, калі быў сур'ёзна паранены. Сувязная Валя Караленка для таго, каб даставіць у Рэчыцу магнітную міну, падвязала яе пад пахі сваёй сястрычцы. Вось так і ішлі ў спадзяванні, што фашысты не спыняць і міна спатрэбіцца для падрыву чарговага варожага аб'екта.

У вёсцы Салтанова байцы спецатрада «Дружба» прытулак знаходзілі ў сям'і Шынкарэнкаў. Гаспадар быў расстраляны карнікамі, а гаспадыня і яе дзеці рабілі ўсё, каб адпомсціць за мужа і бацьку.

...У сярэдзіне жніўня абласны камітэт партыі атрымаў па радыё пастанову ЦК КП(б) Беларусі аб уборцы ўраджаю. У вёскі раёна накіраваліся партызанскія агітатары. Яны неслі з сабой не толькі лістоўкі і газету «Правда», але і раённую «Зару камуны», якая пачала выдавацца ў падполлі якраз у жніўні 1943 года. Быў адноўлены выпуск і «Сацыялістычнай працы» — васілевіцкай раёнкі. «Зару камуны» рэдагаваў М. І. Пахомаў, «Сацыялістычную працу» — П. П. Спірыдонаў.

Выбухі на чыгунцы Гомель — Рэчыца і Рэчыца — Васілевічы грымелі амаль штодня. Асабліва ўдала дыверсійная дзейнасць складвалася для рэчыцкіх партызан у кастрычніку. Падрыўнікі брыгады імя К. Я. Варашылава пусцілі за месяц пад адхон 22 варожыя эшалоны, падарвалі 4 танкі, перабілі шмат чыгуначных рэек, знішчылі 12 мастоў. Дыверсійная група брыгады «Мсцівец», якая была створана на базе асобнага атрада «Мсцівец» 29 верасня 1943 года, падарвала ў кастрычніку 49 аўтамашын, 5 матацыклаў, 6 конных павозак.

Пачынаючы з канца верасня 1943 года вакол зоны дзеянняў партызанскіх атрадаў і брыгад Гомельскай вобласці камандаванне 2-ой нямецкай арміі пачало канцэнтрацыю карных падраздзяленняў. Яны прызначаліся для чарговай спробы разбіць партызан і тым самым зрабіць свае тылы больш бяспечнымі. Менавіта ў Рэчыцы размяшчаўся штаб тылу 2-ой нямецкай арміі, дзейнічалі ягоныя карныя аддзелы. Жорсткасцю вызначаліся супрацоўнікі «Зондэрштаба-П». У Заспе знаходзіліся «Абвергрупа — 105» і «Абвергрупа — 110». Нямала рэчыцкіх патрыётаў гітлераўцы закатавалі ў казематах СД, якое з лістапада 1942 па люты 1943 года знаходзілася ў доме № 101 па вуліцы Вакзальнай (вул. Сыдзько), а потым перабралася на вуліцу Савецкая. Дзейнічалі ў Рэчыцы гебітскамісарыят (вул. Савецкая, д. № 62 — памяшканне былога педагагічнага вучылішча), паліцыя і жандармерыя (вул. Леніна, памяшканне былой СШ № 6).

Для дэблакіравання шашы Рэчыца — Хойнікі, якая вяла ў міжрэчча Дняпра і Прыпяці і знаходзілася ў зоне аператыўнага тылу, нямецка-фашысцкае камандаванне стварыла 2 баявыя групы.

З кастрычніка 1943 года карнікі занялі населеныя пункты, якія знаходзіліся каля Амелькаўскіх лясоў. Раніцай наступнага дня адкрылі артылерыйскі агонь па ўчаст-

ках лесу, дзе, як меркавалі, базіраваліся партызаны. Пасля артпадрыхтоўкі ў лес з усіх бакоў рушыла варожая пяхота.

Улічваючы востры дэфіцыт боепрыпасаў, лоеўская брыгада «За Радзіму» і рэчыцкая «Мсцівец», якія знаходзіліся ў зоне Амелькаўскіх лясоў, пачалі прымяняць тактыку манеўравання. Невялікімі рухомымі групамі ўступалі ў баі з фашыстамі. Рабілі тое пры вострай неабходнасці, калі не было магчымасці адысці без сутычкі.

Частка групы карнікаў прыступіла да расчысткі дарогі Рэчыца-Хойнікі, узвядзення мастоў і г. д.

Тыдзень фашысты страцілі на тое, каб адкрыць рух па дарозе Рэчыца — Хойнікі. Асноўная ж мэта, якую ставілі перад сабой, — знішчыць партызан, дасягнута не была.

Да 10 кастрычніка карнікі зняліся з месца і пакінулі зону дэблакіравання. Пасля сябе пакінулі спаленыя вёскі і расстраляных жыхароў.

9 кастрычніка гітлераўцы распачалі карную аперацыю пад кодавай назвай «Барбара». Яна разгортвалася ў асноўным на тэрыторыі Калінкавіцкага і Васілевіцкага раёнаў, праводзілася сіламі баявых груп вермахта і жандармерыі ў складзе 105-га грэнадзёрскага і 57-га ахоўнага палкоў. 7 ахоўных батальёнаў, артылерыйскіх дывізіёнаў, спецыяльных сапёрных і іншых падраздзяленняў.

Аперацыя не прынесла фашыстам поспеху і на гэты раз.

Зразумеўшы, што партызан не ўдалося знішчыць, камандаванне 2-ой нямецкай арміі прыступіла да аперацыі пад кодавай назвай «Асвячэнне храма». Яна была працягам «Барбары», ажыццяўлялася сіламі, вылучанымі 46-ым армейскім корпусам, у тым ліку 242-ім і 587-ым ахоўнымі батальёнамі, 1-ым батальёнам 612-га ахоўнага палка. Некалькі атрадаў 99-ай Калінкавіцкай брыгады былі блакіраваны карнікамі ва ўрочышчы Новая Зямля. Баі ішлі на працягу сутак. Значныя сутычкі адбыліся каля Васілевіч. Партызанам удалося вырвацца з блакады і захаваць баяздольнасць.

«Асвячэнне храма» мела працяг у карнай аперацыі пад кодавай назвай «Хубертус». Праводзілася яна ў 2 этапы: «Хубертус-1» з 24 па 28 кастрычніка 1943 года і «Хубертус-2» з 3 па 6 лістапада 1943 года.

Гітлераўцы разлічвалі блакіраваць Гомельскае партызанскае злучэнне, атрады

Выпуск чарговага нумара газеты «Зара камуны». З газетай у руках рэдактар М. І. Пахомаў

якога базіраваліся падчас правядзення аперацыі ў лясных масівах каля вёскі Узнаж.

Першыя два дні несупынных баёў з карнікамі паказалі, што план нямецка-фашысцкага камандавання па разгрому партызан у міжрэччы Дняпра — Бярэзіны — Прыпяці быў сарваны і на гэты раз. Але камандаванне злучэння хвалявала адсутнасць боепрыпасаў, хаця з Масквы абяцалі прыслаць дапамогу самалётамі. Па-другое, была страчана сувязь з гомельскай брыгадай «Бальшавік».

У штабе злучэння адбылася нарада. Вырашалася адно пытанне: што рабіць далей? Разглядалася прапанова: адыходзіць на захад, у зону размяшчэння Палескага партызанскага злучэння. Было вырашана: праз мост цераз Бярэзіну адыдуць брыгады «Жалязняк» і імя П. К. Панамарэнкі, атрад імя С. М. Кірава, штаб злучэння, абкамы партыі і камсамола. Мост быў узведзены партызанамі брыгады «Жалязняк», і фашысты не ведалі пра ягонае існаванне.

Уваравіцкая брыгада імя М. В. Шчорса прыняла рашэнне пераправіцца цераз Дняпро. Буда-кашалёўская брыгада імя В. І. Чапаева апынулася як бы за кальцом блакады: знаходзілася ў раёне вёскі Шоўкавічы. Карнікі яе мала турбавалі, бо, як відаць, згубілі яе след.

З самага пачатку блакады ў найбольш цяжкім становішчы апынулася рэчыцкая брыгада імя К. Я. Варашылава. Але камандаванне брыгады вырашыла заставацца на тэрыторыі раёна, разбіўшыся на дробныя групы. Засталіся таксама спецатрад «Дружба» і атрад імя Р. І. Катоўскага.

Апоўначы 25 кастрычніка 1943 года, разбіўшыся на 6 груп, варашылаўцы рушылі па загадзя распрацаваных маршрутах. Цяжкая зброя была закапана і замаскіравана.

Досвіткам 26 кастрычніка карнікі адкрылі артылерыйскі і мінамётны агонь па пазіцыях, якія раней займала брыгада імя К. Я. Варашылава. Потым рушылі прачэсваць лес. Партызан яны не знайшлі.

Пачынаючы з 25 кастрычніка з Масквы пачалі прылятаць самалёты ПО-2 з боепрыпасамі, якімі Беларускі штаб партызанскага руху стараўся дапамагчы Гомельскаму злучэнню.

Пасля таго як партызаны выйшлі з зоны дэблакіравання, фашысты прыступілі да расчысткі завалаў на дарозе Рэчыца — Стара-Краснае — Баравікі — Шацілкі. Страціўшы пры ўзрывах мін некалькі дзесяткаў салдат, фашысты спынілі спробу расчысткі і пакінулі лясы.

Даведаўшыся пра тое, штаб Гомельскага злучэння, абкамы партыі і камсамола, атрад імя С. М. Кірава, брыгады «Жалязняк» і імя П. К. Панамарэнкі вярнуліся ў свае ранейшыя зоны знаходжання.

Высветліўся лёс гомельскай брыгады «Бальшавік». Ноччу 26 кастрычніка ёй удалося адысці ў лес да вёскі Какуевічы. Немцы згубілі яе след.

Трэцяга лістапада 1943 года фашысты прыступілі да другога этапа аперацыі «Хубертус». Зноў была дэблакіравана шаша Рэчыца — Хойнікі.

У надзвычай цяжкім становішчы апынулася лоеўская брыгада «За Радзіму» і рэчыцкая «Мсцівец». Фашысцкая група Рубзама, падмацаваная свежымі сіламі, адрэзала брыгады ад штаба злучэння. Камандзіры брыгад Р. І. Сінякоў і І. Р. Баруноў зрабілі спробу ўстанавіць сувязь з часцямі Чырвонай Арміі. 65-ая армія генерала П. І. Батава і 48-ая армія генерала П. Л. Раманенкі былі на адлегласці 15—20 кіламетраў. Але канцэнтрацыя ворага на ўчастку паміж арміямі і партызанскімі брыгадамі была надзвычай шчыльнай. Таму спроба сувязі не ўдалася.

Камандаванне брыгады «Мсцівец» аддало атрадам загад баі прымаць толькі тады, калі не будзе іншага выйсця. У асноўным жа манеўраваць, дзейнічаць з засад.

Тактыка, прынятая камандаваннем брыгады, дазволіла пазбегнуць значных страт і тым самым захаваць партызанскае фарміраванне.

Пачатак Гомельска-Рэчыцкай аперацыі войск Беларускага фронта не даў фашысцкаму камандаванню магчымасці аперацыю «Хубертус» давесці да канца.

Перад партызанамі ж стаяла задача дапамагчы Чырвонай Арміі выбіць захопнікаў з роднай зямлі.

А. П. Рабянок, П. П. Рабянок

З дзённіка Рэчыцкага партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава аб баявой дзейнасці атрада з 1 ліпеня 1941 года па 15 кастрычніка 1942 года

...Отряд был организован 1 июля 1941 года. Вначале состоял из 42 чел. Отряд поставил перед собой задачу действовать в тылу врага, уничтожать живую силу и его технику.

4 июля 1941 г. отрядом в районе Дуброва-Заречье (Паричский район) была организована засада с задачей уничтожить на этом участке движущиеся машины. При этом у фашистов было отнято 3 бронемашины, из которых 1 была уничтожена в период боя артогнем, 2 взяты в полной исправности и переданы в штаб 3-й армии. При этом было убито 6 фашистов, 2 ранено. Потерь отряд не имел.

6 июля 1941 г. на этом участке отрядом принят бой с 7 бронемашинами противника. В бою были уничтожены 2 бронемашины артогнем ПТО, 2 бронемашины взяты отрядом исправные, остальные 3 машины повернули назад. В бою было убито 11 солдат, в том числе нач. группы. Количество раненых не установлено. Отряд имеет потери — 1 чел. из орудийного расчета. Трофеи: 4 пулемета, 1 из них крупнокалиберный. При этом были захвачены топографические карты и штабные документы. Все трофеи были переданы штабу 3-й армии.

11 июля 1941 г. отрядом во взаимодействии с 2 подразделениями 800-го стрелкового полка под командованием капитана Долбина и лейтенанта Максимова в 6.00 было занято мест. Паричи. В бою была уничтожена 1 бронемашина, взят 1 мотоцикл, который передан 800-му стрелковому полку. Убито 9 чел. Наших потерь нет...

С 18 по 21 июля 1941 г. отряд по приказанию генерал-майора тов. Судакова был придан стрелковому полку (командир полка майор Пипин). Занимали оборону в районе Ракшин, Чирковичи и Старина Паричского района.

22 июля 1941 г. отряд по приказанию генерал-лейтенанта Кузнецова был переброшен в Стрешинский район с задачей взаимодействовать с 66-м кавалерийским полком, где командир полка полковник Моска-

ленко, занимать оборону в районе дер. Антоновка, Ящицы, Доброгощи, Василевичи, Кабановка и Стрешин. Совместные действия отряда с полком проходили до 1 августа 1941 г.

4 августа 1941 г. отрядом в мест. Стрешин был принят бой, где было уничтожено 2 бронемашины и захвачено одно 37-мм орудие. Было убито 4 фашиста. Отряд потерь не имел.

С 4 по 18 августа 1941 г. отряд по приказанию штаба 3-й армии проводил разведку в районе Паричи-Стрешин.

18 августа 1941 г. одной группой отряда в составе 50 чел. под командой командира Алексеенко на шоссе Гомель — Калинковичи у дер. Боршовка было уничтожено 8 грузовых автомашин, убито 35 фашистов. В бою группа имела потери в количестве 2 чел. Второй группой отряда в количестве 45 чел. под командой командира Иванова в районе сенозавода (Речицкого) было захвачено 12 мотоциклов. Из них 8 передано штабу 3-й армии, 4 уничтожено в период боя. Убито 25 фашистов. Группа потерь не имеет.

23 августа 1941 г. группой бойцов отряда в количестве 4 чел. под командой тов. Маркель в гор. Речица на улице был уничтожен 1 мотоцикл. Ранен мотоциклист.

28 августа 1941 г. группой бойцов отряда в количестве 8 чел. под командой Аникеева были взорваны 3 моста: 1 мост на шоссе Гомель — Калинковичи, 2 моста — Буда — Тишковка, Козье — Демехи.

1 сентября 1941 г. бойцы тт. Коновалов и Юрусов взорвали мост на шоссе Речица — Хойники. Второй мост был взорван на шоссе около Ровенской Слободы группой бойцов под руководством тт. Вороны А. И. и Бондаренко И. И.

3 сентября 1941 г. группой бойцов в количестве 30 чел. под командой тов. Турчинского была уничтожена 1 легковая машина. Убито 2 немецких офицера, ранен шофер. Этой же группой на этом же участке, на шоссе у дер. Качай-Болотово, была уничтожена связь, заминировано шоссе, сделаны завалы.

4 сентября 1941 г. на заминированном отрядом месте 3 сентября 1941 г. взорвана 1 грузовая машина. Количество убитых и раненых не установлено.

С 6 сентября 1941 г. по 13 сентября 1941 г. отрядом проводилась разведка по установлению связи с другими отрядами и руководством обкома партии.

15 сентября 1941 г. проведена разведка в направлении Рудни Бурицкой с задачей установить наличие противника. Разведчиком тов. Коноваловым было установлено, что в дер. Рудня Бурицкая и в соседние населенные пункты (Новый Барсук, Литишины и др.) прибыл карательный отряд для борьбы с партизанами. При повторной посылке разведки данные подтвердились. Разведка натолкнулась на засаду карательного отряда. В результате убит разведчик Аринич П. И. и тяжело ранен Больных Павел.

16 сентября 1941 г. отрядом был принят бой с крупным карательным отрядом СС, по сведениям населения, в количестве 760 чел. В результате боя убито 12 фашистов. Потери отряда 3 чел.

4 апреля 1942 г. группа в количестве 4 чел. под командой Турчинского ушла из Лоевского отряда для организации отряда в Речицком районе.

За период самостоятельного действия отряда были проделаны следующие работы:

25 мая 1942 г. группой бойцов под командой Астапенко Павла Алексеевича в количестве 5 чел. был спущен воинский состав под откос. При этом был уничтожен паровоз, 17 платформ с танками и автомашинами и 4 крытых вагона с живой силой. Одних раненых было вывезено 7 грузовых машин. Количество потерь не установлено. Перегон Якимовка — Прибор.

8 июня 1942 г. бойцом отряда тов. Кошелевым Н. П. в гор. Речица убит немецкий офицер и забрано несколько топографических карт района Белоруссии. Командованием отряда объявлена тов. Кошелеву благодарность...

24 июня 1942 г. группой товарищей в количестве 16 чел. под командой комиссара тов. Михайлова А. Е. сожжен лесопильный завод и 35 тыс. выделанных шпал. В этой операции отличились, за что вынесена благодарность, следующие товарищи: Онипко Макар Прокофьевич, Дзагуров Ахсар Омарович, Швайко Константин Варфоломеевич, Храмченко Мария Степановна, Давыденко Степан Иванович, Батуро Андрей Филиппович, Вишняк Федор.

2 июля 1942 г. группой в количестве 9 чел. под командой тов. Турчинского взорван ж.-д. мост на р. Ведрич на перегоне Демехи — Речица. В этой операции отличились подрывник Островский Константин, бойцы отряда Онипко М. П., Баранов П. И., Дзагуров А. О.

Того же числа другой группой под командой тов. Михайлова была заложена неизвлекаемая мина на ж.-д. полотне (перегон Демехи — Бабичи), на которой взорвалась автодрезина. Было убито 14 мадьяр и тяжело ранено 2 полицейских. Количество раненых мадьяр не установлено.

Того же числа (5 июля 1942 г.) группой бойцов в количестве 16 чел. под командой Тихвинского В. С. был взорван ж.-д. путь на перегоне Жердь — Шатилки. При этом было уничтожено 200 м пути. Подрывник тов. Островский К.

8 июля 1942 г. группой бойцов в кол. 11 чел. под командой тов. Онипко было проведено минирование ж.-д. пути на перегоне Деме-

Ф. Вішняк

хи — Бабичи. Был пущен под откос поезд, идущий на фронт с живой силой. При этом был разбит паровоз и 6 крытых вагонов. Количество жертв не установлено. Того же числа также был поврежден паровоз и 4 вагона вспомогательного поезда. Подрывник Ковалев Александр.

10 июля 1942 г. группой бойцов в количестве 10 чел. под командой тов. Хуморьяна Г. С. было произведено минирование и разрушение ж.-д. пути (перегон Бабичи — Демехи). При этом было разрушено 175 м пути. Подрывник — Островский.

12 июля 1942 г. группой бойцов под командой тов. Щербинского В. Ф. в количестве 8 чел. был спущен под откос 1 поезд с техникой противника. При этом было уничтожено: 1 паровоз, 8 платформ с танками и автомашинами. Подрывник Изья. На перегоне Бабичи — Василевичи.

Другой группой в количестве 4 чел. под командой Щербинского И. М. взорван ж.-д. путь на перегоне Демехи — Бабичи. При этом уничтожено более 200 м пути.

Третьей группой в количестве 7 чел. под командой Тихвинского В. С. был спущен под откос резервный паровоз с 3 вагонами на перегоне Речица — Якимовка. Подрывник — Владимир (десантник).

14 июля 1942 г. группой бойцов в количестве 12 чел. под командованием тов. Васильева сожжена повозочная мастерская: 24 повозки, 40 станов колес, изготовленных для немецкой армии (дер. Заходы Дубровской волости Василевичского района).

20 июля 1942 г. группой подрывников в количестве 4 чел. под командованием тов. Щербинского И. М. было проведено минирование ж.-д. пути на перегоне Речица — Демехи. При взрыве было разрушено более 150 м ж.-д. пути. При этом был убит 1 подрывник — Маньшин В. Этой же группой было забрано 3 винтовки у лесника дер. Глыбов.

25 июля 1942 г. группой бойцов в количестве 7 чел. под командой Евтухова А. Ф. был уничтожен и сожжен тягач (трактор ЧТЗ) Речицкой судоверфи с прицепом. Этой же группой было уничтожено и сожжено 50 бочек и 3 цистерны со скипидаром — 150 т.

29 июля 1942 г. группой в количестве 7 чел. под командой Щербинского И. М. на перегоне Демехи — Речица был заминирован ж.-д. путь. При взрыве было повреждено 340 м пути. Подрывник Ковалев А.

1 августа 1942 г. группой бойцов в количестве 20 чел. под командой командира взвода Васильева П. И. уничтожена 1 грузовая машина с живой силой противника. При этом было убито 9 гитлеровцев, из них 2 офицера, 2 ранено. Были взяты трофеи: 2 пулемета, 2 пистолета, 6 винтовок. Наши потери: 1 убит, 1 ранен.

2 августа 1942 г. группой бойцов в количестве 5 чел. под командой тов. Борунова на перегоне Демехи — Речица были сожжены 3 деревянных моста...

13 августа 1942 г. группой бойцов в количестве 3 чел. под командованием бойца Самойлова И. С. сожжен мост на шоссе Речица — Хойники около дер. Ровенская Слобода.

14 августа 1942 г. группой бойцов в количестве 9 чел. под командованием Давиденко С. сожжены 2 моста: один мост на шоссе Гомель — Калинковичи, а другой мост — на грунтовке между дер. Буда и Тишковка.

15 августа 1942 г. принят бой с крупным немецким карательным отрядом, состоявшим из 200 словаков и до 150 полицейских. В результате боя убито солдат и офицеров — 30 и ранено — 20. Наши потери — 3 убитых, 3 раненых.

21 августа 1942 г. группой бойцов в количестве 5 чел. под командой Бондаренко И. И. сожжено 2 моста: 1 мост на шоссе Речица — Хойники, 1 мост на грунтовке...

23 сентября 1942 г. группой бойцов в количестве 6 чел. под командованием тов. Астапенко П. А. был поврежден посредством взрыва немецкий бронепоезд на перегоне Демехи — Бабичи.

1 октября 1942 г. при столкновении группы разведчиков под командованием Кузьменко Д. Н. с группой немецких солдат около дер. Лиски Василевичского района убит 1 солдат и 2 ранено.

12 октября 1942 г. отрядом под командованием тов. Турчинского был разгромлен крупный полицейский участок Узножской волости Василевичского района. При этом было убито до 40 и ранено до 20 карателей. Наши потери: 5 убитых и 7 раненых.

13 октября 1942 г. группой бойцов в количестве 5 чел. под командованием Борунова И. Г. спущен под откос 1 поезд с продуктами, шедший на фронт. При этом были уничтожены паровоз и 6 вагонов.

15 октября 1942 г. той же группой был спущен поезд под откос с продуктами. При этом было разбито 8 вагонов. Бойцы — исполнители операции — Евтухов А. Ф., Романов К. И., Швайко Г. В., Балащенко Н. П., Лисовская А., Батуро А. Ф.

НА РБ ф. 3943, воп. 1, спр. 2, лл. 1—15.

Акт

жыхароў вёскі Кабылева былога Васілевіцкага раёна былой Палескай вобласці і прадстаўнікоў вайсковай часці 9-га гв. стралковага корпуса Чырвонай Арміі аб зверствах гітлераўскіх захопнікаў у дачыненні да жыхароў вёскі ў час акупацыі ў 1941—1943 гг.

28 лістапада 1943 г.

Мы, нижеподписавшиеся, жители дер. Кобылево Василевичского района Полесской обл. и представители Н-ской части, составили настоящий акт о нижеследующем:

2 года немецко-фашистские захватчики свирепствовали в дер. Кобылево, угоняя юношей и девушек в рабство на работы в Германию, грабя имущество и скот, убивая жителей и сжигая дома, издеваясь и глумясь над народом, который не хотел покориться злой немецкой воле.

40 юношей и девушек, оторванных от родных и близких людей, были угнаны гитлеровцами еще зимой 1942 г.

Но не покорилась деревня захватчикам: 48 жителей деревни ушли в леса к партизанам биться за народное счастье и мстить ненавистным оккупантам.

В ответ на это 28 января 1943 г. в дер. Кобылево прибыл отряд немцев и полиции в количестве более 200 чел., во главе которого стояли немецкие ставленники — бургомистр волости Гуляй и начальник полиции Лещенко.

В течение 2 недель свирепствовали грабежи и убийства. Имущество жителей было разграблено, скот угнан, многие дома разбиты. Жителей связывали семьями, бросали в повозки и увозили за деревню, где расстреливали и сжигали живыми. За 2 недели разнузданного произвола и издевательств немцев и их кровавых пособников были расстреляны и сожжены семьи: Емельянченко Михаила Филипповича, Сыча Степана Федоровича, Близнеца Ивана Яковлевича и других 42 чел. Своих односельчан, павших от рук злодеев, похоронили вернувшиеся из лесов жители дер. Кобылево.

Напуганные немецкими зверствами люди разошлись по лесам. В течение нескольких месяцев пустовала деревня.

13 мая 1943 г. в деревню из с. Макановичи прибыла немецкая разведка вместе с Гуляем и расстреляла 12 чел., проживавших в лесу жителей дер. Кобылево. Остальным было объявлено, что всем, кто вернется в деревню, немцы гарантируют хорошую жизнь, пойманные же в лесу будут расстреляны. Большинство жителей вернулось в свои дома. Но палачи обманули народ.

На второй день, 14 мая 1943 г., в деревню прибыл отряд войск СС и полиции до 300 чел. Гитлеровцы при помощи своего ставленника Гуляя оцепили деревню и выставили пулеметы. Всех жителей — мужчин и женщин, стариков и детей, здоровых и больных — немцы стали сгонять в центр деревни, поджигая дома.

Началась дикая расправа. Сначала были отобраны мужчины, загнаны в дома и на глазах их жен, матерей и детей расстреляны и сожжены. После этого немецкие злодеи и их приспешники приступили к уничтожению остальных. Престарелых старух, женщин с грудными младенцами и подростков загоняли по 20—30 чел. в отдельные дома, бросали в них гранаты и поджигали. Стон, плач и душераздирающие крики стояли над дер. Кобылево 14 мая 1943 г. Матери падали на землю, целовали извергам сапоги и молили пощадить их детей. Но с хладнокровием садистов немецкие солдаты разбивали прикладами головы беззащитных людей, бросали детей в огонь, прикалывали штыками ползающих раненых.

Только немногим жителям удалось спастись от этой зверской расправы. Так, Скакун Павлик 12 лет был загнан в дом Белого Федора в числе 25 жителей деревни. Эсэсовцы заперли дверь и бросили туда гранату. Загнанные в дом люди были убиты или ранены. Оглушенный взрывом Скакун Павлик упал у двери. Когда зажгли дом, он очнулся, выскочил в окно, отполз по канаве и спрятался под мостом. Родители его сгорели, а он остался жив.

Жительница этой же деревни Халимоненко Наталья 35 лет в момент расстрела получила тяжелое ранение: пуля вошла сзади уха и вышла через правый глаз. Обливаясь кровью, с опаленной головой, она отползла в сторону от горящего дома, упала в закопанную бочку с водой и пролежала там до прихода в деревню партизан.

Всего на этот раз отряд СС совместно со своими пособниками расстрелял и сжег 1050 чел.

Несколько дней валялись трупы убитых и полусожженных людей — полиция не давала хоронить. Партизаны приходили ночью и хоронили трупы на том месте, где они лежали.

На западной окраине дер. Кобылево (урочище Долина) комиссией была вскрыта могила, в которой обнаружено 6 трупов мирных жителей. Врачебной патологоанатомической экспертизой установлены и родственниками опознаны трупы 2 женщин и 4 детей. Из них: Голуб Марья в возрасте 60 лет, Голуб Матрена 30 лет и ее дети: Николай 9 лет, Нина 6 лет, Юля 5 лет и Мальвина 2 лет.

Кожа и мышцы погибших на всем протяжении представляют из себя сплошной обуглившийся слой. Переломы костей конечностей свидетельствуют об истязаниях и насилии. Череп Голуба Николая имеет пролом вследствие физического воздействия.

На северо-западной окраине дер. Кобылево (кладбище) в могиле обнаружено 9 трупов мирных жителей деревни. Из них 3 мужских, 3 женских и 3 детских. Среди них опознаны Емельянов Михаил 48 лет, Емельянова Мария 40 лет, их сын сельский учитель Емельянов Иван 19 лет, Емельянов Василий 16 лет, Емельянова Нина 5 лет, Емельянова Аксинья 60 лет, Сыч Анна 40 лет, Сыч Александр 12 лет и Сыч Юля 4 лет. На трупах имеются остатки обгорелой одежды. Все открытые места тела, в особенности лицо, руки, покрыты обуглившимся слоем. На отдельных трупах имеются следы огнестрельных ран от разрывных пуль.

На восточной окраине дер. Кобылево во вскрытой могиле обнаружено 16 трупов. В одном трупе (мужском) опознан Сыч Андрей Порфирьевич 20 лет; в трупе женском опознана Матрена Белая 36 лет. Остальные трупы представляют из себя отдельные человеческие органы, бесформенные и совершенно обуглившиеся.

Кроме этого, на месте дома Сыча Ивана Ефимовича в развалинах пожарища обнаружена масса обуглившихся человеческих костей: ребра, челюсти, кости верхних и нижних конечностей. В этом доме было сожжено и расстреляно 15 чел. мирных жителей деревни.

На месте дома колхозника Белого Федора, в котором сожжено 25 чел., и дома Луцко Онуфрия, в котором сожжено 20 чел. женщин, детей и стариков, обнаружены человеческие кости — следы зверской расправы гитлеровцев.

Конкретными виновниками фашистской расправы над мирными жителями дер. Кобылево являются:

1. Начальник жандармерии Василевичского района обер-лейтенант Кляузе.
2. Помощник начальника жандармерии Василевичского района Коваль.
3. Помощник начальника жандармерии Василевичского района Юзик.
4. Комендант Василевичской немецкой комендатуры Ионус.
5. Бургомистр Макановичской волости Гуляй Николай Дмитриевич.
6. Начальник Макановичской волостной полиции Лещенко Адам Евменович.
7. Староста дер. Кобылево Белый Евдоким Васильевич.

За все время немецкой оккупации указанными гитлеровцами и их пособниками из числа советских граждан в дер. Кобылево расстреляно и сожжено 1118 чел., из них до 200 мужчин, до 300 женщин и более 600 детей. Угнано в Германию 18 юношей и 22 девушки. Взято до 35 лошадей, 300 коров, 1 тыс. овец, 2 тыс. кур. Сожжено 276 домов. Разграблено имущество 266 семей.

Цветущая колхозная деревня превращена немецкими оккупантами в груды развалин, заросла бурьяном, покрылась сотнями могил, взывающих к мщению и священной борьбе советского народа против немецких извергов.

Комиссия: майор Ребров, майор медицинской службы Копьев, майор медицинской службы Мануйлов, ст. лейтенант медицинской службы Анатьева, председатель с/совета Гайдаш

Жители дер. Кобылева: Кондратенко Ф. Г., Кондратенко А. Т.

ДАРФ ф 7021 оп. 91 д. 5 лл 2—5

Вёскі, спаленыя карнікамі

Акцябр, Борхаў (Азершчынскі сельсавет), Борхаў (Баршчоўскі сельсавет), Балашаўка, Баранаўка, Берагавая Слабада, Будка Шыбенка, Бушаўка, Бязуеў, Валадарск, Васількоў, Вышамір, Гагалі, Ганчароўка, Гарноўка, Гіроў, Глушэц, Глыбаў, Горваль, Грабянёў, Грушаўка, Дабраволец, Дзятлаўка, Дуброва, Духанаўка, Елізаравічы, Зара Свабоды, Заселле, Заскор'е, Заходы, Калінаўка, Камсамольск, Каравацічы, Козы, Крынкі, Кузьмінкі, Лабкі, Лецяшын, Ліскі, Лясное, Маладуша, Маскалі, Мілаград, Надзвін, Нова-Краснае, Першае Мая, Першамайск (Камсамольскі сельсавет), Першамайск (Каравацікі сельсавет), Пескаполле, Прудзішча, Ровенская Слабада, Роўнае, Рудзец, Салтанова, Сведскае, Свідэра, Стара-Краснае, Стары Барсук, Старына, Стасеўка, Сямёнаўка, Сяргееўка, Узнаж, Церабееўка, Чарнейкі, Чырвоная Кветка, Шоўкавічы.

Пасёлкі

Антонава, Барбары, Барэц, Беражыстае, Вішнёўка, Волга, Вясёлы, Вясна, Гарадок, Гарадзішча, Гасцівель, Дабужа, Днепрык, Залессе, Калініна, Махаў Бераг, Новыя Навінкі.

Быў сапраўдны генацыд

З успамінаў жыхаркі Рэчыцы Кацярыны Анатольеўны Мацвеевай

У Рэчыцу фашысты ўвайшлі 23 жніўня 1941-га. Горад бы вымер: шмат хто Рэчыцу пакінуў, а тыя, хто засталіся, баяліся паказвацца на вочы «новым гаспадарам». Асабліва гэта тычылася яўрэйскага насельніцтва.

Але немцы, як аказваецца, прадумалі ўсё да дробязі. Тыдні праз паўтары адшукалі Малінковіча, загадалі яму правесці перапіс яўрэйскага насельніцтва, што засталося ў Рэчыцы. Неўзабаве такія спісы былі складзены.

Было загадана таксама, каб кожны яўрэй нашыў на сваю вопратку па дзве шасціканцовыя зоркі.

Але самае жудаснае пачалося ў другой палове лістапада таго ж 1941 года. Усе яўрэі былі гвалтоўна сагнаны ў двухпавярховае памяшканне ў фабрычным раёне. Будыніна гэтая ўжо была агароджана калючым дротам. Усяго, як памятаецца, у памяшканне

ўціснулі каля 800 сем'яў, а гэта каля трох тысяч чалавек.

Недзе 25 лістапада фашысты распачалі расстрэл ваеннапалонных, камуністаў і грамадскіх актывістаў горада. На кожную з трох аўтамашын грузілі па 30—35 чалавек, везлі ў бок Азершчыны і там, у лесе, расстрэльвалі.

Гэтак было ад самае раніцы і да чатырох гадзін вечара. А потым акупанты распачалі і расправу над яўрэямі. Да гета падышлі сем аўтамашын. На кожную грузілі па 45—47 чалавек, а потым везлі за Рэчыцу да супрацьтанкавага ірва. На дно яго выштурхвалі па 15—20 чалавек, а затым з аўтаматаў расстрэльвалі.

Я з маці знаходзілася на апошняй, сёмай машыне. Ужо змяркалася. Карнікі спяшаліся. Гэта нас і ўратавала.

Па нашай купцы фашысты таксама прастрачылі з аўтаматаў. Мы, параненыя, упалі. Ляжалі, не паказваючы аніякіх прыкмет жыцця. А калі немцы паехалі, пачалі, дапамагаючы адзін аднаму, вылазіць з-пад забітых.

Падчас акупацыі нялёгка было ўсім рэчычанам. Але найбольшыя здзекі вынеслі яўрэі.

Восенню таго ж 1941 года акупанты схапілі на вуліцы яўрэйку Шыпіеўскую. Прывязалі яе да матацыкла. Шыпіеўская выбілася з сілы, упала на зямлю. А нелюдзі працягвалі яе цягнуць за матацыклам. А калі няшчасная страціла прытомнасць, яе прыстрэлілі.

Каля рускіх могілак горада фашысты спаймалі старога яўрэя. Прывязалі да ягонай шыі вяроўку. Падвялі да калодзежа. Некалькі разоў апускалі яго ў ваду і падымалі ўгору. Гэтыя здзекі над старым чалавекам назіралі сагнаныя да калодзежа некалькі яўрэяў. А потым, калі акупантам надакучыла «забава», яны расстралялі і старога, і сведкаў ягоных пакут.

Перш чым памерці, страшэнныя пакуты зведаў стары Альцер, які да вайны прадаваў газу. Немцы ўпрагалі яго ў вазок з бочкай. На бочку садзіўся эсэсавец, загадваў няшчаснаму бегчы да Дняпра за вадою. Крычаў: «Юда, юда!» Прыспешваў старога, каб той не ішоў, а бег...

Гэты жудасны малюнак бачылі многія рэчычане.

З успамінаў Глафіры Міхайлаўны Марчанкі

У свой час наша вёска Горваль называлася мястэчкам. Была нават райцэнтрам. Непасрэдна перад вайной у Горвалі было 360 двароў, больш як паўтары тысячы жыхароў. Значны працэнт мясцовага насельніцтва складалі яўрэі. Таму ў навакольных вёсках Горваль называлі яўрэйскім мястэчкам.

Шмат хто з горвальскіх яўрэяў працаваў у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». Але большасць займалася саматужніцтвам.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, то нямала горвальскіх мужчын-яўрэяў пайшлі на фронт, некаторыя выехалі ў эвакуацыю. Але шмат іх і засталося. Не ведалі, што іх чакае жудасны лёс.

Горваль карнікі цалкам спалілі ў чэрвені 1943-га. Расправіліся і з насельніцтвам вёскі. Людзей стралялі, палілі жывымі. Але сярод ахвяраў чэрвеня 1943 года яўрэяў не было: яны былі знішчаны яшчэ ў 1941-ым.

...Фашысты ўвайшлі ў нашу вёску 19—20 жніўня 1941 года. Адны часці супыняліся на адпачынак, потым збіраліся і ехалі ў бок Рэчыцы. Іхняе месца займалі іншыя варожыя падраздзяленні.

На першым часе акупанты нікога не чапалі. Хіба што гвалтам забіралі харч.

Але праз які тыдзень акупанты пайшлі па хатах, пачалі загадваць, каб яўрэі збіраліся на сход. Ім казалі ісці на калгасны двор.

Вядома, усе здагадаліся: чужынцы задумалі нядобрае. Над Горвалем павісла злавесная цішыня.

Адным з першых да месца збору рушыў Юдка Калеснікаў. Ягоная жонка Слава корпалася на агародзе. Карнікі яе не заўважылі. Але жанчына, даведаўшыся, што муж на «сходзе», апранула ўсё святочнае і пакрочыла на калгасны двор, куды збіралі няшчасных. Горвальцы супынялі яе: «Куды ты? І цябе расстраляюць...» Яна ж адказвала: «Калі ўжо расстралялі Юдку, то няхай страляюць і мяне...»

Карнікі не пашкадавалі ніводнага з яўрэяў: ні малога, ні старога. У той дзень жніўня 1941-га знішчылі іх некалькі дзесяткаў. А калі выехалі з вёскі, горвальцы кінуліся да калгаснага двара. Агледзелі расстраляных. Убачылі, што ніводная куля не зачапіла Брайну Саламонаўну Кофман. Хутчэй за ўсё яна памерла ад разрыву сэрца.

Крыху пазней горвальцы сталі сведкамі расправы над Хаяй Калеснікавай. Толькі ёй з дзіцём пашчасціла ўратавацца ў дзень расстрэлу мясцовых яўрэяў. Немец, які прыходзіў арыштоўваць жанчыну, яе адпусціў. Справа ў тым, што муж Хаі не быў яўрэем. А мо і ў карніка зашчымела сэрца ад жалю да маладой жанчыны з дзіцём? І немцы ж былі рознымі.

Але не, Хая ўратавалася толькі на некалькі дзён. Пра яе ўчулі паліцаі. Схапілі жанчыну і яе дзіця, пагналі ў Рэчыцу. Назад Хая і яе дзіця, вядома ж, не вярнуліся...

Іх не забудуць ніколі

(з гісторыі Рэчыцкага падполля)

Для выканання Дырэктывы № 2 ЦК КП(б) Беларусі ад 1 ліпеня 1941 года Рэчыцкі райкам партыі правёў дзейсную работу па арганізацыі ў Рэчыцы патрыятычнага падполля. У першую чаргу з камуністаў і камсамольскага актыву. У ліку пакінутых для падпольнай работы былі Іван Дзямідавіч Усхопаў, Міхаіл Пятровіч Агурцоў, Цімафей Сямёнавіч Броўка, Даніла Васільевіч Мыткін, Павел Мікалаевіч Маркаль, Міхаіл Макаравіч Жыленка, Марыя Сцяфанаўна Храмчанка.

Сярэдзіна верасня 1941 года стала трагічнай для Рэчыцкага партызанскага атрада. У баі з карнікамі ён быў рассеяны. Частка партызан накіравалася за лінію фронту, некаторыя пайшлі дамоў. Група з пяці чалавек на чале з Макарам Фёдаравічам Турчынскім далучылася да лоеўскага атрада «За Радзіму». Дарэчы, тут знаходзіліся сакратары Гомельскага падпольнага абкама КП(б)Б і падпольнага абкама камсамола — І. П. Кожар і А. Д. Рудак.

Зімой 1941—1942 гг. група М. Ф. Турчынскага ажыццяўляла работу, накіраваную на мабілізацыю патрыётаў Рэчыцкага раёна на барацьбу супраць ворага.

У красавіку 1942 года М. Ф. Турчынскі разам са сваёй групай пакінуў атрад «За Радзіму» і накіраваўся на тэрыторыю Рэчыцкага раёна для арганізацыі новага партызанскага атрада.

На сувязь з людзьмі, пакінутымі ў свой час у Рэчыцы для падпольнай работы, Макар Фёдаравіч у пачатку мая 1942 года накіраваў Мікалая Пятровіча Кошалева. Назваў яму прозвішчы, адрасы канспіратыўных кватэр. Сярод іх былі Надзея Міхайлаўна Каранкевіч (вул. Чапаева, 38), Таццяна Адамаўна Пацёмкіна (вул. Леніна, 9).

Кошалеў цалкам выканаў баявое заданне.

З верасня 1941 года ў Рэчыцы распачала актыўную патрыятычную дзейнасць група Паўла Маркаля, які працаваў дзяжурным на чыгуначнай станцыі. У групу ўваходзілі таксама Міхаіл Абуховіч, Віктар Кніга, Алена Катлабай, Валянціна, Людміла і Тамара Блёскіны, Уладзімір Ганчароў, Георгій і Алена Носкі. Падпольшчыкі мелі радыёпрыёмнік, па якім слухалі зводкі Саўінфармбюро, перапісвалі іх і распаўсюджвалі ў горадзе.

З другой паловы жніўня 1942 года група Паўла Маркаля дзейнічала па заданню камандавання партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава. Першая сустрэча падпольшчыкаў з партызанамі адбылася каля вёскі Стара-Краснае. Перад групай Маркаля была пастаўлена задача сачыць за рухам варожых эшалонаў да лініі фронту і прыцягваць моладзь горада для барацьбы з акупантамі.

У лістападзе 1942 года А. Катлабай, В. Блёскіна і В. Кніга сустрэліся з сакратаром Гомельскага падпольнага абкама ЛКСМБ Аркадзем Дзянісавічам Рудаком і сакратаром Рэчыцкага падпольнага райкама ЛКСМБ Уладзімірам Рыгоравічам Хамянком. Камсамольцы атрымалі лістоўкі, якія расклеілі ў Рэчыцы ў ноч на 8 лістапада.

Сустрэчы членаў групы Паўла Маркаля з кіраўніцтвам падпольных абкама і Рэчыцкага гаркама ЛКСМБ мелі рэгулярны характар і працягваліся да сакавіка 1943 года. Найчасцей яны адбываліся каля вёсак Маладуша, Стары Барсук і Перавалока.

У канцы 194[illegible] рэчыцкія падпольшчыкі сустрэ[illegible]мандзірам Украінскага партыза[illegible]ння С. А. Каўпаком і камісара[illegible]дневым. У штаб злучэння, які ра[illegible] вёсцы Лясное, што ў 35 кіламетра[illegible]чыцы, прыйшлі Валянціна Блёскіна і Алена Катлабай. Яны інфармавалі кіраўнікоў злучэння аб становішчы ў Рэчыцы, наяўнасці варожых

У. Р. Хамянок

вайсковых часцей. Перад вяртаннем у горад дзяўчаты атрымалі пакет з лістоўкамі. Частка лістовак заклікала насельніцтва Рэчыцы да барацьбы з акупантамі, другая частка лістовак мела форму звароту да здраднікаў Радзімы, прапаноўвала ім перагледзець свае паводзіны, бо расплата непазбежная.

Першыя страты група Паўла Маркаля мела ў канцы мая 1942 года. Фашыстам удалося высачыць Міхаіла Абуховіча. Пры вобыску ў яго былі знойдзены радыёпрыёмнік і прынятая зводка Саўінфармбюро. На допытах Міхаіл трымаўся мужна. Ён не выдаў ворагу ніводнага члена групы. Нічога не дабіўшыся ад яго, гітлераўцы расстралялі мужнага патрыёта.

Летам 1943 года быў арыштаваны Віктар Кніга. Пасля катаванняў яго накіравалі ў канцлагер, дзе юнак і загінуў.

У сувязі з пачашчэннем арыштаў было прынята рашэнне пакінуць Рэчыцу і ісці ў партызанскі атрад імя К. Я. Варашылава. У канцы чэрвеня 1943 года туды накіраваўся і Павел Маркаль.

У маі 1942 года распачала патрыятычную дзейнасць падпольная група канторы «Заготжывёла». Ёю кіраваў Даніла Васільевіч Мыткін, галоўны бухгалтар канторы. У групу ўваходзілі таксама: упраўляючы канторай Цімафей Сямёнавіч Броўка, шафёры Дзмітрый Еўдакімавіч Помаз і Аляксей Сцяпанавіч Озераў, касір Ефрасіння Нічыпараўна Казанцава, галоўны бухгалтар вінзавода Кандрат Сцяпанавіч Герасімовіч.

Займаючыся нарыхтоўкай прадуктаў для нямецкай адміністрацыі, члены групы па фіктыўных дакументах атрымлівалі мясапрадукты і яйкі, перапраўлялі іх у партызанскі атрад. Апроч гэтага, праз касу канторы «Заготжывёла» былі атрыманы 4 тысячы рублёў. На іх былі куплены медыкаменты і перавязачны матэрыял. Усё гэта таксама было накіравана ў лес.

У другой палове ліпеня 1942 года ў жандармерыю паступіла запіска правакатара, у якой пералічваліся члены групы канторы «Заготжывёла». Пачаліся арышты. Пасля жорсткіх катаванняў мужныя патрыёты А. С. Озераў, Ц. С. Броўка і К. С. Герасімовіч былі расстраляны з сем'ямі. Былі расстраляны таксама Д. В. Мыткін і Д. Е. Помаз.

Надзвычай баяздольнай была падпольная патрыятычная група, што дзейнічала ў гарадской друкарні. Яе ўзначальваў член партыі І. Д. Усхопаў. Да вайны ён працаваў выкладчыкам мясцовага педагагічнага вучылішча, а пасля акупацыі Рэчыцы нямецка-фашысцкімі захопнікамі быў прызначаны дырэктарам друкарні.

Іван Дзямідавіч прыцягнуў да актыўнай патрыятычнай дзейнасці мужных і рашучых людзей — выкладчыка малявання педагагічнага вучылішча Міхаіла Пятровіча Агурцова, студэнтку першага курса Гомельскага педагагічнага інстытута Соф'ю Андрэеўну Мікіцюк, бухгалтара Міхаліну Вацлаваўну Васілеўскую і яе сына Уладзіслава, загадчыка склада друкарні Георгія Апанасавіча Малашчыцкага і Максіма Рыгоравіча Дашчынскага, майстра па рамонту машын.

Патрыёты праводзілі вялікую палітычна-растлумачальную работу, друкавалі і распаўсюджвалі сярод насельніцтва Рэчыцы лістоўкі. Па заданню камандавання партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава група аддрукавала тысячу экземпляраў артыкула газеты «Правда» — «Военно-политические итоги первого года войны». Пазней былі аддрукаваны звыш трох тысяч экземпляраў лістовак — «Людзі, за зброю!», «Што даў фашызм сялянству», «Забіць немца — абавязак кожнага грамадзяніна» і г. д.

Распаўсюджванне ў Рэчыцы лістовак усяляла ў душы гараджан веру ў тое, што канчатковая перамога ў вайне будзе за савецкім народам.

Гестапаўцы зрабілі ўсё для таго, каб адшукаць крыніцу вырабу лістовак. А яны з'яўляліся зноў і зноў. І. Д. Усхопаў, М. П. Агурцоў і С. А. Мікіцюк заставаліся нярэдка ў друкарні на ўсю ноч. Аддрукаваныя тэксты Соф'я Мікіцюк дастаўляла на смалакурны завод. Адтуль прыносіла шкіпінар, прызначаны для прамыўкі шрыфтоў.

Выпуск лістовак працягваўся да ліставада 1942 года.

У Рэчыцу прыбыў з Гомеля следчы «Абвергруппы 315» зондэрфюрэр СС Гартман. Для вопытнага разведчыка не было складанай задачай высветліць, што лістоўкі вырабляюцца непасрэдна ў Рэчыцы. Усе члены падпольнай патрыятычнай групы друкарні былі арыштаваны і расстраляны. Толькі М. Р. Дашчынскі пазбегнуў арышту і своечасова накіраваўся ў партызанскі атрад.

У драматычным тэатры горада падпольную патрыятычную групу арганізаваў і ўзначальваў капітан НКУС Георгій Сяргеевіч Хумар'ян, які быў пакінуты ў тыле ворага. У канцы жніўня 1941 года Хумар'ян прыбыў у Рэчыцу і ўладкаваўся працаваць качагарам у драмтэатры. У пачатку 1942 года Георгій Сяргеевіч устанавіў даверлівыя адносіны з артыстамі Пятром Дзмітрыевічам Нікуліным, Віктарам Іларыёнавічам Ануфрыевым, Аляксандрам Васільевічам Зубрыцкім, Зінаідай Мікалаеўнай Кулей. Крыху пазней у групу ўвайшлі Неаніла Міхайлаўна Скавародзіна, Клаўдзія Карпаўна Нікуліна, Марыя Міхайлаўна Кастылёва.

Вопытны чэкіст Г. С. Хумар'ян нямала зрабіў для абучэння падпольшчыкаў мастацтву канспірацыі, спосабам атрымання разведвальнай інфармацыі ад нямецкіх ваеннаслужачых і паліцэйскіх чыноў, з якімі часта сустракаліся артысты. Першачарговай задачай групы Г. С. Хумар'ян лічыў падрыхтоўку ўзрыву тэатра ў той час, калі на спектаклі будзе асабліва шмат гітлераўцаў.

У маі 1942 года пры дапамозе З. М. Кулей Г. С. Хумар'ян сустрэўся з М. С. Храмчанка. Праз яе наладзіў сувязь з кіраўніцтвам партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава.

Аперацыя па ўзрыву драматычнага тэатра не ўдалася. Г. С. Хумар'ян, В. І. Ануфрыеў і П. Д. Нікулін былі вымушаны пайсці ў лес. Неўзабаве Г. С. Хумар'ян быў прызначаны намеснікам камандзіра партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава па разведцы.

Падпольная група драмтэатра працягвала дзейнічаць і пасля таго, як кіраўнік яе быў вымушаны пакінуць Рэчыцу. Падпольшчыкі здабывалі каштоўныя звесткі аб варожых часцях, працягвалі работу па падрыхтоўцы ўзрыву памяшкання драмтэатра. А. В. Зубрыцкі збіраў тол. На жаль, у лістападзе 1942 года ён быў схоплены гестапаўцамі і расстраляны.

З дапамогай звестак, атрыманых ад З. М. Кулей, у пачатку лістапада 1943 года савецкая авіяцыя знішчыла буйны склад боепрыпасаў ворага, што знаходзіўся непадалёку ад Рэчыцы.

Актыўна дзейнічала і падпольная патрыятычная група ў гарадской управе, якой кіраваў Міхаіл Макаравіч Жыленка. Падпольшчыкі здабывалі бланкі дакументаў, пропускі. Яны сабралі і перапраўлілі партызанам значную колькасць зброі і прадуктаў.

У маі 1943 года гітлераўцы натрапілі на след групы. М. М. Жыленка і Якаў Емяльянавіч Шылянок былі арыштаваны і пасля жорсткіх катаванняў расстраляны.

Пасля правалу некалькіх падпольных патрыятычных груп Рэчыцы М. П. Кошалеву нельга было заставацца ў горадзе. Ён пакінуў Рэчыцу і прыбыў у партызанскі атрад імя К. Я. Варашылава. Потым змагаўся з ворагам у складзе Украінскага партызанскага злучэння А. Н. Сабурава.

Гітлераўцы схапілі маці, сястру, сына і трохгадовую дачку Мікалая Пятровіча. Неўзабаве ўсе яны былі расстраляны.

Замест М. П. Кошалева ў Рэчыцу быў накіраваны камандаваннем партызанскага атрада жыхар вёскі Завужаль Фёдар Сямёнавіч Яўланчык.

З мая 1943 года, калі ўсе гарадскія падпольныя патрыятычныя групы былі разгромлены, Г. С. Хумар'ян распачаў дзейнасць па наладжванню новых сувязяў. Адной з сувязных стала былая старшая піянерважатая Азершчынскай сярэдняй школы Ганна Мацвееўна Сумак. Калі ж у Рэчыцкі раён прыбыў спецатрад НКУС «Дружба» пад камандаваннем І. А. Жолабава, Ганна Сумак пачала працаваць па заданню гэтага атрада.

Лёс дзяўчыны быў трагічным. За месяц да вызвалення Рэчыцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Ганну затрымалі гестапаўцы. Яны знайшлі ў яе сумачцы магнітную міну. Дзяўчыну катавалі. Але яна нікога са сваіх таварышаў не выдала. І тады яе даставілі на базарную плошчу, у прысутнасці многіх рэчычан павесілі.

Сувязной партызанскага атрада, а потым брыгады імя К. Я. Варашылава была і Марыя Фёдараўна Сямёнава (Грыцкова). Працуючы ў бальніцы, здабывала для народных мсціўцаў медыкаменты і перавязачны матэрыял, выконвала заданні па наладжванню сувязі з падпольшчыкамі Гомеля і Лоева.

У ліпені 1943 года з-за пагрозы арышту М. Ф. Сямёнава была вымушана пайсці ў лес.

Да вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў партызанскай сувязной з'яўлялася старшая лабарантка маслазавода Зінаіда Мікітаўна Пачтарэнка.

Большасць удзельнікаў Рэчыцкага гарадскога патрыятычнага падполля загінула. Але памяць аб іхніх гераічных справах будзе жыць у сэрцах землякоў.

І. А. Шафір

У глыбокім тыле фашыстаў

З гісторыі Васілевіцкага патрыятычнага падполля ў час Вялікай Айчыннай вайны

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны гарадскі пасёлак Васілевічы апынуўся як бы паміж двума напрамкамі наступлення нямецка-фашысцкіх войскаў. Менавіта таму захопнікі прыйшлі на тэрыторыю былой Палескай вобласці і Васілевіцкага раёна на два месяцы пазней, чым у вобласці заходнія.

У ліпені — жніўні 1941 года па рашэнню Палескага абкама партыі і раённых партыйных камітэтаў з мэтай арганізацыі партызанскага руху ў тыле ворага была пакінута вялікая група партыйных, камсамольскіх і савецкіх работнікаў. На першым часе гэтыя людзі ўваходзілі ў састаў знішчальных атрадаў. Такія атрады павінны былі вышукваць варожых дыверсантаў, весці барацьбу з панікёрамі і распаўсюджвальнікамі правакацыйных чутак. У інфармацыйнай запісцы былога першага сакратара Палескага абкама П. А. Лявіцкага ад 13 ліпеня 1941 года адзначаецца: «У Васілевіцкім раёне знішчальныя атрады ўзначальвае былы партызан камуніст тав. Філончык».

Вораг набліжаўся, а часці Савецкай Арміі адыходзілі на ўсход. Перад знішчальнымі атрадамі, у тым ліку і Васілевіцкім, была пастаўлена задача застацца на акупіраванай тэрыторыі і працягваць з ворагам барацьбу партызанскімі метадамі. Таму непадалёк ад Васілевіч была створана апорная база, на якую завезлі зброю, боепрыпасы, адзенне і прадукты.

У жніўні 1941 года быў створаны Васілевіцкі партызанскі атрад. Спачатку на чале яго стаяў А. А. Казлоў, а потым чэкіст Аляксандр Захаравіч Духанін. Камісарам атрада з'яўляўся У. К. Філончык. Атрад размяшчаўся ў раёне паміж вёскамі Хобнае, Маканавічы, Кабылеў (Першамайск). Назва атрада — «За Радзіму».

На жаль, Васілевіцкі партызанскі атрад, як і знішчальныя атрады, дзейнічаў нядоўга. Некаторыя з байцоў атрада пакінулі яго. Мела месца і здрадніцтва. Менавіта таму фашысты пасля акупацыі тэрыторыі Васілевіцкага раёна адразу ж устанавілі месцазнаходжанне атрадаў і іхніх баз.

Пасля разгрому партызанскага атрада «За Радзіму» частка партызан пайшла ў бок лініі фронту, шмат хто вярнуўся дамоў і пражываў на акупіраванай тэрыторыі. Некаторых фашысты арыштавалі, а потым расстралялі.

У Васілевічах і на тэрыторыі раёна дзейнічала падпольная патрыятычная група, на чале якой стаяў Ціхан Мінавіч Астапенка. Членамі групы з'яўляліся Любоў Пятроўна Курганская, Мікалай Ігнатавіч Астапенка, Яфім Пятровіч Шульга, Якаў Адамавіч Астапенка, Гаўрыла Мікалаевіч Журанок, Антон Іосіфавіч Зайцаў, Павел Аляксеевіч Астапенка. Для падпольнай работы былі пакінуты і камсамольцы. Гэта — Марыя Канстанцінаўна Трафімава, Ларыса Віктараўна Мілановіч, Аляксандр Фёдаравіч Фралоў.

З першых дзён акупацыі падпольшчыкі ўключыліся ў актыўную дзейнасць. У верасні 1941 года Ц. М. Астапенка праз сувязную М. К. Трафімаву папярэдзіў кіраўніцтва Васілевіцкага партызанскага атрада аб карнай аперацыі, якую рыхтавалі гітлераўцы. Гэта дазволіла партызанам пазбегнуць вялікіх страт, нанесці ворагу адчувальны ўрон. На жаль, сувязная М. К. Трафімава, пасля таго як вярнулася з атрада ў Васілевічы, была схоплена гітлераўцамі і закатавана.

З мэтай атрымання шырокай магчымасці для ажыццяўлення сувязі з падпольшчыкамі, а таксама для маскіроўкі Ц. М. Астапенка згадзіўся быць старшынёй Васілевіцкай воласці. За сакратара воласці працавала Л. П. Курганская. Атрымаць такія пасады ім дапамог бургамістр Васілевіч Іонас, немец па нацыянальнасці, які да

вайны жыў у Васілевічах. Выкарыстоўваючы сваё становішча, Ц. М. Астапенка і Л. П. Курганская забяспечвалі членаў падполля неабходнымі прапускамі, афармлялі дакументы на пастаяннае месца жыхарства для многіх параненых і хворых байцоў Чырвонай Арміі, якім удалося ўцячы з фашысцкага палону.

У студзені — лютым 1942 года работнікі валаснога ўпраўлення пераправілі партызанам Акцябрскага раёна 200 тысяч рублёў, якія былі сабраны ў насельніцтва ў якасці падаткаў. Каб гітлераўцы не раскусілі хітрасць, было інсцэніравана рабаўніцтва валасной касы.

Васілевіцкія падпольшчыкі сабралі і перадалі партызанам нямала зброі і боепрыпасаў.

У лютым 1942 года з падполлем устанавілі сувязь даманавіцкія падпольшчыкі. Гэта зрабілі Панкрат Паўлавіч Алісейка і Міхаіл Дзянісавіч Гарбачоў. Такая сувязь спрыяла пашырэнню барацьбы супраць акупантаў.

Да вясны 1942 года Васілевіцкая падпольная арганізацыя мела ў сваіх радах звыш 30 патрыётаў.

Вясной дзейнасць падпольшчыкаў стала яшчэ больш актыўнай. Яны збіралі для партызан зброю, боепрыпасы, медыкаменты, хавалі параненых, распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі. Іх друкавала камсамолка Ларыса Мілановіч, якая працавала прыбіральшчыцай у мясцовым леспрамгасе. У канторы леспрамгаса была схавана пішучая машынка. Калі ўсе ішлі дамоў, Мілановіч, карыстаючыся правам прыбіральшчыцы, заставалася на рабоце. Наводзіла ў пакоях парадак, а потым садзілася за машынку.

У цэнтры Васілевіч фашысты на спецыяльным стэндзе вывешвалі зводкі навін з франтоў, у якіх «трубілі» аб сваіх буйных перамогах. І вось недзе ў сакавіку 1942 года на гэтым стэндзе побач з нямецкай зводкай з'явілася паведамленне Саўінфармбюро, у якім расказвалася праўда аб разгроме фашысцкіх войскаў пад Масквой. Гэта прывяло фашыстаў у шаленства. Пачаліся арышты, допыты. Каля стэнда акупанты паставілі часавога. Тады падпольшчыкі пачалі дзейнічаць інакш. Яны прыклейвалі лістоўкі да хат, у якіх жылі паліцаі, на дзверы жандармерыі і камендатуры. Найчасцей лістоўкі расклейвалі Ігар Мілановіч і Васіль Белы, якім было па 14 гадоў.

Вялі падпольшчыкі і дыверсійную работу, не давалі акупантам праводзіць збор харчавання і цёплых рэчаў. З дапамогай падпольшчыкаў была сарвана адпраўка моладзі ў Германію. Гэта мела месца ў чэрвені 1942 года. Атрымаўшы неабходную інфармацыю, партызаны зрабілі засады на асноўных дарогах, якія вялі да гарадскога пасёлка. Дзякуючы гэтаму былі разгромлены групы немцаў і паліцаяў, якія займаліся зборам юнакоў і дзяўчат. Скарыстаўшы перастрэлку, якая ўзнікла паміж немцамі, паліцаямі, а з другога боку — партызанамі, моладзь, сабраная для адпраўкі ў Германію, уцякла з вагонаў.

Падпольшчыкі Васілевіч перадалі партызанам Даманавіцкага раёна звесткі аб тым, што атрад васілевіцкай паліцыі на чале з яе начальнікам Янчынскім рыхтуецца да выезду ў ліпаўскі паліцэйскі гарнізон. Была зроблена засада, і атрад карнікаў быў знішчаны каля вёскі Насовічы.

У чэрвені — ліпені таго ж 1942 года васілевіцкія падпольшчыкі рыхтавалі дзве буйныя аперацыі. Яны меркавалі падарваць чыгуначны мост праз Ведрыч і атруціць ежу ў афіцэрскай сталоўцы. Здзейсніць задуманае не ўдалося. Справа ў тым, што фашысты змаглі заслаць у падпольную групу правакатара, якая і выдала ўсіх членаў васілевіцкага падполля, а таксама некаторых байцоў даманавіцкага партызанскага атрада.

6 ліпеня 1942 года ў Васілевічы пачалі прыбываць нямецкія батальёны. Гэта былі карнікі. Ц. М. Астапенка і Вольга Белая неадкладна накіраваліся ў бліжэйшыя вёскі, каб перадаць людзям небяспечную вестку.

Першыя карныя аперацыі немцы правялі ў вёсках Бабічы і Ліскі. Вось як нагадвае пра тое Павел Аляксеевіч Астапенка: «Мяне арыштавалі ўвечары 6 ліпеня ў Лісках. Прывялі ў жандармерыю, патрабавалі, каб расказаў пра падпольшчыкаў і партызанаў. Я адмовіўся. Тады мяне збілі і кінулі ў камеру. На наступны дзень прывялі яшчэ 27 чалавек. Сярод іх былі Ціхан і Якаў Астапенкі, Курганская, Ларыса Мілановіч і яе маці. Допыт вёў гебітскамісар Орлічак і афіцэр гестапа ў чыне капітана...»

12 ліпеня былі арыштаваны Е. Ф. Лаўшук і В. П. Сопат з Навінак. У той жа дзень некалькі машын з карнікамі накіраваліся ў Даманавіцкі раён. Яны ставілі сваёй мэтай знішчэнне кіраўніцтва мясцовага партызанскага атрада. У вёсцы Блудзім карні-

кі схапілі Мікалая Герасімавіча Алісейку, Ганну Малчан, Філімона і Матруну Уласенкаў. Усіх пасадзілі на аўтамашыну, пад'ехалі да хаты Уласенкаў, запалілі яе і на вачах у бацькоў кінулі ў агонь іхніх чацвёра дзяцей. Затым фашысты расстралялі і спалілі бацькоў Н. М. Дзянісовіч — камісара Даманавіцкага партызанскага атрада. У вёсцы Ліпава карнікі арыштавалі ў той жа дзень Марыю Іванаўну Капітанаву (Капітонаву).

Усіх арыштаваных прывезлі ў Васілевічы. Два дні дапрошвалі. На допытах білі, у камеру многіх прыносілі без прытомнасці.

14 ліпеня ў 12 гадзін дня гестапаўцы вывелі ўсіх з камеры ў калідор. Пералічылі. Вязняў было 37. Пасля гэтага перакладчык зачытаў прыгавор. Як значылася там, за сувязь з партызанамі і дзеянні, накіраваныя супраць нямецкіх улад, усіх расстраляюць. Людзей прыкладамі загналі ў машыну, вывезлі ва ўрочышча «Рубанікі» і там свой жудасны прысуд прывялі ў выкананне. Праўда, па дарозе ва ўрочышча ўдалося ўцячы Мікалаю Герасімавічу Алісейку і Паўлу Аляксеевічу Астапенку.

Справу, пачатую васілевіцкімі падпольшчыкамі, працягвала мясцовая моладзь. Так, яшчэ ў лютым 1942 года на кватэры Вольгі Белай (Шчэрскай) пад выглядам вечарынкі сабраліся вучні Васілевіцкай сярэдняй школы. Сярод іх былі Мікалай Белы, Іван Навуменка, Іван Доўжык, брат Вольгі — Анісім Белы і інш. Панкрат Паўлавіч Алісейка, які прысутнічаў тут, дапамог юнакам арганізацыйна аформіць сваё падполле, параіў, з чаго пачынаць работу, звярнуў увагу на неабходнасць строгага захоўвання канспірацыі. Юныя падпольшчыкі назвалі сваю арганізацыю «За Радзіму», абралі камітэт. У яго ўвайшлі Анісім і Мікалай Белыя, Іван Навуменка, Іван Доўжык і Міхаіл Кучараў. На чале арганізацыі стаў Анісім Белы, які ўжо меў пэўны вопыт у барацьбе з фашыстамі, бо з першых дзён вайны быў байцом мясцовага знішчальнага атрада.

Неўзабаве праз П. П. Алісейку васілевіцкія камсамольцы ўстанавілі сувязь з даманавіцкім партызанскім атрадам. Іван Навуменка здабыў радыёпрыёмнік. Схавалі яго ў доме Васіля Глыбоўскага. З гэтага часу юныя падпольшчыкі пачалі прымаць зводкі Саўінфармбюро. Разам з тым яны пісалі лістоўкі і распаўсюджвалі іх сярод насельніцтва. Аднойчы Мікалай Белы адшукаў у памяшканні разбітай пры бамбёжцы друкарні раённай газеты «Сацыялістычная праца» шрыфт і друкарскую фарбу. За некалькі дзён юнакі перанеслі ўсё гэта ў дом Івана Доўжыка. У хуткім часе сабралі прымітыўны друкарскі станок, раздабылі паперу. Лістовак ужо выпускалася больш, з'явілася магчымасць распаўсюджваць іх не толькі ў Васілевічах, а і ў вёсках раёна.

Рыхтавалі сябе падпольшчыкі і да актыўнай узброенай барацьбы. Яны збіралі зброю і боепрыпасы, хавалі ўсё гэта ў тайніках. Мікалай Белы, які па заданню камітэта ўладкаваўся ў паліцыю, нярэдка заходзіў у рамонтную майстэрню. Часам яму ўдавалася вынесці адтуль то затвор ад вінтоўкі, то якую частку ад пісталета ці аўтамата. У хляве паліцэйскага ўчастка Мікалай знайшоў два мяхі аманалу. Скарыстаўшы тое, што хлеў не ахоўваўся, ён з дапамогай таварышаў вынес узрыўчатку. У хуткім часе падпольная патрыятычная арганізацыя моладзі гарадскога пасёлка Васілевічы мела некалькі вінтовак, гранаты і патроны, 80 кілаграмаў узрыўчаткі.

З лета 1942 года маладыя патрыёты пераходзяць да актыўнай дыверсійна-тэрарыстычнай дзейнасці. Аднойчы ноччу Анісім Белы і Іван Доўжык непрыкметна выбраліся з пасёлка і ўстанавілі на чыгункі паміж Васілевічамі і Нахавам самаробную міну, сканструяваную Іванам. На наступны дзень жыхары пасёлка гаварылі толькі аб адным: як партызаны пусцілі пад адхон паравоз і некалькі вагонаў. Неўзабаве падпольшчыкі ўзарвалі мост каля вёскі Ліскі.

Камсамольцы атрымалі заданне ад камандавання партызанскага атрада імя Варашылава знішчыць васілевіцкага гебітскамісара Орлічка. За справу ўзяліся Анісім Белы і Міхаіл Кучараў. Але выканаць заданне ім не ўдалося. Анісім быў арыштаваны па даносу правакатара. Ніякія здзекі не прымусілі юнака выдаць сваіх таварышаў. І першага жніўня 1942 года фашысты расстралялі Анісіма і яго сястру Вольгу. Пасля гібелі свайго кіраўніка па рашэнню камітэта падпольную арганізацыю ўзначаліў Мікалай Белы.

29 ліпеня 1942 года ў раёне вёскі Ізбынь прызямлілася дэсантная група пад кіраўніцтвам Фёдара Сяргеевіча Манзіенкі. Першымі, з кім звязаліся дэсантнікі, былі жыхары вёскі Глінная Слабада — Лідзія Сямёнаўна і Іван Данілавіч Шумакі, Ма-

рыя Сямёнаўна Судас і Ефрасіння Міхайлаўна Пырко. Перад дэсантнай групай ставілася задача ведаць усё, што адбываецца каля Васілевіч — у глыбокім тыле фашыстаў, у тым ліку і на чыгункі Брэст — Гомель, на мясцовых шасейных дарогах. Пасланцы з Вялікай зямлі мелі таксама заданне арганізаваць разведку варожых гарнізонаў, ажыццяўляць дыверсіі, каб зямля літаральна гарэла пад нагамі ў захопнікаў.

Кола людзей, якія прыйшлі на дапамогу дэсантнікам, пашыралася. Ім дапамагалі не толькі вяскоўцы, а і Калінкавіцкі партызанскі атрад, на чале якога быў Кузьма Бакун, Даманавіцкі атрад Паўла Кашавараваа, члены васілевіцкіх падпольных груп і арганізацый. Так, падпольшчыкі гарадскога пасёлка сачылі за дыслакацыяй варожых часцей, за прасоўваннем эшалонаў і г. д. Іван Доўжык, які працаваў на чыгуначнай станцыі, вызначаў, які груз знаходзіцца ў вагонах, куды эшалон накіроўваецца. А вось Іван Навуменка здабываў неабходныя бланкі і дакументы, грошы. Ён скарыстоўваў сваю работу ў бухгалтэрыі лясгаса. Усё здабытае — весткі, дакументы, грошы, прадукты — хлопцы накіроўвалі праз Мікалая Белага Ф. С. Манзіенку.

Асабліва плённым для дэсантнікаў быў 1943 год. Дзякуючы радыёстанцыі, яны звязалі мясцовыя партызанскія атрады з Цэнтральным штабам партызанскага руху. На Палессе пачалі прылятаць самалёты. Яны дастаўлялі народным мсціўцам самае неабходнае.

Летам 1943 года група Манзіенкі выросла да атрада. У тым жа 1943 годзе з 101-ай Даманавіцкай брыгады вылучылася група партызан, якая ўтварыла Васілевіцкі атрад. На чале яго стаў Сямён Агеевіч Смерцін, афіцэр Чырвонай Арміі, які ў 1941 годзе не прабіўся праз лінію фронту і застаўся змагацца з ворагам на тэрыторыі Беларусі. Ён пачынаў сваю дзейнасць радавым партызанам, потым стаў камандзірам атрада. У кастрычніку ж 1943 года Сямён Агеевіч узначаліў Васілевіцкую партызанскую брыгаду імя Панамарэнкі.

У другой палове лістапада 1943 года Васілевічы і раён былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Каб гэты дзень хутчэй прыйшоў, мужна змагаліся і васілевіцкія патрыёты.

В. Сяргеева

У час блакады загінула наша сям'я

З успамінаў Марыі Пятроўны Худароба, былой партызанкі атрада імя Варашылава

Наша сям'я была вымушана пайсці ў лес. Я стала партызанкай атрада імя Варашылава.

У снежні 1942 года фашысты распачалі супраць народных мсціўцаў блакаду. Партызаны пакінулі Рэчыцкі раён і адступілі на Акцябршчыну.

У час блакады загінула ўся наша сям'я: бацька, маці, тры сястры і брат. Яны былі пахаваны ў валадарскіх лясах, а потым перазахаваны на могілкі вёскі Валадарск.

Пра бацьку варта сказаць крыху асобна. Па нацыянальнасці ён серб. Быў інтэрнацыяналістам. У гады грамадзянскай вайны без аніякага роздуму перайшоў на бок савецкай улады. Служыў у славутай 1-ай конай арміі Будзённага. Быў адзначаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Як вядома, у першыя гады савецкай улады гэта была вышэйшая ўзнагарода краіны. Зараз бацькоўскі ордэн захоўваецца ў Рэчыцкім краязнаўчым музеі.

...Хацелася б назваць некаторых з нашых падпольшчыкаў. У барацьбе з фашыстамі жыццяў не шкадавалі Уладзімір Саматкан, Міхаіл Яўланчык, Мікалай Назаранка, Леанід Маторны і інш.

Патрыёты сівелі рана

Раі Курыленка было толькі васемнаццаць, калі яна прыехала ў вёску Сасноўка Гомельскага раёна, каб працаваць тут настаўніцай. Вяла першы клас, у пятым выкладала матэматыку, фізкультуру і спевы. Даручылі ёй і школьны драматычны гурток.

Але ў хуткім часе ў жыццё настаўніцы і яе вучняў уварвалася вайна.

Муж Раісы Апанасаўны пайшоў на фронт, а сама яна вярнулася ў родныя мясціны — вёску Берагавая Слабада.

...Неяк у хату Курыленкаў завітаў партызанскі камандзір П. І. Васільеў. Ён добра ведаў гаспадыню Алену Пятроўну, маці Раісы Апанасаўны, таму адразу ж перайшоў да справы:

— Вось што, Пятроўна. Ты дапамагаеш нам. Але думка ёсць даць заданне і тваёй дачцы. Супраць не будзеш?

Алена Пятроўна адказала без роздуму:

— Рая даўно хацела наладзіць з вамі сувязь.

— Ну то і добра, — сказаў, бы падвёў рысу пад размоваю, Пётр Іванавіч.

Вось так і стала Р. А. Курыленка сувязной партызанскага атрада. Разведвала размяшчэнне варожых падраздзяленняў, іхнія сілы, агнявыя кропкі, умацаванні і г. д. Запісаў не вяла. Усё заўважанае трымала ў галаве.

...13 чэрвеня 1943 года накіравалася на чарговае заданне ў Рэчыцу. Там даведалася, што карны атрад гатовы направіцца ў партызанскую зону, размешчаную паміж вёскамі Глыбаў, Падалессе, Берагавая Слабада і Гарноўка. Заспяшалася назад, каб папярэдзіць баявых сяброў, але нечакана трапіла на фашысцкую засаду.

Яе, як і іншых затрыманых, прывялі ў Глыбаў. Жорстка білі, а потым кінулі ў адну з хат.

Раніцай гэту хату фашысты падпалілі. Гарэў дах, узяліся полымем сцены. Здавалася, ратунку не будзе. І тут каты адчынілі дзверы. Вязні пачалі выскокваць на вуліцу.

Усіх, у тым ліку і Раісу Апанасаўну, карнікі пагналі ў Рэчыцу. Ва Унорыцы канваіры-аўтаматчыкі спыніліся на адпачынак. Пасмейваючыся, паведамілі арыштаваным, што ўсіх іх у Рэчыцы расстраляюць.

І тады Р. А. Курыленка вырашыла скарыстаць свой апошні шанц. Калі канваіры пачалі прыкурваць цыгарэты, яна кінулася да недалёкага абрыву. Сіганула з яго ў лазу, затопленую вадой. Услед ёй засакаталі аўтаматныя чэргі. Але партызанскую сувязную хавалі кусты. На шчасце, ніхто з фашыстаў не пажадаў лезці ў ваду.

Упэўніўшыся, што карнікі адышлі, яна кінулася бегчы ў бок Глыбава. Бегла, пакуль не выбілася з сілы...

У Глыбаве сустрэлася з мясцовымі жыхарамі. Тыя дапамаглі дзяўчыне дабрацца да Мілаграда. Там і сустрэлася з партызанамі. Даведалася, што яе маці і маленькі сын знаходзяцца ў атрадзе.

На наступны дзень Раіса зірнула ў люстэрка, і... спалохана адхіснулася ад бліскучага шкла. Убачыла, што галава зусім сівая. Пасівела ад перажытага ў няпоўныя дваццаць тры гады.

У лістападзе 1943-га наша мясцовасць была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Былая настаўніца і партызанская сувязная Р. А. Курыленка атрымала прапанову папрацаваць у райвыканкаме. Згадзілася. Але неўзабаве, як прызнаецца сама, засумавала па школе. Вярнулася на педагагічную працу.

У школе Раіса Апанасаўна працавала звыш сарака гадоў. Тысячы былых выхаванцаў памятаюць яе як любімую настаўніцу. І мала хто ведае пра яе гераічнае мінулае. Што ж, усё тут зразумела: такія, як Р. А. Курыленка, у час цяжкіх выпрабаванняў штодня рызыкавалі сваім жыццём не дзеля славы, а каб хоць крыху наблізіць светлы дзень Вялікай Перамогі.

А. З. Караленка

Былі арышты, катаванні і расстрэлы

З успамінаў Т. І. Лагоўскай, падпольшчыцы, партызанскай сувязной

Так атрымалася, што мой бацька Ілья Іванавіч Блёскін, член партыі з 1924 года, у 1939-ым быў накіраваны на работу старшым дарожным майстрам 5-ай дыстанцыі пуці станцыі Баранавічы. Дагэтуль ён працаваў у Рэчыцы.

Мой муж Іван Паўлавіч Лагоўскі знаходзіўся ў гэты час у арміі. Таму я і вырашыла паехаць з бацькам.

Калі пачалася вайна, я здолела з сынам, якому быў усяго год, і сястрой Людмілай, 1925 года нараджэння, выбрацца з Баранавіч, якія немцы бамбілі, і вярнуцца ў свае мясціны. Прыехалі мы ў Салтаноў. Тут жылі бацькі майго мужа.

У Рэчыцкім педагагічным вучылішчы вучылася мая сястра Валянціна. Ёй было васемнаццаць гадоў, і ў першы ж дзень фашысцкай навалы яна стала байцом народнага апалчэння. Апалчэнцкі атрад ствараўся для таго, каб ахоўваць прадпрыемствы гора-

да, а таксама весці барацьбу з дыверсантамі. На чале падраздзялення, дзе знаходзілася Валянціна, быў Аляксандр Іванавіч Варона.

Валянціна да апошняга заставалася ў Рэчыцы, таму і выехаць з горада не змагла. У мяне ж на руках маленькі сын і хворая сястра Людміла, таму і я эвакуіравацца не здолела. Так мы, тры сястры, і засталіся на акупіраванай ворагам тэрыторыі.

У канцы 41-га я сустрэла ў Рэчыцы жонку дарожнага майстра Паўла Якаўлевіча Шатона. Яна запрасіла мяне да сябе.

Павел Якаўлевіч нічога ад мяне не хаваў. Ён сказаў:

— Я ведаю, Тамара, твайго бацьку і тваю сям'ю. І ў табе я ўпэўнены. Дык вось, у нас на станцыі дзейнічае падпольная група. Думаю, што і ты станеш членам гэтай групы.

Я без роздуму згадзілася з прапановай П. Я. Шатона. Разумела, што ў барацьбе з фашыстамі можа быць усялякае. У тым ліку і арышт. Таму, каб у выніку правалу не ставіць пад удар сям'ю свёкра і не рызыкаваць лёсам маленькага сына, я вырашыла перабрацца ў Рэчыцу. Гэтак і зрабіла, знайшоўшы там паўразбураную хаціну. Пасялілася мы разам з Людмілай.

...На працягу 1941—1942 гг. падпольная група П. Я. Шатона выратавала ад угону ў Германію дзесяткі юнакоў і дзяўчат. Ім выдаваліся даведкі, што яны з'яўляюцца рабочымі чыгункі. У дакументах на заработную плату і за харчовыя карткі распісваліся некалькі падпольшчыкаў. У тым ліку я і жонка Паўла Якаўлевіча. А вось прадукты атрымліваў, аплачваў за іх і перапраўляў у лес сувязны партызанскага атрада.

Мы, члены падпольнай групы станцыі Рэчыца, сабатавалі, як маглі, рамонт чыгуначнага палатна і стрэлак. Нямала рабілі і для таго, каб пашкодзіць вагоны.

Нямала гераічных спраў на рахунку падпольнай групы моладзі, на чале якой быў Павел Маркаль. У групу ўваходзілі таксама Марыя Вішняк, Міхаіл Абуховіч, мае сёстры Валянціна і Людміла. Звычайна, пад выглядам наладжвання вечарыны, яны збіраліся разам. Уключалі радыёпрыёмнік, які належаў Абуховічу. Запісвалі зводкі Саўінфармбюро, пісалі лістоўкі і расклейвалі іх у горадзе.

Пазней для распаўсюджвання лістовак былі прыцягнуты Віктар Кніга і Лена Катлабай. Праўда, Павел Маркаль у мэтах канспірацыі не пазнаёміў Віктара і Лену з усімі членамі групы. Таму пад кіраўніцтвам маёй сястры Валянціны Кніга і Катлабай пачалі дзейнічаць як бы асобнай групай.

Зімой Абуховіч быў арыштаваны. Каб адвесці ад яго падазрэнні гестапаўцаў, члены маладзёжнай групы пачалі яшчэ больш актыўна распаўсюджваць у Рэчыцы лістоўкі.

Урэшце Мішу ўдалося вырвацца з рук ворага. Але знаходжанне ў турме, жорсткія катаванні прывялі да таго, што Міша доўга хварэў.

Павел Маркаль забараніў членам групы заходзіць да Абуховіча. І тады той сам пачаў прымаць зводкі Саўінфармбюро. Запісваў іх і перадаваў баявым таварышам для распаўсюджвання.

У маі 1942 года Міша Абуховіч быў арыштаваны зноў. Пры вобыску гестапаўцы знайшлі ягоны радыёпрыёмнік. Неўзабаве з лістоўкамі была арыштавана і мая сястра Людміла.

На допытах арыштаваныя нікога не выдалі. У час вочнай стаўкі яны, Міша і Люда, адзін другога «не пазналі».

Маю сястру прывялі зноў у камеру. А неўзабаве да яе зайшоў паліцай з аховы і сказаў:

— Падыдзі да акна. Ды не высоўвайся.

Людміла ступіла да акна камеры і ўбачыла, як па парку ідуць насустрач адна другой дзве групы хлопцаў і дзяўчат. У адной з іх быў Павел Маркаль. Насупраць камеры хлопцы спыніліся, пачалі прыкурваць. І тады Людміла пачула: «Ты нікога не ведаеш... За сябе не хвалюйся...» Мая сястра зразумела: сказанае адрасуецца ёй.

Павел Маркаль арганізаваў уцёкі з турмы маёй сястры. Ён жа папярэдзіў, што заставацца нам у горадзе надзвычай небяспечна, таму патрэбна ісці ў партызанскі атрад.

П. Я. Шатон пазнаёміў нас з Мікалаем Кошалевым. Той сказаў, што нас з сястрой вывезуць з горада на машыне.

Тры дні мы з сястрой хаваліся ад магчымага арышту ў хляве Паўла Якаўлевіча Шатона. А потым да ягонай хаты пад'ехала палутарка. За рулём машыны сядзеў Дзмітрый Помаз. У кузаве былі Павел Маркаль, Мікалай Кошалеў, а таксама Ксенія і Ніна Бураковы, якія з'яўляліся гаспадынямі адной з явачных кватэр.

Мне думалася, што машына адразу ж на-

кіруецца за горад. Але найперш яна паехала да хлебазавода. Там Павел і Мікалай ускінулі ў кузаў два мяхі з хлебам. Затым, пад'ехаўшы да аднаго з магазінаў, забралі соль, цукар, кілбасы. Вядома, па харчовых картках фіктыўных рабочых чыгункі. З буфета чыгуначнага вакзала Маркаль і Кошалеў узялі бочку з півам. І толькі тады Помаз павёў машыну за горад.

У раёне вёскі Будка Шыбенка нас сустрэлі М. Ф. Турчынскі, П. І. Васільеў, М. С. Храмчанка.

У партызанскім атрадзе прадукты былі выгружаны, і палутарка накіравалася ў Рэчыцу. Мы ж з Людмілай засталіся ў атрадзе.

Тут, у лесе, было спакайней, чым у Рэчыцы. Таму мы вельмі хваляваліся за Валянціну. Яна змагалася з ворагам у саставе групы А. І. Вароны. Хадзіла на заданні на тэрыторыю Рагачоўскага раёна. Перад ёй ставілася задача ўстанавіць сувязі з народнымі мсціўцамі так званай «паўночнай» зоны вобласці.

Валянціна надта хацела далучыцца да нас, сваіх сясцёр, але Рудак, Ісачанка, Хумар'ян і іншыя кіраўнікі партызанскага руху на Гомельшчыне былі за тое, каб Валянціна заставалася на падпольнай рабоце.

Валянціна атрымала заданне стварыць з надзейных хлопцаў і дзяўчат патрыятычныя групы як у Рэчыцы, так і на тэрыторыі раёна. Група такая пачала дзейнічаць у Салтанове. Дарэчы, у гэтай вёсцы раней існавала падпольная камсамольская арганізацыя, члены якой шмат рабілі ў справе барацьбы з акупантамі. Але потым арганізацыя перастала існаваць, бо амаль усе члены яе перайшлі ў партызанскі атрад.

Патрыятычная група, створаная Валянцінай у Салтанове, была невялікай. У яе, апроч маёй сястры, уваходзілі таксама Міхаіл Ракусевіч, Марыя Шумская і Віктар Кніга, які перабраўся ў вёску з Рэчыцы.

Група наладзіла сувязь са славакамі, якія ахоўвалі чыгуначны мост праз Ведрыч. Тыя давалі падпольшчыкам зброю і боепрыпасы. Усё гэта перапраўлялася ў лес.

Справа была надзвычай рызыкоўнай, бо фашысты не надта давяралі славакам.

У 1942 годзе трагічна загінула Марыя Шумская. Яна была затрымана гітлераўцамі. Пры вобыску яны знайшлі ў дзяўчыны патроны і гранаты. Марыя несла іх у карзіне. За поясам у яе былі таксама два пісталеты.

Мужная патрыётка адмовілася назваць сваё імя. Не назвала і месца жыхарства. Азвярэлыя фашысты расстралялі яе на ўскраіне вёскі, дзе і затрымалі.

Летам 1943 года быў затрыманы Віктар Кніга. Ён нёс тол, які атрымаў у партызанскім атрадзе для падрыву спіртзавода. Ніякія катаванні не прымусілі Віктара расказаць гестапаўцам пра таварышаў па зброі. Тое, дзе пахаваны Віктар Кніга, невядома і па сёння.

Кожную нядзелю Валянціна адна ці з Ленай Катлабай хадзілі ў вёскі раёна. Найчасцей у Маладушу, Барсукі, Перавалоку, Лясное. Прыносілі ў атрад звесткі аб вайсковых падраздзяленнях ворага, дастаўлялі медыкаменты і перавязачны матэрыял. Лекі для народных мсціўцаў збіралі Тамара Грабянчук і ўрач Пятро Тарасавіч Хамянок, які ў час акупацыі працаваў у рэчыцкай клініцы.

Азіраючыся праз гады ў далёкае ваеннае мінулае сваёй сям'і і нашых баявых таварышаў, я думаю пра тую вялікую небяспеку, што падпільноўвала нас літаральна на кожным кроку. Прыгадваю многіх рэчычан, якія, рызыкуючы жыццём, хавалі нас, дапамагалі чым маглі. Гэта, у першую чаргу, сем'і: Судаковых, Паўла і Рыгора Шатонаў, Яфіма Каханоўскага, Лены Катлабай. У Глыбаве заўсёды знаходзілі прыют у сям'і Лідзіі Грабянчук, у Салтанове — Паўла Лагоўскага, Вольгі Прыходзька і інш.

Словам, у час суровых выпрабаванняў людзі адчувалі сябе як бы з аднае сям'і. Гэта дапамагала змагацца і, урэшце, перамагчы ў невыносна цяжкай барацьбе.

Сувязная атрада «Мсцівец»

Партызанскі атрад «Мсцівец» базіраваўся ў лясным масіве непадалёк ад вёскі Новы Барсук. Неяк камандаванне атрада атрымала звесткі аб тым, што карнікі рыхтуюць супраць партызан аперацыю. Атрад падрыхтаваўся да сустрэчы чужынцаў. Ішоў час, але яны не з'яўляліся. Была выслана разведка, але нічога не прынесла.

Камандзір атрада разведкі Сцяпан Іванавіч Васілец выклікаў сувязную Вольгу Бліш:

— Вазьмі, Вольга, каня ды едзь у Рэчыцу. Нешта фашысты замышляюць.

Быў марозны ранак. Конік, апусціўшы галаву, тупаў па не кранутым за ноч снезе, марудна цягнуў сані.

Вольга Фадзееўна сядзела на сене, укутаўшыся ў цёплую хустку. Уперадзе паказалася Ровенская Слабада. Пачуўшы жыллё, конік затрусіў хутчэй.

Яна, партызанская сувязная, няладнае адчула інтуітыўна. Паспрабавала павярнуць коніка назад. Але было ўжо позна: з боку вёскі пачуліся стрэлы, над галавой заціўкалі кулі.

Да саней падбеглі немцы і паліцаі. Былі ў маскхалатах. Павялі жанчыну ў вёску. Перавязалі ёй толькі што параненую руку, пачалі допыт.

— Куды ехала і хто цябе паслаў? — хацелі ведаць карнікі.

Адказала, што кіравала да сястры мужа, каторая жыве тут, у Ровенскай Слабадзе.

— А чаму ўцякала?

— Страляніну пачула, то і спалохалася.

Неўзабаве адзін з паліцаяў прывёў яе родзічку Марыю. Тая пацвердзіла, што сапраўды Вольга ехала да яе.

Карнікі не адпусцілі Вольгу Фадзееўну. Пасадзілі пад ахову. Праўда, дазволілі Марыі прынесці перадачу. І тады Вольга шапнула родзічцы: «Марыя, як сабе хочаш, але перадай аб усім у атрад. І галоўнае, што немцы тут, у Ровенскай Слабадзе...».

Марыя выканала просьбу Вольгі Фадзееўны. Партызаны своечасова атрымалі звесткі не толькі аб знаходжанні карнага атрада, але і аб колькасці фашыстаў і іхніх памагатых. Каб пазбегнуць няроўнага бою, змянілі месца дыслакацыі. Карнікі ўбачылі пусты лагер.

Вольгу Фадзееўну яны адвезлі ў Рэчыцу, паклалі на лячэнне ў бальніцу. Тут праляжала два месяцы. Лячылі яе ўрачы Шатровіч, Кудзелька, якія былі звязаны з народнымі мсціўцамі. Яны і папярэдзілі партызанскую сувязную:

— Не думай, што гітлераўцы табе паверылі. Яны дакладна ведаюць, што ты партызанка. Але нешта задумалі. Мо сочаць, хто прыйдзе да цябе.

Пасля бальніцы — турма і допыты. Білі без жалю. А яна кожны раз казала: «Ніякіх партызанаў не ведаю... Мне немцы нічога дрэннага не зрабілі, то чаму ж я супраць іх пайду».

Урэшце Вольгу Фадзееўну адпусцілі, і яна вярнулася ў родную вёску Грудское.

Неўзабаве яе падсцерагла смяротная небяспека. Была патрэба даставіць у Рэчыцу з партызанскага атрада газету «Правда» і зводкі Саўінфармбюро. Ёй зноў запрэглі коніка, паклалі на падводу парася, кінулі сена. Газету і зводкі схавала ў шкарпэтках. Затым абкруціла ногі анучамі, абулася ў чаравікі, што былі на некалькі памераў большымі, чым звычайна насіла. Тузанула лейцы, і конік паслухмяна пасунуўся па дарозе. Даехала да вёскі Гарывада. А з-за вугла бліжэйшага дома карнікі.

— Куды едзеш?

Адказала, што ў Рэчыцу. Мяркуе там прадаць парася ды купіць солі.

Казала і бачыла, што паліцаі ўжо абмацваюць вазок.

Ёй загадалі распранацца, а потым — і скінуць чаравікі.

Вольга Фадзееўна нагнулася і, ледзь стрымліваючы сябе, пачала скідваць адзін чаравік, потым другі. Скінула анучы, а сама засталася стаяць на мёрзлай зямлі ў шкарпэтках.

Старшы з паліцаяў махнуў рукой: «Едзь!»

Ужо ў каторы раз В. Ф. Бліш з палёгкай уздыхнула: «Дзякуй богу! Пранесла!»

Летам 1943 года нехта з карнікаў данёс свайму начальству, што Вольга Фадзееўна — партызанская сувязная, што яе муж — Іван Фёдаравіч Бліш — партызан і два сыны іхнія таксама знаходзяцца ў партызанскім атрадзе.

У вёску прыехалі паліцаі. Дома яе не заспелі, бо Вольга Фадзееўна якраз выконвала чарговае заданне. Фашысцкія паслугачы не хацелі вяртацца ні з чым. Таму вырашылі арыштаваць дачку партызанскай сувязной Тоню. А ў доме дзве дзяўчынкі.

— Хто дачка Вольгі?

Уперад ступіла Тоніна сяброўка. Паліцаі павялі яе з сабой. А неўзабаве даведаліся: узялі не тую. Вярнуліся назад. Тоня выскачыла ў акно і пабегла па агародах. За ёю гналіся, стралялі. Двойчы паранілі. Яна ўпала і страціла прытомнасць. Паліцаі падбеглі, агледзелі скурчаную фігурку дзяўчынкі, штурхнулі наском бота ў бок. А яна і не застагнала.

Раніцою Тоню падабраў брат Якаў. Але

не вытрымала дзяўчынка цяжкіх раненняў...

Вольга Фадзееўна Блішч страціла ў час вайны мужа і дачку. Сама неаднойчы была на крок ад смерці. Але ўсё сцярпела, перанесла. Засталася гордай і непахіснай, як належыць жанчыне вялікага і мужнага сэрца.

Ф. Каваленка, А. Дубравін

З задання не вярнулася

Перад Вялікай Айчыннай вайной Лідзіі Захараўне Кулік было 33 гады. Выхоўвала траіх дзяцей, працавала тэлефаністкай Холмецкага вузла сувязі.

У жніўні 1941 года Рэчыцкі раён быў акупіраваны фашыстамі. Лідзія Захараўна стала членам Холмецкай падпольнай групы. Калі ў амелькаўскіх лясах у верасні 1941 года па даносу здрадніка быў разгромлены партызанскі атрад, яе хата стала месцам нелегальнага пражывання народных мсціўцаў, сустрэч кіраўнікоў падпольных груп, хворых і параненых партызан. Лідзія Захараўна хавала і траіх яўрэйскіх дзяцей.

Востра стаяла пытанне стварэння новага партызанскага атрада. Была патрэба звязацца з усімі падпольнымі групамі раёна. У гэту нялёгкую і небяспечную справу ўключылася і Кулік. Хадзіла на сувязь з падпольнымі групамі Рэчыцы, вёсак Андрэеўка, Ровенская Слабада, Церабееўка, Вятхінь, Пракісель. Сабраную інфармацыю перадавала пакінутым для арганізацыі партызанскага руху таварышам.

Вясной 1943 года мсціўцы арганізавалі збор сродкаў у фонд абароны краіны. Лідзія Захараўна Кулік перадала ў атрад цэлы чамадан аблігацый дзяржаўнай пазыкі. Гэтыя аблігацыі даў ёй для захоўвання перад акупацыяй раёна начальнік Рэчыцкага вузла сувязі.

Нярэдка жанчына ішла з дому на заданні на два-тры дні. Было, што і на тыдзень. Таму над яе сям'ёю увесь час вісела смяротная небяспека. Аднойчы маці ёй сказала: «Ты ў мяне адна. Загубіш сябе і нас сваім падполлем». Паказала рукой на дзяцей. Лідзія Захараўна сціснула, каб не расплакацца, вусны, а потым, счакаўшы крыху, адказала:

— І вы ў мяне адны. Але ж, мама, трэба...

У жніўні 1943 года Лідзія Захараўна направілася ў Рэчыцу на чарговае заданне. Гэта была яе апошняя трагічная дарога. Здраднікі высачылі падпольшчыцу, даставілі ў гестапа. Скрываўленую, кінулі ў камеру, зрабілі перад гэтым прапанову выдаць месца знаходжання партызан. Маўляў, зробіш гэта, табе даруем жыццё.

Лідзія Захараўна папрасіла аловак і аркуш паперы. Там, у камеры,на гэтым аркушы напісала прозвішчы не патрыётаў, а здраднікаў. Потым, не чакаючы новых катаванняў, сама абарвала сваё жыццё.

Праз паўтара месяца пасля яе смерці вёска Холмеч была вызвалена ад фашыстаў. Байцоў Савецкай Арміі радасна сустракалі і тры дзяўчынкі, дзеці Лідзіі Захараўны, — Валя, Нэля, Ліля.

14 лістапада 1988 года на сцяне Холмецкай сярэдняй школы, у якой вучылася некалі Л. З. Кулік, была ўстаноўлена мемарыяльная дошка. З яе пазірае ўдалячынь Лідзія Захараўна — мужная патрыётка.

На жаль, ніхто не ведае, дзе фашысцкія каты закапалі цела партызанкі. Але мы, жывыя, памятаем яе подзвіг і будзем ганарыцца ёю.

Л. А. Дворнік

Уцёкі ад смерці

Іх было шасцёра: пяць мужчын і жанчына. Знаходзіліся пад аховай і чакалі смяротнага прысуду.

Пяцёра — уласаўцы, якія зразумелі ганебнасць свайго становішча і прыйшлі да рашэння змыць сваю віну перад Радзімай крывёю. А шостая — дваццацігадовая дзяўчына, сувязная партызанскага атрада «Мсцівец» Шура Кечка.

...Па заданню камандзіра партызанскага атрада Дзмітрыя Барысава яна павінна была звязацца з атрадам уласаўцаў, што стаяў у вёсцы Маладуша, выявіць тых, хто памыліўся на жыццёвай дарозе і схіліўся перад акупантамі. Трэба было дапамагчы ім перайсці са зброяй да партызан.

Што і казаць, заданне надзвычай адказнае і рызыкоўнае.

Яна, Шура Кечка, справілася з ім: здолела пераканаць уласаўцаў, што ў іх ёсць апошні шанц змыць з сябе бруд здрады. І вось каля дваццаці ўласаўцаў у адну з начэй вырашылі перайсці да партызан. Але знайшоўся здраднік, які расказаў аб гэтай задуме гітлераўцам.

Немцы арыштавалі партызанскую сувязную і ініцыятараў пераходу. Пачаліся допыты, здзекі. Гітлераўцы жадалі выпытаць у яе, дзе знаходзіцца партызанскі атрад, хто з яе знаёмых дапамагае народным мсціўцам. Але яна маўчала. Тады фашысты вывелі арыштаваных на агарод, прымусілі капаць яму. Ускінулі аўтаматы.

Афіцэр спытаў у арыштаваных, ці будуць яны гаварыць. Тыя маўчалі. Маўчала і Шура. У думках развітвалася з жыццём, шкадавала, што не здолела выканаць заданне да канца. Афіцэр загадаў адвесці арыштаваных назад у хлеў.

Расстрэл быў адменены.

Надышла ноч. Скрыпеў у куце хлява цвыркун, было чуваць, як на вуліцы тупае вартавы. Ніхто з вязняў не спаў. Кожны, напэўна, думаў аб сваім. А яшчэ: няўжо нельга знайсці выйсце?

Урэшце адзін з арыштаваных падказаў Шуры:

— Ты пастукай, папрасіся, каб пусцілі на двор. Ну, быццам...

Так і зрабіла. Вартавы, павагаўшыся крыху, адчыніў дзверы. Адно імгненне, і на яго накінуліся, звалілі на зямлю, пачалі адбіраць зброю. Немец заенчыў.

Шура выскачыла з хлява, пабегла па агародах. Напрасткі, не выбіраючы дарогі. А ззаду ўжо ўсчалася страляніна. І яе даганялі кулі.

Шура адчула, што сілы зусім мала, а тут яшчэ нешта балюча апякло руку.

А яна ўсё бегла. Упала, папаўзла.

Вось і лес. Сцягнула з галавы хустку, пачала перавязваць руку.

Па знаёмых партызанскіх сцяжынках дабралася да атрада.

Раненне, як высветлілася, сур'ёзнае. Руку давялося ампутаваць. А што ж з тымі, хто разам з ёй сядзелі ў хляве ды чакалі смерці? Двое з іх здолелі дабрацца да партызанскага атрада. Астатніх фашысты схапілі і расстралялі.

...Мала хто ў Маладушы ведае пра гераічнае мінулае Аляксандры Макараўны Кечка. Не любіла яна ні расказваць, ні дакучаць уладам просьбамі аб дапамозе. Разумела: змагацца за вызваленне ад чужынцаў — святая справа.

Так думалі яе дзяды і прадзеды. Таму і вольная наша зямля.

Ф. Каваленка, А. Дубравін

Партызанскія важакі

АНІПКА Макар Пракопавіч нарадзіўся 6(19).1.1915 г. у с. Родзіна Барнаульскага павета Томскай губерні. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Гомельшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З сялян. Член КПСС з 1943 г. Скончыў Сумскае артылерыйскае вучылішча (1938). У першыя дні Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях з нямецкімі захопнікамі каля Слоніма і Баранавіч. З красавіка 1942 г. у партызанах: камандзір узвода, роты, намеснік камандзіра рэчыцкага атрада імя Варашылава. З лістапада 1942 г. — камандзір атрада, з чэрвеня 1943 г. — камандзір партызанскай брыгады імя К. Я. Варашылава. З снежня 1943 г. на савецкай, партыйнай і прафсаюзнай рабоце. З верасня 1961 г. — старшыня Гомельскага абласнога савета прафсаюзаў. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 2-га і 3-га скліканняў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, 4 іншымі ордэнамі, медалямі.

Жыў у Гомелі, памёр у 1990 г.

БАЙКОЎ Андрэй Пракопавіч нарадзіўся 19.8(1.9).1915 г. у в. Пясочная Буда Гомельскага павета. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Палессі ў час Вялікай Айчыннай вайны. З сялян. Член КПСС з 1943 г. У жніўні 1942 г. скончыў асобныя курсы і быў накіраваны на Гомельшчыну ў тыл ворага, дзе ўзначаліў партызанскі атрад. З верасня 1943 г. — камандзір партызанскай брыгады імя М. А. Шчорса, якая дзейнічала на тэрыторыі Уваравіцкага і Рэчыцкага раёнаў. Са снежня 1943 г. на савецкай рабоце. Узнагароджаны 2 ордэнамі, медалямі.

А. П. Байкоў жыў у Ветцы Гомельскай вобл.

БАНДАРЭНКА Іван Іванавіч нарадзіўся 11 лютага 1913 г. у в. Глыбаў. Сямнаццацігадовым юнаком пачаў працоўнае жыццё ў Падалескім сельсавеце.

Пасля службы ў Чырвонай Арміі з 1935 г. па 1941 г. працаваў на адказных пасадах у партыйных і савецкіх органах. Выбіраўся старшынёй Падалескага, Свірыдавіцкага і Жмураўскага сельсаветаў.

У час Вялікай Айчыннай вайны кіраваў партызанскай брыгадай імя П. К. Панамарэнкі, якая дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Жлобінскага, Рэчыцкага, Стрэшынскага, Парыцкага, Васілевіцкага раёнаў.

У пасляваенны перыяд І. І. Бандарэнка прымаў актыўны ўдзел у аднаўленні народнай гаспадаркі, працаваў у партыйных і савецкіх органах.

З 1952 г. — у гандлі. Дзесяць гадоў узначальваў Рэчыцкі райспажыўсаюз. З 1962 г. — начальнік гандлёвага аддзела Рэчыцкага гархарчпрамгандлю.

За баявыя і працоўныя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Памёр 18.9.1970 г.

ВАСІЛЬЕЎ Пётр Іванавіч нарадзіўся ў 1901 г. у Рэчыцы. З сям'і служачых. У чатырохгадовым узросце страціў бацьку. Дзесяцігадовым хлапчуком быў вымушаны пайсці працаваць на Рэчыцкую запалкавую фабрыку. Член КППС з 1921 г. З 1921 па 1924 г. служыў у Чырвонай Арміі ў якасці палітрука. Пасля звальнення ў запас вяртаецца ў Рэчыцу. Да 1926 г. працуе старшынёй прафкама запалкавай фабрыкі «Дняпро». У 1929 г. вылучаецца на кіруючую савецкую работу ў Лоеў. З 1931 па 1937 г. — старшыня Рэчыцкага дрэўлесхімсаюза. З 1937 г. і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны — дырэктар лесакамбіната імя Кірава. У жніўні 1941 г. быў прызначаны камандзірам атрада народнага апалчэння Рэчыцы. Калі ў верасні 1941 г. Рэчыцкі партызанскі атрад быў разбіты карнікамі паблізу вёскі Амелькаўшчына (Хойніцкі раён), пераходзіць на нелегальнае становішча. З мая 1942 г. — камандзір узвода, а затым роты рэчыцкага партызанскага атрада імя Варашылава. З сакавіка па чэрвень 1943 г. з'яўляўся камісарам партызанскага атрада, а потым і камандзірам яго. Атрад імя Варашылава, якім камандаваў П. І. Васільеў, здзейсніў шэраг баявых аперацый супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, як на тэрыторыі Рэчыцкага раёна, так і па-за межамі яго.

Фашысты жорстка расправіліся з сям'ёй мужнага камандзіра. Схапілі, а потым расстралялі ягоную маці, жонку, пяцёра дзяцей.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны П. І. Васільеў працаваў дырэктарам Рэчыцкага домабудаўнічага камбіната. Памёр у маі 1952 г.

ГУДАЎ Павел Пятровіч нарадзіўся ў студзені 1902 г. у в. Нова-Высокая Мазырскага пав. Мінскай губ., адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Гомельшчыне ў Вялікую Айчынную вайну. З сялян. Член КП(б)Б з 1925 г. У 1923 г. скончыў Бабруйскую саўпартшколу, затым — камуністычны універсітэт (1931). Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны працаваў у Гомельскім абкаме КП(б)Б. З лютага 1943 г. — у партызанах, з красавіка 1943 г. — палітрук, з чэрвеня 1943 г. — камісар партызанскага атрада. З 1943 г. — камісар партызанскай брыгады імя П. К. Панамарэнкі Васілевіцкага р-на Палескай вобл., адначасова сакратар Васілевіцкага падпольнага РК КП(б)Б. Узнагароджаны некалькімі ордэнамі і медалямі.

ДЗЕДЗІК Павел Іванавіч нарадзіўся 15(28).3.1901 г. у в. Свірыдавічы. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Гомельшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З сялян. Член КП(б) Беларусі з 1927 г. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1955). У 1927—1941 гг. на савецкай, партыйнай і журналісцкай рабоце ў Жыткавіцкім, Кармянскім і Чачэрскім р-нах. У партызанах з 1941 г.: камісар атрада 1-ай Гомельскай партызанскай брыгады, адначасова сакратар Чачэрскага падпольнага РК КП(б)Б. У 1943—1965 гг. на партыйнай рабоце ў Чачэрскім, Гомельскім р-нах, у Гомельскім абкаме КПБ. Узнагароджаны ордэнам Леніна, іншымі ордэнамі, медалямі. Жыў у Гомелі.

ДРАЗДЗЕЦКІ Аляксандр Пятровіч, нарадзіўся ў лютым 1901 г. на Віцебшчыне. Адзін з арганізатараў партызанскага руху на Гомельшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Член КПСС. У 1919 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію. Службу праходзіў у Рэчыцы. Тут жаніўся і пасля дэма-

А. П. Драздзецкі

білізацыі ў 1923 г. працаваў стрэлачнікам на станцыі Рэчыца. З 1926 г. у органах ГПУ. У 1935 г. быў накіраваны на партыйную работу ў Хойнікі. Адзін з арганізатараў Хойніцкага знішчальнага батальёна, а потым і партызанскага атрада. Праводзіў палітычную работу сярод насельніцтва, разам з сакратаром Хойніцкага падпольнага райкама КП(б)Б і камісарам партызанскага атрада П. П. Домнікавым наладжваў партыйна-савецкае падполле ў вёсках Маладуша, Лясное, Раманаўка, Смагарын, Сяргееўка (пасля вайны ўвайшлі ў склад Рэчыцкага р-на).

Разам з П. П. Домнікавым быў схоплены карнікамі ў канцы снежня 1941 г. і закатаваны ў в. Маладуша.

МІКЛАШЭВІЧ Аляксандр Браніслававіч нарадзіўся ў 1898 г. у вёсцы Сож на Смаленшчыне. У канцы 1916 г. быў прызваны на службу ў царскую армію. У 1917 г. добраахвотна ўступіў у 1-ы чырвонагвардзейскі рэвалюцыйны батальён. Змагаўся ў яго радах супраць белапольскіх легіянераў і на паўднёвым фронце. Быў двойчы паранены.

У 1919 г. А. Б. Міклашэвіч стаў членам партыі. Неўзабаве быў накіраваны ў Вышэйшую артылерыйскую школу (г. Смаленск). З 1922 па 1925 г. служыў у 27-ай Омскай дывізіі на пасадзе памочніка камандзіра батальёна.

У 1925 г. быў дэмабілізаваны з радоў Чырвонай Арміі. Працаваў дырэктарам Фралоўскага і Лакоцкага спіртзаводаў на Смаленшчыне. Затым, пасля курсаў тэхнарукоў, быў накіраваны ў Беларускі спірттрэст. 10.9.1935 г. прызначаны дырэктарам Дземяхоўскага спіртзавода Рэчыцкага раёна. 1.5.1940 г. Рэчыцкі райкам партыі накіраваў А. Б. Міклашэвіча дырэктарам райпрамкамбіната.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, А. Б. Міклашэвіч прызначаецца камандзірам знішчальнага атрада. Менавіта ў гэты час яскрава праявіліся выдатныя камандзірскія якасці Міклашэвіча. Ён вывеў атрад на перадавую лінію фронту, якая праходзіла па рубяжы Парычы — Шацілкі — Стрэшын.

Аб баявых дзеяннях знішчальнага атрада пад камандаваннем А. Б. Міклашэвіча 21 ліпеня 1941 г. расказала рэспубліканская газета «Звязда», а 25 ліпеня — Рэчыцкая раённая газета «Зара камуны». Эпізоды баявой дзейнасці атрада паказаны і ў артыкуле сакратара ЦК КП(б) Беларусі П. К. Панамарэнкі, з якім ён выступіў у газеце «Правда» (нумар за 22.7.1941 г.).

2 жніўня 1941 г. А. Б. Міклашэвіч быў прызваны ў дзеючую армію. Ён змагаўся з ворагам на пасадзе намесніка камандзіра артылерыйскага палка. Загінуў у жніўні 1942 г. у час жорсткіх баёў пад г. Харкавам.

КУНЬКО Рыма Уладзіміраўна нарадзілася 14.12.1926 г. у Рэчыцы.

Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны і партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці. З красавіка 1942 г. сувязная партызанскага атрада М. П. Каралёва. У партызанах з чэрвеня 1942 г., арганізатар і кіраўнік першай у Асіповіцкім партызанскім злучэнні маладзёжнай дыверсійнай групы. Група знішчыла 8 эшалонаў (адзін з іх асабіста Кунько), 7 аўта- і бронемашын, 2 гарнізоны, 7 мастоў. Загінула ў баі 1.7.1944 г. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалём.

СМЕРЦІН Сямён Агеевіч нарадзіўся ў 1914 г. у в. 1-ая Вятка Мурамцеўскага р-на Омскай вобл. Працоўную дзейнасць пачаў у 1932 г. настаўнікам сельскай школы.

Незадоўга да Вялікай Айчыннай вайны вайсковая часць, у якой давялося служыць Смерціну, была перабазіравана з Сібіры ў Беларусь, увайшла ў склад паветрана-дэсантнай брыгады Заходняга ўмацаванага раёна.

Абставіны склаліся так, што вайсковая часць Смерціна патрапіла ў варожае акружэнне. Тыя байцы і афіцэры часці, якія не загінулі ў першыя дні вайны, былі вымушаны невялікімі групамі ці адзіночна прабівацца праз лінію фронту да сваіх. Гэта рабіў і С. А. Смерцін.

Неўзабаве лёс звёў Сямёна Агеевіча з адным з арганізатараў партызанскага руху

на тэрыторыі былога Васілевіцкага р-на Панкратам Паўлавічам Алісейкам. Смерцін уключаецца ў партызанскую барацьбу. Ад радавога байца ён вырастае да камандзіра партызанскага атрада, а ў 29-гадовым узросце прызначаецца камандзірам Васілевіцкай партызанскай брыгады.

У лістападзе 1943 г. Васілевічы былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Часці Савецкай Арміі пайшлі з баямі далей на захад. Васілевіцкая ж партызанская брыгада была расфарміравана. Асноўная частка яе асабовага саставу папоўніла рэгулярныя часці 1-га Беларускага фронту, шмат хто з байцоў і камандзіраў быў накіраваны на аднаўленне народнай гаспадаркі.

С. А. Смерцін у якасці другога сакратара Васілевіцкага раённага камітэта партыі з уласцівай яму энергіяй займаецца фарміраваннем партыйных і савецкіх органаў раёна, аднаўленнем народнай гаспадаркі.

Але неўзабаве Сямён Агеевіч перавадзіцца ў апарат Палескага абкама партыі. 4 ліпеня 1944 г. ён трагічна загінуў. Пахаваны С. А. Смерцін у Мазыры, на кургане Славы.

ТУРЧЫНСКІ Макар Фёдаравіч (сапраўднае прозвішча Турчынскі-Медвядчук) нарадзіўся 5 студзеня 1897 г. у с. Цярноўка Вінніцкай вобл. З 1915 г. у арміі. У час Грамадзянскай вайны ў 3-ім Бесарабскім чырвонагвардзейскім палку 1-й Коннай арміі. З 1922 г. працаваў на добрушскай папяровай фабрыцы «Герой працы». Пасля заканчэння Клінцоўскай павятовай партыйнай школы (1926 г.) на партыйнай і гаспадарчай працы. З 1939 г. у Чырвонай Арміі. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны — камандзір партызанскай групы, атрада. З красавіка 1942 г. — камандзір партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава. У лістападзе 1942 — лютым 1943 г. — камісар гэтага атрада. З чэрвеня 1943 г. — камандзір партызанскага атрада імя М. В. Фрунзе Гомельскага партызанскага злучэння. З 24.11.1942 г. па 31.7.1943 г. — член Рэчыцкага падпольнага райкама КП(б)Б. З лістапада 1943 г. — другі сакратар Рэчыцкага райкама КП(б)Б. Са снежня 1944 г. — другі сакратар Антопальскага райкама КП(б)Б Брэсцкай вобл. У 1946—1967 гг. на гаспадарчай працы ў г. Рэчыцы і Рэчыцкім раёне.

М. С. Храмчанка

М. Ф. Турчынскі памёр 20 мая 1982 г. Пахаваны ў Рэчыцы. Ягоным імем названа адна з вуліц горада.

ХРАМЧАНКА Марыя Сцяфанаўна нарадзілася 17 лістапада 1914 г. у Рэчыцы. Тут вучылася, уступіла ў камсамол, пачала працаваць на запалкавай фабрыцы «Х Кастрычнік». У лютым 1933 г. была абрана намеснікам сакратара камітэта камсамола фабрыкі. З сакавіка па кастрычнік 1936 г. М. С. Храмчанка — інструктар раённага камітэта камсамола, затым — сакратар камітэта камсамола завода імя Варашылава.

М. С. Храмчанка, члену партыі з 1939 г., давялося працаваць таксама інструктарам арганізацыйна-масавай работы райкама Чырвонага Крыжа, статыстыкам сектара ўліку райкама КП(б) Беларусі.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, М. С. Храмчанка па рашэнню Рэчыцкага райкама партыі была пакінута для падпольнай работы. Да жніўня 1943 г. з'яўлялася намеснікам камісара па камсамолу партызанскага атрада імя Варашылава.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў гады вайны, Марыя Сцяфанаўна была ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, некалькімі медалямі.

Пасля вайны працягвала работу ў партыйных органах. На пенсію пайшла ў снежні 1974 г. Пасля гэтага ўключылася ў актыўную грамадскую работу.

М. С. Храмчанка памёрла 26 снежня 1986 г.

Родныя Вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад Вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам
у чорныя дні фашысцкай навалы.
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў Вашай любові
да Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра Вас у нас назаўсёды,
як неўміручая наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю!

Загінуўшыя і прапаўшыя без вестак партызаны, удзельнікі антыфашысцкага падполля, асобы, якія садзейнічалі падпольнаму і партызанскаму руху, мірныя жыхары

АЗЕРШЧЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЗЕРШЧЫНА

ВАРАПАЕЎ Мікалай Фёдаравіч.
ДВОРНІК Іван Фядосавіч.
КУЗМЯНОК Андрэй Фёдаравіч.
КУЗМЯНОК Ганна Дзмітрыеўна.
КУЗМЯНОК Ганна Уладзіміраўна.
КУЗМЯНОК Мікалай Фёдаравіч.
КУЗМЯНОК Ульяна С.
КУЗМЯНОК Яўген Андрэевіч.
ЛАЗАРЭВІЧ Андрэй Самойлавіч.

ЛАПШАК Пётр Філімонавіч, н. у лістападзе 1920, сакратар камсамольскай арганізацыі в. Азершчына, расстраляны ў верасні 1941.

МАХОНЬКА Павел Іванавіч, н. у 1919, партызан, загінуў у кастрычніку 1943.

ПАШКОЎ Аляксандр Кірылавіч, н. у 1916, да вайны працаваў настаўнікам у в. Гарноўка, сувязны партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава, расстраляны ў верасні 1943.

СУМАК Ганна Мацвееўна, н. 10.12.1922, да вайны працавала настаўніцай у г. Віцебску (1939), а з 1940 — піянерважатай у в. Азершчына, падпольшчыца і партызанская сувязная, схоплена карнікамі ў час выканання баявога задання, павешана ў кастрычніку 1943.

СЯРАК Андрэй Мартынавіч, н. у 1897, да вайны працаваў сакратаром сельскага савета, расстраляны ў верасні 1941.

СЯРАК Іван Самойлавіч, н. у 1915, да вайны працаваў сакратаром Хойніцкага РК камсамола, расстраляны 28.5.1942.

СЯРАК Міхаіл Іванавіч.

ЦЮЛЬКОЎ Іван Антонавіч, старшыня Азершчынскага с/с, расстраляны ў 1941.

ЯНКОВІЧ Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1924, партызан, загінуў у чэрвені 1943.

ЯНКОВІЧ Міхаіл Раманавіч, н. у 1923, партызан.

ЯНКОВІЧ Міхаіл Сяргеевіч, н. у 1922, партызан, загінуў 19.10.1943.

ЯНКОВІЧ Міхаіл Фаміч, н. у 1923, партызанскі сувязны, загінуў 20.10.1943.

ПАСЁЛАК БАРЭЦ

Да вайны меў 10 двароў, 47 жыхароў. Цалкам спалены ў чэрвені 1943.

ПАСЁЛАК БОРХАЎ

Да вайны меў 22 двары, 110 жыхароў. Цалкам спалены ў чэрвені 1943. Загінуўшыя працавалі да вайны ў калгасе «Чырвоная Беларусь».

Г. М. Сумак

І. А. Цюлькоў

КРАЎЧАНКА Лізавета Апацеўна, 57 гадоў, расстраляна, а потым спалена 13.6.1943.

САДОЎНІК (САДОЎНІКАЎ) Яфім Андрэевіч, н. у 1880, закатаваны 13.6.1943. Спачатку карнікі нацкавалі на яго сабак, а потым укінулі ў полымя.

ВЁСКА УНОРЫЦА

Амаль усе загінуўшыя працавалі да вайны ў калгасе «Чырвоная Беларусь».

БРОЎКА Міхаіл Васільевіч, н. у 1919, расстраляны ў 1943.

ЗАЯЦ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1864, расстраляны ў 1943.

КАДОЎБА Апанас Якаўлевіч, н. у 1865, расстраляны ў 1943.

МАРЫЕЎСКАЯ Аляксандра Іванаўна, н. у 1925, расстраляна.

МАРЫЕЎСКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1898, расстраляны.

СЕВЯРЫНЕЦ Ефрасіння, н. у 1867, расстраляна ў 1943.

АРТУКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АРТУКІ

СКАРОМНЫ Васіль Рыгоравіч, н. у 1897, да вайны працаваў старшынёй калгаса імя Сталіна (в. Ганчароўка), падпольшчык, партызанскі сувязны, расстраляны ў 1941 у Рэчыцы.

ПАСЁЛАК БАРБАРА

ШУРПО (ШУРПА) Ірына Несцераўна.
ШУРПО Павел Астапавіч.
ЯКАВЕНКА Наталля Сцяпанаўна.
ЯРМОЛЕНКА Любоў Рыгораўна.

ВЁСКА ВЯТХІНЬ

ГЛУШАК Емяльян Прохаравіч, н. у 1915, член падпольнай патрыятычнай групы, расстраляны ў жніўні 1942.

ГЛУШАК Іван Прохаравіч, н. у 1905, партызан, загінуў.

ЗАБІРАН Віктар Фёдаравіч.

МАНЬКОЎ Яўхім (Яфрэм) Дзянісавіч, член падпольнай патрыятычнай групы, расстраляны ў жніўні 1942.

ПІНЧУК Васіль Іванавіч, расстраляны.

ПІНЧУК Іван Арцёмавіч, расстраляны.

ПІНЧУК Уладзімір Дзянісавіч, расстраляны.

ПІНЧУК Фёдар Тарасавіч, расстраляны.

САЛАМАХА Мірон Лукіч, н. у 1903, да вайны працаваў старшынёй Артукоўскага с/с, кіраўнік падпольнай патрыятычнай групы, партызанскі сувязны, расстраляны ў жніўні 1942.

ЧАРНЕЦКІ Кузьма Паўлавіч, н. у 1904, да вайны працаваў у гандлі, член падпольнай патрыятычнай групы, партызанскі сувязны, расстраляны ў жніўні 1942.

ВЁСКА НАДЗВІН

ВЯЛІКАБОРАЦ Таццяна Сцяпанаўна.

ЗДРОК Ігнат Яфімавіч.

КРОТ Павел Апанасавіч, расстраляны ў 1941.

УЛАСІК Таццяна Сцяпанаўна.

УЛАСІК Уладзімір Анісавіч.

ВЁСКА ПРАКІСЕЛЬ

ГАРБАЧЭЎСКІ Сяргей Дзямідавіч, расстраляны ў 1943.

ДЗЕЖКА Мікалай Якаўлевіч, расстраляны ў 1943.

ЗЯЛЕНСКІ Міхаіл Ціханавіч (Цімафеевіч), расстраляны ў 1942.

ЗЯЛЕНСКІ Піліп Міхайлавіч, н. у 1920, партызан, загінуў у 1943.

ЗЯЛЕНСКІ Піліп Ціханавіч (Цімафеевіч), расстраляны ў 1942.

КОВАЛЬ Васіль Іванавіч, расстраляны ў 1942.

ПАЛІВАЧ Давыд Пятровіч, расстраляны ў 1943.

ПАЛІВАЧ Еўдакія Пятроўна, расстраляна ў 1943.

ПАЛІВАЧ Іван Давыдавіч, расстраляны ў 1943.

Я. Дз. Манькоў

ВЁСКА ЦЕРАБЕЕЎКА

БАЛЮНОЎ Іван Іванавіч, расстраляны ў 1942.

ГУРСКІ Іван Еўдакімавіч, н. у 1904, да вайны працаваў старшынёй калгасаў «Савецкая Беларусь» (в. Казанаўка) і «Чырвоны сцяг» (в. Краснаполле), старшынёй Вышамірскага с/с, партызан і падпольшчык, расстраляны 21.10.1941 у Рэчыцы.

МАЛЧАНАВА Ганна Купрэеўна, расстраляна.

МАЛЧАНАЎ Сцяпан Данілавіч, н. у 1901, адзін з арганізатараў на тэрыторыі Рэчыцкага р-на калгаснага ладу, непасрэдна перад вайной працаваў старшынёй калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (в. Горваль), кіраўнік падпольнай патрыятычнай групы, партызанскі сувязны, расстраляны 23.7.1943.

МЕЛЬНІКАЎ Іван Восіпавіч (Рыгоравіч), партызан, закатаваны ў 1942.

Яўрэй, прозвішча якога ўстанавіць не ўдалося. Да вайны працаваў кавалём, закатаваны восенню 1941.

БАБІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАБІЧЫ

ЖАЛЯЗКА Дзмітрый Васільевіч, н. у 1902—1908 (?), да вайны працаваў на чыгунцы, падпольшчык, расстраляны ў студзені 1943.

ЖАЛЯЗКА Уладзімір Дзмітрыевіч, н. у 1926, падпольшчык, расстраляны 19.1.1943.

ЖАРНАК Фёдар Фёдаравіч, н. у 1900, пасвіў грамадскую жывёлу, расстраляны восенню 1942 ва ўрочышчы Дубавое.

ЖУРАНОК Гаўрыла Мікітавіч, н. у 1883—1886 (?), да вайны працаваў у калгасе «Чырвоны шлях» і на чыгунцы. Карнікі схапілі яго восенню 1941 за сувязь з партызанамі. Быў расстраляны за хутарам Бабічы.

ЖУРО (ЖУРА) Іван Данілавіч, каля 20 гадоў, расстраляны.

КУЛАГА Фёдар Фёдаравіч, н. у 1921, да вайны працаваў у калгасе «Чырвоны шлях», расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ЛАРУШКІНА Лёня (Лёля) Арсенаўна, н. у 1912, расстраляна.

МАЗУР Мікалай, працаваў загадчыкам Галоўкаўскай пачатковай школы, расстраляны ў канцы 1941 ва ўрочышчы Сеўскае Балота.

МАЛІЖОНАК Васіль Піліпавіч, н. у 1921, працаваў рабочым у Бабіцкім леспрамгасе, падпольшчык.

...Калі карны атрад прыехаў у Бабічы, Васіль знаходзіўся ў лесе. Збіраў грыбы.

— Прывядзі сына! — загадалі чужынцы Парасцы, Васілёвай маці. — А не прывядзеш — расстраляем мужа.

Піліп Маліжонак разгубіўся і не паспеў сказаць жонцы, каб яна не шукала сына.

Параска знайшла Васіля, прыспешвала яго: «Хутчэй, сынок. А тож немцы чакаюць. Калі не прывядзеш, сказалі, то расстраляем старога».

Вядома ж, Васіль разумеў, што чакае яго. Але не хацеў рызыкаваць жыццём бацькі.

Карнікі не далі яму развітацца з бацькам. Загадалі: «Марш уперад!» А калі Параска памкнулася ісці ўслед, яе перастрэў суровы вокліч: «Назад!»

...У той жа вераснёўскі дзень 1941 года В. П. Маліжонак быў расстраляны ва ўрочышчы Сосны.

САКАЛОЎСКАЯ Ганна Піліпаўна, н. у 1899, расстраляна.

САКАЛОЎСКІ Васіль (Валянцін), н. у 1933, сын Ганны Піліпаўны і Паўла Мікалаевіча Сакалоўскіх, расстраляны.

САКАЛОЎСКІ Павел Мікалаевіч, н. у 1891 на Украіне, у Бабічах працаваў аб'ездчыкам лясніцтва, расстраляны за сувязь з партызанамі.

СМЯЯН Трафім, н. у 1897, расстраляны летам 1943 ва ўрочышчы Баршчы.

СОПАТ Апанас Фёдаравіч, н. у 1880, працаваў у лясніцтве, расстраляны ў 1941.

ТАБУЛІНА Ніна Цімафееўна, н. у 1881, працавала настаўніцай, расстраляна ў 1941 за тое, што з'яўлялася членам партыі.

ФЕШЧАНКА Васіль Захаравіч, н. у 1925, расстраляны ў 1942.

ХРАМЯНКОВА Кацярына Цімафееўна, н. у 1908, падпольшчыца, расстраляна.

ШАСТОЎ Сцяпан, н. у 1904, расстраляны.

ШАЎЦОЎ Восіп Цімафеевіч, н. у 1904—1906 (?), працаваў рахункаводам, падпольшчык, расстраляны.

ШАЎЦОВА Кацярына Цімафееўна, падпольшчыца.

ШПАДАРУК Васіль Фёдаравіч, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1944.

ШПАДАРУК Павел Фёдаравіч, н. у 1922. У 1940 скончыў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча. Як кандыдат у члены партыі, быў накіраваны ў Брэсцкую вобл. Працаваў загадчыкам пачатковай школы ў в. Дубечна Маларыцкага р-на. Перад вайной прыехаў дамоў. Баец Васілевіцкага знішчальнага батальёна. Расстраляны ў верасні 1941 ва ўрочышчы Сосны разам з сябрам Васілём Маліжонкам і хлопцам, прозвішча якога ўстанавіць не ўдалося. З імі быў М. І. Турбецкі, начальнік участка Бабіцкага леспрамгаса, начальнік разведкі Васілевіцкага партызанскага атрада. Але яго карнікі адпусцілі (?!).

В. Ц. Шаўцоў

К. Ц. Шаўцова

С. Д. Малчанаў



П. Ф. Шпадарук

З успамінаў Міхаіла Фёдаравіча Шпадарука, ветэрана вайны і працы, малодшага брата П. Ф. Шпадарука.

...Вядома, Павел не ведаў, што ў Бабічах карны атрад і ў іх, карнікаў, «чорны спіс» на мясцовых патрыётаў. Брат меўся наведаць сябра, Васіля Маліжонка. Па дарозе завітаў да Лёшы Кулагі, які потым загінуў на фронце. Да Маліжонка пайшлі разам. Каля сельсавета хлопцаў спынілі карнікі. Яны павялі Паўла ў памяшканне. Там, як мы даведаліся потым, яго катавалі — адціскалі дзвярыма пальцы рук.

Наша маці, Ганна Паўлаўна, уведаўшы пра арышт сына, кінулася да сельсавета. Пабачыцца з Паўлам ёй не далі. Праўда, супакоілі. Маўляў, разбярэмся, а пакуль адправім у Рэчыцу, у камендатуру.

Маці, хуценька вярнуўшыся дамоў, спакавала сёе-тое з ежы. Наказвала мне: «Ты ж, сынок, добранька прасі немцаў, каб аддалі Паўлу перадачу...»

А ў гэты час карнікі вывелі арыштаваных з сельсавета, селі самі на коней і пагналі небаракаў перад сабою... Я крыху спазніўся. Кінуўся паўз чыгунку наўздагон. А неўзабаве пачуў страляніну. Яшчэ не ведаў, хто і чаму страляе. Але быццам нехта падказаў, што брата ў жывых няма...

Так яно і было. Павел, Васіль Маліжонак і трэці, невядомы нам хлопец, былі расстраляны ва ўрочышчы Сосны. Некалькімі кулямі... Кожны... Стралялі ў галаву...

Гэта здарылася 21 верасня 1941.

ШПАК Пятро, н. у 1884, расстраляны ва ўрочышчы Баршчы.

Ішоў з Крынак. Яго схапілі карнікі на чале з начальнікам бабіцкай паліцыі Аляксандэрам, якія наладзілі засаду на партызан. Дарэчы, Аляксандэр быў мужам унучкі арыштаванага.

— А ты чаго швэндаешся па лесе? — падскочыў начальнік паліцыі да старога. — Хадзіў да партызанаў?..

Калі паліцаі вярнуліся ў Бабічы, Аляксандэр сказаў жонцы: «Ліда, я толькі што твайго дзеда забіў, то ідзі хавай...»

ШУЛЬГА Васіль Пятровіч, н. у 1924, працаваў рабочым у Бабіцкім леспрамгасе, партызан, загінуў у верасні 1941.

ВЁСКА ГАЛОЎКІ

Пераважная большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе «Парыжская камуна».

БРЭЛЬ Еўдакія, н. у 1918, расстраляна.

ГАЛОЎКА Арына (Ірына), н. у 1905, спалена ў 1943. Разам з ёй загінулі: муж — **Міхаіл Пятровіч (Паўлавіч),** 1903 г. н.; дзеці — дочкі **Аксіння, Кацярына** і **Надзея,** адпаведна 1941, 1935 і 1939 г. н., сын **Уладзімір,** які н. у 1938.

Сям'я ехала хавацца ў лес. Карнікі спынілі небаракаў. Абвінавацілі Галоўкаў у тым, што яны партызанская сям'я. А потым учынілі жудасную расправу...

ГАЛОЎКА Іван Фёдаравіч, н. у 1909, спалены. Разам з ім спалены дзеці: дочкі — **Варка,** 1937 г. н., **Марыя,** 1939 г. н., сын **Іван,** які н. у 1940.

ГАЛОЎКА Ігнат Мікітавіч, н. у 1910, спалены.

ГАЛОЎКА Міхаіл Максімавіч, н. у 1900, расстраляны.

ГАЛОЎКА Міхаіл Паўлавіч, н. у 1914, спалены.

ГАЛОЎКА Міхаіл Піліпавіч, н. у 1888, спалены.

ГАЛОЎКА Павел Міронавіч, н. у 1883, расстраляны.

ГАЛОЎКА Раіса Міхайлаўна, н. у 1940, спалена.

ГАЛОЎКА Сямён Апанасавіч, н. у 1868, спалены.

ГАЛОЎКА Таццяна, н. у 1910, расстраляна.

ГАЛОЎКА Хіма Арцёмаўна, н. у 1938, спалена.

ГАЛОЎКА Якаў Восіпавіч, н. у 1878, расстраляны.

ЖУРО (ЖУРА) Антон Майсеевіч, н. у 1910, спалены.

ЖУРО Ганна Паўлаўна, н. у 1912, расстраляна.

ЖУРО Еўдакія Васільеўна, н. у 1935, спалена.

ЖУРО Іван Арцёмавіч, н. у 1888, спалены.

ЖУРО Іван Сцяпанавіч, н. у 1884, спалены.

ЖУРО Ірына (Арына) Міхайлаўна, н. у 1896, спалена.

ЛАЎШУК Павел Сцяпанавіч, н. у 1903, расстраляны.

СОПАТ Павел Рыгоравіч, н. у 1888, расстраляны.

СЫЧ Цярэнцій Ануфрыевіч, н. у 1931, спалены.

ЧОРНАЯ Надзея Мікітаўна, н. у 1920, партызанская сувязная, расстраляна 21.9.1941.

БАРШЧОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АБРАМАЎКА

...9 чэрвеня 1942 года па загаду немцаў шашу скарадзіў жыхар вёскі Востраў Аляксандр Маеўскі. І ўсё ж у гэты дзень каля Абрамаўкі на партызанскай міне падарвалася фашысцкая машына, у якой ехаў нейкі важны чын. На другі дзень раннем немцы з сабакамі акружылі вёску, выгналі ўсіх з хат і павялі да шашы. Трымалі тут людзей некалькі гадзін, хацелі даведацца, хто падклаў міну. Нічога не дабіўшыся, аддзялілі ад натоўпу мужчын і расстралялі кожнага дзесятага...

П. С. Падрэзенка

БАРТНЕЎСКІ Павел Сцяпанавіч, н. у 1886.

КОРЗУН Іван Міхайлавіч.

МАТКОЎСКІ Канстанцін Міхайлавіч, н. у 1915.

САКОВІЧ (САПОВІЧ) Пётр Францішкавіч.

ФЕЛЬБЕРГ Леанід Сцяпанавіч.

ЦУКАРАЎ Васіль Яўменавіч.

ЦУКАРАЎ Піліп Яўменавіч, н. у 1882.

ЦУКАРАЎ Сяргей Міхайлавіч.

ЧАПЛЕНКА Міхаіл Іванавіч, н. у 1913.

ШЫЦКО Міхаіл Васільевіч, н. у 1912.

(?) Аляксандр Рыгоравіч.

ВЁСКА БАРШЧОЎКА

БАРТНОЎСКАЯ Настасся Канстанцінаўна, была забрана на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

БАРТНОЎСКІ Віктар Канстанцінавіч, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ГРЫГАРЭНКА Кандрат Паўлавіч, расстраляны.

ЗАЙЦАВА Таццяна Ціханаўна. Была затрымана карнікамі ў полі. Яе абвінавацілі ў тым, што насіла ежу партызанам. Пасля жорсткіх катаванняў жанчыну расстралялі.

ЗАЙЦАЎ Дзям'ян Барысавіч, расстраляны.

ЗАХАРАНКА Марыя Іванаўна, была забрана на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ЗАХАРАНКА Пётр Трафімавіч, н. у 1911, да вайны працаваў у спажывецкай кааперацыі, расстраляны восенню 1941.

МАРТЫНЕНКА Пётр Мікітавіч. Да вайны працаваў настаўнікам. Па заданню партызан пайшоў у паліцыю. Браў актыўны ўдзел у разгроме мясцовага паліцэйскага ўчастка. Аб гэтым даведаліся фашысты. Гестапаўцы арыштавалі Пятра Мікітавіча і адвезлі ў Гомель. Доўгі час катавалі яго, але Мартыненка маўчаў. Тады яго прывезлі ў Баршчоўку, каб, сагнаўшы людзей, павесіць. На некалькі хвілін пакінулі ў кузаве аўтамашыны без аховы.

Цяга да жыцця дапамагла змардаванаму здзекамі чалавеку зрабіць амаль немагчымае. Ён, са звязанымі рукамі, саскочыў з аўтамашыны, кінуўся агародамі ўцякаць. Адбег больш кіламетра. Але следам ужо імчаліся фашысты і мясцовыя здраднікі. Апошнія і расстралялі Пятра Мікітавіча.

МАЯНЦОЎ Элька Барысавіч, 50–55 гадоў, расстраляны ў Гомелі ў 1941. Разам з ім былі расстраляны жонка, сыны Арон і Іофе, дачка.

САЎЧАНКА Андрэй Якаўлевіч, н. у 1916, да вайны працаваў на пошце, расстраляны восенню 1941.

СТАЛЯРОЎ Іван Данілавіч, н. у 1907, да вайны працаваў фінагентам сельсавета, расстраляны восенню 1941.

СТАСЕНКА Аляксандр Антонавіч, расстраляны восенню 1941.

ТКАЧОЎ Павел Паўлавіч, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ХАМЯНКОЎ Пётр Пятровіч, расстраляны восенню 1941.

ХАЧКОЎ Цімафей Малахавіч, партызан.

ЦІМАШЭНКА Аляксей Пятровіч (Мартынавіч), н. у 1892, да вайны працаваў фельчарам, расстраляны восенню 1941.

ШЛЯХЦЕНКА Георгій, афіцэр запасу, камандзір атрада апалчэнцаў, загінуў у баі 19.8.1941.

ЯНКОЎ Пётр (Фёдар) Сяргеевіч, н. у 1916, да вайны працаваў старшынёй калгаса, расстраляны восенню 1941.

ЯРОМЕНКА Іван Васільевіч, н. у 1892, расстраляны восенню 1941.

ЯРОМЕНКА Пётр Васільевіч, н. у 1900, да вайны працаваў дарожным майстрам, расстраляны восенню 1941.

ВЁСКА БОРХАЎ

БАЖКОВА Наталля Сцяпанаўна, н. у 1889.

БРАКАРЭНКА Леанід Васільевіч, н. у 1917, партызан.

ДЗІЧАКОЎ Якаў Бенядзіктавіч, н. у 1911, партызан.

КАВАЛЕНКА Мікіта Мікітавіч, н. у 1862.

КАРНАВУХАВА Марыя А., н. у 1869.

КАЧУРА (КАЦУРА) Пётр Восіпавіч, н. у 1909, партызан.

ЛАБАНАВА Танна Канстанцінаўна, расстраляна.

ЛАБАНАВА Марыя Канстанцінаўна, расстраляна.

МАСЯНЗОЎ Андрэй Андрэевіч, расстраляны.

МАСЯНЗОЎ Раман Піліпавіч, расстраляны.

ПАЛОЙКА Фрыдрых Міронавіч, н. у 1900.

ПАНОЎ Васіль Сямёнавіч, н. у 1890, партызан.

ПАНОЎ Сямён Васільевіч, н. у 1921, партызан.

ПАНЧАНКА Карней Андрэевіч, н. у 1879.

РАВЯНКОВА Лізавета Львоўна, н. у 1920.

СІЛКОЎ Арцём Піліпавіч, н. у 1861, расстраляны.

ВЁСКА ВОСТРАЎ

КАВАЛЁЎ Павел Яфімавіч.

ЛАРКОВА Настасся Аляксандраўна, была забрана на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ЛАРКОЎ Віктар Аляксандравіч, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

МАЕЎСКАЯ Ульяна Яўменаўна, была забрана на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

МАЕЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч, падарваўся на міне, калі па загаду фашыстаў скарадзіў шашу.

МАЕЎСКІ Віктар Іванавіч, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА ГРАНАЎКА (БАРАВАЯ)

БУРАЧЭНКА Андрэй Іванавіч, н. у 1912, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ДУБРОЎСКІ Іван Макаравіч.

ЗАЛАТУХІН Васіль Фядотавіч, н. у 1903, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

КАНАВАЛАЎ Адам Гаўрылавіч, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ІШЧАНКА Рыгор Маркавіч, н. у 1908, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

Пры рабоце над спісам па в. Гранаўка (Баравая) дапамогу творчай групе аказала Кошалева Таццяна Мінаўна, 1909 г. н.

ВЁСКА ДУНАЙ

ФАМІЧОЎ Уладзімір Фёдаравіч, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА ЗАСЕЛЛЕ

Да вайны ў ёй было 99 двароў, 312 жыхароў. Цалкам спалена ў жніўні 1943. Карнікі знішчылі 41 чалавека. На жаль, прозвішчы ўсіх загінуўшых устанавіць не ўдалося.

БРАКАРЭНКА Яфім Маркавіч, расстраляны.

ЗАХАРАВА Варвара Авяр'янаўна, н. у 1864.

ЗАХАРАВА Ефрасіння Іванаўна, расстраляна.

ЛЕЙНАЎ (ЛЕПНАЎ) Даніла Самуілавіч, н. у 1904.

МЕЛЬНІКАВА Ксенія Фёдараўна, н. у 1906.

МЕЛЬНІКАВА Яўгенія Ціханаўна, н. у 1899.

ШКРАБКОЎ Канстанцін Авяр'янавіч, н. у 1887.

ЮРУСАЎ Мікіта Мікалаевіч.

ВЁСКА КАПАНЬ

БЫСТРАНКОЎ Мікалай Алемпіевіч, н. у 1925, расстраляны.

ФІЛОНЧЫК Іван Нічыпаравіч, н. у 1927, расстраляны.

ФІЛОНЧЫК Іван Рыгоравіч, н. у 1926—(1927), расстраляны ў 1943.

ШАМЯТКОЎ Мітрафан Фёдаравіч, староста вёскі, закатаваны ў в. Прыбар (Гомельскі р-н) за тое, што ў ягоным двары была схавана міна.

ВЁСКА СВІДАЎКА

ЦІМАШЭНКА Іван Якаўлевіч. Быў адпраўлены на прымусовыя работы ў Германію, але па дарозе яму ўдалося ўцячы. Партызан.

ХАМЯНКОЎ Пётр Пятровіч, быў адпраўлены на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ВЁСКА СІТНЯКІ

ГУЗ Барыс Максімавіч, н. у 1864.

ДАРАШКОЎ Дзяніс Васільевіч, н. у 1902, закатаваны.

ВЁСКА ЯКІМАЎКА

АДАМЕНКА Хрысціна Іванаўна, н. у 1902, расстраляна.

АСІПЕНКА Аляксандр Гаўрылавіч, н. у 1924.

АСІПЕНКА Мікалай Паўлавіч, н. у 1928.

БАРЫСЕНКА Міхаіл Іванавіч, н. у 1919, расстраляны.

БАРЫСЕНКА Сцяпан Апанасавіч, н. у 1917.

КАВАЛЕНКА Алена Іванаўна, н. у 1894, расстраляна.

МАМСТАЎ Фядот Арцёмавіч, н. у 1902.

СТАНЦЫЯ ЯКІМАЎКА

АБРАМОВІЧ (АЎРАМОВІЧ) Андрэй Іосіфавіч, расстраляны.

АБРАМОВІЧ Васіль Іосіфавіч, расстраляны.

АБРАМОВІЧ Кірыл Іосіфавіч, расстраляны.

БЕЛАБАЛОЦІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЕЛАЕ БАЛОТА

ФРАЛОЎ Мікалай Міхайлавіч, н. у 1918, партызан, загінуў у 1943.

ВЁСКА ГЛУШЭЦ

Да вайны ў ёй было 66 двароў, 224 жыхары. Спалена карнікамі ў чэрвені 1943. Пры гэтым былі знішчаны 63 двары.

КРЫШТОПАЎ Іосіф Кандратавіч, н. у 1881, расстраляны.

ПАЎЛАВА Марыя Ісакаўна, н. у 1880, расстраляна.

ВЁСКА ПЕСКАПОЛЛЕ

Да вайны ў ёй было 36 двароў, 109 жыхароў. Спалена карнікамі ў чэрвені 1943. Пры гэтым былі знішчаны 33 двары.

ГУЗАЎ Сцяпан Барысавіч, н. у 1895—1901 (?), партызанскі сувязны, патрапіў на варожую засаду, жывым карнікам не даўся.

РАБЦАЎ Банадык Рыгоравіч, н. у 1886, расстраляны ў 1943.

ВЁСКА РАШОТНІКІ

КАЛЕСНІКАВА Наталля Рыгораўна, н. у 1896, расстраляна.

КАЛЕСНІКАЎ Мікалай Ціханавіч, н. у 1927, расстраляны.

ВЁСКА РЭПІШЧА

БАЛОТЦАЎ Феакціст Мікалаевіч, н. у 1868, расстраляны.

БРАКАРЭНКА Марыя Сцяпанаўна, н. у 1916, закатавана.

МАНОЙЛІНА Матруна Анціпаўна, н. у 1883, расстраляна.

РУБАНАЎ Аляксей Аляксеевіч, н. у 1882, расстраляны.

РУБАНАЎ Іван Аляксеевіч, н. у 1884, расстраляны.

СТАРАВОЙТАВА Фёкла Мацвееўна, н. у 1910, закатавана.

ВЁСКА СТОЎПНЯ-1 (БЕЛАЕ)

АНЦІПАЎ Сцяпан Максімавіч, н. у 1910, расстраляны.

ГУЛЯНКОЎ Ціт Сямёнавіч, н. у 1898, расстраляны.

ЛУНЬКОВА Ганна Іванаўна, н. у 1911, расстраляна.

ЛУНЬКОВА Кацярына Ігнатаўна, н. у 1901, расстраляна.

ЛУНЬКОЎ Іван Сцяпанавіч, н. у 1942, расстраляны.

ЛУНЬКОЎ Пётр Лявонавіч, н. у 1895, расстраляны.

ЛУНЬКОЎ Сцяпан Ісакавіч, н. у 1910, расстраляны.

ПРАНУЗА Васіль Патапавіч, н. у 1891, расстраляны.

ПРАНУЗА Мацвей Міхайлавіч, н. у 1870, расстраляны.

ПРАНУЗА Сцяпан Патапавіч, н. у 1889, расстраляны.

ПУКАНАЎ Герасім Нічыпаравіч, н. у 1888, закатаваны.

ВЁСКА СТОЎПНЯ-2 (ПЕРАХОД)

ДУБРОЎСКІ Якаў Сільвестравіч, н. у 1900, расстраляны ў 1943.

ПСАРОВА Соф'я Іванаўна, н. у 1870, расстраляна ў 1943.

ВЁСКА ХАЦЕЦКАЕ

МАЛУЦІН Адам, н. у 1887, расстраляны ў 1943.

ВЁСКА ЧОРНАЕ

БАЛАЧКОВА Аксіння Паўлаўна, н. у 1901, расстраляна ў 1943.

ВАСІЛЬКОЎ Сідар Логвінавіч, н. у 1903, расстраляны ў 1943.

ГОРДЗІН Арон, н. у 1885, расстраляны ў 1941.

ГОРДЗІН (пляменнік Гордзіна А.), расстраляны ў 1941.

ГОРДЗІНА Малка, н. у 1887, расстраляна ў 1941.

ГРАМЫКА Ганна Мікітаўна, н. у 1899, расстраляна ў 1943.

ГУЗАЎ Сямён Цітавіч, н. у 1924, расстраляны.

ЗАЙЦАВА Марфа Логвінаўна, н. у 1887, расстраляна ў 1943.

ЗАХАРЧАНКА Фёдар Іванавіч, н. у 1890, расстраляны ў 1943.

КАГАНСКАЯ Хана, н. у 1884, расстраляна ў 1941.

КАГАНСКІ Берка, н. у 1884, расстраляны ў 1941.

КУЗЁМКІН Мацвей Логвінавіч, н. у 1890, расстраляны ў 1943.

ФАМІНА Капіталіна І., н. у 1891, расстраляна ў 1943.

ХАРЫТОНАЎ Раман Мікітавіч, н. у 1916, расстраляны ў 1943.

ШАМОЛАЎ Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1923, расстраляны ў 1943.

ВАСІЛЕВІЦКІ ГАРСАВЕТ

ГОРАД ВАСІЛЕВІЧЫ

АЗБЕЛЬ Яўсей Лейбавіч, н. у 1909, расстраляны.

АЛІСЕЙКА Мікалай Паўлавіч, н. у 1917, да вайны працаваў фінансавым агентам, партызан, загінуў у баі з карнікамі ў снежні 1942 каля в. Ліпава (Калінкавіцкі р-н).

АЛІСЕЙКА Сямён Паўлавіч, н. у 1903, да вайны працаваў старшынёй калгаса імя Кірава, падпольшчык, гаспадар канспіратыўнай кватэры, расстраляны ў 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

АСТАПЕНКА А. Я.

АСТАПЕНКА Мікалай Ігнатавіч, падпольшчык, расстраляны ў 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

АСТАПЕНКА Ціхан Мінавіч, н. у 1903 у в. Ліскі. Служыў у Чырвонай Арміі. Пасля вяртання са службы быў абраны старшынёй Бабіцкага с/с. Скончыў партыйную школу. Пасля гэтага быў пераведзены ў Васілевічы. Працаваў старшынёй мясцовага Савета, затым — начальнікам дарожнага аддзела райвыканкама. Са жніўня 1941 — кіраўнік падпольнай патрыятычнай групы. З мэтай канспірацыі даў акупацыйным уладам згоду працаваць старшынёй Васілевіцкай воласці. Расстраляны ў ліпені 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

АСТАПЕНКА Якаў Адамавіч, да вайны працаваў старшынёй калгаса, падпольшчык, расстраляны ў 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

БЕЛАЯ (ШЧЭРСКАЯ) Вольга Іванаўна, н. у 1921, падпольшчыца, расстраляна 1.8.1942.

БЕЛЫ Андрэй Мікалаевіч, падпольшчык, расстраляны.

БЕЛЫ Анісім (Сіма) Іванавіч, н. у 1925, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў маладзёжнай падпольнай патрыятычнай арганізацыі, расстраляны 1.8.1942.

БЕЛЫ В. І.

БРЭЛЬ А. Д.

БРЭЛЬ Л. Н.

БРЭЛЬ Мікалай Паўлавіч, н. у 1918, да вайны працаваў старшынёй раённага Асаавіяхіма, партызан, расстраляны ў 1942.

БРЭЛЬ Настасся Дарафееўна, н. у 1910, расстраляна з дзецьмі.

БРЭЛЬ Павел Аўрамавіч, н. у 1892, да вайны працаваў у калгасе імя Сталіна, падпольшчык, партызан, расстраляны ў жніўні 1942.

БРЭЛЬ П. Н.

БРЭЛЬ Р. Н.

БУРАКОВА Міра, падпольшчыца, расстраляна ў чэрвені 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

ВАРАЖУН Марыя Дзянісаўна, н. у 1904 у в. Хамічы (Калінкавіцкі р-н), да вайны працавала ў калгасе в. Гогалеў. Падпольшчыца, гаспадыня канспіратыўнай кватэры. Расстраляна ў 1942. Пасмяротна ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга.

ГАРБАЧОЎ Дзяніс Захаравіч, н. у 1883 у в. Хамічы (Калінкавіцкі р-н), да вайны працаваў у калгасе. Актыўны ўдзельнік Васілевіцкага патрыятычнага падполля. Падпольшчыцай з'яўлялася і ягоная жонка — Аксіння Аляксееўна. Актыўную барацьбу з ворагам вялі і шасцёра іхніх дзяцей. У жывых застаўся толькі адзін з сыноў Гарбачовых — Міхаіл Дзянісавіч. Старэйшы з сыноў Гарбачовых — Яўстрат Дзянісавіч, як і дачка — Марыя Дзянісаўна Варажун, пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Ц. М. Астапенка

Л. П. Курганская-Сакалова

ГАРБАЧОЎ Дзяніс Захаравіч расстраляны ў Васілевічах у 1942.

ГАРЭЛІК (ён), расстраляны.

ГАРЭЛІК (яна), расстраляна.

ГЕРАСІМЕНКА.

ГЕРАСІМЕНКА Пётр Ільіч, н. у 1915, партызан, расстраляны ў снежні 1941.

ГОРБАЧ А. Я.

ДЗЕНІСЕВІЧ Н. Н.

ЖАЛЕЗКА Уладзімір Дзмітрыевіч, н. у 1926, да вайны працаваў на чыгунцы, падпольшчык, расстраляны ў 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

ЖУКОЎСКАЯ Антаніна Іванаўна, да вайны працавала настаўніцай, падпольшчыцай, расстраляна.

ЖУРАНОК Гаўрыла Мікалаевіч (Мікітавіч), н. у 1896, падпольшчык, расстраляны ў 1941.

ЗАБРОДСКАЯ А. П.

ЗАБРОДСКАЯ А. С.

ЗАБРОДСКАЯ Н. І.

ЗАБРОДСКІ І. С.

ЗАБРОДСКІ Н. С.

ЗАЙЦАЎ Антон Восіпавіч, н. у 1900, да вайны працаваў рабочым на чыгунцы, партызан, расстраляны ў 1942.

ЗАЛМАНАВА Роза Абрамаўна, н. у 1880, расстраляна.

ЗАЛМАНАЎ Генух Шмеркавіч, н. у 1878, расстраляны.

КАПІТОНАВА (МАЎЧАН) Марыя Іванаўна, н. у 1903 у в. Ліпава (Калінкавіцкі р-н). Да

вайны жыла ў г. п. Ганцавічы Брэсцкай вобл., працавала ў ашчаднай касе. У верасні 1941 вярнулася на радзіму. Сувязная Васілевіцкай і Дамановіцкай падпольных патрыятычных груп. Расстраляна ў 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

КАПІТОНАВА Т. М.

КУЛЯШОЎ Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1910, да вайны працаваў старшынёй Васілевіцкага райвыканкама, член падпольнага райкама КП(б)Б, загінуў у баі з карнікамі ў лістападзе 1941.

КУРГАНСКАЯ-САКАЛОВА Любоў Пятроўна, н. у 1914, да вайны працавала настаўніцай матэматыкі Васілевіцкай СШ, адна з арганізатараў і актыўных удзельнікаў патрыятычнага падполля, расстраляна ў ліпені 1942 ва ўрочышчы Рубанікі разам з чатырохгадовай дачкой **Ларысай** і двухгадовым сынам **Валерыкам.**

З успамінаў Л. Дзейкун, былой вучаніцы Л. П. Курганскай-Сакаловай

...Фотаздымак сваёй першай настаўніцы Любові Пятроўны Курганскай-Сакаловай захоўваю многія гады. У далёкія гады дзяцінства настаўніца навучыла нас, сваіх выхаванцаў, шчыра і бязмежна любіць Айчыну, верыць у дабро і змагацца за яго.

Прыйшла суровая ваенная пара і, не вагаючыся, Любоў Пятроўна зрабіла выбар — стала падпольшчыцай. У яе быў радыёпрыёмнік. Любоў Пятроўна не здала яго, нягледзячы на загад акупантаў. Па гэтым прыёмніку падпольшчыкі слухалі апошнія паведамленні з франтоў, а потым расказвалі людзям праўду. Так, 8 лістапада 1941 года жыхары Васілевічаў даведаліся аб парадзе на Краснай плошчы. Назаўтра пра гэту падзею расказала першая лістоўка мясцовых падпольшчыкаў, непасрэднае дачыненне да выпуску якой мела Любоў Пятроўна. А потым людзі прывыклі да паведамленняў Саўінфармбюро і з нецярплівасцю чакалі іх.

Здаецца, васілевіцкія падпольшчыкі былі няўлоўнымі. Але фашыстам удалося падсадзіць да іх правакатара. Улетку 1942 года было арыштавана 40 чалавек. Маю настаўніцу схапілі з дзецьмі.

— Дзе партызаны? Хто папярэдзіў насельніцтва аб адпраўцы ў Германію? Хто друкаваў лістоўкі?

Але на ўсе гэтыя пытанні вораг так і не атрымаў адказаў.

...Іх павезлі на расстрэл ва ўрочышча Рубанікі. Машыны мінулі чыгуначнае паўтво, за якім густой сцяной стаяла жыта. І тут арыштаваныя, хто яшчэ мог бегчы, сталі выскокваць з аўтамашын, рассыпацца па полі.

Дзве гадзіны карнікі шукалі змучаных людзей. І ўсё ж адзін з іх — Павел Астапенка — уцёк. Ён і расказаў пра далейшае.

Ва ўрочышчы фашысты адкрылі барты грузавікоў і пачалі спіхваць людзей. Дарослыя ссаджвалі дзяцей на мяккую траву. А малыя, як некалі на прагулцы ў дзіцячым садзе, браліся за рукі і ішлі насустрач... смерці...

Любоў Пятроўна не змагла скалечанымі рукамі прытуліць у апошні раз сваіх дзетак. Яна толькі супакойвала іх і абяцала, што татка абавязкова прыйдзе і прагоніць фашыстаў. Напэўна ж, думала яна і пра старэйшага сына, які быў у гэты час з бабуляй у вёсцы Ліпава.

Настаўніца ў апошні раз азірнулася на сваю чатырохгадовую Ларысу і двухгадовага Валерыка, а потым ступіла, засланіўшы на момант дзяцей, да фашыста, які ўжо ўзняў пісталет...

КУРГАНЦАЎ (КУРГАНСКІ) А. П.

КУРС М. І.

КУРС Р. П.

КУРС Ф. А.

ЛАЎШУК Яўсей Піліпавіч, н. у 1914 у в. Навінкі (Калінкавіцкі р-н), перад вайной працаваў у міліцыі, падпольшчык, расстраляны ў ліпені 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

ЛІС Рувім Давыдавіч, н. у 1910, да вайны працаваў дырэктарам Васілевіцкага сыраварнага завода, партызан, расстраляны паліцаямі ў лютым 1942 у в. Муціжар (Калінкавіцкі р-н).

ЛОБАН Макар Яфрэмавіч, да вайны працаваў старшынёй Ліскаўскага сельсавета, расстраляны ў 1942.

МІЛАНОВІЧ А. Е.

МІЛАНОВІЧ Аляксандра Іванаўна, н. у 1898, маці падпольшчыкаў Ігара Віктаравіча і Ларысы Віктараўны Мілановічаў, расстраляна ў ліпені 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

МІЛАНОВІЧ А. С.

МІЛАНОВІЧ Ігар Віктаравіч, н. у 1928, падпольшчык, расстраляны ў ліпені 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

МІЛАНОВІЧ Ларыса Віктараўна, н. у 1924, да вайны працавала піянерважатай Васілевіцкай СШ, падпольшчыца, расстраляна ў ліпені 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

МУЗЫКАНТ Анатоль Аронавіч, н. у 1916, да вайны працаваў сакратаром раённага камітэта камсамола, партызан, загінуў у снежні 1941.

МУЗЫКАНТ Міхаіл Аронавіч, н. у 1914, да вайны працаваў цырульнікам, партызан, загінуў у снежні 1941.

МУЛЬМЕНКА Ганна Яфімаўна, н. у 1896, падпольшчыца, расстраляна 14 ліпеня 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

МУЛЬМЕНКА Надзея Аляксандраўна, н. у 1912, да вайны працавала настаўніцай, расстраляна.

ПЕТРЫКАВЕЦ Мордух Пейсахавіч, н. у 1908, да вайны працаваў загадчыкам раённага аддзела народнай адукацыі, партызан, загінуў у снежні 1941.

РОСЛІК Клаўдзія Канстанцінаўна, н. у 1928, расстраляна.

САЎЧАНКА Міхаіл Антонавіч, н. у 1904, да вайны працаваў старшым оперупаўнаважаным Васілевіцкага раённага аддзялення НКУС, партызан, камандзір аддзялення, загінуў у кастрычніку 1941.

СІДАРАВА (ЮРЧАНКА) Алена Цімафееўна, падпольшчыца, расстраляна 14 ліпеня 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

СІРОЦІН Анатоль Валянцінавіч, н. у 1917, партызан, камандзір узвода, загінуў у ліставадзе 1941.

СІРОЦІН Г. Н.

СІРОЦІН Г. П.

СМАЛАВІЦКІ (СМАЛЯВІЦКІ) Міхаіл, н. у 1898, расстраляны.

СОКАЛАВА Іна Пятроўна.

СОКАЛАЎ Валерый Пятровіч.

СОПАТ Васіль Прохаравіч, н. у 1908, да вайны працаваў начальнікам пашпартнага стала Ганцавіцкага раённага аддзялення НКУС (Брэсцкая вобл.), муж падпольшчыцы Антаніны Іванаўны Жукоўскай, падпольшчык, расстраляны 14 ліпеня 1942 пры спробе ўцячы, калі яго везлі ва ўрочышча Рубанікі.

СЫЧ Ганна Гаўрылаўна, падпольшчыца, расстраляна 14 ліпеня 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

СЯЧКО Браніслаў Міхайлавіч, н. у 1918, падпольшчык, расстраляны.

ТРАФІМАВА Марыя Канстанцінаўна, н. у 1919, да вайны працавала аб'ездчыкам лясніцтва, падпольшчыца, расстраляна ў верасні 1941.

УЛАСЕНКА Д.

УЛАСЕНКА Матруна Арцёмаўна, н. у 1910 у в. Блудзім (Калінкавіцкі р-н), падпольшчыца, гаспадыня канспіратыўнай кватэры, расстраляна ў ліпені 1942. Перад гэтым фашысты падпалілі яе хату і кінулі ў агонь чацвярых дзяцей...

УЛАСЕНКА М. Н.

УЛАСЕНКА Філімон, н. у 1908 у в. Блудзім (Калінкавіцкі р-н), да вайны працаваў лясніком, падпольшчык. Збіраў для партызан зброю, наладжваў сувязь паміж падпольшчыкамі Васілевіцкага і Даманавіцкага раёнаў. Расстраляны 14 ліпеня 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

УСІКАЎ Е. Т.

ФІЛОНЧЫК Усцін Карнеевіч, н. у 1882, актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны, да вайны працаваў загадчыкам гаспадаркі Васілевіцкай аўташколы, партызан, загінуў у лютым 1942.

ЧЭГА (ЧАГА) Надзея.

ЧЭГА (ЧАГА) Якаў Паліпавіч.

ШАВЯЛЕНКА Іван Фёдаравіч, падпольшчык, расстраляны.

ШТУРМА Пётр Пятровіч, падпольшчык, расстраляны.

ШУЛЬГА Яфім Пятровіч, н. у 1885. З 1910 па 1917 знаходзіўся ў царскай арміі, з 1918 па 1920 — старшыня Васілевіцкага рэвалюцыйнага камітэта. У 1920 быў паранены ў баі з белапалякамі, патрапіў да іх у палон. Уцёк з палону і, вярнуўшыся ў Васілевічы, зноў працаваў у мясцовым рэўкоме. Неўзабаве быў абраны кіраўніком валвыканкама. Сакратар мясцовай камуністычнай ячэйкі па 1922, адзін з арганізатараў васілевіцкага калгаса. Працаваў у ім да 1936. Затым — начальнік добраахвотнай пажарнай дружыны. У час Вялікай Айчыннай вайны — падпольшчык, партызан. Расстраляны ў 1942.

ЯГОРАВА Малання Акімаўна, да вайны працавала настаўніцай, падпольшчыца, расстраляна 14 ліпеня 1942 ва ўрочышчы Рубанікі.

Устанавіць прозвішчы ўсіх, хто быў расстраляны, спалены ці закатаваны фашыстамі і іхнімі памагатымі ў Васілевічах за час вайны, на жаль, не ўдалося. Разам з тым не ўдалося ўстанавіць асоб, якія былі забраны ў Германію на прымусовыя работы і не вярнуліся адтуль. Значная колькасць жыхароў Васілевічаў была вязнямі фашысцкіх канцэнтрацыйных лагераў, і ў першую чаргу — Азарыцкага лагера смерці. Многія назаўсёды засталіся там...

ВЁСКА ВЕДРЫЧ

ІВАНОЎ Іван Мікалаевіч, 15 гадоў, расстраляны ў 1943.

Прозвішчы ўсіх жыхароў в. Ведрыч, знішчаных за час вайны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, на жаль, устанавіць не ўдалося.

ПАСЁЛАК ЗАКРАШЫНСКІ МОХ

ХРАЛОВІЧ (ХРАЛАВЕЦ), да вайны працаваў дырэктарам школы, расстраляны разам з сям'ёй.

ВЁСКА ЗАШЧОБ'Е

ЗЯНЬКО Іван (Якаў) Кузьміч, н. у 1930—1932(?), расстраляны каля в. Першамайск (Кабылеў).

ЗЯНЬКО Ксенія Кузмінічна, н. у 1930, расстраляна каля в. Першамайск (Кабылеў).

ЗЯНЬКО Соф'я Кузмінічна, н. у 1928, расстраляна каля в. Першамайск (Кабылеў).

ЗЯНЬКО Таццяна Пятроўна, н. у 1927 (1928?), расстраляна каля в. Першамайск (Кабылеў).

МАЦВЕЙЧУК Агаф'я Сцяпанаўна, н. у 1899, расстраляна.

МІХАЛКА Агаф'я Міхайлаўна, н. у 1911, расстраляна 18.11.1943.

НЕЖЫВЁНАК Міхаіл Васільевіч, н. у 1861, расстраляны.

ЦЭЙКА Агрыпіна, н. у 1864, расстраляна.

ЦЭЙКА Павел Сямёнавіч, расстраляны ў кастрычніку 1943.

ЦЭЙКА Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1913, расстраляны ў кастрычніку 1943.

ЦЭЙКА Сцяпан Яўменавіч, н. у 1898, расстраляны.

ЦЭЙКА Фёкла Акімаўна (Якімаўна), н. у ліпені 1903. Разам з вяскоўцамі хавалася ад карнікаў у лесе. У верасні 1943 вярнулася дамоў, каб наведаць маці. Была схоплена фашыстамі. Ад яе патрабавалі, каб расказала, дзе хаваюцца людзі. Узамен абяцалі жыццё. Мужная патрыётка на такую прапанову адказала адмовай. Калі яе вялі паўз родную хату, крыкнула: «Мама! Мяне арыштавалі і вядуць расстрэльваць. Бывай! ...»

ЯРМОЛЕНКА Мікіта Ануфрыевіч, расстраляны ў лістападзе 1943.

ВЁСКА МАКАНАВІЧЫ

БОГДАН Аляксей Іванавіч, н. у 1908, расстраляны.

БЯЗГУБКА Соф'я Сямёнаўна, н. у 1910, расстраляна.

БЯЗГУБКА Ульяна Іванаўна, н. у 1875, расстраляна.

ГРЫЦЭНКА Сямён Давыдавіч, н. у 1865, спалены.

КОТАВА Ганна Пятроўна, н. у 1921, закатавана.

КОТАВА Марыя Рыгораўна, н. у 1876, спалена.

ЛЕШЧАНКА Анастасія Данілаўна, н. у 1878, спалена.

ЛЕШЧАНКА Васіль Іванавіч, н. у 1880, расстраляны.

ЛЕШЧАНКА Марыя Васільеўна, н. у 1920, расстраляна.

ЛЕШЧАНКА Марыя Міронаўна, н. у 1894, спалена.

МАЦКО Валерый Мартынавіч, н. у 1936, расстраляны.

МАЦКО Домна Іванаўна, н. у 1916, расстраляна.

РАДЗЮЖКА Аляксандр Паўлавіч, н. у 1922, расстраляны.

РАДЗЮЖКА Аркадзь Іванавіч, н. у 1939, расстраляны.

РАДЗЮЖКА Васіль Васілевіч, н. у 1862, расстраляны.

РАДЗЮЖКА Васіль Пятровіч, н. у 1926, расстраляны.

РАДЗЮЖКА Вольга Якаўлеўна, н. у 1891, расстраляна.

РАДЗЮЖКА Дар'я Кузмінічна, н. у 1862, расстраляна.

РАДЗЮЖКА Марыя Пятроўна, н. у 1928, расстраляна.

РАДЗЮЖКА Мікалай Паўлавіч, н. у 1925, расстраляны.

РАДЗЮЖКА Наталля Іванаўна, н. у 1920, расстраляна.

РАДЗЮЖКА Наталля Ціханаўна, н. у 1887, расстраляна.

РАДЗЮЖКА Пётр Васільевіч, н. у 1890, расстраляны.

РАДЗЮЖКА Соф'я Пятроўна, н. у 1941, расстраляна.

Ф. А. (Я.) Цэйка

Н. І. Карлоўская

На жаль, прозвішчы ўсіх жыхароў Васілевіцкага гарсавета, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іхных памагатых з ліку мясцовых здраднікаў, устанавіць не ўдалося.

ВЫШАМІРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЫШАМІР

Да вайны ў ёй было 120 двароў, 580 жыхароў. Цалкам спалена ў чэрвені 1943.

АРЦЁМЕНКА Агаф'я Ігнатаўна, расстраляна ў лютым 1942.

АРЦЁМЕНКА Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1933, расстраляны ў лютым 1942.

АРЦЁМЕНКА Рыгор Іонавіч, расстраляны ў лютым 1942.

ВАЛОДЗЬКІНА Мальвіна, расстраляна ў лютым 1942. Разам з ёй было загублена і шасцімесячнае дзіця.

ВОЛКАЎ Сідар Самуілавіч, расстраляны 14.9.1941.

ВЯЛІКАБОРАЦ Уладзімір Васільевіч, расстраляны 14.9.1941.

КАРЛОЎСКАЯ Надзея Іонаўна, 26 гадоў, расстраляна разам з дачушкамі. Старэйшую, якой было 5 гадоў, звалі **Дзінай.** Малодшай было 2 гады. Яе імя не ўстаноўлена.

КРОТАЎ Еўдакім Маркавіч, расстраляны.

КРОТАЎ Павел Пятровіч, партызанскі сувязны, расстраляны 14.9.1941.

ПРАХАРЭНКА Аляксандра, н. у 1936, расстраляна ў лютым 1942.

ПРАХАРЭНКА Віктар, н. у 1931, расстраляны ў лютым 1942.

ПРАХАРЭНКА Марыя Кліменцьеўна, расстраляна ў лютым 1942.

ПРАХАРЭНКА Фёкла, н. у 1872, спалена ў чэрвені 1943.

ПУЛЯНСКАЯ Ганна, н. у 1927, расстраляна ў лютым 1942.

ПУЛЯНСКАЯ Надзея, н. у 1933, расстраляна ў лютым 1942.

ПУЛЯНСКІ Рыгор Д.

САВІЦКІ Васіль Іванавіч, расстраляны ў лютым 1942.

САВІЦКІ Мяфодзій Якаўлевіч, расстраляны 14.9.1941.

СІВІЦКАЯ Яўгенія Аляксееўна.

СІВІЦКІ Васіль Аляксеевіч.

СІВІЦКІ Васіль Іванавіч.

СІВІЦКІ Рыгор Іванавіч, ад 25 да 30 гадоў. Да вайны працаваў кінамеханікам. У арміі не служыў, бо меў фізічную загану: было пашкоджана вока. Карнікі арыштавалі яго ў лютым 1942. На вуліцы раздзелі і загадалі: «Бяжы да сваіх партызанаў!» І ён пабег у бок вёскі Лецяшын. Фашысты стралялі наўздагон, але ён працягваў бегчы. Праз які месяц вяскоўцы знайшлі яго ва ўрочышчы Камітэт. Сівіцкі Р. І. ляжаў у снезе голым, як і бег ад карнікаў. Ягоныя грудзі былі прабіты 3 кулямі. Ён адбег ад Вышаміра амаль на 2 кіламетры.

СІДАРАВА Алена, н. у 1863, спалена ў чэрвені 1943.

СКЛІМЯНОК Іван Рыгоравіч, расстраляны 14.9.1941.

СКЛІМЯНОК Уладзімір Антонавіч, н. у 1910-1912(?). Да вайны працаваў шаўцом ботаў у Рэчыцы, выдатна граў на гармоніку. Партызан. У час блакады 1942 са згоды камандавання атрада вярнуўся дамоў. Але ў лютым таго ж 1942 у Вышамір прыехаў карны атрад. У фашыстаў ужо быў спіс тых, каго меркавалі расстраляць. І гэтых няшчасных пачалі зганяць да хаты, што стаяла каля вясковых могілак. Карнікі спыталі ў Склімянка У. А.: «Партызан?» Ён цвёрда адказаў: «Партызан!» І яго тут жа расстралялі.

СТРАЛЬЦОЎ Мікалай Маркавіч, расстраляны ў лютым 1942.

ХУЛУП Васіль Яфімавіч, расстраляны 14.9.1941.

ХУЛУП Максім Максімавіч, расстраляны.

ХУЛУП Максім Міхайлавіч, расстраляны ў лютым 1942.

ВЁСКА ГАНЧАРОЎКА (ГАНЧАРОЎ ПАДЗЕЛ)

Да вайны ў ёй было 80 двароў, 320 жыхароў. Цалкам спалена ў чэрвені 1943.

ДАНІЛЕНКА Іван Сямёнавіч, н. у 1908, да вайны працаваў старшынёй калгаса імя Сталіна, партызан, загінуў у баі 10.10.1941. Згодна іншых даных — расстраляны ў 1942 у Рэчыцы.

КУРЛОВІЧ Архіп Верамеевіч.

КУРЛОВІЧ Міхаіл Архіпавіч.

СКАРОМНАЯ Ганна Васільеўна, н. у 1922, да вайны вучылася ў Гомельскім педагагічным інстытуце, расстраляна ў 1941 у Рэчыцы як член партызанскай сям'і.

СКАРОМНЫ Фёдар Васільевіч, н. у 1924, расстраляны ў 1941 у Рэчыцы як член партызанскай сям'і.

ВЁСКА ДЗЯТЛАЎКА

Да вайны ў ёй быў 21 двор, 95 жыхароў. Цалкам спалена ў чэрвені 1943.

ІВАНЧЫКАЎ Аляксандр, падлетак, падарваўся на міне.

ІВАНЧЫКАЎ Мікалай, падлетак, падарваўся на міне.

ІВАНЧЫКАЎ Сцяпан Рыгоравіч, н. у 1907, да вайны працаваў старшынёй калгаса імя Варашылава, партызан, расстраляны ў верасні 1941.

ВЁСКА ДУХАНАЎКА

Да вайны ў ёй было 54 двары, 295 жыхароў. Цалкам спалена ў чэрвені 1943. Амаль усе загінуўшыя з'яўляліся членамі партызанскіх сем'яў, былі расстраляны карнікамі зімой 1943.

АЛЕКСАНДРОНЕЦ Алена Сцяпанаўна, н. у 1915 у в. Бурыцкае (Лоеўскі р-н), жыла ў Духанаўцы.

АЛЕКСАНДРОНЕЦ Андрэй Емяльянавіч, н. у 1873.

АЛЕКСАНДРОНЕЦ Васіль Андрэевіч, н. у 1904.

АЛЕКСАНДРОНЕЦ Ганна Гаўрылаўна.

АЛЕКСАНДРОНЕЦ Ганна Канстанцінаўна, н. у 1938.

АЛЕКСАНДРОНЕЦ Ефрасіння Андрэеўна, н. у 1925.

АЛЕКСАНДРОНЕЦ Людміла Гаўрылаўна, н. у 1940.

АЎЧЫННІКАВА Ганна Андрэеўна, н. у 1906.

АЎЧЫННІКАВА Еўдакія Лукінічна.

АЎЧЫННІКАВА Сцепаніда Якаўлеўна, н. у 1875.

АЎЧЫННІКАЎ Аляксандр Ільіч, н. у 1939.

АЎЧЫННІКАЎ Аніс Карпавіч, н. у 1873.

АЎЧЫННІКАЎ Арсон Ільіч, н. у 1926.

АЎЧЫННІКАЎ Міхаіл Ільіч, н. у 1928.

БРОНАВА Кацярына Дзмітрыеўна, н. у 1925 у в. Бурыцкае (Лоеўскі р-н), жыла ў Духанаўцы.

ЗАЙЧАНКА Агей Сцяпанавіч, н. у 1890.

ЗАЙЧАНКА Антаніна Пятроўна, н. у 1935—1939.

ЗАЙЧАНКА Матруна Пятроўна, н. у 1910 у в. Ліпнякі (Лоеўскі р-н), жыла ў Духанаўцы.

ЗАЙЧАНКА Міхаіл Пятровіч, н. у 1937.

ЗАЙЧАНКА Наталля Мітрафанаўна, н. у 1893.

ПРАНОЗА Аляксандра Іванаўна, н. у 1943.

ПРАНОЗА Васіліса Барысаўна, н. у 1899 у в. Вылева (Добрушскі р-н), жыла ў Духанаўцы.

ПРАНОЗА Іван Канстанцінавіч, н. у 1888 у в. Вышкаў (Лоеўскі р-н), жыў у Духанаўцы.

ПРАНОЗА Марыя Іванаўна, н. у 1924.

ПРАНОЗА Ніна Іванаўна, н. у 1926.

ПРАНОЗА Таццяна Іванаўна, н. у 1935.

СЕМЯНЕНКА Макар Маркавіч.
СЛЕПЧАНКА Іван Цімафеевіч.
СЛЕПЧАНКА Марыя Дзянісаўна.
СЛЕПЧАНКА Марыя Сцяпанаўна.
ЧАЙКО Васіль Данілавіч, н. у 1925.
ЧАЙКО Даніла Васільевіч, н. у 1904.
ЧАЙКО Фядосся Іванаўна, н. у 1904 у в. Ліпнякі (Лоеўскі р-н), жыла ў Духанаўцы.
ЧВАНЬКОВА Марыя Трафімаўна, н. у 1920.
ЧВАНЬКОВА Марыя Якаўлеўна, н. у 1887 у в. Бурыцкае (Лоеўскі р-н), жыла ў Духанаўцы.
ЧВАНЬКОЎ Трафім Савельевіч, н. у 1884.
ШКУРАТАВА Марыя Аляксееўна, н. у 1895 у в. Бурыцкае (Лоеўскі р-н), жыла ў Духанаўцы.
ШКУРАТАЎ Лука Навумавіч, н. у 1920 у в. Бурыцкае (Лоеўскі р-н), жыў у Духанаўцы.
ШКУРАТАЎ Міхаіл Навумавіч, н. у 1922 у в. Бурыцкае (Лоеўскі р-н), жыў у Духанаўцы.

ВЁСКА КУЗЬМІНКА

Да вайны мела 47 двароў, 167 жыхароў. Цалкам спалена ў чэрвені 1943. Карнікі расстралялі аднаго вяскоўца, прозвішча якога ўстанавіць не ўдалося.

ВЁСКА ЛЕЦЯШЫН

Да вайны ў ёй было 23 двары, 92 жыхары. Цалкам спалена ў чэрвені 1943. Карнікі расстралялі, спалілі і закатавалі 8 чалавек. Іхнія прозвішчы, на жаль, устанавіць не ўдалося.

ВЁСКА СЯМЁНАЎКА (АСІНАЎКА)

Да вайны ў ёй было 330 двароў, 1080 жыхароў. Цалкам спалена ў чэрвені 1943.
ДУБАВЕЦ Праскоўя Лявонаўна, партызанская сувязная.
ЗЯЛЕНСКІ Піліп Міхайлавіч, н. у 1920, да вайны працаваў у спажывецкай кааперацыі, партызан.
КЛЕМЯЗЬ (жанчына), расстраляна ў чэрвені 1943.
КОЎТУН Даніла (стары), расстраляны ў жніўні 1943.
ЧЭЧЫК Ігнат Паўлавіч, н. у 1914, партызан.

ГЛЫБАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БЕРАГАВАЯ СЛАБАДА

Да вайны ў ёй было 103 двары, 461 жыхар. Цалкам спалена ў чэрвені 1943. Ахвярамі карнікаў сталі 5 вяскоўцаў, прозвішчы якіх, на жаль, устанавіць не ўдалося.
КАРНІЕНКА Ілля Фёдаравіч, н. у 1920, партызан, загінуў у баі з паліцаямі 16.9.1943 каля в. Валадарск (Гавенавічы).
СІВАДЗЕДАЎ Анатоль Фёдаравіч, н. у 1925, партызан, загінуў 12.6.1943 каля в. Будка-Шыбенка.
СКРЫПЧАНКА Аляксандра Андрэеўна, н. у 1919, да вайны працавала настаўніцай у Васілевічах, партызанка, загінула 10.7.1943.

ВЁСКА ВАЛАДАРСК (ГАВЕНАВІЧЫ)

Да вайны ў ёй было 125 двароў, 587 жыхароў. Цалкам спалена ў чэрвені 1943. Пераважная большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе «20-ы Кастрычнік».
БЯЛЯЙ Міхаіл Д., 45 гадоў, расстраляны 20.6.1943.
ГАЛАВАЧЭНКА Якаў К., 44 гады, расстраляны 20.6.1943.
ГРОМ Сямён Лаўрэнавіч, 18 гадоў, расстраляны 20.6.1943.
ГУЗ Рыгор Мікалаевіч, 66 гадоў, расстраляны 20.6.1943.
ГУЗ Яўдокій Іванавіч, 70 гадоў, спалены 20.6.1943.
ДУДКО Ангеліна Трафімаўна, 13 гадоў, расстраляна 20.6.1943.
ЗАЯЦ Фама, партызан, расстраляны 19.9.1941. Ад здрадніка фашысты даведаліся пра тое, што ён разам з Канавальчыкам А. М., Кастрамой А. Р., Кастрамой С. і Лёгкім П. Р. ахоўваў склады, закладзеныя ў лесе каля Валадарска для партызанскіх атрадаў.
КАНАВАЛЬЧЫК Арцём Мартынавіч, н. у 1904, партызан, расстраляны 19.9.1941.
КАСТРАМА Антон Рыгоравіч, н. у 1903, партызан, расстраляны 19.9.1941.
КАСТРАМА Дар'я Юр'еўна, 50 гадоў, расстраляна 20.6.1943.
КАСТРАМА Іван Барысавіч, 61 год, расстраляны 20.6.1943.
КАСТРАМА Самуіл, партызан, расстраляны 19.9.1941.
КАСТРАМА Фёдар Лаўрэнавіч, н. у 1926, партызан, загінуў 20.9.1943.
КАСТРАМА Харытон Сцяпанавіч, н. у 1891, расстраляны 20.6.1943.
ЛЁГКІ Піліп Рыгоравіч, н. у 1891, партызан, расстраляны 19.9.1941.
ЛІСОЎСКІ Васіль Іванавіч, 40 гадоў, расстраляны 20.6.1943.
МАРТЫНЕНКА Павел Пятровіч, партызанскі сувязны, загінуў 22.3.1943.
СВЯТАГОР Раіса Іванаўна, 6 гадоў, расстраляна 20.6.1943.
СЕВЯРЫНСКАЯ (СЕВЯРЫНЕЦ) Праскоўя, 33 гады, расстраляна 20.6.1943.
СІДОРАНКА (СІДАРЭНКА) Марк Васільевіч, 70 гадоў, закатаваны 20.6.1943.
ШКІЛЬ Уладзімір Сцяпанавіч, н. у 1926, партызан, памёр ад ран.

ВЁСКА ГАРНОЎКА

Да вайны ў ёй было 55 двароў, 242 жыхары. Спалена 13.6.1943. Загінуўшыя працавалі да вайны ў калгасе імя Молатава.

КАЛЕСНІК Мірон Есіпавіч, н. у 1904, спалены.

КАНОДА Даніла.

РАЦЫБОРСКАЯ Фядора Андрэеўна, н. у 1883, спалена.

РАЦЫБОРСКІ Аляксей Сямёнавіч, н. у 1880, спалены.

ВЁСКА ГЛЫБАЎ

Да вайны ў ёй было 64 двары, 336 жыхароў. Спалена ў чэрвені 1943. Большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе «Сацыялізм». На жаль, прозвішчы ўсіх ахвяраў устанавіць не ўдалося.

ЖАЛЕЗКА (АКУЛАВА) Малання П., падпольшчыца, расстраляна.

КАЗЛОЎСКІ Васіль Іванавіч, падпольшчык, расстраляны.

ДОЎБУШ Ева Яўменаўна, н. у 1883, спалена жывой.

КАРАКА Ганна Фёдараўна, н. у 1912, да вайны працавала медыкам. Партызанка, загінула ў баі з фашыстамі 16.9.1941 на партызанскай базе Рэчыцкага атрада імя Варашылава, якая знаходзілася ў Амелькаўскім лесе (Хойніцкі р-н). Згодна іншых даных – была схоплена карнікамі, калі перавязвала параненага партызана, і закатавана каля в. Новы Барсук. У мужнай патрыёткі-партызанкі засталіся двое маленькіх дзяцей.

КЛЕШЧАНКА Агаф'я Іванаўна, н. у 1897, расстраляна.

КЛЕШЧАНКА Ганна, расстраляна.

КЛЕШЧАНКА Іван Авяр'янавіч, н. у 1858, спалены.

КЛЕШЧАНКА Іван Мінавіч, спалены жывым.

ПАРЧАНКА Мікіта, расстраляны.

ПЕТУШЭНКА Васіль Мікітавіч, н. у 1873, да вайны працаваў у калгасе, спалены жывым.

ПЕТУШЭНКА Васіль Рыгоравіч, спалены жывым.

ПУЗІК Усціння Барысаўна, н. у 1863, спалена жывой.

РЫЛІК Рыгор Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1916, у 1939 скончыў вайсковае вучылішча пры акадэміі імя Фрунзе (г. Масква) і быў накіраваны ў танкавую часць, якая дыслацыравалася ў

г. Бярдзічаве Жытомірскай вобл. (Украіна). У раёне г. Львова патрапіў, не прабіўшыся з акружэння, у палон. Пасля ўдалых уцёкаў — камандзір аддзялення аднаго з украінскіх партызанскіх атрадаў, загінуў 17.1.1944, пахаваны на Украіне.

ВЁСКА УЗНАЖ

Да вайны ў ёй было 153 двары, 708 жыхароў. Цалкам спалена карнікамі ў сярэдзіне чэрвеня 1943. Былі расстраляны, закатаваны і спалены каля 30 чалавек. На жаль, дакладна колькі — невядома. Можна меркаваць, што ў той страшны для вёскі дзень у ёй знаходзіліся не толькі карэнныя жыхары, але і людзі з іншых бліжэйшых населеных пунктаў, якіх карнікі спалілі 13.6.1943.

БАРЫСЕНКА Андрэй Васільевіч.

БОБЛА Рыгор Кузьміч, н. у 1898, да вайны працаваў у калгасе «Бальшавік», расстраляны.

ГВОЗДЗЬ Амрос, спалены жывым.

ГІЛЬ Іван Якаўлевіч.

ГОШКА Андрэй Якаўлевіч.

ГОШКА Іван Якаўлевіч, н. у 1902, да вайны працаваў у калгасе «Бальшавік», спалены жывым.

ГОШКА Ігнат Елісеевіч, н. у 1939, спалены жывым.

Гошка Кацярына Сцяпанаўна, н. у 1889, да вайны працавала ў калгасе «Бальшавік», спалена жывой.

ГОШКА Лукер'я Сцяпанаўна, да вайны працавала ў калгасе «Бальшавік», спалена жывой.

ГОШКА Пётр Сцяпанавіч, н. у 1905, да вайны працаваў у калгасе «Бальшавік», расстраляны.

ГОШКА Сцяпан Іванавіч.

ГОШКА Яўдоха (Еўдакія), н. у 1905, да вайны працавала ў калгасе «Бальшавік», спалена жывой.

ГРЫШКОЎ Раман Лаўрэнавіч (Цярэнцьевіч), н. у 1923, да вайны працаваў у калгасе «Бальшавік», расстраляны.

КАПАРЫКАВА Ганна Рыгораўна, н. у 1918, да вайны працавала настаўніцай, расстраляна.

КАШАВАР Мікалай Іванавіч.

КОЗЫР Цімафей Мікалаевіч, н. у 1891, да вайны працаваў у калгасе «Бальшавік», спалены жывым.

КРАЎЧУК (КРАЎЧАНКА) Лазар і ягоныя дзеці: сын **Віктар,** 1939 г. н., дачка **Рыва,** 1936 г. н. і дачка **Соф'я,** 1940 г. н. Расстраляны ў 1941.

КРАЎЧАНКА (КРАЎЧУК) Меер, н. у 1898, расстраляны.

ПЕТРАВЕЦ Ганна Пятроўна, н. у 1915, да вайны працавала ў калгасе «Бальшавік», спалена жывой.

ПЕТРАВЕЦ Пётр Андрэевіч, н. у 1877, да вайны працаваў у калгасе «Бальшавік», спалены жывым.

СМАЛЯН Еўдакія Якаўлеўна, н. у 1915, да вайны працавала ў калгасе «Бальшавік», расстраляна.

Г. Ф. Карака

СМАЛЯН Марыя Мікалаеўна, н. у 1934, расстраляна.

ШЧУКА Іван Піліпавіч, н. у 1923, да вайны працаваў у калгасе «Бальшавік», расстраляны.

ШЧУКА Марыя Піліпаўна, н. у 1922, да вайны працавала ў калгасе «Бальшавік», расстраляна.

ШЧУКА Настасся Міхайлаўна, н. у 1889, да вайны працавала ў калгасе «Бальшавік», расстраляна.

ВЁСКА ЧАРНЕЙКІ

Да вайны ў ёй было 70 двароў, 344 жыхары. Цалкам спалена 13.6.1943. Былі расстраляны, закатаваны ці спалены жывымі звыш 10 яе жыхароў. На жаль, дакладная колькасць не ўстаноўлена.

ДРАГУН Антон Паўлавіч, н. у 1868, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», спалены жывым.

ДРАГУН Ганна Антонаўна, н. у 1923, да вайны працавала ў калгасе «Перамога», расстраляна.

ДРАГУН Ганна Рыгораўна, да вайны працавала ў калгасе «Перамога», спалена жывой.

ДРАГУН Еўдакія Герасімаўна, расстраляна.

КАВАЛЬЧУК Іван Панцялеевіч, н. у 1863, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», расстраляны.

КАВАЛЬЧУК Марфа Міронаўна, н. у 1907, да вайны працавала ў калгасе «Перамога», расстраляна.

КАВАЛЬЧУК Соф'я Міронаўна, н. у 1909, да вайны працавала ў калгасе «Перамога», расстраляна.

ЛІЦВІНЕНКА Варвара Львоўна, н. у 1898, да вайны працавала ў калгасе «Перамога», расстраляна.

ЛІЦВІНЕНКА Марыя Львоўна, н. у 1929, расстраляна.

ПАШКУРА Майсей Паўлавіч, н. у 1915, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан брыгады імя Чапаева, папярэдзіў жыхароў в. Чарнейкі, каб яны ўцякалі ў лес, бо фашысты

распачалі карную аперацыю. Быў цяжка паранены і памёр ад ран у канцы 1943.

ВЁСКА ШОЛКАВІЧЫ

Да вайны ў ёй было 32 двары, 147 жыхароў. Цалкам спалена 14.6.1943. Пераважная большасць жыхароў вёскі, папярэджаных партызанамі, уцякла ад карнікаў у лес. Тыя ж, каторыя засталіся дома, былі расстраляны, закатаваны ці спалены.

КОЗЫР Аксіння (Ксенія) Раманаўна, н. у 1879, да вайны працавала ў калгасе, спалена жывой.

КОЗЫР Ганна Якаўлеўна, н. у 1900, да вайны працавала ў калгасе, спалена жывой.

КОРЗУН Ганна Паўлаўна, н. у 1870, да вайны працавала ў калгасе, спалена жывой.

КОРЗУН Павел Мацвеевіч, н. у 1927, спалены жывым.

ЛІПСКІ Андрэй Іванавіч, партызан, загінуў 9.10.1943 каля в. Буда Калінкавіцкага р-на.

МАРКАЎ Сяргей Е., н. у 1884, да вайны працаваў у калгасе, спалены жывым.

НІКІЦЕНКА Васіль Пятровіч, н. у 1870, да вайны працаваў у калгасе, спалены жывым.

НІКІЦЕНКА Пётр Пятровіч, н. у 1870, да вайны працаваў у калгасе, спалены жывым.

СТАРЖЫНСКАЯ Марыя Паўлаўна, н. у 1876, да вайны працавала ў калгасе, спалена жывой.

СТАРЖЫНСКАЯ Настасся Паўлаўна, н. у 1874, да вайны працавала ў калгасе, спалена жывой.

ТРАЦЭЎСКІ Рыгор Якаўлевіч.

КАПАРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАГДАНАЎКА

ГОРБАЧ Уладзімір Ігнатавіч, н. у 1924, партызан, загінуў у маі 1943.

ВЁСКА БУДКА

АГУНОВІЧ Васіль Яўсеевіч.
ГОРБАЧ Міхаіл Міхайлавіч.
ГОРБАЧ Павел Міхайлавіч.
ПАТАРОЧА Максім Сямёнавіч.
САПОНЧЫК Мікіта Ануфрыевіч.
ХАТКЕВІЧ Васіль Васільевіч.
ХАТКЕВІЧ Дар'я Кірэеўна.
ХАТКЕВІЧ Леанід Васільевіч.

ВЁСКА КАПАРАЎКА

БАБРОВА Уліта Фёдараўна, расстраляна.

БАБРОЎ Мікалай Мікалаевіч, кіраўнік падпольнай патрыятычнай групы, расстраляны.

БУР'ЯК Іван Мікітавіч.

БУР'ЯК Сямён Васільевіч, да вайны працаваў старшынёй калгаса, партызан, закатаваны ў 1942.

ГРАБЦЭВІЧ Сафрон Максімавіч.

ЛІСОЎСКІ Уладзімір Паўлавіч.

САПОНЧЫК Міхаіл Сільвестравіч.

САПОНЧЫК Міхаіл Сямёнавіч, расстраляны.

САПОНЧЫК Рыгор Дзмітрыевіч, расстраляны.

СЯДЗЬКО Віктар Васільевіч.

СЯДЗЬКО Мікалай Піліпавіч.

СЯДЗЬКО Піліп Кандратавіч.

УЛАСЕНКА Аляксей Аляксеевіч.

ЧАРНАЛЕЎСКІ Міхаіл Харытонавіч, расстраляны.

ШАБЕТНІК Аляксей Іванавіч.

ШАБЕТНІК Павел Мікалаевіч.

ШАПАВАЛ Барыс Піліпавіч.

ВЁСКА ЛАЗАРАЎКА

АГУНОВІЧ Апанас Іосіфавіч.

ДОРАХ Павел Іванавіч.

ПАТАРОЧА Павел Гардзеевіч.

ПОЛЯК Павел Людвігавіч.

СІВАДЗЕД Іван Андрэевіч.

СІЛКО Ніна Захараўна.

СЯДЗЬКО Сцяпан Піліпавіч.

ЧАШУН Ануфрый Макаравіч.

ПАСЁЛАК ПРУДЗІШЧА

ЗАЛЯЧОНАК Піліп Сцяпанавіч.

СМОЛЬСКАЯ Праскоўя Маркаўна.

КАРАВАЦІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАРАВАЦІЧЫ

Пераважная большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе «Запаветы Леніна», расстраляны ці спалены летам 1943.

БЛІЗНЕЦ Міхаіл Мікалаевіч, 60 гадоў.

БЛІЗНЕЦ Пётр Трафімавіч, н. у 1900.

ВУС (УС) Аўдоцця Архіпаўна, н. у 1890.

ВУС Герасім Адамавіч, 51 год.

ВУС Еўдакія Трафімаўна, 60 гадоў.

ВУС Іван Міхайлавіч, 60 гадоў.

ВУС Мікалай, н. у 1880.

ВУС Цімафей Дзмітрыевіч, партызан, загінуў.

ВУС ... Ігнатавіч, н. у 1915.

ГОРБАЧ Арына Ігнатаўна, н. у 1916.

ДЗЕЙКУН Агаф'я Іванаўна, н. у 1900.

ДЗЕЙКУН Андрэй Андрэевіч, партызан, загінуў.

ДЗЕЙКУН Васіль Васільевіч, н. у 1880.

ДЗЕЙКУН Іван Лявонавіч, н. у 1912.

ДЗЕЙКУН Матруна Ігнатаўна, 60 гадоў.

ДЗЕЙКУН Матруна Яўсееўна, н. у 1900. Яе дзеці: сын **Антось,** 1936 г. н., і дачка **Марыя,** 1940 г. н.

ЗАЯЦ Аўдоцця Архіпаўна, н. у 1880.

КАНДРАЦЕНКА Аляксандр Іванавіч, н. у 1915, партызан, загінуў 24.10.1943.

КАНДРАЦЕНКА Мікалай Рыгоравіч, н. у 1900.
КАНДРАЦЕНКА Яфім Іванавіч, н. у 1906.
КРУТАЯ Пелагея, 65 гадоў.
КРУТАЯ Улляна Сідараўна, 60 гадоў.
МІХАЛКА Аляксей Сцяпанавіч, партызан, загінуў.
МІХАЛКА Андрэй Якаўлевіч, партызан, загінуў.
МІХАЛКА Іван Трафімавіч, партызан, загінуў.
МІХАЛКА Мікалай Яфімавіч, н. у 1917.
МІХАЛКА Наталля Аляксееўна, 50 гадоў.
МІХАЛКА Піліп Піліпавіч, н. у 1925.
МІХАЛКА Рыгор Кірылавіч, н. у 1902.
МІХАЛКА Усціння Яфімаўна, 43 гады.
МІХАЛКА Фядосся, 50 гадоў.
СІДОРАНКА (СІДАРЭНКА) Васіль Сцяпанавіч, н. у 1911.
СІДОРАНКА Раман Пракопавіч, н. у 1900.
СІДОРАНКА Рыгор Пракопавіч, н. у 1880.
СІДОРАНКА Сцяпан Аўрамавіч, 60 гадоў.
СМОЛЬСКАЯ Кацярына Ананьеўна, 45 гадоў. Яе дачка **Ганна,** 10 гадоў.
СМОЛЬСКІ Міхаіл Лявонавіч, н. у 1900, партызанскі сувязны.

З успамінаў Таццяны Лявонаўны Краўчанкі, сястры М. Л. Смольскага

...Калі ж тое было? Ды ўлетку сорак трэцяга. Калі і жыта якраз не ўсё зжалі, і грыбы пайшлі. У Каравацічах якраз мадзяры стаялі. А дзе былі тыя партызаны, дый зачапілі іх. Во тут і ўсчалося. Давай паліць ды страляць. Хто пад руку, таго й страляюць. У агонь каго папакідалі. Было, што й жывымі закопвалі...

Тады і брата майго, Міхайлу, схапілі. Папавадзілі па Каравацічах босага ды голага. А тады на Зашчоб'е пагналі. Матка нашая ўслед. Панесла есці перадаць, ды з адзежыны. Пабачыла: збіты ўвесь, зубоў нямашака...

А яны штурхаюць: «Матка, дамоў, дамоў ідзі... Разбярэмся. Заўтра прыходзь».

Ну, матка й паслухалася. А назаўтра прыйшла, то яго ўжэ й нямашака... Потым казалі партызаны, што яго тады пад пілу лесапільную...

Памятаю, бытта сёння было: вядуць, скрываўленага, а ён і галавы не падняў, развітацца каб. Мо й не бачыў ужэ нічога...

Тады не толькі аднаго яго, а і багата каго з Каравацічаў...

СЫЧ Соф'я Іванаўна, н. у 1924.
ТУЖЫК Варвара Іванаўна, н. у 1925.
ТУЖЫК Восіп Церахавіч, н. у 1898.
ТУЖЫК Настасся, н. у 1900.
ТУЖЫК (яна).
ХАЛІМОНЕНКА Лёкса Н., 60 гадоў.
ЦІМАШОК Марфа Фёдараўна, н. у 1906.
ЯРАЦ Аляксей Аляксеевіч, н. у 1925.
ЯРАЦ Вольга Мікалаеўна, 3 гады. Яе брат **Леанід,** 6 гадоў.
ЯРАЦ Ганна Васільеўна, 25 гадоў.
ЯРАЦ Дар'я Адамаўна, 65 гадоў.
ЯРАЦ Іван Кузьміч, 60 гадоў.
ЯРАЦ Іван Максімавіч, н. у 1925.
ЯРАЦ Іван Рыгоравіч, н. у 1910.
ЯРАЦ Іван Цітавіч, 75 гадоў.
ЯРАЦ Кацярына Сцяпанаўна, н. у 1925.
ЯРАЦ Марфа Аляксееўна, н. у 1905.
ЯРАЦ Мікалай Цімафеевіч, 75 гадоў.
ЯРАЦ Надзея Фёдараўна, 45 гадоў.
ЯРАЦ Раман Іванавіч, н. у 1900.

На жаль, устанавіць прозвішчы ўсіх, хто быў у час вайны ў вёсцы Каравацічы расстраляны, спалены, закатаваны ці загінуў пры праходжанні фронту, не ўдалося.

ВЁСКА ПЕРАВАЛОКА

Пераважная большасць загінуўшых перад вайной працавалі ў калгасе «Абарона краіны».

ВАСІЛЕЦ Васіль Усцінавіч, н. у 1904, расстраляны ў жніўні 1941.
ДОРАХ Дзям'ян Іванавіч, н. у 1931, расстраляны.
ДОРАХ Іван Іванавіч, н. у 1887, расстраляны.
ДОРАХ Марфа Міхайлаўна, н. у 1909, расстраляна як член партызанскай сям'і. Яе дзеці: дочкі **Ганна,** 1931 г. н., і **Ніна,** 1941 г. н.
ДОРАХ Наталля Майсееўна, н. у 1926, расстраляна карнікамі ў лесе. Разам з ёй загінуў малодшы брат **Іван,** 1936 г. н. У трагічны для сям'і Дорахаў дзень у лесе з Наталляй і Іванам была і іхняя маці. Ад смерці яе ўратавала тое, што жанчына адлучылася ў вёску, каб узяць чаго з ежы. Вяртаючыся, яна чула стрэлы. Матчына сэрца падказала: дзяцей ужо няма ў жывых...
ДОРАХ Ніна Ціханаўна, н. у 1942, расстраляна.
КУЛАЖАНКА Вольга Піліпаўна, н. у 1909, расстраляна ў студзені 1943 як член партызанскай сям'і. Разам з ёй была расстраляна дачка **Клава,** 1939 г. н.
ЛУЦКО Акуліна Арсонаўна, н. у 1914, расстраляна ў 1943 у лесе. Яе дачка **Ніна,** 1940 г. н. У жывых застаўся сын, якому было 3—5 гадоў. Хлапчук прычакаў бацьку, які вярнуўся з фронту. А потым ... потым на калгасным двары падарваўся на міне. Пад той час яму было 9—10 гадоў.
ЛУЦКО Анатоль, н. у 1938, расстраляны.
ЛУЦКО Антон Іванавіч, н. у 1926, расстраляны ў 1943.
ЛУЦКО Антон Карнеевіч, н. у 1912. З братам **Сяргеем,** 1907 г. н., ішоў у лес па грыбы. Карнікі перастрэлі іх, учынілі допыт. А потым, не выбіўшы з братоў прызнання ў сустрэчы з партызанамі, пагналі іх у Каравацічы. Там нашчасных кінулі ў яму і закапалі жывымі... Гэта

злачынства на сумленні мадзяраў. Адбылося яно летам 1943.

ЛУЦКО Мартын Іосіфавіч, н. у 1902, партызан, загінуў 28.1.1943.

ЛУЦКО Таццяна Іванаўна, н. у 1927, расстраляна.

ЛУЦКО Фядос Іванавіч, н. у 1899, расстраляны ў жніўні 1941.

ЛУЦКО Хіма Фёдараўна, н. у 1911, расстраляна ў 1943 як член партызанскай сям'і. Яе дзеці: сыны — **Фёдар,** 1931 г. н., **Мікалай,** 1939 г. н., дачка **Таццяна,** 1936 г. н.

РАШЭТНІКАЎ Яфім Карпавіч, н. у 1897, расстраляны ў 1943 як член партызанскай сям'і. Разам з ім расстраляны: жонка **Улюта Піліпаўна,** 1897 г. н., дачка **Кацярына,** 1931 г. н., сыны — **Аляксандр,** 1930 г. н., **Кузьма,** 1923 г. н.

СЕМЧАНКА Марыя (Малання) Фёдараўна, н. у 1909, расстраляна ў студзені 1943 як член партызанскай сям'і. Разам з ёй быў і васьмігадовы сын Іван. Карнікі, а сярод іх былі паліцаі з в. Маладуша, стралялі і па хлапчуку. Ён, звалены куляй, паваліўся на забітых. Глыбокай ноччу апрытомнеў. Прыйшоў у родную вёску. Добрыя людзі прытулілі яго, выхадзілі. У спісах жа рэчыцкай паліцыі ён значыўся як знішчаны. Паліцаі і ўявіць сабе не маглі, што хлапчук, у якога выпусцілі некалькі куль, застанецца ў жывых, а потым, калі прыйдзе час расплаты, будзе на судзе адным са сведкаў...

СЕМЧАНКА Пётр Гардзеевіч, н. у 1927, расстраляны ў 1943.

СЕМЧАНКА Савелій Іванавіч, н. у 1896, расстраляны ў жніўні 1941.

СМОЛЬСКАЯ Антоля Харытонаўна, н. у 1925, расстраляна ў 1943.

СМОЛЬСКАЯ Марыя Іванаўна, н. у 1900. Разам з дачкой **Нінай,** 1938 г. н., знаходзілася ў лесе. Ішла з вяскоўцамі паўз жыта. Карнікі заўважылі людзей і пачалі страляць па іх. Каторыя пападалі, а потым папаўзлі. Смольская ж пабегла. Здавалася, што яна ўратуецца, бо куля не зачапіла яе. Але карнікі не схацелі ўпусціць ахвяру. Яны кінуліся наўслед з сабакамі. Знайшлі Марыю Іванаўну і яе дачушку. Здзекаваліся над жанчынай, зрэзалі яе кінжаламі. А потым расстралялі і дзіцё.

СМОЛЬСКАЯ Марыя Мікалаеўна, н. у 1911, расстраляна ў 1943 разам з дачкой **Тамарай,** 1942 г. н.

СМОЛЬСКАЯ Наталля Пракопаўна, н. у 1913, расстраляна ў 1943 як член партызанскай сям'і. Разам з маці загінулі дзеці: дачка **Марыя,** 1939 г. н., сыны — **Міхаіл,** 1940 г. н., і **Мікалай,** якому было ўсяго некалькі месяцаў.

СМОЛЬСКІ Аляксей Рыгоравіч, партызан, загінуў.

СМОЛЬСКІ Аляксей Юр'евіч (Георгіевіч), н. у 1925 (1926?), партызан. Разам з сябрам, прозвішча якога ўстанавіць не ўдалося, хаваўся на гарышчы хаты. Нечакана ля вёскі грымнуў стрэл. Яго ўчулі і фашысты, што былі непадалёку. Яны прымчаліся ў Перавалоку на матацыклах. Колькі немцаў і што яны мяркуюць рабіць, Аляксей і ягоны таварыш не ведалі. Яны хуценька злезлі з гарышча, кінуліся дварамі ў бок лесу. Немцы заўважылі іх. Здагнаўшы хлопцаў-партызанаў, расстралялі іх. А потым, вярнуўшыся, расстралялі і **СМОЛЬСКАГА Георгія Клімавіча,** 1896 г. н., каля двара якога і заўважылі юнакоў.

СМОЛЬСКІ Андрэй Васільевіч, н. у 1929, расстраляны ў лесе ў 1943. Разам з ім была расстраляна і **СМОЛЬСКАЯ Мальвіна,** 1926 г. н. Андрэй і Мальвіна неслі партызанам ежу.

СМОЛЬСКІ Георгій Лаўрэнавіч, н. у 1898, расстраляны ў жніўні 1941.

СМОЛЬСКІ Міхаіл Ігнатавіч, н. у 1887, расстраляны ў 1943.

СМОЛЬСКІ Пётр Пятровіч, н. у 1886, расстраляны ў 1943.

СМОЛЬСКІ Фёдар (Фядос) Адамавіч, н. у 1896, расстраляны ў жніўні 1941.

ЦЕРАБІЛЕНКА Арына Іванаўна, н. у 1896, расстраляна ў 1943.

ЯНОВІЧ Насця, каля 40 гадоў, была схоплена паліцаямі. Яны павезлі жанчыну ў бок в. Андрэеўка. Далейшы лёс жанчыны невядомы. Невядома таксама, што зрабілі каты і з яе дачкой **Нінай,** 1939 г. н.

Пры рабоце над спісамі па в. Перавалока дапамогу творчай групе аказала мясцовая жыхарка Кулажанка Марыя Харытонаўна, 1922 г. н.

ВЁСКА ПЕРШАМАЙСК (КАБЫЛЕЎ)

Да вайны ў ёй было 280 двароў, 1500 жыхароў.

Акт жыхароў вёскі Кабылеў былога Васілевіцкага раёна былой Палескай вобласці і прадстаўнікоў вайсковай часці 9-га гв. стралковага корпуса Чырвонай Арміі аб зверствах гітлераўскіх захопнікаў у дачыненні жыхароў вёскі ў час акупацыі ў 1941—1943 гг.

28 лістапада 1943 г.

Мы, нижеподписавшиеся, жители дер. Кобылево Василевичского района Полесской обл. и представители Н-ской части, составили настоящий акт о нижеследующем:

2 года немецко-фашистские захватчики свирепствовали в дер. Кобылево, угоняя юношей и девушек в рабство на работы в Германию, грабя имущество и скот, убивая жителей и сжигая дома, издеваясь и глумясь над народом, который не хотел покориться злой немецкой воле.

40 юношей и девушек, оторванных от родных и близких людей, были угнаны гитлеровцами еще зимой 1942 г.

Но не покорилась деревня захватчикам: 48 жителей деревни ушли в леса к партизанам биться за народное счастье и мстить ненавистным оккупантам.

В ответ на это 28 января 1943 г. в дер. Кобылево прибыл отряд немцев и полиции в количестве более 200 чел., во главе которого стояли немецкие ставленники — бургомистр волости Гуляй и начальник полиции Лещенко.

В течение 2 недель свирепствовали грабежи и убийства. Имущество жителей было разграблено, скот угнан, многие дома разбиты. Жителей связывали семьями, бросали в повозки и увозили за деревню, где расстреливали и сжигали живыми. За 2 недели разнузданного произвола и издевательств немцев и их кровавых пособников были расстреляны и сожжены семьи: Емельянченко Михаила Филипповича, Сыча Степана Федоровича, Близнеца Ивана Яковлевича и других 42 чел. Своих односельчан, павших от рук злодеев, похоронили вернувшиеся из лесов жители дер. Кобылево.

Напуганные немецкими зверствами люди разошлись по лесам. В течение нескольких месяцев пустовала деревня.

13 мая 1943 г. в деревню из с. Макановичи прибыла немецкая разведка вместе с Гуляем и расстреляла 12 чел. проживавших в лесу жителей дер. Кобылево. Остальным было объявлено, что всем, кто вернется в деревню, немцы гарантируют хорошую жизнь, пойманные же в лесу будут расстреляны. Большинство жителей вернулось в свои дома. Но палачи обманули народ.

На второй день, 14 мая 1943 г., в деревню прибыл отряд войск СС и полиции до 300 чел. Гитлеровцы при помощи своего ставленника Гуляя оцепили деревню и выставили пулеметы. Всех жителей — мужчин и женщин, стариков и детей, здоровых и больных — немцы стали сгонять в центр деревни, поджигая дома.

Началась дикая расправа. Сначала были отобраны мужчины, загнаны в дома и на глазах их жен, матерей и детей расстреляны и сожжены. После этого немецкие злодеи и их приспешники приступили к уничтожению остальных. Престарелых старух, женщин с грудными младенцами и подростков загоняли по 20—30 чел. в отдельные дома, бросали в них гранаты и поджигали. Стон, плач и душераздирающие крики стояли над дер. Кобылево 14 мая 1943 г. Матери падали на землю, целовали извергам сапоги и молили пощадить их детей. Но с хладнокровием садистов немецкие солдаты разбивали прикладами головы беззащитных людей, бросали детей в огонь, прикалывали штыками ползающих раненых.

Только немногим жителям удалось спастись от этой зверской расправы. Так, Скакун Павлик 12 лет был загнан в дом Белого Федора в числе 25 жителей деревни. Эсэсовцы заперли дверь и бросили туда гранату. Загнанные в дом люди частью были убиты, частью ранены. Оглушенный взрывом Скакун Павлик упал у двери. Когда зажгли дом, он очнулся, выскочил в окно, отполз по канаве и спрятался под мостом. Родители его сгорели, а он остался жив.

Жительница этой же деревни Халимоненко Наталья 35 лет в момент расстрела получила тяжелое ранение: пуля вошла сзади уха и вышла через правый глаз. Обливаясь кровью, с опаленной головой, она отползла в сторону от горящего дома, упала в закопанную бочку с водой и пролежала там до прихода в деревню партизан.

Всего на этот раз отряд СС совместно со своими пособниками расстрелял и сжег 1050 чел.

Несколько дней валялись трупы убитых и полусожженных людей — полиция не давала хоронить. Партизаны приходили ночью и хоронили трупы на том месте, где они лежали.

На западной окраине дер. Кобылево (урочище Долина) комиссией была вскрыта могила, в которой обнаружено 6 трупов мирных жителей. Врачебной патологоанатомической экспертизой установлены и родственниками опознаны трупы 2 женщин и 4 детей. Из них: Голуб Марья в возрасте 60 лет, Голуб Матрена 30 лет и ее дети: Николай 9 лет, Нина 6 лет, Юля 5 лет и Мальвина 2 лет.

Кожа и мышцы погибших на всем протяжении представляют из себя сплошной обуглившийся слой. Переломы костей конечностей свидетельствуют об истязаниях и насилии. Череп Голуба Николая имеет пролом вследствие физического воздействия.

На северо-западной окраине дер. Кобылево (кладбище) в могиле обнаружено 9 трупов мирных жителей деревни. Из них 3 мужских, 3 женских и 3 детских. Среди них опознаны Емельянов Михаил 48 лет, Емельянова Мария 40 лет, их сын сельский учитель Емельянов Иван 19 лет, Емельянов Василий 16 лет, Емельянова Нина 5 лет, Емельянова Аксинья 60 лет, Сыч Анна 40 лет, Сыч Александр 12 лет и Сыч Юля 4 лет. На трупах имеются остатки обгорелой одежды. Все открытые места тела, в особенности лицо, руки, покрыты обуглившимся слоем. На отдельных трупах имеются следы огнестрельных ран от разрывных пуль.

На восточной окраине дер. Кобылево во вскрытой могиле обнаружено 16 трупов. В одном трупе (мужском) опознан Сыч Андрей Порфирьевич 20 лет; в трупе женском опознана Матрена Белая 36 лет. Остальные трупы представляют из себя отдельные человеческие органы, бесформенные и совершенно обуглившиеся.

Кроме этого, на месте дома Сыча Ивана Ефимовича в развалинах пожарища обнаружена масса обуглившихся человеческих костей: ребра, челюсти, кости верхних и нижних конечностей. В этом доме было сожжено и расстреляно 15 чел. мирных жителей деревни.

На месте дома колхозника Белого Федора, в котором сожжено 25 чел., и дома Луцко Онуфрия, в котором сожжено 20 чел. женщин, детей и стариков, обнаружены человеческие кости — следы зверской расправы гитлеровцев.

Конкретными виновниками фашистской расправы над мирными жителями дер. Кобылево являются:

1. Начальник жандармерии Василевичского района обер-лейтенант Кляузе.
2. Помощник начальника жандармерии Василевичского района Коваль.
3. Помощник начальника жандармерии Василевичского района Юзик.
4. Комендант Василевичской немецкой комендатуры Ионус.
5. Бургомистр Макановической волости Гуляй Николай Дмитриевич.
6. Начальник Макановической волостной полиции Лещенко Адам Евменович.
7. Староста дер. Кобылево Белый Евдоким Васильевич.

За все время немецкой оккупации указанными гитлеровцами и их пособниками из числа советских граждан в дер. Кобылево расстреляно и сожжено 1118 чел., из них до 200 мужчин, до 300 женщин и более 600 детей. Угнано в Германию 18 юношей и 22 девушки. Взято до 35 лошадей, 300 коров, 1 тыс. овец, 2 тыс. кур. Сожжено 276 домов. Разграблено имущество 266 семей.

Цветущая колхозная деревня превращена немецкими оккупантами в груды развалин, заросла бурьяном, покрылась сотнями могил, взывающих к мщению и священной борьбе советского народа против немецких извергов.

Комиссия: майор Ребров,
майор медицинской службы Копьев,
майор медицинской службы Мануйлов,
ст. лейтенант медицинской службы Анатьева,
председатель сельсовета дер. Кобылево Гайдаш, жители дер. Кобылево Кондратенко Ф. Г., Кондратенко А. Т.
ДАРФ, ф. 7 021, воп. 91, спр. 5, лл. 2—5. Арыгінал

Расказвае Павел Скакун з вёскі Кабылева (цяпер Першамайск)

«...У сорак трэцім годзе, чатырнаццатага мая, з самага ранку, прыехаў нямецкі карацельны атрад. Ну, я малы быў, дванаццаты год, я пра гэта нічога не разумеў... Яны акружылі вёску. Мы аралі, бацька, значыцца, і я быў — з быкамі: вадзіў. Бягуць немцы кругом і крычаць, каб мы беглі ў вёску. Нас штурханулі, і мы пайшлі ў вёску.

Прыходзім мы з бацькам у вёску, а там ужо тры немцы выцягнулі такія вось браўнеры, пісталеты і гоняць людзей па вёсцы.

Тут бацьку раз — забралі цяляты грузіць на вазы. А я пайшоў да мацеры. Нас усіх было чэцвера. Ішоў я, бачу, адна жанчына за хлеў уцякае, а немец яе раз — і забіў. А тут яны з матацыкламі... А тая старана вёскі гарыць. І гналі нас да таго перакрыжавання. Яны загналі на двор і рашылі раздзяліць. Як раздзялілі, значыцца, дык маці ў адзін бок пайшла, а я тут застаўся. Адна жанчына стала бегчы ў вароты, а я за ёю, дык яна на мяне: «Куды ты?!» Дык я не пайшоў за ёю, пабаяўся.

Пасля — у хату. Там адзін мужык, высокі такі, упёрся ў дзвярах і не пускае нікога, каб не заходзілі туды. А немец яму тым браўнерам па галаве. Ну, дзяваща няма куды, дык я паміж ног таму чалавеку і ў хату. Заходжу я туды, дык там поўна ўжо. Запалілі свечку на покуці — звычай такі ў вёсцы — сядзяць і нешта моляцца, хрысцяцца. А я нічога аб гэтым не панімаю.

Я стаў у кутку каля сценкі, бо я тут адзін; я гэтых людзей не ведаю. Ведаю, але мала.

Тут акно адно выбіта, і праз акно адна пакацілася сіненькая, як бульбіна, граната. Як лопне, значыцца, — параскідала! Каго раніла, каго так раскінула. Мяне толькі паветрам ударыла. Я ростам невялікі, дык яно, відаць, вышэй пайшло, ці што. Мяне аб сценку толькі ўдарыла, і я аглух... А потым з коміна сажа як пайшла — цёмна ў хаце! — нічога не відаць. Тыя пападалі, значыцца, бічкуюцца, б'юцца, поўзаюць, крычаць. Я бачу, што каля парога месца ёсць. А ў мяне была лахмаціна такая, дык я пайшоў ды лёг і ўкрыўся ёю.

Ляжу і чую: кок-кок-кок — ідзе. Ён ад мяне і пачаў. Бух, значыцца. Дык мне пуля во сюды. (Паказвае.) Тры разы чуў я, як бузнула. Шум у мяне ў галаве, нічога я не панімаю. Страляў ён там, страляў...

Аглух-то я аглух, ды не зусім, і вочы бачаць. Бачу — яны паселі, гавораць нешта. І смех там быў. Па-нямецку і па-руску — словы закідалі ўсякія. Тры чалавекі іх.

Потым як выходзілі, дык, відаць, смякнулі, што ўсе людзі — павыцяглыя, а я — напалавіну сагнуты быў. Дык ён як даў мне ў калена ботам ці бацінкам, дык ажно рассек калена. У іх жалеза на наску. Я ўжо як дохлы быў, я ўжо чакаў, што пуля шлёп — і па ўсім будзе. Яны нешта там буркнулі і пайшлі.

Запалілі яны хату адгэтуль, ад мяне. Страха саломенная была, а яны адгэтуль, ад дзвярэй, і запалілі. Сені пачалі гарэць, дзверы пачалі гарэць... Потым дзверы ўпалі на мяне — і мне ўжо горача, я ўжо гару. Я адтуль вылузаўся, а адгэтуль ужо круціць полымя, выганяе мяне. Я хацеў спачатку пад печку, але там валёнкі ўсялякія — там магу і згарэць. Дык я ў акно.

Выскачыў, а гэтыя немцы недалёка, метраў трыццаць. Яны, відаць, стаялі і наблюдалі. Я, значыцца, цераз гэтае акно, якое выбіта, куды яны кідалі гранату, перамахнуў і — там канаўка была невялікая — папоўз. Там пажарная стаяла, дык я за гэтую пажарную, а потым — у кусцікі.

Не даходзячы да моста, немец мяне заўважыў і — за мной. А на гэты бок дарогі беглі дзве пацанкі. Дык я пад масток, а тыя пацанкі далей. Ён іх убіў, яны пападалі, а я пад сваі і ляжаў — да самага вечара ў вадзе. Потым ішла цяжкая машына і чуць не прыдавіла мяне. Як цісканула на тыя сваі...

Калі яны нас пабілі, дык доўга сядзелі і гутарылі — мінут пятнаццаць-дваццаць. А потым выйшлі і запалілі хату.

Пытанне: — А пра што яны гаварылі? Вы чулі? Вы разумелі іх?

— Ды не. Там жа і павярнуцца няма дзе. Як павернешся трошкі, дык адразу пуля, яны ж гатовы на ўсё.

А людзі, каторыя недабітыя, дык яны і каўкаюць: каў-каў! А ён як пачуе — дык і напраўляе туды пулю...

Як я потым там падняўся, дык бачыў, як суседка ляжыць, гэтак во дзіця трымае. Скрыня нейкая, дык яна да скрыні во так прыперлася і сядзіць.

А мужык упёрся ў сцяну, і сын, гадоў пятнаццаць...»

Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік. «Я з вогненнай вёскі...». Мінск, «Мастацкая літаратура», 1983, стар. 138—140.

Расказвае Вольга Фамінічна Гайдаш з вёскі Кабылева (цяпер Першамайск)

«...Чатырнаццатага мая сорак трэцяга года немцы спалілі нашу вёску. Мужа майго ўзялі партызаны каўпакоўцы восенню сорак другога года, і два тыдні пасля гэтага мы пераехалі ў лес. За Каўпаком у нас пайшло чалавек восемдзесят. У лесе мы, партызанскія сем'і, сядзелі ўсю зіму. Пасля нам прыйшлі сказалі:

— Хто ў Каўпака, то вы не бойцеся — вас расстрэльваць не будуць.

Сказалі гэта нам свае людзі, а людзям гэтым — немцы. Ну, мы і папрыязджалі дадому. Я таксама ў лесе з канём была. Пераначавала я ў брата, а потым прыходзіць матка мая, свякруха, і кажа, што прыходзілі з паліцыі і казалі, каб я дома была заўтра, у дзесяць гадзін, і каб нікуды не ішла. Ну, мне страшна стала, што ганяюцца за мной. Я пабыла і зноў пайшла на сяло. Прыходжу з сяла ўжо ўвечары. Зарэзала аўцу. У лес уцякаць пачала зноў збірацца... Луплю тую аўцу ў адзінаццаць гадзін. Прыходзяць, стукаюць вечарам. Святла тады не было, капцілка. Яны пастукалі, я спалохалася, расцяралася. У мяне дзяцей было трое: сын з трыццаць пятага года і дочка з трыццаць сёмага, а меньшанькая — з трыццаць дзевятага. Тая сядзіць каля мяне, а мне дзецца недзе. Я баялася, бо яны ганяліся за адзежаю майго гаспадара: у яго былі боты хромавыя і кожанка. Забраць хацелі ад мяне. Страх мне стаў. А тут падпечча ў нас, дзе куры заганяюць. Свякруха пайшла адкрываць сенцы, а я пад тую печ, бо баялася. А дзеці большыя, што былі на печы, не ўбачылі, дзе я. А меншанькая сядзела. А матка:

— Вот была толькі што, а дзе дзелася, не ведаю.

Яна думала, што я за ёю выскачыла на двор, не бачыла, што я пад печ схавалася...

— Ну, дык скажы ёй, каб яна заўтра ў дзесяць была дома.

Яны паехалі, а я тады каня запрэгла, мяса тое, аўцу нелупленую, на воз і ў лес. Двое дзяцей са мной паехала, а меншанькая з бабай засталася. Матка не пусціла яе. Яна і так у лесе тым намерзлася. Назаўтра ў дзесяць гадзін яны прыехалі, забралі маці маю і дзіця. Яна яшчэ ім песенькі пела, дзіця тое... Чатыры гады дзевачцы было. І тут яе расстралялі разам з усімі. Трынаццаць душ тады забілі, старых жанчын і дзяцей...

А ў маі месяцы, трынаццатага, прыехалі да нас у лес і сказалі... Мы там у лесе сядзелі, стары араў, дык яны таго старога паклікалі і сказалі:

— Хто ў лесе сядзіць — аб'яві ім, каб ехалі дамоў, бо ў лесе пастраляем.

І па лесе яны пахадзілі, каго захапілі ў куранёх, пастралялі — дзяцей малых і старых. Людзі перапалохаліся: сабраліся ўсе, паехалі ў вёску, ноччу. Проста як абоз ішоў з таго лесу. Уранні прыйшлі дадому. Прыйшла я да суседа, ён друг наш быў, і пытаюся:

— Што будзем, Брэль, рабіць?

А ён кажа:

— Хто куды хоча, а мая сям'я нявінная, не буду я адвячаць за каго-та.

Яго з сям'ёй тады забралі: і ён, і дзеткі яго ўсе пагарэлі.

Ну, сталі гнаць худобу, цяляты. Людзей пазганялі. Тут адна старая засталася, таксама партызанская сям'я. Яна з сяла прыбегла сюды на наш канец. Халіха гэтая. Я пытаюся:

— Цётка, партызанскія сем'і зганяюць асобна ці ўсіх людзей разам?

А яна гаворыць:

— Усіх зганяюць у сараі, у хаты, хто партызанская сям'я, а хто і не партызанская.

Ну, я стаю з дзецьмі, на вуліцы. Каля хаты свае, каля дзвярэй стаю. Прагналі яны адну кучу, прагналі другую. Сястры маёй дачка была ў Германіі, дык сястра пісьмы дзяржыць, а я ў яе пытаюся:

— Куды ты, Тацяна, пойдзеш?

А яна кажа:

— Ты хавайся, а я пайду туды: у мяне пісьмо е, дык мо ў Германію мяне забяруць?

Дочка яе была ў Германіі, а дзве дома былі, а сын быў у партызанах. Яна думала, што яе пісьмы тыя спасуць. Іх там у хаты пазаганялі, а я дзе стаяла,— стаю, чакаю. У мяне вось такая думка была: узяла і выпіла я добра і думаю, каб білі нас у хаду. І дзяцей так настрапаліла:

— Сынок і донька, будзем уцякаць, што б білі нас, а не так.

Немцы цялят вязуць па вуліцы, а потым толькі ўтрох ідуць і жанчын гоняць, бабулек. Адзін, такі малады, відна, чысты немец. Падыходзіць да мяне. А мой пацан... Шапка на ём — шлём такі быў, пуп зверху. Краснаармейская. Дык немец за той пуп узяў, шапку падняў над галавой, потым зноў надзеў. Ручка хлопчыкава ў мяне ў гэтай руцэ, а дочкі — у гэтай. Немец яму зноў зняў і зноў надзеў шапку. А тады трэці раз яго вось так пад паху падхапіў і падняў. І мне вот здаецца, што ён кіне і заб'е яго. Паставіў. Зноў тую шапку падняў і зноў апусціў. Дык я тады кажу:

— Пан, я пайду рабёнка свайго вазьму.

У мяне ўжо тады рабёнка не было, але мне так на вум узбегла. Дык ён засмяяўся і кажа:

— Ідзі!

Сам сабраўся і пайшоў. Дык мы ў двор свой. Ну, у хату зайшлі — няма чаго браць. А я думала, што ён сцеражэ і ўб'е нас. Кошка была з кацянятамі за печкай. Я тую кошку з кацянятамі ўкруціла ў хустку і выношу на двор. Гэты мой сын паглядзеў і кажа:

— Мама, ужо няма нікога, паехалі. Давай астрагу паставім у калодзеж і пахаваемся.

Паставілі мы астрагу, улезлі дзеці, і я ўлезла, і так мяне відна.

— Не, так мы прападзем, дзеці!

Выскачылі мы на агарод. Там у нас бліндаж быў. Але ў тым бліндажы ўжо суседка сядзіць, чатыры душы. І тут яшчэ жанчына бяжыць з дзеткамі, у яе маленькае дзіцятка. І тая — туды. Сталі крычаць тыя дзеці. Ну, мы і вылезлі адтуль. Вылезла я са сваімі дзецьмі, ажно бачу — бягуць за гэтаю жанчынаю ўдагонь, утрох. Немцы. Бягуць,— ну, мне ўжо некуды дзецца. Я ў разору вось так. І дзеці мае ў разору паміж градамі пападалі. Яны ў той бліндаж, выгналі тую жанчыну. Дзве дочкі ў яе; і была там жанчына чужая. Збілі іх і пагналі ў вёску. А ў вёсцы ўжо стогне зямля, гарыць, крычаць!.. Так усё прама — ажно сумна ляжаць. Той хлопчык уцёк назад у бліндаж, думаў, што я ў бліндажы. І суседа другога ўцёк. Ну, яны ў бліндаж не палезлі, бо я ім сказала, каб ішлі ў разору, бо з бліндажа павыганяюць. Яны ў разоры палеглі. Маіх двое і я. Усіх пяць нас у разоры. Перабеглі цераз нас. І кошка ж тая з кацянятамі ляжыць каля мяне, і кукла, што я сабіралася ў Германію. Яечкі, сала кусок і хлеба луста. Яны тую маю куклу нагой кашканулі і, значыцца, пабеглі. Я сама сабе думаю: «Ці яны падумалі, што мы бітыя?» Яны прабеглі. Потым зноўку бягуць, хаты паляць, хлявы ўжо, сараі нашыя. Гарыць ужо дзярэўня. Ужо дым. Тут у мяне ў галавах стог саломы стаіць, і я ўжо расцяралася, як ён стаў тую салому паліць зажыгалкай... На

мне тая тужурка-кожанка і боты хромавыя, бо падумала я, што згару сама і ўсё на мне згарыць. Я расцяралася, а дзеці спяць — мае двое і чужыя. Мае рукі во так пазакладаныя за галаву былі, дык рука ўпала. Ён на маю руку стаў, перайшоў... І сабраліся яны, пайшлі. Салому запалілі. А дзеці ляжаць — пазасыналі. Толькі ўжо як салома загарэлася, і хлеў наш загарэўся, і полымя стала прыпякаць — дзеці гараць: і рубашкі на іх, і косы гараць. Мой ужо ўвесь абгарэў хлопчык, крычыць:

— Ой, мама! Я не магу ўжо ляжаць!

— Ляжы!

А тут шляшок, во гэта вулачка наша каля школы. Мы туды павярнулі, дык па нас б'юць, страляюць, пулі сыплюцца, як боб. Мы зноў там ляжалі, гэты мой хлопец устаў... Тут такія копчыкі каля нас, дык я іх туды папераносіла. Ужо сонца заходзіла. Вечар. Ціхі такі. Шулы стаяць — гараць, а мне ўсё здаецца, што гэта немцы стаяць. Папераходзіла я сюды, а тут у меня на дварэ конь стаіць. Толькі сухары ўкраты ў мяне з возу.

Я ўжо тады, увечары, пайшла шукаць, хто ў лесе застаўся жывы...

Хлопчыку майму было восем, а дзяўчынцы шэсць, сёмы год. А меншанькую расстралялі, я вам казала.

Што яна ім спявала, дык гэта чула жанчына, суседка. Яна была, бачыла, як свякруха мая і на воз садзілася і прашчалася. А меншанькая, чатыры годзікі было, сказала:

— Дзядзі, не бярыце мяне з бабуляй, я вам спяю тую песеньку, каторая «Пасею гурочкі».

Яна спела ім, стоячы на акне, і яны яе забралі і застрэлілі...»

Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік. «Я з вогненнай вёскі...».Мінск, «Мастацкая літаратура», 1983, стар. 257—261.

Жыхары вёскі расстраляны і закатаваны 14.5.1943.

БЕЛАЯ Агафія, 50 гадоў.

БЕЛАЯ Марыя Фёдараўна, 40 гадоў.

БЕЛАЯ Матруна, 36 гадоў, расстраляна 14.5.1943.

БЕЛАЯ Соф'я Кузьмінічна, 15 гадоў.

БЕЛЫ Васіль Васільевіч, 16 гадоў.

БЕЛЫ Васіль Васільевіч, 17 гадоў.

БЕЛЫ Кузьма, 50 гадоў.

БЕЛЫ Сцяпан, 14 гадоў.

БЛІЗНЕЦ Іван Якаўлевіч, расстраляны зімой 1943 разам з сям'ёй.

БРЭЛЬ Ганна, 60 гадоў.

БРЭЛЬ Іван Рыгоравіч, 14 гадоў.

БРЭЛЬ Рыгор Данілавіч, 60 гадоў.

ГОЛУБ Марыя, 60 гадоў.

ГОЛУБ Матруна, 30 гадоў, дзеці: сын **Мікалай,** 9 гадоў, дочкі — **Ніна,** 6 гадоў, **Юля,** 5 гадоў, **Мальвіна,** якой было 2 гады.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Аксіння, 60 гадоў.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Алена Фёдараўна, н. у 1921.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Васіль, 16 гадоў.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Вольга Фёдараўна, н. у 1912.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Іван Міхайлавіч, 19 гадоў.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Марыя Рыгораўна, 40 гадоў.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Міхаіл Піліпавіч, расстраляны зімой 1943 разам з сям'ёй.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Міхаіл, 48 гадоў.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Ніна, 5 гадоў.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Паліна Рыгораўна, 6 месяцаў.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Пелагея Іванаўна, н. у 1891.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Рыгор Фёдаравіч, н. у 1880.

ЕМЯЛЬЯНЕНКА Фёдар Фёдаравіч, н. у 1891.

КАНДРАЦЕНКА Ксенія Мікітаўна, н. у 1912.

КАНДРАЦЕНКА Міхаіл Міхайлавіч, 5 гадоў.

КАНДРАЦЕНКА Юлія Міхайлаўна, 7 гадоў.

ЛОБАН Адам.

ЛУЦКО Ануфрый Яўціхіевіч, 55 гадоў.

ЛУЦКО Васіль Якаўлевіч, 35 гадоў.

ЛУЦКО Вольга Сцяпанаўна, 16 гадоў.

ЛУЦКО Дзмітрый Якаўлевіч, 60 гадоў.

ЛУЦКО Іван Васільевіч, н. у 1924.

ЛУЦКО Канстанцін Васільевіч, н. у 1922.

ЛУЦКО Марыя Міхайлаўна, 65 гадоў.

ЛУЦКО Павел Мікітавіч, 12 гадоў.

ЛУЦКО Праскоўя Дзмітрыеўна, 60 гадоў.

ЛУЦКО Праскоўя Майсееўна, 35 гадоў.

ЛУЦКО Рыгор, 70 гадоў.

ЛУЦКО Яфім Яўціхіевіч, 40 гадоў.

СКАКУН Аляксандр Паўлавіч, 7 гадоў.

СКАКУН Ганна Паўлаўна, 10 гадоў.

СКАКУН Ганна Сцяпанаўна, 35 гадоў.

СКАКУН Міхаіл Якаўлевіч, 65 гадоў.

СКАКУН Ніна Емяльянаўна, н. у 1939—1940.

СКАКУН Павел Мікітавіч, 35 гадоў.

СКАКУН Паліна (Пелагея) Данілаўна, н. у 1910.

СОПАТ Матруна, 50 гадоў.

СОПАТ Савелій, 50 гадоў.

СЫЧ Аляксандр, 12 гадоў.

СЫЧ Андрэй Парфіравіч, 20 гадоў.

СЫЧ Галіна, 40 гадоў.

СЫЧ Сцяпан Фёдаравіч, расстраляны зімой 1943 разам з сям'ёй.

СЫЧ Юлія, 4 гады.

ФІЛІМОНЕНКА Усціння, расстраляна разам з дзецьмі.

Увогуле, за час Вялікай Айчыннай вайны ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іхніх памагатых з ліку мясцовых здраднікаў загінулі каля 1,3 тысячы мірных жыхароў в. Першамайск (Кабылева). На жаль, прозвішчы пераважнай большасці ахвяраў фашысцкага тэрору ўстанавіць не ўдалося.

ЛІСКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРЫНКІ

Да вайны ў ёй было 315 двароў, 1050 жыхароў.

Вёску Крынкі фашысты і паліцаі палілі двойчы. Першы раз — у жніўні 1942. Тады была знішчана вуліца Мохавая, расстраляны і спалены ў агні 52 яе жыхары.

У другі раз фашысты акружылі Крынкі ў снежні таго ж 1942-га. Жудасную расправу распачалі з вуліцы Красная. У вёсцы не ацалела ні адна будыніна. Агонь знішчыў усё. Ад куль карнікаў і ў агні загінулі яшчэ каля васьмідзесяці чалавек. Многія — цэлымі сем'ямі...

Гэтак гітлераўцы адпомсцілі Крынкам за тое, што на чыгунцы, паблізу вёскі, раз-пораз узляталі ў паветра ад партызанскіх мінаў іхнія цягнікі, якія ішлі да лініі фронту.

Вуліцу назвалі партызанскай

На ўскраіне вёскі Крынкі знаходзіцца невялічкая вуліца, якая раней звалася Мохавай. У даваенны перыяд тут стаяла 21 хата. Усе жыхары Мохавай былі надзвычай дружнымі. Як бы душою вуліцы быў Юрка Ярушэвіч — адмысловы музыка-гарманіст.

Калі пачалася Вялікая Айчынная, шмат хто з вуліцы Мохавай выправіўся на фронт, каб са зброяй у руках бараніць Айчыну ад ворага. Тыя ж, каторыя засталіся дома, спадзяваліся, што гітлераўцы неўзабаве будуць спынены і пакоцяцца назад. На жаль, рэчаіснасць стала іншай. У другой палове жніўня 1941-га чужынцы з'явіліся і ў Крынках. Яны ўзяліся за ўстанаўленне «новага парадку». У гэты час Васілевіцкі падпольны райкам партыі разгарнуў работу па арганізацыі барацьбы з фашысцкай нечысцю. Значная частка жыхароў вёскі Крынкі, у тым ліку і вуліцы Мохавая, уступіла ў партызанскія атрады, многія сталі сувязнымі. Вяскоўцы аказвалі народным мсціўцам усялякую дапамогу: адзеннем, харчаваннем, зброяй.

У 1942 годзе Гітлер кідаў на фронт усё новыя і новыя рэзервы. Па чыгунцы ішлі эшалоны з жывой сілай і тэхнікай. Але далёка не ўсе яны прыбывалі да месца прызначэння. Фактычна, не было ніводнага тыдня, каб не адбыўся выбух то ў адным, то ў другім месцы паміж станцыямі Бабічы — Дземяхі. Вось і 21 жніўня 1942 года каля Піркавай будкі ў выніку ўдала падкладзенай партызанамі міны пад адхон пайшоў варожы цягнік. Фашысты вырашылі расправіцца з партызанамі. Карны атрад рушыў у Крынкаўскія лясы.

А ў гэты дзень некалькі жанчын з Мохавай сабраліся да партызан. Сяброўкі Маша Іовенка, Макрына Блізнец ды Саша Кіпіч неслі ў лес гарачыя абеды. Хаця і не было з чаго гатаваць, але таго-сяго назбіралі: аладак, шчаўя, скавароднікаў.

Па дарозе жанчыны завярнулі да вёскі Васількова. Тут яны разлічвалі змалоць паўпуда ячменю. Але каля лясной стражы сяброўак перастрэлі карнікі. «Для каго пяць лыжак?» — спытаў фашысцкі афіцэр у жанчын. Тыя растлумачылі: маўляў, ежу нясём падзённікам, якія ў лесе на паляне павінны палоць проса.

Карнікі выправілі групу, каб удасканаліцца, ці сапраўды арыштаваныя нясуць абед пяці падзённікам. Неўзабаве высветлілі: жыта полюць толькі двое...

Перапалоханых жанчын карнікі шпурнулі ў машыну, павезлі ў Крынкі. Там, на роднай Мохавай вуліцы, сагналі ў светлы дом Васіля Ярушэвіча ўсіх яе насельнікаў і пачалі дапытваць, дзе хаваюцца партызаны. Але людзі маўчалі.

Азвярэлыя карнікі падпалілі хату, поўную няшчасных. Лямант і крыкі жанчын і дзяцей разнесліся па Мохавай уперамешку са стралянінай.

Чорныя клубы дыму і агонь шуганулі вышэй дрэў. Той, хто кінуўся ратавацца, быў забіты на месцы. Усе астатнія згарэлі...

Агонь сціх. Не стала ні вуліцы, ні людзей на ёй. Карнікі пагрузілі нарабаваную маёмасць і пакінулі Крынкі.

Як высветлілася неўзабаве, некалькі чалавек цудам уратаваліся. Коцур Віктар, якому было ўсяго некалькі месяцаў, ляжаў у спавіточку на гародзе... Састарэлы Ахрэм Еўдакімавіч Коцур, дзве бабы — Ганна Мікітаўна Блізнец і Праскоўя Гаўрылаўна Коцур, глуханямы Яўдак Ахрэмавіч Коцур... Вось тыя людзі з Мохавай, каторыя засталіся ў жудасны дзень жывымі.

Назаўтра пачалося пахаванне. Прыйшлі не толькі свае — крынкаўцы, а і з іншых вёсак. Убачылі трагедыю Мохавай. Выкапалі яму ды пахавалі сваіх землякоў на вечны спакой.

Але не сціхлі выбухі мін на чыгунцы. Наадварот. Такім чынам партызаны помсцілі ворагу за смерць родных і блізкіх.

Зараз вуліца Мохавая носіць назву Партызанская. Яна яе аплаціла страшэннай цаной.

Л. Астапенка

З успамінаў Аляксандра Сцяпанавіча Коцура, ветэрана вайны і працы, жыхара в. Крынкі

...Цалкам Крынкі былі спалены ў снежні 1942-га. Тым месяцам, 18-га чысла, на міне падарваўся яшчэ адзін цягнік з жывой сілай і тэхнікай, што сунуўся на фронт. Здарылася тое ноччу. А праз некалькі гадзін усё і пачалося...

— Уставай, сынок! — тармусіла мяне маці. — Немцы тутака. Паляць ужэ...

Усхапіўся на ногі. У хаце было відна, бо некалькі хат ад краю нашай вуліцы Краснай ужо ахапіў агонь.

Выбег на вуліцу. Тут жа пачуў стрэлы, крыкі немцаў і паліцаяў. Хуценька завярнуў назад. Разам з маці і дзвюма малодшымі сёстрамі пачаў выносіць на двор адзенне.

Але ў суседніх дамах ужо зазвінелі разбітыя карнікамі шыбы. Каля іх таксама ўспыхнулі факелы...

І тады мы кінуліся гародамі ў лес. У канцы іх, ля выратавальнага хмызняку, мы супыніліся. Убачылі, як полымя ахапіла і наш двор. Найперш пачаў гарэць хлеў...

Неўзабаве адчуў: холад скаваў падэшвы. Аказваецца, я надзеў боты на голыя ногі...

...Паліць Крынкі карнікі распачалі недзе ў тры гадзіны ночы, а да двух дня ўсё было скончана. Ад Крынак засталіся толькі коміны. Чорныя, бы здані...

Вярнуўшыся на сваё падворышча, мы дарэмна шукалі хаця б рэшткі галоўнага набытка сям'і — шавецкай нажной машынкі. Напэўна, яе прыхапіў нехта з паліцаяў.

Першай ахвярай, якую я ўбачыў на вуліцы, быў стары Аляксей Блізнец. Смерць ён прыняў, прастрэлены, ля свае хаты. А калі яна гарэла, то напалову абгарэў, мёртвы ўжо, і гаспадар святліцы...

Пераважная большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе «Піянер».

БЛІЗНЕЦ Алена Аляксееўна, загінула ў 1942.

БЛІЗНЕЦ Алена Фёдараўна, н. у 1908, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Аляксандр Гардзеевіч, н. у 1876, расстраляны.

БЛІЗНЕЦ Аляксандр Герасімавіч, н. у 1916, расстраляны.

БЛІЗНЕЦ Аляксандра Фёдараўна, н. у 1936, спалена.

БЛІЗНЕЦ Аляксей Барысавіч, н. у 1903, расстраляны. Ягоныя дзеці: сыны — **Аляксандр,** 1932 г. н., **Леанід,** 1934 г. н., дачка **Таццяна,** 1927 г. н.

БЛІЗНЕЦ Аляксей Прохаравіч.

БЛІЗНЕЦ Антон Кірылавіч (Кірэевіч), н. у 1881, расстраляны.

БЛІЗНЕЦ Валянціна Максімаўна, н. у 1932, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Васіліса Іванаўна, н. у 1870, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Вольга Іванаўна, н. у 1921, спалена.

БЛІЗНЕЦ Вольга Іванаўна (дзіцё).

БЛІЗНЕЦ Ганна Восіпаўна, н. у 1913, спалена ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Ганна Дзмітрыеўна, н. у 1912, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Дзмітрый Архіпавіч.

БЛІЗНЕЦ Дзмітрый Фёдаравіч.

БЛІЗНЕЦ Іван Архіпавіч, н. у 1910, расстраляны ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Іван Прохаравіч.

БЛІЗНЕЦ Іван Трафімавіч.

БЛІЗНЕЦ Іван Ціханавіч.

БЛІЗНЕЦ Ірына Мікалаеўна, н. у 1929, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Карп Іовіч.

БЛІЗНЕЦ Кацярына Цярэнцьеўна (дзіцё), загінула ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Лідзія Аляксееўна (дзіцё), загінула ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Лідзія Сямёнаўна, н. у 1935, спалена ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Макрына Сямёнаўна, н. у 1884, спалена ў жніўні 1942.

БЛІЗНЕЦ Марыя Фёдараўна.

БЛІЗНЕЦ Матруна Сямёнаўна, н. у 1893, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Мікіта Іванавіч, расстраляны.

БЛІЗНЕЦ Міхаіл Мацвеевіч, на фронце з 1941, быў у фашысцкім палоне, але яго адпусцілі дамоў. Загінуў у 1942, калі немцы бамбілі Крынкі.

БЛІЗНЕЦ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1925, расстраляны.

БЛІЗНЕЦ Міхаіл Трафімавіч.

БЛІЗНЕЦ Надзея Уладзіміраўна.

БЛІЗНЕЦ Ніна Максімаўна, н. у 1941, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Ніна.

БЛІЗНЕЦ Павел Мікалаевіч, н. у 1941, спалены ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Пелагея Фёдараўна, н. у 1904, павешана.

БЛІЗНЕЦ Раіса Максімаўна, н. у 1930, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Сцяпан Адамавіч, н. у 1876, расстраляны ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Сцяпан Усцінавіч, н. у 1884, расстраляны ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Сямён Архіпавіч.

БЛІЗНЕЦ Ульяна Антонаўна, н. у 1884, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Ульяна Францаўна, н. у 1870, расстраляна.

БЛІЗНЕЦ Фёдар Іванавіч, спалены ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Фёкла Фёдараўна, н. у 1941, спалена ў снежні 1942.

БЛІЗНЕЦ Харытон.

БЛІЗНЕЦ ... Раманавіч (дзіцё).

БЛІЗНЕЦ ... Раманаўна (дзіцё).

БЛІЗНЕЦ ... Фядосавіч (дзіцё).

БЛІЗНЕЦ ... Фядосаўна (дзіцё).

ВАСІЛЕНКА Варвара Ісакаўна, 45 гадоў, спалена.

ГВОЗДЗЬ Агаф'я Ігнатаўна, н. у 1908, спалена.

ГВОЗДЗЬ Марыя Рыгораўна, н. у 1935, спалена.

ГВОЗДЗЬ Надзея Рыгораўна (дзіцё).

ГВОЗДЗЬ Таццяна Рыгораўна (дзіцё).

ГРЫБ Андрэй Андрэевіч.

ГРЫБ Дзмітрый Мацвеевіч, н. у 1890, расстраляны.

ГРЫБ Іван Андрэевіч.

ГРЫБ Малання Іванаўна, н. у 1888, расстраляна.

ГРЫБ Малання Прохараўна.

ГРЫБ Матруна Андрэеўна.

ГРЫБ Міхаіл Ануфрыевіч, н. у 1894, спалены.

ГРЫБ Міхаіл Васільевіч, н. у 1923, расстраляны.

ГРЫБ Міхаіл Васільевіч (дзіцё).

ГРЫБ Міхаіл Дзмітрыевіч, н. у 1928, расстраляны.

ГРЫБ Міхаіл Нічыпаравіч, н. у 1913, спалены.

ГРЫБ Наталля Іванаўна.

ГРЫБ Нічыпар Ануфрыевіч.

ГРЫБ Пятро.

ГРЫБ Пятро Мацвеевіч.

ГРЫБ Пятро Цярэнцьевіч, н. у 1876, расстраляны.

ГРЫБ Фёдар Іванавіч.

ГРЫБ Юрый Васільевіч, н. у 1870, спалены.

ЗАХОЖАЯ Ульяна.

ЗАХОЖЫ Мікалай Антонавіч, н. у 1940, спалены.

ЗАХОЖЫ Міхаіл Антонавіч, н. у 1942, спалены.

ІОВЕНКА Васіль Васільевіч.

ІОВЕНКА Дзяніс.

ІОВЕНКА Іван.

ІОВЕНКА Марыя Фёдараўна, н. у 1909, спалена ў жніўні 1942.

КАЗЛОЎСКАЯ Матруна, н. у 1904, расстраляна.

КІШЧ Настасся (Аляксандра) Іванаўна, н. у 1908, спалена ў жніўні 1942. Яе дзеці: дочкі — **Ліда,** 1936 г. н., **Тамара,** 1938 г. н., сын **Міхаіл,** 1940 г. н.

КІШЧ Рыгор.

КЛЕШЧАНКА Варвара (Вера) Ісакаўна, н. у 1908, спалена.

КЛЕШЧАНКА Ева Піліпаўна, н. у 1884, спалена.

КЛЕШЧАНКА Еўдакія Андрэеўна, н. у 1928, спалена.

КЛЕШЧАНКА Ісак Фёдаравіч, н. у 1864, расстраляны.

КЛЕШЧАНКА Марыя Андрэеўна, н. у 1922, спалена.

КЛЕШЧАНКА Мікалай Рыгоравіч, н. у 1924, расстраляны.

КЛЕШЧАНКА Надзея Андрэеўна, н. у 1929, спалена.

КЛЕШЧАНКА Рыгор Цітавіч, н. у 1886, расстраляны.

КЛЕШЧАНКА Хрысціна Кірылаўна (Кірэеўна), н. у 1894, расстраляна.

КОЦУР Акуліна Аляксееўна, н. у 1913, расстраляна.

КОЦУР Алена Майсееўна (дзіцё).

КОЦУР Аляксандр Андрэевіч (дзіцё).

КОЦУР Аляксандр Дзмітрыевіч.

КОЦУР Аляксандр Дзянісавіч, н. у 1929, спалены.

КОЦУР Аляксандр Іванавіч, н. у 1930, расстраляны.

КОЦУР Аляксандр Макаравіч.

КОЦУР Аляксандра Іванаўна, н. у 1914, спалена.

КОЦУР Аляксандра Маркаўна, н. у 1924, спалена.

КОЦУР Аляксандра Міхайлаўна, н. у 1923, спалена.

КОЦУР Аляксей Аляксеевіч (дзіцё).

КОЦУР Аляксей Барысавіч.

КОЦУР Аляксей Дзям'янавіч (Дзёмкавіч) (дзіцё).

КОЦУР Аляксей Міхайлавіч (дзіцё).

КОЦУР Аляксей Сцяпанавіч.

КОЦУР Анатоль Аляксеевіч, н. у 1941, спалены.

КОЦУР Андрэй Ігнатавіч.

КОЦУР Валянціна Максімаўна (дзіцё).

КОЦУР Валянціна Пятроўна, н. у 1932, спалена.

КОЦУР Варвара Сцяпанаўна, н. у 1899, расстраляна.

КОЦУР Васіль Аляксеевіч, н. у 1937, спалены ў снежні 1942.

КОЦУР Васіль Майсеевіч, н. у 1933, расстраляны.

КОЦУР Васіль Пятровіч, н. у 1940, спалены.

КОЦУР Васіль Цярэнцьевіч.

КОЦУР Васіль Якаўлевіч.

КОЦУР Вера Віктараўна, н. у 1931, спалена.

КОЦУР Вера Дзмітрыеўна, н. у 1920, спалена.

КОЦУР Віктар Дзмітрыевіч, н. у 1935, спалены.

КОЦУР Віктар Кузьміч, н. у 1880, спалены.

КОЦУР Віктар Мікалаевіч, н. у 1936, спалены.

КОЦУР Вольга Пятроўна (дзіцё).

КОЦУР Вольга Юр'еўна, н. у 1922, спалена ў снежні 1942.

КОЦУР Вольга Якаўлеўна.

КОЦУР Галіна Восіпаўна.

КОЦУР Ганна Восіпаўна, н. у 1909, расстраляна.
КОЦУР Ганна Іванаўна (дзіцё).
КОЦУР Ганна Прохараўна.
КОЦУР Ганна Пятроўна (дзіцё).
КОЦУР Дар'я Юр'еўна, н. у 1918, спалена.
КОЦУР Дзмітрый Кузьміч.
КОЦУР Дзмітрый Міхайлавіч (дзіцё).
КОЦУР Дзмітрый Паўлавіч.
КОЦУР Дзмітрый Савельевіч, н. у 1908, расстраляны.
КОЦУР Дзмітрый Фёдаравіч, н. у 1870, спалены.
КОЦУР Дзям'ян Юр'евіч, н. у 1909, спалены.
КОЦУР Ева Сцяпанаўна, н. у 1884, спалена ў снежні 1942.
КОЦУР Еўдакім Міхайлавіч.
КОЦУР Еўдакія Андрэеўна (дзіцё).
КОЦУР Еўдакія Дзмітрыеўна, н. у 1894, расстраляна.
КОЦУР Еўдакія Міхайлаўна, н. у 1921, расстраляна ў снежні 1942.
КОЦУР Іван Адамавіч.
КОЦУР Іван Аляксеевіч.
КОЦУР Іван Дзянісавіч, н. у 1938, спалены ў снежні 1942.
КОЦУР Іван Прохаравіч.
КОЦУР Іван Пятровіч, н. у 1937, спалены ў снежні 1942.
КОЦУР Іван Сцяпанавіч.
КОЦУР Кацярына Міхайлаўна, н. у 1927, спалена.
КОЦУР Кацярына Рыгораўна, н. у 1924, спалена.
КОЦУР Ксенія Фёдараўна, н. у 1910, спалена.
КОЦУР Лідзія Васільеўна (дзіцё).
КОЦУР Лідзія Гаўрылаўна (дзіцё).
КОЦУР Лукер'я (Лёкса) Іванаўна.
КОЦУР Лукер'я (Лёкса) Мікітаўна.
КОЦУР Майсей Аляксандравіч, н. у 1900, расстраляны.
КОЦУР Майсей Аляксеевіч.
КОЦУР Макрына Сямёнаўна, расстраляна.
КОЦУР Марк Іванавіч.
КОЦУР Марк Кузьміч.
КОЦУР Марк Трафімавіч, н. у 1901, расстраляны.
КОЦУР Марыя Андрэеўна, н. у 1926, спалена ў снежні 1942.
КОЦУР Марыя Гаўрылаўна, н. у 1932, спалена ў снежні 1942.
КОЦУР Марыя Дзмітрыеўна (дзіцё).
КОЦУР Марыя Іванаўна, н. у 1941, расстраляна ў снежні 1942.
КОЦУР Марыя Мікалаеўна, н. у 1936, расстраляна ў снежні 1942.
КОЦУР Марыя Мінаўна.
КОЦУР Марыя Рыгораўна.
КОЦУР Матруна Мінаўна.
КОЦУР Мікалай Ануфрыевіч.
КОЦУР Мікалай Віктаравіч (дзіцё).
КОЦУР Мікалай Гаўрылавіч, н. у 1887, спалены ў снежні 1942.
КОЦУР Мікалай Гаўрылавіч (дзіцё).
КОЦУР Мікалай Мікалаевіч, н. у 1940, расстраляны ў снежні 1942.
КОЦУР Мікалай Яфрэмавіч.
КОЦУР Міхаіл Андрэевіч.
КОЦУР Міхаіл Апанасавіч.
КОЦУР Міхаіл Васільевіч (дзіцё).
КОЦУР Міхаіл Дзмітрыевіч (дзіцё).
КОЦУР Міхаіл Елісеевіч.
КОЦУР Міхаіл Піліпавіч, н. у 1928, спалены ў снежні 1942.
КОЦУР Міхаіл Пятровіч, н. у 1935, спалены ў снежні 1942.
КОЦУР Міхей Ільіч, н. у 1876, расстраляны ў снежні 1942.
КОЦУР Надзея Аляксееўна, н. у 1935, спалена ў снежні 1942.
КОЦУР Надзея Андрэеўна (дзіцё).
КОЦУР Надзея Майсееўна, н. у 1929, расстраляна.
КОЦУР Надзея Рыгораўна, н. у 1933, спалена ў снежні 1942.
КОЦУР Настасся (Нюся) Іванаўна, н. у 1934, расстраляна.
КОЦУР Ніна Аляксандраўна (дзіцё).
КОЦУР Ніна Аляксееўна (дзіцё).
КОЦУР Павел Мікалаевіч (дзіцё).
КОЦУР Павел Мінавіч (дзіцё).
КОЦУР Пелагея Паўлаўна, н. у 1912, расстраляна.
КОЦУР Пётр Сілавіч, н. у 1939, спалены ў снежні 1942.
КОЦУР Праскоўя Васільеўна.
КОЦУР Праскоўя Майсееўна, н. у 1910, спалена ў снежні 1942.
КОЦУР Раіса Дзянісаўна, н. у 1936, загінула ў снежні 1942.
КОЦУР Раіса Максімаўна (дзіцё).
КОЦУР Рыгор Адамавіч.
КОЦУР Рыгор Андрэевіч.
КОЦУР Рыгор Іванавіч, н. у 1936, расстраляны ў снежні 1942.
КОЦУР Рыгор Навумавіч.
КОЦУР Рыгор Рыгоравіч, н. у 1933, спалены.
КОЦУР Рыгор Фёдаравіч, н. у 1874, спалены.
КОЦУР Соф'я.
КОЦУР Сцяпан Усцінавіч.
КОЦУР Сямён Дзмітрыевіч (дзіцё).
КОЦУР Тамара Дзмітрыеўна (дзіцё).
КОЦУР Тамара Майсееўна, н. у 1938, расстраляна.
КОЦУР Тарас Сцяпанавіч, н. у 1866, спалены.
КОЦУР Таццяна Васільеўна, н. у 1912, спалена.
КОЦУР Таццяна Васільеўна (дзіцё).
КОЦУР Таццяна Максімаўна (дзіцё).
КОЦУР Таццяна Фёдараўна.

КОЦУР Таццяна Юр'еўна, н. у 1882, спалена ў снежні 1942.

КОЦУР Трафім Іванавіч.

КОЦУР Уладзімір Дзмітрыевіч, партызан, загінуў.

КОЦУР Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1938, расстраляны.

КОЦУР Фёдар Міхайлавіч.

КОЦУР Фёдар Нічыпаравіч, н. у 1874, спалены.

КОЦУР Фёдар Пятровіч.

КОЦУР Фёкла Рыгораўна, н. у 1894, спалена.

КОЦУР Фёкла Фёдараўна, н. у 1941, спалена.

КОЦУР Фядора Міхайлаўна, н. у 1898, расстраляна.

КОЦУР Фядосся Дзмітрыеўна, н. у 1900, расстраляна.

КОЦУР Хрысціна Адамаўна, н. у 1904, спалена.

КОЦУР Юрый Нічыпаравіч.

КОЦУР Якаў Макаравіч.

КОЦУР Яўгенія Мікалаеўна.

КОЦУР Яўгенія Міхайлаўна, н. у 1890, спалена.

КОЦУР Яўмен Яфрэмавіч.

КОЦУР Яўсей Ільіч, н. у 1882, спалены ў снежні 1942.

КОЦУР Яўсей Сцяпанавіч.

КОЦУР Яфрэм Дзям'янавіч.

КОЦУР ... Аляксееўна (дзіцё).

ЛУГОЎСКАЯ Соф'я Якаўлеўна, н. у 1915, працавала настаўніцай, расстраляна. Разам з маці загінулі трое дзяцей: сыны **Анатоль** і **Леанід.** На жаль, як звалі трэцяе дзіцё — устанавіць не ўдалося.

ПАТАРОЧА Пракоп Васільевіч, н. у 1881, расстраляны. Разам з бацькам загінулі сыны: **Васіль,** 1924 г. н., **Іван,** 1922 г. н. Як згадваюць некаторыя жыхары Крынак, у П. В. Патарочы быў яшчэ сын — **Міхаіл.** Ён таксама расстраляны.

ПЕЎЗНЕР, расстраляны.

САКАЛОЎСКАЯ, расстраляна.

САКАЛОЎСКІ, расстраляны.

СТРЭЛЬЧАНКА Уладзімір Паўлавіч, н. у 1912, спалены.

СЫЧ Антон Якаўлевіч, н. у 1870, спалены разам з дачкой **Вольгай,** 1920 г. н.

СЫЧ Клім Мацвеевіч (Майсеевіч), н. у 1870, расстраляны.

ТКАЧ Андрэй Фёдаравіч.

ТКАЧ Андрэй Яфімавіч.

ТКАЧ Іван Яфімавіч.

ЯРУШЭВІЧ Алена Васільеўна, спалена ў жніўні 1942.

ЯРУШЭВІЧ Валянціна Юр'еўна, н. у 1937, спалена ў жніўні 1942.

ЯРУШЭВІЧ Варвара Фёдараўна, н. у 1912, спалена ў жніўні 1942.

ЯРУШЭВІЧ Вера Фёдараўна.

ЯРУШЭВІЧ Ганна Васільеўна.

ЯРУШЭВІЧ Ганна Юр'еўна (дзіцё), спалена ў жніўні 1942.

ЯРУШЭВІЧ Ефрасіння Акімаўна.

ЯРУШЭВІЧ Ефрасіння Цімафееўна, н. у 1910, спалена.

ЯРУШЭВІЧ Ефрасіння Юр'еўна, н. у 1913, спалена ў жніўні 1942.

ЯРУШЭВІЧ Ірына Юр'еўна, н. у 1884, спалена ў жніўні 1942.

ЯРУШЭВІЧ Леанід Васільевіч, н. у 1938, спалены ў жніўні 1942.

ЯРУШЭВІЧ Лідзія Васільеўна (дзіцё), спалена.

ЯРУШЭВІЧ Лідзія Фёдараўна, н. у 1929, спалена ў жніўні 1942.

ЯРУШЭВІЧ Ніна Васільеўна, н. у 1940, спалена ў жніўні 1942.

ЯРУШЭВІЧ (дзіцё), спалена ў жніўні 1942.

ВЁСКА ЛІСКІ

Да вайны ў ёй было 287 двароў, 1100 жыхароў.

Вёску Ліскі карнікі спалілі 19 снежня 1942, на царкоўнае свята — Міколу. Днём раней яны знішчылі вёску Крынкі, якая ад Лісак у трох кіламетрах.

Акружыўшы Ліскі, карнікі сабралі людзей і пагналі ў Рэчыцу, дзе расстралялі некалькі сем'яў. Астатніх адпусцілі дамоў. Але яны вярнуліся на папялішчы, бо Ліскі згарэлі да адзінае хаты.

З успамінаў Фёклы Сяргееўны Астапенкі, 1898 г. н.

Ото ж нацярпеліся, нагараваліся.

Абкружылі сяло раннем, і нікуды. Гоняць да млына. Здагадка была: тутака і спаляць усіх. Крынкі ж ужо спалілі, то зарава скрозь ноч ды дзень і нам відаць было.

Мо і спалілі б, ды не даў Інглік. Ён сам немец. А жыў яшчэ ад вайны тае, грамадзянскае, у Бабічах. Начальнічаў у воласці. Пагергетаў штось са сваімі. То і яны паліць нас не рашыліся. Пагналі ўсіх у Рэчыцу. Хто так ідзе, а хто дзетак на руках нясе. Усе ж тутака...

Думаецца ўсяляк. Мо ж будзем жыць? Усё ж, каб схацелі губіць, то не гналі б у гэткую далеч.

А ўжо шушукаюцца ў натоўпе. Навошта, моў, усе страдаць павінны? Ну, няхай сем'і партызанскія ці актывістаў. А то ўсе.

І што вы думаеце? Як прыгналі ў Рэчыцу, то каторыя і папрасіліся да начальства. Мяне звалі: «Хадзем, Пяклуха, раскажам усё ...» А я кажу: «А я — не. Усе пад адным богам. То хай як будзе. Ён нам усім за суддзю».

Пайшлі. Што казалі там?! Толькі ж расстралялі сем'і не толькі партызанскія, а і хто хадзіў, хто на іншых казаў...

А астатнім: «Дамоў ідзіце».

А куды ісці? Сяло ж згарэла. Усё як ёсць. Пагналі ўсіх у Рэчыцу, то і тушыць не было каму.

От так і жылі. Спалілі ж: не было й сярэдзіны зімы... Хто дзе ды як. А вот выжылі. То мо й праўда, як богам дадзена. Дзевяноста пяць гадоў, а ўсё жыву...

Запісала *Н. В. Астапенка,*
настаўніца Ліскаўскай СШ

АСТАПЕНКА Арцём Харытонавіч, н. у 1874, працаваў у калгасе «КІМ», расстраляны ў Рэчыцы ў снежні 1941. Разам з ім загінулі: дачка **Таццяна,** 1913 г. н., унучка **Наталля,** 1935 г. н.

АСТАПЕНКА Варвара Сяргееўна (Гардзееўна), н. у 1901, працавала ў калгасе «КІМ», расстраляна ў снежні 1942.

АСТАПЕНКА Васіль Кандратавіч, н. у 1917, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

АСТАПЕНКА Вольга Ігнатаўна, н. у 1922, была забрана на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

АСТАПЕНКА Кацярына Дзмітрыеўна, н. у 1924, працавала ў калгасе «КІМ», расстраляна ў снежні 1942.

АСТАПЕНКА Клара Паўлаўна, н. у 1932, расстраляна разам з сястрой **Лідай,** 1935 г. н., за тое, што бацька знаходзіўся ў партызанах.

АСТАПЕНКА Лукер'я Андрэеўна, н. у 1884, расстраляна ў снежні 1942.

АСТАПЕНКА Мікалай Адамавіч, н. у 1872, расстраляны.

АСТАПЕНКА Мікалай Ігнатавіч, н. у 1912, працаваў на чыгунцы, расстраляны за сувязь з партызанамі.

АСТАПЕНКА Надзея Адамаўна, н. у 1918, у 1942 была забрана на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

АСТАПЕНКА Уладзімір Піліпавіч, н. у 1915, з 1941 — на фронце ў якасці ваентэхніка 2-га рангу. Не здолеўшы прабіцца з акружэння, вярнуўся дамоў, стаў членам падпольнай патрыятычнай арганізацыі. Расстраляны ў 1942.

АСТАПЕНКА Ульяна Мікалаеўна, н. у 1880, расстраляна ў снежні 1942.

АСТАПЕНКА Фёкла Дзмітрыеўна, н. у 1915, была забрана на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

АСТАПЕНКА Якаў Адамавіч, н. у 1898, працаваў у калгасе «КІМ», расстраляны ў снежні 1942. Разам з ім загінулі: жонка **Соф'я Піліпаўна,** 1900 г. н., сыны — **Аляксандр,** 1934 г. н., **Мікалай,** 1932 г. н., **Павел,** 1938 г. н., дочкі — **Вольга,** 1930 г. н., **Ганна,** 1928 г. н., **Кацярына,** 1926 г. н., **Яўгенія,** 1924 г. н.

БЕЛАЯ Марыя, працавала на торфзаводзе, расстраляна ў 1942 за сувязь з партызанамі.

БЛІЗНЕЦ Архіп Панкратавіч, н. у 1903, працаваў у Бабіцкім леспрамгасе, расстраляны ў 1942.

БЛІЗНЕЦ Міхаіл Мацвеевіч, н. у 1918, партызан, памёр ад ран 24.12.1943.

КОЦУР Восіп Восіпавіч, н. у 1914, працаваў у Бабіцкім леспрамгасе, партызан, загінуў.

КОЦУР Максім Сідаравіч, н. у 1896, працаваў на торфзаводзе, расстраляны ў снежні 1942.

ЛОБАН Іван Якаўлевіч, н. у 1915, працаваў брыгадзірам у калгасе «КІМ», затым — старшынёй сельсавета, партызан, загінуў у 1943.

ЛОБАН Лазар Андрэевіч, н. у 1892, працаваў у калгасе «КІМ», расстраляны ў снежні 1942. Разам з ім загінулі: жонка **Яўгенія Паўлаўна (Канстанцінаўна),** 1898 г. н., сын **Аляксандр,** 1928 г. н.

ЛОБАН Макар Яфімавіч, н. у 1904, працаваў старшынёй сельсавета, расстраляны ў 1942.

ЛОБАН Мацвей Кузьміч, н. у 1895, расстраляны ў снежні 1942. Разам з ім загінулі: жонка **Настасся,** 1897 г. н., сыны — **Васіль,** 1931 г. н., **Мікалай,** 1925 г. н., **Міхаіл,** 1933 г. н., дачка **Лідзія,** 1929 г. н.

ЛОБАН Уладзімір Дзмітрыевіч, н. у 1924, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

МЕШКА (МЯШКО) Сяргей Дарафеевіч, н. у 1898, працаваў у калгасе «КІМ», стараста вёскі, расстраляны ў 1942.

МУРАШКА Якаў Самсонавіч, н. у 1897, працаваў у Бабіцкім леспрамгасе.

НАВАСАД Уладзімір Паўлавіч, н. у 1923, працаваў на торфзаводзе, партызан, загінуў.

ПАЛІВАЧ Уладзімір Трафімавіч, н. у 1925—1927(?), партызан, загінуў 15.2.1943 каля в. Узнаж.

СМОЛЬСКАЯ Серафіма Якаўлеўна, н. у 1919, працавала ў калгасе «КІМ», расстраляна ў снежні 1942 разам з сынам Валянцінам, 1939 г. н.

СЫЧ Фёдар Васільевіч, н. у 1892, працаваў у калгасе «КІМ», расстраляны ў снежні 1942.

ХАМЯНОК Ганна Аляксандраўна, н. у 1924, працавала ў калгасе «КІМ», падарвалася на міне ў 1943.

НОВАБАРСУЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК ГРАБЯНЁЎ (ГРАБЯНЁВА)

Да вайны ў ім было 32 двары, 120 жыхароў. Быў цалкам спалены ў маі 1943. За час акупацыі фашысты расстралялі, закатавалі і спалілі каля двух дзесяткаў ягоных жыхароў.

АРЦЮШЭНКА Іван Пятровіч, н. у 1924, да вайны вучыўся ў Рэчыцкім педагагічным вучылішчы, з 1942 — партызан украінскага партызанскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1943.

БУЙНЕВІЧ Восіп Аляксандравіч (Аляксеевіч), н. у 1870.

КАМЕШ Вольга Мікалаеўна, н. у 1908, да вайны працавала лесатэхнікам, спалена разам з дзецьмі ў 1942.

КЕЧКА Дар'я, н. у 1864, расстраляна ў 1943.

КЕЧКА Леанід Серафімавіч, н. у 1930, расстраляны ў 1943.

МАСЦІЦКІ Ясь Адольфавіч, н. у 1923, да вайны працаваў настаўнікам. Расстраляны 11.9.1941 на царкоўнае свята Івана Галавасека каля в. Лясное. Яго, як і іншых жыхароў Грабянёва, карнікі прыгналі на калгасны двор в. Маладуша. Пачалі зачытваць спіс тых, хто быў пазначаны для расстрэлу. Я. А. Масціцкага ў гэтым спісе не было. Але адзін са здраднікаў, з якім, дарэчы, Масціцкі вучыўся ў Рэчыцкім педагагічным вучылішчы і якога лічыў за сябра, ступіў да аднаго з фашыстаў і, паказаўшы на маладога настаўніка, сказаў: «Камсамолец! Актыўны камсамолец!» Пачуўшы гэта, карнік загадаў Я. А. Масціцкаму стаць да адабраных для расстрэлу...

НОВІК Марыя Малахаўна, н. у 1884, расстраляна ў 1943.

ПАТАРОЧА Міхаіл П., н. у 1935, расстраляны ў 1943.

ПАТАРОЧА Хоўра В., н. у 1874, расстраляна ў 1943.

СМОЛЬСКАЯ Валянціна Уладзіміраўна, н. у 1943.

СМОЛЬСКАЯ Сцепаніда (Сцяфанія) Андрэеўна, н. у 1884, расстраляна ў 1943.

СМОЛЬСКІ Леанід Мікалаевіч, н. у 1924, да вайны вучыўся ў Рэчыцкім педагагічным вучылішчы, расстраляны ў 1943.

СМОЛЬСКІ Мікалай Канстанцінавіч, н. у 1884, да вайны працаваў у калгасе «Ударнік палёў», расстраляны ў 1943.

ХУЛУП Васіль Уладзіміравіч, н. у 1923 (1924?), з 1942 — партызан украінскага партызанскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1943.

ПАСЁЛАК ЗАРА СВАБОДЫ

Да вайны ў ім было 55 двароў, 275 жыхароў. Цалкам спалены карнікамі ў жніўні 1943.

ЖАЎНОЎ Аляксей Мінавіч.

ЖАЎНОЎ Гаўрыла Іванавіч, расстраляны ў 1943.

КАЗОРА Анастасія, н. у 1909, расстраляна ў 1943.

КАЗОРА Пракоп Якаўлевіч, партызан.

КАЗОРА Феакціст Якаўлевіч, н. у 1912—1914(?), расстраляны ў 1943.

КАЗОРА Фёдар Іванавіч, партызан.

КАЧАНОВА Аляксандра Цярэнцьеўна, расстраляна ў 1943.

КАЧАНОЎ Цярэнцій Маркіянавіч, партызан.

КУРКАЕВА (ЖАЎНОВА) Таццяна Андрэеўна, н. у 1925 (1926?), расстраляна ў 1943.

МАРЧАНКА Андрэй Іпалітавіч, партызан.

МАРЧАНКА Антон Іпалітавіч, партызан.

ПШАНОЎ Ігнат Цімафеевіч, партызан.

СУРАВЕЦ Ілья Яфімавіч, партызан.

УШАКОЎ Сяргей Нічыпаравіч, расстраляны ў 1943.

ШПАКАЎ Купрыян Рыгоравіч, партызан.

ШПАКАЎ Фёдар Рыгоравіч, партызан.

ПАСЁЛАК КАЛІНІНА

Да вайны ў ім было 40 двароў, 120 жыхароў. Цалкам спалены ў ліпені 1943. Карнікі расстралялі сям'ю Брылёвых.

БРЫЛЁВА Вольга Андрэеўна, 58—59 гадоў.

БРЫЛЁВА Ларыса Аляксандраўна, дзіцё, дачка Марыі Ціханаўны і Аляксандра Пятровіча.

БРЫЛЁВА Марыя Ціханаўна, 23—24 гады.

БРЫЛЁЎ Аляксандр Пятровіч, 25 гадоў.

БРЫЛЁЎ Андрэй Пятровіч, 14—15 гадоў.

БРЫЛЁЎ Іван Пятровіч, 19 гадоў.

БРЫЛЁЎ Пятро Мікалаевіч, каля 60 гадоў.

ВЁСКА ЛЯСНОЕ (ЧЫРВОНЫ ВОСТРАЎ)

Да вайны ў ёй было 60 двароў, 242 жыхары. Цалкам спалена ў студзені 1943.

БУРЭЙ Іван Іванавіч, н. у 1941, расстраляны ў 1943.

ВАШЧЫНСКАЯ Ганна Купрыянаўна.

ВАШЧЫНСКАЯ Ніна Ц., н. у 1900, расстраляна ў 1943.

ВАШЧЫНСКАЯ Нэля Уладзіміраўна, н. у 1940, расстраляна ў 1943.

ВАШЧЫНСКІ Анатоль Уладзіміравіч, н. у 1928, расстраляны ў 1943.

ВАШЧЫНСКІ Людвік Уладзіміравіч, н. у 1937, расстраляны ў 1943.

ВАШЧЫНСКІ Станіслаў Уладзіміравіч, н. у 1937, расстраляны ў 1943.

ГАЙДАШ Агаф'я Аляксееўна, н. у 1909, расстраляна ў 1943.

ГАЙДАШ Вольга А., н. у 1925, закатавана.

ГАЙДАШ Дзмітрый Пятровіч, н. у 1923, партызан, загінуў 18.10.1943.

ГАЙДАШ Дзмітрый Пятровіч, н. у 1927.

ГАЙДАШ Кірыл Майсеевіч, н. у 1914, да вайны працаваў старшынёй калгаса, партызан, загінуў у студзені 1943 на тэрыторыі Акцябрскага р-на.

ГАЙДАШ Матруна П., н. у 1860, расстраляна ў 1943.

ГАЙДАШ Рыгор Майсеевіч, партызан.

ГАЙДАШ Юлія Раманаўна, н. у 1936, расстраляна ў 1943.

ГУПАЛА Аляксандр Андрэевіч, н. у 1910, партызан.

ЖАРЫН Кароля А., н. у 1924.

КАЗЛОЎСКІ Дзмітрый Луцыянавіч.

КАЗЛОЎСКІ Міхаіл Луцыянавіч, н. у 1890, расстраляны ў 1943.

КАЛУЖНІКАЎ Банеда Мікалаевіч, н. у 1905, расстраляны ў 1943.

КАЛУЖНІКАЎ Венядзікт Міхайлавіч, партызан.

КАЛУЖНІКАЎ Міхаіл Ануфрыевіч, н. у 1870, закатаваны.

КАНДРАЦЕНКА Фёдар Анісавіч.

КАНДРАЦЕНКА Халімон Ігнатавіч, н. у 1892, расстраляны.

КАТАРСКІ Валяр'ян (Валерый) Ягоравіч, н. у 1880.

КАТАРСКІ Ягор Дзянісавіч, н. у 1830, закатаваны.

КАЧАНОЎСКАЯ Ганна Уладзіміраўна, н. у 1918, закатавана.

КАЧАНОЎСКІ Вікенцій Уладзіміравіч, н. у 1900, расстраляны.

ЛОБАН Алена С., н. у 1900.

МІХАЛКОВА (МІШАЛКОВА) Галіна Мікалаеўна, н. у 1938.

МІХАЛКОЎ (МІШАЛКОЎ) Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1941.

ПАБЯДЗІНСКАЯ Алімпіяда С., н. у 1937, расстраляна.

ПАБЯДЗІНСКАЯ Ганна С., н. у 1940, расстраляна.

ПАБЯДЗІНСКАЯ Любоў, н. у 1920, расстраляна.

ПРЫХОДЗЬКА Анатоль Л., н. у 1927, расстраляны.

ПРЫХОДЗЬКА Валянціна Л., н. у 1937, расстраляна.

ПРЫХОДЗЬКА Вера, н. у 1900, расстраляна.

РЫМКО Іван Канстанцінавіч, партызан.

САКАЛОЎСКАЯ Пелагея, н. у 1860, расстраляна.

СКАКУН Іосіф Ягоравіч, н. у 1899, расстраляны ў 1943.

СКАКУН Кацярына, расстраляна ў 1943.

СКАКУН Станіслава Іосіфаўна, н. у 1939, расстраляна ў 1943.

СКАКУН Юлія Іосіфаўна, н. у 1937, расстраляна ў 1943.

СМОЛІЧ Ванда Пятроўна, н. у 1921, закатавана ў 1943.

СМОЛІЧ Вікенцій Уладзіміравіч.

СМОЛІЧ Гаўрыла (Гаўрусь) Васільевіч (Вікенцьевіч), н. у 1917, партызан, загінуў 18.10.1943.

СМОЛІЧ Іван В., н. у 1880, расстраляны ў 1943.

СМОЛІЧ Мальвіна, н. у 1940.

СМОЛІЧ Пётр В., н. у 1917.

СМОЛІЧ Юлія Раманаўна, н. у 1850, расстраляна ў 1943.

СТАРАВОЙТАЎ Жорж Яўтенавіч, н. у 1941.

ХАЛІМОНКА (ХАЛІМОНЕНКА) Лідзія, н. у 1928, расстраляна ў 1943.

ХАЛІМОНКА Мальвіна, н. у 1942, расстраляна ў 1943.

ХАЛІМОНКА Міла, н. у 1906, расстраляна ў 1943.

ЧЭЧАТ Юзэфа Адамаўна, н. у 1870, расстраляна ў 1943.

ВЁСКА МАЛАДУША

Да вайны ў ёй было 300 двароў, 1457 жыхароў. Спалена карнікамі 2 і 9 жніўня 1942. Пры гэтым былі расстраляны, закатаваны і спалены 54 яе жыхары. Пераважная большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе «Непераможны».

АРЦЮШЭНКА Пётр Васільевіч, н. у 1875.

БЛІШЧ Арына (Ярына) Фёдараўна, н. у 1875, спалена. Разам з цяжарнай нявесткай была дома, а муж Арсен і сын Піліп знаходзіліся ў гэты час на агародзе. Яны і ўбачылі, як фашысты і паліцаі сунуцца, тоячыся, да вёскі. Бацька з сынам зразумелі: быць бядзе. Але часу на тое, каб папярэдзіць родных, у іх не было. З карча, што раскашаваў ускрай агарода, Арсен з Піліпам бачылі, як успыхнуў, падпалены, іхні двор. Агонь нішчыў не толькі маёмасць, а і родных...

Арсен Блішч, перажыўшы страшэнную трагедыю, памёр у 1946. Піліп Блішч жыве і зараз (час работы над спісам загінуўшых).

БЛІШЧ Марыя Цімафееўна, н. у 1916. Летам 1941 разам з Піліпам пагналі на ўсход калгасны статак. Дамоў вярнуліся ў кастрычніку 1941. У вёсцы ўжо гаспадарылі фашысты. Неўзабаве Марыя і Піліп пажаніліся. Яны чакалі дзіцё. Але для Марыі апошнім днём стала 9 жніўня 1942.

БУРАЧЭНАК Надзея Платонаўна, н. у 1908. Перад вайной жыла ў Рэчыцы. А калі муж пайшоў на фронт, яна разам з дзецьмі перабралася ў Маладушу да сястры. Жыла ў адной з кватэр барака, узведзенага некалі панам для рабочых вінакурні. Спалена разам з дзецьмі 9 жніўня 1942. Дзяцей у Надзеі Платонаўны было двое ці трое. Адну дачку звалі Надзеяй, яна н. у 1941.

ВАРОНІНА Любоў Іванаўна, н. у 1935 (унучка Даўгалапцева І. М.). Калі карнікі бамбілі вёску, яна ўцякала да лесу. Была забіта кулямётнай чаргой ці ўзрывам бомбы.

ВАСІЛЕЦ Мацвей (Майсей) Несцеравіч, н. у 1875. Калі ў жніўні 1942 карнікі палілі Маладушу, ён быў далёка ад свае хаты — касіў траву каля в. Смагарын. Убачыўшы над Маладушай дым, паспяшаўся дамоў... Перш чым расстраляць Васільца, карнікі далі яму магчымасць паназіраць з хвіліну, як бушуе полымя над хатамі вёскі-пакутніцы, пачуць перадсмяротныя енкі суседзяў...

ГЕРУС Іван Мікалаевіч, н. у 1924, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака.

ДАВЫБАРНЫ Іван, н. на Украіне, з акружэнцаў. Майстар на ўсе рукі, меў вышэйшую адукацыю, добра ведаў нямецкую мову. Не здолеўшы прабіцца праз лінію фронту, прыбіўся ў Маладушу. Тут ажаніўся. Быў схоплены фашыстамі і адпраўлены на прымусовыя работы ў Германію. Па дарозе ўцёк, далучыўся да партызан Брэстчыны. Дзейнічаў у асноўным на тэрыторыі Камянецкага р-на «почыркам» славутага савецкага разведчыка Мікалая Кузняцова. Загінуў.

ДАМКОЎСКІ Андрэй Гардзеевіч (Яўціхавіч), н. у 1892, адзін з сельскіх актывістаў, расстраляны ў 1941.

ДАМКОЎСКАЯ Марыя (Марцэля), н. у 1897. Карнікі расстралялі яе мужа — **Андрэя Гардзеевіча (Яўціхавіча),** спалілі дзяцей — сына **Аркадзя,** 1934 г. н., і дачку **Ніну,** 1937 г. н. Яна ж, абгарэлая, знайшла ў сябе сілы выпаўзці з ахопленай полымем хаты. Карнікі праявілі «гуманнасць». Яны забралі яе ў Рэчыцу. Там, у бальніцы, жанчына памерла.

ДАНЧАНКА Ніна Дзмітрыеўна, н. у 1922, партызанка злучэння С. А. Каўпака, загінула ў лістападзе 1942.

ДАЎГАЛАПЦЕЎ Іван Міронавіч, н. у 1860. Мясцовы грамацей. Праўда, сёй-той з маладушцаў часам кпіў, што продкі Івана Міронавіча былі «...колісь куплены панам за паляўнічых ганчакоў». Працаваў у калгасе кладаўшчыком. Перад прыходам акупантаў раздаваў калгаснікам калектыўную маёмасць. Шмат збожжа было вывезена са склада ў Амелькаўскі лес, дзе рыхтавалася база для Рэчыцкага партызанскага атрада імя К. Я. Варашылава, а таксама для атрада Хойніцкага р-на.

І вось гэтага мясцовыя здраднікі не даравалі кладаўшчыку. «Партызанам дак аддаваў усё, — казалі яны. — Нам шкадаваў...»

Даўгалапцеў І. М. быў расстраляны разам з многімі вяскоўцамі 11.9.1941, на царкоўнае свята Івана Галавасека. Фашысты і паліцаі павялі няшчасных да в. Лясное (Чырвоны Востраў). Прымусілі іх цягнуць гармату. Там, каля Лясного, збочылі ў хмызняк і пачалі паліваць людзей кулямётным агнём. Потым дабівалі з вінтовак...

ЖУРАЎКОЎ Уладзімір С., н. у 1908, да вайны працаваў настаўнікам, расстраляны 11.9. 1941.

ІВАНЮТКА Караліна А., н. у 1902. У пачатку вайны яна прыехала ў Маладушу з в. Ізбынь Хойніцкага р-на, расстраляна ў 1942.

КАВАЛЬЧУК Вольга Лаўрэнаўна, н. у 1909, расстраляна зімой 1943 за тое, што муж знаходзіўся ў партызанах. Разам з маці карнікі загубілі і дзвюх яе дачушак — **Марыю,** 1939 г. н. і **Валянціну,** якая н. у 1941.

КАВАЛЬЧУК Ганна Цярэнцьеўна, н. у 1921, расстраляна ў 1942.

КАВАЛЬЧУК Ефрасіння В., н. у 1880, расстраляна ў 1942.

КАВАЛЬЧУК Цярэнцій Васільевіч, н. у 1880, расстраляны ў 1942.

КАВАЛЬЧУК Цярэнцій М., н. у 1892, расстраляны ў 1943.

КАЗАЧОНАК (КАЗАЧЭНАК) Ганна, н. у 1917, расстраляна ў жніўні 1942. Яна трымала на руках сына Івана, 1941 г. н. Адзін з карнікаў праткнуў немаўля штыком і, выхапіўшы яго з рук маці, падкінуў угору... Другі ж нелюдзь дабіў дзіцё стрэлам з ракетніцы...

КАЗАЧОНАК (КАЗАЧЭНАК) Іван Паўлавіч, н. у 1914, сельскі актывіст, член знішчальнага (загараджальнага) атрада, які быў створаны ў пачатку вайны пры Маладушскім с/с. Расстраляны 11.9.1941. Названыя вышэй Ганна і Іван — ягоныя жонка і сын.

КЕЧКА Іван Мікалаевіч, н. у 1875. Аднавяскоўцы найчасцей звалі яго Іванам Адамаўскім. Расстраляны ў жніўні 1942.

КЕЧКА Міхаіл Іванавіч, н. у 1918 (1919?), партызан.

КЕЧКА Піліп Фёдаравіч, н. у 1923, оперупаўнаважаны Марачноўскага раённага аддзела НКУС Ровенскай вобл. (Украіна), загінуў у с. Кухоцкая Воля 20.5.1945.

КУДАРЭНАК (КУДАРЭНКА) Марыя (Марфа) Мітрафанаўна, н. у 1902, расстраляна 2.8.1942. Разам з маці быў расстраляны і яе сын **Пятро,** 1940 г. н.

КУДАРЭНАК (КУДАРЭНКА) Фёдар Андрэевіч, н. у 1900, закатаваны ў канцы верасня 1941. Яго, сельскага актывіста, разам з Кузарам Д. І. карнікі прывязалі, каб памучыць, за аглоблі калёс, а потым пагналі па дарозе на в. Сямёнаўку. А там, каля Сямёнаўкі, прыстрэлілі.

Названыя вышэй Марыя Мітрафанаўна і Пятро Кударэнкі — ягоныя жонка і сын.

КУЗАР Даніла Іванавіч, н. у 1892, з'яўляўся членам выканкама Маладушскага с/с, у свой час узначальваў калгас у в. Лясное (Чырвоны Востраў). Незадоўга перад прыходам акупантаў казаў людзям, што сабраліся ў памяшканні Савета: «Немцы пабудуць, дый пойдуць. Не можа таго быць, каб нашыя ўсё адступалі. А нам во тутака трэба згаварыцца, як жыць, трымацца адзін другога...»

Вядома, сказанае тады Данілам Іванавічам не было сакрэтам для мясцовых здраднікаў. Разам з тым свой асабісты «рахунак» меў да Кузара Д. І. камендант Майер. 11.9.1941, калі фашысты «знаёмілі» вяскоўцаў з новаю ўладаю і хапалі, каб потым расстраляць, мясцовых актывістаў, Даніла Іванавіч разам з большасцю маладушцаў быў на калгасным двары. Зусім хворы. Казаў людзям: «Усё! Во-во і мяне зачытаюць...»

Але ў той дзень Данілу Іванавіча карнікі не зачапілі. Уратавала яго тое, што Майер, толькі што прызначаны камендантам, знаходзіўся пад той час у в. Андрэеўка. І ён, здраднік Майер, расквітаўся з Кузарам Д. І. праз два тыдні. Данілу Іванавіча, як і Кударэнку Ф. А., прывязалі за аглоблі ды пагналі на Сямёнаўку, дзе і прыстрэлілі.

МАЛЯНОК Уладзімір, н. у 1913. Хутчэй за ўсё ў в. Дубровіца Хойніцкага р-на. Спецыяліст па жывёлагадоўлі (фельчар ці заатэхнік). Нейкі час жыў і працаваў у в. Сяргееўка, незадоўга перад вайной перабраўся ў Маладушу. Член мясцовага знішчальнага (загараджальнага) атрада. Расстраляны ў 1941.

МАНУЙЛАЎ Уладзімір Іванавіч, н. у 1925 (1926?), вучыўся ў Ленінградзе, дзе і загінуў.

МУХА Валянцін (Веніамін) Лаўрэнавіч, н. у 1880, расстраляны ў жніўні 1942.

МУХА Васіль Мацвеевіч, н. у 1916, партызан Рэчыцкай брыгады «Мсцівец», загінуў у 1943.

НАРНІЦКІ Іван (Ян) Пятровіч, н. у 1890, расстраляны 9.8.1942. Калі карнікі палілі вёску, ён нават не спрабаваў хавацца. Чалавек як след не ўсвядоміў бяду, што прыйшла ў Маладушу, бо меў сур'ёзны фізічны недахоп — быў глухім.

НОВІК Восіп (Есіп) Канстанцінавіч, н. у 1904, жыў ускрай вёскі, працаваў на ўласнай гаспадарцы. У жніўні 1942, калі карнікі палілі вёску, быў цяжка паранены, а неўзабаве памёр.

НОВІК Галіна Емяльянаўна, н. у 1905, расстраляна ў жніўні 1942.

НОВІК Любоў Андрэеўна, н. у 1915. Працавала загадчыцай клуба, скончыла курсы трактарыстак, на пачатку вайны працавала загадчыцай *мясцовай МТФ, займалася* эвакуацыяй у глыб краіны калгаснага статка. Расстраляна 11.9.1941.

НОВІК Сідар Аляксеевіч, партызан.

ПІНЧУК Міхаіл Ільіч, н. у 1895, працаваў у калгасе бухгалтарам, быў членам праўлення гаспадаркі, перад прыходам акупантаў размяркоўваў паміж калгаснікамі калектыўную маёмасць. Быў застрэлены, а потым спалены ў хаце Казачэнкі І. П. у жніўні 1942. Карнікі, аказваецца, шукалі яго. Знайшлі і прывялі, параненага, да каменданта Майера. Той абвінаваціў Пінчука М. І. у супрацоўніцтве з органамі НКУС. Маўляў, ён, Пінчук, яшчэ ў час грамадзянскай вайны падаў у ЧК спіс членаў мясцовай банды.

ПІНЧУК Соф'я Іванаўна, н. у 1898, расстраляна.

ПЫРХ Васіль Аляксандравіч (Аляксеевіч), н. у 1911, баец знішчальнага (загараджальнага) атрада, расстраляны 11.9.1941.

ПЯТРОЎСКІ Антон Ігнатавіч, н. у 1895.

ПЯТРОЎСКІ Васіль Іванавіч, н. у 1924, партызан.

РАЗУМЕНКА Павел, н. у 1897, пёк для партызанаў хлеб, расстраляны 11.9.1941.

РУДЧАНКА Іван, партызан.

САВЯНОК Лідзія Іванаўна, н. у 1930, спалена 9.8.1942.

СІВУХА Варвара Фёдараўна, н. у 1924, закатавана ў 1942.

СПІРЫДОНАЎ Савелій Ігнатавіч, н. у 1875. У Маладушу прыехаў да рэвалюцыі з в. Ліпава (Калінкавіцкі р-н). Працаваў механікам на панскім вінакурным заводзе. Перад вайной наглядваў за калгасным млыном, рамантаваў яго. Перад прыходам немцаў казаў людзям: «Я іх ведаю шчэ з тае вайны. З імі можна згаварыцца...» Падзеі ж разгортваліся так, што менавіта Спірыдонаў стаў першай ахвярай у Маладушы. Яго расстралялі на двары Мануйлавых (Мацвейшыных) перад тым, як весці 11.9.1941 адабраных для расстрэлу да в. Лясное.

ТАМАШЭЎСКІ Адам Браніслававіч, н. у 1924, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў.

ТАМАШЭЎСКІ Антон Браніслававіч, н. у 1920, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў.

ТАМАШЭЎСКАЯ Марыя, н. у 1915, расстраляна ў час блакады ў 1943 ва ўрочышчы Шчоўб. Разам з маці былі расстраляны і яе дзеці — дачка **Тамара,** 1938 г. н., сын **Вікенцій,** які н. у 1940.

ТАРАНАЎ Дзмітрый, н. у 1905. Прыехаў жыць у Маладушу з Рэчыцы, разам з Паўлам Разуменкам выпякаў для партызанаў хлеб.

ШЧАРБУК Сцяпан С., н. у 1907, расстраляны 11.9.1941. Карнікі расправіліся таксама і з ягонай сям'ёй — жонкай **Лукер'яй** і дзецьмі 8—12 гадоў.

ЯКІМАЎ Аляксандр Ільіч, з акружэнцаў, жыў, не прабіўшыся праз лінію фронту, у Маладушы, з 1942 — баец украінскага партызанскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў.

ЯРАЦ Аляксей Дзмітрыевіч, н. у 1865. У Маладушу прыехаў з в. Амелькаўшчына Хойніцкага р-на, загінуў у жніўні 1942.

ЯСЕНАВЕЦ Марыя, н. у 1870, загінула ў жніўні 1942.

ЯСЕНАВЕЦ Настасся, н. у 1875, загінула ў жніўні 1942.

Пры рабоце над спісамі загінуўшых па в. Маладуша выкарыстаны ўспаміны былога яе жыхара, партызана рэчыцкай брыгады «Мсцівец», ветэрана педагагічнай працы Аркадзя Данілавіча Кударэнкі, 1924 г. н.

Як згадваў Аркадзь Данілавіч, 11.9.1941, калі карнікі вялі да в. Лясное (Чырвоны Востраў) прызначаных для расстрэлу жыхароў Маладушы і Грабянёва, нехта з фашыстаў заўважыў: ускрай лесу, крокаў за 100 ад дарогі, сядзіць купка людзей. Гітлеравец паведаміў пра тое афіцэру. Ён, афіцэр, павярнуўся ў бок, куды паказваў падначалены, махнуў рукой: «Ком! Ком!» І тады людзі на ўскраі лесу падняліся з зямлі, рушылі да дарогі. Гэта былі ... чырвонаармейцы. 5 ці 6 чалавек. Яны, напэўна, не змаглі выйсці з акружэння. Усе страшэнна знясіленыя, худыя. На што спадзяваліся яны? На літасць ворага? Карнікі далучылі чырвонаармейцаў да прызначаных для расстрэлу...

Увогуле за час варожай акупацыі ў раёне в. Маладуша карнікі знішчылі не менш 500 чалавек мірнага насельніцтва. У асноўным — жыхароў г. п. Хойнікі.

ВЁСКА НОВЫ БАРСУК

АНІСІМАЎ Васіль Іванавіч (Данілавіч).

АНТОСІК Іосіф Ігнатавіч, 16—17 гадоў, сувязны партызанскага атрада. Своечасова папярэдзіў атрад пра тое, што ў лесе карнікі. Партызаны адбілі варожую атаку. Антосік І. І. быў схоплены паліцаямі. Яго доўга катавалі, а потым расстралялі.

БОНДАР Наталля Ягораўна, 40 гадоў.

БРАКАВЕНКА Васіль Іванавіч, 17—18 гадоў.

ГРЫШЧАНКА Марыя Мікалаеўна, перад вайной вучылася ў школе.

ГРЫШЧАНКА Мікалай Яўгенавіч, каля 50 гадоў.

ГРЫШЧАНКА Ніна Мікалаеўна, перад вайной вучылася ў школе.

ДАНІЛЬЧАНКА Васіль Мацвеевіч, партызан.

ДАНІЛЬЧАНКА Марыя Савельеўна, 17—18 гадоў, расстраляна.

ДАНІЛЬЧАНКА Савелій Уласавіч, гадоў 50—55. Перад вайной працаваў у калгасе імя Фрунзе. Атрымаў заданне гнаць грамадскі статак на ўсход. Разам з некалькімі вяскоўцамі загнаў кароў да Волгі. Прасіўся на фронт, але яго не ўзялі. І тады вярнуўся ў родную вёску, дзе і быў расстраляны.

ДАНІЛЬЧАНКА Таццяна Кірылаўна, каля 50 гадоў, расстраляна.

ЕРМАЧЭНКА Сямён Фёдаравіч, партызан, загінуў.

ЖАЎНОЎ Аляксей Мінавіч, н. у 1926—1927, расстраляны ў 1943.

ЖАЎНОЎ Васіль Фёдаравіч, н. у 1912, партызан, загінуў.

ЖАЎНОЎ Пётр Макаравіч, н. у 1900, партызан, загінуў.

ЖАЎНОЎ Рыгор Сямёнавіч, партызан, загінуў.

ЖУРАЎЛЁВА Марыя Анікееўна, 20—22 гады, сувязная партызанскага атрада, закатавана паліцаямі ў маі 1943.

ЗАЙЦАЎ Міхаіл Емяльянавіч.

КУРКАЕВА Аляксандра Цярэнцьеўна.

ЛАПЕКА Іван Кузьміч.

МЯДЗВЕДЗЕЎ Іван Сямёнавіч, партызан, загінуў.

ПАТАПЕНКА Ларывон Елісеевіч.

ПРАКАПЕНКА Рыгор Юркавіч.

СМОЛІЧ Ірына Васільеўна, 55—60 гадоў, расстраляна.

СМОЛІЧ Хрысан Яфімавіч, 58—60 гадоў, расстраляны.

СУХАБОК Любоў Фёдараўна, 15—16 гадоў, расстраляна.

СУХАБОК Ульяна Маркаўна, 48—50 гадоў, расстраляна.

ТАРАТЫН Карп Маркавіч.

ТЫШКОЎ Віктар Васільевіч.

ХАМЯКОВА Любоў Васільеўна, 48—50 гадоў.

ХАМЯНОК Анастасія Пракопаўна.

ЧАЙКО Павел Карнеевіч, н. у 1918, партызан, загінуў.

ШПАКАЎ Купрыян Рыгоравіч, н. у 1902, партызан, загінуў у 1944.

ШПАКАЎ Міхаіл Рыгоравіч, партызан, загінуў.

ШПАКАЎ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1915, камандзір партызанскай роты, загінуў у 1943.

ВЁСКА СТАРЫ БАРСУК

Да вайны ў ёй было 110 двароў, 660 жыхароў. Спалена карнікамі ў жніўні 1943.

БАКАВЕЦ Ганна Ільінічна, расстраляна ў 1943.

БАКАВЕЦ Ефрасіння Ільінічна, расстраляна ў 1943.

КЕЧКА Аляксей Яўгенавіч, расстраляны ў 1943.

КЕЧКА Васіль Кузьміч, расстраляны ў 1943.

КЕЧКА Леанід Дзямідавіч, расстраляны ў 1943.

КЕЧКА Праскоўя Цярэнцьеўна, расстраляна.

КЕЧКА Рыгор Цярэнцьевіч, расстраляны.

КЕЧКА Фёдар Сцяпанавіч, расстраляны ў 1943.

МАЙСЕЕНКА Сямён Ігнатавіч, н. ў 1892, расстраляны ў жніўні 1943.

З успамінаў Наталлі Сямёнаўны Бурачэнак, дачкі Майсеенкі С. І.

«...Нашую Маладушу карнікі спалілі ўлетку 42-га. То я і перабралася з дзецьмі да сваіх у Стары Барсук. На наступнае лета карны атрад прыбыў і ў Стары Барсук. Прыехалі нават на танкетках.

Тады арыштавалі майго бацьку ды яшчэ чацвярых мужчын. Вывелі на выган, загадалі капаць вялікую ямчыну. А як выкапалі, то звязалі ўсім рукі, пасадзілі ў гэтую ямчыну. Вартаваў іх паліцэйскі.

Ноччу мы насілі бацьку есці. Ён казаў, што ўсіх павінны адпусціць. А капалі яны, каб было куды схаваць танкетку.

Раннем немцы сабралі ўсіх людзей да ямчыны. Прыйшлі паліцэйскія. На галовах іхніх былі маскі. Гэта каб няможна было нікога спазнаць. Яны і расстралялі майго бацьку ды ягоных таварышоў па няшчасці. А тады прыкапалі зямлёй.

Скора карнікі падаліся ў бок Рудні Бурыцкай. Пагналі нашых кароў і авечак. Мы ж адкапалі расстраляных, пахавалі іх на могілках...»

ХАМЯНОК Анастасія Пракопаўна.

ХАМЯНОК Віктар Лявонавіч, расстраляны ў 1943.

ХАМЯНОК Фёдар Логвінавіч, партызан, загінуў.

ШЫЛЕЦ Леанід Міхайлавіч, партызан, загінуў.

ВЁСКА СЯРГЕЕЎКА

Да вайны ў ёй было 53 двары, 190 жыхароў. Цалкам спалена ў чэрвені 1943.

ВАСІЛЬЕЎ Сяргей В., н. у 1880, расстраляны ў 1943.

КУНЕЦ Васіль Канстанцінавіч, н. у 1911, партызан, загінуў.

КУНЕЦ Канстанцін Васільевіч, партызан, загінуў.

ПРОЦКАЯ Марыя С., н. у 1894, расстраляна ў 1943.

ПРОЦКІ Фёдар Іосіфавіч, н. у 1924 (1925?), партызан, загінуў.

СІРОТКА Зоя Іванаўна, н. у 1942, расстраляна.

СІРОТКА Нюра Іванаўна, н. у 1939, расстраляна.

СІРОТКА Паўліна Браніславаўна, н. у 1912, расстраляна.

СЯНЬКО Канстанцін Трафімавіч, партызан, загінуў.

СЯНЬКО Кацярына, н. у 1907, расстраляна.

СЯНЬКО Трафім, н. у 1898, расстраляны.

ФЕДАРЫНЧЫК Васіль, н. у 1888, расстраляны ў 1943.

ЦІМАНОВІЧ А., н. у 1878, расстраляны.

ПЕРАСВЯТОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК БАРЭЦ

ГУЦЬЕНТАВА Хася Аронаўна, расстраляна ў 1941.

ВЁСКА КОРАСЦЕНЬ

ЛАСІЦА Мікалай Юр'евіч.
ЛАСІЦА Юрый Андрэевіч.
ЛІТОШКА Аляксандр Цімафеевіч.
ШНЧУК Аляксандра Антонаўна, н. у лютым 1929, расстраляна ў сакавіку 1943.
СІВУХА Уладзімір Данілавіч.
ШАЎЧЭНКА Павел Цімафеевіч.

ВЁСКА МАЎЧАНЫ

БАГАЦКІ Цімафей Цімафеевіч.
БАНЧАК Іван Фадзеевіч.
ГАНЧАРЭНКА Іван Іванавіч.
ГРАБЦЭВІЧ Мікалай Яфімавіч.
ДУБАВЕЦ Рыгор Мінавіч.
ЕМЯЛЬЯНЕНКА Сяргей Сямёнавіч.
ЖАЎНЯРЭНКА Міхаіл Сцяпанавіч.
КАНАВАЛАЎ Уладзімір Мікалаевіч.
КАНЦАВЫ Іван Аляксеевіч.
КАНЦАВЫ Рыгор Аляксеевіч.
ЛАСІЦА Віктар Рыгоравіч.
ЛАСІЦА Іван Мікалаевіч.
ЛАСІЦА Іван Рыгоравіч.
ЛАСІЦА Леанід Сцяпанавіч.

ВЁСКА ПАДМОСЦЕ

ЛАСІЦА Раіса Мікалаеўна.
ЛАСІЦА Таццяна Захараўна.

ВЁСКА ПЕРАСВЯТОЕ

Пераважная большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе імя С. М. Будзённага. Расстраляны.

ГРАБОК Алена Андрэеўна.
ДАВЫДЗЕНКА Надзея Фёдараўна.
ДЗЕДЗІК Міхаіл, 15 гадоў.
КАХАНОЎСКІ Фёдар Філімонавіч.
ЛІСОЎСКІ Рыгор, 15 гадоў.
МАРОЗ Андрэй Андрэевіч.
МАРОЗ Дзмітрый Піліпавіч.
НАЛЯГАЧ Рыгор Піліпавіч.
ПІНЧУК Антон Мікалаевіч.
ПІНЧУК Вольга Антонаўна.
ПІНЧУК Вячаслаў Антонавіч.
ПІНЧУК Клаўдзія Антонаўна.
ПІНЧУК Марыя Нічыпараўна.
СВІЧ Міканор Міхайлавіч.

ВЁСКА РАБУСА

Жыхары расстраляны.

ГРАБОК Дзмітрый Лаўрэнцьевіч.
КАХАНОЎСКІ Іван Рыгоравіч.
КАХАНОЎСКІ Фёдар Дзянісавіч.
КРАСКОЎСКІ Васіль Міхайлавіч.
ПАЖАРЫЦКІ Іван Кандратавіч.

На жаль, прозвішчы ўсіх жыхароў Перасвятоўскага с/с, якія загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў, устанавіць не ўдалося.

РОВЕНСКА-СЛАБОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АНДРЭЕЎКА

Трагедыя напаткала вёску Андрэеўку зімой 1943 года, калі атрад карнікаў акружыў яе з усіх бакоў. Людзям было загадана з хат не выходзіць. Неўзабаве карнікі пабеглі па хатах. Яны выводзілі вяскоўцаў на агароды і расстрэльвалі. Шмат людзей было сагнана ў хату Антона Васільца. Усіх іх спалілі.

Устанавіць асобы ўсіх загінуўшых не ўдалося, бо пад той час, калі нелюдзі нішчылі Андрэеўку, у ёй знаходзілася нямала людзей з іншых вёсак як Рэчыцкага, так і Хойніцкага раёнаў. На жаль, не ўстаноўлены і дакладны час расправы над Андрэеўкай. Тыя з вяскоўцаў, каторым пашчасціла застацца жывымі, найчасцей згадваюць студзень і люты.

БЛШЧ Ганна Маркаўна, расстраляна.

ВАСІЛЕЦ Аляксей Дзмітрыевіч, н. у 1908—1911, партызан, загінуў.

ВАСІЛЕЦ Антон Канстанцінавіч, партызан, загінуў.

ВАСІЛЕЦ Вольга Лаўрэнаўна, спалена.

ВАСІЛЕЦ Клаўдзія Фёдараўна, спалена.

ВАСІЛЕЦ Марыя Фёдараўна, спалена.

ВАСІЛЕЦ Міхаіл Іванавіч, н. у 1910, партызан, памёр ад тыфусу 5.5.1943.

ВАСІЛЕЦ Наталля Рыгораўна, спалена.

ВАСІЛЕЦ Павел Фёдаравіч, партызан, загінуў.

ВАСІЛЕЦ Сямён Рыгоравіч, спалены.

ВАСІЛЕЦ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1942, спалены.

ВАСІЛЕЦ Фёдар Паўлавіч, н. у 1940, спалены.

ДВОРНІК Марыя Іванаўна, н. у 1866, расстраляна 7.8.1942 у в. Ровенская Слабада як член партызанскай сям'і.

КАСЦЯНОК Антон Антонавіч, спалены.

КАСЦЯНОК Вольга Антонаўна, спалена.

КАСЦЯНОК Любоў Цярэнцьеўна, спалена.

КАСЦЯНОК Мікалай Міхайлавіч, спалены.

КУЗАР Александрына (Ляксута) Цярэнцьеўна, н. у 1892 у в. Ізбынь (Хойніцкі р-н), спалена.

КУЗАР Рыгор Данілавіч, н. у 1926, партызан, загінуў.

МАРОЗ Вольга Мікалаеўна, спалена.

ПАЎЛЯНОК Аляксандр Ціханавіч, н. у 1925, партызан, загінуў.

ПАЎЛЯНОК Ганна Ціханаўна, спалена.

РУДЧАНКА Іван Васільевіч, н. у 1904, партызан, прапаў без вестак у лістападзе 1943.

СУПРАНОК Апанас Архіпавіч, н. у 1923, спалены.

СУПРАНОК Архіп Сямёнавіч, н. у 1878, актыўны ўдзельнік Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, спалены.

СУПРАНОК Варвара Архіпаўна, н. у 1928, спалена.

СУПРАНОК Віктар Міхайлавіч, н. 15.9. 1935, спалены.

СУПРАНОК Вольга Архіпаўна, н. у 1923, спалена.

СУПРАНОК Вольга Міхайлаўна, спалена.

СУПРАНОК Еўдакія Васільеўна, н. у 1881, спалена.

СУПРАНОК Еўдакія Васільеўна, н. у 1913, расстраляна.

СУПРАНОК Іван Сямёнавіч, спалены.

СУПРАНОК Леанід Міхайлавіч, н. у 1937, спалены.

СУПРАНОК Марыя Міхайлаўна, н. у 1939, спалена.

СУПРАНОК Ніна Міхайлаўна, спалена.

СУПРАНОК Рыгор Міхайлавіч, н. у 1941, спалены.

ВЁСКА БЯЗУЕЎ

Да вайны ў ёй было 70 двароў, 290 жыхароў. Спалена ў жніўні 1942. Згарэлі 68 двароў. Карнікі расстралялі, спалілі і закатавалі 45 вяскоўцаў.

АТРОШЧАНКА Лявон Рыгоравіч, расстраляны.

АТРОШЧАНКА Настасся Міхайлаўна, расстраляна.

БАЛАШЧАНКА Валянцін Паўлавіч, н. у 1927, расстраляны.

Г. І. Васілец з дзецьмі (у верхнім радзе першы злева сын застаўся ў жывых)

БАЛАШЧАНКА Васіль, н. у 1923, расстраляны.

БАЛАШЧАНКА Леанід, н. у 1922, расстраляны.

БАЛАШЧАНКА Марыя Якаўлеўна, расстраляна.

БАРАНОЎСКАЯ Вольга, расстраляна.

БАРАНОЎСКАЯ Ганна, расстраляна.

ГЛУШАНОК Агапа, расстраляна.

ДАНЕЦ Васіль Іванавіч, н. у 1924, расстраляны.

ДАНЕЦ Ганна, расстраляна.

ДАНЕЦ Піліп, расстраляны.

ДВОРНІК Мікалай, н. у 1938, спалены.

ДУБІНА Марыя Самойлаўна, расстраляна.

ЗАБІРАН Васіль Андрэевіч, расстраляны.

ЗАБІРАН Іван Самойлавіч, расстраляны.

ЗАБІРАН Кацярына Сцяпанаўна, расстраляна.

ЗАБІРАН Любоў, расстраляна.

ЗАБІРАН Ніна, расстраляна.

КАВАЛЕНКА Віктар, н. у 1931, расстраляны.

КАВАЛЕНКА Леанід, н. у 1936, спалены.

КАВАЛЕНКА Люба, н. у 1939, спалена.

КАЗАК Аляксей Еўдакімавіч, н. у 1918, партызан, загінуў у 1943.

КАЗАК Ганна, спалена.

КАЗАК Іван, расстраляны.

КАЗАК Наталля Пахомаўна, расстраляна.

КАШЫЦКАЯ Вольга, н. у 1940, расстраляна.

КАШЫЦКАЯ Люба, н. у 1939, расстраляна.

КАШЫЦКАЯ Матруна, расстраляна.

КОХНА (КАХНО) Эма, н. у 1937, расстраляна.

КУЦЕНЬ Міхаіл, н. у 1920, расстраляны.

ЛЫСЕНКА Ларывон П., расстраляны.

ЛЫСЕНКА Соф'я Рыгораўна, расстраляна.

ЛЯХНОВІЧ Барыс, н. у 1933, расстраляны.

ЛЯХНОВІЧ Ларыса, н. у 1939, расстраляна.

МАСІКЕВІЧ (МАСЮКЕВІЧ) Ефрасіння, расстраляна.

МАЦЕШАЎ (МАЦЮШАЎ) Віктар, н. у 1933, расстраляны.

МАЦЮШЭНКА Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1933, расстраляны.

МАЦЮШЭНКА Настасся, спалена.

МАЦЮШЭНКА Уладзімір Н., н. у 1928, расстраляны.

ПІНЧУК Аляксандр Паўлавіч, н. у 1924, партызан, загінуў у 1943.

РУБАН Іван Якаўлевіч, н. у 1925, партызан, загінуў у 1942.

РУДАКОВА Арына, расстраляна.

СВІРЫДАЎ Мікалай, н. у 1933, расстраляны.

СІНГАЕЎСКІЯ (дзве жанчыны), расстраляны.

СТРЫЖАК М., расстраляны.

ШАРОЙКА Ізот, н. у 1924, расстраляны.

ШАРОЙКА (жанчына), расстраляна.

ПАСЁЛАК БЯРОЗАЎКА

ДВОРНІК Маўра Васільеўна, н. у 1894, расстраляна.

ВЁСКА ГРУДСКОЕ

БЛІШЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1900, расстраляны.

БЛІШЧ Наталля Фёдараўна, памерла ад [illegible].

БОНДАР Вадзім Яфімавіч, н. у 1931, расстраляны ў 1943.

БОНДАР Генадзь Яфімавіч, н. у 1929, расстраляны ў 1943.

БОНДАР Іван Яфімавіч, н. у 1925, расстраляны ў 1943.

БОНДАР Любоў, н. у 1902, расстраляна.

БОНДАР Яфім, н. у 1900, расстраляны.

ВАСІЛЕЦ Вера Пятроўна, расстраляна.

ВАСІЛЕЦ Ганна Іванаўна, н. у 1905—[illegible](?), расстраляна зімой 1943 у в. Андрэеўка як [illegible] партызанскай сям'і. Разам з ёй расстраляны [illegible] сыны — **Віктар,** 1937 г. н., **Мікалай,** [illegible] г. н., **Рыгор,** 1939 г. н., дочкі — **Марыя,** [illegible] г. н., **Надзея,** 1930 г. н., **Ніна,** 1935 г. н.

ВАСІЛЕЦ Дзмітрый Нічыпаравіч, н. у [illegible], партызан, загінуў.

ВАСІЛЕЦ Праскоўя Пятроўна, н. у 1922, [illegible]раляна.

ВАСІЛЕЦ Серафіма Сямёнаўна, н. у 1880, [illegible]раляна зімой 1943 у в. Андрэеўка як член [illegible]ванскай сям'і.

ВАСІЛЕЦ Тамара Пятроўна, расстраляна.

ВАСІЛЕЦ Фёкла, расстраляна.

КУЗАР Даніла Іванавіч, н. у 1894, закатаваны.

КУЗАР Фёдар, расстраляны.

МУХА Андрэй, н. у 1901, расстраляны ў [illegible].

МУХА Ганна Андрэеўна, н. у 1923, расстраляна ў 1943.



І. П. Кашыцкі

МУХА Уладзімір Андрэевіч, н. у 1925, расстраляны ў 1943.

Загінулі таксама сямёра дзяцей узростам ад 5 да 7 гадоў. Іхнія прозвішчы, на жаль, устанавіць не ўдалося.

ВЁСКА ПАСЕКА

ГАПОНЕНКА Іван Міканоравіч, н. у 1926, расстраляны.

МАЦЮШЭНКА Васіль Іванавіч, н. у 1917, партызан, прапаў без вестак 20.4.1943.

МАЦЮШЭНКА Сцяпан Акімавіч, н. у 1925 (1926?), закатаваны ў в. Андрэеўка. Карнікі загадалі яму выкапаць сабе магілу, у якой і закапалі юнака жывым.

СІВУХА Зіновій, н. у 1893, расстраляны ў 1943.

СІВУХА Якаў Маркавіч, н. у 1902, расстраляны.

ЧАРНАШЭЙ Клаўдзія, н. у 1916, расстраляна.

ВЁСКА РАМАНАЎКА

Пераважная большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе «Аўрора».

БАБРОЎНІК Ева Рыгораўна, н. у 1890, загінула ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

КАНДРАЦЕНКА Ганна Іванаўна, н. у 1878, загінула ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

КАНДРАЦЕНКА Фёдар Анісавіч, загінуў у лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

КАШЫЦКІ Аляксандр Цярэнцьевіч, н. у 1926, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, прапаў без вестак у 1944 у Карпатах.

КАШЫЦКІ Аляксей Якаўлевіч, н. у 1926, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1943 на Піншчыне.

КАШЫЦКІ Іван Пятровіч, н. у 1926, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1942.

МЯЖЭВІЧ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1924, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1943.

МЯЖЭВІЧ Уладзімір Фролавіч, н. у 1922, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1942.

МЯЖЭВІЧ Феафан Васільевіч, н. у 1923, да вайны вучыўся ў Рэчыцкім педтэхнікуме, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1942 каля Калінкавіч.

МЯЖЭВІЧ Фрол Мікітавіч, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1942.

ВЁСКА РОВЕНСКАЯ СЛАБАДА

Да вайны ў ёй было 220 двароў, 637 жыхароў. Спалена 7.8.1942. Пераважная большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе імя Дзяржынскага.

ГАНЧАРЭНКА Ганна, н. у 1903, памерла ад ран.

ГАНЧАРЭНКА Платон, н. у 1871, расстраляны.

ГАНЧАРЭНКА Рыгор Мітрафанавіч, н. у 1927, расстраляны.

ГАНЧАРЭНКА Уладзімір Гаўрылавіч, н. у 1926, расстраляны.

ДВОРНІК Аляксандр Мацвеевіч, н. у 1926, расстраляны.

ДВОРНІК Фёдар Фядотавіч, н. у 1926, расстраляны.

КУЦЕНЬ Вольга, н. у 1895, расстраляна.

КУЦЕНЬ Кацярына Паўлаўна, н. у 1925, закатавана.

КУЦЕНЬ Мікалай Ігнатавіч, н. у 1923, расстраляны.

ЛАХОНЬКА Леанід Макаравіч, н. у 1924, расстраляны.

МАЦЮШЭНКА Віктар Антонавіч, да вайны працаваў настаўнікам, расстраляны.

МУРАШКА Васіль Аляксандравіч, н. у 1913, расстраляны.

МУРАШКА Мікалай, н. у 1880, расстраляны.

МУРАШКА Мікалай Дзямідавіч, н. у 1921.

МУРАШКА Таццяна, н. у 1880, расстраляна.

СІВУХА Агаф'я Лук'янаўна, н. у 1902, расстраляна.

СІВУХА Аляксандра Іванаўна, н. у 1885, расстраляна.

СІВУХА Ганна Іванаўна, н. у 1937, расстраляна.

СІВУХА Гаўрыла Маркавіч, н. у 1915, расстраляны.

СІВУХА Марфа Маркаўна, н. у 1895, расстраляна.

СІВУХА Настасся М., н. у 1904, расстраляна.

СІВУХА Наталля, н. у 1868, расстраляна.

СІВУХА Рыгор Кузьміч, н. у 1923, расстраляны.

СІВУХА Сямён Юркавіч, н. у 1892, расстраляны.

СІВУХА Якаў Фёдаравіч, н. у 1928, расстраляны.

ЧАРНАШЭЙ Рыгор Пятровіч, н. у 1882, расстраляны.

ЧЭЧАТ Васіль Мікалаевіч, расстраляны.

ЧЭЧАТ Уладзімір Мікалаевіч, расстраляны.

Загінулі таксама трое дзяцей узростам ад 3 да 5 гадоў, прозвішчы якіх, на жаль, устанавіць не ўдалося.

ВЁСКА РОЎНАЕ

Да вайны ў ёй было 96 двароў, 340 жыхароў. Спалена 7.8.1942. Згарэлі 93 двары. Пераважная большасць загінуўшых да вайны працавалі ў калгасе «Іскра».

АРЖАНОЎСКІ Леанід Ф., н. у 1925, расстраляны.

КАЛЬЧУК Андрэй Арцёмавіч, н. у 1892, спалены.

КАЛЬЧУК Ганна, н. у 1903, спалена.

КАЛЬЧУК Дар'я Ільінічна, н. у 1923, спалена.

КАЛЬЧУК Ілля Цімафеевіч, н. у 1900, спалены.

КАЛЬЧУК Мікалай Пятровіч, н. у 1926, расстраляны.

КАЛЬЧУК Наталля Майсееўна, н. у 1885, расстраляна.

КАЛЬЧУК Фёдар Ільіч, н. у 1929, спалены.

КАЛЬЧУК Цімафей Е., н. у 1873, спалены.

КАНАРЖЭЎСКІ Уладзімір П., н. у 1923, расстраляны.

КЛАКОЦКАЯ Ганна Пятроўна, н. у 1916, расстраляна.

КУЛАКОЎСКАЯ Дар'я, н. у 1871, спалена.

КУЦЕНЬ Дзмітрый Уладзіміравіч, расстраляны. Жонка **Еўдакія**, дзеці: сыны — **Андрэй, Пятро**, 1930 г. н., дочкі — **Валянціна**, 1934 г. н., **Ганна,** 1939 г. н., **Кацярына,** 1937 г. н., **Марыя**, 1936 г. н., **Ніна**, 1932 г. н.

КУЦЕНЬ Наталля Васільеўна, н. у 1922, да вайны вучылася ў Рэчыцкім педтэхнікуме, расстраляна.

КУЦЕНЬ Павел Уладзіміравіч, н. у 1910, расстраляны.

КУЦЕНЬ Уладзімір Мітрафанавіч, н. у 1927, расстраляны.

КУЦЕНЬ Ульяна Васільеўна, н. у 1929, расстраляна.

КУЦЕНЬ Юлія Васільеўна, н. у 1928, расстраляна.

МАЕЎСКАЯ Ганна Уладзіміраўна, н. у 1936, расстраляна.

МАЕЎСКАЯ Ганна Ціханаўна.

МАЕЎСКАЯ Уладзіслава, н. у 1913, расстраляна.

МАЕЎСКІ Уладзімір Браніслававіч, н. у 1910, расстраляны.

МАЖЭЙКА Кацярына Сямёнаўна, н. у 1938, расстраляна.

МАЖЭЙКА Лізавета Васільеўна, н. у 1900, расстраляна.

МАЖЭЙКА Настасся Сямёнаўна, н. у 1935, спалена.

МАРОЗ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1930, расстраляны.

МАЦЮШЭНКА Кацярына, н. у 1906, расстраляна.

МАЦЮШЭНКА Уладзімір, н. у 1935, расстраляны.

НАВАСАД Іван, н. у 1908, расстраляны.

ПАЎЛОЎСКАЯ Агаф'я Адамаўна, н. у 1897, расстраляна.

СІВУХА Кацярына Тарасаўна, н. у 1902, спалена.

СІВУХА Лілія Маркаўна, н. у 1932, расстраляна.

СІВУХА Марфа, н. у 1895, расстраляна.

ФІСНЕР Варвара Сяргееўна, н. у 1914, расстраляна.

ФІСНЕР Лідзія Адамаўна, н. у 1934, расстраляна.

ЧАРНАШЭЙ Валянціна Уладзіміраўна, н. у 1941, спалена.

ЧАРНАШЭЙ Васіль Сяргеевіч, н. у 1928, расстраляны.

ЧАРНАШЭЙ Віктар Ціханавіч, н. у 1939, расстраляны.

ЧАРНАШЭЙ Іван Ісакавіч.

ЧАРНАШЭЙ Іван Мітрафанавіч, н. у 1924, расстраляны.

ЧАРНАШЭЙ Ксенія, н. у 1894, спалена.

ЧАРНАШЭЙ Ксенія Сафронаўна, н. у 1914, спалена.

ЧАРНАШЭЙ Леанід Данілавіч, н. у 1928, расстраляны.

ЧАРНАШЭЙ Леанід Уладзіміравіч, н. у 1934, спалены.

ЧАРНАШЭЙ Лідзія Уладзіміраўна, н. у 1938, спалена.

ЧАРНАШЭЙ Матруна Адамаўна, н. у 1873, расстраляна.

ЧАРНАШЭЙ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1922, расстраляны.

ЧАРНАШЭЙ Рыгор Ф., н. у 1910, расстраляны.

ЧАРНАШЭЙ Сафрон Сафронавіч, н. у 1924, партызан, загінуў.

ЧАРНАШЭЙ Сцепаніда, н. у 1910, расстраляна.

ЧАРНАШЭЙ Тамара Ціханаўна, н. у 1931, расстраляна.

ЧАРНАШЭЙ Таццяна С., н. у 1885, расстраляна.

ЧАРНАШЭЙ Уладзімір Іванавіч, н. у [illegible], партызан, загінуў у 1943.

ЧАРНАШЭЙ Ціхан Ісакавіч, н. у 1912, [illegible]раляны.

ВЁСКА СМАГАРЫН

Пераважная большасць загінуўшых да вайны [illegible] ў калгасе «Аўрора».

БЛІШЧ Андрэй Мікалаевіч, н. у 1880, рас[illegible] ў 1943.

БЛІШЧ Аўдоцця Іванаўна, н. у 1861, згарэла ў бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

БЛІШЧ Васіль Архіпавіч, расстраляны.

БЛІШЧ Васіль Пятровіч, расстраляны.

БЛІШЧ Іван Мікалаевіч, н. у 1875, расстраляны ў 1943.

БЛІШЧ Міхаіл Іванавіч, н. у 1871, расстраляны.

БЛІШЧ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1914, партызан, загінуў 16.11.1943 каля в. Асветнік.

БОРСУК Фёдар Аляксандравіч, н. у 1911, расстраляны.

БОРСУК Фядора Аляксандраўна, н. у 1904, загінула ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ВАСІЛЕЦ Пётр Ігнатавіч, н. у 1877, расстраляны.

ВАСІЛЕЦ Уладзімір Пятровіч, расстраляны.

ДАЎЖАНОК Алена Антонаўна, н. у 1928, згарэла ў бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ДАЎЖАНОК Антон В., н. у 1890.

ДАЎЖАНОК Зоя (Зося) Антонаўна, н. у 1931, згарэла ў бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ДАЎЖАНОК Мікалай Гаўрылавіч, н. у 1918, быў забраны на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ДАЎЖАНОК Надзея Іванаўна, н. у 1899, згодна іншых даных — у 1908, згарэла ў бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ДАЎЖАНОК Рыгор Антонавіч, н. у 1934, згарэў у бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ДАЎЖАНОК Сцяпан Гаўрылавіч, н. у 1909, партызан.

ДАЎЖАНОК Уладзімір Антонавіч, н. у 1925 (1926?), згарэў у бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ДАЎЖАНОК Яўгенія (Алена) Антонаўна, н. у 1928 (1929?), згарэла ў бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ЛАМАНОВІЧ Казімір, н. у 1885.

ЛІХАЧ Віктар С., н. у 1932.

ЛІХАЧ Вольга Восіпаўна, н. у 1861, згарэла ў бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ЛІХАЧ Восіп Васільевіч, н. у 1912, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1945 на тэрыторыі Хмяльніцкай вобл. (Украіна) у баі з бандэраўцамі.

ЛІХАЧ Малання Піліпаўна, н. у 1900, згарэла ў бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ЛІХАЧ Пётр Сяргеевіч, н. у 1911, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў у 1943.

ЛІХАЧ Сцепаніда Д., н. у 1913, закатавана.

ЛЯПЁШКА Віктар Аляксандравіч, н. у 1937—1939(?), расстраляны.

ЛЯПЁШКА Соф'я Міхайлаўна, н. у 1916, расстраляна.

ЛЯПЁШКА Юлія Фёдараўна, н. у 1929 (1930?), згарэла ў бліндажы ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

МАРОЗ Кацярына Аляксандраўна, н. у 1927, загінула ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

МАРОЗ Ніна Лаўрэнаўна, н. у 1937, загінула ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

МАРОЗ Раіса Лаўрэнаўна, н. у 1935, загінула ў лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

ПАРУКЕВІЧ Васіль Рыгоравіч, н. у 1931, закатаваны.

ПАРУКЕВІЧ Лідзія Браніславаўна, н. у 1907, закатавана.

ПАРУКЕВІЧ Марыя Піліпаўна, н. у 1903, закатавана.

ПІЛЕЦКАЯ Марыя Савельеўна, н. у 1913 (жонка партызана Пілецкага Аляксандра Данілавіча). 10.11.1943 фашысты кінулі ў яе гранату. Разам з маці загінулі дочкі: **Люба**, 1938 г. н. і **Тамара**, 1936 г. н.

ПІЛЕЦКІ Аляксандр Данілавіч, н. у 1911 у в. Завужаль, жыў з сям'ёй у Смагарыне, партызан, расстраляны ў маі 1943.

РУБАН Нікан (Мікалай) Іванавіч, н. у 1896, загінуў у лістападзе 1943 пры праходжанні фронту.

РЫМКО Ала Т. н. у 1887.

СУПРАНОК Міхаіл Апанасавіч, н. у 1924, быў адпраўлены на прымусовыя работы ў Германію, далейшы лёс невядомы.

ЦЫБУЛЬСКІ Пётр Адамавіч, н. у 1874, расстраляны разам з сям'ёй.

ШАЛЯМЕЙ Васіль Сцяпанавіч, н. у 1914, партызан украінскага злучэння С. А. Каўпака, загінуў.

ШАЛЯМЕЙ Ганна Іванаўна, н. у 1861, згодна іншых даных — у 1874, спалена.

ШАЛЯМЕЙ Іван Аляксандравіч, н. у 1930, расстраляны ў 1943.

ШАЛЯМЕЙ Надзея П., н. у 1906—1908(?), расстраляна ў 1943. Разам з маці загінуў і сын **Васіль**, узрост якога ўстанавіць не ўдалося.

